Паўль Сутэр

АЛЬФУРКАН ТАТАРСКІ

Каран-тэфсір
татараў
Вялікага Княства
Літоўскага

Татарам
былога Вялікага Княства Літоўскага
ахвярую

Paul Suter

ALFURKAN TATARSKI

Der litauisch-tatarische Koran-Tefsir

Köln Weimar Wien
Böhlau Verlag
2004

Паўль Сутэр

АЛЬФУРКАН ТАТАРСКІ

**Каран-тэфсір
татараў
Вялікага Княства
Літоўскага**

Мінск
«Тэхналогія»
2009

УДК 821.512.145.09
ББК 83.3(4Бел = Тат)
С 90

Пераклад з нямецкай мовы
Ірыны Сынковай, Віктара Свяклы і Міхася Тарэлкі

Навуковы рэдактар
Генадзь Цыхун

Пераклад зроблены з выдання: Suter, Paul. Alfurkan Tatarski. Der litauisch-tatarische Koran-Tefsir. Köln etc.: Böhlau Verlag, 2004. 555 S. (Bausteine zur slavischen Philologie und Kulturgeschichte. Neue Folge. Reihe A: Slavistische Forschungen. Band 43)

Сутэр, П.

С 90 Альфуркан татарскі. Каран-тэфсір татараў Вялікага Княства Літоўскага / Паўль Сутэр: пер. з ням. мовы Ірыны Сынковай, Віктара Свяклы, Міхася Тарэлкі; пад. рэд. Генадзя Цыхуна. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 530 с.

ISBN 978-985-458-189-7

Манаграфія вядомага швейцарскага навукоўца, спецыяліста ў галіне кітабістыкі, прысвечана выдатнаму помніку пісьменства татараў Вялікага Княства Літоўскага – перакладу Карана з тлумачэннямі (г. зв. тэфсіру), які быў распаўсюджаны на беларускіх землях. Параўнальна з заходнееўрапейскімі перакладамі ён больш дасканалы, дакладны і тэалагічна абгрунтаваны. Паказваецца культурны і рэлігійны кантэкст XVI ст., з якога паходзіць тэфсір, аналізуюцца графічная і граматычная сістэмы мовы.

Для філолагаў, гісторыкаў, культуролагаў, рэлігіязнаўцаў, усіх тых, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Вялікага Княства Літоўскага.

УДК 821.512.145.09
ББК 83.3(4Бел = Тат)

ISBN 978-985-458-189-7

© Böhlau Verlag GmbH & Cie, 2004
© Выданне на беларускай мове, афармленне. НВК "Тэхналогія", 2009

ЗМЕСТ

Ад рэдактара беларускага выдання 12
Прадмова да беларускага выдання 15
Падзяка 17
Скарачэнні 19
Абазначэнні цытат 20

1. УВОДЗІНЫ 21
1.1. Кітабістыка 22
1.1.1. Катэгорыі рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага 26
1.1.2. Моўная праблема 29
1.2. *"Альхаміяда"*-літаратура 31
1.2.1. Боснія 32
1.2.2. Вялікае Княства Літоўскае 35
1.3. *"Альфуркан татарскі"* 36
1.4. Каран-тэфсір "літоўскіх" татараў 40
1.5. Узор тэксту з тэфсіра L 42
1.5.1. Верш святла 44
1.6. Традыцыйная форма "літоўскага" тэфсіра 45
1.7. Арабскі тэкст 47
1.8. Падрадковы пераклад 49

2. АСПЕКТЫ ТЭКСТУ ПЕРАКЛАДУ 51
2.1. Экзегетычны каментар 52
2.1.1. Паэт *Ка'б ібн аль-Ашраф* 52
2.1.2. Знаўца Пісання *Абд Алаг ібн Салям* 53
2.1.3. Геаграфічны каментар: *Масул* 53
2.1.4. Скасаванне: "*nāsiḫ*" і "*mansūḫ*" 54
2.1.5. Боства "*Дагон*" 56
2.2. Экзегетычная парафраза 57
2.2.1.Паняцці "*tanzīh*" і "*tawḥīd*" 57
2.3. Пераклад "слова за словам" 58
2.3.1. Пераклад рыфмаванай фразы 59
2.3.2. Літаральнае адлюстраванне арабскага тэксту 59
2.3.3. Пранаміналізацыя і адносны даданы сказ 61
2.3.4. Састаўныя часавыя формы *kāna* + *імперфект* 62
2.3.5. Арабскі дзеепрыметнік незалежнага стану 64
2.3.6. Адвербіяльныя абазначэнні акалічнасцей (ар. *ḥāl*) 65
2.3.7. Figura etymologica (унутраны аб'ект) 67
2.3.8. Родны склон спецыфікацыі 68

3. АРЫЕНТАЛЬНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ 70
3.1. Арабізмы 71
3.1.1. Арабізм "*ġāzī*" (змагар за веру) 72
3.2. Цюркізмы 75
3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*" 76

3.3. Персізмы 79
3.3.1. Прыметнік "*lekkosierny*" (лёгкасардэчны) 80
3.4. Фразеалагічныя дзеясловы 80
3.5. Арабскія імёны ўласныя 81
3.6. Тапаніміка 83

4. КАРАНІЧНЫЯ ЦЫТАТЫ Ў КІТАБАХ 84

5. СТАН КРЫНІЦ 96
5.1. Манускрыпты 96
5.2. Знешнія крыніцы 99
5.2.1. "*Тарых-і Печэві*" 99
5.2.2. *Рысале-і Татар-ы Лех* 100

6. КУЛЬТУРНЫ КАНТЭКСТ 106
6.1. Кальвінізм, антытрынітарызм і нонадарантызм 109
6.2. Суіснаванне розных рэлігійных канфесій 115
6.3. Татары і караімы 117

7. АДБІТКІ КУЛЬТУРНАГА КАНТЭКСТУ 120
7.1. Лацінізмы 120
7.2. *Літоўская метрыка* 121
7.3. Абазначэнне хрысціян (ар. *naṣārā*) 123
7.4. Перанос хрысціянскай тэрміналогіі 124
7.4.1. Тэрміны "*kapłan*" і "*ofiarownik*" 124
7.4.2. Пераклад арабскага слова *міхраб* (малітоўная ніша) 126
7.4.3. Тэрмін "*rozdział*" (раздзел, глава) 128
7.5. Тройца і трынітарыі 130

8. ВЫСНОВЫ 135

9. УЖЫВАННЕ ПІСЬМА 143
9.1. Паходжанне і традыцыя арабскага пісьма 144
9.2. Алфавіт "літоўскіх" татараў 146
9.2.1. Напісанне зычных 146
9.2.2. Тлумачэнне да зычных графем 148
9.2.2.1. Знак "*šadda*" 149
9.2.2.2. Асаблівая функцыя *'ayn* і *alif* 149
9.2.3. Выражэнне палатальнасці 149
9.3. Напісанне галосных 151
9.3.1. Заўвагі да спосабаў напісання галосных 153
9.3.2. Дапаможныя арфаграфічныя знакі *sukūn* і *hamza* 156
9.3.3. *Scriptio plena* і *scriptio defectiva* галосных 156
9.4. Асабістыя пісьмовыя стылі 159
9.5. Тэндэнцыі развіцця ў сістэме пісьма 159
9.6. Частотнасць графем 163
9.6.1. Спосабы напісання галосных 163
9.6.2. Спосабы напісання зычных 167

10. ВАКАЛІЗМ РУКАПІСУ 169
10.1. Польская сістэма галосных 169
10.2. Беларуская сістэма галосных 170
10.3. Напластаванне абедзвюх сістэм 171

10.4. Закрытыя галосныя 173
10.4.1. Закрыты */á/* 174
10.4.2. Закрыты галосны */é/* 174
10.4.3. Закрыты */ó/* 177
10.5. Насавыя галосныя 178
10.5.1. Насавыя галосныя ў сярэдзіне слова 178
10.5.2. Насавы *e* ў канцы слова 181
10.5.3. Насавы *o* ў канцы слова 181
10.5.4. Змяшэнне насавых галосных 183
10.5.4.1. Архаічныя гучанні 184
10.5.4.2. Варыянты назоўніка "*wątpliwość*" (сумненне) 184
10.5.4.3. Змяшэнні насавых у парадыгмах 185
10.5.4.4. Змяшэнні насавых у групах аднакаранёвых слоў 186
10.5.4.5. Пераходы ў спосабе напісання 187
10.5.5. Назалізацыя этымалагічных гукавых груп */en/*, */an/* або */on/* 187
10.5.6. Дэназалізаваныя спосабы напісання 188
10.5.7. Другасная назалізацыя 189
10.6. Перагаласоўка 189
10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка 190
10.6.2. Польская перагаласоўка 193
10.7. Уплыў плаўных і насавых на галосныя 195
10.7.1. Змена *iR* > *eR* 195
10.7.2. Змена *iL* > *eL* 196
10.7.3. Змена *iM* > *eM* 196
10.8. Звужаная артыкуляцыя ненаціскных */e/* і */o/* 199
10.8.1. Звужэнне ненаціскнога */e/* > */i, y/* 199
10.8.2. Звужэнне ненаціскнога */o/* > */u/* 201
10.9. Аканне 201
10.9.1. Аканне */o/* > */a/* перад націскам 202
10.9.2. Аканне */o/* > */a/* пасля націску 203
10.9.2.1 Аканне */o/* > */a/* ў скланенні назоўнікаў 203
10.9.2.2. Аканне */o/* > */a/* ў скланенні прыметнікаў 204
10.9.2.3. Аканне */o/* > */a/* ў спражэнні 204
10.9.2.4. Аканне */o/* > */a/* ў прыслоўях 205
10.9.3. Аканне */e/* > */a/* перад націскам 205
10.9.4. Аканне */e/* > */a/* пасля націску 206
10.9.4.1. Аканне */e/* > */a/* ў скланенні назоўнікаў 206
10.9.4.2. Аканне */e/* > */a/* ў скланенні прыметнікаў 207
10.9.4.3. Аканне */e/* > */a/* ў спражэнні 208
10.9.4.4. Аканне */e/* > */a/* ў прыслоўях 209
10.9.5. *Scriptio defectiva* */a/* праз *fatḥa* = *e* 209
10.9.6. Моцнае (поўнае) аканне 210
10.9.7. Гіперкарэктнае гучанне, звязанае з аканнем 211
10.10. Змяшэнне галосных */a/*, */e/* і */o/* пад націскам 213
10.11. Змена */e/* > */o/* ў канцы слова 214

11. КАНСАНАНТНАСЦЬ РУКАПІСУ 216
11.1. Сукупнасць зычных фанем 216
11.2. Фанемы */ch/*, */h/* і */g/* 216

11.3. Фанемы /ł/, /l/ і /l'/ . . . 218
11.4. Фанемы /r/, /ř/ і /ž, š/ (< /ř/) . . . 220
11.5. Асіміляцыя зычных . . . 222
11.5.1. Карэляцыя ўдзелу голасу . . . 223
11.5.2. Прагрэсіўная асіміляцыя адпаведна ўдзелу голасу . . . 224
11.5.3. Асіміляцыя па месцы артыкуляцыі . . . 224
11.5.3.1. Карэляцыя палатальнасці . . . 225
11.5.3.2. Ускосны паказчык палатальнасці . . . 225
11.5.3.3. Тыповае беларускае змякчэнне */d, t/* перад */w'/* . . . 226
11.5.3.4. Змякчэнне */s/ > /s'/* у пазіцыі перад */k'/* . . . 227
11.5.3.5. Асіміляцыя *дэнтальны > альвеалярны* і *дэнтальны > білабіяльны* . . . 228
11.5.4. Асіміляцыі са спрашчэннем кансанантных груп . . . 228
11.6. Асінхронная артыкуляцыя ў палатальных білабіяльных . . . 229
11.7. Змяшэнне */z'/* з */ž/* і */s'/* з */š/* . . . 230
11.8. Змяшэнне */s/* з */s'/* і */z/* з */z'/* . . . 231
11.9. Сляды мазуракання? . . . 232
11.10. Спрашчэнні кансанантных груп . . . 232
11.11. Змяшэнне */w/* і */u/* на пачатку слова, інтэрвакальны */w/* (*ŭ*) . . . 233
11.12. Поўнагалоссе . . . 234
11.13. Падваенне зычных . . . 235
11.14. Пратэтычны */i/* пры збегу двух зычных на пачатку слова . . . 236
11.15. Эпентэтычны */ . . . 236

12. СКЛАНЕННЕ НАЗОЎНІКАЎ . . . 237
12.1. Скланенне назоўнікаў мужчынскага роду . . . 238
12.1.1. Назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду . . . 240
12.1.2. Родны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду . . . 241
12.1.3. Давальны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду . . . 243
12.1.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду . . . 244
12.1.5. Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду . . . 245
12.1.6. Месны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду . . . 246
12.1.7. Клічны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду . . . 248
12.1.8. Назоўны склон множнага ліку мужчынскага роду . . . 249
12.1.9. Родны склон множнага ліку мужчынскага роду . . . 254
12.1.10. Давальны склон множнага ліку мужчынскага роду . . . 257
12.1.11. Вінавальны склон множнага ліку мужчынскага роду . . . 258
12.1.12. Творны склон множнага ліку мужчынскага роду . . . 261
12.1.13. Месны склон множнага ліку мужчынскага роду . . . 262
12.1.14. Клічны склон множнага ліку мужчынскага роду . . . 264
12.2. Скланенне назоўнікаў ніякага роду . . . 264
12.2.1. Назоўны (клічны) склон адзіночнага ліку ніякага роду . . . 264
12.2.2. Родны склон адзіночнага ліку ніякага роду . . . 266
12.2.3. Давальны склон адзіночнага ліку ніякага роду . . . 267
12.2.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку ніякага роду . . . 267
12.2.5. Творны склон адзіночнага ліку ніякага роду . . . 268
12.2.6. Месны склон адзіночнага ліку ніякага роду . . . 270
12.2.7. Назоўны (клічны) склон множнага ліку ніякага роду . . . 271
12.2.8. Родны склон множнага ліку ніякага роду . . . 271
12.2.9. Давальны склон множнага ліку ніякага роду . . . 272

12.2.10. Вінавальны склон множнага ліку ніякага роду 273
12.2.11. Творны склон множнага ліку ніякага роду 274
12.2.12. Месны склон множнага ліку ніякага роду 274
12.3. Скланенне назоўнікаў жаночага роду 275
12.3.1. Назоўны склон адзіночнага ліку жаночага роду 275
12.3.2. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду 275
12.3.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду 278
12.3.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду 279
12.3.5. Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду 281
12.3.6. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду 282
12.3.7. Клічны склон адзіночнага ліку 284
12.3.8. Назоўны (клічны) склон множнага ліку жаночага роду 284
12.3.9. Родны склон множнага ліку жаночага роду 285
12.3.10. Давальны склон множнага ліку жаночага роду 286
12.3.11. Вінавальны склон множнага ліку жаночага роду 287
12.3.12. Творны склон множнага ліку жаночага роду 288
12.3.13. Месны склон множнага ліку жаночага роду 289
12.4. Кансанантнае скланенне назоўнікаў жаночага роду 290
12.4.1. Назоўны склон адзіночнага ліку жаночага роду 290
12.4.2. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду 290
12.4.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду 291
12.4.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду 291
12.4.5. Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду 292
12.4.6. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду 293
12.4.7. Назоўны склон множнага ліку жаночага роду 293
12.4.8. Родны склон множнага ліку жаночага роду 293
12.4.9. Давальны склон множнага ліку жаночага роду 294
12.4.10. Вінавальны склон множнага ліку жаночага роду 295
12.4.11. Творны склон множнага ліку жаночага роду 295
12.4.12. Месны склон множнага ліку жаночага роду 295

13. ЗМЕНА РОДУ 296

14. ПРЫМЕТНІКІ І ІХ СКЛАНЕННЕ 298
14.1. Скланенне прыметнікаў 298
14.1.1. Назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду 299
14.1.2. Назоўны склон адзіночнага ліку ніякага роду 301
14.1.3. Родны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду 301
14.1.4. Давальны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду 302
14.1.5. Вінавальны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду 302
14.1.6. Вінавальны склон адзіночнага ліку ніякага роду 303
14.1.7. Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага родаў 303
14.1.8. Месны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду 304
14.1.9. Клічны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду 305
14.1.10. Назоўны склон адзіночнага ліку жаночага роду 305
14.1.11. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду 306
14.1.12. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду 307
14.1.13. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду 307
14.1.14. Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду 309
14.1.15. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду 309

14.1.16. Клічны склон адзіночнага ліку жаночага роду . . . 310
14.1.17. Назоўны склон множнага ліку . . . 310
14.1.18. Родны склон множнага ліку . . . 314
14.1.19. Давальны склон множнага ліку . . . 315
14.1.20. Вінавальны склон множнага ліку . . . 315
14.1.21. Творны склон множнага ліку . . . 317
14.1.22. Месны склон множнага ліку . . . 318
14.1.23. Клічны склон множнага ліку . . . 318
14.2. Утварэнне ступеняў параўнання прыметнікаў . . . 319
14.3. Скарачэнні ў прыналежных займенніках . . . 320

15. ПРЫСЛОЎІ . . . 321

16. МАРФАЛОГІЯ ДЗЕЯСЛОВА . . . 323
16.1. Інфінітыў . . . 325
16.2. Цяперашні час . . . 326
16.2.1. 1-я асоба адзіночнага ліку цяперашняга часу . . . 326
16.2.2. 2-я асоба адзіночнага ліку цяперашняга часу . . . 327
16.2.3. 3-я асоба адзіночнага ліку цяперашняга часу . . . 328
16.2.4. 1-я асоба множнага ліку цяперашняга часу . . . 329
16.2.5. 2-я асоба множнага ліку цяперашняга часу . . . 331
16.2.6. 3-я асоба множнага ліку цяперашняга часу . . . 332
16.3. Прошлы час . . . 333
16.3.1. 1-я асоба адзіночнага ліку прошлага часу . . . 333
16.3.2. 2-я асоба адзіночнага ліку прошлага часу . . . 334
16.3.3. 3-я асоба адзіночнага ліку прошлага часу . . . 335
16.3.4. 1-я асоба множнага ліку прошлага часу . . . 336
16.3.5. 2-я асоба множнага ліку прошлага часу . . . 338
16.3.6. 3-я асоба множнага ліку прошлага часу . . . 338
16.4. Сляды плюсквамперфекту . . . 339
16.5. Умоўны лад . . . 339
16.5.1. 1-я асоба адзіночнага ліку . . . 340
16.5.2. 2-я асоба адзіночнага ліку . . . 340
16.5.3. 3-я асоба адзіночнага ліку . . . 341
16.5.4. 1-я асоба множнага ліку . . . 341
16.5.5. 2-я асоба множнага ліку . . . 342
16.5.6. 3-я асоба множнага ліку . . . 342
16.6. Будучы час . . . 342
16.6.1. 1-я асоба адзіночнага ліку . . . 343
16.6.2. 2-я асоба адзіночнага ліку . . . 343
16.6.3. 3-я асоба адзіночнага ліку . . . 344
16.6.4. 1-я асоба множнага ліку . . . 344
16.6.5. 2-я асоба множнага ліку . . . 344
16.6.6. 3-я асоба множнага ліку . . . 344
16.6.7. Адсутнасць будучага часу з дапаможным дзеясловам *mieć* (мець) . . . 345
16.7. Загадны лад . . . 345
16.7.1. 2-я асоба адзіночнага ліку . . . 345
16.7.2. 1-я асоба множнага ліку . . . 346
16.7.3. 2-я асоба множнага ліку . . . 347
16.7.4. 3-я асоба адзіночнага і множнага ліку . . . 348

16.8. Зваротныя дзеясловы . . . 349
16.9. Дзеепрыметнікі . . . 350
16.9.1. Дзеепрыметнік цяперашняга часу незалежнага стану . . . 350
16.9.2. Дзеепрыметнік цяперашняга часу залежнага стану . . . 351
16.9.3. Дзеепрыметнік прошлага часу залежнага стану . . . 352
16.10. Дзеепрыслоўі . . . 354
16.10.1. Дзеепрыслоўе незакончанага трывання . . . 354
16.10.2. Дзеепрыслоўе закончанага трывання . . . 355

17. РУКАПІСЫ . . . 358
17.1. Рукапіс тэфсіра L . . . 359
17.1.1. Тэкст рукапісу **L** . . . 361
17.2. Рукапіс тэфсіра I . . . 434
17.2.1. Тэкст рукапісу **I** . . . 435
17.3. Рукапіс тэфсіра U . . . 467
17.3.1. Тэкст рукапісу **U** . . . 468
17.4. Рукапіс тэфсіра M . . . 498
17.4.1. Узоры тэксту з рукапісу **M** . . . 498
17.5. Рукапіс кітаба K . . . 502
17.5.1. Узоры тэксту з рукапісу **K** . . . 504
17.5.1.1. Экзэгеза суры Ясін (сура 36) . . . 504
17.5.1.2. Пра эзатэрычны свет . . . 505
17.5.1.3. Легенда пра Эзру . . . 505
17.5.1.4. Пра гасціннасць . . . 506
17.5.1.5. З катэхізіса . . . 507
17.5.1.6. Грэхападзенне Адама і Евы . . . 509
17.5.1.7. З пачатку Мірадж-легенды . . . 510
17.5.1.8. Гісторыі пра Мекку, Медыну, неба і зямлю . . . 511
17.5.1.9. Гісторыі пра набожнага . . . 511
17.5.1.10. Тлумачэнне сноў . . . 512
17.5.1.11. Гісторыі пра Саламона . . . 512
17.5.1.12. Статыстыка літар . . . 513

18. ДАДАТАК . . . 514
18.1. Прыклады тэксту з цюркскіх тэфсіраў . . . 514
18.2. Фрагмент з "Тарых-і Печэві" . . . 515
18.3. Адзін важны след . . . 517

БІБЛІЯГРАФІЯ . . . 519

АД РЭДАКТАРА
БЕЛАРУСКАГА ВЫДАННЯ

Калісьці, у 70-х гадах мінулага стагоддзя, на навуковай канферэнцыі ў Балгарыі, мне давялося пазнаёміцца з цікавым славістам з Швейцарыі праф. д-рам Робертам Цэтам. Яго думкі адносна вынікаў кантактаў славянскіх і неславянскіх моў падаліся мне вельмі арыгінальнымі і новымі, асабліва ў галіне міжмоўнага ўзаемадзеяння, вядомага пад назвай моўных саюзаў. Відаць, сама лінгвістычная сітуацыя Швейцарыі з яе развітым шматмоўем падтрымлівае цікавасць да праблемы моўных кантактаў і змяшэння моў. У слушнасці такога меркавання яшчэ раз давялося пераканацца, пазнаёміўшыся з кнігай Паўля Сутэра "Альфуркан Татарскі" спачатку ў арыгінале, а цяпер і ў перакладзе на беларускую мову. Вучань Р.Цэта не здрадзіў названай праблематыцы, узяўшыся за даследаванне вельмі складаных арабскаграфічных тэкстаў, дзе ўзаемадзейнічаюць па меншай меры тры моўныя ідыёмы – два славянскія (беларускі і польскі) і арабскі, часам яшчэ і цюркскі (турэцкі).

Неабходнасць у перакладзе кнігі на беларускую мову тлумачыцца не толькі гістарычнымі прычынамі, паводле якіх тэрыторыя ўзнікнення арабскаграфічнай пісьмовай традыцыі на славянскіх мовах прывязана да беларускай тэрыторыі, ці шырэй – да тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (другі цэнтр такой пісьменнасці лакалізаваўся ў Босніі). Яшчэ адна з важкіх прычын заключаецца ў тым, што беларусамі ці выхадцамі з Беларусі і прылеглых земляў зроблены найбольш значны ўклад у навуковае вывучэнне гэтай пісьменнасці, якое ўжо аформілася ў асобную галіну славістыкі пад назвай *кітабістыкі*. Дастаткова назваць хаця б фундаментальную працу Антона Антановіча, прысвечаную арфаграфічнай сістэме рукапісаў беларускіх ("літоўскіх") татараў, на якой грунтуюцца пазнейшыя працы ў гэтай галіне, у прыватнасці народжанага на Беласточчыне Чэслава Лапіча, вільнянкі Галіны Александровіч-Мішкінене, беларускіх даследчыкаў Віктара Несцяровіча і Міхася Тарэлкі. Да гэтага напрамку ў кітабістыцы прымыкае і манаграфія П.Сутэра, якая абагульняе найноўшыя навуковыя дасягненні ў вывучэнні т.зв. тэфсіраў – падрадковых перакладаў Карана з пэўнымі тлумачэннямі. Акрамя таго, яна фактычна ўводзіць чытача ў праблематыку кітабістыкі, а таксама падае ў транслітараваным выглядзе чатыры рукапісы ці фрагменты рукапісаў тэфсіраў і аднаго кітаба з розных бібліятэк і прыватных калекцый, што на сённяшні момант уяўляе найбольш поўны корпус транслітараваных тэкстаў (с. 361–513). У дадатку даюцца таксама з неабходнымі каментарамі фрагменты тэксту з цюркскіх падрадковых перакладаў Карана ў арыгінале і ў перакладзе на беларускую мову, якія суадносяцца з адпаведнымі фрагментамі даследаваных тэкстаў.

Найбольш складанае пытанне, якое вынікае з аўтарскага аналізу рукапісных тэкстаў, датычыць іх моўнага статусу. Беларуская моўная аснова канстатуецца толькі для рукапісу кітаба з Брытанскага музея ў Лондане, які даследавалі Глін Манро Мэрыдыт-Оўэнс і Аляксандр Надсан, а таксама Шырын Акінэр. Усе іншыя даследаваныя тэксты адносяцца да польскамоўных з характэрнымі рысамі т.зв. пальшчызны крэсовай. У большасці выпадкаў яны дэманструюць шматлікія прыклады "mieszanki językowej", як у свой час характарызаваў віленскую пальшчызну выдатны польскі дыялектолаг Казімеж Ніч. Гэта фактычна найбольш поўны корпус запісаў беларуска-польскага змешанага маўлення, аналагічнага т.зв. трасянцы, што дэманструе розныя формы беларуска-рускага змешанага маўлення. І аўтар кнігі пераканаўча гэта паказаў грунтоўным аналізам тэкстаў, адзначаючы што ў іх паўсюдна прысутнічаюць "бясспрэчна беларускія моўныя рысы, што перавышае звычайныя ў польскай мове паўночных крэсаў з'явы інтэрферэнцыі". І гэта вынік таго, "што перапісчыкі ў прынцыпе імкнуліся пісаць па-польску, але гэта ім не заўсёды цалкам удавалася" (с. 50). Пытанне толькі ў тым, ці можна гэта назваць ***польскай мовай***, паколькі мова, у прыватнасці яе пісьмовая форма, характарызуецца адносна ўстойлівымі нормамі і ўяўляе ўнутрана несупярэчлівую сістэму, асабліва ў галіне марфалогіі. Між тым, адносна даследаваных тэкстаў неаднаразова сцвярджаецца: "Як і для іншых асаблівасцей, тут таксама немагчыма канстатаваць адзіную моўную карціну. Польскія альбо беларускія формы з'яўляюцца ў ***выпадковым*** (вылучэнне наша. – *Г.Ц.*) размеркаванні, якое нельга ахапіць правіламі" (с. 323). Што якраз характэрна для змешанага маўлення, менавіта – маўлення (parole), а не мовы (langue) у Сасюраўскім разуменні. Калі да гэтага дадаць, што большасць канчаткаў "могуць падлягаць аканню", што ў прынцыпе пярэчыць фанетычнай сістэме польскай мовы, то зразумела – гутарка ідзе пра пісьмовую фіксацыю арабскай графікай спантаннага перакладу і тлумачэння канфесійных арабскіх тэкстаў, у залежнасці ад розных знешніх фактараў (часу, калі рабіўся пераклад, моўнай кампетэнцыі перакладчыкаў і перапісчыкаў, жанравай характарыстыкі тэкстаў і інш.) з большай або меншай перавагай элементаў адной ці другой мовы. І тут П.Сутэр мае рацыю, калі бачыць прычыны ўсіх назіраных з'яў у лінвістычнай сітуацыі, у якой апынуліся "літоўскія" татары, што характарызавалася рознай прэстыжнасцю моў у іх разуменні. Аднак выклікае сумненні трактоўка моўнай сітуацыі як дыгласіі, пры якой назіраецца свядомае "пераключэнне кодаў" у залежнасці ад сфераў камунікацыі. Якраз тут прысутнічае неўсвядомленая кантамінацыя элементаў матэрыі і формы (у сэнсе В. Гумбальта) беларускай і польскай моў, якія ў кантрасце з высокім статусам арабскай мовы Карана ўспрымаліся як менш прэстыжныя. Хуткая моўная асіміляцыя "літоўскіх" татараў і змены ў моўнай сітуацыі, да якой прыходзілася дастасоўвацца, парадзілі тую моўную стыхію, якая адлюстравалася і ў даследаваных тэкстах.

Перакладчыкі і рэдактар перакладу імкнуліся ў максімальнай ступені захаваць форму і сутнасць аўтарскага выкладу. Натуральным быў зварот да зыходных арабскамоўных тэкстаў пры літаральным перакладзе іх на беларускую мову, а не праз пасярэдніцтва нямецкіх перакладаў. Мы дазволілі сабе дапоўніць некаторыя бібліяграфічныя і біяграфічныя звесткі новымі пазіцыямі і фактамі, што з'явіліся пасля выхаду ў свет нямецкага выдання (яны падаюцца ў курсіўных квадратных дужках, а таксама асобным дадаткам да Бібліяграфіі). Выказваю надзею, што выданне на беларускай мове грунтоўнай працы Паўля Сутэра паспрыяе далейшаму развіццю кітабістыкі ў нашай краіне і за яе межамі.

6 жніўня 2009 г. *Генадзь Цыхун*

ПРАДМОВА ДА БЕЛАРУСКАГА ВЫДАННЯ

Больш за 20 гадоў таму я ўзяўся за праект пашыранага аналізу тэфсіра татараў Вялікага Княства Літоўскага. Тады я не ведаў, з якімі цяжкасцямі лінгвістычнага і гістарычна-культурнага кшталту мне давядзецца сутыкнуцца. Толькі потым, падчас працы, моўная складанасць і гістарычна-культурная шматгранасць перакладу "літоўскімі" татарамі Карана раскрылася ў поўнай меры.

Спатрэбілася прыкласці пэўныя намаганні, каб растлумачыць гэты тэфсір. Былі перыяды роспачы, калі хацелася пахаваць цалкам гэты праект; былі таксама часіны, калі я хадзіў па замкнёным коле і, падавалася, страціў арыентацыю. Толькі непахіснае і з пазіцыі сённяшняга дня нечаканае нават для мяне самога жаданне працягваць даследаванне тэфсіра не дазваляла, аднак, супакоіцца на працягу многіх гадоў і ўвесь час вяртала мяне да аб'екта майго даследавання. Нарэшце ўвесну 2004 г. быў атрыманы вынік доўгіх гадоў працы: кніга была выдадзена ў Германіі ў Böhlau Verlag (Кёльн) у прэстыжнай серыі і стала даступнай для зацікаўленай грамадскасці.

Цяпер, праз чатыры гады, з'явіўся беларускі пераклад маёй кнігі. Ідэя беларускага выдання кнігі нарадзілася ў халодны восеньскі вечар у лістападзе 2004 г. на лецішчы паблізу беларуска-літоўскай мяжы. Тады я папярэджваў прысутных беларусістаў і гісторыкаў не ігнараваць складанасці перакладу маёй кнігі. Аднак бестурботны аптымізм з'яўляецца перадумовай для ўсялякай рэалізацыі мэт, і таму тэрмінова пачаліся пошукі перакладчыка, які б мог справіцца з пастаўленай задачай як спецыяліст у гэтай сферы і як лінгвіст. Я абавязаны выказаць сваю падзяку ўсім, хто сваім асабістым удзелам спрычыніўся да ажыццяўлення беларускага выдання кнігі "Альфуркан татарскі". Тут у першую чаргу трэба назваць перакладчыкаў спадарыню Ірыну Сынкову і спадароў Міхаіла Тарэлку і Віктара Свяклу, якія зрабілі выдатную працу. Апроч таго, праект не ажыццявіўся б без фундатарскай падтрымкі спадара Алега Герта. Вырашальнае значэнне дзеля беларускага выдання мела таксама ўсеагульная падтрымка праекта з боку вядомых беларускіх навукоўцаў. Таму я выказваю сардэчную падзяку таксама спадарам Адаму Мальдзісу, Генадзю Цыхуну, Віктару Несцяровічу, Алесю Жлутку, Уладзіміру Свяжынскаму, Івану Саверчанку. Шчыра дзякую таксама спадарыні Моніцы Банькоўскай (Цюрых) за дапамогу і падтрымку.

Мне задавалі пытанні, як павінна выглядаць і ў якім кірунку мае рухацца далейшае даследаванне тэфсіра. З таго часу як два дзесяцігоддзі таму я пачаў займацца рукапісамі "літоўскіх" татараў (кітабістыкай) як адзіны ў Заходняй Еўропе даследчык, у Польшчы і ў краінах былога Савецкага Саюза з'явіліся маладыя таленты, якія ў стане надаць кітабістыцы новую дынаміку. Я лічу

прынцыповым, што кожны даследчык можа і павінен самастойна знаходзіць і вызначаць сваю тэматыку. Даследчыцкае імкненне ёсць нешта вельмі асабістае і ідзе знутры. Але часта пастаўленыя мэты даследавання і абвешчаная тэматыка не выконваюцца з раўнамерным прыкладаннем намаганняў і патрэбнай энергіяй, неабходнымі для атрымання новых вынікаў.

Я хачу тут, аднак, паказаць на некалькі важных момантаў наконт развіцця даследаванняў у сферы кітабістыкі, як я іх бачу. Адзін шлях далейшага развіцця пазначаны ў дадатку да гэтай кнігі (гл. 18.3). "Літоўскі" тэфсір павінен разглядацца ў кантэксце Рэфармацыі і рэлігійнай літаратуры канца XVI ст. Хоць у маёй кнізе і згадваюцца выдатныя постаці Рэфармацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім, як, напрыклад, Сымон Будны, аднак трэба ажыццявіць сістэматычнае вывучэнне ўплыву рэфарматараў Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага і іх твораў на пераклад Карана. Гэта вымагае вялікай адвагі, значнай дасведчанасці, ведання шырокага кола крыніц, спецыяльных лінгвістычных здольнасцяў, а таксама грунтоўнага ведання некалькіх моваў, у тым ліку арабскай і цюркскай*.

Падмуркам жа для далейшага даследавання перш за ўсё было б выданне поўнага тэфсіра ў форме, якая была паказана ў гэтай кнізе. Абавязковым для такога праекта было б глыбокае веданне арабскай мовы, беларускай і польскай лінгвістыкі, а таксама веданне культурнай гісторыі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага. Важнай перадумовай для працы над тэфсірам з'яўляецца добрае веданне ісламскай каранічнай экзэгезы. Акрамя таго, патрэбны высокапрадукцыйны кампутар і моцнае жаданне даследчыка давесці працу да канца; фінансавыя аспекты адыходзяць тут на другі план. Праца над такім выданнем поўнага тэфсіра заняла б, паводле маёй ацэнкі, прыкладна тры-чатыры гады. Гэта можна ажыццявіць сіламі аднаго даследчыка або камандай спецыялістаў рознай накіраванасці ў міждысцыплінарнай кааперацыі.

Толькі на падставе поўнага выдання тэфсіра будзе магчымым поўнае даследаванне гістарычна-культурнага і лінгвістычнага вымярэння тэфсіра "літоўскіх" татараў. Ключом да яго з'яўляецца гэтая кніга, "Альфуркан татарскі", нямецкае і беларускае выданні якой, спадзяюся, будуць натхняць маладых даследчыкаў на Усходзе і на Захадзе займацца кітабістыкай.

Цюрых, ліпень 2008 г. *Аўтар*

---

* *[Пэўным адказам на гэтыя рэкамендацыі з'яўляецца падрыхтаваная да выдання манаграфія* М. Тарэлкі і І. Сынковай (2009) *(заўвага рэд.).]*

ПАДЗЯКА

Гэтая кніга, гісторыя якой узыходзіць да 80-х гадоў мінулага стагоддзя, не можа з'явіцца без таго, каб тут не была выказана мая падзяка тым людзям, якія спрыялі выхаду гэтай працы.

У першую чаргу я дзякую праф. д-ру Роберту Цэту (Цюрых) і праф. д-ру Бенедыкту Райнерту (Цюрых) за ўвядзенне ў цяжкія навукі – славістыку і арабістыку.

За прыязны прыём маёй працы ў "Bausteine zur Slavischen Philologie und Kulturgeschichte" я дзякую праф. д-ру Гансу Ротэ (Бон), праф. д-ру Карлу Гутшміту (Дрэздэн) і праф. д-ру Роланду Марці (Саарбрукен).

Я ўдзячны праф., д-ру Арнольду Мак-Міліну (Лондан) за мікрафільм лонданскага тэфсіра. Мая падзяка належыць таксама айцу Аляксандру Надсану з Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лондане за ветлівы прыём у бібліятэцы і за яго дапамогу ў бібліяграфічных і моўных пытаннях.

На працягу ўсіх гадоў фраў д-р Астрыд Мейер (Цюрых) пастаянна дапамагала рухацца наперад крытычнымі заўвагамі адносна навуковай аргументацыі. Таксама мая падзяка належыць фраў д-ру Аніце Мюлер (Цюрых) і фраў праф. Мірэй Шнайдэр (Цюрых), якія ніколі не сумняваліся ў выхадзе кнігі і падтрымлівалі мяне сваім непахісным аптымізмам.

На арыенталістычным семінары Цюрыхскага ўніверсітэта д-р Ёханес Томан падтрымліваў маю пазіцыю ў бібліяграфічных, тэхнічных і навуковых пытаннях як партнёр. Д-р Тобіяс Гейнцэльман (Цюрых), таксама з арыенталістычнага семінара ўніверсітэта, істотна дапамог мне ў разуменні і перакладзе цюркскіх фрагментаў у рукапісах.

Апроч таго, у якасці інфарманткі ў сферы польскай мовы ў маім распараджэнні знаходзілася носьбіт мовы спадарыня д-р Малгажата Гербер (Цюрых), за што ёй належыць тут падзякаваць.

За вельмі кампетэнтны і крытычны прагляд рукапісу маёй дысертацыі, за шматлікія і каштоўныя бібліяграфічныя, моўныя і прадметныя заўвагі я дзякую спадарыні Моніцы Банькоўскай (Цэнтральная бібліятэка Цюрыха).

Мая падзяка належыць таксама спадарыні д-ру Галіне Александровіч-Мішкінене (Вільня), якая даставіла мне цяжкадаступныя тэксты з бібліятэкі ў Вільні. Таксама выказваю сваю ўдзячнасць у гэтым плане славісту д-ру Сяргею Цемчыну (Вільня).

У Мінску для пытанняў і кантактаў у маім распараджэнні знаходзіўся праф., д-р Ібрагім Канапацкі з татарскага аб'яднання "Аль-Кітаб". Спадару д-ру Якубу Якубоўскаму, таксама з татарскага аб'яднання "Аль-Кітаб", я дзякую за гасціннасць падчас майго знаходжання ў Мінску. Д-р Уладзімір Свяжынскі

пастаянна забяспечваў мяне копіямі артыкулаў і вытрымкамі з кніг мінскіх бібліятэк. Належыць таксама падзякаваць спадару д-ру Івану Саверчанку за яго садзейнічанне ў кантактах і дастаўцы рэдкіх кніг па тэме.

Я дзякую спадару праф. д-ру Мікалаю Дзьякаву з Санкт-Пецярбурга, які на пачатку 90-х гадоў даў магчымасць даследаваць рукапісы татараў Вялікага Княства Літоўскага на Усходнім факультэце Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта. Тут таксама належыць выказаць падзяку персаналу бібліятэкі, які тады надзвычай ветліва мяне сустрэў і дапамог. Апроч таго, у Інстытуце ўсходазнаўства Расійскай акадэміі навук я знайшоў прыязную падтрымку д-ра Дзмітрыя Ермакова.

Яшчэ я вельмі ўдзячны маім сябрам у Санкт-Пецярбургу Аляксандру і Тацяне Васільчанка, якія мяне заўсёды гасцінна прымалі ў сябе. Я хачу падзякаваць таксама маім настаўнікам Барысу Якаўлеву і Дзмітрыю Якаўлеву, якія мне цярпліва тлумачылі рускую мову і дапамагалі атрымаць літаратуру па спецыяльнасці на рускай мове.

Цюрых, снежань 2003 г.

СКАРАЧЭННІ

/ /	абазначэнне фанемы
< >	абазначэнне графемы
>>>	абазначэнне спасылкі
адз. л.	адзіночны лік
ар.	арабскі
ас.	асоба
бел.	беларускі
буд. ч.	будучы час
він. скл.	вінавальны склон
г.	год
г. г.	год паводле гіджры
габр.	габрэйскі
гіст.	гістарычны
гл.	глядзі
дав. скл.	давальны склон
ж. р.	жаночы род
займ.	займеннік
заўв.	заўвага
і г.д.	і гэтак далей
інш.	іншыя
кл. скл.	клічны склон
літар.	літаральна
м. р.	мужчынскі род
месн. скл.	месны склон
мн. л.	множны лік
н. р.	ніякі род
наз.	назоўнік
наз. скл.	назоўны склон
нар.	нарадзіўся
ням.	нямецкі
пам.	памёр
параўн.	параўнай
пар. л.	парны лік
перс.	персідскі
польск.	польскі
пр. ч.	прошлы час
прым.	прыметнік
род. скл.	родны склон
рус.	рускі
с.	старонка
твор. скл.	творны склон
тур.	турэцкі
цяп. ч.	цяперашні час
цюрк.	цюркскі
EI-2	Encyclopedia of Islam (2-е выд.)
р.	pagina

АБАЗНАЧЭННІ ЦЫТАТ

Цытаты з Карана:

- **Q**(x:y):
- Каран (сура:верш): **Q**(6:69) = > Каран, сура 6, верш 69.
- Арабскія цытаты з Карана пазначаюцца фігурнымі дужкамі { }. Акрамя таго, арабскі тэкст, як правіла, друкуецца **паўтоўстым** шрыфтам: {**bi-smi llāhi r-raḥmāni r-raḥīmi**} (У імя Алага, Міласцівага, Міласэрнага).

Цытаты з тэфсіраў або кітабаў:

(Аркуш / a, b / радок):
(26a3) => аркуш 26a, радок 3.
З дадатковымі літарамі **L, I, U, M** альбо **K**:
I(26a3) => рукапіс **I**, аркуш 26a, радок 3.
K(50b21) => рукапіс **K**, аркуш 50b, радок 21.
(Цытаты без дадатковых літар заўсёды адносяцца да тэфсіра **L**.)

Пазначэнне графем:

Выкарыстоўваецца арабская назва літары і дапаўняецца праз знак роўнасці (=) прынятымі ў дадзенай працы знакамі транслітарацыі літар ва ўжыванні "літоўскімі" татарамі. Такім чынам забяспечваецца ідэнтыфікацыя арабскага пісьмовага знака, а таксама пазначаецца ўжыванне графемы і яе гукавое значэнне ў літоўскататарскім пісьменстве:

ар. графема = літоўскататарская транслітарацыя
t̲ā' = *ṡ*

(Графема *t̲ā'* ў арабскім ужыванні транслітаруецца праз <*t̲*>; арабскаму /*t̲*/ адпавядае англійскае /*th*/. Аднак ва ужыванні "літоўскімі татарамі" *t̲ā'* адпавядае змякчанаму /*s'*/ і транслітаруецца праз <*ṡ*>.)

1. УВОДЗІНЫ

Яшчэ і сёння ў Беларусі, Літве і Польшчы існуюць мусульманскія меншасці – нашчадкі татараў, што перасяляліся ў XIV, XV і XVI стагоддзях з зямель Залатой Арды і Крыма ў Вялікае Княства Літоўскае, якое з 1385 г. было звязанае з Польшчай персанальнай уніяй[1].

Вялікае Княства Літоўскае ў XVI ст. ахоплівала тэрыторыі сённяшніх Літвы, Беларусі, а таксама большай часткі Украіны і, такім чынам, распасціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора. У дачыненні да татараў, якія пасяліліся на землях Вялікага Княства, у заходняй навуцы замацавалася абазначэнне "літоўскія татары"[2].

Асноўны абшар іх рассялення сёння, як раней, абымае тэрыторыю, якая прыблізна абмяжоўваецца Вільняй на поўначы, Мінскам на ўсходзе і Брэстам на захадзе. Рэалістычная ацэнка колькасці татараў, якія пражывалі ў XVI і XVII стст. у Вялікім Княстве Літоўскім, дае каля 50–60 тыс. чалавек[3].

У Вялікім Княстве Літоўскім асноўнай канфесіяй было хрысціянства візантыйскага абраду, дзе ў якасці мовы культу і адукацыі выкарыстоўвалася

---

[1] Пра Польшчу гл.: Encyclopaedia of Islam, 2-е выд. (далей – EI-2), слоўнікавы артыкул Абрагамовіча LEH (Z. Abrahamowicz). Наконт "літоўскіх" татараў асобна гл. у EI-2 слоўнікавы артыкул Абрагамовіча і Рэйхмана LIPKA (Z. Abrahamowicz / J. Reychman). Кароткі нарыс пра найважнейшыя этапы гісторыі татараў Вялікага Княства Літоўскага даюць Meredith-Owens / Nadson (1970). Наконт гісторыі "літоўскіх" татараў ад пачатку да XVIII ст. гл.: Tyszkiewicz (1989). Агульны агляд іх гісторыі і культуры прысутнічае ў працах: Borawski / Dubiński (1986), Думін / Канапацкі (1993) і Канапацкі / Смолік (2000). Каштоўны матэрыял па гісторыі і культуры "літоўскіх" татараў знаходзіцца ў трох тамах часопіса "Rocznik Tatarski", t. 1 (1932), t. 2 (1934); трэці том быў напісаны Крычынскім (Kryczyński (1938)) у форме вельмі інфарматыўнай манаграфіі па гісторыі, культуры і рэлігіі "літоўскіх" татараў. У часопісе "Rocznik Tatarów Polskich" (T. 1, 1993), які быў выдадзены аб'яднаннем "Związek Tatarów Polskich", апублікаваны гістарычныя, лінгвістычныя, літаратурныя навуковыя даследаванні па тэматыцы "літоўскіх" татараў.

[2] Гл.: Meredith-Owens / Nadson (1970), p. 141: "Byelorussia in the 14th-16th centuries formed part of the Grand Duchy of Lithuania. It was a multinational state in which the present-day Lithuanians and Byelorussians formed the two main ethnical groups. All the inhabitants of the Grand Duchy, irrespective of their ethnic origin, called themselves – and were called by others – Lithuanians, while the official language was Byelorussian. It is for this reason that the Tartar settlers in Byelorussia were known as 'Lithuanian Tartars' until relatively recent times".

Параўн.: Kryczyński (1938), p. 2. Таксама ў дадзенай працы выкарыстоўваецца паняцце "літоўскія татары" ў гістарычным сэнсе, звязаным з былым Вялікім Княствам Літоўскім. Каб падкрэсліць гэта, слова "літоўскі" ў такім значэнні бярэцца ў двукоссе.

[3] Стан крыніц для вызначэння колькасці татарскага насельніцтва складаны. Абмеркаванне розных крыніц і падлікі знаходзяцца ў Собчака (Sobczak (1984), p. 40–49). Параўн. таксама: Антонович (1968), с. 8; Kryczyński (1938), p. 23; Meredith-Owens / Nadson (1970), p. 141, 144, 147.

царкоўнаславянская мова. Паралельна ў штодзённых зносінах ужывалася рутэнская (беларуская) гутарковая мова ("простая мова"[4]). У якасці афіцыйнай мовы Вялікага Княства ўсталявалася старабеларуская мова, якую часам называюць "заходнерускай канцылярскай мовай"[5]. З XVI ст. яна разам з усім культурным жыццём у Літве саступала польскаму ўплыву, які паступова ўзрастаў. Пры гэтым роля літоўскай мовы была зусім нязначная[6]. У выніку ўсе сферы жыцця ў Вялікім Княстве – рэлігія, высокая культура, адукацыя, дзяржаўнае кіраванне, а таксама штодзённыя зносіны (перш за ўсё шляхты) – мелі на сабе выразны славянскі, г. зн. беларускі і польскі, адбітак[7]".

У Вялікім Княстве Літоўскім татарскія перасяленцы асіміляваліся ў моўным і культурным плане з іх славянскім абкружэннем, аднак большасць з іх захавала сваю рэлігію – іслам. Каб перадача духоўнага зместу ісламскай рэлігіі і надалей была магчымая, татары з XVI ст. развівалі культуру перакладу. Была перакладзена не толькі святая кніга мусульман – Каран, але і іншыя творы рэлігійна-дыдактычнага характару: катэхізісы, легенды, займальныя гісторыі і апокрыфы. З гэтага пісьменства да нас дайшлі толькі манускрыпты, створаныя ў XVII – XX стст.

1.1. Кітабістыка

Сёння ў Беларусі, Літве і Польшчы навука пра рукапісы "літоўскіх" татараў звычайна называецца *кітабістыка*, таму што насельніцтва гэтых краін традыцыйна

---

[4] Параўн. >>> 1.8. Падрадковы пераклад; >>> 6. Культурны кантэкст.

[5] Гл. Stang (1935); гл. таксама >>> 6. Культурны кантэкст.

[6] На тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ва ўмовах фармавання канкурэнцыі паміж беларускай і польскай мовамі літоўская мова не адыгрывала ніякай ролі; гл., напр., Urbańczyk (1979), p. 155.

[7] Пра ўжывальнае ў XVI ст. абазначэнне мовы ў Беларусі/Літве заўважае Ўарынг (Waring (1980), p. 131): «The varying assessments of this language bear witness to the controversies surrounding its character and importance, and in themselves are some indication of the part played by non-linguistic factors, beginning with the name of the language itself. Contemporary sources, e.g. the 1588 Statute, Skaryna's prefaces, call it 'jazyk russkij' which adjective, originaly designating the general East Slavonic territory, was restricted in the 15th century virtually to the area of Byelorussia. The term had a territorial significance in official documents in the joint kingdom where Polish rulers called themselves 'Kings of the Russians'. For Skaryna the term denoted a language comprehensible to ordinary people as opposed to Church Slavonic – a religious consideration, not West Russian as opposed to the language of Muscovy – a political consideration. The appellations 'prostyj jazyk', 'prostyj dialekt', 'prostaja mova', have clear cultural or social overtones. In Muscovy where 'Russian' meant obviously the language of Moscow, the term 'bělorossijskij jazyk' was used, again a territorial concept, whereas 'bělorusskij' denoting the language inspired less confidence in tsarist Russia, to judge by A.I.Sobolevskij's comment about translations made from the 15th to the 17th centuries in Moscow: "… with others we met which the so-called Byelorussian language – of course, such translations are hard to distinguish from translations made in South West Russia". Ciapinski's rendering of the Gospel in 1570 called the language 'zacnyj ruskij' while Zizanij's Catechism is 'po-litovskij'».

называе ўсе рукапісы тутэйшых татараў аднолькава – *кітабамі* (ад арабскага слова *kitāb*, што азначае "кніга")[8].

Навуковыя даследаванні рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага пачынаюцца з сярэдзіны XIX ст. У гэты час пецярбургскі цюрколаг Антоні Мухлінскі (1808–1877) дзвюма публікацыямі прыцягнуў увагу да гэтай этнічнай групы і яе культурных дасягненняў[9]. У рамках гэтых гісторыка-культурных даследаванняў Мухлінскі таксама закранаў тэму рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага і транслітараваў некалькі кароткіх фрагментаў тэкстаў.

На пачатку XX ст. выйшлі невялікія працы розных аўтараў у форме артыкулаў пра татараў Вялікага Княства Літоўскага, напрыклад, у беларускіх перыёдыках "Наша Ніва" і "Наш край". Лінгвістычная апрацоўка заўсёды вельмі кароткіх вытрымак з рукапісаў ажыццяўляецца ў транслітарацыі кірыліцай, якая ўжо не адпавядае сучасным навуковым стандартам. Да гэтага этапу адносіцца навуковая дзейнасць Луцкевіча (1920) і Цвяткова (1927), а таксама такіх даследчыкаў літаратуры "літоўскіх" татараў, як В. Вольскі[10] і знакаміты беларусіст Я. Ф. Карскі[11], якіх часта цытуе Антановіч.

Разнастайныя артыкулы з часопіса "Rocznik Tatarski"[12], якія ў 30-х гадах выйшлі ў трох тамах, у сваёй большасці маюць не мовазнаўчую, а гістарычную, біяграфічную і бібліяграфічную накіраванасць. Філалагічныя артыкулы

---

[8] Ад ар. назоўніка *kitāb* = "кніга" ў польскай і беларускай мовах утвараецца множны лік *кітабы*.

[9] Мухлинский (1857, 1858).

[10] Вольскі В. Аб асаблівасцях жывой мовы беларускіх татар і арабскай транскрыпцыі "Аль-Кітабаў" // Наш Край. 1927. № 8–9. Мінск.

Вольскі В. Асноўныя прынцыпы арабскай транскрыпцыі беларускага тэксту ў кітабах // Узвышша. 1927. № 6. Мінск.

Вольскі В. Наконт беларускай мовы ў татарскіх кітабах // Літаратура і мастацтва. 1933. № 28. Мінск.

Вольскі В. Наконт нацыянальнай літаратуры беларускіх татар // Узвышша. 1927. № 4. Мінск.

Вольскі В. Цюркска-татарскія элементы ў беларускай мове // Узвышша. 1929. № 6. Мінск.

[11] Кароткая біяграфія Карскага змяшчаецца ў працы "Academician Ja. F. Karski (1861–1931)" / by Arnold McMillin. In: The Journal of Byelorussian Studies. 1967. Vol. I, № 3, London.

У Антановіча (Антонович (1968)) цытуюцца:

Карскі Я. Беларуская мова арабскім пісьмом // Вестник Нар. Ком. Просв. ССРБ. 1921. Т. 2.

Карский Е.Ф. Белорусская речь арабским письмом // Карский Е.Ф. Белорусы. Пг., 1927. Т. 3, ч. 2. С. 239–240.

Карский Е.Ф. Белорусская речь арабским письмом // Ученые записки Высшей школы г. Одессы. 1922. Т. 2. Одесса.

Карский Е.Ф. Культурные завоевания русского языка в старину на западной окраине его области // Карский Е.Ф. Труды по белорусскому и другим славянским языкам. М.: Изд-во АН СССР, 1962. С. 448–463.

[12] Rocznik Tatarski. Czasopismo naukowe, literackie i społeczne. Poświęcone historyi, kulturze i życiu Tatarów w Polsce. Wydanie rady centralnej związku kulturalno-oświatowego Tatarów Rzeczypospolitej Polskiej. T. I: Wilno, 1932. T. II: Zamość, 1935. T. III: Warszawa, 1938.

носяць хутчэй апісальны, чым лінгвістычна-аналітычны характар, і яны прапануюць, як правіла, зусім няшмат арыгінальных тэкстаў з рукапісаў у лацінскай транслітарацыі, якая не адпавядае навуковым патрабаванням[13].

У першай палове XX ст. асабліва вызначаўся сваімі артыкуламі па кітабістыцы даследчык Ян Станкевіч. Ён, у прыватнасці, транслітараваў даволі аб'ёмістыя фрагменты тэкстаў, напрыклад беларускі падрадковы пераклад цюркскай *Міраджс*-легенды (легенды пра нябесную вандроўку прарока Мухамада)[14]. На жаль, транслітарацыя Станкевіча досыць суб'ектыўная і непаслядоўная, і ў выніку яна часта не дазваляе ўбачыць моўныя своеасаблівасці тэкстаў. Станкевіч стаў першым сярод даследчыкаў літаратуры "літоўскіх" татараў, хто ажыццявіў лінгвістычную апрацоўку цэлага рукапісу. У гэтым плане выклікае цікавасць яго праца, апублікаваная ў Нью-Ёрку ў 1952 г., пра гукавы лад даследаванага ім кітаба[15]. Праўда, задуманае ім выданне поўнага тэксту гэтага кітаба ў навуковай транслітарацыі не здзейснілася.

Новы этап у навуковых даследаваннях літаратуры татараў Вялікага Княства Літоўскага пачынаецца з А.К. Антановіча, прафесара Віленскага ўніверсітэта. Яго апублікаваная ў 1968 г. праца па арфаграфічнай сістэме рукапісаў "літоўскіх" татараў дагэтуль з'яўляецца неперасягнутым узорным творам у кітабістыцы і падмуркам любой навуковай дзейнасці па гэтай тэме.

У Лондане на пачатку сямідзесятых гадоў XX ст. увагу даследчыкаў Мэрэдыт-Оўэнс (G. M. Meredith-Owens) і Надсана (A. Nadson) прыцягнулі тры рукапісы, якія знаходзяцца ў Брытанскім музеі і Беларускай бібліятэцы імя Францішка Скарыны. Іх артыкул у "Journal of Byelorussian Studies" разам з нарысам па гісторыі татараў у Вялікім Княстве Літоўскім і апісаннем трох лонданскіх манускрыптаў прапануе таксама некалькі фрагментаў тэкстаў у сучаснай навуковай транслітарацыі[16].

Працягваючы сур'ёзную лонданскую традыцыю, Шырын Акінэр (Shirin Akiner) у сярэдзіне сямідзесятых гадоў апублікавала дзве кароткія працы пра

---

[13] Філалагічна накіраваныя артыкулы ў часопісе "Rocznik Tatarski" (RT) наступныя:

H. S. Szapszał. O zatraceniu języka ojczystego przez tatarów w Polsce. RT, I, p. 34–48.

J. Szynkiewicz. O kitabie. RT, I, p. 188–194.

J. Szynkiewicz. Literatura religijna Tatarów litewskich i jej pochodzenie. RT, II, p. 138–144.

A. Woronowicz. Szczątki językowe Tatarów litewskich. RT, II, p. 351–367.

A. Woronowicz. Kitab Tatarów litewskich i jego zawartość. RT, II, p. 376–394.

Rocznik Tatarski. T. III: *S.Kryczyński*: Tatarzy Litewscy. Próba monografii historyczno-etnograficznej. У гэтай манаграфіі С.Крычынскага філалагічныя тэмы распрацоўваюцца перш за ўсё ў раздзеле VIII "Szkoły i księgi" (p. 211–227) і ў раздзеле IX "Mowa i pismo" (p. 228–240). Тут таксама арыгінальныя тэксты пераважна апісваюцца і толькі некаторыя прыводзяцца ў транслітарацыі.

[14] Гл.: Stankiewicz (1934).

[15] Гл.: Stankievič (1952).

[16] Гл.: Meredith-Owens / Nadson (1970).

арыенталізмы ў кітабе Брытанскага музея і іх сінтаксічнае ўжыванне[17]. На жаль, аб'ёмістая дысертацыя Акінэр "Рэлігійная лексіка беларускататарскага кітаба з Брытанскай бібліятэкі" ("The religious vocabulary of the British Library Tatar-Byelorussian Kitab") дагэтуль не была выдадзена. Яна змяшчае побач з грунтоўным даследаваннем лексікі кітаба таксама значныя транслітараваныя фрагменты тэксту[18].

У 1983 г. вучань А.К. Антановіча з Беларусі, Віктар Несцяровіч, напісаў працу па фразеалагізмах у рукапісах "літоўскіх" татараў[19]. Даследаванне, выкананае як дысертацыйнае пад кіраўніцтвам Антановіча, засталося неапублікаваным і таму невядомым у шырокіх колах*.

У сярэдзіне васьмідзесятых гадоў у Торуні выйшла на польскай мове напісанае Чэславам Лапічам даследаванне, прысвечанае аднаму кітабу[20]. Гэты грунтоўны лінгвістычны аналіз мовы кітаба суправаджаецца ў дадатку, на жаль, зусім кароткімі ўзорамі тэксту ў навуковай транслітарацыі.

З сярэдзіны дзевяностых гадоў славістка і беларусістка Галіна Александровіч-Мішкінене (Miškinienė) з Віленскага ўніверсітэта некалькімі публікацыямі зарэкамендавала сябе ў якасці сур'ёзнай даследчыцы і знаўцы літаратуры татараў Вялікага Княства Літоўскага. Мішкінене прапануе лінгвістычны аналіз рукапісаў у традыцыі Антановіча і свайго настаўніка, славіста і беларусіста В.Чэкмана (Čekmonas)[21]. Яе найноўшая публікацыя (Miškinienė, 2001) асвятляе найстарэйшыя захаваныя тэксты ад пачатку XVII ст.[22]

Да сённяшняга часу не існуе поўнага каталога рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага. Выдатныя манускрыпты рассеяныя па розных музеях і бібліятэках Вільні, Мінска, Санкт-Пецярбурга, Казані, Варшавы, Ляйпцыга альбо Лондана. Значная колькасць рукапісаў знаходзіцца ў прыватнай уласнасці татарскіх сем'яў, дзе яны перадаюцца ў спадчыну ад пакалення да пакалення**. Як правіла, гэтыя манускрыпты даступныя для навуковага даследавання толькі ў абмежаванай меры. Усё яшчэ незваротна страчваюцца рукапісы, часта з-за няўвагі альбо абыякавасці ў дачыненні да ісламска-татарскай спадчыны.

---

[17] Гл.: Akiner (1973, 1978).

[18] Гл.: Akiner (1980); экзэмпляр даследавання знаходзіцца ў распараджэнні Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лондане.

[19] Гл.: Нестерович (1983).

[20] Гл.: Łapicz (1986).

[21] Гл.: Мішкінене (1994); Мішкінене / Шупа (1995).

[22] Параўн. таксама агляд у Мішкінене (Мишкинене (2001), с. 29) і далей: 3. Из истории публикации текстов арабско-алфавитных рукописей. Параўн. таксама: Drozd (1999), wstęp.

* *[Па матэрыялах дысертацыі ў апошні час апублікавана манаграфія: Несцяровіч (2003) (заўвага рэд.).]*

** *[Апісанне некаторых рукапісаў, што знаходзяцца ў Літве, Беларусі і Польшчы, гл. у каталогах: Мишкенене (2005), Доўнар (1997), Ганчарова (2003), а таксама ў артыкуле І. Радзішэўскай: Iwona Radziszewska "Rękopisy tatarskie na Podlasiu" ў зборніку Orientas (2008), p. 138–143 (заўвага рэд.).]*

1.1.1. Катэгорыі рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага

У кітабістыцы звычайна вылучаюць наступныя катэгорыі рукапісаў: *тэфсіры*, *кітабы*, *хамаілы*, *дуалары* (*далавары*), *граматкі* і *гласарыі*[23].

Тэфсіры: ад ар. *tafsīr* = "тлумачэнне, экзегеза". Выкарыстанне тэрміна *tafsīr* "тлумачэнне Карана" ў адрозненне ад "перакладу" (ар. *tarǧama*) было абумоўлена ісламскім вучэннем пра "непараўнанасць Карана" (ар. *i'ǧāz al-qur'ān*) і, як вынік з гэтага, сцверджаннем пра неперакладальнасць моўнага цуду, якім з'яўляецца Каран. У тэфсірах "літоўскіх" татараў поўны арабскі тэкст Карана суправаджаецца падрадковым перакладам на польскую мову з экзегетычнымі каментарыямі, дапаўненнямі, парафразамі. Звычайна перад уласна каранічным тэкстам змяшчаюцца некалькі кароткіх уступных глаў, якія ўводзяць у чытанне Карана. Напрыклад, шырока распаўсюджаным з'яўляецца трактат з апісаннем рытуальнага чытання Карана над нябожчыкам[24].

Падрадковыя пераклады Карана – тэфсіры – займаюць цэнтральнае месца ў літаратуры татараў Вялікага Княства Літоўскага. З аднаго боку, яны ўяўляюць сабой аб'ёмістыя рукапісы[25], з другога – тэкст тэфсіра ў форме каранічных цытат[26] пранік ва ўсе іншыя рукапісы, перш за ўсё ў *кітабы*[27].

---

[23] Пра катэгорыі рукапісаў гл.: Антонович (1969), с. 1–50. Параўн., акрамя таго: Łapicz (1986), p. 66–68. Параўн. таксама: Kryczyński (1938), p. 211–228, і артыкул "Literatura religijna Tatarów litewskich i jej pochodzenie / Jakób Szynkiewicz in: Rocznik Tatarski, t. 2, 1935, p. 138–145. Параўн. таксама: Канапацкі / Смолік (2000), с. 202 і далей.

[24] Гл. >>> 17.1.1. Тэкст рукапісу **L**; 17.2.1. Тэкст рукапісу **I**; 17.3.1. Тэкст рукапісу **U**.

[25] Падрадковыя пераклады ў тэфсірах з аб'ёмам у сярэднім у 200 000 слоў уяўляюць сабою каштоўныя першакрыніцы XVIII–XIX стст. для польскіх і беларускіх моўных даследаванняў, якія, аднак, не атрымалі на гэты дзень належнай увагі.

[26] Гл. >>> 4. Каранічныя цытаты ў кітабах.

[27] Наконт тэфсіраў "літоўскіх" татараў гл.: Szynkiewicz (1935), p. 138: "Obecnie tefsiry stały się prawie unikatami i przechowują się w nielicznych rodzinach, jako relikwje. Trafiają się egzemplarze z w. XVIII. Ich tłumaczenie jest bardzo dobre, w duchu najlepszych komentatorów muzułmańskich, lecz niewiadomo, w jakiem stuleciu tłumaczenie to zostało dokonane."

Тэфсіры існуюць выключна ў форме рукапісаў. Наконт колькасці тэфсіраў, якія яшчэ захоўваліся перад Другой сусветнай вайной, Шынкевіч піша: "O ile Koranów i chamaiłów zachowało się jeszcze sporo, to kitabyw pozostało bardzo mało, po jednym – po dwa na każdą parafję, a co się tyczy tefsirów, to na całą Rzeczpospolitą znajdzie się nie więcej dziesięciu" (Szynkiewicz (1935), p. 140).

Першы поўны польскі пераклад Карана, надрукаваны лацінскім шрыфтам, з'яўляецца толькі ў сярэдзіне XIX ст. Ян Мурза Тарак Бучацкі, сам татарскага паходжання, падрыхтаваў свой польскі пераклад непасрэдна з арабскага арыгінала і, апроч таго, карыстаўся "літоўскімі" тэфсірамі. Разам з гэтым ён абапіраўся таксама на французскі пераклад Карана Казімірскага, які з'явіўся ў сярэдзіне XIX ст. (ад 1840 да 1856) у некалькіх выданнях. Ужо бацька Бучацкага на пачатку XIX ст. падрыхтаваў разам з татарскім святаром рукапісны польскі пераклад Карана, які, аднак, не быў надрукаваны. Гл.: *Buczacki* (1858), прадмова, p. III: "Nie można atoli wątpić, że między dość licznemi wyznawcami mahometanizmu w osiadłych oddawna w Polsce i dziś

Тэджвід: ад ар. *taǧwīd* = "мастацтва дэкламавання Карана". Часцей за ўсё гэта асманскатурэцкія трактаты пра карэктнае вымаўленне арабскіх фанем і карэктнае дэкламаванне Карана. Турэцкі тэкст мае адпаведны падрадковы пераклад на беларускую мову[28]. Адносна маленькія трактаты часта дадаюцца да *кітабаў*.

Кітаб: ад ар. *kitāb* = кніга. Кітабы ўяўляюць сабой сукупнасць тэкстаў разнастайнага зместу[29]. Такія рукапісы часта пачынаюцца генеалагічнымі табліцамі прарокаў, імамаў і ханаў. Адразу за імі ідуць тэксты па экзегезе Карана. Далей знаходзяцца катэхізісы з апісаннямі рытуалаў і асноўных абавязкаў мусульман, якія часта пераходзяць у маральнае настаўленне. Пры гэтым звычайна прыводзяцца цытаты з Карана і выслоўі прарока Мухамада (ар. *ḥadīṯ* = выказванне Прарока), каб праілюстраваць і абгрунтаваць настаўленне. Шмат месца займаюць апавяданні і займальныя гісторыі выхаваўчага зместу. Побач з імі знаходзяцца трактаты тэхнічнага характару, напрыклад пра правільнае вымаўленне арабскіх літар і карэктнае дэкламаванне Карана (ар. *taǧwīd*). Рэгулярна сустракаюцца таксама легенды рэлігійнага зместу, напрыклад пра смерць Марыі альбо пра размову Мухамада з д'яблам (*Šayṭān-nāme*). Шырока распаўсюджана

---

zupełnie z nami zrosłych językiem, uczuciem i obyczajami tatarskich rodzinach, tu i owdzie znalazłby się rękopiśmienny przekład wprost z oryginału. Taki właśnie przekład w pierwszych latach XIX wieku dokonany wspylnie podobno z jednym duchownym tegoż wyznania, przez ojca zgasłego niedawno Jana Murzy Tarak Buczackiego, podał mi pierwszą myśl podjęcia tego dawno oczekiwanego i niewątpliwie pożądanego dla literatury naszéj wydania".

Пасля нечаканай смерці Бучацкага (малодшага) праца над перакладам была даведзеная да канца польскім арыенталістам Уладыславам Касцюшкам. Нарэшце, у 1858 годдзе, пераклад выйшаў у Варшаве ў выдавецтве А. Навалецкага. Пра гісторыю варшаўскага выдання Карана гл. прадмову Навалецкага да перакладу Бучацкага (Buczacki (1858), p. I–X); таксама *Kryczyński* (1938), p. 226.

[28] Тыповы прыклад тэджвіда знаходзіцца пад шыфрам P98 у бібліятэцы Акадэміі навук Беларусі ў Мінску і апісаны ў Антановіча (Антонович (1968), с. 138–140).

[29] Наконт зместу кітабаў гл.: Szynkiewicz (1932), Woronowicz (1935). Інфармацыя пра змест некаторых кітабаў знаходзіцца ў Антановіча (Антонович (1968)). Апісанне зместу кітаба з Брытанскага музея ў Лондане (шыфр OR. 13.020), тыповага прадстаўніка гэтай катэгорыі рукапісаў, знаходзіцца ў Мэрэдыт-Оўэнс і Надсана (Meredith-Owens / Nadson (1970), p. 160–164). Пра гэты самы кітаб OR. 13.020 з Брытанскага музея піша Шырын Акінэр у сваіх працах, у кожнай з якіх змяшчаюцца ўзоры тэксту (Shirin Akiner (1973, 1978)). У неапублікаванай дысертацыі Акінэр (1980) пра рэлігійную лексіку кітаба OR. 13.020 прапануецца некалькі даволі аб'ёмістых транслітараваных фрагментаў тэксту. Акінэр таксама робіць спробу ідэнтыфікаваць арыентальныя прататыпы і крыніцы, якія маюць дачыненне да прыведзеных тэкстаў. Шырокае даследаванне кітаба здзейсніў Лапіч (Łapicz (1986)).

Поўнага выдання кітаба дагэтуль яшчэ не зроблена. У сярэдзіне XX ст. падобнае выданне планаваў Ян Станкевіч. Аднак гэта не было выканана. Навуковае выданне кітаба ва ўсёй яго паўнаце, зразумела, было б пажадана не толькі для славістаў і лінгвістаў, але таксама і для этнолагаў і рэлігіязнаўцаў. (Пра ўзор тэксту з кітаба OR. 13.020 з Брытанскага музея гл. таксама >>>

ў кітабах асманская *Міпаджж*-легенда (*Mi'rāğ-nāme*), у якой апісваецца начная вандроўка па небе (ар. *mi'rāg*) прарока Мухамада. Асманскатурэцкі тэкст адпаведна суправаджаецца падрадковым беларускім перакладам[30].

Хамаіл: ад ар. *ḥamala* = насіць. Форма *ḥamā'il* адпавядае арабскаму назоўніку множнага ліку. У турэцкай мове назоўнік *hamail* мае значэнне "амулет, талісман". У пісьменстве татараў Вялікага Княства Літоўскага пад тэрмінам *хамаіл* разумеюцца рукапісы малога фармату, якія можна насіць з сабой. Такія дапаможнікі змяшчаюць апісанні звычаяў, малітоўных рытуалаў і цырымоній (шлюбу, пахавання) для практычнага ўжывання ў штодзённым жыцці мусульман. Шмат месца займаюць малітоўныя выслоўі і зборы малітваў на арабскай і асманскатурэцкай (часам на чагатайскай) мовах. Тыповым для хамаілаў з'яўляецца, напрыклад, тэкст пра чытанне Карана ў гонар нябожчыка, які змяшчаецца як уводны раздзел у даследаваных тут рукапісах тэфсіраў[31]. Акрамя таго, да тыповага зместу *хамаілаў* належыць апісанне вырабу магічных пячатак (ар. *muhr*) і талісманаў[32].

Дуалар: ад ар. *du'ā'* (малітва), якое ўтварае множны лік з дапамогай цюркскага суфікса *-lar*: *du'ā'lar* = малітвы. Гэта падборкі малітоўных выслоўяў на арабскай мове, часам даволі аб'ёмістыя, якія ў форме скруткаў клаліся з нябожчыкам у магілу.

Граматкі: *граматкі* – талісманы ў форме маленькіх папяровых скруткаў, на якіх былі напісаныя арабскія малітвы і магічныя заклінанні і якія насілі з сабою.

Гласарыі: у пісьменстве татараў Вялікага Княства Літоўскага захавалася некалькі гласарыяў са спісамі слоў і кароткіх фраз на турэцкай і арабскай мовах з перакладам іх на беларускую[33].

Для дадзенага даследавання з'яўляецца дастатковым вылучэнне двух паняццяў:
(1.) Тэфсір, пад якім разумеецца выключна *падрадковы пераклад Карана*.
(2.) Кітаб, якім ахопліваюцца ўсе іншыя манускрыпты, якія не належаць да тэфсіраў (*тэджвіды*, *кітабы*, *хамаілы*, *дуалары*, *граматкі*, *гласарыі*).

17.5. Рукапіс кітаба **К**.) Апошнім часам Мішкінене апублікавала ў сваёй працы, прысвечанай найстарэйшым рукапісам татараў Вялікага Княства Літоўскага, вялікія фрагменты з двух кітабаў у транслітарацыі і з навуковым даследаваннем (Miškinienė (2001), p. 108–213).

[30] Тэкст беларускага перакладу падобнай *Міпаджж*-легенды выдаў Станкевіч у часопісе "Slavia" (Stankiewicz (1934)); гл. таксама >>> 17.5.1.7. З пачатку *Міпаджж*-легенды.

[31] Гл. >>> 17. Рукапісы.

[32] Тыповы ўзор хамаіла знаходзіцца ў Брытанскім музеі ў Лондане пад шыфрам OR.13.054. Кароткае апісанне гэтага манускрыпта даюць Мэрэдыт-Оўэнс і Надсан (Meredith-Owens / Nadson (1970), p. 159–160, 173). Гл. таксама: Антонович (1968), с. 93–94, 103–109, 131–136, 140–174. Параўн.: Miškinienė (2001), p. 214 – 262, з транслітараваным тэкстам з ляйпцыгскага хамаіла.

[33] Александровіч-Мішкінене і Шупа (1995) апублікавалі такі гласарый у транслітарацыі кірыліцай. Параўн. з гэтым таксама даследаванне падобнага гласарыя: Majda (1995).

1.1.2. Моўная праблема

Увогуле ў рукапісах татараў Вялікага Княства Літоўскага мы знаходзім тэксты на чатырох мовах: беларускай, польскай, арабскай і цюркскай.

Усходнія тэксты часта напісаныя з даволі сапсаванай арфаграфіяй, бо перапісчыкі не заўсёды былі дасведчаныя ў гэтых мовах. Славянскія тэксты ў большасці з'яўляюцца перакладамі з арабскіх і цюркскіх крыніц. Аднак залежнасць літаратуры "літоўскіх" татараў ад усходніх крыніц на гэты момант яшчэ недастаткова даследавана.

Але літаратура татараў Вялікага Княства Літоўскага – пераважна славянамоўная. Беларуская і польская мовы цалкам дамінуюць у рукапісах. Усходнія мовы сустракаюцца толькі ў форме ўстаўленых у славянскі тэкст цытат альбо ў тэкстах арабскіх ці цюркскіх арыгінальных твораў (Каран, *Мірадж*-легенда) з падрадковым перакладам і каментаром на польскай або беларускай мове.

Чыста беларускія або чыста польскія тэксты сустракаюцца вельмі рэдка. Побач з імі мы знаходзім пераважна мешанку з абедзвюх моў, якую можна характарызаваць як беларуска-польскую або як польска-беларускую ў залежнасці ад таго, якія моўныя рысы дамінуюць. Разам з тым у манускрыптах татараў можна заўважыць канкурэнцыю паміж польскай і беларускай мовамі, якая адлюстравала сітуацыю дыгласіі ў Вялікім Княстве Літоўскім, што асабліва моцна выяўляецца пачынаючы з XVI ст.

Пытанне пра ўдзельную вагу абедзвюх моў, беларускай і польскай, у пісьменстве "літоўскіх" татараў неаднаразова абмяркоўвалася ў навуковай літаратуры. Базавая па гэтай тэме гіпотэза была сфармуляваная Антановічам[34]. У цэнтры дыскусіі стаяла пытанне: якая з дзвюх моў (беларуская ці польская) была першапачатковай мовай перакладаў[35].

Паводле Антановіча, тэксты кітабаў перакладаліся з усходніх моў першапачаткова на беларускую мову. Антановіч робіць выснову, што толькі на другім этапе ўзніклі польскія тэксты з адпаведных беларускіх. У якасці доказу можна разглядаць польскія тэксты, для якіх на падставе моўных асаблівасцей цвёрда ўстаноўлена, што ў іх аснове ляжаць адпаведныя беларускія версіі[36]. З XVIII ст. у рукапісах кітабаў становіцца ўсё больш польскіх тэкстаў, і ў XIX ст. іх колькасць яшчэ павялічваецца. Гэты наступ польскіх тэкстаў у літаратуры "літоўскіх" татараў можна зразумець на падставе соцыялінгвістычных умоў у Вялікім Княстве Літоўскім, дзе з XVI ст. польская мова ўсё больш

---

[34] Гл.: Антонович (1968), с. 19 і далей.

[35] Гл.: Антонович (1968), с. 22: "Очень интересным и чрезвычайно важным с научной точки зрения является и вопрос о том, который из двух названных нами языков – белорусский или польский – первым был использован для перевода восточных текстов".

[36] Гл.: Антонович (1968), с. 23: "Так, напр., с уверенностью можно сказать, что многие польские тексты китаба ВЭМ-13 /1868 г./ являются переводами с белорусского языка".

пашыралася і ў канцы XVII ст. выцесніла беларускую мову з афіцыйнага і літаратурнага ўжытку[37].

Гіпотэза, сфармуляваная Антановічам на падставе рукапісаў кітабаў, па аналогіі была перанесеная і на тэфсіры. Але мова ўсіх вядомых "літоўскіх" тэфсіраў польская, і дагэтуль не выяўлена ніводнага тэфсіра, пераклад якога можна было б лічыць беларускім. Аднак мы знаходзім у кітабах цытаты з Карана на беларускай мове, якія тэкстуальна супадаюць з адпаведнымі перакладамі ў тэфсірах. Гэты факт разглядаецца як ускосны доказ на існаванне першапачатковага беларускага тэфсіра, які, хаця на сёння і страчаны, аднак пакінуў свае сляды ў кітабах у форме цытат[38].

Гэтаму распаўсюджанаму палажэнню супрацьпастаўляецца пункт гледжання, які па-іншаму тлумачыць размеркаванне польскай і беларускай моў, выяўленае ў пісьменстве "літоўскіх" татараў. На падставе захаваных рукапісаў можна прынцыпова вызначыць дакладнае моўнае адрозненне паміж тэфсірамі і кітабамі. Тэфсіры напісаны на польскай мове. У іншых рукапісах – кітабах, наадварот, дамінуе беларуская мова, і нават тэксты, якія здаюцца польскімі, у кітабах моцна беларусізаваныя.

Гэта – моўнае размежаванне паміж тэкстамі, свядома падзеленымі на два віды. Пераклад і тлумачэнне Карана, слова Бога, робіцца на больш узвышаную

---

[37] Згодна з гэтай гіпотэзай Антановіча (Антонович (1968)) выказваецца таксама Дзямідчык (Демидчик (1987), с. 241): "Есть все основания считать, что на польский язык переводы осуществлялись с белорусского. После крушения Литовского Княжества, официальным языком которого был русско-белорусский язык, власть в государстве перешла к польским королям. Часть мусульман, для которых белорусский язык уже стал родным, литературным, книжным, оказалась в зоне активной полонизации, и поэтому возникла необходимость перевода всех текстов и на польский язык. Более того, мусульмане Белоруссии и Польши, связанные единством общины, создали среднебелорусско-польский язык, который акад. Е.Ф.Карский описал следующим образом: человек, пишущий на этом языке, говорит и думает по-белорусски, но старается писать на польском (Карский Е.Ф. Белорусская речь арабским письмом. – Белорусы, т. 3, ч. 2. Пг., 1921, с. 1–2). Эту же характеристику принял и И.Ю. Крачковский (Крачковский И.Ю. Рукопись Корана в Пскове. Избр. соч. Т. 1, М.; Л., 1955, с. 165)".

Апошнім часам такую ж пазіцыю наконт моўнай праблемы займаюць Канапацкі і Смолік (2000, с. 211).

Антановіч заўважае, што для канчатковага высвятлення яго гіпотэзы патрэбна шырокае вывучэнне з сістэмным параўнаннем тэкстаў і лінгвістычным аналізам, а таксама метадамі тэксталогіі. Праўда, такія даследаванні дагэтуль не зробленыя.

[38] Гл.: Антонович (1969), с. 19: "Хотя полного текста Корана с подстрочным его переводом на белорусский язык до сих пор не обнаружено, однако имеется основание полагать, что такой перевод в прошлом существовал. Об этом красноречиво свидетельствует наличие в некоторых китабах больших отрывков текста Корана на белорусском языке. Эти тексты очень часто используются в качестве цитат во многих китабах".

Пра дэталёвае абмеркаванне каранічных цытат у кітабах гл. >>> 4. Каранічныя цытаты ў кітабах.

і шляхетную ў Вялікім Княстве Літоўскім XVI ст. мову – польскую. Наадварот, у кітабах знаходзяцца тэксты, якія выкарыстоўваюцца пры агульным настаўленні вернікаў; часта яны апісваюць ісламскую рэлігію і рытуалы ў даволі спрошчаным выглядзе. Гэтыя тэксты напісаныя на беларускай мове.

Пісьменства "літоўскіх" татараў, карані якога трэба шукаць у другой палове XVI ст., было, такім чынам, ад пачатку двухмоўным, і ўжыванне польскай або беларускай мовы было абумоўлена соцыялінгвістычнымі фактарамі. Сітуацыя дыгласіі ў Вялікім Княстве Літоўскім на той момант (у другой палове XVI ст.) ужо выразна праявілася.

З прычыны моўна-культурнай паланізацыі беларуская мова ў кітабах усё больш выцяснялася польскай.

Сфармуляваны тут тэзіс не супярэчыць прынцыпова назіранням Антановіча. Аднак няма неабходнасці пастуляваць існаванне "страчанага" Карана-тэфсіра на беларускай мове. Гэта здаецца надзвычай праблематычным, каб кніга ў аб'ёме Карана першапачаткова перакладалася на беларускую мову і потым з яе на польскую. Такі пераклад нічога б не прынёс, бо татары разумелі абедзве мовы – беларускую і польскую.

1.2. "Альхаміяда"-літаратура

Характэрная асаблівасць рукапісаў "літоўскіх" татараў палягае ў выкарыстанні выключна арабскага пісьма таксама для польскіх і беларускіх тэкстаў. Адаптацыя арабскага пісьма да беларускай і польскай моў надзіва добра ўдалася і выклікае захапленне, бо яна здаецца вынікам свядомага аналізу, які *яўна* абапіраецца на дакладнае веданне фаналагічнай сістэмы беларускай, польскай, асманатурэцкай і арабскай моў[39].

Тым самым пісьменства татараў Вялікага Княства Літоўскага ў еўрапейскім кантэксце ўключаецца ў шэраг падобных літаратур, якія звычайна аб'ядноўваюцца тэрмінам *альхаміяда* (Aljamiado), што паходзіць з іспанскай мовы.

Выразам *al-'aǧamīya* (варварства)[40] андалускія арабы абазначалі раманскія дыялекты туземнага насельніцтва Іберыйскага паўвострава. Арабскі выраз *al-'aǧamīya* ўвайшоў у іспанскую мову ў форме *aljamīa*. З канца Сярэднявечча гэтым тэрмінам пазначаецца раманская мова іспанскіх *мустарыбаў*[41], запісаная арабскім пісьмом. Надалей абазначэнне *альхаміяда* ўжывалася ў дачыненні да запісаных арабскай графікай іспанскамоўных помнікаў[42].

---

[39] Гл. >>> 9. Ужыванне пісьма.

[40] Ар. *'aǧamīya* з'яўляецца абстрактным паняццем, якое выводзіцца з ар. *'aǧam* = персы, варвары, незразумелая мова. Параўн.: EI-2 слоўнікавы артыкул 'ADJAM.

[41] Абазначэнне паходзіць ад ар. *musta'rib* = той, хто арабізуецца. Параўн. таксама: EI-2 слоўнікавыя артыкулы MOZARAB і MORISCOS.

[42] Гл.: EI-2 слоўнікавы артыкул ALJAMIADO.

Адным з першых, хто перанёс паняцце *альхаміяда* таксама і на славянскія моўныя помнікі ў арабскай графіцы, з'яўляецца баснійскі вучоны *Фехім Байрактаравіч* (Fehim Bajraktarević) (1889–1970); ён шмат зрабіў дзеля таго, каб адносна баснійскага арабскаграфічнага пісьменства ўкаранілася абазначэнне "*alhamijado književnost*"[43].

Узнікненне і баснійскай альхаміяда-літаратуры, і літаратуры "літоўскіх" татараў, таксама славянамоўнай, шчыльна звязана з гісторыяй Асманскай імперыі. Нягледзячы на тое што абедзве літаратуры ўзніклі прыблізна ў той самы час, у другой палове XVI ст., яны паходзяць з зусім розных гістарычных і соцыякультурных умоў.

1.2.1. Боснія

На Балканах у ходзе асманскага заваявання з сярэдзіны XIV ст. туземныя, перш за ўсё славянскія, народы, якія падпалі пад асманскае панаванне, атурэчваліся і ісламізаваліся. Гэта вяло да запазычванняў з турэцкай ісламскай культуры і прыняцця арабскага пісьма ісламізаванымі славянскімі падданымі.

Як вынік у Босніі развівалася ісламская літаратура на славянскай, баснійскай, мове арабскім пісьмом. Акрамя таго, гэтая літаратура ў ходзе развіцця набывала самастойную дынаміку. На першым этапе баснійская альхаміяда-літаратура складалася амаль выключна з паэтычных і лірычных твораў. На раннім этапе ў любоўнай лірыцы свецкага характару выразна праяўляліся літаратурныя ўплывы з Далмацыі і Дуброўніка. У ходзе далейшага развіцця яна ўсё больш прасякаецца арыентальнымі элементамі[44].

---

[43] Гл. Nametak (1981), p. 7: "Naziv je španjolskog porijekla (j = h) sa arapskim članom "al', i naziv alhamijado danas je općenito prihvaćen. Kod nas je ovaj naziv novijeg datuma i prvi ga je upotrebio dr Fehim Bajraktarević (Fehim Bajraktarević: Srpska pesma o Muhamedovu rođenju. Glasnik Skopskog naučnog društva, III/1928. str. 189–202)". Параўн.: Lehfeldt (1969), p. 4; Balić (1992), p. 271 f.

[44] Найстарэйшы з захаваных баснійскіх *альхаміяда*-тэкстаў – гэта любоўны верш "*Hirvat Türkisi*", напісаны *Мехметам Эрдэльяцам* (Mehmet Erdeljac) у 1588 г.; гл.: Nametak (1981), p. 6 (у факсіміле) і p. 58 у лацінскай транслітарацыі і сучаснай арфаграфіі; параўн.: Lehfeldt (1969), p. 25 f.

Nametak (1981), p. 10: "Za nas je veoma važna činjenica što svojim počecima u XVI i u početku XVII stoljeća sačuvani primjerci pjesama *Hirvat türkisi* od Mehmeda Erdeljca i *Nuto moje čuda i ljute nevolje* od nepoznatog autora dokazuju da su bila prisutna književna strujanja iz Dubrovnika i Dalmacije u Bosnu, posebno petrarkističke lirike, na koju ove dvije pjesme i tonom i formom i osobito leksikom živo podsjećaju. / Zašto ova tradicija ljubavne lirike nije produžena i zašto se u kasnijim stoljećima ne nailazi na sličnu podudarnost naše alhamijado poezije sa dubrovačko-dalmatinskim pjesništvom XVII i poznijih stoljeća razlog, po našem mišljenju, leži u tome što je islamizacija bosanskohercegovačkog

Празаічныя тэксты ўзнікаюць, відавочна, толькі на больш познім этапе, пераважна ў XVIII ст. Большай часткай яны ўяўлялі сабою простыя тэксты з маральнымі і рэлігійнымі павучаннямі, апісаннямі рытуалаў, але таксама *меўлюды*[45] і тэксты на падобныя тэмы, часам апакрыфічнага зместу. Часта

---

stanovništva donekle djelovala u pravcu odvajanja od svjetovnih tema, pa prema tome i od ljubavnih, upućujući na orijentalne izvore i posebice favoriziranjem obrazovanja na orijentalnim jezicima. Mada orijentalna književnost dosta često obradjuje i ljubavne motive, kod nas je ljubavna poezija, dobrim dijelom, ostala van interesa orijentalno obrazovanih ljudi. Ukoliko su ovi ljudi i pjevali o temu ljubavi na narodnom jeziku, oni su u jezik unosili toliko orijentalnih izraza da su njihove pjesme postale bilingvalne i izgledaju više kao ljubavne pjesme na turskom nego našem jeziku. Kao primjer može nam poslužiti pjesma *Čok severim džānum sèni* (Mnogo te volim, dušo moja), u kojoj je skoro svaka prva polovica distiha na turskom, jako su se turcizmi lako mogli zamijeniti odgovarajućim riječima našega jezika, a da se naruši ni ritam pjesme, ni krepkoća izraza, data turskim riječima".

Баліч, які даў кароткую ацэнку баснійскай *альхаміяда*-літаратуры (Balić (1992), p. 271–292) у сваім усебаковым апісанні культуры баснійцаў, вельмі вартым, каб быць прачытаным, заўважае: "*Альхаміяда*-паэзія ў яе большай, дыдактычна-эвакатыўнай частцы абавязана ўзнікненнем усведамленню сваёй місіі. *Альхаміяда*-паэты – гэта пераважна менавіта рэлігійныя людзі: кадзі, веранастаўнікі, дэрвішы. Яны патрыятычныя і добра ведаюць грамадскія праблемы свайго часу. У Каране існуе асноўнае настаўленне пра паводзіны: "І каб была з вас абшчына, якая заклікае да дабра, загадвае ўхваленае і забараняе няўхваленае" (3:104). Гэтага прынцыпу мусілі ўсвядомлена прытрымлівацца выразнікі народнага ісламу. Учынкі ў духу гэтага ўказання часам мусілі здавацца "рэвалюцыйнымі". Таму пануючы лейтматыў *альхаміяда*-паэзіі звязаны з маральным уздымам грамадства" (Balić (1992), p. 271).

Далей, на с. 272, Баліч заўважае: " У Босніі *альхаміяда*-літаратура разгортвалася на працягу асманскага ўладарання (1463–1878). Яе мова заўсёды абазначалася аўтарамі як баснійская. Яна была перамешана з турэцкімі, арабскімі і персідскімі словамі і звярталася да простых людзей у гушчы свайго сацыяльнага атачэння (на ваеннай службе, у рэлігійнай пачатковай школе, на базары). З прычыны гэтага і праз свой змест яна была аўтэнтычным выказваннем духоўных плыняў у мусульман і часта таксама адлюстраваннем пануючых грамадскіх умоў. Праз гэтую літаратуру, асабліва праз паэзію, ісламскія містыкі – сапраўдныя рухаючыя сілы ісламізацыі і аўтарытэтныя суддзі ў рэлігійных і ідэалагічных спрэчках – давалі народу парады, умацоўвалі рэлігійную і палітычную свядомасць, дапамагалі ў цяжкім становішчы, крытыкавалі заганы грамадства, пасярэднічалі ў надзвычайных сітуацыях і выяўлялі свой душэўны настрой. Найважнейшай адметнай рысай зместу гэтай літаратуры, якая складалася пераважна з паэзіі, з'яўляецца непасрэдная суаднесенасць з жыццём. Падхопліваюцца і распрацоўваюцца розныя тэмы з жыцця простых людзей, у большасці выпадкаў з мэтай маральнага настаўлення. Больш каштоўную частку *альхаміяда*-літаратуры стварае медытатыўная і рэлігійная, а таксама любоўная лірыка. Гэтая сфера літаратуры, зразумела, сацыяльна не ангажаваная. Яе творцамі поруч з рэлігійнымі дзеячамі з'яўляюцца прадстаўнікі іншых грамадскіх груп: салдаты (Мехмет з Трансільваніі), студэнты (Фейзо Софта, Магір-Софта) і жанчыны (Уміхана Чувідзіна)".

[45] Цюрк. *mevlût* ад ар. *mawlūd* = народжаны. Размова ідзе пра хвалебную паэзію ў рыфмаванай прозе і вершах у гонар нараджэння прарока Мухамада, якія выконваюцца кожны год 21 рабі'і аль-аўаля пад час свята – дня нараджэння Прарока.

такія празаічныя тэксты былі перакладам з арабскіх, персідскіх і галоўным чынам турэцкіх крыніц[46]. У параўнанні з літаратурай татараў Вялікага Княства Літоўскага вартай увагі з'яўляецца адсутнасць уласнага баснійскага перакладу Карана[47].

Да канца XIX ст. не існавала аднастайнай, паслядоўнай арфаграфіі для арабскага пісьма баснійскай *альхаміяда*-літаратуры[48]. Толькі напрыканцы XIX ст. была зроблена спроба рэформы пісьма і арфаграфіі (Arebica)[49]. Баснійская *альхаміяда*-літаратура складалася да самага XX ст. з манускрыптаў, а з пачатку XX ст. таксама і з друкаваных выданняў. Аднак ужо ў 1941–1942 гг. друкаванне публікацый у баснійска-арабскім алфавіце спынілася.

---

[46] Гл.: Nametak (1981), p. 35: "Početak prozne alhamijdo književnosti pada znatno kasnije od poezije. Koliko smo do sada mogli ustanoviti, prvi prozni tekst zabilježen je 1171. godine po Hidžri (1757/58) sa jednim naslovom Sène 1171 (Godina 1171) – traktat sa moralnim poukama o lijepom vladanju i o vjerovanju. / Dok u poeziji nailazimo na raznolikost tema, prozna književnost je veoma jednoobrazna u svom osnovnom cilju: naučavanju vjere, njenih dogmi i obreda, te moralno-duhovnih pouka. U vezi s tim nailazimo i na takve tekstove koji ne stoje u tijesnoj vezi s islamom, prije bi se reklo da, i pored moralno-vjerske pouke, oni imaju karakter apokrifne književnosti. To osobito važi za tekst *Hâzā muhábbet bu dir* (Ovo je razgovor) u kome se razgovoru vjerovjesnika Muhameda sa njegovim drugovima o tome koje tri stvari svaki od njih najviše voli (u jednom tekstu je "najvoli") priključuju andjeli, pa i sam Bog, čime se ličnosti andjela i Boga konkretizuju, što je u očiglednoj suprotnosti sa islamskim vjerovanjem".

[47] Наколькі магчыма бачыць і як вынікае з дапаможнай літаратуры, у баснійскай альхаміяда-літаратуры не існуе перакладаў Карана, якія маглі б параўнацца з "літоўскімі" тэфсірамі. Першы сербскахарвацкі пераклад Карана быў зроблены толькі ў канцы XIX ст. Мічо Любібрацічам (*Mićo Ljubibratić*) з французскага перакладу: "Prvi prevod Kurana na srpskohrvatski jezik, štampan u Beogradu 1895, načinio je Mićo Ljubibratić prema francuskom prevodu" (гл.: *Enciklopedija Jugoslavije* слоўнікавы артыкул *Koran*; гл. таксама: Binark / Eren (1986), p. 397).

[48] Лефельт даказвае, што ўжыванне пісьма ў асобных рукапісах пазбаўлена адзінства і нават унутры аднаго і таго ж рукапіса вельмі непаслядоўнае (Lehfeldt (1969)).

Параўн. таксама: *Lehfeldt* (1989) як (адзіночны) прыклад добрай адаптацыі арабска-турэцкага пісьма да паўднёваславянскай мовы. Манускрыпт, даследаваны Лефельтам, з'яўляецца шмат у чым цікавым. Ён змяшчае звычайны вучэбны тэкст на арабскай мове. Да арабскага тэксту арыгінала побач з персідскім перакладам таксама дадаюцца пераклады на грэчаскую і сербскую мовы ў арабскай графіцы. Рукапіс узнік не ў Босніі, а пры двары султана і пры тым ужо ў даволі ранні перыяд. Узнікненне рукапісу, напэўна, належыць аднесці да часу праўлення султана Баязіда II (1481–1512), які пакінуў на манускрыпце сваю пячатку. Але магчыма, што ён быў зроблены яшчэ раней, у час праўлення Мехмеда II (1451–1481), заваёўніка Канстанцінопаля. Тым самым гэты сербскі альхаміяда-тэкст узнік роўна на сотню гадоў раней, чым найстарэйшы з вядомых баснійскіх тэкстаў, любоўны верш *Hirvat Türkisi* (1588). Рукапіс паказвае цікавасць да балканскіх моў, сербскай і грэчаскай, якая існавала ў XV ст. пры двары султана. Адначасова манускрыпт падкрэслівае таксама значнасць, якую набывала сербская мова ў XV ст. як больш важная мова на заваяваных балканскіх землях.

[49] Ужыванне арабскага пісьма для баснійскай мовы напрыканцы XIX ст. было аформлена ў арфаграфію Раісам аль-уляма Мехмедам Джэмалюдзінам Чаўшэвічам (*Ra'īs al-'ulamā' Mehmed Džemaludin Čaušević*) і Хамдыям Мулічам (*Hamdija Mulić*) з псеўданімам Ата Нэрчэс (*Ata*

Поруч з *альхаміяда*-літаратурай нямала мусульманскіх вучоных з Босніі пісалі таксама творы на турэцкай, персідскай і арабскай мовах, уплыў якіх выходзіў за вузкія межы іх радзімы і меў значэнне для ўсёй ісламскай прасторы[50].

1.2.2. Вялікае Княства Літоўскае

У Вялікім Княстве Літоўскім татарскія згуртаванні як цюркскія, мусульманскія меншасці жылі ізалявана ад Асманскай імперыі і ад ісламскага рэгіёна ў хрысціянскім абкружэнні. Яны страцілі сваю родную цюркскую мову і асімілявaліся ў сферы мовы са сваім славянамоўным навaколлем. Каб захаваць сваю ісламскую веру, татары развівалі культуру перакладу, якая канцэнтравалася перш за ўсё на перакладзе рэлігійных тэкстаў на новую родную мову – беларускую альбо польскую. У адрозненне ад баснійскай літаратуры ў літаратуры татараў Вялікага Княства Літоўскага не праяўляецца імкнення да самастойнага літаратурнага развіцця. Сапраўдная паэзія і лірыка не адыгрывала ў ёй істотнай ролі[51]. У цэнтры ўвагі гэтай літаратуры знаходзяцца хутчэй дыдактычныя празаічныя тэксты, каментары да арабскіх і цюркскіх твораў і іх падрадковыя пераклады. Даволі вузка абмежаваны набор тэкстаў і рукапісаў на працягу стагоддзяў капіюецца і звяраецца з арыгіналам. Адпаведна з гэтым аднолькавыя тэксты часта паўтараюцца ў розных рукапісах і паказваюць у кожным разе адхіленні праз дыялектныя асаблівасці. У акрэсленым аб'ёме традыцыя ручной рэпрадукцыі рукапісаў працягвала сваё існаванне да новага часу[52]. У літаратуры "літоўскіх" татараў не існуе друкаваных выданняў араб-

---

Nèrćes) (гл.: Balić (1992), p. 337, 339 f.; Nametak (1981), p. 40, 43.). Устаноўленым імі баснійскім алфавітам (т. зв. "*арэбікай*") друкаваліся кнігі і публікаваліся альманахі. Паводле Баліча, арэбіка выкарыстоўваецца яшчэ сёння ў перапісцы і вывучаецца ў мусульманскіх пачатковых школах (Balić (1992), p. 361–362). Параўн. таксама з назіраннямі Лефельта (Lehfeldt (1969), p. 53, 54).

[50] Агляд укладу баснійскіх вучоных у ісламскую культуру ў цэлым прапануе Баліч (Balić (1992)).

[51] Паэтычныя творы згадваюцца ў Дзямідчыка (Демидчик (1987), с. 243): "Судя по «Библиографическим заметкам» Л. Кричинского, Али Воронович готовил к изданию религиозную поэзию белорусских мусульман, но, видимо, она так и не была издана. Л. Кричинский подтвердил наличие поэтических произведений в рукописях и материалов, касающихся истории белорусских мусульман". (Дзямідчык спасылаецца на кнігу: L.N.M.Kryczyński. Bibliografia do historii Tatarów polskich. Zamość, 1935.)

У Варановіча прыводзяцца вершы з кітаба ў лацінскай транслітарацыі, у якіх згадваецца польскі паэт Ян Каханоўскі (1530–1584) (Woronowicz (1935), p. 389 ff.)

Хаця яшчэ не існуе поўнага каталога рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага, аднак з упэўненасцю можна казаць, што паэтычныя творы ў іх пісьменстве татараў адыгрывалі падпарадкаваную ролю і што ніводнага з іх нельга паставіць нароўні з баснійскімі паэтычнымі тэкстамі.

[52] Гл.: Łapicz (1986), p. 69: "Kopiowanie ksiąg religijnych trwało do czasyw obecnych. W 1979 r. zmarł ostatni kopista – Lut Muchla, były imam parafii w Dowbuciszkach. Wcześniej oglądałem jego warsztat pracy i słuchałem objaśnień dotyczących techniki i zasad przepisywania. Oglądałem

скім шрыфтам[53]. Калі зноў параўнаць з баснійскай *альхаміяда*-літаратурай, то варта згадаць даволі паслядоўнае ўжыванне ў літаратуры "літоўскіх" татараў арабскага пісьма з характэрнай арфаграфіяй[54].

1.3. "Альфуркан татарскі"

"*Альфуркан татарскі*" ("Alfurkan tatarski") – гэта назва палемічнага твора, які з'явіўся ў 1616 г. у Вільні на польскай мове[55]. Ён быў напісаны аўтарам з псеўданімам Пётр Чыжэўскі (Piotr Czyżewski). Сапраўдная асоба аўтара невядомая. Уважлівае прачытанне тэксту дазваляе, паводле Тышкевіча (1989), зрабіць выснову, што аўтар належаў да дробнай шляхты і, напэўна, атрымаў каталіцкую, магчыма, езуіцкую адукацыю. Акрамя таго, ён быў таксама добра дасведчаны ў судовых і юрыдычных пытаннях[56].

---

także zbiór jego ksiąg religijnych, wraz z chamaiłem, który pierwotnie należał do jednego z ostatnich pielgrzymów tatarskich z Litwy do Mekki – Aleksandra Iliasewicza".

Параўн.: Meredith-Owens / Nadson (1970), p. 150 : "Kanapacki relates that in 1966 there still lived in Bieŭastok (Biaŭystok, now in Poland) the last of the Tatar copyists, the former mullā of the Daubuciški mosque *Lut Muchla*. He even grew saffron required in the preparation of a special ink".

Szynkiewicz (1935) звяртае ўвагу на тое, што ў пісьменстве "літоўскіх" татараў існуюць таксама манускрыпты ў кірылаўскім пісьме: "W Muftiacie w Wilnie przechowuje się kilka egzemplarzy chamaiłów, pisanych literami rosyjskimi. Ten rodzaj chamaiłów ukazał się przed samą wojną w bardzo małej ilości i wyróżnia się tem, że nietylko objaśnienia obrzędów są napisane w języku rosyjskim, lecz i tekst arabski modlitw i cały 36-ty rozdział Koranu (Ja-sin) transkrybowany literamy rosyjskiemi. Większą część tych chamaiłów napisał imam Szehidewicz z Łowczyc (koło Nowogródka) dla inteligentnych Tatarów, którzy zapomnieli czytać po arabsku, a pragnęli pozostać pobożnymi muzułmanami".

[53] У XIX ст. было надрукавана некалькі прац на польскай мове па ісламскай рэлігіі, створаных "літоўскімі" татарамі; так, напр., уводзіны ў ісламскую рэлігію Юзэфа Сабалеўскага "Wykład wiary mahometańskiej czyli islamskiej" (Wilno, 1830), у якіх змяшчаліся вытрымкі з Карана і з выслоўяў прарока (ар. *ḥadīṯ*); альбо пераклад Карана Бучацкага (J.M.T. Buczacki (1858)). Паводле Шынкевіча, у публікацыі Сабалеўскага былі ўключаны тэксты з хамаілаў і кітабаў у лацінскай транслітарацыі (Szynkiewicz (1935), p. 140).

[54] Сувязь альбо ўзаемны ўплыў паміж ужываннем пісьма "літоўскімі" татарамі і баснійскімі мусульманамі можна выключыць, што паказваюць даследаванні Антановіча (Антонович (1968)) і Лефельта (Lehfeldt (1969, 1989)).

[55] "Alfurkan tatarski prawdziwy na czterdzieści części rozdzielony, który zamyka w sobie początki tatarskie i przygnanie ich do Wielkiego Xięstwa Litewskiego; przez Piotra Czyżewskiego, któremu Alejewicz Tatarzyn z Waki ojca zabił zebrany i do druku podany Wilno, 1617."

Як вынікае з падзагалоўка твора, бацька аўтара быў забіты нейкім татарынам па імені Алеевіч з мястэчка *Вака*. Гэта паказвае, што аўтар, відавочна, меў асабістыя матывы для складання памфлета.

Апісанне зместу твора "Альфуркан татарскі", забяспечанае навуковым каментаром, дае Насоўскі (Nosowski (1974), t. 1, p. 151–168).

[56] Гл.: Tyszkiewicz (1989), p. 291: "Dokładne przeczytanie tekstu *Alfurkanu tatarskiego* pozwala mniemać, że autorem był niezamożny szlachcic w służbie jakiegoś senatora, dobrze

Першае выданне гэтага твора, якое таксама з'явілася ў 1616 г. з крыху іншай назвай – "*Алькаран татарскі*" ("Alkoran tatarski"), не захавалася[57]. Змена назвы з "*Alkoran tatarski*" на "*Alfurkan tatarski*"[58] – хутчэй за ўсё з'яўляецца свядомым скажэннем і дазваляе прызнаць за аўтарам пэўнае веданне ісламскай тэрміналогіі. Падставу для замены "*Alkoran*" на "*Alfurkan*", магчыма, трэба шукаць у пэяратыўным эфекце, які аўтар хацеў выклікаць у польскамоўнага чытача. Слова "*Alfurkan*" у гэтага чытача, не дасведчанага ў арабскай мове, непазбежна выклікае асацыяцыю з утвораным ад дзеяслова *furkać* назоўнікам *furkanie* (шум, гудзенне, фырканне, пырханне). Назва "*Alfurkan tatarski*", альбо "Татарскі шум (гудзенне, фырканне)" змяшчае, такім чынам, негатыўную ацэнку.

Гэты твор пад новай назвай "*Alfurkan tatarski*" яшчэ тройчы перавыдаваўся ў наступных гадах, а менавіта ў 1617, 1640 і 1643.

Як дае зразумець назва "*Алькаран татарскі*", або "*Альфуркан татарскі*", твор мусіць уяўляць сабою рэлігійную палеміку. Аднак разважанні дагматычнага і тэалагічнага характару, сапраўдная і дыферэнцыяваная дыскусія з ісламскай рэлігіяй і Каранам, якія быццам падразумявае назва, не знаходзяцца ў цэнтры ўвагі. Твор мае хутчэй характар пасквіля. Аўтар з запалам абвінавачвае "літоўскіх" татараў ва ўсіх магчымых распустах і грахах, як разбой, ліхвярства, махлярства, клятвапарушэнне, п'янства, пярэлюб, блюзнерства, знахарства,

---

zorientowany w sądach ziemskich i trybunalskich, być może wychowanek jezuityw pochodzący z Mazowsza".

Параўн. таксама: Sobczak (1984), p. 105: "Niektórzy z historyków wyrażają pogląd, że twórcą *Alfurkanu tatarskiego* był jeden z kanoników wileńskich".

Гэтае палажэнне абараняе ў розных публікацыях пераважна польскі гісторык П. Бараўскі, аднак не вызначае, на чым грунтуецца яго меркаванне; гл., напр., Borawski (1986), p. 74: "W 1616 roku jeden z członków kapituły wileńskiej, kryjący się pod pseudonimem Piotra Czyżewskiego napisał paszkwil na litewskich muzułmanów, zatytułowany *Alfurkan tatarski*".

[57] Пра гісторыю выдання твора гл.: Sobczak (1984), p. 106, заўвага 166): "Pierwotnie w 1616 r. paszkwil antytatarski Czyżewskiego miał się ukazać pod nieco zmienionym tytułem jako *Alkoran tatarski*. [...] *Alkoran tatarski* nie dochował się do naszych czasów. Znany on jednak był A. Brücknerowi (A. Brückner, Z teki bibliograficznej, VII, Volumina miscellanea, "Pamiętnik Literacki" R. III, 1904, s. 86–87; także Dzieje kultury polskiej, t. II, Kraków 1906, s. 425)". Параўн. у Мухлінскага (Мухлинский (1857), с. 33), які датуе першае выданне твора "Альфуркан татарскі" 1616 годам.

Параўн. таксама звесткі пра гісторыю выдання твора "Альфуркан татарскі" ў Крычынскага (Kryczyński (1938), p. 27, заўвага 106): Pełne tytuły trzech wydań 'Alfurkanu' (1617, 1640 i 1643) podaje *Estreicher*, Bibliografia polska, XIV, 589–590. Tytuł 'Alkoranu' z r. 1616 (wydanego pod pseudonimem Matiasza Czyżewskiego) podaje odkrywca tego paszkwilu *Al. Brückner*, Z teki bibliograficznej. VII. Volumina miscellanea. Pamiętnik Literacki. R. III, 1904, s. 86 – 7. *Tenże*, Dzieje kultury polskiej, T. II. Kraków, s. 425. Prof. *Brückner* podaje, że cytowany egzemplarz 'Alkoranu', prawdopodobnie unikat, znajduje się w zbiorach hr. Baworowskiego. Niestety, egzemplarza tego w zbiorach Biblioteki Baworowskich we Lwowie nie udało mi się odszukać. Estreicher książki tej nie zna. Paszkwil powstał na tle procesów klasztoru benedyktynów w Starych Trokach z Tatarami z Waki".

[58] Ар. *al-furqān* = (літар.) "адрозніванне" [дабра ад зла, ісціны ад хлусні – *заўв. перакл.*]; гэты тэрмін у арабскай мове часта ўжываецца як абазначэнне для Карана.

чараўніцтва і магія[59]. Наконт іх рэлігіі аўтар папракае татараў, што яны імкнуліся да пашырэння ісламу ў Вялікім Княстве Літоўскім. Акрамя таго, яны не трымаліся прадпісанняў Карана, які яны ўважаюць за святую кнігу. Далей аўтар нагадвае татарам пра іх прывілеі, якія яны атрымалі ад князёў і каралёў, нягледзячы на тое, што першапачаткова прыйшлі сюды як палонныя[60].

Твор "*Альфуркан татарскі*" сваёй палемікай прынцыпова накіраваны супраць мусульманска-татарскага насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага і даходзіць да патрабавання схіліць мусульманскую меншасць у каталіцтва альбо выгнаць татараў з краіны.

Цікава тое, што аўтар пасквіля, Пётр Чыжэўскі, стараецца свае папрокі і сваю крытыку татараў абгрунтоўваць цытатамі з Карана. Узнікае пытанне, з якой крыніцы Чыжэўскі пачарпнуў прыведзеныя каранічныя цытаты.

Параўнанне каранічных цытат, прыведзеных Чыжэўскім на польскай мове, з лацінскім перакладам Карана, выдадзеным у 1543 г. (і 1550 г.) у Базелі цюрыхскім тэолагам-рэфарматарам Тэадорам Бібліяндэрам (Theodor Bibliander), бясспрэчна даказвае: каранічныя цытаты ў сачыненні Чыжэўскага паходзяць з выдання Бібліяндэра[61].

---

[59] У 1630 г. у Вільні выйшаў твор у абарону татараў "Apologia Tatarów". Яго аўтар – нехта *Азулевіч*. Прозвішча выдае яго татарскае паходжанне. Гэты трактат, "Апалогія татараў", які можна разглядаць як рэакцыю на пасквіль "*Альфуркан татарскі*", на жаль, не захаваўся. Мусіць, у ім можна было б знайсці звесткі пра "літоўскія" тэфсіры. Гл.: Sobczak (1984), s. 106: "Odpowiedzią na paszkwil Czyżewskiego była nieznana dzisiaj *Apologia Tatarów*, której autorem miał być Azulewicz".

Гл. таксама: Zajączkowski (1935), s. 216, дзе цытуюцца некалькі сказаў з "Апалогіі татараў", у якіх адхіляецца абвінавачванне ў чараўніцтве, вядзьмарстве і магіі, як тое падаецца ў "*Альфуркане татарскім*": "Mają oni (Tatarzy) zasię pieniądze, które ich bracia przysyłają, nie umieją ich czytać, ale dalibóg nie masz tam konterfektu djabelskiego. Mają te pieniądze jako znak błogosławieństwa rodziców, ale nikt nie wyczytał, aby tam Bóg bluźnili. Ej, i czyż za to palić potrzeba, że kto ma sztuczki srebrne i złoto? To czytać nie umiecie, a gadacie: to djabelskie pismo!"

Параўн. таксама: Kryczyński (1938), s. 27.

[60] Папрок у распаўсюджванні ісламу ў Вялікім Княстве Літоўскім праз татарскае насельніцтва неабгрунтаваны. Прывілеі татарам, напр. свабода веравызнання, непасрэднае падпарадкаванне каралю, вызваленне ад некаторых падаткаў, а таксама частковая ўласная юрысдыкцыя, стала пацвярджаліся і пашыраліся пры панаванні Ягелонаў, якія заўсёды былі вельмі прыязна настроеныя ў дачыненні да татараў. У творы *Рысале-і татар-ы Лех*, які цытуецца ніжэй (>>> 5.2.2. "*Рысале-і татар-ы Лех*"), ананімны аўтар апісвае сустрэчу татараў з каралём Жыгімонтам Аўгустам (1548–1572), пры гэтым ясна выказваецца павага караля да татараў: "Kiedy pewnego razu przyjechał król do naszego kraju, byłem i ja przytomny jak się stawili przed nim wszyscy znaczniejsi obywatele. Wezwawszy do siebie naszych beków, wychwalał w obec całego zebrania wiarę i wierność muślimów, odzywając się w te słowa: 'Kocham ich i ich religiję, bo ona zasadza się na czystości nauki i obyczajów.' Te słowa królewskie źle przyjęli inni panowie, i dla tego to głośno szemrali na króla" (гл. Muchliński (1858), *Risāle*, p. 23).

Для пацвярджэння тут прыводзіцца толькі адзін прыклад, пачатак 221 верша з другой суры:

Czyżewski, "*Alfurkan tatarski*", Wilna, 1617, p. 54:

"Azoara 3, Alkoran: Chłopi dobrzy, inszego zakonu białogłów na żony nie pojmujcie, ani córek waszych za męża inszego zakona nie wydawajcie, ażebyście ich pierwszy do swego zakonu nawrócili"[62].

Bibliander, "Alcoran", Basel, 1543 (1550):

Alcoran, Azoara III: (заўвага на палях: "Matrimonium sit inter consortes religionis.") "Alterius legis foeminas in uxores nec ducatis, nec filias vestras viris alterius legis nubere permittatis, nisi post eorum ad vestram legem conversione facta"[63].

Польскі тэкст у Чыжэўскага даслоўна адпавядае лацінскаму тэксту Бібліяндэра, які з'яўляецца парафразам і не перадае дакладна арабскі тэкст. Абазначэнне сур тэрмінам *Azoara*, а таксама адхіленні ў падліку сур у абодвух тэкстах ідэнтычныя[64]. Польскае *chłopi dobrzy* адпавядае частаму ў лацінскім тэксце бібліяндэраўскага выдання *viri boni*.

Не вельмі здзіўляе, што бібліяндэраўскае выданне Карана пранікла да ўсходняга краю Польшчы, якая ўваходзіла ў кола заходняй лацінскай культуры,

---

[61] Рэфармацыйны цюрыхскі тэолаг *Тэадор Бібліяндэр* (Бухман) (1504–1564) выдаў у 1543 г. і 1550 г. у Базелі лацінскі пераклад Карана *Роберта Кетэненсіса* (Robertus Ketenensis альбо Robertus Cestrensis), зроблены ў 1142/43 г. у Іспаніі на загад Пятра Венерабіліса (Petrus Venerabilis) (1092–1156). Пра выданне Бібліяндэра гл.: Watt (1980), Bd. 1, p. 24; Bobzin (1986), (1985a), (1985b), p. 271 ff. Наконт ролі Марціна Лютэра ў бібліяндэраўскім выданні Карана гл.: Bobzin (1985b), p. 276 f.; Bobzin (1995), p. 90–158. Пра значэнне бібліяндэраўскага перакладу Карана і яго ўплыў у перыяд Рэфармацыі піша ў сваім аб'ёмістым даследаванні Bobzin (1995).

[62] Параўн.: Nosowski (1974), t. 1, p. 355.

[63] Для параўнання тут можна было б прывесці арабскі тэкст і польскі пераклад з "літоўскага" тэфсіра:

Q(2:221) {**wa-lā tankiḥū l-mušrikāti ḥattā yu'minna wa-la-amatun mu'minatun ḫayrun min mušrikatin wa-law a'ǧabat-kum wa-lā tunkiḥū l-mušrikīna ḥattā yu'minū wa-la-'abdun mu'minun ḫayrun min mušrikin [...]**}.

ne pōjmūjce za žōni k'afirek āž ūwerą newolnica muśulmanke jest lepša ōd k'afirk'i wolnej chōcbišce-še zakōchali w nej i ne-šlūbūjce cōrk'i swoje k'afirōm āž ūwerą bō lepšij jest newolnij muśulmanin lepšij ōd k'afirina [...] (29a5).

Літар. пераклад: Не бярыце ў жонкі няверніц (*k'afirka*), пакуль яны не ўверуюць. Рабыня мусульманка лепшая за няверніцу (*k'afirka*), хоць бы вы і закаханіся ў яе. Не выдавайце дачкі сваёй замуж за няверніка (*k'afirin*), пакуль яны не ўверуюць, бо раб мусульманін лепшы за няверніка (*k'afirin*) [...].

Мы канстатуем, што пераклад у тэфсіры з'яўляецца вельмі дакладным і літаральна ідзе ўслед за арабскім тэкстам, чым яўна кантрастуе з тэкстам Чыжэўскага, які, бясспрэчна, залежаў ад вельмі парафрастычнага лацінскага перакладу Бібліяндэра.

[64] Пра падзел тэксту Карана і адхіленні ў падліку сур (Azoara) у Бібліяндэра гл.: Bobzin (1995), p. 224 ff.

і што цытаты з гэтага перакладу мы знаходзім у палемічным творы 1616 г. з сталіцы Вялікага Княства Вільні. Таму што выданне Карана Бібліяндэра, у надрукаванай форме і напісанае на лацінскай мове, было адносна лёгкадаступнае для адукаванага сучасніка.

1.4. Каран-тэфсір "літоўскіх" татараў

Менавіта ў татараў-мусульман, якія жылі побач, Пятру Чыжэўскаму было б прасцей пазнаёміцца з ісламскай рэлігіяй і Каранам. Як ужо гаварылася вышэй, гэтыя татары стварылі рэлігійную літаратуру, у якой цэнтральнае становішча займае пераклад Карана.

Татары ў Вялікім Княстве Літоўскім на пачатку XVII ст. валодалі ўласным перакладам Карана на польскую мову; і гэта сапраўдны "*Аль-фуркан татарскі*" – *Каран-тэфсір* "літоўскіх" татараў.

Аднак, нягледзячы на геаграфічную і моўную блізкасць, выкарыстанне гэтага татарскага перакладу Карана было б для Чыжэўскага больш складаным, чым пераклад бібліяндэраўскага выдання.

Трэба было б пераадольваць высокі канфесійны бар'ер. У першай палове XVII ст., пры панаванні Жыгімонта Вазы (1587–1632), у Рэчы Паспалітай рэлігійная талерантнасць наогул памяншалася. Рэфармацыя ўжо перайшла свой зеніт, Контррэфармацыя і каталіцтва з польскай афарбоўкай разгортвалі на ўсю моц пераслед хрысціянска-рэфарматарскіх "ерасей". Антытрынітарыі, заахвочаныя італьянцам Фаўстам Сацыні[65] да сацыніянства, або унітарызму, настойліва заклікалі захоўваць у рэлігійных справах знакамітую *польскую талерантнасць*[66], якой славілася Рэч Паспалітая ў XVI ст. З трыумфам Контррэфармацыі талерантнасць памяншаецца таксама ў дачыненні да мясцовых юдэйскіх і мусульманскіх меншасцяў[67]. Прыклад таму – чатыры выданні зга-

---

[65] Фаўста Сацыні (Fausto Sozzini) (1539–1604) нарадзіўся ў Сіене. На пачатку 60-х гадоў XVI ст. ён адправіўся ў Швейцарыю, у Цюрых. Пад уплывам тэалагічных поглядаў свайго дзядзькі Леліо Сацыні (Lelio Sozzini) (1525–1562), які там жа і памёр у 1562 г., ён прыйшоў да антытрынітарызму. У 1574 г. ён прыехаў у Базель, дзе прысвяціў сябе тэалагічным даследаванням, а праз чатыры гады апынуўся ў Трансільваніі і змагаўся разам з італьянскім антытрынітарыем Джорджа Б'яндрата (Giorgio Biandrata) (1515–1588) супраць Франца Давідзіса (Franz Davidis) (1510–1579) і яго вучэння нонадарантызму. Нарэшце ён прыехаў у Польшчу, дзе займаўся тэалогіяй да самай смерці і заклаў падмурак унітарызму.

[66] Пра польскую рэлігійную талерантнасць у XVI – XVII стст. гл., напр.: Tazbir (1967) і (1977).

[67] Аднак трэба падкрэсліць, што каталіцкае духавенства ў Рэчы Паспалітай у першую чаргу бачыла пагрозу не ў юдэйскіх і мусульманскіх меншасцях, а перш за ўсё ў хрысціянскіх "ерэтыках", якія маглі спакойна дзейнічаць пад пратэкцыяй шляхецкіх сем'яў.

данага антытатарскага памфлета "*Альфуркан татарскі*"[68]. У сярэдзіне XVII ст. з прычыны далейшага пагаршэння сітуацыі "літоўскія" татары вымушаныя былі перасяліцца ў Асманскую імперыю[69].

Але Чыжэўскаму ў выкарыстанні гэтага перакладу Карана магла б замінаць яшчэ іншая неадольная перашкода: арабскае пісьмо. Татары зрабілі пераклад Карана для свайго ўласнага ўжывання. Таму ў традыцыі сваёй рэлігіі і польскі пераклад яны запісалі арабскімі літарамі. Акрамя таго, манускрыптаў з тэфсірамі ў першай чвэрці XVII ст. было няшмат, і яны знаходзіліся, бадай, выключна ў руках татарскіх рэлігійных дзеячаў альбо ў прыватным валоданні шляхецкіх татарскіх сем'яў, якія ахвотна замаўлялі копіі тэфсіраў.

Пра багаслова, які падрыхтаваў падрадковы пераклад Карана на польскую мову, мы нічога не ведаем. Безумоўна, перакладчык быў высокаадукаваным. Ён не толькі вельмі добра ведаў арабскую і цюркскую мовы, але таксама разбіраўся ў тэалагічных пытаннях і экзегезе Карана, што бачна па якасці перакладу.

З гістарычных крыніц мала што можна даведацца пра мусульманска-татарскае духавенства ў Вялікім Княстве Літоўскім XVI ст. Вядома, што службай у мячэцях, якія існавалі ў татарскіх паселішчах, кіравалі альбо імамы, альбо мулы. Гэтыя імамы і мулы былі прадстаўнікамі ніжэйшага духавенства і валодалі толькі вельмі сціплай тэалагічнай падрыхтоўкай, якая ахоплівала чытанне арабскіх літургічных тэкстаў і пісанне арабскімі літарамі. Паўсюль у сціплых таксама школах пры мячэцях яны перадавалі татарскім дзецям асноўныя паняцці ісламскай рэлігіі, а таксама ўменне чытаць і пісаць. Аднак невядома, што

---

[68] Падставу для поспеху памфлета (4 выданні) належыць шукаць не толькі ў рэлігійных справах, але таксама ў сацыяльных і палітычных прычынах, такіх як, напрыклад, непрыязнасць шляхты ў дачыненні да прывілеяваных татараў.

[69] Гл.: Meredith-Owens / Nadson (1970), p. 146: "Already in the last edition of the Lithuanian Statute in 1588, Tartars were debarred from holding any public office, and were forbidden to keep Christian bondsmen and nurses. Other restrictions followed early in the 17th century. Marriages between Tartars and Christians were forbidden under the penalty of death for both parties. Tartars were also debarred from holding the rank of an officer in their own regiments, and they were forbidden to build and repair mosques, or acquire any freehold lands. [...] When in 1656 the Grand Duchy of Lithuania was invaded by the Swedes, many Tartars left with their families and their movable goods to find safety in Poland. After the Swedes penetrated into Poland, the Tartars decided to return home. It was then thant they were attacked by bands of Polish nobles, avid for easy gain. The most flagrant incident occurred on Easter Thursday 1656, when a convoy of 300 horse-carts was attacked near Zambryw by Poles, who killed and wounded the Tartars, assaulted their womenfolk and plundered their goods. It was during this period that many tartars decided to emigrate to Turkey, whilst the others became Christians, and the Tartar population in Belorussia was drastically reduced".

дакладна змяшчала школьная праграма. З гістарычных крыніц вынікае, што гэтых прадстаўнікоў ніжэйшага духавенства часта прысылалі з замежжа, перш за ўсё з Крыма, а часам з Залатой Арды[70].

У XVI ст. складалі выключэнне некаторыя асобы з "літоўскіх" татараў, якія, відавочна, атрымалі тэалагічную падрыхтоўку ў Асманскай імперыі і потым дзейнічалі ў Літве. З актаў *Літоўскай метрыкі*[71] вядома, што ў 80-х і 90-х гадах XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім дзейнічаў татарскі кадзі, якога звалі Дэрвіш Хаджы Чэлебі Мурзіч, "*kadi wsich Tatar Wielikoho Kniażstwa Litowskoho*"[72].

1.5. Узор тэксту з тэфсіра L

У якасці ўзору тэксту тут прыводзіцца фрагмент з тэфсіра Беларускай бібліятэкі імя Францыска Скарыны ў Лондане. Манускрыпт узыходзіць да 1725 г. і з'яўляецца найстарэйшым з татарскіх тэфсіраў, вядомых на гэты момант[73]. Радкі з трэцяга па восьмы на аркушы 283a змяшчаюць тэкст "Верша святла", які з'яўляецца 35 вершам з суры *al-Nūr* ("Святло" = сура 24).

У транслітараванай вытрымцы з аркуша 283a для большай яснасці ў тэксце падкрэслены месцы, якія былі ўстаўлены дадаткова да тэксту Карана як экзегетычныя дапаўненні і каментары.

---

[70] Гл.: Muchliński (1858), *Risale*, p. 258: "Przy większych mesdżydach zwykle utrzymujemy imamów z Krymu lub z hord, podejmując ich własnemi siłami; u nich się także uczą nasze dzieci".

[71] Гл.: >>> 7.2. *Літоўская метрыка*.

[72] У судовых актах горада Вільні згадваецца ў адным дакуменце ад 02.03.1594 *кадзі Дэрвіш Хаджы Чэлебі Мурзіч* (AWK. XXXI, 185–6. Nr. 122). Вядома, што ў 1588 г. гэты самы *Дэрвіш Хаджы Чэлебі Мурзіч* дзейнічаў у якасці мулы пры мячэці ў Даўбучышках (Ашмянскі павет). Гл.: Kryczyński (1938), p. 205. Собчак (Sobczak (1984), p. 79.) заўважае, што прызначэнне ў 1586 г. *Дэрвіша Хаджы Чэлебі Мурзіча* на пасаду *кадзі* (суддзі) татараў было відавочна зацверджана самім каралём: "Jest rzeczą interesującą, że nominacji na urząd kadiego udzielił Czelebiemu, chyba w 1586 r., sam król" (Собчак абапіраецца на AGAD, Sumariusz Metryki Litewskiej, t. VIII, p. 37).

Пра Мурзіча гл. таксама: Kryczyński (1938), 204 ff.; параўн. таксама >>> 5.2.2. *Рысале-і Татар-ы Лех*, заўвага 30.

[73] Пра датаванне гэтага манускрыпта гл. >>> 17.1. Рукапіс тэфсіра **L**.



Аркуш 283а: Верш святла
(друкуецца са згоды Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны, Лондан)

1.5.1. Верш святла

Аркуш 283a **(1a) ‘araḍa l-ḥayāta (!= l-ḥayāti) d-dunyā wa-man yukrih-hunna fa-inna llāha min ba‘di ikrāhi-hinna ġafūrun**

(1b) pōžiwana na tim dōčasnim świece skerbi cūdzōlōstwa pre tō zapewne pan bōg pō tim pri gwaltōwanjū ōdpūskliwij

(2a) raḥīmun · wa-la-qad anzalnā ilay-kum āyātin bayyinātin (!= mubayyinātin) wa-maṯalan mina lladīna ḫalaw min

(2b) milōserdnij bō gwaltem cūdzōlōstwa činili bō gdiž zapewne zeslališmi dō was ājet'i značne i pōdōbenstwa s-tich cō zešli ūprōdī

(3a) qabli-kum wa-maw‘iẓatan li-l-muttaqīna · Allāhu nūru s-samāwāti wa-l-arḍi maṯalu nūri-hī

(3b) was i napōminanū zeslali dla bōjaźnikōw našich bōg jest świátlōšcą nebeską i źemšką pōdōbenstwo świátlōšci

(4a) ka-miškātin fī-hā miṣbāḥun-i l-miṣbāḥun (!= l-miṣbāḥu) fī zuǧāǧatin-i z-zuǧāǧatu ka-anna-hā kawkabun

(4b) jegō jakō k'edī we-tchłane cemnej w tej pečūrī świeca jasnâ ā ta świeca jasna we škle krištâlōwim ā šklō te jakō nektōra jasna gwazda bliskajōnca

(5a) durrīyun yūqadu min šaǧaratin mubārakatin zaytūnatin lā šarqīyatin wa-lā ġarbīyatin ·

(5b) tō jest nutr werōncegō člōweke świeci-še ōd drewa świentōbliwegō oliwnegō ā tō światlōšc īmannâ jest ne-z-ūschōdū slōnca āni z-zachōdū āle šerī‘et'

(6a) yakādu zaytu-hā yuḍī'u wa-law lam tamsas-hu nāru (!= nārun) nūrun ‘alā nūrin yahdi llāhu

(6b) muchemmedow ma bic na wšitek świát nezadlūgō ōliwa ta ōświeci-še ā chōcbi ne-dōtknōl-še dō tegō ōgen ma /prece/ preź še świátlōšc nad świátlōšcami pōprōwadzī pan bōg

(7a) li-nūri-hī man yašā'u wa-yaḍribu llāhu l-amṯāla li-n-nāsi wa-llāhu bi-kulli šay'in

(7b) [do] świátlōšci swoj[ej] tegō kogō chce i pōdbija pan bōg pōdōbenstwa dla sinōw ādamšk'ich bō pan bōg koždą reč

(8a) ‘alīmun · fī buyūti (!= buyūtin) aḏina llāhu an tarfa‘a (!= turfa‘a) wa-yuḏkaru (!= yuḏkara) fī-hā smu-hū yusabbiḥu la-hū (283b1) fī-hā bi-l-ġudūwi wa-l-āṣāli

(8b) wadōm w dōmach ōd bōga pōzwolōnich dla pōdnešena glōsu źik'erōwegō i nech-spōminają tam īme świentegō ābi chwalili jegō tam i ranō i wečōr

Глосы на палях:
радок (6): *šerī‘et' muchemmedōw ma bic na wšitek świát nezadlūga*
радок (8): *dō mečetū każe še źbirac dla nemaźu i źik'erū ranō i wwečōr*

Беларускі пераклад арабскага тэксту Верша святла[74]:

Q(24:35): {**Алаг – святло нябёсаў і зямлі. Падабенства Яго святла як ніша, у якой свяцільня. Свяцільня гэтая ў шкле. Шкло гэтае нібы**

[74] Тут і далей пераклад фрагментаў Карана рабіўся намі з арабскага арыгіналу (*заўв. перакл.*).

яркая зорка. Яна гарыць ад дрэва добраславеннага – масліны, ані ўсходняй, ані заходняй. Гатовы ялей яго загарэцца, і калі б не дакранаўся да яго агонь. Святло над святлом. Алаг вядзе да Свайго святла каго пажадае. Алаг дае падабенства людзям. Алаг ведае кожную рэч.}

Пераклад Верша святла ў сучаснай польскай арфаграфіі:

(283a3) *Bóg jest światłością niebieską i ziemską. Podobieństwo światłości* (4) *jego jako kiedy w otchłani ciemniej. W tej pieczarze (jest) świeca jasna a ta świeca jasna (jest) we szkle kryształowym a szkło to (jest) jak niektóra jasna gwiazda błyskająca.* (5) *To jest wnętrze wierzącego człowieka. Świeci się od drzewa świętobliwego oliwnego, a to światłość imanna jest, nie ze wschodu słońca ani z zachodu, ale szeryjat* (6) *muchammadów ma być na wszystek świat niezadługo. Oliwa ta oświeci się a choćby nie dotknął się do tego ogień. Ma przez się światłość nad światłościami. Poprowadzi Panbóg* (7) *do światłości swojej tego kogo chce; i podbija Panbóg podobieństwa dla synów adamskich, bo Panbóg każdą rzecz (każdej rzeczy)* (8) *wiadom*[75].

Літаральны беларускі пераклад польскай версіі:

(283а) Бог ёсць святло нябеснае і зямное. Падабенства святла Яго як бы ў цёмнай бездані. У гэтай пячоры ёсць свяча яркая, і гэтая свяча яркая ў крыштальным шкле, а шкло тое як нейкая яркая зорка бліскучая. Гэта ўнутранасць чалавека, які верыць. Свеціцца ад пабожнага аліўнага дрэва, і гэта святло іманнае, ані з усходу сонца, ані з захаду, але шарыят Мухамедаў павінны быць неўзабаве на ўвесь свет. Аліва гэтая засвеціцца, хоць бы не дакранаўся да гэтага агонь. Маецца праз сябе святло над святлом. Павядзе Пан Бог да Свайго святла таго, каго хоча; і падбівае Пан Бог падабенства для сыноў адамскіх, бо Пан Бог кожную рэч ведае.

1.6. Традыцыйная форма "літоўскага" тэфсіра

Знешняя форма, размяшчэнне тэксту, безумоўна, паходзяць ад асманскіх альбо цэнтральнаазіяцка-цюркскіх і, урэшце, персідскіх узораў. Вядома некалькі цюркскіх рукапісных Каранаў, якія суправаджаюцца падрадковым перакладам. У гэтых цюркскіх рукапісах звычайна мы знаходзім на старонцы манускрыпта ад васьмі да дзевяці двайных радкоў. Цэнтральнаазіяцка-цюркскія і асманскія рукапісы Каранаў, відавочна, паслужылі мадэллю для татарскіх тэфсіраў у Вя-

[75] Для параўнання тут можна было б прывесці сучасны польскі пераклад Ю. Бяляўскага (J. Bielawski (1986), s. 423): "Bóg jest światłem niebios i ziemi. Jego światło jest podobne do niszy, w której jest lampa; lampa jest we szkle, a szkło jest jak gwiazda świecąca. Zapala się ona od drzewa błogosławionego – drzewa oliwnego, ani ze Wschodu, ani z Zachodu, którego oliwa prawie by świeciła, nawet gdyby nie dotknął jej ogień. Światło na świetle! Bóg prowadzi drogą prostą ku światłu, kogo chce. Bóg przytacza przykłady dla ludzi. Bóg o każdej rzeczy jest wszechwiedzący!"

лікім Княстве Літоўскім. Такім чынам, традыцыя падрадковай формы тэфсіра ад персаў працягваецца праз цюркаў Цэнтральнай Азіі і туркаў-асманаў далей да "літоўскіх" татараў[76].

Стварэнне першага падрадковага перакладу Карана на персідскую мову прыпадае на другую палову X ст., на час праўлення Саманіда Мансура ібн Нуха[77], які замовіў пералажэнне тэфсіра *Ǧāmi' al-bayān fī tafsīr al-qur'ān* арабскага гісторыка і знаўцы Карана *ат-Табары*[78]. Пры гэтым вершы Карана перакладаліся на персідскую мову падрадкова, строга паралельна арабскаму тэксту арыгінала[79].

Гэты фармальны прынцып падрадковага перакладу Карана ў далейшым пазычылі цюркі для стварэння цюркскіх Каранаў-тэфсіраў. Тоган (1963)[80] сцвярджае, што першы цюркскі тэфсір узнік адначасова з першым персідскім

---

[76] Наконт персідскіх і цюркскіх падрадковых перакладаў ў тэфсірах гл.: Togan (1963), p. 229–230; Eckmann (1971); Lazard (1963), p. 41–45; таксама: World Bibliography of Translations of the Holy Qur'an, p. xxix–xxx. Параўнанне ўзору тэксту з цэнтральнаазіяцка-цюркскага тэфсіра, прыведзенага ў Экмана (Eckmann (1971)), з адпаведным узорам тэксту з тэфсіра Ł знаходзіцца ў дадатку >>> 18.1. Узоры тэкстаў з цюркскіх тэфсіраў.

[77] *Abū Ṣāliḥ Manṣūr ibn Nūḥ ibn Naṣr ibn Aḥmad ibn Ismā'īl* (350–376 г. гіджры / 961–986).

[78] *Abū Ǧa'far Muḥammad Ibn Ǧarīr aṭ-Ṭabarī* (224–310 г. гіджры / 839–922) з'яўляецца аўтарам аб'ёмістага каментару да Карана "*Pāmi' al-bayān fī tafsîr al-Qur'ān*" (Збор тлумачэнняў у экзегезе Карана) альбо з іншым загалоўкам "*Pāmi' al-bayān an ta'wîl āy al-Qu'rān*" (Збор тлумачэнняў да экзегезы вершаў Карана). У некалькіх тамах свайго твора *ат-Табары* ахоплівае, як дае зразумець загаловак, меркаванні экзегетаў свайго часу.

[79] У Экмана (Eckmann (1971), p. 150) знаходзіцца пераклад прадмовы да персідскага пераказу тэфсіра *ат-Табары*, якая пралівае святло на падаплёку гэтага пераказу твора: "This book is the great Commentary related by Muḥammad ibn Jarīr aṭ-Ṭabarī – God's mercy be upon him, - translated into a correct and straightforward Persian language. They brought this book from Bagdad. It was forty volumes written in Arabic and provided with long chains of authority. They brought it to the victorious commander and lord Abū Ṣāliḥ Manṣūr ibn Nūḥ ibn Naṣr ibn Aḥmad ibn Ismā'īl – God's mercy be upon them all. Then it proved difficult to read and interpret this book in the Arabic language, and so he desired that it should be translated into the Persian language. Then he assembled the scholars (*'ulamā*) of Transoxania and sought from them a legal pronouncement (*fatvā*): 'Would it be lawful for us to turn this book into the Persian Language?' They said: 'It would be lawful to read and write the commentary of the Koran in Persian for the benefit of those who do not know Arabic, since God Most High said: I have sent no messenger but with the tongue of his people'... Then the victorious king Abū Ṣāliḥ commanded that the scholars of Transoxania should be brought: from Bukhara Faqīh Abū Bakr ibn Aḥmad ibn Ḥāmid and Khalīl ibn Aḥmad as-Sijistānī, from Balkh Abū Ja'far ibn Muḥammad ibn 'Alī, from the gates of India Faqīh al-Ḥasan ibn 'Alī Mandūs and Abū l-Jahm Khālid ibn Hānī al-Mutafaqqih, and also [other scholars] from Samarkand, Ispîjāb and Farghāna, and from every city of Transoxania. And they all consented to the translation of this book, [declaring] that this was the right way. Then the victorious lord and king Abū Ṣāliḥ ordered this assembly of scholars to choose from among themselves the most learned and erudite so that they might translate this book. And they translated it, omitting the long chains of authority and shortening the texts of the stories".

[80] Гл.: Togan (1963), p. 230; Eckmann (1971), p. 151.

перакладам, паколькі ў перакладзе на персідскую мову каментару *ат-Табары* да Карана прымалі ўдзел цюркскія вучоныя з Трансаксаніі[81].

1.7. Арабскі тэкст

Звычайна "літоўскія" тэфсіры змяшчаюць на старонцы восем (радзей дзевяць) радкоў арабскага тэксту Карана. Падзел тэксту на суры і вершы адпавядае агульнапрынятаму, як мы яго сёння знаходзім у кананічнай рэдакцыі Карана (Каір, 1925), што абапіраецца на ўсманаўскі кансанантны тэкст[82] і тэкставую традыцыю *Ḥafṣ 'an 'Āṣim*[83]. Асобныя вершы аддзяляюцца адзін ад аднаго тоўстай кропкай (·) чырвонай фарбы; часам такім чынам таксама пазначаецца паўза ў чытанні і ўстанаўліваюцца межы рыфмаваных фраз. У літургічных мэтах на палях (у глосах) пазначаецца падзел на *aḥzāb*[84] і *aǧzā'*[85].

У арабскім тэксце сустракаецца вялікае мноства апісак і арфаграфічных памылак перапісчыкаў. Часцей за ўсё маюць месца памылкова пастаўленыя знакі

---

[81] Тэзіс Тогана быў пастаўлены пад сумнеў цюрколагамі Мехмедам Фуатам Кёпрулю (Mehmed Fuat Kóprülü) і Абдзюлькадырам Інанам (Abdülkadir Inan), якія аднеслі момант ўзнікнення першага цюркскага падрадковага перакладу на сто гадоў пазней; гл. таксама: Eckmann (1971), p. 151, і World Bibliography of Translations of the Holy Qur'an, p. xxix. Праўда, у "World Bibliography of Translations of the Holy Qur'an" далей (p. xxx) заўважаецца: "It is now definitely known, however, that the translation made in the Eastern Turkish language in 734 A.H./1333 A.D. is the oldest Turkish translation. It is in the Museum of Turkish and Islamic Art in Istanbul, registered under number 73. It can be clearly seen that this translation was modeled on the Persian one". Наконт згаданага тут манускрыпта 734 г. гіджры / 1333 г. гл. артыкул Экмана "Eine ostmitteltürkische interlineare Koranübersetzung" (1959), апублікаваны ў "Ural-Altaischen Jahrbüchern", 31 (1959–1960). Wiesbaden: Harrassowitz, 1959, p. 72–85. Экман піша: "Сярод старых перакладаў Карана, якія захоўваюцца ў стамбульскім Музеі цюркскіх і ісламскіх твораў (Türk ve Islâm Eserleri Müzesi), знаходзіцца рукапіс выдатнага падрадковага перакладу на ўсходнесярэднецюркскую (караханідска-цюркскую) мову, які быў напісаны шыразскім перапісчыкам Мухамадам б. Хаджы Даўлатшахам (Muḥammad b. Ḥāǧī Davlatšāh) у 734 г. (1333/34), магчыма, у Шыразе. Рукапіс, зарэгістраваны пад нумарам T 73, ахоплівае 902 старонкі па 9 радкоў. Цюркскія словы напісаныя чырвоным чарнілам пад арабскімі словамі". (На наступных старонках Экман дае падрабязнае апісанне мовы манускрыпта.)

[82] Толькі пры трэцім халіфе, Усмане, тэкст Карана ўпершыню быў сабраны і цалкам зафіксаваны пісьмова.

[83] Традыцыя *Ḥafṣ 'an 'Āṣim* (чытанне тэксту Карана паводле *Хафса* [пам. 180 г. гіджры / 796], заснаванае на аўтарытэце *Асыма* [пам. 127 г. гіджры / 745]), з'яўляецца галоўнай традыцыяй з горада Куфа (Ірак) і пануючай традыцыяй тэксту на ўсім ісламскім Усходзе. На ёй грунтуецца рэдакцыя Карана каірскага выдання 1925 года, якая сёння шырока прымаецца як кананічная. Праўда, традыцыя *Ḥafṣ 'an 'Āṣim* з'яўляецца толькі адной з сямі прызнаных у ісламскім свеце тэкставых традыцый. (Кароткі агляд розных традыцый знаходзіцца, напр., у Бобцына (Bobzin (1995), p. 245.) Пра *Хафса* і *Асыма* гл. адпаведныя артыкулы ў EI-2.

[84] Ар. *ḥizb* (мн. л. *aḥzāb*) = частка, партыя, аддзяленне, адна шасцідзесятая частка Карана.

[85] Ар. *ǧuz'* (мн. л. *aǧzā'*) = частка, раздзел, адна трыццатая частка Карана (= *2 хізбы*).

вакалізацыі і дыякрытычныя кропкі. У кансанантным тэксце, наадварот, мы не знаходзім значных адхіленняў, якія маглі б быць вызначаныя як абумоўленыя традыцыяй адхіленні ў тэксце[86]. Арабскі тэкст лонданскага тэфсіра ў значнай меры адпавядае тэксту Карана, выдадзенага ў Каіры ў 1925 г., ва ўсіх аспектах: кансанантным тэксце, расстаноўцы кропак, вакалізацыі.

Гэтыя даныя таксама падмацоўваюцца падрадковым перакладам. Здараецца так, што адхіленні ў вакалізацыі, а часам і пропускі ў кансанантным тэксце, нават тыя, што былі б граматычна прымальныя, не знайшлі адлюстравання ў перакладзе. Экзегетычныя звесткі, якія змяшчаюцца ў падрадковым перакладзе, таксама не пацвярджаюць адхіленняў і асобнага чытання і тлумачэння.

У вышэйзгаданым фрагменце тэксту на аркушы 283a ("Верш святла") мы знаходзім у арабскім тэксце некалькі памылковых вакалізацый. Іх неабходна тут дакладней асвятліць, таму што яны з'яўляюцца тыповымі для тэксту **L** адхіленнямі.

(a) Памылкі ў сферы нунацыі *ka-miškātin fī-hā miṣbāḥuni l-miṣbāḥun* замест *al-miṣbāḥu* (283a4), *lam tamsas-hu nāru* замест *nārun* (283a6), *fī buyūti* замест *fī buyūtin* (283a8). Гэтыя вакалізацыі парушаюць у сваім кантэксце правілы арабскай граматыкі і могуць разглядацца толькі як апіскі перапісчыка.

(b) Памылковая вакалізацыя ў формах дзеясловаў: (283a8) *fī buyūtin aḍina llāhu an tarfa'a (!= turfa'a) wa-yuḏkaru (!= yuḏkara) fī-hā smu-hū* **Q**(24:36). Форма дзеяслова *tarfa'a*, якая адносіцца да множнага ліку неадушаўлёнага назоўніка *buyūt* (дамы) і таму стаіць у 3-й ас. ж. р. адз. л., вакалізаваная як незалежны стан замест залежнага *turfa'a*[87]. Пры форме дзеяслова *yuḏkaru* (ён згадваецца) (3-й ас. м. р. адз. л. абв. зал.) у дадзеным кантэксце індыкатыў парушае правілы граматыкі. Лад залежыць ад злучніка *an* (каб), які няўхільна патрабуе ўмоўнага ладу *yuḏkara*.

Таму выяўленыя адхіленні ў вакалізацыі арабскага тэксту на аркушы 283a трэба разглядаць не як спосаб чытання, а як апіскі, якія можна тлумачыць недастатковай моўнай кампетэнцыяй перапісчыка.

---

[86] У рэдкіх выпадках у кансанантным тэксце можна натрапіць на блытаніну паміж літарамі, напр. *ṣād* = *ṣ*, *sīn* = *s* і *ṭā'* = *ṭ*, што тлумачыцца цюркскім і славянскім моўным субстратам перапісчыкаў, якія не ведалі ў сваёй роднай мове эмфатычных фанем. Тым самым выключалася магчымасць правільнага чытання, бо перакручаныя такім чынам словы, як правіла, страчвалі сэнс. Параўнанне са спосабамі чытання, якія сабраў Jeffery (1937) са старых даусманаўскіх кодэксаў Карана, таксама не дае падстаў да таго, каб аднесці тэкст да аднаго з традыцыйных адхіленняў.

[87] Разуменне формы як 2-й ас. м. р. адз. л. незал. ст. у далейшым вядзе да сінтаксічнай і тэкстуальнай заблытанасці. Адсутнічае анафарычны займеннік *-hā*, які адсылаецца да *buyūt* (дамы) і які займае становішча прамога дапаўнення да дзеяслоўнай формы *tarfa'a* (ты ўзвышаеш) у бяззлучнікавым рэлятыўным сказе *fī buyūtin - aḍina llāhu an tarfa'a-hā* (прыблізна: У дамах, якія Алаг прадпісаў, каб ты іх узвысіў). Тым самым трэба было б дапусціць яшчэ больш цяжкую памылку ў кансанантным тэксце, каб патлумачыць адхіленні ад *tarfa'a* ў вакалізацыі! Простае і лагічнае тлумачэнне адхіленняў у вакалізацыі ляжыць, пэўна, у дапушчэнні апісак перапісчыка.

1.8. Падрадковы пераклад

Пад радкамі арабскага тэксту мы знаходзім адпаведны падрадковы пераклад арабскім пісьмом, напісаны наўскос. Мова перакладу – польская, якая паказвае асаблівасці тыповай "*пальшчызны крэсовай*" ("*polszczyzna kresowa*"), "ускраінай" польскай мовы. Паняццем "*пальшчызны крэсовай*" абазначаецца польская мова, як яна бытуе ў "*крэсах*"[88], усходніх ускраінных абласцях Польшчы, на землях усходніх славян. Можна вылучыць два варыянты "*пальшчызны крэсовай*": "*polszczyzna północno-kresowa*" (паўночна-ўскраінная польская мова) з беларускім субстратам і "*polszczyzna południowo-kresowa*" (паўднёва-ўскраінная польская мова) з украінскім субстратам.

"*Polszczyzna północno-kresowa*" складвалася ў полі ўзаемадзеяння паміж польскай літаратурнай мовай на розных этапах яе развіцця і беларускім субстратам. Такім чынам, для перыяду (XVI–XVIII стст.), які тут даследуецца, "*polszczyzna północno-kresowa*" – гэта не дыялект, для якога неабходнай умовай з'яўляецца існаванне адпаведнага аўтахтоннага насельніцтва, але рэгіянальная субсістэма польскай нарматыўнай, або агульнай, мовы.

У Вялікім Княстве Літоўскім польская мова лягла на моўны субстрат аўтахтоннага рутэнскага (беларускага) насельніцтва ўжо як надрэгіянальная літаратурная мова і мова адукацыі. Беларускамоўная шляхта пераймала польскую мову ў працэсе акультурацыі і паланізацыі ўжо з пачатку XV ст., але пераважна ў XVI ст., з моманту уніі Княства і Польскага каралеўства ў 1569 г. Польская мова вывучалася імі як замежная і часткова пераўтваралася на аснове субстрату роднай мовы на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы, перш за ўсё ў сферы фаналогіі і марфалогіі, але таксама ў сінтаксісе і лексіцы. Такім чынам, "*polszczyzna północno-kresowa*" змяшчае ў сваёй аснове польскую літаратурную мову, у якую ўліваюцца характэрныя рысы беларускай мовы, якія, аднак, могуць вар'іравацца ў залежнасці ад ступені адукаванасці размоўцы. Дзякуючы таму што ўплывовыя шляхецкія сем'і і нямала выдатных польскіх паэтаў і пісьменнікаў паходзілі з гэтак званых *крэсаў*, г.зн. з усходніх земляў Рэчы Паспалітай[89], польская літаратурная мова ў сваім развіцці неаднаразова атрымлівала істотныя імпульсы з гэтага раёна. Але размяшчэнне *крэсаў* на ўскраіне польскай дзяржаўнай і моўнай тэрыторыі садзейнічала таму, што тут маглі захоўвацца рысы польскай мовы, якія ў польскіх землях лічыліся састарэлымі[90].

---

[88] Паняцце "*крэсы*" (польск. *kresa* = ускраіна) пачало выкарыстоўвацца толькі пасля 1920 г. Раней для гэтых земляў ужываліся назвы "*Літва*" (Беларусь з адміністрацыйным цэнтрам у Мінску), "*Беларусь*" (або "*Biała Ruś*" для Віцебскай і Магілёўскай губерняў), "*Жмудзь*" (для этнічнай Літвы), "*Русь*" (для т. зв. правабярэжнай Украіны).

[89] Адам Міцкевіч (1798–1855), Юліюш Славацкі (1809–1849), Юзэф Ігнацы Крашэўскі (1812–1887), Эліза Ажэшка (1841–1910) і інш.

[90] Наконт польскай мовы на *крэсах* гл.: Kurzowa (1985), (1993). Падрабязнае і пераканаўчае даследаванне пра працэсы пранікнення польскай мовы на *крэсы* здзейсніў Martel (1938).

Польская мова ў Вялікім Княстве не толькі падпадала пад уплыў беларускага субстрата, але, са свайго боку, таксама ўздзейнічала на беларускую мову. Так у беларускую лексіку праніклі шматлікія паланізмы. Пры гэтым для многіх з тых, хто размаўляў па-беларуску, розніца паміж абедзвюма мовамі згладжвалася і станавілася нявыразнай, так што яны адносілі да польскай мовы гэты свой першапачаткова беларускі дыялект, прасякнуты паланізмамі, які для іх уяўляў толькі сацыяльна больш нізкі ўзровень мовы. Той, хто размаўляў на такім паланізаваным беларускім дыялекце, нярэдка абазначаў сябе як паляк, а сваю гаворку – як "простую мову", супрацьпастаўленую польскай літаратурнай мове[91].

Моўная аснова падрадковага перакладу тэфсіра **L** і наогул усіх "літоўскіх" тэфсіраў – польская. Нягледзячы на гэта, у тэксце тут і там сустракаюцца бясспрэчна беларускія моўныя рысы, што перавышае звычайныя ў польскай мове паўночных крэсаў з'явы інтэрферэнцыі.

Увогуле ўзнікае ўражанне, што перапісчыкі ў прынцыпе імкнуліся пісаць па-польску, але гэта ім не заўсёды цалкам удавалася. Хутчэй за ўсё несвядома яны ўнеслі ў тэксты, якія належала перапісваць, беларускія моўныя асаблівасці. Таму беларускія асаблівасці ўнутры асобных манускрыптаў рассеяны большай часткай бессістэмна. Што перапісчыкі стараліся пісаць на польскай, а не на беларускай мове, пацвярджаюць сярод іншага шматлікія гіперкарэктныя формы і выпраўленні[92].

---

[91] Параўн., напр., заўвагу Лапалеўскага да моўнай сітуацыі ў віленскім краі ў 30-х гадах XX ст. (Łopalewski (1990), p. 43): "Chłop, prawosławny czy katolik, stanowiący główną masę zaludnienia tej nawskroś rolniczej dzielnicy z równą chęcią mówi u siebie w chacie 'po prostemu', to znaczy, 'po białorusku', jak na rynku w miasteczku czy w urzędzie gminnym 'po pańsku', albo 'tak jak panowie' – czyli po polsku".

[92] Параўн.: Крачковский (1924), с. 165: "Относительно языка приведенных отрывков высказаться труднее: во всяком случае он не представляет чистой формы польской или белорусской. По заключению Е.Ф.Карского, данные переводы отражают польскую речь с сильными белорусизмами или характеризуют человека, говорящего по-белорусски, но стремящегося писать по-польски".

Параўн. таксама каментар Мэрэдыт-Оўэнс і Надсана наконт мовы тэфсіра ў першай суры рукапісу **L**: "The text is in the typical 'peripherical Polish' as it was spoken in Byelorussia. The influence of the Byelorussian language is evident (the hard "s" in the word "miloserdnemu"; unconscious akańnie in "pravadź"; "strogości" written with a "t" ; the Polish word "błendnymi" written "blondnimi" in the way which a Byelorussian would pronounce it; the word "źwedźonimi" which is typical of the Byelorussian language, but not of Polish). The word "lak" is unintelligible. The whole translation is not literal and looks more like a paraphrase". (Замест "*lak*", як гэта памылкова пазначана ў артыкуле, трэба, пэўна, паставіць "*tak*" як частку выразу "*daj nam tak*", якім перакладаецца слова "āmīn" [амін] у арабскім тэксце. Параўн. >>> 17.1.1. Тэкст рукапісу **L**.)

2. АСПЕКТЫ ТЭКСТУ ПЕРАКЛАДУ

Параўнанне тэксту Карана, польскага перакладу і вялікага каментару (tafsīr) Абу Джафара Мухамада ібн Джарыра ат-Табары[1] да Карана паказвае, што ў тэкст тэфсіра разам з уласна каранічным тэкстам дадаткова ўліліся экзегетычныя звесткі. У польскай версіі яны з'яўляюцца ў форме кароткіх інтэрпаляваных *экзегетычных дапаўненняў і каментароў* альбо ў форме *экзегетычна афарбаваных парафразаў* арабскага тэксту. Дадатковыя экзегетычныя звесткі большай часткай можна знайсці ў ат-Табары. Яны цалкам грунтуюцца на артадаксальным суніцкім вучэнні. Застаецца яшчэ невялікая частка, не знойдзеная ў яго, што, аднак, нічога не змяняе ў толькі што сфармуляванай выснове.

Звычайная тэхніка перакладу палягае ў перакладзе арабскага тэксту *слова за словам*. Пры гэтым часта адбываецца даслоўнае адлюстраванне арабскіх канструкцый, якія з'яўляюцца некарэктнымі для польскай мовы[2]. На падставе знойдзеных устойлівых арабска-польскіх інтэрферэнцыйных структур можна выключыць пасярэдніцтва цюркскага перакладу паміж арабскім тэкстам і польскай версіяй[3].

---

[1] Aṭ-Ṭabarī, Abū Ǧa'far M. b. Ǧarīr: *Ǧāmi' al-bayān 'an ta'wīl āy al-qur'ān.* / M. Šākir.- al-Qāhira, s.a. (Параўн. таксама >>> 1.6. Традыцыйная форма "літоўскага" тэфсіра.)

Тэфсір ат-Табары надалей выкарыстоўваўся як параўнальная экзегеза. Побач з гэтым ужываўся таксама з мэтай параўнання так званы *"Тафсір аль-Джаляляйн"* (*"Tafsīr al-Ǧalālayn"*). Аўтарамі *"Тафсіра аль-Джаляляйн"* з'яўляюцца Джаляль ад-Дын ас-Суюты (*Ǧalāl al-Dīn al-Suyūtī*; пам. 1505) і яго настаўнік Джаляль ад-Дын аль-Махалі (*Ǧalāl al-Dīn al-Maḥallī*; пам. 1459), адсюль і назва кнігі "Тафсір двух Джаляляў". Тафсір у сваёй кароткай рэдакцыі вельмі распаўсюджаны, таму што сціслы каментар (парафразы, спосаб чытання, граматычныя тлумачэнні), які абмяжоўваецца толькі істотным, дае агульную карціну і самую неабходную інфармацыю. *"Тафсір двух Джаляляў"* таксама цалкам грунтуецца на традыцыйнай, суніцкай экзегезе Карана.

[2] Да "літоўскага" тэфсіра таксама мае дачыненне тое, што Экман (Eckmann (1971), p. 152) заўважыў наконт цюркскага падрадковага перакладу: "The Turkic words [...] follow the order of the Arabic text. The translator imitated, with meticulous care, even rections, particles [...] and phrases of the Arabic language. Therefore, in many cases, the translation is not understandable without the Arabic text".

Параўн. тамсама, p. 150: "The Persian text of the Koran in Ṭabarī's Commentary is literal translation. The Persian words are written under the Arabic words regardless of the world order and syntax of the Persian Language. An analysis of its language shows that only a small part of its vocabulary is driven from Arabic".

[3] Гіпотэза пра прамежкавы цюркскі пераклад выказвалася рознымі даследчыкамі; гл., напр.: Szynkiewicz (1935), p. 138–139: "Trudno z pewnością ustalić, czy przekład został zrobiony bezpośrednio z oryginału arabskiego, czy z przekładu tureckiego. Dopiski na marginesach tefsiru przemawiają więcej za tem, że tłumaczono z tekstu tureckiego". (Параўн. таксама: Антонович (1969), с. 21.)

Такім чынам, у тэксце польскага перакладу можна вылучыць тры аспекты[4]:
(1) Інтэрпаляцыя кароткага экзегетычнага каментару.
(2) Экзегетычны парафраз арабскага тэксту.
(3) Пераклад арабскага тэксту *слова за словам*.

2.1. Экзегетычны каментар

Устаўленыя ў тэкст тэфсіра экзегетычныя каментары, зразумела, даволі кароткія і служаць для канкрэтызацыі агульнага зместу арабскага арыгінальнага тэксту. Часта ў якасці экзегетычнага каментару сустракаюцца толькі імёны, якія ўстаўляюцца ў пераклад.

2.1.1. Паэт Ка'б ібн аль-Ашраф

У **Q**(4:61) прыводзіцца імя аднаго юдэйскага паэта для канкрэтызацыі каранічнага тэксту:
Q(4:61) {**a-lam tara ilā llaḏīna yaz'amūna anna-hum āmanū bi-mā unzila ilay-ka wa-mā unzila min qabli-ka yurīdūna an yataḥākamū ilā ṭ-ṭāġūti wa-qad umirū an yakfurū bi-hī wa-yurīdu š-šayṭānu an yuḍilla-hum ḍalālan ba'īdan**}[5]

ne-patriš i tich ktōre zmōwili-śe na nich pewne ōnī mōwą werim tō cō zeslanō tōbe i cō zeslanō pred tōbą chcą żebi was priwedli dō pōslūšenstwa dō swojich zwodzicelow k'e'eba ešrefōwiča ī im samim prikezanō żebī ne-werili temū zwodzicelū bō chce prez-negō šetan żebi zwedl jich w blōnd bârzdō welk'ij (67b8).

Літаральны пераклад: Не бачыш ты і тых, якія змовіліся супраць іх. Пэўна яны гавораць: "Верым у тое, што паслана табе і што паслана перад табою". Яны хочуць, каб вас прывялі да паслушэнства да сваіх падманшчыкаў – Ка'ба ібн Аль-Ашрафа. І ім самім загадана, каб яны не верылі гэтаму падманшчыку, бо праз яго Шатан хоча звесці іх у вельмі вялікі зман.

Каранічны *Тагут* (*Ṭāġūt*; літар.: ідал) у дадзеным вершы **Q**(4:61) звычайна атаясамліваецца каментатарамі Карана з Ка'бам ібн аль-Ашрафам (Ka'b ibn al-Ašraf). Юдэй Ка'б ібн аль-Ашраф быў праціўнікам Мухамада. Ён пісаў ганебныя вершы на мусульман і нацкоўваў у Меццы племя курайш на Мухамада і мусульман. Пасля бітвы пры Ухудзе (625 г.), якая скончылася паразай мусульман, Ка'ба ібн аль-Ашрафа завабілі ў пастку і забілі, як кажуць, на загад Мухамада[6].

---

[4] Параўн.: Suter (1993).

[5] **Q**(4:61): "Ці не бачыў ты тых, хто сцвярджае, што яны ўверавалі ў тое, што паслана табе і тое, што было паслана перад табою? Яны хочуць звяртацца за судом да *Тагута*, а ім загадана, каб яны не верылі ў яго! А Шайтан хоча ўвесці іх у вялікі (літар. – далёкі) зман".

[6] Пра *Каба б. аль-Ашрафа* гл. артыкул В.М. Вата ў EI-2: "When Muhammad asked for someone to rid him of this man, Muhammad b. Maslama offered. He collected four others, including Ka'b's fos-

2.1.2. Знаўца Пісання Абд Алаг ібн Салям

У наступным вершы прыводзіцца імя медынскага юдэя, які на падставе юдэйскага Пісання прызнаў Мухамада прарокам і таму перайшоў у ісламізм: **Q**(46:11) {**qul a-ra'aytum in kāna min 'indi llāhi wa-kafartum bi-hī wa-šahida šāhidun min banī isrā'īla 'alā miṯli-hī fa-āmana wa-stakbartum inna llāha lā yahdī l-qawma ẓ-ẓālimīna**}[7]

mōw ja muchemmed či-ne-widzice jeśli jest ōd pana bōga ā jemū newernikami bendzece w tim ā i świádk'ī wiświedčają iz sinōw izra'elśk'ich 'ebdullah sīn śelamōw i brat jegō jamin na pōdōbenstwo korānne że muchemmed jest prōrōk ūweril w negō ā wī pōdneśliśce-śe w picha i dwuličnōśc bō pewne pan bōg ne-prōwadzi na drōge prawdziwą lūdzej newernich kriwdnikōw (412a2).

Літаральны пераклад: Кажы, о Мухамад: "Ці вы не бачыце, калі ён ад Пана Бога, а вы Яму будзеце няверні кам і ў гэтым, а сведкі сведчаць з сыноў ізраільскіх, Абд Алаг ібн Салям і яго брат Йамін, пра падабенства каранічнае, што Мухамад – прарок. Ён паверыў у яго, а вы ўзнесліся ў гонары і двудушнасці, бо пэўна Пан Бог не вядзе па праўдзівай дарозе людзей няверных, крыўднікаў".

Для канкрэтызацыі арабскага даслоўнага тэксту {**wa-šahida šāhidun min banī isrā'īla**} = "а сведка з сыноў Ізраіля засведчыў" мусульманскія каментатары прыводзяць імя *Абд Алаг б. Салям*. Яго першапачатковае імя было *аль-Хусайн*; імя *Абд Алаг* ён атрымаў непасрэдна ад прарока Мухамада. *Абд Алаг б. Салям* (пам. 663/4) быў адным з тых юдэяў, якія, будучы пераканаными ў тым, што Мухамад – гэта прадказаны ў юдэйскім Пісанні прарок, адразу па прыбыцці яго ў Медыну прынялі іслам[8].

2.1.3. Геаграфічны каментар: Масул

У вершы **Q**(11:44) знаходзіцца ў якасці каментару геаграфічная заўвага пра гару *Джудзі*, на якой, паводле Карана, спыніўся Ноеў каўчэг:

---

ter-brother Abū Nā'ila b. Salāma. By pretending to have turned against Muhammad they enticed Ka'b out of his *uṭum* (fort, castel) on a moonlight night and killed him in spite of his vigorous resistance".

[7] **Q**(46:11): "Скажы: "Ці бачылі вы, што ён (г.зн. Каран) ад Алага, а вы не паверылі ў яго. А сведка з сыноў Ізраіля засведчыў пра падабенства яго і ўверавaў, а вы ўзвялічыліся. Сапраўды, Алаг не вядзе прама народ злачынцаў".

[8] Пра Абд Алага б. Саляма гл. артыкул Горавіца (J. Horovitz) у EI-2: "In Muslim Tradition he has become the typical representative of that group of Jewish scribes which honored the truth, admitting that Muhammad was the prophet predicted in the Thora, and protecting him from the intrigues of their co-religionists".

Q(11:44) {**wa-qīla yā arḍu bla'ī mā'a-ki wa-yā samā'u aqli'ī wa-ġīḍa l-mā'u wa-quḍiya l-amru wa-stawat 'alā l-ǧūdīyi wa-qīla bu'dā lī-l-qawmi ẓ-ẓālimīna**}[9]

i reklō śe i źemjá pōlikaj wode swoje ā tī ž nebō zawścōngnī dežǧ swoj woda i stalō śe dōšic mōci i prikezanū i stal kōrabl na ǧūdije gōrī ktōra jest w mūsile i reklō śe ōddalaj-śe i ne spōlkūjce z-lūdzemi[10] *zalimśk'imi*[11] *k'afirmi*[12] (174a8).

Літаральны пераклад: І было сказана: "О зямля, праглыні ваду тваю, а ты, неба, спыні дождж свой, ваду!" І стала досыць моцы, і было загадана, і стаў карабель на Джудзі гары, якая ў Масуле. І было сказана: "Аддаляйся і не спалучайцеса з людзьмі злачыннымі, нявернікамі".

Горад Масул (ар. *Mawṣil*) ляжыць на поўначы Ірака. Заўвага, што гара Джудзі знаходзіцца каля Масула, не вынікае з арабскага арыгінальнага тэксту.

2.1.4. Скасаванне: "nāsiḫ" і "mansūḫ"

Вершы **Q**(4:16) і **Q**(4:17) абмяркоўваюць увогуле распусту (ар. *al-fāḥiša*), якая ў тэксце тэфсіра тлумачыцца як парушэнне шлюбнай вернасці. У лонданскім тэфсіры на аркушы 62a5 знаходзіцца верш:
Q(4:16) {**wa-llātī ya'tīna l-fāḥišata min nisā'i-kum fa-stašhidū 'alay-hinna arba'atan min-kum fa-in šahidū fa-amsikū-hunna fī l-buyūti ḥattā yatawaffā-hunna l-mawtu aw yaǧ'ala llāhu la-hunna sabīlan**} **Q**(4:17) {**wa-llaḏāni ya'tiyāni-hā min-kum fa-aḏū-humā fa-in tābā wa-aṣlaḥā fa-a'riḍū 'an-humā inna llāha kāna tawwāban raḥīman**}[13]

i te newjásti ktōre jeślī wistōnpą w nečistō cūdzolōstwa iz žōn wašich ōświedčajce-śe na nich čtirma świątkami z-was sprawedliwich ā jeślī wiświądčą pretō zamknice jich w dōm albō w tūrma āž zamōrī jich hanbą i śmercą ālbō ūčini pan bōg dla nich drōge ten ājet' menśūch te dwoje ktō prijdą pōjmani na cūdzōlōstwe z-was pretō karajca jich ōbōjich ā jeślī pōkajōn-śe i pri' ōbecūją bic statečnimi ōdwrōcce ōd nich pewne pan bōg jest kajeta prijmūjōncij milōserdnij (62a5).

Літаральны пераклад: А тыя жанчыны, якія калі ўступяць у нячысты пярэлюб, з жонак вашых – сведчыце на іх чатырма сведкамі з вас справядлівых.

---

[9] **Q**(11:44): "І было сказана: "О зямля, праглыні ваду тваю, о неба, устрымайся"! І спала вада, і здзейсніўся загад, і спыніўся ён на аль-Джудзі, і было сказана: "Далоў народ злачынцаў!"

[10] У выразе *z-lūdzemi* канчатак *-emi* належыць разглядаць як арфаграфічную памылку; была напісана *fatḥa* = *e* замест знака *sukūn*, які абазначае адсутнасць галоснага.

[11] Ар. *ẓālim* = злачынец.

[12] Ар. *kāfir* = нявернік.

[13] **Q**(4:16): "А тыя з вашых жанчын, якія ўчыняць пярэлюб – і засведчаць супраць іх чатыры з вас; і калі яны засведчаць, то трымайце іх у дамах, пакуль не спасцігне іх смерць альбо Алаг учыніць для іх шлях". **Q**(4:17): "А тым дваім з вас, якія зробяць гэта, прычыніце пакуты. А калі яны раскаюцца і зробяць добрае, то адвярніцеся ад іх. Сапраўды, Алаг прымае пакаянні, Міласэрны".

А калі яны засведчаць, то замкніце іх у доме альбо ў турме, пакуль не заморыць іх ганьбай і смерцю, альбо ўчыніць Пан Бог для іх дарогу. Гэты аят мансух (скасаваны). Тыя два, хто прыйдуць злоўленыя на пярэлюбе, з вас – то пакарайце іх абодвух. А калі пакаюцца і паабяцаюць быць паважнымі – адвярніцеся ад іх. Пэўна, Пан Бог прымае пакаянні, Міласэрны.

Тут выяўляецца круг праблем, звязаных са скасаваннем асобных вершаў Карана праз іншыя, пасланыя пазней вершы, якія супярэчаць папярэдняму патрабаванню і яго адмяняюць. Знаўцы Карана пазначаюць скасаваныя месцы тэксту праз *terminus technicus mansūḫ* (які касуецца) і тэкст, які касуе, тэрмінам *nāsiḫ* (які касуе).

У вышэйпрыведзеным тэксце ў падрадковым перакладзе ўжываецца ў якасці экзегетычнага каментару арабскі *terminus technicus mansūḫ* (той, які касуецца), якім папярэдні тэкст пазначаецца як скасаваны. З падрадковага перакладу складваецца ўражанне, што тэкст верша **Q**(4:17), які ідзе непасрэдна потым, з'яўляецца тэкстам, які касуе (*nāsiḫ*), што пацвярджаецца тэкстам тэфсіра, у якім праз паўтарэнне слова "пярэлюб" ствараецца тэкстуальная кагерэнтнасць з папярэднім вершам.

У арабскім жа тэксце маецца на ўвазе нешта іншае. Абодва вершы **Q**(4:16) і **Q**(4:17) стаяць паралельна і адзін раз гавораць пра жанчыну, якая займаецца распустай, і адзін раз пра мужчыну, які робіць падобнае. Паколькі верш **Q**(4:17) арабскага тэксту ў адрозненне ад папярэдняга верша **Q**(4:16) змяшчае толькі формы мужчынскага роду, то верш **Q**(4:17) належыць аднесці да распусты паміж мужчынамі і тым самым тлумачыць як паралель, а не як працяг верша **Q**(4:16)[14].

На погляд мусульманскіх каментатараў, верш **Q**(4:16) касуецца не праз верш **Q**(4:17), а праз верш **Q**(24:2). У тэксце тэфсіра на аркушы (279a4) мы знаходзім гэтае месца:

Q(24:2) {**az-zāniyatu wa-z-zānī fa-ğlidū kulla wāḥidin min-humā mi'atu (!= mi'ata) ğaldatin wa-lā ta'ḫuḏu-kum bi-himā ra'fatun fī dīni llāhi in kuntum tu'minūna bi-llāhi wa-l-yawmi l-āḫiri wa-l-yašhad 'aḏāba-humā ṭā'ifatun mina l-mu'minīna**}[15]

cūdzōlōžnica newasta i cūdzōlōžnik menžčizna pretō bijce ōnich kōždegō ź nich ōbōjich s-tich ōbōjich pō stū k'ijōw i nech was ne-bere na tich ōbōjich ūžalene

[14] Табары прыводзіць тры агульнапрынятыя ў каментатараў тлумачэнні: 1) Гаворка ідзе пра распусту паміж жанатым мужчынам і замужняй жанчынай. 2) Верш мае на ўвазе нежанатага маладога мужчыну і незамужнюю маладую жанчыну. 3) Падразумяваецца распуста паміж двума мужчынамі. Апошняе тлумачэнне самае распаўсюджанае сярод каментатараў. (Пераклад на нямецкую мову Парэта таксама паўтарае трэцяе тлумачэнне.)

[15] **Q**(24:2): "Пералюбніка і пералюбніцу – лупцуйце, і кожнаму з іх – сто ўдараў. І няхай не ахопіць вас спачуванне да іх у рэлігіі Алага, калі вы верыце ў Алага і апошні дзень. І няхай прысутнічае пры іх пакаранні грамада вернікаў".

w prikezanū bōžžim jeśli jesteśce wī werōncimi panu bōgū i w dzen ōstatnij strašnij pretō źbirajce-śe na pōkarana jich grōmada lūdzej z-muśulman werōncich (279a4).

Літаральны пераклад: Пералюбніца-жанчына і пералюбнік-мужчына – таму біце гэтых, кожнага з іх абодвух, з тых абодвух, па сто кіёў, і няхай вас не бярэ на тых абодвух жаль у загадзе Божым, калі вы верыце ў Пана Бога і ў апошні страшны дзень. Таму збірайцеся на пакаранне іх грамадой людзей з вернікаў-мусульман.

Верш **Q**(24:2) яшчэ дадаткова каментуецца ў глосе:

k'edī mlōdzenec i pânnâ zblōndzą tedī pōsašic i wipendzic z-masta ābō ze-wśi ã jeśli žōnatij iz-menžatą pasašic ã pōtim na križōwej drōdze ūkapac i kamenmi zabic (294a4).

Літаральны пераклад: Калі малады чалавек і панна саграшаць, тады схапіць і выгнаць з горада або з вёскі. А калі жанаты з замужняй – схапіць, а потым на крыжовай дарозе закапаць і каменьмі забіць.

У тэксце тэфсіра наогул адсутнічаюць указанні на іншыя вершы Карана з дапамогай тэхнічнай сістэмы спасылак. Такім чынам, у дадзенай глосе таксама няма ніякіх спасылак на вершы **Q**(4:16) і **Q**(4:17).

2.1.5. Боства "Дагон"

У якасці прыкладу экзегетычнай інфармацыі, якая адсутнічае ў ат-Табары, можа паслужыць верш **Q**(39:18), у якім каранічны ідал *Тагут* ідэнтыфікуецца з паганскім боствам *Дагонам*:

Q(39:18) {**wa-llaḏīna ǧtanabū ṭ-ṭāġūta an ya'budū-hā wa-anābū ilā llāhi la-humu l-bušrā fa-baššir 'ibādī**}[16]

ã ci ktōre wisteregali-śe dagōnōw ābi-śe jim ne-klanali nawrōcili-śe dō bōga pâna dla nich jest świjástōwane pretō świjástūj slūg mōjich (376b6).

Літаральны пераклад: А тыя, якія сцерагліся дагонаў, абы ім не кланяцца, звярнуліся да Бога Пана, – для іх ёсць дабравешчанне, таму апавясці слуг маіх.

Атаясамліванне каранічнага ідала *Тагута* са старажытным усходнім боствам *Дагонам* стала сустракаецца ў тэксце тэфсіра. Такая ідэнтыфікацыя Тагута выходзіць за рамкі звычайных інтэрпрэтацый. У сваім тлумачэнні ат-Табары атаясамлівае *Тагута* ў залежнасці ад кантэксту з сатаной (ар. *šayṭān*) альбо прадракальнікам і паганскім жрацом (ар. *kāhin*, мн. л. *kuhhān*)[17].

---

[16] **Q**(39:18): "А тыя, якія пазбягаюць Тагута, каб не пакланяцца яму, і якія раскаяліся перад Алагам – ім радасная вестка, абрадуй рабоў Маіх".

[17] Гл. у Табары каментар да **Q**(2:256).

Дагон засведчаны ў якасці галоўнага боства вавіланян і асірыйцаў у вобласці сярэдняга Еўфрата (з галоўным культавым цэнтрам Тэрка ў Мары) з 2500 г. да н.э. Аднак гэты культ быў распаўсюджаны па ўсёй Пярэдняй Азіі да ўзбярэжжа Міжземнага мора (Палестына, Угарыт). *Дагон* часта паказваецца як боства ў абліччы рыбы з чалавечым тварам, а таксама рукамі і нагамі. У якасці сімвала боства часта з'яўляецца таксама колас[18]. Застаецца няясным, з якой крыніцы пачарпнуў сваю інтэрпрэтацыю перакладчык "літоўскага" тэфсіра.

2.2. Экзегетычная парафраза

Часта арабскі тэкст у тэфсіры перакладаецца не даслоўна, а пераказваецца. Пры гэтым тэкст набывае дадатковую экзегетычную інфармацыю. Тэалагічныя канцэпты, якія раскрываюцца ў такога кшталту экзегетычных парафразах, можна знайсці ў мусульманскіх каментатараў Карана.

2.2.1. Паняцці "tanzīh" і "tawḥīd"

Тыповы прыклад экзегетычнай парафразы каранічнага тэксту знаходзіцца ў вершы **Q**(7:207):

Q(7:207) {**inna llaḏīna 'inda rabbi-ka lā yastakbirūna 'an 'ibādati-hī wa-yusabbiḥūna-hū wa-la-hū yasǧudūna**}[19]

> *pewne ci ktōre pri bōgū twemu ănjōlōwe ne-wiličōn-śe i ne-zbranajōn-śe ōd pōslūg jegō i chwalōn-gō i ōčiščajōn-gō ōd balwanow ōd spōlenčnikōw i jemū twarem nizkō klanajōn-śe* (136b7).
>
> Літаральны пераклад: Пэўна, тыя, якія пры Богу тваім – анёлы незлічоныя – і яны не адмаўляюцца ад паслуг Яму, і ўсхваляюць Яго, і ачышчаюць Яго ад ідалаў, ад супольнікаў, і Яму тварам нізка кланяюцца.

Арабскі дзеяслоў *sabbaḥa* = "усхваляць, праслаўляць" у тэксце тэфсіра перадаецца ў выглядзе парафразы. Замест аднаго польскага дзеяслова ў тэфсіры ўжываюцца два дзеясловы. Першы дзеяслоў *chwalić* (хваліць) дае літаральны пераклад арабскага дзеяслова, а з другім дзеясловам *oczyszczać* (ачышчаць) у тэкст уносіцца дадатковае значэнне.

Дадаткова прыведзены экзегетычны канцэпт "ачышчэнне" можа быць знойдзены непасрэдна ў арабскіх каментатараў Карана. У "Тафсіры аль-Джаляляйн" верш **Q**(7:207), напрыклад, каментуецца наступным чынам:

---

[18] Наконт Дагона (альбо Дагана) гл.: Reallexikon der Assyrologie (1938); Die Religion in Geschichte und Gegenwart. Handwörterbuch für Theologie und Religionswissenschaft (1958). (Гл. таксама: Мифологический словарь (М., 1992), с. 169; слоўнікавы артыкул "Дагон" – *заўв. перакл.*).

[19] **Q**(7:207): "Сапраўды, тыя, хто пры Госпадзе тваім, не ўзвялічваюцца над служэннем Яму, а ўсхваляюць Яго і Яму пакланяюцца".

"{**Сапраўды, тыя, якія пры Госпадзе тваім,**} *гэта значыць: анёлы* {**не ўзвялічваюцца**} *не ганарацца* {**над служэннем Яму, а ўсхваляюць Яго**} *яны ачышчаюць Яго ад таго, што не вартае Яго* {**і Яму пакланяюцца**} *гэта значыць: яны пераконваюць Яго ў пакорнасці і падпарадкаванні; і будзьце як яны!*"[20]

Каранічная форма дзеяслова *yusabbiḥūna* (яны ўсхваляюць) парафразуецца ў "Тафсіры аль-Джаляляйн" праз дзеяслоў *nazzaha* = "ачышчаць". З гэтым дзеясловам звязана ісламскае тэалагічнае паняцце *tanzīh*[21] = "аддаленасць Бога ад нябоскіх, чалавечых атрыбутаў". Паняцце *tanzīh* змяшчае "трыманне ў чысціні" Бога ў сэнсе ісламскага *tawḥīd*[22], вучэння пра абсалютнае адзінства і надзвычайнасць Алага, побач з якім не існуюць іншыя багі: *lā ilāha illā llāh* (Няма Бога акрамя Алага).

Абодва паняцці *tanzīh* і *tawḥīd* ствараюць, такім чынам, тэалагічны падмурак для парафрастычнага тэксту "літоўскага" тэфсіра: *chwalią go i oczyszczają go od bałwanów od spółeczników* (яны хваляць яго і ачышчаюць ад ідалаў і супольнікаў)[23].

2.3. Пераклад "слова за словам"

Тэкст тэфсіра ўяўляе сабою падрадковы пераклад арабскага тэксту Карана. Зразумела, што пры гэтым арабскі арыгінал аказвае істотны ўплыў на форму і структуру тэксту перакладу.

Значныя фрагменты арабскага тэксту Карана з'яўляюцца паэтычна структураваным тэкстам з падзелам на вершы, канцоўкі якіх часта адзначаныя рыфмамі. Гэты падзел на вершы з канцавымі рыфмамі не можа быць перададзены ў перакладзе. Канцоўкі вершаў у тэксце тэфсіра таксама часта ігнаруюцца, бо пераклад зроблены сінтагмамі або сказамі, якія парушаюць верш.

Рэкурэнцыя асобных фраз і фрагментаў тэксту – вельмі выразная асаблівасць тэксту Карана. Такія паўторы выконваюць у арабскім тэксце структурную функцыю і абмяжоўваюць асобныя значныя часткі тэксту. Так у некаторых месцах праявілася тыповая для рэлігійнага тэксту шаблоннасць, якая адначасова з'яўляецца асаблівасцю вуснай паэзіі і мастацтва дэкламавання.

---

[20] Гл. *Tafsīr al-Ǧalālayn* да **Q**(7:207): {**inna laḏīna 'inda rabbi-ka**} *ay: al-malā'ikatu* {**lā yastakbirūna**} *yatakabbarūna* {**'an 'ibādati-hī wa-yusabbiḥūna-hū**} *yunazzihūna-hū 'ammā lā yalīqu bi-hī* {**wa-la-hū yasǧudūna**} *ay: yaḫuṣṣūna-hū bi-l-ḫuḍū'i wa-l-'ibādati fa-kūnū miṯla-hum*".

[21] Фармальна слова *tanzīh* адпавядае аддзеяслоўнаму назоўніку II пароды (марфемны тып: *fa''ala*, *taf'īl*) кораня *nzh*, які мае асноўнае значэнне "быць чыстым, свабодным альбо далёкім".

[22] Слова *tawḥīd* з'яўляецца аддзеяслоўным назоўнікам ад II пароды (марфемны тып: *fa''ala*, *taf'īl*) кораня *wḥd*, які мае асноўнае значэнне "быць адным, адзіным, непараўнальным". II парода ад гэтага кораня гучыць *waḥḥada* і абазначае "аб'ядноўваць; злучаць; лічыць Бога адзіным; быць монатэістам".

[23] Супольнікаў Бога ў тэфсіры звычайна абазначаюць словамі *bałwan* (ідал), *społecznik* (супольнік), *siabr* (сябар, кампаньён).

2.3.1. Пераклад рыфмаванай фразы

У тэксце Карана сустракаюцца паўторы тыповых рыфмаваных фраз, якімі заканчваюцца асобныя вершы і адзначаюць вершаваны канчатак. Канкрэтны прыклад рыфмаванай фразы і параўнанне яе перакладу ў розных месцах тэксту тэфсіра дазваляе нам пазнаёміцца з метадам працы перакладчыка. Рыфмаваная фраза {**wa-mimmā razaqnā-hum yunfiqūna**} (і з таго, што Мы ім падаравалі на пражыццё, яны ахвяруюць) шэсць разоў сустракаецца ў Каране:

Q(2:3) (6a3) *i s-tegō cō śmi īm riźkū*[24] *nadalī mne ōfarūją*
Q(8:3) (137a6) *i s-tegō cō ōbdarōwališmi īm widają źek'at*[25] *i dzešencine i sedeko*[26]
Q(22:35) (267b5) *i te cō z-risku swegō ōfarūją sedeko*
Q(28:54) (315b6) *ōd tegō cō nadarilišmi jich činą ōfari gwolī bōgū*
Q(32:16) (337a8) *i z-danich jim pōžitkōw lōnčali jalmūžna*
Q(42:38) (399a6) *i s-tegō cō dališmi risk jim dadzą na ōfare bōžą*

Высвятляецца, што рыфмаваная фраза ў перакладзе ніводнага разу не паўтараецца ў аднолькавым выглядзе. У розных месцах яна перакладаецца з рознымі тэкстуальнымі нюансамі. Прыклад паказвае, што перакладчык перадаваў арабскі тэкст без звароту да папярэдніх ідэнтычных частак тэксту. Разуменне ж арабскага тэксту застаецца аднолькавым ва ўсіх прыкладах.

2.3.2. Літаральнае адлюстраванне арабскага тэксту

Большай часткай тэкст тэфсіра ідзе строга паралельна арабскаму тэксту Карана і ўяўляе сабою літаральную перадачу арабскага арыгінала на польскай мове. Тыповы фрагмент тэксту знаходзіцца ў Лонданскім тэфсіры, напр., на аркушы (197b5):
Q(14:6) {**wa-laqad |1 arsalnā |2 mūsā |3 bi-āyāti-nā |4 an |5 aḫriǧ |6 qawma-ka |7 mina ẓ-ẓulumāti |8 ilā n-nūri |9 wa-ḏakkir-hum |10 bi-ayyāmi llāhi |11 inna fī ḏālika |12 la-āyātin |13 li-kulli ṣabbārin |14 šakūrin**}[27]

wšakże |1 *pōslališmi* |2 *mōjżeša* |3 *z-cūdami našimi* |4 *mowonc że* |5 *wiprōwadz* |6 *lūd swoj* |7 *ōd cemnegō blendū* |8 *na świątlō* |9 *i pripōmni jim* |10 *dnī bōżże* |11 *w ktōre dnī keral newernich pewne w tim jest i bendze* |12 *priklad i na'ūke* |13 *wšitk'im cerpliwim* |14 *chwalcōm bōżżim* (197b5).

Літаральны пераклад: Паслалі ж Мы Майсея з цудамі нашымі, кажучы, што вывядзі люд свой ад цёмнай памылкі да святла і нагадай ім дні Божыя – дні,

[24] Ар. *rizq* = сродкі для пражыцця.

[25] Ар. *zakā* = абавязковая міласціна.

[26] Ар. *ṣadaqa* = міласціна.

[27] **Q**(14:6): "Мы паслалі Майсея з нашымі знамяннямі: "Вывядзі народ твой з цемры да свету і нагадай ім пра дні Алага. Сапраўды, у гэтым знаменні для кожнага цярплівага, удзячнага".

> у якія Ён караў няверных – пэўна, у тым ёсць і будзе прыклад і навука ўсім цярплівым, якія ўсхваляюць Бога.

Інтэрпаляваны каментар (у транслітарацыі для яснасці падкрэслены) паясняе каранічны тэкст "нагадай ім дні Бога", які незразумелы і таму патрабуе тлумачэння. Праз гэтую інтэрпаляцыю каментару ў тэфсіры ўзнікае разрыў у тэксце, што з'яўляецца характэрным для структуры падрадковага перакладу.

У перакладзе "слова за словам" для экзегетычнага пашырэння арабскіх паняццяў часта ўжываецца фігура *гендыядыс*. У вершы **Q**(4:96) мы знаходзім наступныя тыповыя адпаведнікі: ар. **ḍarar** (шкода) – польск. *zawada* (перашкода), *trudność* (цяжкасць); ар. **faḍḍala** (аддаваць перавагу) – польск. *wybrać* (выбраць), *powyszyć* (павысіць); ар. **al-ḥusnā** (найлепшае) – польск. *zapłata* (узнагарода), *raj* (рай); ар. **aǧr** (плата) – польск. *zapłata* (узнагарода), бел. *spasienie* (выратаванне):

Q(4:96) {**lā yastawī l-qā'idūna mina l-mu'minīna ġayru ūlī ḍ-ḍarari wa-l-muǧāhidūna fī sabīli llāhi bi-amwāli-him wa-anfusi-him faḍḍala llāhu l-muǧāhidīna bi-amwāli-him wa-anfusi-him 'alā l-qā'idīna darağatan wa-kullan wa'ada llāhu l-ḥusnā wa-faḍḍala llāhu l-muǧāhidīna 'alā l-qā'idīna aǧran 'aẓīman**}[28]

> *ne-mōże bic rōwnij śedzōncij dōma iź muśulman cō ne idą na-wojna nemajōnc žadnej zawadī i trudnōści is-timi gazijami*[29] *ō wjára bōžžą ānī skarbem īch i dūši jich bō wibral i pōwišil bōg gazijōw i[s]-skarbami-jich i z-dūšami jich lepej nad ṣedzōncich dōma pōwišenjam nebesk'im i kōždemū ź nich ōpisal pan bōg dōbrą zaplatō raj i pōwelbil pân bōg gazijōw barzdō nad tich cō dōma śedzōncich zaplatō i spaṣenōm welk'im* (72b2).

> Літаральны пераклад: Не можа быць роўным той, хто сядзіць дома, з мусульман, што не ідуць на вайну, не маючы ніводнай перашкоды і цяжкасці, з тымі газіямі веры Божай ані скарбам іх і душамі іх, бо выбраў і павысіў Бог газіяў і са скарбамі іх і з душамі іх лепей над тымі, што сядзяць дома, павышэннем нябесным. І кожнаму з іх апісаў Пан Бог добраю ўзнагародаю рай. І ўшанаваў Пан Бог газіяў вельмі над тымі, што дома сядзяць, узнагародаю і ўратаваннем вялікім.

У дадзеным фрагменце тэксту можна канстатаваць хістанне паміж формамі адзіночнага і множнага ліку. Вышэйзгаданае месца тэксту – *ani skarbem ich*

---

[28] **Q**(4:96): "Не раўняюцца тыя з вернікаў, што сядзяць, не маючы шкоды, і тыя, што стараюцца на шляху Алага маёмасцю іх і душамі іх. Алаг даў перавагу на ступень тым, што стараюцца маёмасцю іх і душамі іх, над тымі, што сядзяць. Усім паабяцаў Алаг найлепшае і даў Алаг перавагу тым, што стараюцца, над тымі, што сядзяць, вялікаю ўзнагародаю".

[29] Гл. >>> 3.1.1. Арабскае "*ġāzī*" (змагар за веру).

i duszy ich (ані скарбам іх і душамі іх) – датычыць дзейніка ў адзіночным ліку: *doma siedzący* (той, хто сядзіць дома). Аднак у арабскім тэксце скрозь сустракаюцца формы множнага ліку як імён, так і займеннікаў. Тое, што на пачатку верша перакладчык перадаў арабскі множны лік **al-qā'idūna** (тыя, што сядзяць) на польскай мове як адзіночны лік (*siedzący*), абумоўлена формай адзіночнага ліку арабскага дзеяслова, які пачынае сказ: **yastawī** (ён роўны; ён на аднолькавым узроўні). Форма дзеяслова ўтварае выказнік у арабскім дзеяслоўным сказе: **lā yastawī l-qā'idūna […] wa-l-muǧāhidūna** (Не роўны тыя, што сядзяць, і тыя, што стараюцца). Суб'екты дзеяння, якое перадаецца дзеясловам, стаяць у множным ліку, а форма дзеяслова – у адзіночным ліку. Правілы кангруэнцыі ў арабскім дзеяслоўным сказе, у якім дзеяслоў стаіць на пачатку, дазваляюць такую камбінацыю. Спачатку перакладчык згодна з арабскім тэкстам перадаў дзеяслоўную форму як адзіночны лік, а пасля ён перадаў таксама ў адзіночным ліку дзейнік, які непасрэдна ідзе за ім, насуперак арабскай форме множнага ліку. Толькі далей у тэксце, з узрастаннем адлегласці ад уводнай дзеяслоўнай формы, ён ужыў формы множнага ліку ў адпаведнасці з арабскім тэкстам.

Таксама тыповай з'яўляецца ў тым самым вершы **Q**(4:96) наступная структура, якая ўзнікла праз канкурэнцыю з другой канструкцыяй: *pōwelbil pân bōg gazijōw barzdō nad tich cō dōma śedzōncich*. Перакладчык перадаў на польскай мове арабскі дзеепрыметнік незалежнага стану **al-qā'idūna** (тыя, што сядзяць) згодна з формай у арабскім арыгінале: *siedzących*. Але перад тым у працэсе перакладу ён памылкова прыняў адносны даданы сказ за далейшы працяг тэксту і таму паставіў адносны займеннік *co* (што), які потым праз наступны дзеепрыметнік стаў недарэчным.

2.3.3. Пранаміналізацыя і адносны даданы сказ

Уплыў арабскага сінтаксісу характэрна праяўляецца ў пранаміналізацыі. Часта род займенніка і назоўніка-антэцэдэнта не супадае, таму што ў арабскай і польскай мовах яны належаць да розных родаў:
Q(29:35) {**innā munzilūna 'alā ahli hāḏihi l-qariyati riǧzan mina s-samā'i bi-mā yafsuqūna**} **Q**(29:36) {**wa-la-qad taraknā min-hā āyatan bayyinatan li-qawmin ya'qilūna**}[30]

bō zapewne mī spūścimi dežğ na lūdzī tegō meškana śarke ōgen i kamene kerane źneba a tō za tō że bili lōtrami źwedzōnimi i zapewne te mastō zōstawiliśmi ją pūste na priklad znak'em lūdzem rōzūm majōncim (232a1).

Літаральны пераклад: Бо, напэўна, Мы спусцілі дождж на людзей гэтага паселішча – серу, агонь і камяні, – пакаранне з неба. І гэта за тое, што яны былі

[30] **Q**(29:35-36): "Сапраўды, Мы пашлем на жыхароў гэтага горада пакаранне з неба за тое, што яны былі распуснікамі. Мы пакінулі ад гэтага яснае знаменне для людзей разумных".

нягоднікамі падманутымі. І, напэўна, гэты горад мы пакінулі яе пустым для прыкладу, знакам людзям, якія маюць розум.

Займеннік *ją* (ж.р. адз. л.) не супадае ў родзе з назоўнікам *miasto* (н. р. адз. л.), інтэрпаляваным у якасці каментару. Займеннік *ją* залежыць непасрэдна ад арабскага тэксту, дзе яму адпавядае займеннік **-hā**, які належыць да назоўніка жаночага роду **qariya** (вёска, горад) з папярэдняга верша **Q**(29:35).

Характэрныя структуры ў тэксце тэфсіра ўтвараюцца з прычыны пераймання займеннікаў, якія ў арабскім адносным даданым сказе адсылаюць да назоўніка-антэцэдэнта ў галоўным сказе. Гэтыя займеннікі ў арабскай мове павінны абавязкова існаваць, а ў польскай мове – не. Граматычная структура арабскага адноснага даданага сказа адпаведна перадаецца на польскай мове слова за словам разам з займеннікамі:

Q(16:65) {**wa-mā anzalnā ʻalay-ka l-kitāba illā la-tubayyina (!= li-tubayyina) la-humu llaḏī ḫtalafū fī-hi wa-hudan wa-raḥmatan li-qawmin yu'minūna**}[31]

ne-zeslališmi tōbe korān na prōžnō tilkō żebiś ōznajmil jim te warą w ktōrej sprečają z-wami w tej ã tō jest direkciją wam na dōbrą drōgą dō lask'i našej dla lūdzej temū werōncich (212b5).

Літаральны пераклад: Не паслалі Мы табе Каран дарэмна – толькі каб ты азнаёміў іх з той верай, у якой яны спрачаюцца з вамі ў гэтай, а гэта ўказанне вам на добрую дарогу да ласкі Нашай для людзей, якія вераць гэтаму.

У адносным даданым сказе прыведзенага прыкладу займеннік прыназоўнікавай фразы паказвае на назоўнік-антэцэдэнт *wiara* (вера) у галоўным сказе. Згодна з польскай структурай сказа ўступная прыназоўнікавая фраза была створаная, аднак, ужо праз адносны займеннік *w ktōrzej* (у якой), з-за чаго становіцца залішняй прыназоўнікавая фраза, запазычаная з арабскага адноснага даданага сказа.

Менавіта так належыць разумець займеннікі ў наступных прыкладах: *albō ōdpūści ten ktōrij cō w renkū jegō źwonzek ślūbū* (32a4), *jeśli bendze ten ktōrij jegō jest' skarb bezrōzumnij ãlbō mlōdij* (38b2), *mōw ī muchemmed śmerc jest ta ktōre ūcekace wī ōd nej ã ōna jest približajōnca i zlōnči-śe z-wami* (454b2), *widzalem cō wi ne-widzeli tegō* (252b8), *i cį ktōre w sercu jich chōrōba i newernōśc* (340a2).

2.3.4. Састаўныя часавыя формы kāna + імперфект

Камбінацыяй дапаможнага дзеяслова *kāna* (быць) і асноўнага дзеяслова ў арабскай мове ўтвараюцца састаўныя часавыя формы, якія больш дакладна апісваюць ход дзеяння ў мінулым альбо ў будучыні. Часцей за ўсё сустракаюцца

[31] **Q**(16:65): "Мы паслалі табе Кнігу толькі для таго, каб ты растлумачыў ім тое, у чым яны нязгодныя (паміж сабой) – і просты шлях і крыха для вернікаў".

аналітычныя формы прошлага часу паводле ўзору *kāna* + імперфект, якімі апісваецца дзеянне, што працягвалася або паўтаралася ў мінулым. Адлюстраванне такіх састаўных часавых формаў у польскай мове адбываецца ў выглядзе характэрных для тэфсіра канструкцый, а менавіта ў камбінацыі формаў дзеяслова *być* (быць) з дзеепрыметнікам незалежнага стану[32]:
Q(30:11) {**ṯumma kāna 'āqibatu llaḏīna asā'u (!= asā'ū) s-su'a an kaḏḏabū bi-āyāti llāhi wa-***kānū bi-hā yastahzi'ūna*}[33]

pōtim stal kōnec tich ktōre bōgū rōwnōśc činili menka bila ōtō s-tej pričini że klamali na pišme bōże korān i bili ōni na tō żartūjōncimi (327a7).

Літаральны пераклад: Потым паўстаў канец тых, якія Богу рабілі роўнасць. Пакута была. Гэта з той прычыны, што яны лгалі на пісанне Божае – Каран – і былі яны над гэтым жартаўнікамі.

Тут перакладчык праз канструкцыю з дзеясловам *być* (быць) у перфекце і дзеепрыметнікам незалежнага стану *żartujący* (які жартуе) адлюстраваў у польскай мове арабскую канструкцыю. Тым самым ён дакладна схапіў сэнс арабскай канструкцыі, г.зн. адлюстраваў дзеянне, якое працягваецца або паўтараецца.

Канструкцыі тыпу *kāna* + імперфект з'яўляюцца ў Каране надзвычай часта і ў многіх выпадках іх можна сустрэць у якасці характэрных рытарычных фігур у вершавай канцоўцы. Тым самым яны ўяўляюць сабой структурную асаблівасць арабскага тэксту Карана. Гэтая структурная функцыя, як правіла, працягвае захоўвацца ў тэксце тэфсіра з дапамогаю камбінацыі *być* + дзеепрыметнік незалежнага стану ў польскай мове:
Q(29:9) {**wa-waṣṣaynā l-insāna bi-wāliday-hi ḥuṣnan wa-in ǧāhadā-ka li-tušrika bī mā laysa la-ka bi-hī 'ilmun fa-lā tuṭi'-humā ilayya marǧi'u-kum fa-unabbi'u-kum bi-mā kuntum ta'lamūna**}[34]

i prikezaliśmi pilnim prikezanem lūdzōm dō rōdzicōw bic dōbrim dōbrōtliwim tilkō jeśli bendą radzici-śe s-tōbą ābi-me meli rōwnac dō čegō na-cō ne-mace w tim slūšnaj na'ūk'i mne rōwnac pretō w tim tilkō w tim ne-bōndz jim pōwolnij jeśli ōcec matka bendō newernimi bō dō mne bendze priwrōt waš i ōznajmi wam tō cō biliśce činōncimi (320a5).

Літаральны пераклад: І загадалі Мы пільным загадам людзям да бацькоў быць добрым, ласкавым. Толькі калі яны будуць радзіцца з табою, каб Мяне мелі раўняць да чаго-небудзь, пра што не маеце ў тым слушнай навукі Мяне

---

[32] Гл. таксама >>> 16.9.1. Дзеепрыметнік цяперашняга часу незалежнага стану.

[33] **Q**(30:11): "Потым, было наступствам для тых, хто рабіў злое – зло, таму што яны абвясцілі знаменні Алага лжывымі і насміхаліся з іх".

[34] **Q**(29:9): "І запаведалі Мы чалавеку дабро да яго бацькоў. І калі яны будуць старацца, каб ты дадаў Мне ў супольнікі тое, пра што ў цябе няма ведаў, то не падпарадкоўвайся ім. Вярніцеся да Мяне і Я паведамлю вам, што вы рабілі".

раўняць, – таму ў тым, толькі ў тым не будзь ім паслухмяным, калі бацька, матка будуць няверныміі. Бо да Мяне будзе вяртанне вашае, і Я паведамлю вам тое, што вы былі рабілі (320a5).

Ужыванне камбінацыі *być* + дзеепрыметнік незалежнага стану не мае падставы ў польскай граматыцы. Яна ўяўляе асабістую творчасць перакладчыка, якая абапіраецца на імкненне перадаваць сэнс арабскага тэксту на польскай мове як мага больш дакладна.

Часам замест камбінацыі *być* + дзеепрыметнік незалежнага стану ў тэксце тэфсіра ўжываецца таксама *nomen agentis*, каб перадаць арабскую канструкцыю незакончанага трывання паводле тыпу *kāna* + імперфект:
Q(43:9) {**wa-mā ya'tī-him min nabīyin illā kānū bi-hī yastahzi'ūna**}[35]

ne-prichōdzili dō nich ōd prōrōkōw tilkō bilī jim naśmewcami šidarami (401a3).

Літаральны пераклад: Не прыходзілі да іх ад прарокаў. Толькі былі ім насмешнікамі, з'едліўцамі.

Характэрна, што арабская дзеяслоўная форма **yastahzi'ūna** (яны насміхаюцца) была перададзена ў польскай мове з мэтай экзегетычнага пашырэння двума *nomina agentis*: *naśmiewac* (насмешнік), *szydarz* (насмешнік, з'едлівец). Аднак *nomen agentis* у польскай мове ў якасці прамога адпаведніка арабскім фінітным дзеяслоўным формам выкарыстоўваецца рэдка.

2.3.5. Арабскі дзеепрыметнік незалежнага стану

Nomen agentis рэгулярна з'яўляецца ў тэксце тэфсіра, каб перадаць арабскі дзеепрыметнік незалежнага стану:
Q(29:13) {**wa-qāla llaḏīna kafarū li-llaḏīna āmanū ttabi'ū sabīla-nā wa-la-naḥmil (!= wa-l-naḥmil) ḫaṭāyā-kum wa-mā-hum bi-ḥāmilīna (!= bi-ḥāmilīna) min ḫaṭāyā-hum min šay'in inna-hum la-kāḏibīna**}[36]

rekli te ktōre newernimi bili dla tich ktōre īman[37] *prijenli ūdajce-śe za nami drōgą naszą mī berem na-ṣe grechī waśe ōni ne-mōgą bic nōśicelami ōd grechōw namnejśej rečī zapewne wedz że ōni klamcami są* (320b3).

Літаральны пераклад: Казалі тыя, якія былі няверніками, тым, якія веру прынялі: "Ідзіце за намі дарогаю нашаю. Мы бярэм на сябе грахі вашыя". Яны не могуць быць носьбітамі грахоў, найменшай рэчы. Пэўна ж яны з'яўляюцца лгунамі.

---

[35] **Q**(43:9): "І не прыходзіў да іх ніякі прарок, каб яны з яго не пасмяяліся".

[36] **Q**(29:13): "І сказалі тыя, якія не паверылі, тым, якія паверылі: "Ідзіце нашаю дарогаю, а мы панясем вашыя грахі". Але не панясуць яны нічога з іх грахоў. Сапраўды, яны лгуны".

[37] Ар. *īmān* = вера.

Ужыванне дзеепрыметніка незалежнага стану замест фінітных дзеяслоўных формаў у арабскай мове шырока распаўсюджанае. Частае ўжыванне *nomen agentis* у тэксце тэфсіра ўяўляе сабой непасрэднае адлюстраванне арабскага сінтаксісу.

Наступны тыповы прыклад: *i ōdwrōc-śe ja muchemmed wiglōndaj na zgūbe jich i ōni pewne wiglōndači są na zgūbe twoje* (338b2), *ōtō tak wlašne ūčink'i činą dōbre činicelōwe* (366a3).

Структуры тыпу *kāna* (быць) + дзеепрыметнік незалежнага стану часта сустракаюцца ў Каране ў канцоўках вершаў, дзе дзеепрыметнікі выкарыстоўваюцца для рыфмы:

Q(29:40) {**wa-qārūna wa-fir'awna wa-hāmāna wa-la-qad ǧā'a-hum mūsā bi-l-bayyināti fa-stakbarū fī l-arḍi wa-mā kānū sābiqīna**}[38]

i też karūna[39] *i fera'ūna*[40] *i też hamana*[41] *i gdī prišli dō nich mōjżeš z-wjádōmōścą i z-cūdami pretō pōdneśli-śe w picha welką na źemi i ne-bili i ne-mōgli bic ūcekačami ōd nas* (323a8).

Літаральны пераклад: І таксама Кораха і Фараона, і таксама Амана; і калі прыйшлі да іх Майсей з паведамленнем і з цудамі, то падняліся яны ў пыхлівасці вялікай на зямлі, і не былі і не маглі яны быць уцекачамі ад Нас.

У вышэйзгаданым прыкладзе перакладчык перадаў арабскі дзеепрыметнік незалежнага стану (**sābiq**) праз *nomen agentis uciekacz*. Аднак у прыведзеным фрагменце дапаможны дзеяслоў **kānū** (яны былі) паказвае не перфект і разумець яго належыць як мадальны дзеяслоў. Гэтую розніцу ў значэннях перакладчык унёс у тэкст тэфсіра дзякуючы таму, што спачатку ён ужыў пераклад дзеяслоўнай формы ў сэнсе перфекта (*nie byli*) і потым дадаў мадальнае значэнне (*nie mogli być*).

2.3.6. Адвербіяльныя абазначэнні акалічнасцей (ар. ḥāl)

У арабскай мове часта ўжываюцца гэтак званыя *ḥāl-сказы*, адвербіяльныя акалічнасныя сказы, якія ў тэксце тэфсіра, як правіла, перадаюцца з дапамогай дзеепрыслоўя незакончанага трывання на *-ąc*[42]:

Q(9:55) {**fa-lā tu'ǧib-ka amwālu-hum wa-lā awlādu-hum innamā yurīdu llāhu li-yu'aḏḏiba-hum bi-hā fī l-ḥayāti d-dunyā wa-tazhaqa anfusu-hum wa-hum kāfirūna**}[43]

---

[38] **Q**(29:40): "І Каруна, і Фіраўна, і Гамана … І прыйшоў да іх Муса з яўнымі доказамі, а яны ўзвялічваліся на зямлі і не былі яны першымі (г.зн. не ўцяклі)".

[39] Ар. *Qārūn* = Корах.

[40] Ар. *fir'awn* = фараон.

[41] Ар. *Hāmān* = Аман; міністр фараона.

[42] Гл. >>> 16.10.1. Дзеепрыслоўе незакончанага трывання.

[43] **Q**(9:55): "Няхай не захапляюць цябе ні маёмасці іх, ні дзеці іх. Сапраўды, Алаг хоча пакараць іх гэтым у гэтым жыцці. Памруць яны, будучы няверніками".

ne-dziwuj-še i ne-zajzri patrōnc na skarbi jich ānitež na dzeci jich pewne chce pan bōg žebi ūkaral jich tim skarbem i dzecmi w tim dōžiwotnim świece i pōtenpi w tim dūši īch i ōnī bendōnc newernikami (151a1).

Літаральны пераклад: Не здзіўляйся і не зайздросць, гледзячы на скарбы іх або на дзяцей іх. Пэўна, хоча Пан Бог пакараць іх тым скарбам і дзецьмі ў гэтым пажыццёвым свеце і асудзіць у гэтым душы іх, і яны з'яўляюцца няверніками.

У арабскім тэксце іменны сказ **wa-hum kāfirūna** (і яны з'яўляюцца няверніками) выконвае функцыю адвербіяльнага акалічнаснага сказа пры папярэднім кантэксце: **wa-tazhaqa anfusu-hum** (літар. іх душы адыходзяць). У тэкст тэфсіра ўстаўляецца *będąc*, дзеепрыслоўе незакончанага трывання ад дзеяслова *być* (быць), чым перакладчык адзначае сказ як адвербіяльны акалічнасны сказ.

У наступным прыкладзе таксама ў пераклад *ḥāl*-сказа дадаецца дзеепрыслоўе *wiedząc* (ведаючы), і тым самым перадаецца дакладны сэнс арабскага сказа. Арабскі дзеяслоўны сказ **wa-ḫalaqa-hum** (і ён стварыў іх) функцыянуе як супраціўны адвербіяльны сказ, што перакладчык падкрэслівае ў польскім тэксце праз ужыванне злучніка *a* (і, але) замест *i*:
Q(6:101) {**wa-ǧa'alū li-llāhi šurakā'a l-ǧinna wa-ḫalaqa-hum wa-ḫaraqū (!= wa-ḫaraqū) la-hū banīna wa-banāti bi-ġayri 'ilmin subḥāna-hu wa-ta'ālā 'ammā yaṣifūna**}[44]

i činą panū bōgū ṣabrami anjōlōw i ferejōw ā wedzōnc że tō pan bōg stworil i pōtwarają bōga klamliwe sinami ūźejirōm[45] *'ejśoju*[46] *i cūrkami z-'anōlōw bez žadnej mōci čistij ōn jest i wisōk'ij ōd tegō cō newernici persōni priznawają* (109a4).

Літаральны пераклад: І яны робяць Пану Богу сябрамі анёлаў і фярэяў, а ведаючы, што гэта Пан Бог сатварыў. І яны ганьбяць Бога лжыва сынамі, Эзрам і Ісусам, і дочкамі з анёлаў без аніякай моцы. Ён чысты і вышэйшы за тое, што няверні асобамі прызнаюць.

Прыклад паказвае, што перакладчык правільна разумее адвербіяльную функцыю арабскага акалічнаснага сказа (*ḥāl*-сказа) і спрабуе ў тэксце тэфсіра перадаць яе сродкамі польскай мовы адпаведна яе значэнню.

У якасці адвербіяльнага абазначэння акалічнасцей у арабскай мове функцыянуюць таксама асобныя імёны ў вінавальным склоне. У вершы **Q**(34:29)

---

[44] **Q**(6:101): "І зрабілі яны Алагу супольнікаў з джынаў, а Ён іх сатварыў. І яны беспадстаўна прыпісалі Яму сыноў і дачок пры адсутнасці ведаў. Хвала Яму, і Ён вышэй за тое, што яны прыпісалі".

[45] Ар. *'Uzayr* = Эзра.

[46] Ар. *'Isā* = Ісус.

у гэтай функцыі знаходзяца два імёны: вінавальнаму склону **bašīran** (ар. *bašīr* = дабравеснік) і вінавальнаму склону **naḏīran** (ар. *naḏīr* = той, хто перасцерагае, вставы) у тэксце тэфсіра зноў адпавядаюць дзеепрыслоўі на *-ąc*:
Q(34:29) {**wa-mā arsalnā-ka illā kāffatan li-n-nāsi bašīran wa-naḏīran wa-lākinna akṯara n-nāsi lā ya'lamūna**}[47]

ne-pōslališmi cebe w jednō ktōre strōne tilkō na wšitek świát lūdzej świestūjōncim laską našą ā strašōnc keranem našim tilkō wenkša čeńsc lūdzej cō tegō ne-wedzą (350b6).

Літаральны пераклад: Не паслалі Мы цябе ў які-небудзь адзін бок, толькі на ўвесь свет, тым, хто людзям апавяшчае ласку Нашую і палохаючы караю Нашаю. Толькі большая частка людзей гэтага не ведае.

Для тэксту тэфсіра наогул з'яўляецца характэрным хістанне паміж фармальнымі катэгорыямі. Першы вінавальны склон з адвербіяльным значэннем, **bašīran** (дабравеснік), перадаецца дзеепрыметнікам незалежнага стану *świastujący* (які апавяшчае). Другому вінавальнаму склону, **naḏīran** (які перасцерагае, вставы), у тэксце тэфсіра адпавядае дзеепрыслоўе *strasząc* (палохаючы). Змяшэнне дзеепрыслоўя і дзеепрыметніка незалежнага стану безумоўна абапіраецца на фармальнае падабенства абедзвюх катэгорый у польскай мове. Нягледзячы на такое фармальнае змяшэнне, бачна, што перакладчык правільна разумее функцыю адвербіяльнага акузатыва і спрабуе яе адэкватна перадаць.

2.3.7. Figura etymologica (унутраны аб'ект)

Унутранны аб'ект, які прымыкае да дзеяслова, будучы, як правіла, аднакаранёвым аддзеяслоўным імем, стварае фігуру, якая служыць для ўзмацнення выразнасці і часта ўжываецца ў арабскай мове. У тэксце тэфсіра такая фігура звычайна адлюстроўваецца літаральна. Унутраны аб'ект, які ў арабскай мове выступае як акузатыўны аб'ект дзеяслова, у польскай мове рэгулярна перадаецца праз творны склон, як у наступным вершы:
Q(12:6) {**qāla yā bunayya lā taqṣuṣ ru'yā-ka 'alā iḫwati-ka fa-yakīdū la-ka kaydan inna š-šayṭāna li-l-insāni 'adūwun mubīnun**}[48]

rekl ōcec ī sinū mōj ne-pōwadaj widzena swegō na twe bracje pretō ōšūkają cebe ōšūkaniną pewne šetan lūdzem neprijacelem welk'im (181b2).

Літаральны пераклад: Сказаў айцец: "О сын мой, не кажы сну твайго тваім братам, таму што ашукаюць цябе ашуканствам. Пэўна, Шатан людзям вялікі непрыяцель".

---

[47] **Q**(34:29): "Мы пасылалі цябе толькі да ўсіх людзей дабравеснікам і вставым. Аднак большасць людзей не ведае".

[48] **Q**(12:6): "Ён сказаў: «О сын мой, не расказвай свайго сну братам тваім. Яны задумаюць супраць цябе падман.» Сапраўды, шайтан для чалавека яўны вораг".

Тут у тэксце тэфсіра для павялічвання выразнасці ў якасці ўнутранага аб'екта выкарыстоўваецца аддзеяслоўнае імя *oszukanina* (ашуканства), інтэнсіўная форма аддзеяслоўнага імя, утвораная з дапамогай суфікса *-ina*.

Шмат разоў аддзеяслоўныя імёны ў якасці ўнутранага аб'екта перадаюцца яшчэ з адным прыметнікам. Такія перыфразы часта ўяўляюць сабою экзегетычныя дадатакі: *ōbačiš tich ktōre w sercach jich mają chōrōbe wiglōndają dō cebe wiglōndanem bezrōzūmnim na tō ōd bōjaźni śmerci pretō nalepej dla nich mōdlic-śe dōbrō slōwo mōwic* (417a2), *či-ne-patriš majsterstwa bōga twegō ī muchemmed jakō precōngnōl cemnōśc k'edī bi chcal ūčinilbi tō na mejscū stōjōncim a pōtim ūčiniliśmi slōncō drōgō pōkazūjōnce prikladem ā pōtim ūjenliśmi ōnō kū sōbe ūjencem latwim* (291a6), *bō zapewne chce pan bōg ōčiścic ōd was grech i*[49] *dōmōwstwo prōrōck'e bō ōčiści was ōčiścenem čistim* (342b6).

2.3.8. Родны склон спецыфікацыі

Структура, якая рэгулярна паўтараецца ў тэксце тэфсіра і прыцягвае ўвагу, узыходзіць да роднага склону спецыфікацыі ў арабскай мове. Пры гэтым прыметнікі ўдакладняюцца з дапамогай дэтэрмінаванага імя ў родным склоне. Такі родны склон спецыфікацыі досыць часта сустракаецца ў тэксце Карана, як, напрыклад, напрыканцы верша **Q**(24:40): **wa-llāhu sarī'u l-ḥisābi** = "А Алаг хуткі ў падліку":

Q(24:40) {**wa-lladīna kafarū a'māla-hum (!= a'mālu-hum) ka-sarābin baqī'atin (!= bi-qī'atin) yaḥsubu-hū (=! yaḥsabu-hū) ẓ-ẓamānu mā'an ḥattā idā ǧā'a-hū lam yaǧid-hu šay'an wa-waǧada llāhu (=! llāha) 'inda-hū fa-waffā-hu ḥisāba-hū wa-llāhu sarī'u l-ḥisābi**}[50]

i ci ktōre newernimi zōstali jich zle ūčink'i jakō k'edī prōmen ōd mglī slōnečnej jakō widac w pōlū dalek'im rōzūme gō pragnōncij za wode āž k'edī prijdze dō negō dla picjá ne-najdze tam nic z-wodī āle najdze bōga pri tim ūčink'u i ōtwori mū drōga dla ūčinkōw bō pan bōg jest prendk'ij liǧbi (283b5).

Літаральны пераклад: О тыя, якія засталіся нявернікамі! Іх злыя ўчынкі як бы прамень ад імглы сонечнай, як бачна ў полі далёкім. Той, хто прагне, лічыць яго вадою, але калі прыйдзе да яго для піцця – не знойдзе там нічога з вады, але знойдзе Бога пры тым учынку, і Ён адкрые яму дарогу для ўчынкаў. Бо Пан Бог хуткага падліку.

У названым прыкладзе склонавы канчатак прыметніка *-ij*, які ўжываецца ў польскай мове для перадачы роднага склону спецыфікацыі (**sarī'u l-ḥisābi**), можна патлумачыць дваіста. Калі канчатак *-ij* разумеецца як паказчык

---

[49] Тут размова ідзе пра клічную часціцу *i* (o), а не пра злучнік *i* (i).

[50] **Q**(24:40): "А тыя, хто не верылі – справы іх як міраж у пустыні. Той, хто прагне – лічыць яго вадою. Але той, хто падыходзіць, не знаходзіць нічога, – а знаходзіць Алага ў сябе, які патрабуе ад яго разліку. А Алаг хуткі ў падліку".

назоўнага склону[51], то гэта з'яўляецца дакладнай перадачай арабскага назоўнага склону **sarī'u** (хуткі) і дапаўнення ў родным склоне *liczby* (падліку) адпаведна арабскаму ўзору. Аднак канчатак можна таксама разглядаць як родны склон жаночага роду адзіночнага ліку *-ij* (<*-éj*)[52]. У гэтым выпадку прыметнік разам з назоўнікам *liczba* стварае іменную фразу ў родным склоне: *prędkiej liczby* (хуткага падліку). Другая інтэрпрэтацыя была тут прыведзеная, таму што ў тэксце тэфсіра мы рэгулярна знаходзім канструкцыю такога кшталту для адлюстравання арабскага роднага склону спецыфікацыі: *i wspōminajce jedin drūgegō na ōfarī i darūjca ābī wistarčili pōslūgi bōžže ã ne-pōmōgajce jedin drūgemū na grech i na zwadī neprijaźni i bōjce-śe bōga pewne pan bōg twardegō kerane i menk'ī*[53] (82b2). Такім чынам, прыметнік кожны раз сінтаксічна раз'ядноўваецца ў тэксце тэфсіра з азначаным ім іменем у назоўным склоне і набліжаецца да імя спецыфікацыі ў родным склоне.

[51] Пра канчатак *-ij* прыметніка м. р. адз. л. наз. скл. гл. >>> 14.1.1. Назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду.

[52] Пра канчатак *-éj* прыметніка ж. р. гл. >>> 10.4.2. Закрыты галосны /é/; 14.1.11. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[53] Тут трэба чытаць *twardego karania i (twardej) męki* (са *scriptio defectiva* канчатка род. скл. *-a* ў *karania)*; гл. >>> 9.4.2. Заўвагі да спосабаў напісання галосных; >>> 10.9.5. *Scriptio defectiva* /*a*/ праз *fatḥa* = *e*; 12.2.2. Родны склон адзіночнага ліку ніякага роду.

3. АРЫЕНТАЛЬНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ

У тэкст тэфсіра пранікла і рэгулярна ў ім выкарыстоўваецца толькі адносна абмежаваная колькасць арыентальных слоў, асабліва арабізмаў, якія большай часткай ужываюцца як спецыфічна ісламскія, рэлігійныя *termini technici*[1].

Арабізмы з прыведзенага вышэй транслітараванага тэксту, падрадковага перакладу "верша святла"[2], на аркушы 283а: *ājet'i* (283а2), *īmanna* (283а5), *šerī'et'* (283а5) (283а6), *muchemmedow* (283а6), *źik'erōwegō* (283а8), *žik'erū* (283а8), безумоўна, увайшлі ў лексіку перакладу праз пасярэдніцтва турэцкай мовы.

Мы знаходзім перадачу /t/ арабскага канчатка жаночага роду *-a(tun)* у status constructus як у турэцкай мове: (ар.) *āya* > (тур.) *ayet* > (польск.) *ajet'* (*ajet* = верш Карана); (ар.) *šarī'a* > (тур.) *şeriat* > (пол.) *šerī'et'* (*szeryjet* = шарыят, ісламскі рэлігійны закон)[3].

Згодна з турэцкім вымаўленнем перадаюцца таксама тыя словы, у якіх турэцкая мова праз устаўленне дапаможных галосных пазбаўляецца збегу зычных гукаў: (ар.) *dikr* > (тур.) *zikir* > (польск.) *źik'er* (*zikier* = рытуальнае памінанне Бога).

Арабізмы ўключаюцца ў парадыгмы славянскага словаўтварэння і марфалогіі: *ājet'i* = він. скл. мн. л. м. р. (283а2); *šerī'et'* = наз. скл. адз. л. м. р. (283а5), (283а6); *nemaźu* = род. скл. адз. л. м. р. (283а8); *žik'erū* = род. скл. адз.л. м. р. (283а8).

Для ўтварэння прыметнікаў ад субстантываваных арабізмаў ужываюцца словаўтваральныя суфіксы *-ny*, *-owy*, *-ów*: *imannâ* (283а5) (прыметнік наз. скл. адз. л. ж. р. ад назоўніка *iman* = вера), *źik'erōwegō* (283а8) (прыметнік род. скл. адз. л. м. р. ад назоўніка *zikier* = рытуальнае памінанне Бога), *muchemmedow* (283а6) (прыналежны прыметнік наз. скл. адз. л. м. р. ад імя ўласнага *Muḥammad*).

---

[1] Параўн.: Eckmann (1971), p. 152: "This translation contains very few Arabic and Persian words. Obviously the translator endeavored to render everything with Turkic words, imitating in this respect the makers of the first Persian translation of the Koran".

Наконт арыенталізмаў у пісьменстве татараў Вялікага Княства гл.: Akiner (1973, 1978, 1980). Акрамя таго, у часопісе "Rocznik Tatarski" (1935, t. 2, p. 351–367) знаходзіцца гласарый, складзены Алі Варановічам. У наступных раздзелах гэтай працы ў розных месцах падрабязна разглядаюцца арабізмы.

[2] Гл. >>> 1.5.1. Верш святла.

[3] Параўн.: >>> 12.1.1. Назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду; >>> 12.2.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку ніякага роду.

3.1. Арабізмы

āḏān = заклік муэдзіна да малітвы
ʻadn = Эдэм
ʻağam = варвары, персы
ʻākif = той, хто знаходзіцца ў стане рытуальнай чысціні
anṣār (мн.) = тыя, хто дапамагае; жыхары Медыны, якія прынялі іслам і падтрымалі прарока
ʻarab = арабы
ʻarš = трон
āya = знак, верш Карана
bušrā = радасная вестка
ḏikr = памінанне Бога, форма працяглай рытуальнай малітвы
farḍ = рэлігійны абавязак
fatwā = юрыдычнае заключэнне
fir'awn = фараон
firdaws = рай
furqān = Каран
ğāhil = невуцкі, даісламскі
ğamīʻa = натоўп, гурт
ğanāza = пахаванне
ġāzī = змагар за веру
ḥağğ = паломніцтва
ḥalāl = дазволенае
ḥarām = забароненае
ḥayḍ = менструацыя
iḥrām = стан пасвячэння
imām = імам; той, хто стаіць наперадзе падчас малітвы
imān = вера
inğīl = евангелле
kaʻba = Кааба
kāfir = нявернік
kitāb = кніга
mağnūn = звар'яцелы, вар'ят
malik = цар
manna = манна
masğid = мячэць
maṣīḥ = месія
muftī = муфтый, каментатар ісламскага права
muhāğir = перасяленец, той, хто з прарокам Мухамадам пераехаў з Мекі ў Медыну
munāfiq = крывадушнік
muqarrab = (літар.) прыбліжаны, давераны, улюбёнец
mursal = пасланнік
mušrik = політэіст
nār = агонь
nūr = святло
qalam = калам, трысняговая палачка для пісьма
qibla = кірунак пры малітве
qur'ān = Каран
qurbān = ахвяра, ахвярапрынашэнне
rizq = сродкі для жыцця
ṣabāḥ = раніца
ṣadaqa = міласціна
sağda = зямны паклон пры малітве
šahīd = пакутнік
ṣalā (мн. *ṣalāwāt*) = малітоўны рытуал, малітоўныя формулы
ṣalāḥ = здароўе, дабрабыт, поспехі
salām = мір, прывітанне
ṣalīḥ = сумленны
šarīʻa = шарыят, ісламскі закон
šayṭān = Сатана, д'ябал
sunna = традыцыя, звычай
sūra = сура Карана
takbīr = вымаўленне формулы "*Allahu akbar*" (Алаг вялікі)
tasbīḥ = усхваленне
tawba = пакаянне, дараванне грахоў
tawrā = Тора
tayammum = рытуальнае ўмыванне
umma = рэлігійнае згуртаванне
ʻumra = рытуальны абход Каабы
walī = святы, заступнік

zabūr = псалмы
zākā = абавязковая міласціна
zāhid = аскет, манах
ẓālim = злачынец

З гэтых роўна сямідзесяці арабізмаў некалькі ўжываюцца надзвычай часта, таму што ўяўляюць сабою цэнтральныя паняцці ісламскай рэлігіі.

З аднаго боку, гэта такія паняцці, як (ар.) *ḥalāl* = "дазволены, дазволенае" і (ар.) *ḥarām* = "забаронены, забароненае", якія ў тэксце тэфсіра класіфікуюць дзеянні як дазволеныя ці забароненыя ў духу Карана і рэлігійнага закону.

З іншага боку, рэгулярна ўжываюцца ў сваёй арабскай форме назвы частак Карана і іншых святых пісанняў. Так, у тэксце тэфсіра вельмі часта з'яўляюцца такія абазначэнні, як (ар.) *āya* = верш Карана, (ар.) *furqān* = Каран, (ар.) *inǧīl* = Евангелле, (ар.) *qur'ān* = Каран, (ар.) *sūra* = сура Карана, (ар.) *tawrā* = Тора, (ар.) *zabūr* = псалмы.

Акрамя таго, вельмі часта ўжываюцца арабізмы (ар.) *farḍ* = рэлігійны абавязак, (ар.) *kāfir* = няверны, нявернік, (ар.) *šayṭān* = д'ябал, (ар.) *zakā* = абавязковая міласціна, (ар.) *ẓālim* = злачынец.

Таксама ў тэксце тэфсіра паўтараюцца цалкам арабскія сінтагмы і фразы. Напрыклад, у якасці экзегетычнага дадатку альбо парафраза асобных слоў звычайна сустракаецца формула веравызнання (ар.) *lā ilāha illā llāh* = "Няма Бога акрамя Алага", каб падкрэсліць строга монатэістычнае тлумачэнне асобных месцаў у тэксце.

Побач з гэтым як тлумачэнне да слова (ар.) *kitāb* = "кніга, Каран" часта называецца "Патаемная скрыжаль", (ар.) *al-lawḥ al-maḥfūẓ*, якая знаходзіцца на небе і на якой, паводле мусульманскіх уяўленняў, напісаны спрадвечны Каран, толькі копіяй якога з'яўляецца зямны Каран[4].

3.1.1. Арабізм "ġāzī" (змагар за веру)

Частае ўжыванне арабскага назоўніка *ġāzī* (змагар за веру) у тэксце тэфсіра кідаецца ў вочы, і ёсць сэнс затрымацца на ім больш дэталёва, бо ён выяўляе ў тэксце тэфсіра спецыфічны рэфлекс асманскай культуры.

Тэрмінам *ġāzī*[5] ў арабаў першапачаткова абазначаўся ўдзельнік ваеннага паходу ці набегу (ар. *ġazw* альбо *ġazwa*).

Паняцце *ġazwa* выкарыстоўвалася спецыяльна ў дачыненні да ваенных паходаў альбо набегаў супраць няверніка ў, якія ўзначальваў прарок. Тым самым паняцце *ġāzī* атрымала ў далейшым развіцці рэлігійнае вымярэнне. Пазней *ġāzī*-воін – ісламскі баец, які ў якасці воіна за веру выступаў за выгнанне няверніка ў і за пашырэнне ісламу.

---

[4] Гл. таксама >>> 7.2. Літоўская метрыка.

[5] Слова *ġāzī* – гэта форма актыўнага дзеепрыметніка ад арабскага дзеяслова *ġazā* = рабіць ваенны паход, набег альбо напад; нападаць, урывацца, захопліваць.

Пад уплывам *ġāzī*-традыцыі ва Усходняй Анатоліі сярод цюркаў, якія прыйшлі з Цэнтральнай Азіі, узніклі ісламскія княствы, што ўспрымаліся як авангард у барацьбе супраць Візантыі (*ġāziyān-i Rūm*). Адно з гэтых княстваў знаходзілася пад кіраўніцтвам *Асмана*, заснавальніка Асманскай дынастыі і Асманскай імперыі[6]. Таму з ранейшых часоў тытул *ġāzī* быў ганаровым тытулам асманскіх султанаў, а пазней ён знайшоў шырокае распаўсюджанне ў асманскай культурнай традыцыі.

У далейшым у Асманскай імперыі існавалі ваенныя ордэны, якія шанавалі і падтрымлівалі ідэалы барацьбы за веру. У такіх *ġāzī*-ордэнах ваеннае рамяство было звязана з рэлігійным запалам і містычнымі плынямі[7].

Пасля падзення Візантыі (1453) традыцыя *ġāzī* хутка страчвала практычнае значэнне, хаця, авеяная легендамі, яна працягвала сваё існаванне як міф

---

[6] Наконт ролі Асмана (*'Uṯmān ġāzī*, 1288–1326) на пачатку Асманскай імперыі гл.: Grunebaum (Hrsg.) (1984), p. 26–27: "Асман быў камандуючым не арміі, а толькі злучэння цюркскіх качавых плямёнаў, што ў якасці *ġāzī*-воінаў вялі барацьбу за веру супраць няверных суседніх народаў і прызнавалі кіраўніцтва Асмана толькі ў гэтай барацьбе. Астатнія задачы, кіраўніцкія і адміністрацыйныя, выконваліся, як і раней, плямёнамі і родавымі кланамі адпаведна іх уласным традыцыям і звычаям. Толькі за сваё незвычайнае ўменне весці вайну і дасягнутыя праз гэта ваенныя поспехі ў барацьбе супраць візантыйцаў Асман вылучыўся сярод іншых туркменскіх *ġāzī*-правадыроў, што, нарэшце, схіліла яго сельджукскіх правіцеляў фармальна прызнаць яго як *бея*, г.зн. як адзінага правадыра, які мог цалкам выконваць функцыі кіравання на пэўнай тэрыторыі, у выпадку з Асманам – у паўночна-заходняй вобласці візантыйскай Анатоліі. Першыя поспехі Асмана і іх прызнанне сельджукамі зрабілі для яго магчымым распачаць той працэс, у ходзе якога яго вобласць праўлення стала княствам (*beylik*) у вузкім сэнсе слова. Гэтыя падзеі абгрунтавалі заклік асманаў стаць самымі небяспечнымі праціўнікамі няверніка ў, заклік, якім яны пачалі карыстацца далёка за межамі Анатоліі ва ўсім ісламскім свеце і які стварыў аснову іх далейшых поспехаў, таму што ён паставіў сабе на службу тысячы качэўнікаў, рамеснікаў і іншых".

[7] Наконт гэтага гл. артыкул GHĀZÎ ў EI-2: «The *ġẖāzîs*, who had at first consisted of a popular movement in which were mingled adventurers and dissidents, were grouped into a corporation which possessed the attributes of a Muslim chivalry and was organized like a religious fraternity, with a ceremony of investiture conferring the title of *ġẖāzî*, the granting of arms and of ritual emblems, and which was joined henceforth by princes and rulers. […] The 14th century sources and the first Ottoman chroniclers have left in their writings testimony to what the *ġẖāzî* spirit was which animated these warlike principalities. 'Put on the white cap for the *ġẖazā*!' exclaims the historian 'Āshikpashazāde [...] while Eflākî […] tells us that the use of this white cap, the characteristic head-gear of the *ġẖāzîs*, was introduced in the frontier regions in the 7th/13th century by Meḥmed Beg of the *Udj*. This same Eflākî describes the ceremony of initiation of the 'sultan of the *ġẖāzîs*' Meḥmed *Aydinoghli*, by the *Mawlawî shaykh* of Konya, Amîr 'Ārif: 'Meḥmed Beg, taking the club from Čelebi, placed it on his head and said: 'I shall beat down my passions with this club, and with it I shall strike dead the enemies of the faith. " […] The poet Aḥmedî gives the following definition of the *ġẖāzî*: 'A *ġẖāzî* is the instrument of the religion of God, a servant of God who cleans the earth from the defilement of polytheism; a *ġẖāzî* is the sword of God, he is the protector and the refuge of the Believers; if he becomes a martyr while following the paths of God, do not think him dead, he lives with God as one of the blessed, he has Eternal life"».

у асманскай культуры[8]. Асманы заўсёды ганарыліся сваёй праслаўленай традыцыяй: ваяваць у якасці *ġāziyān-i Rūm* – змагароў за іслам – на перадавой супраць Візантыі і, нарэшце, яе перамагчы.

На гэтым фоне належыць тлумачыць і разумець ужыванне ў тэксце тэфсіра арабізмаў *ġāzī* > (польск. / бел.) *gazej*[9] (змагар за веру) і вытворнага ад яго *gazejstwo* (рэлігійная барацьба на службе ісламу). Пры гэтым назоўнік *gazej* сустракаецца адносна рэдка ў параўнанні з нашмат больш частым абстрактным назоўнікам *gazejstwo*.

Q(9:111) {**inna llāha štarā mina l-mu'minīna anfusa-hum wa-amwāla-hum bi-anna la-humu l-ğannata yuqātilūna fī sabīli llāhi fa-yaqtulūna wa-yuqtalūna wa'dan 'alay-hi ḥaqqan fī t-tawrāti wa-l-inğīli wa-l-qur'āni** [...]}[10]

pewne pan bōg kūpil sōbe werōncich muśulman i dūš jich i skarbi jich ā tō zatō dal jim tim raj cō še biją s-k'afirami[11] *na drōdze bōžžej i zabijali k'afirōw i biwają gazijami i biwają sami zabitimi šehīdami*[12] *naterminōwal i ōbecal jim [raj] pan bōg prawdziwe w t'ewrīt'u*[13] *i w inğilu*[14] *i też w korāne* (157b1).

Літаральны пераклад: *Пэўна, Пан Бог купіў сабе вернікаў-мусульман і душы іх і скарбы іх. А тое, за што Ён даў ім тым рай – што яны б'юцца з нявернікамі на дарозе Божай, і забівалі яны нявернікаў, і бываюць газіямі, і бываюць самі забітымі пакутнікамі. Наканаваў і абяцаў ім Пан Бог [рай] праўдзіва ў Торы і ў Евангеллі, а таксама ў Каране.*

Абстрактны назоўнік *gazejstwo* (барацьба за веру, вайна за веру), як правіла, стаіць у тэксце тэфсіра ў форме дадатку да фразы, якая ў Каране, як у вышэйзгаданым прыкладзе **Q**(9:111), заўсёды паўтараецца: {**qātilū fī sabīli llāhi**} альбо {**ğāhidū fī sabīli llāhi**} = "Змагайцеся на шляху Алага!", г.зн. змагайцеся за справу Алага, за ісламскую рэлігію! Тыповае месца знаходзіцца ў вершы **Q**(49:16):

Q(49:16) {**innamā l-mu'minūna llaḏīna āmanū bi-llāhi wa-rasūli-hī ṯumma lam yartabū wa-ğāhadū bi-amwāli-him wa-anfusi-him fī sabīli llāhi ulā'ika humu ṣ-ṣādiqūna**}[15]

---

[8] У XVI ст., у найвышэйшым пункце асманскай магутнасці, султан Сулейман Пышны (*Süleyman Qānūnī* 1512–1566) без асаблівага поспеху спрабаваў адрадзіць яшчэ раз традыцыю *ġāzī*.

[9] Пра пераход канчатка ар./цюр. *ī* > польск./бел. *-ej* параўн.: Akiner (1978), p. 233.

[10] **Q**(9:111): "Сапраўды, Алаг купіў у вернікаў іх душы і маёмасці іх за тое, што ім – рай. Яны змагаюцца на шляху Алага – і забіваюць, і бываюць забітымі згодна абяцанню пра гэта ў Торы і Евангеллі і Каране. Хто больш верны ў сваім абяцанні, чым Алаг? Дык радуйцеся свайму гандлю, якім вы гандлявалі з Ім, – гэта вялікі поспех".

[11] Ар. *kāfir* = нявернік.

[12] Ар. *šahīd* = пакутнік.

[13] Ар. *tawrā* = Тора.

[14] Ар. *inğīl* = Евангелле.

[15] **Q**(49:16): "Сапраўды, тыя вернікі, якія ўверавалі ў Алага і пасланніка Яго, потым не сумняваліся і змагаліся сваімі маёмасцямі і сваімі душамі на шляху Алага. Яны – шчырыя".

pewne prawdziwe muśulmane są te ktōre wwerili w jednōšc pana bōga i w prōrōke jegō ā pōtim ne-wontpili ni-w čim i starali-še welk'im staranem i skarbami swīmi i dūšami swojimi na drōdze bōžžej na gezejstwa takōwe naceje ōni są prawdziwimi (424b2).

Літаральны пераклад: *Пэўна, сапраўднымі мусульманамі з'яўляюцца тыя, якія ўверавалі ў адзінства Пана Бога і ў прарока Яго, а потым не сумняваліся ні ў чым і стараліся вялікім стараннем, і скарбамі сваімі, і душамі сваімі на дарозе Божай, у вайне за веру. Такія нацыі, яны – сапраўдныя.*

Месца ў тэксце {**fī sabīli llāhi**} = "на шляху Алага" ў вышэйзгаданым прыкладзе тыповым чынам перадаецца спачатку літаральна праз польск. *na drodze bożej* і следам за гэтым яшчэ дадаткова тлумачыцца праз неалагізм *gazejstwo*, што накладае на гэтае месца ў тэксце спецыфічны асманскі адбітак.

3.2. Цюркізмы

Цюркізмы, якія рэгулярна сустракаюцца ў тэксце тэфсіра, – гэта перш за ўсё абазначэнні малітваў і часоў малітвы:

- *kuşluk* = дапаўдзённы час, дапаўдзённая малітва;
- *öğle* = поўдзень, паўдзённая малітва[16];
- *ikindi* = час папаўдзённай малітвы, папаўдзённая малітва;
- *akşam* = вечар, час вячэрняй малітвы;
- *yatsı* = начны час, адна-дзве гадзіны пасля захаду сонца; начная малітва.

Пры гэтым сустракаюцца тыповыя фразы, якія могуць складацца з цюркскіх, арабскіх і персідскіх слоў, як у наступным прыкладзе: *i te ktōre īman*[17] *prijenli muśulmane te ktōre klanajōn-še beš wacht nemaz*[18] *i widają spelnō źek'at*'[19] *i dześencine* (91a1). Некалькі арабізмаў паказваюць моцнае персідска-цюркскае вымаўленне, як арабізм *waqt* (час), што сустракаецца звычайна ў форме *wacht*, як у вышэйзгаданым прыкладзе. Пры ўжыванні назоўніка *wacht* (час) заўсёды маецца на ўвазе "час малітвы", як гэта становіцца зразумелым з іншага месца ў тэксце: *šedzce w mečetach ōd wacht'u dō wacht'u* (421b2).

Толькі назоўнік (цюрк.) *bayram* = "свята" (або ў словазлучэнні *kurban bayram* = "свята ахвяры"), які вельмі часта можна знайсці ў тэксце тэфсіра, сустракаецца незалежна ад малітоўнай тэматыкі.

---

[16] Цюркізм *öğle* сустракаецца ў пісьменстве "літоўскіх" татараў звычайна ў форме *evle*. Застаецца незразумелым, як ён ператвараецца ў польск./бел. *evle*; гл. Akiner (1978), p. 234.

[17] Ар. *īmān* = вера.

[18] Тур. *beş* = пяць; ар. *waqt* = час; перс. *namāz* = рытуальная малітва. Тут маецца на ўвазе пяціразовая рытуальная малітва.

[19] Ар. *zakā* = абавязковая міласціна.

3.2.1. Дзеяслоў "*siemęczować" і назоўнік "*siemęcza"

У пісьменстве татараў Вялікага Княства Літоўскага ўжываецца лексема, этымалогію якой на гэты момант нельга праясніць. Яна выступае ў форме як дзеяслова, так і назоўніка, і сустракаецца ў тэксце тэфсіра надзвычай часта. Ужываюцца дзеяслоў **siemęczować* і яго зваротная форма **siemęczować się*. Акрамя таго, сустракаецца назоўнік **siemęcza*. У якасці кораня можна было б вызначыць **siemęcz*. Магчыма, гэта лексема цюрска-татарскага паходжання. Akiner (1980) выводзіць яе з тур. *sevinç* (радасць)[20].

У перакладзе дзеяслоў **siemęczować* значыць ні больш ні менш "прынесці Евангелле"; па аналогіі назоўнік **siemęcza* можна тлумачыць як "Евангелле"[21]. У арабскім арыгінале менавіта на адпаведных месцах кожны раз стаяць словы, якія ўтвораны ад кораня *bšr*, што мае асноўнае значэнне "*абвяшчаць, прыносіць Евангелле*": (ар.) *baššara* = "абвяшчаць, прыносіць Евангелле, абвяшчаць добрую вестку"[22].

У арабскай мове дзеяслоў *baššara* утварае канструкцыю з вінавальным склонам асобы і прыназоўнікавай фразай, якая будуецца з *bi-*. Асоба, якой нешта абвяшчаецца, звязваецца з дзеясловам як прамы аб'ект праз вінавальны склон, а з дапамогай прыназоўніка *bi-* далучаецца змест абвяшчэння:

– (ар.) *baššara* + вінавальны склон асобы + *bi-*

Арабская канструкцыя ў тэксце тэфсіра, як правіла, адлюстроўваецца адзін у адзін з дапамогай дзеяслова **siemęczować*:

– (польск.) **siemęczować* + вінавальны або давальны склон асобы + іменная фраза ў творным склоне.

Асоба, якой нешта абвяшчаецца, у тэксце тэфсіра кожны раз выступае адносна дзеяслова як прамы аб'ект або ўскосны аб'ект у давальным склоне, а змест абвяшчэння далучаецца як іменная фраза ў творным склоне[23].

У наступным прыкладзе як тлумачэнне да арабскага арыгінальнага тэксту ў перакладзе толькі раз сустракаецца фігура гендыядыс (*winszuję i siemęczuję*): **Q**(61:7) {**wa-iḏ qāla 'īsā bnu maryama yā banī isrā'īla innī rasūlu llāhi ilay-kum muṣaddiqan li-mā bayna yadayya mina t-tawrāti wa-mubašširan bi-rasūlin**

[20] Akiner (1980), p. 198: "ŚEMENČOVAC 'to rejoice' (trans). Unrecorded. Possibly derived from T *sevinç* 'joy'. This word occurs quite often in the BL Kitab; also in transcriptions from other Tatar works. *śemenčuj jich, proroče, adpuščenem hrachov* 10b8-9, *śemenčuj, praroče, cerplivich katorich Ja navežu pripadkam, škodaj* 36a5-6; *śemenčuj, praroče, dobrich ludźej muśelman rajem* 42b24; *Džebra'il muvil: śemenčuju tabe, praroče, me'radž noč jest* 88a5-6".

[21] Параўн.: Stankiewicz (1934), p. 375 (заўвага 3 да арк. 109a) "śemenčūj: význam tohoto slova není znám, podle souběžného tatarského textu mělo by to znamenati 'příjemné překvapení'".

[22] Ад таго ж кораня ўтвораныя таксама (ар.) *bašīr* = "той, хто прыносіць радасную вестку, евангеліст", (ар.) *bišāra* = "добрая вестка, Евангелле".

[23] Гэта тыпова для тэксту тэфсіра, калі пабудаваная з дапамогай прыназоўніка *bi-* арабская канструкцыя кожны раз у польскай мове адпавядае іменнай фразе ў твор. скл.

ya'tī min ba'd-ī smu-hū aḥmadu fa-lammā ǧā'a-hum bi-l-bayyināti qālū hāḏā siḥrun mubīnun}[24]

wspōmni gdi rekl 'īśá sīn merjemin[25] *i sīni izra'ilōwe jakūbōwe pewne ja pōsōl bōžij dō was pōtwerdzajōncij prawda tich cō prede mną bili s-t'ewrīt'u*[26] *i ješčō was winšūje i śemenčūje pōslōm cō prijdze pō mne īma jegō āchmed*[27] *ma bic ā k'edi teraz prišed dō nich z-rōznimi cūdami rekli tō jest čarōdzejstwo welk'e i jawne* (453a1-3).

Літаральны пераклад: Успомні, калі сказаў Ісус, сын Марыі: "О сыны Ізраілевы, Якубавы, пэўна, я пасланнік Божы да вас, які пацвярджае праўду тых, што перада мною былі, – з Торы. І яшчэ я віншую і абвяшчаю пасланнікам, які прыйдзе пасля мяне, імя яго Ахмад павінна быць. А калі зараз ён прыйшоў да іх з рознымі цудамі, яны сказалі: "Гэта вялікае і яўнае чараўніцтва".

Аналагічныя канструкцыі ўжываюцца таксама ў наступных прыкладах: *śemenčūje śwjástōwanjem werōncich lūdzej te ktōre činą učink'i dōbre dla nich jest zaplata welka* (220b2), *pretō śemenčūj jich zbawenjōm i platō śwentōbliwo na wečnōśc* (359a6), *śemenčōwacjimbendze*[28] *w ten dzen ānjōlōwe rajem ceką sespōdkū jich rek'ī cūkrōwe wekū'iste* (442a4), *pan bōg tilkō śemenčōwal wam żebišce meli bic zwicenžcami* (137b5), *i tō też jednō z-cūdōw że pōsla wjátrī śemenčūjōnc dežčōm i żebi dal wam skōštōwac ōd lask'ī śwentij* (330b6)[29].

Акрамя таго, гэты дзеяслоў сустракаецца таксама ў зваротнай форме, як у наступным прыкладзе: *śemenčūjon-śe jedin z-drūgim laską ō[d] pana bōga i pōwagą śwentōbliwośći pewne pan bōg ne-zatraci zaplati werōncim muśulmanem* (56a7).

Назоўнік **siemęcza* нясе значэнне "радасная вестка", як у наступным прыкладзе, у якім мае месца беларускі творны склон: *a w ten čas k'edi prišli pōsli naši dō ōbrahama z-śemenčōju reklī mī zapewne wigūbimī lūdzej ōtō tegō masta są kriwdnikami dūš swojich* (322b2)[30]. У наступным прыкладзе назоўнік **siemęcza*

---

[24] **Q**(61:7): "Аднойчы сказаў Іса, сын Мар'ям: "О сыны Ізраіля, сапраўды, я пасланнік Алага да вас, які пацвярджае Тору, што ў мяне ў руках, і які абвяшчае пра пасланніка, што прыйдзе пасля мяне, імя яго – Ахмад. І калі ён прыйшоў з яснымі доказамі, то яны сказалі: "Гэта чараўніцтва".

[25] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[26] Ар. *tawrā* = Тора.

[27] Ар. *Aḥmad* = Ахмад (імя ўласнае); літар. "высокашаноўны". Тут маецца на ўвазе прарок Мухамад, які – паводле ісламскага вучэння – быў прадказаны Ісусам. Імя *Мухамад* утвараецца ад таго жа арабскага кораня *ḥmd* (асноўнае значэнне: хваліць), што і імя *Ахмад*.

[28] Тут у наяўнасці сінтаксічнае недапасаванне паміж формай дзеяслова ў адзіночным ліку і суб'ектам дзеяння ў множным ліку.

[29] Пераклад **Q**(30:70).

[30] **Q**(29:31): "І калі Нашы пасланнікі прыйшлі да Ібрагіма з радаснаю весткаю, яны сказалі: "Мы знішчым жыхароў гэтага горада". Сапраўды, жыхары яго былі злачынцамі".

адпавядае арабскаму назоўніку *bušrā* = "радасная вестка", які ўтвораны ад арабскага кораня *bšr*, як і дзеяслоў *baššara*: *w ten dzen k'edī ōbačą ānjōlōw jim bendą mōwic dziś nemaš wam śemenči* (289b3).

Яшчэ больш цікавым з'яўляецца тое, што дзеяслоў **siemęczować* у аналагічных канструкцыях выкарыстоўваецца для перадачы негатыўнага значэння: "прыносіць кепскую вестку; прадказваць нешта дрэннае". Таксама ў арабскім арыгінальным тэксце дзеяслоў *baššara* спалучаецца з назоўнікам у негатыўным значэнні, напрыклад "абвяшчаць пакаранне".

Такім чынам, зноў негатыўнае ўжыванне дзеяслова **siemęczować* у тэфсіры цалкам згоднае з арабскім словаўжываннем. Тыповы прыклад знаходзіцца ў вершы 34 суры 9:

Q(9:34) {**yā ayyuhā llaḏīna āmanū inna kaṯīran mnia l-aḥbāri wa-r-ruhbāni li-ya'kulūna amwāla n-nāsi bi-l-bāṭili wa-yaṣuddūna 'an sabīli llāhi wa-llaḏīna yaknizūna ḏ-ḏahaba wa-l-fiḍḍata wa-lā yunfiqūna-hā fī sabīli llāhi fa-baššir-hum bi-'aḏābin alīmin**}[31]

i te ktōre īman[32] *prijenli wedzce pewne że mnōga z-rabinōw wiščekōw židōwśk'ich i pūstelnikōw i černcōw*[33] *cō jedzą skarbi lūck'e nadaremne i zwodzą lūdzej z-drōgī bōžžej i ktōre skarbą zlōtō i srebrō ā nic ne-dają s-tegō na drōge bōžžą śemenčūj īch ī muchemmed menkō pek'elnō* (148b1).

Літаральны пераклад: І тыя, якія веру прынялі, ведайце пэўна, што многія з рабінаў, балбатуноў гэбрайскіх, і пустэльнікаў, і чарняцоў, што ядуць скарбы людскія дарэмна і зводзяць людзей з дарогі Божай і якія збіраюць золата і срэбра і нічога не даюць з таго на дарозе Божай, абвясці іх, о Мухамад, мукаю пякельнаю.

Таксама ў негатыўным значэнні дзеяслоў **siemęczować* ужываецца вельмі часта; да гэтага некалькі наступных тыповых прыкладаў ужывання дзеяслова: *pretō śemenčūj jich ja muchemmed menką pek'elną serca palōncą* (486a5), *pretō śemenčūj keranem menke serce palōnca* (332b8), *śemenčūj jich menką gōrką palōncą* (42a1), *śemenčūj ōbweśc munafikōw*[34] *tim cō dla nich jest' menka gōrka palōnca* (77b1).

---

[31] **Q**(9:34): "О вы, якія ўверавалі! Шмат хто з кніжнікаў і манахаў ядуць маёмасць людзей дарэмна і адхіляюць ад шляху Алага. А тыя, што збіраюць золата і срэбра і не расходуюць іх на шляху Алага, – абвясці іх цяжкае пакаранне".

[32] Ар. *īmān* = вера.

[33] Польск. *czerniec* = праваслаўны манах.

[34] Ар. munāfiq = крывадушнік.

Агляд граматычных канструкцый дзеяслова **siemęczować*:

Арабская канструкцыя:
– дзеяслоў + аб'ект у вінавальным склоне (асоба) + прыназоўнікавая фраза з bi-
baššir-hum bi-rasūlin (абвясці ім [як радасную вестку] прарока!).
baššir-hum bi-'adābin alīmin (прадкажы ім смяротнае пакаранне!).

Польскія канструкцыі:
– **дзеяслоў + він. скл. + твор. скл.**: *siemęczuję ludzi zwiastowaniem / siemęczuj ich męką*
– **зваротны дзеяслоў + твор. скл.**: *siemęczują się laską*
– **дзеяслоў + дав. скл. + твор. скл.**: *siemęczować im będzie rajem*
– **назоўнік**: *siemęcza*

Значэнне:
– **пазітыўнае**: *прыносіць радасную вестку, віншаваць*
– **негатыўнае**: *прадказваць няшчасце, абвяшчаць пакаранне*

Для праяснення значэння дзеяслова **siemęczować* у прыкладах, якія прыводзяцца вышэй, мы дадаткова знаходзім дзеясловы *winszować* (віншаваць) і, у некалькі нейтральным значэнні, *obwieścić* (абвяшчаць).

Як адпаведнік ар. *baššara* (абвяшчаць добрую вестку) у тэфсіры побач з **siemęczować* часта з'яўляецца польскі дзеяслоў *zwiastować* (абвяшчаць, прадказваць, прарочыць).

3.3. Персізмы

Персідскія словы ў тэфсіры таксама звязаныя амаль выключна з малітоўным рытуалам. Звычайна ў тэфсіры выкарыстоўваюцца тры наступныя персідскія назоўнікі:

– *namāz* = рытуальная малітва;
– *namāzgozār* = нехта, хто ўзорна здзяйсняе рытуальную малітву;
– *namāzkār* = той, хто моліцца.

Па-за малітоўнай тэматыкай з'яўляецца частаўжывальны назоўнік *perī* = "фея, крылатая істота, дух"; у тэфсіры ён выкарыстоўваецца ў польскай[35] форме *ferej* як адпаведнік (ар.) *ǧinn* = "джын, дух", якім абазначаюцца істоты, што былі створаны Богам разам з людзьмі і анёламі: *fereji tajemnich rečej ne-wedzą bō jeślibi wedzeli prišle i tajemne rečī ne-bawilibi-še ū tak cenžk'ich menkach rōbōtnich meśǧid el-aksa*[36] *būdūjōnc* (349a8).

---

[35] У беларускай мове чужы для яе /*f*/ звычайна замяняецца на /*chv*/.

[36] Ар. *al-Masǧid al-Aqṣā* = (літар.) "найбольш аддаленая мячэць", маецца на ўвазе мячэць Аль-Акса ў Ерусаліме.

Як іншае выключэнне ў тэфсіры знаходзіцца персідскі назоўнік *meydān* = "плошча, поле": *pretō i mī winidzim na cebe š-čarami pōdōbnimi twojim čarōm pretō ūčin medzi nas i medzi cebe majdan plac gdze bim-tō pōkazal* (250a3). Характэрным у прыведзеным фрагменце з'яўляецца тое, што арыентальнае слова адразу ўслед перакладаецца і тлумачыцца праз польскае *plac* (< з ням. "Platz").

3.3.1. Прыметнік "lekkosierny" (лёгкасардэчны)

Прыметнік (польск.) *lekkosierny* || (бел.) *lechkoserdny*, які часта сустракаецца ў тэфсіры, з'яўляецца, найбольш верагодна, калькай з персідскай мовы. Яна сустракаецца, як правіла, у сваім усходнеславянскім вымаўленні *lechkoserdny*, з цвёрдым /*s*/ і з гукаспалучэннем /*rdn*/.

Персідскі прыметнік *sabokdel* = "бестурботны, бесклапотны, легкадумны, радасны, вясёлы" складаецца з прыметніка *sabok* = "лёгкі, спрытны" і назоўніка *del* = "сэрца, душа, розум". Паводле гэтага ўзору фармуецца прыметнік *lekko-sierny* альбо *lechko-serdny*[37]. Ён не сустракаецца ў польскай ці беларускай нарматыўнай мове, таксама яго нельга знайсці ў спецыяльных слоўніках.

У тэфсіры гэты прыметнік з'яўляецца звычайна як адпаведнік (ар.) *ḥalīm* = "мяккі, лагодны, цярплівы": *pewne ci ktōre zradliwe ōdstą-pilī [od] was w dzen pōtkane wojsk našich i k'afirśk'ich*[38] *pewne īch zwodl šetan nektōrim cō zarōbili āle prawdziwe ōdpūścil pan bōg ōnim i zrek-še grechū pewne pan bōg jest ōdpūskliwij ōd ōdpūščena lechkōserdnij* (54b5)[39], *i wprōwadzi jich w tak'e mejsca że /ne-/bendą wdzenčnī jemū bō pewne pan bōg jest wšitkō wjádōmij lechkōserdnij* (270a2)[40].

3.4. Фразеалагічныя дзеясловы

Утварэнне фразеалагічных дзеясловаў[41] з арыентальнымі назоўнікамі з'яўляецца тыповай асаблівасцю перакладу ў тэфсіры, якую можна разглядаць на фоне аналагічных структур у турэцкай і персідскай мовах[42].

---

[37] Аналогія пануе таксама наконт прыметніка *miłosierny* = "міласэрны". У тэфсіры гэты прыметнік сустракаецца звычайна ва ўсходнеславянскім варыянце *miloserdny*: *laskawemū milōserdnemū krōlōwi* (52b).

[38] ар. *kāfir* = няверны, нявернік.

[39] **Q**(3:155): "Сапраўды, тыя з вас, хто адвярнуліся ў дзень спаткання двух атрадаў, – сапраўды, іх збіў Сатана чымсьці, што яны зрабілі. А Алаг ужо дараваў ім. Сапраўды, Алаг даруе і Ён лагодны".

[40] **Q**(22:60): "І Ён увядзе іх уваходам, якім яны будуць задаволеныя. Сапраўды, Алаг ведае і Ён лагодны".

[41] Г.зн. устойлівыя (фразеалагічныя) злучэнні дзеяслова з назоўнікам (заўвага перакладчыка).

[42] Наконт фразеалагічных дзеясловаў з арыентальнымі словамі ў кітабах гл.: Нестерович (1983), с. 137–147.

З арабскім назоўнікам *tawba* = "пакаянне, дараванне" ўтвараюцца, напрыклад, наступныя фразеалагічныя дзеясловы, характэрныя для тэксту тэфсіра: *tewbe czynić* = "рабіць пакаянне, раскайвацца"; *tewbe przyjąć* = "прымаць пакаянне, дараваць" альбо *tewbe dać* = "даваць дараванне, дараваць". Як узор для падобных пабудоў можа разглядацца турэцкі фразеалагічны дзеяслоў *tövbe etmek* = (літар.) "рабіць пакаянне" або "рабіць дараванне", г.зн. "раскайвацца" або "дараваць"[43].

Арабізм *īmān* (вера) таксама часта сустракаецца ў структуры фразеалагічнага дзеяслова *iman przyjąć* = "прыняць веру", як у наступным тыповым прыкладзе: *ci ktōre īman prijenli i ūčink'i činili dōbre statečna* (320a5). Пры такім ужыванні арабізма *īmān* (вера), які кантрастуе з польскім адпаведнікам *wiara* (вера), кожны раз падразумяваецца "ісламская вера" ў адрозненне ад іншых рэлігій[44]. Функцыя арабізмаў часта заключаецца ў тым, каб надаць выразам у кантэксце іншых рэлігій менавіта ісламскі выгляд альбо канкрэтнае ісламскае значэнне.

Як характэрныя фразеалагічныя дзеясловы звяртаюць на сябе ўвагу ў тэксце тэфсіра яшчэ наступныя ўтварэнні з малітоўнай тэматыкай: (польск.) *niemaź kłaniać się* = "спраўляць рытуальную малітву" альбо (польск.) *siedźde czynić* = "рабіць зямны паклон (пры малітве)". Падобныя ўтварэнні фармуюцца па аналогіі з такімі турэцкімі ўзорамі, як *namaz kılmak* = "спраўляць малітву", *secde etmek* = "рабіць зямны паклон".

Прыцягвае ўвагу тое, што менавіта сярод дзеяслоўных кампанентаў фразеалагічных дзеясловаў у тэфсіры часта трапляюцца беларускія формы. Так, пры некаторых утварэннях звычайна сустракаецца беларускі дзеяслоў *peć* (пець) замест польскага *śpiewać* (пець): *koran peć* = "дэкламаваць (чытаць нараспеў) Каран", *nemaź peć* = "чытаць малітву", *selewat peć* = "чытаць малітоўныя формулы", *ğenaźe peć* = "чытаць пахавальныя формулы"[45]. У гэтым выпадку мы таксама знаходзім у турэцкай мове аналагічныя ўтварэнні, напрыклад з дзеясловам *okumak* = "чытаць, дэкламаваць": *kuran okumak*, *salât okumak*.

3.5. Арабскія імёны ўласныя

У тэксце тэфсіра імёны прарокаў, а таксама іншых каранічных ці біблейскіх персанажаў перадаюцца ў іх арабскай форме, як у Каране.

---

[43] Разам з арабізмам *tawba* (пакаянне, дараванне) у аналагічных канструкцыях у тэфсіры ўжываецца беларуска-польскі адпаведнік *kajeta* / *kajata* (з націскам на канчатак). Назоўнік *kajeta* / *kajata* = "дараванне або пакаянне" з'яўляецца вытворным словам ад беларускага дзеяслова *каяцца* (польск. *kajać się*) і часта сустракаецца ў тэксце тэфсіра як імянны кампанент тыповага фразеалагічнага дзеяслова: *dać* / *przyjąć kajatę* = "даць дараванне" / "прыняць пакаянне". Гл. пра гэта: Suter (1993).

[44] Параўн.: Akiner (1978), p. 237.

[45] Гл. >>> 16. Марфалогія дзеяслова; 16.8. Зваротныя дзеясловы.

Часцей за ўсё ў тэфсіры ўжываюцца наступныя ўласныя імёны: (ар.) *Dāwūd* = Давід; (ар.) *Dū al-Qarnayn* = Аляксандр Вялікі (літар.: Двухрогі); (ар.) *Ǧālūt* = Галіяф; (ар.) *Hābil* = Авель; (ар.) *Hām* = Хам; (ар.) *Hārūn* = Арон; (ар.) *Hūd* = Гуд (арабскі прарок); (ар.) *Ibrāhīm* = Абрагам; (ар.) *'Īsā*; *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус; Ісус, сын Марыі[46]; (ар.) *Ismā'īl* = Ісмаіл; (ар.) *Izḥāq* = Ісаак; (ар.) *Lūṭ* = Лот; (ар.) *Maryam* = Марыя; (ар.) *Muḥammad* = Мухамад; (ар.) *Mūsā* = Майсей; (ар.) *Nimrūd* = Німрод; (ар.) *Nūḥ* = Ной; (ар.) *Qābil* = Каін; (ар.) *Qārūn* = Корах; (ар.) *Ṣāliḥ* = Саліх (арабскі прарок); (ар.) *Sām* = Сам; (ар.) *Šu'ayb* = Шуайб (арабскі прарок); (ар.) *Sulaymān* = Саламон; (ар.) *Tālūt* = Гідэон; (ар.) *'Uzayr* = Эзра; (ар.) *Yāfiṯ* = Яфет; (ар.) *Yaḥyā* = Іаан; (ар.) *Ya'qūb* = Якуб; (ар.) *Yūsuf* = Іосіф. Часам называюцца таксама імёны чатырох праведных халіфаў *Абу-Бакра*, *Умара*, *Усмана* і *Алі* як прыклады для добрых мусульман.

Таксама імёны анёлаў знаходзяцца звычайна ў сваёй арабскай форме: (ар.) *Ǧibrā'īl* = Габрыэль; (ар.) *Hārūt* = Гарут (літар. разрывальнік); (ар.) *Israfīl* = Ісрафіл, архангел, які пратрубіць у дзень уваскрэсення памёрлых; (ар.) *'Izrā'īl* = Азраіл, анёл смерці; (ар.) *Mārūt* = Марут (літар. ламальнік); (ар.) *Mikā'īl* = Міхаіл.

Прыцягвае ўвагу, што абазначэнне Бога праз арабізм Алаг з'яўляецца ў тэксце тэфсіра рэдка. Замест слова Алаг звычайна выкарыстоўваецца польск. *bóg* (Бог) або *panbóg* (Пан Бог). Толькі калі Алаг адносіцца да ісламскага Бога ў адрозненне ад іншых багоў, ужываецца арабізм: *allάh jest' tak'ij bōg że nemaš inšegō bōga illa*[47] *tilkō ōn žiwij ūstawičnij* (34b3).

Д'ябал у тэфсіры **L** абазначаецца звычайна арабскім словам *Šayṭān* = Сатана (польск. = *Šetan*) альбо выкарыстоўваецца такая польская перыфраза, як *zwodziciel* = спакуснік. Разам з гэтым знаходзяцца абазначэнні (ар.) *Iblis* або радзей таксама (ар.) *Ǧān*, якія ўзятыя з арабскага арыгінала.

Разам з імёнамі, якія трапляюцца ў Каране, мы знаходзім у тэфсіры таксама імёны тыповых фігур з ранняга перыяду ісламу. Яны выконваюць функцыю экзегетычнага дадатку і канкрэтызуюць месцы агульнага зместу ў Каране:

– *'Abd Allāh ibn Salām* = Абд Алаг б. Салам быў юдэйскім знаўцам Пісання, які, будучы перакананым у тым, што Мухамад з'яўляецца прарокам, прадказаным у Пісанні, адразу пасля прыбыцця Мухамада ў Медыну прыняў іслам[48].

– *al-Aḫnas ibn Šarīq al-Ṯaqafī* = аль-Ахнас ібн Шарык аль-Сакафі быў зласлівцам і праціўнікам мусульман, імя якога, напрыклад, згадваецца ў тэфсіры

---

[46] У дачыненні да *Ісуса* ў тэксце тэфсіра часта аддаецца перавага абазначэнню "*'Īsā syn marijamin*". Яно выводзіцца ад ар. *'Īsā ibn Maryam* = "Ісус, сын Марыі" і падкрэслівае, што Ісус, паводле ісламскіх уяўленняў, не з'яўляецца сынам Бога.

[47] Ар. *illā* = акрамя.

[48] Гл. >>> 2.1.2. Знаўца Пісання Абд Алаг ібн Салям.

як экзегетычны дадатак да верша **Q**(2:205)[49]. У ат-Табары мы знаходзім каментарый да верша **Q**(2:205): "Мы раней ужо згадвалі злачынства аль-Ахнаса б. Шарыка аль-Сакафі, пра якога аль-Сада казаў, што верш пра падпальванне палёў мусульман і смерць іхніх аслоў быў пасланы з-за яго"[50].

– *Ka'b ibn al-Ašraf* = Ка'б ібн аль-Ашраф, паэт і праціўнік Мухамада юдэйскага веравызнання[51].

3.6. Тапаніміка

Тапонімы, якія звычайна згадваюцца ў тэфсіры, - гэта абазначэнні месцаў, якія займаюць цэнтральнае становішча ў ісламскай рэлігіі:

– (ар.) *Makka* = Мекка, родны горад Прарока;

– (ар.) *Madīna* = горад Медына (ад ар. *madīna* = горад). Пасля бясконцых канфліктаў з племенем курайш (*Qurayš*) – кланам, што панаваў у Меццы, – Прарок з групай адданых мусульман пакінуў у 622 г. (н.э.) свой родны горад Мекку і адправіўся ў аазіс Ясрыб (*Yaṯrib*), каля 300 км на поўнач ад Мекі. Пазней аазіс Ясрыб быў перайменаваны ў гонар Прарока ў (ар.) *madīna al-nabī* = "горад Прарока";

– (ар.) *aṣ-Ṣafā wa-l-Marwa* = Сафа і Марва – два ўзгоркі каля Мекі, якія наведваюцца падчас паломніцтва, прычым участак паміж абодвума гэтымі ўзгоркамі трэба праходзіць сем разоў;

– (ар.) *'Arafāt* = узгорак каля Мекі, які наведваюць падчас паломніцтва;

– (ар.) *Ḥirā' / Ḥarā'* = Хіра – назва гары на паўночны ўсход ад Мекі. У пячоры гэтай гары, паводле ісламскага падання, Мухамад атрымаў першае Адкрыццё.

---

[49] Гл. >>> 17.1.1. Тэкст рукапісу **L**; тэкст тефсіра (27a3), да верша **Q**(2:205).

[50] Гл. ат-Табары да **Q**(2:205): "*[...] kamā qad ḏakarnā ānifan min fi'li l-Aḫnasa bni Šarîqin-i ṯ-Ṯaqafīyi lladī ḏakara s-Saḍā anna fī-hi nuzilat hāḏini l-āyatu min iḥrāqi zar'i l-muslimīna wa-qatli-hī ḥimari-him [...]*".

[51] Гл. >>> 2.1.1. Паэт Ка'б ібн аль-Ашраф; >>> 17.1.1. Тэкст рукапісу **L**; тэкст тэфсіра (17b6), да верша **Q**(2:121).

4. КАРАНІЧНЫЯ ЦЫТАТЫ Ў КІТАБАХ

Тэкст тэфсіра ў форме каранічных цытат паўплываў на іншыя рукапісы "літоўскіх" татараў. Гэтыя каранічныя цытаты паказваюць, у прыватнасці, досыць моцны адбітак беларускай мовы. Такія беларускія каранічныя цытаты, якія з'яўляюцца тэкстуальна ідэнтычнымі адпаведным месцам у тэфсіры, разглядаліся некаторымі даследчыкамі ў якасці ўскоснага доказу існавання беларускага тэфсіра, на іх думку, сёння страчанага.

Аднак праверкі гэтай гіпотэзы не адбылося дагэтуль, хаця яна ўяўляе сабою найважнейшае дыскусійнае пытанне кітабістыкі, а менавіта якая з дзвюх моў – польская ці беларуская – была першапачатковай мовай перакладу[1].

Як правіла, у пісьменстве "літоўскіх" татараў можна вылучыць два віды перакладаў Карана: (1.) падрадковы пераклад тэфсіра, які ідзе строга паралельна арабскаму тэксту і (2.) каранічныя цытаты ў кітабах, у якіх арабскаму тэксту, які часцей за ўсё спецыяльна адзначаецца зверху выцягнутай лініяй, адпавядае беларуска-польскі пераклад, ідэнтычны перакладу тэфсіра[2].

Часта ў кітабах каранічныя цытаты дапаўняюцца дадатковым экзегетычным каментаром, парафразамі і дыгрэсіямі. Пры гэтым арабскія вершы Карана кожны раз падзяляюцца на маленькія фрагменты, затым перакладаюцца і ў некаторых выпадках дапаўняюцца каментаром[3].

---

[1] Гл. >>> 1.1.2. Моўная праблема.

[2] Параўн. з тым, што Экман кажа наконт двух відаў каранічных перакладаў у цюркскім пісьменстве: "They represent two main types: (1) interlinear, i.e., wholly literal translations without any additional explanations and (2) literal translations enlarged with commentary like digressions and more or less long stories pertinent to the translated portion of the text" (Eckmann (1971), p. 151).

Параўн. таксама ў Заянчкоўскага, які такім самым чынам адрозніваe два тыпы: "On peut distinguer deux types de *täfsîr* turcs parmi plusieurs de ces monuments connus aujourd'hui. Un de ces types c'est la traduction littérale du Qorân sans aucun supplément, on pourrait dire: "traduction interlinéaire", écrite même quelquefois entre les lignes de l'original arabe. […] Un autre genre d'adaptation du texte qorânique dans la littérature turque ce sont d'assez longs commentaires, dits *täfsīr*, qui engloutissent complètement l'original ou bien négligent totalement le texte primitif des versets" (Zajączkowski (1937), p. VII).

[3] Гл. у Антановіча: «Белорусские тексты в китабах выступают обычно параллельно с арабскими, но не в виде подстрочного перевода, как это бывает в тефсирах. Арабский текст обычно сопровождается словами "Як пан бог мувиц" или же "Як у Куране пиша". После арабского текста Корана следует тот же отрывок на белорусском языке» (Антонович (1968), с. 19–20).

Параўн. у Заянчкоўскага, які дакладна апісвае аднолькавы стыль у даследаваным ім стараасманскім перакладзе: „Samo tłumaczenie wraz z komentarzem podaje autor bezpośrednio po tekście arabskim, w kilku tylko wypadkach wprowadzając je za pomocą wyrażenia *ja'nī* 'to znaczy'. Tłumacz dzieli każdy werset na kilka części, nieraz bardzo krótkich; po odrzuceniu tekstu arabskiego […]

Экзегетычны тэкст другога з апісаных відаў з істотнымі адхіленнямі ад тэксту тэфсіра мы знаходзім у рукапісе кітаба **K**, які сёння знаходзіцца ў Брытанскім музеі ў Лондане[4]. На аркушах **K**(34b21) – **K**(35a14) мы знаходзім тлумачэнне да пачатку другой суры Карана:

KITAB K (арк. 34b21) **Q**(2:0) {**bi-smi llāhi r-raḥmāni r-raḥīmi**} (22) **Q**(2:1) {**alif lām mīm**} *jâ bôh wâdômši wedlūg wiklâdu sinâ âbâśôwâha*[5] *jâ bôh wedômši tâk mâ* (23) *môwic tô jest pânbôh tôj štô wâdômi tâjemnici alif*[6] *bôh lâm*[7] *ǧebrâ'īl*[8] **K** (fol.35a) (1) *mim*[9] *muchemmed tô jest jâ tôj bôh štô ǧebrâ'īlâ pâslâw dâ muchemmedâ* **Q**(2:2) {**ḏālika l-kitābu**} (2) *ôtô iẓ-hetâj iknihâju kurânem štô ješče âd âdâmâ źwônẓâl i prôrôčene tedi ôdâbrâlâ-* (3) *-m i nâẓnâčilâm te kśenge tôbe preẓ duch świenti prislâl bô tâ kśenge nâ tâblicâch i* (4) *âstrôžnâści môjej nâpisâlâm* {**lā rayba fī-hi**} *ne-mâš w nej žâdnej wôntpliwôści* (5) *ôd pânâ bôgâ ẓeslânâ jest* {**hudân li-l-muttaqīna**} *ten kurân priwôdzi dâ drôgi prâwdziwâ-* (6) *-j bôjâźnikâw bôžich* **Q**(2:3) {**alladīna yu'minūna bi-l-ġaybi**} *tich ktūre ūwerili zâ'ôčne* (7) *cô prârôkâw ne-widzeli âni-jich sūdâw* {**wa-yuqīmūna ṣ-ṣalāta**} *â stâwâjō u nemâźe*[10] *klâ-* (8) *-nejuccâ* {**wa-mimmā razaqnā-hum yunfiqūna**} *i s-tegô cô-mi jim riźku*[11] *nâdâli mne âferūjôn widâjō (9) dzešencine źek'át*[12] *sedeku*[13] **Q**(2:4) {**wa-llaḏīna yu'minūna bi-mā unzila ilay-ka**} *i tô ūwerili cô ẓeslânô tô-* (10) *-be kurân* {**wa-mā unzila min qabli-ka**} *i cô ẓeslânô pred tôbôn ẓešlim prôrôkâm kśengô[m]* (11) *t'ewrīt*[14] *źebūr*[15] *inǧīl*[16] *i ẓwitkôm prôrôck'im wârâ dâjô* {**wa-bi-l-āḫirati hum yūqinūna**} (12) *i âstâtnemu sūdnemu dnū' priẓnâwâjō* **Q**(2:5) **ūlā'ika 'alā hudân min rabbi-him**} *tâkôwi lūdzi jest nâ*

---

otrzymujemy tureckie tłumaczenie […]. Komentarz, jako dodatek do tekstu przekładu podstawowego, pojawia się nieraz wtrącony w środek zdania" (Zajączkowski (1973), p. 102).

[4] Кітаб Брытанскага музея паходзіць з пачатку XIX ст. і паводле свайго зместу ўяўляе тыповы прыклад катэгорыі кітабаў. У пісьменстве "літоўскіх" татараў мы знаходзім некалькі кітабаў з ідэнтычнай структурай і зместам. Усе падобныя кітабы паходзяць з XVIII альбо XIX ст. Неверагодна, каб ужо ў XVII ст. існавалі рукапісы таго тыпу і аб'ёму, што і кітаб **K**. Са спасылкай на кітаб **K** тут прапануецца параўнанне з рукапісам, які роўна на 100 гадоў пазнейшы за тэфсір **L**. Пра кітаб **K** гл. >>> 17.5. Кітаб **K**.

[5] Ар. *Ibn 'Abbās* = Абд Алаг ібн Абас (пам. 68 г. г. = 686 г.); гл. каментар далей.

[6] Ар. *alif* = аліф, першая літара арабскага алфавіта.

[7] Ар. *lām* = лам, 23-я літара арабскага алфавіта.

[8] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

[9] Ар. *mīm* = мім, 24-я літара арабскага алфавіта.

[10] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[11] Ар. *rizq* = сродкі для пражыцця.

[12] Ар. *zakā* = абавязковая міласціна.

[13] Ар. *ṣadaka* = міласціна.

[14] Ар. *tawrā* = Тора.

[15] Ар. *zabūr* = псалмы.

[16] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

prâ- (13) *-wdziwâj drôdze ôd pânâ bôgâ jich* {**wa-ūlā'ika humu l-mufliḥūna**} *i tâkôwi lūdzi ôni jest wô-* (14) *-lnimi ôd wšelâk'ich trudnôścâj dnâ sūdnâgô*[17].

Для параўнання тут можна прывесці тэкст тэфсіра з манускрыпта **L** з пачаткам другой суры Карана:

TEFSIR L(6a1) *wīma bōga laskawegō milōserdnegō [bog ǧebra'il muchemmed]*[18] *ja-m bōg wadōmšij ōtō ta kśenga nimaš wentepliwośći w nej derekciją dla bōjaźnikōw bōžich ktōre ūwerili za' ōčne i stawają ū nemaźe*[19] *i s-tegō cō śmi īm riźku*[20] *nadalī mne ōfarūją i ktōre ūwerili cō zeslanō tōbe i cō zeslanō pred tōbą ī ōstatnemū času ōni priznawają takōwe nacije są na prawdziwej drōdze ōd bōga jich i takōwe nacije są ōni wolnimi*

Пры параўнанні абодвух тэкстаў – з кітаба і з тэфсіра – мы канстатуем, што ў першы ўліваецца дадатковая экзегетычная інфармацыя. Верш **Q**(2:0), *Басмала*[21], у кітабе наогул не перакладаецца і не тлумачыцца. Затое экзегеза трох пачатковых літар *alif*, *lām* і *mīm* займае шмат месца. Значэнне і функцыя такіх літарных груп, якія з'яўляюцца уступам да суры 29, незразумелыя. Немагчыма надаць ім ніякага літаральнага сэнсу, і яны вядомыя ў экзегетаў Карана як "адасобленыя літары" (ар. *al-ḥurūf al-muqaṭṭa'a*)[22]. Спробы іх тлумачэння набываюць у мусульман містычныя вымярэнні. У кітабе пры экзегезе трох літар робіцца спасылка на *Ібн Абаса*[23], аднаго з найвялікшых рэлігійных вучоных першага пакалення мусульман і аўтарытэта ў каранічнай экзегезе і веданні традыцыі (*ḥadīṯ*).

Экзегеза трох літар *alif*, *lām* і *mīm*, як мы знаходзім яе ў кітабе **K**, па стылі і спосабе ідэнтычная (а нават у значнай ступені супадае даслоўна) каранічнай экзегезе са стараасманскага манускрыпта "*Ǧawāhir al-aṣdāf*"[24], якая была апублікавана Заянчкоўскім (Zajączkowski (1973)). Для ілюстрацыі тут можна прывесці ўзор з транслітараванага Заянчкоўскім тэксту, які ўключае пачатак суры 2:

---

[17] Для яснасці ў транслітараваным фрагменце тэксту кітаба **K** падкрэслены пераклады вершаў, аднак дадатковая экзегетычная інфармацыя не адзначалася. У кітабе не існуе такой маркіроўкі.

[18] У рукапісах тэфсіраў **I** і **U** выяўляецца дадатковы адносна рукапісу **L** тэкст, прыведзены ў квадратных дужках.

[19] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[20] Ар. *rizq* = сродкі для пражыцця.

[21] Ар. *bi-smi llāhi r-raḥmāni r-raḥīm* = У імя Алага, Міласцівага, Міласэрнага.

[22] Гл. у EI-2 у слоўнікавым артыкуле KUR'ĀN адпаведны раздзел.

[23] Наконт 'Абд Алага ібн Абаса (пам. 68 г. г. = 686 г.) гл. слоўнікавы артыкул 'ABD ALLĀH b. al-'ABBĀS (L.Veccia Valieri) у EI-2.

[24] Ар. *Ǧawāhir al-aṣdāf* = "Змест жамчужнай ракавіны". Манускрыпт паходзіць з Паўночнай Анатоліі і ўзнік падчас праўлення Ісфендыяра б. Баязіда (*Isfendiyār b. Bayezīd* 1392–1440). Гл.: Zajączkowski (1937), p. 5.

"*Alif Lām Mīm:* Ibni ʻAbbās qytynda *anā~llāhu aʻlam*[25] demäkdur, jaʻnī[26]: bän oł Tanryjäm ki ʻallāmu ġujūbäm[27]; baʻẓyłar[28] äjdür: *älif* Allāh démäkdur; *lām* Ğäbrāʼil démäkdur, *mīm* Muḥammäd démäkdur, jaʻnī: bän ół Tanryjäm kim Ğäbrāʼilí göndärdüm Muḥammädä. – démäkdur. Ół kitābdur[29] ki bän Adamdan ʻahdu[30] mīs̱āq[31] ałduqda vaʻda[32] etdümdíkim saná vaḥj[33] qyłam, ja ół kitābdur ki lävḥi maḥfūẓda[34] jazdum, anda gumān[35] joqdur kim Allāhdan-dur, oł kitāb hādīdur[36], hidājät[37] vériğídur muttaqīłara[38] [...]"[39].

Літаральны пераклад: *Alif, lām, mīm*: у Ібн Абаса гэта абазначае: Я, Алаг, усёведны; гэта значыць: Я ёсць той Бог, які ведае Патаемнае. Некаторыя кажуць: *alif* абазначае Бог; *lām* абазначае Габрыэля, *mīm* абазначае Мухамада; гэта значыць: Я ёсць той Бог, які паслаў Габрыэля да Мухамада. Гэта ёсць кніга, якую я абяцаў, калі я ўзяў абяцанне з Адама, адкрыць табе; альбо: Гэта ёсць кніга, якую я запісаў на "добра захаванай дошцы", і наконт якой няма ніякіх сумненняў, што яна ідзе ад Бога; гэтая кніга з'яўляецца правадыром, які ажыццяўляе кіраўніцтва богабаязнымі [...].

Безумоўна, вышэйзгаданы экзегетычны тэкст пра тлумачэнне трох літар *alif*, *lām* і *mīm* з кітаба **K** знаходзіцца ў шчыльнай тэкстуальнай сувязі з апублікаваным Заянчкоўскім тэкстам з манускрыпта "*Ğawāhir al-aṣdāf*"[40].

---

[25] Ар. *anā llāhu aʻlam* = Я, Алаг, Усёведны.

[26] Ар. *yaʻnī* = гэта значыць, гэта абазначае.

[27] Ар. *ʻallāmu ġuyūb* = знаўца Патаемнага.

[28] Ар. *baʻḍ* = частка, некалькі.

[29] Ар. *kitāb* = кніга.

[30] Ар. *ʻahd* = саюз, дамова.

[31] Ар. *mīt̲āq* = саюз, дамова.

[32] Ар. *waʻd* = абяцанне.

[33] Ар. *waḥy* = натхненне.

[34] Ар. *al-lawḥ al-maḥfūẓ* = "Патаемная скрыжаль" на небе, на якой напісаны спрадвечны Каран.

[35] Перс. *gomān* = сумненне.

[36] Ар. *hādī* = той, хто вядзе; правадыр.

[37] Ар. *hidāya* = кіраванне.

[38] Ар. *muttaqī* = той, хто асцерагаецца, богабаязны.

[39] Zajączkowski (1937), p. 1.

[40] Гэты след каранічнага тлумачэння, які адсылае да аналагічных тэкстаў асманскатурэцкай літаратуры, няма неабходнасці тут разглядаць больш падрабязна. З іншага боку, у аснове турэцкага тэксту "*Ğawāhir al-aṣdāf*" маглі ляжаць арабскія і/або персідскія прататыпы. Залежнасць рэлігійнай літаратуры "літоўскіх" татараў ад асманскатурэцкага пісьменства і культурнага кола застаецца дагэтуль нявывучанай і патрабуе шырокіх даследаванняў, якія толькі ў сумеснай працы з цюрколагамі і асманістамі могуць прывесці да плённых вынікаў.

Далей на працягу тэксту ў перакладзе кітаба **K** прасвечваецца тэкст тэфсіра. Разам з тым кітаб змяшчае ў адрозненне ад тэфсіра дадатковую экзегетычную інфармацыю, якая павінна выявіць значэнне вершаў. У якасці ўзору можна разгледзець тыповую структуру тэксту: следам за арабскім тэкстам у кітабе ў кожным выпадку ідзе пераклад, які большай часткай даволі дакладна супадае з тэкстам тэфсіра, і затым тэкст пераходзіць у тлумачэнне, якога няма ў тэфсіры.

Рэканструкцыя поўнага тэксту Карана з рукапісаў кітабаў была б немагчымай, таму што аб'ём каранічных цытат у кітабах занадта малы. Каранічныя вершы прыводзяцца ў кітабах побач з *хадзісамі* (выслоўямі Прарока), каб патлумачыць пытанні, звязаныя з рытуалам, апісаць культавыя абрады, а таксама паведаміць маральныя прынцыпы паводзін. Пры гэтым каранічныя цытаты служаць у якасці аргументаў і доказаў на карысць настаўлення і нормаў паводзін, і ў такой функцыі яны з'яўляюцца ў тэкстах, якія знайшлі шырокае распаўсюджанне ў кітабах, як свайго роду рэлігійныя павучанні і катэхізмы.

Далей трэба прывесці некалькі тыповых прыкладаў каранічных цытат з кітаба **K**, прааналізаваць іх і параўнаць з адпаведнымі вытрымкамі з тэксту ў тэфсіры **L**.

Наступны прыклад выразна дэманструе, што пераклады тэксту Карана ў кітабе **K** і тэфсіры **L** тэкстуальна цалкам ідэнтычныя:

KITAB K (36a21) **Q**(2:261) {**maṯalu laḏīna yunfiqūna amwāla-hum**} (22) {**fī sabīli llāhi ka-maṯali ḥabbatin anbatat sab'a sanābila fī kulli sunbulatin mi'atu ḥabbatin wa-llāhu yuḍā'ifu li-man**} (23) {**yašā'u wa-llāhu wāsi'un 'alīmun**}[41] *pôdôbenstwo tich ktūre âfârūje skârbi nâ bôžujū dâ-* (24) *-rôhu jâk pôdôbenstwo źernō' cô ẓrôdzi śedem klôsôw â w kôžnim klôśe stô źer-* **K**(36b1) *-nât tâk pânbôh prisbôri 'ofâri čije ẓâchce bô pânbôh širôk'ej lâsk'i i we ktô* (2) *cô dâje*[42].

TEFSIR L (35b7) *pōdōbenstwa tich ktōre ōfarūją skarbi swoje na drōgą bōżże jakō pōdōbenstwa źarnō cō zrōdzi śedmi klōsōw w każdim klōśe stō źarn tak pan bōg prispōrī 'ofari čije zachce bō pan bōg šerōk'ej lask'ī i we ktō cō daje*[43]

---

[41] Пераклад каранічнага тэксту: "Тыя, хто расходуе сваю маёмасць на шляху Алага, падобныя да зерня, якое вырасціла сем каласоў, а ў кожным коласе сто зерняў. І Алаг падвойвае таму, каму пажадае. Алаг агортвае (усё), ведае".

[42] Літаральны пераклад кітаба: "Падабенства тых, хто ахвяруе скарбы на Божую дарогу, – як падабенства зерня, што пародзіць сем каласоў, а ў кожным коласе сто зерняў. Так Пан Бог памножыць ахвяры чые захоча, бо Пан Бог шырокай ласкі і ведае, хто што дае".

[43] Літаральны пераклад тэфсіра: "Падабенства тых, хто ахвяруе скарбы свае на дарозе Божай, як падабенства зерня, што пародзіць сем каласоў, у кожным коласе сто зерняў. Так Пан Бог памножыць ахвяры чые захоча, бо Пан Бог шырокай ласкі і ведае, хто што дае".

У перакладзе кітаба знаходзяцца фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці, якія з'яўляюцца характэрнымі для беларускай мовы: пераход /g/ > /h/, поўнагалоссе, аканне, склонавыя канчаткі (*na bôžujū dârôhu*).

Таксама ў наступным прыкладзе тэкст з кітаба **K** у значнай меры ідэнтычны тэксту з тэфсіра **L**:

KITAB K (35b20) **Q**(2:153) {**yā ayyuhā llaḏīna āmanū**} (21) {**sta'īnū bi-ṣ-ṣabri wa-ṣ-ṣalāti inna llāha ma'a ṣ-ṣābirīna**}[44] *i tô ktôre ūwerili prâšice pômâ- (22) -či u pânâ bôhâ preẓ-pôst cerplīwi i preẓ nemâź*[45] *pewne pânbôh ẓâwše iš-cerplīwimi*[46]

TEFSIR L (21a5) *ije te ktōre ūwerili prōšce pōmōci ū bōga prez pōst cerpliwij i prez nemaź pewne bōg jest' zawše z-cerpliwimi*[47]

У кітабе звяртае на сябе ўвагу ніякі род указальнага займенніка *to*, які належыць тлумачыць як арфаграфічную або часам як сэнсавую памылку перапісчыка. Таксама ў гэтым фрагменце кітаба з'яўляюцца тыповыя для беларускай мовы рысы (пераход /g/ > /h/ і аканне). Арабскі выраз *ṣabr* (цярплівасць, трывучасць) у абодвух тэкстах перакладаецца экзегетычным парафразаваннем праз *post cierpliwy* (цярплівае выкананне посту).

У наступным прыкладзе абедзве версіі – кітаба і тэфсіра – таксама з'яўляюцца тэкстуальна ідэнтычнымі. Яны супадаюць і ў адхіленнях ад арабскага арыгінальнага тэксту:

KITAB K (35a14) **Q**(2:176) {**[...] wa-inna llaḏīna ḫtalafū fī l-kitābi**} (15) {**la-fī šiqāqin ba'īdin**}[48] *i pewne ktūre prečec preciwku kśengâm bôžim tâkôwi lūdzi 'ū welk'im* (16) *blūdze dâlekô âd pânâ bôgâ i âd prâwdi bôžej*[49]

TEFSIR L (23a8): *i pewne ci ktōre prečą prōciw kśeng takōwe są ū welk'im blendze daleko ōd boga i ōd prawdi*[50]

---

[44] Пераклад каранічнага тэксту: "О тыя, якія ўверавалі, звяртайцеся за дапамогай да цярпення і малітвы. Сапраўды, Алаг з цярплівымі".

[45] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[46] Літаральны пераклад кітаба: "О тыя, якія ўверавалі, прасіце дапамогі ў Пана Бога праз пост цярплівы і праз малітву. Пэўна, Бог заўсёды з цярплівымі".

[47] Літаральны пераклад тэфсіра: "О тыя, хто ўверавалі, прасіце дапамогі ў Бога праз пост цярплівы і праз малітву. Пэўна, Бог заўсёды з цярплівымі".

[48] Пераклад каранічнага тэксту: "[Гэта так, таму Алаг на самой справе паслаў Пісанне.] Сапраўды, тыя, хто маюць іншыя меркаванні пра гэтае Пісанне, у глыбокай (літар. – далёкай) нязгодзе".

[49] Літаральны пераклад кітаба: "І, пэўна, тыя, хто супярэчыць супраць кніг Божых, такія людзі ў вялікай памылцы, далёка ад Пана Бога і ад праўды Божай".

[50] Літаральны пераклад тэфсіра: "І пэўна, тыя, хто супярэчыць супраць кніг, такія ў вялікай памылцы далёка ад Бога і ад праўды".

У абодвух тэкстах канцоўка верша інтэрпрэтуецца ў аднолькавай манеры, якая некалькі адхіляецца ад арабскага тэксту. Назоўнік (ар.) *šiqāq* = "нязгода, сварка, разлад, рознагалоссе" перакладаецца словам *błąd / blud* (памылка), а залежны ад яго прыметнік (ар.) *ba'īd* = "далёкі" экзегетычна ампліфікуецца і тлумачыцца як "аддаленасць ад Бога і ісціны". У кітабе двойчы дадаецца прыметнік *boży* (божы), дзякуючы якому гэты тэкст крыху адхіляецца ад тэксту тэфсіра. Тэкст кітаба зноў паказвае адрозненне ад апошняга беларускімі асаблівасцямі (аканне, ненасавыя галосныя замест насавых).

У наступным прыкладзе тэксты кітаба і тэфсіра цалкам супадаюць. Кангруэнцыя існуе таксама ў дачыненні да тыповага разрыву ў структуры тэксту, якая ўзнікае праз устаўку каментару:

KITAB K (35b23) **Q**(2:154) {**wa-lā taqūlū li-man yaqtulu (!= yuqtalu) fī sabīli llāhi amwātan (!=amwātun) bal aḥyā'u (!=aḥyā'un) wa-lākin lā taš'urūna**}[51]
K(36a1) *ne-mūwce wi nâ tich ẓâbitich ne-jest ẓâbite nâ drôdze bôžej śmercô âle i ôwšem žiwi* (2) *jest tilkô cô wi ō nich ne-wece*[52]

TEFSIR L (21a6) *ne-mōwce wi na tich zabitich ne-są zabite na drōdze bōžej śmercą āli i ōwšem žiwe są tilkōž wī ō nich ne-wece*[53]

Паслядоўнасць перакладу парушаецца праз экзегетычную ўстаўку *nie jest / są zabite* (яны не забітыя / не мёртвыя). У астатнім пераклад ідзе строга паралельна арабскаму арыгіналу. У абодвух тэкстах кідаецца ў вочы творны склон *śmiercią* як адпаведнік арабскага вінавальнага склону *amwātan* (мёртвых), які было б правільна чытаць як назоўны склон: *amwātun*. Напэўна, перакладчык не зусім разумеў арабскі тэкст у гэтым месцы, памылкова інтэрпрэтаваў гэтую форму як *акалічнасны вінавальны склон* (ар. *ḥāl*) і перадаў яго на славянскай мове з дапамогай *творнага склону*[54].

Адхіленні паміж кітабам **K** і тэфсірам **L** часам даволі значныя, як гэта паказвае наступны прыклад:

KITAB K (37a8) **Q**(2:271) {**in tubdu (!= tubdū) ṣ-ṣadaqāti fa-ni'immā hiya wa-in tuḫfū-hā (!= tuḫfū-hā) wa-tu'tū-hā l-fuqarā'u (!= l-fuqarā'a) fa-huwa ḫayrun la-kum wa-yukaffir**} (9) {**'an-kum min sayyi'āti-kum wa-llāhu bi-mā**

---

[51] Пераклад каранічнага тэксту: "Не кажыце пра тых, каго забіваюць на шляху Алага: "Мёртвыя". Не, жывыя, але вы не ўсведамляеце".

[52] Літаральны пераклад кітаба: "Не кажыце вы на тых забітых (яны не забітыя!) на дарозе Божай смерцю, але надварот – яны жывыя, толькі што вы пра іх не ведаеце".

[53] Літаральны пераклад тэфсіра: "Не кажыце вы на тых забітых (яны не забітыя!) на дарозе Божай смерцю, але наадварот – яны жывыя, толькі што вы пра іх не ведаеце".

[54] Параўн. >>> 2.3.6. Адвербіяльныя абазначэнні акалічнасцей (ар. *ḥāl*).

ta'malūna ḫabīrun}[55] *kâli jâwnô dâjece sedeku*[56] *dôbre kâli môwči-* (10) *-kâm dâjece ūbôhim bôhômôlcâm tô ješče lepej źek'ât'*[57] *i dzesecinu widâwâc jâwnô bô* (11) *jest [ferz]*[58]*-â sedeke tâjemne lepej bô jest nâfile*[59] *âdwerne pânbôh hrâchi wâši pânbôh wedâje štô* (12) *wi činice ẓâ 'učink'i*[60]

TEFSIR L (37a3) *ješli jawne dajece sedeku dōbrō tō jest' ã ješli milčk'em i dace tō ūbōgim bōgōmōlcam tō lepša jest' wam i ōdwrōci ōd was ōd grechōw wašich bō pan bōg cō wi učink'i činice wjádōmij*[61]

У кітабе пераклад пераходзіць ў павучальны каментар. Супадаючы спачатку з тэфсірам, кітабны тэкст паказвае шматлікія экзегетычныя "насычэнні". У каментарыі **K** супрацьпастаўляюцца два рэлігійныя паняцці: (ар.) *farḍ* = "рэлігійны абавязак" і (ар.) *nāfila* = "прапанаваная неабавязковая павіншасць". Потым у канцы цытаты зноў праглядае тэкст тэфсіра. Таксама ў гэтым прыкладзе тэкст кітаба вылучаецца моцнай беларускамоўнай афарбоўкай.

У наступным прыкладзе падаецца тэкст перакладу, які значна супадае для абодвух – кітаба **K** і тэфсіра **L**:

KITAB K(35b18) *jâk pânbôh môwi* **Q**(2:152) {**fa-ḏkurū-nī aḏkuru-kum wa-škurū lī**} (19) {**wa-lā takfurūna (!= takfurūni)**}[62] *uspôminâjce mne bôhâ môdlitwâmi â jâ wâs uspômnū' zbâwenem âddâ-* (20) *-wâjce mne chwâlu â ne-tlūmce dâri môje ne-būdzce newernikâmi*[63]

TEFSIR L(21a4) *pretō wspōminajce [mne] mōdlitwami ã ja was wspōmne zbawenem i ōddawajce chwale mne ne-tlūmce dari mōje newerenstwam*[64]

---

[55] Пераклад каранічнага тэксту: "Калі вы адкрыта робіце міласціну, то гэта добра, а калі ўтойваеце яе і падаеце яе бедным, то гэта лепей для вас і загладжвае вашыя ліхія ўчынкі. А Алаг ведае, што вы робіце".

[56] Ар. *ṣadaka* = міласціна (добраахвотная).

[57] Ар. *zakā* = міласціна-падатак (абавязковая міласціна).

[58] Ар. *farḍ* = рэлігійны абавязак.

[59] Ар. *nāfila* = прапанаваная неабавязковая павіншасць.

[60] Літаральны пераклад кітаба: "Калі вы яўна даеце міласціну – добра, калі моўчкі даеце ўбогім багамольцам, то яшчэ лепей. Міласціну-падатак і дзесяціну даваць яўна, бо гэта *фарз* (рэлігійны абавязак), а міласціну лепей таемна, бо гэта *нафіла* (непрадпісанае дзеянне). Адхіліць Пан Бог грахі вашыя. Пан Бог ведае, што за ўчынкі вы робіце".

[61] Літаральны пераклад тэфсіра: "Калі вы наяве даеце міласціну, то гэта добра. А калі моўчкі і даеце гэта ўбогім багамольцам, то вам лепей. І гэта адхіліць ад вас (грахі вашыя, а вас) ад грахоў вашых, бо Пан Бог ведае, што за ўчынкі вы робіце".

[62] Пераклад каранічнага тэксту: "Успомніце Мяне – Я ўспомню вас. Будзьце ўдзячнымі Мне і не будзьце няўдзячнымі".

[63] Літаральны пераклад кітаба: "Успамінайце Мяне, Бога, малітвамі, а Я вас успомню збавеннем. Аддавайце Мне хвалу, а не ўтойвайце дары Мае. Не будзьце нявернікамі".

[64] Літаральны пераклад тэфсіра: "Таму ўспамінайце [Мяне] малітвамі, а Я вас успомню збавеннем. І аддавайце хвалу Мне. Не утойвайце дары Мае нявер'ем".

Арабскія дзеясловы *ḏakara* = "помніць", *šakara* = "дзякаваць" і *kafara* = "закрываць, утойваць; быць няверніка; быць няўдзячным" былі пашыраныя ў кітабе і ў тэфсіры аднолькавымі экзегетычнымі дадаткамі (*modlitwami*, *zbawieniem*) і перакладзеныя ідэнтычнымі фразеалагічнымі зваротамі (*oddawać chwałę*, *tłumić dary*). Звяртае ўвагу адхіленне напрыканцы верша. Тэфсір змяшчае творны склон *niewiereństwem*, што ў якасці дадатку належыць да звароту *tłumić dary* і ўключаецца ў адзін шэраг з абодвума папярэднімі ўжываннямі творнага склону ў аналагічных канструкцыях. У кітабе замест гэтага знаходзіцца назоўнікавы сказ: *ne budzcie niewiernikami* (не будзьце няверніка!). Такім чынам, шматзначнасць арабскага слова *kafara* = "закрываць, утойваць; быць няверніка; быць няўдзячным" перадаецца ў кітабе праз фігуру гендыядыс, а ў тэфсіры – праз пашыраны творным склонам зварот *tłumić dary niewiereństwem* = "утойваць дары нявер'ем".

У наступным прыкладзе першая частка перакладу верша ў кітабе **K** з'яўляецца парафразай, і тэкст тэфсіра **L** праглядае толькі месцамі. У другой частцы пераклады ў кітабе **K** і ў тэфсіры **L** зноў ідуць паралельна:

KITAB K (71a4) **Q**(2:222) {**wa-yas'alūna-ka 'ani l-maḥīḍi qul huwa**} (5) {**aḏan fa-'tazilū n-nisā'a fī l-maḥīḍi**}[65] *i muchemmed kâli 'u-cebe pitâc buduc (6) 'â beliglôwâch ketôrije mâjuc chwârôbu plinenâ swâjehô mūw jim jest (7) tô welikâje nečistâšc 'âddâlâjce-še 'âd tâk'ich beliglôw*[66] {**wa-lā taqra-**} (8) {*-bū-hunna ḥattâ yaṭhurna iḏā (!= fa-iḏā) taṭahharna fa-'tū-hunna min ḥayṯu amara-kumu llāhu*} (9) {**inna llāha yuḥibbu t-tawwābīna wa-yuḥibbu l-mutaṭahhirīna**}[67] *ne-približâjce-še dâ nich 'âž pâ-* (10) *-kūl 'âčiščiccâ 'âd tâhô plinenâ swâjehô kâli 'âčiščiccâ guśul*[68] *'ôźme* (11) *idzice dâ nich 'âle 'u-tôj šlūnâk jâk prikâẓâw bôh wâm pewne pâ-* (12) *-nbôh lubic pâkâjetnich lūdzej i lūbic čistich*[69]

TEFSIR L (29a8) *ā jeśli spitają ū cebe ōd chajzu*[70] *nečistōści meśenčnej mow jest' tō welka nečistōšc w ten čas strōnce-še [od] newjásti w meśenčnej nečistōści*

---

[65] Пераклад каранічнага тэксту: "І яны пытаюцца ў цябе пра менструацыю. Скажы: "Гэта пакута!" І аддаляйцеся ад жанчыны падчас менструацыі".

[66] Літаральны пераклад кітаба: "О Мухамад, калі ў цябе будуць пытаць пра жанчын, якія маюць хваробу свайго выцякання, кажы ім: "Гэта вялікая нячыстасць. Аддаляйцеся ад такіх жанчын".

[67] Пераклад каранічнага тэксту: "І не набліжайцеся да іх, пакуль яны не будуць чыстымі. А калі яны ачысцяцца, то прыходзьце да іх так, як загадаў вам Алаг. Сапраўды, Алаг любіць тых, хто каецца, і любіць тых, хто ачышчаецца".

[68] Ар. *ġusl* = абмыванне; вялікае рытуальнае абмыванне перад малітвай.

[69] Літаральны пераклад кітаба: "Не набліжайцеся да іх, ажно пакуль яны ачысцяцца ад таго выцякання свайго. Калі яна ачысціцца, рытуальнае абмыванне возьме – ідзіце да іх, але ў тую частку цела, як загадаў вам Бог. Пэўна, Пан Бог любіць тых людзей, якія каюцца, і любіць чыстых".

[70] Ар. *ḥayḍ* = менструацыя.

i ne-približajce-śe dō nich āž śe ōčiščą a k'edi śe ōčiščą i wmijōn-śe tō jūž prichōdzce dō nich ale w ten člōnek jakō prikazal wam bōg bō pewne bōg lūbi kajetnika i lūbī čistich lūdzej[71]

Прыцягваюць увагу экзегетычныя дадаткі, якія можна знайсці ў тэксце тэфсіра і кітаба. Арабскі дзеяслоў *taṭahhara* = "ачышчацца" быў перададзены ў тэфсіры з дапамогай гендыядыса: *oczyścić się* (ачысціцца) і *umyć się* (умыцца). У тэксце кітаба мы таксама знаходзім фігуру гендыядыса. Тут звяртае на сябе ўвагу ўтварэнне фразеалагічнага дзеяслова з рэлігійным тэрмінам (ар.) *ġusl* = "абмыванне, рытуальнае абмыванне перад малітвай": *kâli 'âčiściccâ guśul 'ôźme* (Калі яна ачысціцца, (рытуальнае) абмыванне зробіць). Пры гэтым, без сумнення, размова ідзе пра элемент тэксту, які не грунтуецца на арабскім аргінальным тэксце. Хутчэй такое далейшае развіццё тэксту трэба разумець як дадатковае экзегетычнае тлумачэнне да тэксту тэфсіра – *k'edi śe ōčiščą i wmijōn-śe* – які ляжыць у аснове і з'яўляецца больш нейтральным, г.зн. менш дагматычна афарбаваным, чым кітабны тэкст.

Наступны экзегетычны дадатак: *ale w ten člōnek* / *'âle 'u-tôj šlūnâk* з'яўляецца рэфлексам вытлумачэння мусульманскімі вучонымі арабскага тэксту {**fa-'tū-hunna min ḥaytu amara-kumu llāhu**} = "прыходзьце да іх так, як загадаў вам Алаг". Большая частка ісламскіх каментатараў тлумачыць гэтае месца як забарону садомскіх зносін.

З наступнага прыкладу становіцца зразумела, што беларускі пераклад кітаба паходзіць з тэксту тэфсіра:

KITAB K (39b14) **Q**(2:183) {**yā ayyuhā llaḏīna āmanū [kutiba] 'alay-kumu**} (15) {**ṣ-ṣiyāmu ka-mā kutiba 'alā llaḏīna min qabli-kum la'alla-kum tattaqūna**}[72] *i tije kâtôrije u 'âdzīnâhâ* (16) *bôhâ werice nâpisâw wâm fârẓâm*[73] *pôst remeẓân*[74] *jâk nâpisâw nâ tich kâtôrije pre-* (17) *-d wâmi bili âzâlej būdzce bâjâźnikâmi bôžimi bilî i pâscerâhâli jehô râskâẓâne*[75]

---

[71] Літаральны пераклад тэфсіра: "А калі спытаюць у цябе пра менструацыю – нячыстасць месячную, кажы: "Гэта вялікая нячыстасць. У гэты час пазбягайце жанчыны ў месячнай нячыстасці і не набліжайцеся да іх, пакуль яны не ачысцяцца. А калі яны ачысцяцца і ўмыюцца, то ўжо прыходзьце да іх, але ў тую частку цела, як загадаў вам Бог, бо, пэўна, Бог любіць таго, хто каецца, і любіць чыстых людзей".

[72] Пераклад каранічнага тэксту: "О тыя, якія ўверавалі! Прадпісаны вам пост, таксама як прадпісаны ён тым, хто быў да вас. Можа быць, вы будзеце богабаязнымі".

[73] Ар. *farḍ* = прадпісаны рэлігійны абавязак.

[74] Ар. *ramaḍān* = рамадан, месяц посту.

[75] Літаральны пераклад кітаба: "І тыя, якія ў адзінага Бога верыце, Ён прадпісаў вам абавязак, пост (у) рамадан, як прадпісаў тым, якія былі перад вамі; былі б вы баязліўцамі Божымі і захоўвалі б Яго загады".

TEFSIR L (24a5) *i ci ktōre ūwerili napisalō-śe ferzem wam pōst remezan jakō napisalō-śe na tich ktōre pred wami bili ăzali-śce wī bōjaźnikami bili i pōstregali dnī w meśōncu*[76]

Тут цікавай з'яўляецца канструкцыя аптатыву (*optativ*) альбо адгартатыву (*adhortativ*) з уступнай часціцай *azali* / *azalej*. У тэксце тэфсіра польскі дзеяслоўны канчатак 2-й а. мн. л. *-ście* ўжываецца энклітычна, аддзяляецца ад дзеяслова і далучаецца да часціцы *azali*. Гэты энклітычны канчатак *-ście* лічыцца канчаткам прошлага часу незакончанага трывання дзеясловаў *być* (быць) і *postrzegać* (захоўваць, сцерагчы). Тэкст кітаба імкнецца аналагічна адлюстраваць польскую канструкцыю. Польскае *-ście* перадаецца ў кітабе праз імператыў ад *być*, таму што ў беларускай мове няма энклітычных дзеяслоўных канчаткаў: *budźce* (будзьце). Але праз гэта ўся канструкцыя з формамі прошлага часу незакончанага трывання *byli* і *paścerahali* сінтаксічна выходзіць з раўнавагі. Тут зусім выразна дэманструецца, што ў аснове кітабнага тэксту ляжыць граматычная структура, якая абапіраецца на польскую мову і якая не можа даслоўна капіявацца ў беларускай мове.

Параўнанне вышэйзгаданых каранічных цытат з рукапісу кітаба **K** з адпаведнымі месцамі ў тэксце тэфсіра **L** паказвае:

1) Каранічныя цытаты кітаба тэкстуальна ў значнай меры супадаюць з адпаведнымі месцамі тэфсіра. Такім чынам даказваецца залежнасць паміж каранічнымі цытатамі кітаба і тэкстам тэфсіра.

2) Лінгвістычныя асаблівасці беларускай мовы з рознай сілай праяўляюцца ў асобных цытатах. Заўсёды існуюць таксама шматлікія польскія асаблівасці. Розныя каранічныя цытаты не адлюстроўваюць ні аднароднай, ні паслядоўнай у самой сабе моўнай карціны.

3) У асобных каранічных цытатах кітаб паказвае большыя тэкстуальныя адхіленні, чым тэфсір. Яны з'яўляюцца дадатковымі экзегетычнымі звесткамі да каранічных цытат. Але існуе таксама шмат фраз і сказаў, ідэнтычных перакладу тэфсіра. Некаторыя экзегетычныя каментары кітаба можна разумець як далейшае экзегетычна-тэкстуальнае развіццё тэксту тэфсіра, які ляжыць у аснове.

4) Некаторыя непаслядоўнасці ў структуры тэксту кітаба знаходзяць сваё лагічнае тлумачэнне на аснове тыповых польскіх граматычных канструкцый, якія ўзнаўляюцца ў беларускай мове. Яны пераканаўча пацвярджаюць залежнасць каранічных цытат ад тэксту тэфсіра.

---

[76] Літаральны пераклад тэфсіра: "І тыя, якія ўверавалі, прадпісаны абавязкам вам пост (у) рамадан, як прадпісаны ён тым, хто былі перад вамі; былі б вы баязліўцамі (Божымі) і захоўвалі б дні (посту) у месяцы (рамадан)".

Прыведзеным тут параўнаннем абвяргаецца сцверджанне, што некалі існаваў беларускі пераклад Карана[77]. Наадварот, даследаваныя каранічныя цытаты падмацоўваюць тэзіс пра пераклад, зроблены першапачаткова на польскай мове, і запазычванне каранічных цытат з польскага тэксту тэфсіра ў беларускі тэкст кітаба, прызначаны для шырокага ўжытку. У далейшым каранічныя цытаты набывалі беларускія моўныя рысы ў беларускім кантэксце кітаба.

[77] Гл. >>> 1.1.2. Моўная праблема.

5. СТАН КРЫНІЦ

5.1. Манускрыпты

У пісьменстве татараў Вялікага Княства Літоўскага захаваліся манускрыпты тэфсіраў XVIII і XIX стст. Некаторыя з гэтых манускрыптаў знаходзяцца ў бібліятэках і музеях Вільні, Мінска, Санкт-Пецярбурга і Лондана. Акрамя таго, невядомая колькасць рукапісаў тэфсіраў з'яўляецца прыватнай уласнасцю татарскіх сем'яў у Беларусі, Польшчы і Літве[1].

На падставе вядомых рукапісаў тэфсіраў ужо магчыма зрабіць высновы, істотныя для ацэнкі тэкставай базы. Параўнанне тэкстаў розных манускрыптаў выразна паказвае: 1) моўная аснова перакладу ўсіх рукапісаў – польская. 2) Усе рукапісы тэфсіраў супадаюць па структуры тэксту і па змесце. Яны відавочна ўзыходзяць да аднаго протаэкзэмпляра. 3) Дыяхранічна за прамежак часу каля 200 гадоў (г.зн. на працягу XVIII і XIX стст.) тэкст перакладу не спазнае істотных змен і развіцця[2].

Тэфсір **L**, які сёння знаходзіцца ў Беларускай бібліятэцы імя Францішка Скарыны ў Лондане, паходзіць з 1725 г. і з'яўляецца найстарэйшым з вядомых "літоўскіх" тэфсіраў[3].

У рукапісе Карана 1682 г., які змяшчае арабскі тэкст Карана без падрадковага перакладу і знаходзіцца сёння ў Пскове[4], з'яўляюцца сляды перакладу з тэфсіра ў форме заўваг і глос. Гэты рукапіс быў даследаваны і апісаны пецярбургскім

---

[1] Антановіч (Антонович (1968)) апісвае адзін тэфсір з Вільні (XVIII ст.) і два – з універсітэцкай бібліятэкі Санкт-Пецярбурга (XVIII і XIX стст., = рукапіс **U**). Яшчэ адзін манускрыпт тэфсіра знаходзіцца ў Інстытуце Ўсходазнаўства ў Санкт-Пецярбургу (канец XVIII ст., = рукапіс **I**). Мухлінскі (Мухлинский (1857), с. 62 – 64) на падставе аднаго кароткага фрагмента тэксту апісвае тэфсір, які, на яго думку, паходзіць з XVII ст. (Аднак, мабыць, Мухлінскі карыстаўся рукапісам, ідэнтычным манускрыпту ЛУ-868 тэфсіра XVIII ст., які быў апісаны Антановічам (Антонович (1968), с. 100–103).) Тэфсір з Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лондане складае тэкставую аснову дадзенага даследавання (пачатак XVIII ст. = рукапіс **L**). Некалькі рукапісаў тэфсіраў (XVIII і XIX стст.) знаходзяцца ва ўласнасці таварыства татараў Беларусі "Аль-Кітаб" у Мінску. Колькі манускрыптаў тэфсіраў знаходзіцца ў прыватным валоданні татарскіх сем'яў, немагчыма ацаніць.

[2] Манускрыпты **I** (канец XVIII ст.) і **U** (1825), што даследуюцца ў дадзенай працы, паказваюць толькі нязначныя дадатковыя каментары і змены ў тэксце адносна тэфсіра **L** (1725), які з'яўляецца асновай гэтай працы.

[3] Гл. >>> 17.1. Рукапіс тэфсіра **L**.

[4] Пскоўскі гісторыка-мастацкі і архітэктурны музей-запаведнік-старажытнасховішча (Псковский историко-художественный и архитектурный музей-заповедник-древнехранилище. Ул. Некрасова, 7, 180000, Псков).

арыенталістам Крачкоўскім (1955а)[5]. На жаль, Крачкоўскі прыводзіць толькі дзве кароткія вытрымкі з тэксту як прыклад шматлікіх польскіх заўваг. Аднак яны робяць відавочнай тэкстуальную залежнасць глос пскоўскага манускрыпта Карана (1682) ад "літоўскага" тэфсіра: пачатак суры 33 (*al-Aḥzāb*)[6], паводле Крачкоўскага, гучыць: *i prōrōče bōj-še bōga i ne-bōndz pōslūšnī newernikōm i nedōwerkōm*[7]. Адпаведнае месца ў тэфсіры **L** у значнай ступені супадае: *ī prōrōče bōj-še bōga ā ne-bōndz pōslūšnij newernikōm namawajōncim dō šebe ānitež nedōwarkōm* **L**(338b3). Пачатак суры 108 (*al-Kawṯar*)[8], паводле Крачкоўскага, гучыць наступным чынам: *zapewne ōbdarōwališmi cebe ī muchemmed korānem*[9]. І як тлумачэнне да арабізма *al-kawṯar* ідзе: *k'ewšer – woda rajška žiwōnca*. Таксама ў тэксце тэфсіра **L** у адпаведным месцы знаходзіцца ідэнтычны тэкст: *zapewne ōbdarōwališmi cebe ja muchemmed korānem i k'ewšerem (pretō mōdl-še bōgu swemū i klanaj-še bajram nemaź)* **L**(495b5). Таксама ў тэфсіры **L** тлумачыцца арабізм *al-kawṯar* у форме глосы з ідэнтычным тэкстам: *woda rejška žiwonca – k'ewšer*.

З больш ранняга часу да нас, на жаль, не дайшло ніводнай першакрыніцы ў форме манускрыпта.

Іншы, зразумела, толькі другасны след "літоўскага" тэфсіра, які таксама вядзе ў XVII ст., знаходзіцца, магчыма, у фрагменце тэфсіра, што прыводзіць Мухлінскі (Мухлинский (1857), с. 62) і які датуецца XVII ст. (пачатак суры 20, *Та-Га*):

"muchemmed ne-zeslališmi na cebeh korān 'abi-šeh nim zūbōšil tilkō 'abišceh 'umeli chwalic pana bōga dla bōjańskō [!= bojaźnikow] jegō (2) *zeslaneh jest ōd tego ktōri dzelal źime i nebōse wisōk'ī* (3) *'a sam jakō bōg laskawī milōserdnī na 'eršu*[10] *majestaceh 'ōpanōwal-še zūpelnō mōcą swojō* (4) *dla negō cō w nebōsach i cō w źemi i na źemi i cō medzi nimi i cōkōlwek pōd fūndamentem źemi* (5) *'a chōcbiš-go jawnimi slōwi chwalil 'albō tajemnō pewnō 'ōn we i tajemneh milčk'em chwalōnceh i natajemnejšeh* (6) *alláh jest samī bōg naš nemaš bōga i[n]šegō tilkō 'ōn jegō jest imōna najlepšeh"*[11].

---

[5] Крачкоўскі заўважае: "Для науки интересно и происхождение рукописи: она писана очень типичным неуклюжим почерком литовских татар и содержит массу приписок и отдельных слов на польском или белорусском языке в арабской транскрипции" (Крачковский (1955а), с.163). Гл. таксама: Демидчик (1987), с. 239, дзе прыводзіцца некалькі цікавых дэталей да гісторыі рукапісу. Параўн. таксама: Антонович (1968), с. 38.

[6] Ар. *al-aḥzāb* = групы (мн. л. ад *ḥizb* = частка, група).

[7] Гл. Крачковский (1955а), с. 163–164. (Крачкоўскі прыводзіць цытаты з тэксту ў арабскім шрыфце.)

[8] Ар. *al-Kawṯar* = Назва ракі ў раі.

[9] Гл. Крачковский (1955а), с. 163–164. (Вытрымка з тэксту прыводзіцца ў арабскім шрыфце.)

[10] Ар. *'arš* = трон.

[11] Для параўнання тут даецца адпаведнае месца з тэфсіра **L**: (247a5) *išm tá-há īš īma tō jest ī muchemmed ne-zeslališmi na cebe korān ābiš-še nim zgōršil tilkō ābišce ūmeli chwalic pana bōga dla*

У прыведзеным фрагменце графічна вылучаецца *hā-i-resmīye*[12], альбо *hā* = *h*, які не вымаўляецца, што служыць для перадачы галоснага */e/* ў канцы слова (*cebeh*, *majestaceh*, *tajemneh* і г.д.). Акрамя таго, звяртае ўвагу графема *'ayn* = ‘, якая служыць *mater lectionis* для галосных у пачатку слова[13]. Ужыванне графемы *dāl* з трыма дыякрытычнымі кропкамі над ёй для напісання */dz*, *dz'*/[14], магчыма, з'яўляецца на самой справе асаблівасцю архаічнай арфаграфіі, якая можа служыць аргументам для датавання XVII ст., што было прапанавана Мухлінскім. Безумоўна, такія раннія датаванні належыць разглядаць з асцярожнасцю, таму што некаторыя даследчыкі пісьменства "літоўскіх" татараў вызначылі занадта ранні час узнікнення даследаваных імі манускрыптаў[15].

---

(6) *bōjaźnikōw jegō zeslane jest ōd tegō stworicela źeme i nebōs wisōk'ich ā sam* (7) *jakō bōg laskawij milōserdnij na 'eršū majestace ōpōnōwal-še mōcą swoją dla negō tō cō jest w nebōsach i cō kōlwek jest* (8) *w źemi i na źemi i cō medzi nimi i cōkōlwek pōd fūndamentem źemī ā chōc biź gō jawnim[i] slōwi chwalil albō tajemnō* (247b1) *pre tō zapewne ōn we tajemne milčk'em chwalōnc i natajemnejše allah jest samij bōg nimaš inšegō bōga tilkō ōn jest īmōna* (2) *najlepše.*

[12] Гл. >>> 9.4.2. Заўвагі да спосабаў напісання галосных. Заўв. 34.

[13] Наконт 'ayn у якасці *mater lectionis* гл. >>> 9.4. Напісанне галосных.

[14] Гл. >>> 9.3. Напісанне зычных. Заўв. 13.

[15] Луцкевіч (1920) паведамляе пра каранічны тэкст канца XVI ст. на беларускай мове, які ён быццам бы знайшоў: "Доўга прышлося шукаць Корану, пісанага па беларуску арабскімі літэрамі, і толькі шчасьлівы прыпадак давёў мяне да яго ў 1915 годзі – перад заняцьцем Вільні немцамі. Знайшоў я яго ў татарскага муллы Сьцяпана Палтаракевіча ў Сорак-Татарах, ваколіцы пад Вільняй. Гэта – зложаны з колькісот страніц рукапіс in folio, пісаны характарам XVI або пачатку XVII веку, без пачатку і канца. Адзін з бэрлінскіх вучоных, якога вайна занесла ў наш край, адшыфраваў некалькі страніц гэтага рукапісу, перапісываючы з арабістыкі на лацініку. Вось я і падаю некаторые тэксты, перапісываючы грамадзянкай – літэра ў літэру, як яны запісаны лацінікаю:

стран. 1: "*Напрод Божэ іме успамінаймa. Мілосьць у нутрах свайіх уфундуем. Першый і остатній Он ест векоістый, да кожнэй рэчы моцный. Ніхто Ему непадобный. Едыный ест. Есьлі нічога не было стварыў сьветы.*" стран. 2: "*Цемна было, очы сьветласьці не відзелі. Куры не пелі, сабакі не брэхалі. Дошч ішоў, цемна было, вецер веяў. Разумеў, што судный дзень настаў*".

Гэты прыведзены ў Луцкевіча тэкст паходзіць, безумоўна, не з Карана, а з шырока распаўсюджанай у пісьменстве "літоўскіх" татараў турэцкай *Міpадж*-легенды з падрадковым перакладам. (Параўн. транслітараваны тэкст легенды ў Станкевіча (Stankiewicz (1934)), які даследаваў той самы манускрыпт кітаба, што і Луцкевіч. Параўн.: Антонович (1968), с. 47, 50–57, 377; гл. таксама: Станкевіч (1955). Наконт тэксту легенды гл. таксама >>> 11.3. Фанемы /ł/, /l/ /l'/; >>> 17.5.1.7. З пачатку *Міpадж*-легенды.) Акрамя таго, датаванне мяжой XVI і XVII стст. можна разглядаць як занадта ранняе. Як даказаў Антановіч (Антонович (1968), с. 50–57, 377), выкарыстаны Луцкевічам і Станкевічам манускрыпт паходзіць з першай паловы XVIII ст.

Параўн. таксама: Borawski/Dubiński (1986), p. 249. Тут сцвярджаецца, што найстарэйшыя "літоўскія" рукапісы Карана паходзяць з пачатку XVI ст.: "Najstarsze egzemplarze Koranu pochodziły z początku XVI stulecia. Zawierały one zazwyczaj – dla lepszego rozumienia – przekłady i objaśnienia w języku białoruskim lub polskim, pisane alfabetem arabskim. Księgi takie zwali Tatarzy *tefsirami*." Такія сцверджанні можна ўвесь час чытаць у беларускай прэсе; аднак яны пазбаўленыя навуковай асновы.

5.2. Знешнія крыніцы

Акрамя першакрыніц у форме манускрыптаў мы валодаем двума каштоўнымі дадатковымі сведчаннямі, у якіх мы можам прасачыць след "літоўскага" тэфсіра: 1. Гістарычны твор *Тарых-і Печэві* (*Tarîḫ-i Peçevî*) асманскага гісторыка Ібрагіма Печэві Эфендзі (*Ibrahim Peçevî Efendi*) і 2. гэтак званы "*Рысале-і Татар-ы Лех*" (*Risāle-i Tātār-ı Leh* "Трактат пра польскіх татараў") аднаго паломніка ў Мекку.

5.2.1. "*Тарых-і Печэві*"

У асманскага гісторыка Ібрагіма Печэві Эфендзі (1574 – каля 1650)[16] мы знаходзім, пэўна, найстарэйшае згадванне "літоўскага" тэфсіра. У сваім гістарычным творы *Тарых-і Печэві*, які лічыцца дакладнай крыніцай па асманскай гісторыі паміж 1520 (уступленне на трон Сулеймана) і 1639 (смерць Мурада IV) гадамі, Печэві апісвае таксама мусульманскую супольню Вялікага Княства Літоўскага[17]. Наконт пісьменства ён заўважае: "*Яны пішуць нават Свяшчэнны Каран арабскім пісьмом, і калі яны робяць тэфсір [г.зн. тлумачаць Каран], то яны робяць яго на мове язычнікаў ляхаў*"[18].

Печэві называе ў якасці інфарманта нейкага *кетхуду*[19] па імені Муса, які дзесяць гадоў быў у палоне ў Вялікім Княстве. Печэві характарызуе свайго інфарманта як "чалавека, якога людзі лічылі тым, каму можна давяраць"[20]. *Кетхуда* Муса пасылаў аднойчы нейкага "літоўскага" татарына, не названага па імені, для высвятлення выпадку з судовай практыкі да муфтыя Акермана[21] – свайго роднага горада[22]. "Літоўскія" татары, з якімі *кетхуда* Муса меў зносіны, дэталёва расказвалі яму пра свае мусульманскія суполкі і сярод іншага паведамлялі пра падрыхтоўку тэфсіра.

---

[16] Наконт Ібрагіма Печэві Эфендзі гл.: EI-2, слоўнікавы артыкул PEČEWÎ (F. Babinger). Печэві з'яўляецца першым сярод асманскіх гістарыёграфаў, які выкарыстоўваў заходнія крыніцы для свайго выкладання.

[17] Гістарычны твор Печэві Эфендзі быў выдадзены ў Стамбуле ў двух надрукаваных тамах. Месца пра "літоўскіх" татараў знаходзіцца ў першым томе на с. 472. Гл. тэкст у дадатку >>> 18.2. Фрагмент з "*Тарых-і Печэві*". Параўн. таксама: Bartoszewicz (1858), p. 293–294.

[18] «*Ḥattā Qur'ān-ı 'aẓīmi yine 'arabī ḫaṭṭ ile yazarlar ve tefsīr etseler Leh keferesi lisānıyla tefsīr ederler*»; гл. Tarîḫ-i Peçevî. – Istanbul, 1866. – T. 1, p. 472.

[19] Перс./тур. *keṯḫudā* = намеснік, гофмайстар, начальнік, кіраўнік; альбо таксама наогул намеснік у асманскай ваеннай адміністрацыі; гл. у EI-2 слоўнікавы артыкул KETKHUDĀ (C. Orhonlu).

[20] Гл. Tarîḫ-i Peçevî. – Istanbul, 1866. – T. 1, p. 472: «*Mūsā Keṯḫüdā ki ehl-i dilden bir mu'temed ādamdür*».

[21] Тур. *Akkerman* = Белгарад, горад на Чорным моры, на поўдзень ад Адэсы.

[22] Крычынскі адносіць кансультацыю "літоўскіх" татараў у муфтыя Акермана прыблізна да 1630 года: "Jak informuje historyk turecki Ibrahim Peczewi, około r. 1630 (datę można wynioskować z różnych okoliczności podanych w relacji tego historyka) bawił w Akkermanie-Białogrodzie

Кетхуда Муса служыў у падначаленні Іскендэр-пашы[23], які на момант паведамлення ўжо памёр[24]. З гістарычных крыніц вынікае, што Іскендэр-паша быў атручаны ў 1620/21 г. у Акермане[25].

На падставе сведчанняў гэтых названых Печэві ў кантэксце асоб і інфармантаў, *кетхуды* Мусы і Іскендэр-пашы, на якіх грунтуецца паведамленне пра падрыхтоўку тэфсіра, можна прасачыць след "літоўскага" тэфсіра прынамсі да другога дзесяцігоддзя XVII ст.

5.2.2. Рысале-і Татар-ы Лех

У 1558 г. нейкі паломнік у Мекку, які зрабіў прыпынак у Стамбуле, напісаў для Рустэм-пашы (*Rüstem Paşa*), вялікага візіра Сулеймана Пышнага (Süleyman Qānūnī 1520–1566), паведамленне пра становішча татараў у Вялікім Княстве Літоўскім. Гэты твор з назвай *Рысале-і Татар-ы Лех* ("Трактат пра польскіх татараў")[26] быў першапачаткова зроблены на асманскатурэцкай мове.

---

specjalny wysłannik Tatarów polskich, który przedłożył tamtejszemu muftiemu do rozstrzygnięcia jakąś kwestię religijną" (Kryczyński (1938), p. 208). На жаль, Крычынскі не дае дакладных падстаў для датавання 1630 годам.

[23] Кароткая біяграфія Іскендэр-пашы знаходзіцца ў: Sureyyā (1890), v. 1, p. 347. *Іскендэр-паша* быў *кетхуда* ў падначаленні Тыр'які Хасан-пашы (*Tiryākī Ḥasan Paşa*), галоўнакамандуючага крэпасці Каніша ў Венгрыі. У 1612 г. ён сам стаў намеснікам гэтай крэпасці. У 1613 і 1615 гг. ён знаходзіўся ў Босніі і потым стаў намеснікам Ачакава (асм.-тур. *Ozu* / *Özi*) на Дняпры. Паміж 1616 і 1620 гг. ён удзельнічаў у Малдавіі ў некалькіх ваенных паходах супраць казакаў і палякаў; гл., напрыклад, у Хамера (Hammer (1835), Bd. 4, p. 479): "Цяпер Іскендэр-паша, узмоцнены малдаўскімі, валахскімі і трансільванскімі войскамі, быў пасланы супраць казакаў. Польскі амбасадар быў запэўнены, што асманская армія не накіраваная супраць палякаў, а толькі супраць казакаў, якія на зямлі і на моры – біч для асманскіх граніц і мараплавання". (Цытата датычыць ваеннага паходу супраць казакаў летам 1616.)

[24] Гл. Tarîḫ-i Peçevî. – Istanbul, 1866. – T. 1, c. 472: "*Iskender Paša merḥūmūñ ketḫüdāsı Mūsā Ketḫüdā*."

[25] Гл.: Jorga (1913), Bd. 3, p. 373: "Асман для большай надзейнасці загадаў пакараць смерцю свайго брата Махамеда і 21 мая 1621 г. выступіў з Канстанцінопаля. 12 000 янычараў, артылерыстаў і латнікаў і шматлікія сіпахі, асабліва з Азіі і нават з Алепа і Дамаска, ішлі за ім. Скендэр больш не сустракаў свайго гаспадара: ён памёр у Акермане, як кажуць, ад атруты, што яму даў *калга*, у якога ён спрабаваў аспрэчыць славу перамогі пры Цэцоры".

Параўн. таксама: Sureyyā (1890), v. 1, p. 347; ён заўважае, што Іскендэр-паша быў пазбаўлены жыцця праз здраду слугі; і менавіта ўжо ў 1028 г. гіджры = 1619/20 г.! Аднак вядома, што Іскендэр-паша ўдзельнічаў яшчэ ў польска-турэцкай вайне 1620 г. Параўн. у Хамера (Hammer (1835), Bd. 4, p. 515), дзе Іскендэр-паша яшчэ ўвосень 1620 г. узначальваў ваенны паход у Малдавіі. Зрэшты, наконт Сурэі вядома, што ў яго асманскім біяграфічным даведніку, Siğill-i 'Oṣmānī, падлік гадоў часта не зусім правільны (гл. Babinger (1927), p. 386).

[26] Назва твора *Risāle-i Tātār-ı Leh* (чытай: Risāle-je Tātār-ı Leh) складаецца з персідскай ізафетнай канструкцыі (нешта супастаўнае з генітыўнай канструкцыяй). Першае слова, *Risāle*, ад арабскага кораня. Тэрмін (ар.) *risāla* = "ліст, пісанне, пасланне, трактат, твор" ужываецца ў арабскім

Копія *Рысале* трапіла на пачатку 50-х гадоў XIX ст. у Санкт-Пецярбург. Арыенталіст Антон Мухлінскі (1808–1877)[27], у той час загадчык кафедры ўсходняй філалогіі ў Пецярбургскім універсітэце, набыў яе разам з іншымі арыентальнымі манускрыптамі ў знакамітага стамбульскага гандляра кнігамі Эміна Эфендзі. Скарыстаны Мухлінскім манускрыпт, паводле яго паведамлення, быў напісаны почыркам *ta'līk*[28] і паходзіў з пачатку XVIII ст. Сярод іншага на рукапісе пакінуў адбітак сваёй ўладальніцкай пячаткі вядомы асманскі дзяржаўны дзеяч, літаратар і апякун навукі і мастацтва Рагыб-паша (*Rāġib Paşa*)[29].

Рысале змяшчае дэталёвае апісанне жыццёвых умоў татараў у Вялікім Княстве Літоўскім у часы Жыгімонта Аўгуста (1548–1572), апошняга ўладара з дынастыі Ягайлавічаў. Па форме і характары паведамлення *Рысале* належыць да катэгорыі асманскай рапарт-літаратуры (*Talḫīṣāt*).

Аўтар *Рысале* невядомы[30]. Ён піша ў сваім трактаце, што пры напісанні рапарта атрымаў дапамогу вучоных і пісьменнікаў са Стамбула, спрактыкаваных

пісьменстве як абазначэнне літаратурнага жанру (гл. у EI-2 слоўнікавы артыкул RISĀLA). Гэтае слова ў той самай функцыі пранікла ў персідскае і цюркскае пісьменства. Да слова *Risāle* ў дадзенай назве далучаецца з дапамогай персідскага ізафетнага канчатка *-i* абазначэнне народа *Tātār* = татары, з якім зноў праз ізафет звязваецца абазначэнне народа *Leh* = палякі. Выкарыстоўванне персідскай ізафетнай канструкцыі часта сустракаецца ў асманскатурэцкім пісьменстве.

[27] Пра жыццё і творчасць Мухлінскага гл.: Stanisz (1935). Параўн. таксама заўвагі да *Рысале* ў тым самым творы (p. 316 ff.).

[28] *Ta'līk* – гэта абазначэнне аднаго са стыляў напісання, прынятых ў асманскай адміністрацыі. Гл. трэцюю частку слоўнікавага артыкула KHAṬṬ у EI-2 пра каліграфію ў туркаў (A. Alparslan).

Гл. таксама Zajączkowski/Reychman (1950), p. 52.

[29] *Meḥmed Rāġıb Paşa* (1699–1763) разам са сваімі шматлікімі пасадамі ў адміністрацыі Асманскай імперыі, якія прывялі яго ў Багдад і Егіпет, паміж 1757 і 1763 гг. быў вялікім візірам пры султане Мустафе III (1757–1774). Таксама нельга недаацэньваць яго значэння як выдатнага літаратара свайго часу; гл. у EI-2 слоўнікавы артыкул RĀGHIB PASHA (F. Babinger).

[30] Крычынскі дапускае, што аўтарам *Рысале* мог быць названы вышэй (гл. >>> 1.4. Карантэфсір "літоўскіх" татараў) *Дэрвіш Хаджы Чэлебі Мурзіч (Derwisz Hadży Czelebi Murzicz)*: "Autor 'Risale' w chwili pisania go, t.j. w r. 965 Hidżry (1558), był jeszcze młodym człowiekiem, o czym świadczą niektóre jego wyrażenia; jeżeli przypuścimy, że miał wywczas lat około 30, to w roku 1594 zaprezentuje się nam jako starzec w wieku około 66 lat, co zgadzałoby się z domniemanym wiekiem kadiego Murzicza. Murzicz nosił tytuł hadży, odbył więc pielgrzymkę do Mekki; pątnikiem do Mekki był i nieznany autor traktatu, który w podróży swej, rozpoczętej w r. 965 Hidżry (20.X.1557-20.X.1558), zatrzymał się przez kilka miesięcy w Stambule i tam napisał swoją pracę o Tatarach litewskich, ofiarowawszy ją następnie sułtanowi Sulejmanowi Wspaniałemu. W pisaniu tej pracy doznawał, jak wyznaje, 'wsparcia ze strony uczonych we wszystkich gałęziach umiejętności'. Być może, pielgrzym tatarski z Litwy, powracając później z Arabii, pozostał jeszcze przez jakiś czas w Turcji a pociągnięty głęboką wiedzą teologiczną różnych uczonych, których poznał w Stambule, oddał się studiom w jakimś medrese (szkole teologicznej), wstąpił do klasztoru derwiszów i wrócił wreszcie do kraju na tyle wykształcony w muzułmańskim prawie religijnym, że mógł objąć stanowisko kadi'ego... Są to jednak tylko przypuszczenia, których źródłowymi argumentami wzmocnić nie podobna".

у пісьменстве[31]. Мухлінскі пазначае мову трактата як чысты стамбульскі дыялект; стыль апавядання і фармулёўкі захавалі зразумеласць і прастату. Таксама, паводле Мухлінскага, асманскі вучоны Сідзі Алі (*Sīdī 'Alī Re'īs, Kātib-i Rūmī*)[32], аўтар знакамітых дарожных нататак *Mirāt al-Mamālik* ("Люстэрка краін"), мог дапамагаць "літоўскаму" татарыну пры складанні яго трактата, таму што ў асманскатурэцкім тэксце *Рысале* можна знайсці некаторыя тыповыя элементы стылю гэтага вучонага.

Тэкст *Рысале-і Тамар-ы Лех* быў апублікаваны Мухлінскім у 1858 г. у часопісе *Teka Wileńska*[33] ў перакладзе на польскую мову з каментарамі і заўвагамі: *Zdanie sprawy o Tatarach Litewskich, przez jednego z tych Tatarów złożone Sułtanowi Sulejmanowi w r. 1558. Z języka Tureckiego przełożył, objaśnił i materyałami historycznemi uzupełnił Antoni Muchliński.* У кітабістыцы прынята спасылацца на гэты пераклад Мухлінскага[34].

Чатыры пункты ў *Рысале-і Тамар-ы Лех* заслугоўваюць увагі ў сувязі з пісьменствам "літоўскіх" татараў:

1) Трактат быў створаны, напэўна, з мэтай праінфармаваць вялікага візіра, Рустэм-пашу, пра стан і ўмовы існавання мусульманскай супольні Вялікага Княства Літоўскага:

---

[31] Muchliński (1858), *Risāle*, p. 7: "[...] a wielu z dostojnych ministrów oświadczyło nawet chęć, abyśmy zostawili o sobie pamięć na piśmie, i opisali w krótkości kraje, w których mieszkamy, jako też zwyczaje i obyczaje nasze śród niewiernych. Czyniąc zadosyć ich żądaniu, a przyzwawszy na pomoc błogosławieństwo Nieba, z ochotą poświęciliśmy kilka dni takiéj pracy, w któréj doznaliśmy też wsparcia ze strony uczonych we wszystkich gałęziach umiejętności, mianowicie biegłych w sztuce pisania".

[32] Сідзі Алі нарадзіўся ў 1500 г. у Стамбуле і памёр там 1 джумада аль-аўваль 970 г. гіджры = снежань 1562/ студзень 1563 г. Свае апошнія гады ён правёў у Стамбуле, дзе яго дом быў месцам сустрэч інтэлектуальнай эліты. Пра Сідзі Алі гл. слоўнікавы артыкул SÎDÎ 'ALÎ RE'ÎS у EI-2.

[33] Гл. часопіс "*Teka Wileńska*", Nr. 4, 5, 6. Wilno, 1858.

[34] Кароткая асманскатурэцкая цытата з *Рысале* ёсць у Мухлінскага (Muchliński (1857), p. 55). Параўн. таксама: Stanisz (1935), p. 317 f.; ён прыводзіць некалькі турэцкіх вытрымак з тэксту *Risāle* ў лацінскай транслітарацыі, каб крытычна абмеркаваць польскі пераклад Мухлінскага.

Наконт асманскатурэцкага арыгінала *Рысале* Акінэр заўважае: "1971 saw the appearance of two extremely helpful publications in Turkish: C. Orhonlu's 'Lipkalar" (Türkiyat mecmuası, 16, Istanbul), which looks at the history of the Lipkas (ie Tatars) in the light of Ottoman sources, and M.T. Gökbilgin's 'Lehistan Tatarları hakkinda bir risâle "Risâle-i Tatar-i Leh"' (Tarih Enstitüsü Dergisi, 2, Istanbul), which discusses the original Turkish version of Risale-i Tatar-i Leh (previously only published in Muchlinskij's Polish translation) and includes facsimile reproductions of its twenty-three folios. Linguistically, this manuscript is less informative than might have been expected, for it does not reproduce the speech of the Tatar pilgrim; the unknown author enlisted the help of professional scribes in Istanbul and the result is sixteenth-century Ottoman Turkish, not sixteenth-century Byelorussian Tatar. Nevertheless, it is very interesting to at last have access to the original version of this valuable document" (Akiner (1980), p. 82).

Risāle: "Mieszkańcy tego miasta niezwykłą zdjęci byli ciekawością nas oglądać: z tej przyczyny zapraszano nas do swych domów i badano o szczegółach pobytu naszego w krajach Kiafirów[35], a wielu z dostojnych ministrów oświadczyło nawet chęć, abyśmy zostawili o sobie pamięć na piśmie, i opisali w krótkości kraje, w których mieszkamy, jako też zwyczaje i obyczaje nasze śród niewiernych. [...] A gdyśmy tę pracę ukończyli podług naszych sił i zdolności, złożyliśmy ją w ręce wielkiego wezyra"[36].

Risāle: "Chociaż to Risale w istocie jest przepełnione mnogiemi błędami i usterkami, i niema prawie żadnej wartości, osobliwie w oczach tak wielkiego monarchy; jednak może przynieść jakąkolwiek korzyść, przynajmniej z tego względu, iż da wyobrażenie o stanie wiernych, mieszkających w krajach, gdzie Islam jest dziedzictwem małej garstki ludu"[37].

2) Аўтар згадвае сярод іншага, што татары Вялікага Княства страцілі сваю родную цюркскую мову, але затое авалодалі дзвюма іншымі мовамі, якія ўжываліся там: беларускай і польскай.

Risāle: "[...] na nieszczęście porzucili swą mowę i używają języka krajowego. [...] Dzisiaj zatem mały poczet Muslimów używa tam mowy Otomańskiej, a to tylko tacy, którzy (jak wyżej rzekliśmy) sami w bliższej nam epoce przenieśli się w te strony"[38].

Risāle: "A jeżeli nasi nie mogą rozmawiać po Arabsku lub Turecku, za to mają znajomość innych języków: każdy bowiem w naszym kraju posiada dwie mowy, tam powszechnie używane"[39].

3) Аўтар у сваім трактаце засмучаны занядбаным станам мусульманскай супольні Вялікага Княства Літоўскага. Гэта выразна праяўляецца ў тым, што "літоўскія" татары не маюць уласнага пераказу Карана. Групе паломнікаў адтуль пры наведванні мячэці Сулейманіі[40] быў дадзены ў рукі экзэмпляр Карана, пасля чаго яны выказалі шкадаванне, што ў Вялікім Княстве няма нічога падобнага:

---

[35] Ар. *kāfir* = нявернік.

[36] Muchliński (1858), *Risāle*, p.7.

[37] Muchliński (1858), *Risāle*, p. 9.

[38] Muchliński (1858), *Risāle*, p. 11–12.

[39] Muchliński (1858), *Risāle*, p. 20.

[40] *Сулейманія* – мячэць, якая была пабудавана на загад Сулеймана Пышнага ў 1550–1557 гг. знакамітым дойлідам Сінанам. У *Рысале* адзначаецца, што гэтая пабудова была завершана незадоўга да прыбыцця ў Стамбул паломнікаў з Вялікага Княства Літоўскага. У садзе па-за Сулейманіяй сёння знаходзіцца месца пахавання султана Сулеймана і яго жонкі *Хурэм*, альбо *Раксаланы*, як яе называлі ў заходніх крыніцах. Яна была славянкай, мабыць, украінскага паходжання, якая была ўзведзена ў становішча ўлюбёнай жонкі султана. (Пра Раксалану гл., напр.: Jorga (1913), Bd. 2, p. 345.)

> **Risāle**: "Kiedy nas wprowadzono do środka, trafiliśmy właśnie na wykład Kur'anu, i natychmiast podano nam do rąk świętą xięgę: pomyśliliśmy sobie w duszy, jak nasza nauka nikczemną jest w porównaniu do tych muderrisów[41]!"[42]

Таксама выразна выявілася, што ў Вялікім Княстве Літоўскім не існуе вартага ўвагі мусульманскага духавенства, якое магло б умацоўваць веру. Каб выратаваць там святло ісламу, якое згасае, аўтар просіць султана прыслаць у Вялікае Княства знаўцаў рэлігіі (*'ülemâ*), якія сваёй настаўніцкай дзейнасцю павінны ўзмацніць і захаваць у чысціні ісламскую веру. Рэлігійную сітуацыю ў тамтэйшых мусульман ён лічыць занядбанай, а самі яны ўвогуле разглядаюцца ісламскай *умма*й[43] як язычнікі:

> **Risāle**: "Jeśliby odległość miejsca nie stała temu na przeszkodzie, nie wątpić że padziszahy Osmańscy przysłaliby do nas swoich ulemów[44], którzyby utrzymali naszą wiarę w czystości i prowadzili nas swą nauką po drodze prawej. W teraźniejszem zaś położeniu naszem, nie jest słuszne wyrzucać nam na oczy, że światło Islamu u nas przyćmione, i że my sami u muślimów wyglądamy jakby niewierni. Gdybyśmy przynajmniej posiadali mekteby[45], dzieci nasze mogłyby się uczyć języków Arabskiego i Osmańskiego, oraz innych nauk, które wymagają się od naszej religii"[46].

Невядомы аўтар *Рысале* асмеліўся нават сцвярджаць, што ісламская рэлігійная прапаганда ў Вялікім Княстве Літоўскім можа быць паспяховай і схіліць да ісламу большую частку насельніцтва:

> **Risāle**: "Jeśliby wielki padiszah do tych krajów przysłał od progu swej szczęśliwości gorliwych waizów[47]; niemasz wątpliwości, iż większa część ich mieszkańców zostałaby uzacnioną światłem Islama, dzielnością religii oczywistej i nauki prawdziwej"[48].

4) Аўтар не згадвае ніводным словам рэлігійнае пісьменства. Калі б на момант складання трактата, г.зн. у 1558 г., існавала пісьменства "літоўскіх" татараў з перакладамі Карана, то аўтар трактата пра гэта б згадаў, тым больш, што гэта ўяўляла сабою важную асаблівасць рэлігійнага жыцця татарскай супольні ў Вялікім Княстве Літоўскім.

---

[41] Ар. *mudarris* = настаўнік.

[42] Muchliński (1858), *Risāle*, p. 8–9.

[43] Ар. *umma* = згуртаванне вернікаў.

[44] Ар. *'ālim* (мн. л. *'ulamā'*) = вучоны, рэлігійны вучоны.

[45] Ар. *maktaba* = школа па вывучэнні Карана.

[46] Muchliński (1858), *Risāle*, p. 19–20.

[47] Ар. *wā'iẓ* = прапаведнік.

[48] Muchliński (1858), *Risāle*, p. 14.

Паводле звестак *Рысале-і Татар-ы Лех*, мы павінны заключыць, што каля сярэдзіны XVI ст. не існавала зусім, альбо прынамсі вартай згадвання, рэлігійнай літаратуры "літоўскіх" татараў.

Дзякуючы гэтым двум дадатковым сведчанням, асманскаму гістарычнаму твору *Тарых-і Печэві* і *Рысале-і Татар-ы Лех*, устанаўліваюцца часавыя рамкі, у якіх мы змяшчаем узнікненне перакладу Карана "літоўскімі" татарамі. Усё паказвае на тое, што пераклад узнік не раней як у другой палове XVI ст., а магчыма толькі ў канцы XVI ст.

6. КУЛЬТУРНЫ КАНТЭКСТ

Узнікненне "літоўскага" тэфсіра прыпадае на фазу паланізацыі культурнага, грамадскага і рэлігійнага жыцця ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Ужо на пачатку XVI ст. польская мова перажывала ўздым. Яна стала носьбітам заходнееўрапейскіх духоўных плыняў – гуманізму і Рэфармацыі, якія былі ўспрынятыя Рэччу Паспалітай.

Польская літаратура ў XVI ст. зведала першы росквіт. У польскім літаратуразнаўстве прамежак часу ад сярэдзіны XVI ст. да сярэдзіны XVII ст. лічыцца "залатым векам". Найважнейшыя творы гэтай эпохі належаць Мікалаю Рэю (Mikołaj Rej, 1505–1569), Яну Каханоўскаму (Jan Kochanowski, 1530–1584) і езуіту Пятру Скаргу (Piotr Skarga, 1536–1612). Мовай вышэйшай адукацыі і культуры, а галоўнае, мовай, якой шляхта аддавала перавагу, стала польская; у гэтай функцыі яна ўсё больш выцясняла лаціну.

У Вялікім Княстве Літоўскім з беларускім у большасці насельніцтвам польская мова дзякуючы соцыякультурнай значнасці выцясняла з адміністрацыйнай сферы так званую беларускую мову канцылярыі[1] (змешаную рутэнска-царкоўнаславянскую мову) і царкоўнаславянскую мову часткова – са сферы рэлігіі, адукацыі і культуры. Царкоўнаславянская мова літургіі, якая ўсё больш станавілася чужой і незразумелай народу[2], а таксама прасякнутая беларусізмамі мова канцылярыі была паралізаваная стагнацыяй. Сюды не даходзілі імпульсы культурнага і рэлігійнага развіцця і абнаўлення з праваслаўных цэнтраў Масквы, Кіева і Візантыі. Таксама шляхта Вялікага Княства Літоўскага, якая па сваім паходжанні была праваслаўнай і беларускай, ахвотна прымала польскую мову і лад жыцця, бо яны рэпрэзентавалі больш высокі ўзровень культуры

---

[1] Параўн. Stang (1935).

[2] Waring (1980), p. 134: "But in Byelorussia the decline in Church Slavonic made it unfamiliar to the faithful and hard even for the clergy to understand. / The 16th century was a time when Byelorussian was exposed to influences from the West which were barely felt in Muscovy. Foremost was the Reformation with its insistence on the use of the vernacular in Church services which greatly fostered and, as it were, legitimized the use of Byelorussian for religious purposes. Byelorussia became a crucible of religious conflict in which all the contenders, the Orthodox, Catholics, Uniates and Protestants had recourse to the vernacular in order to proselytize their beliefs. The need to go to the vernacular was also seen in its use by the Jesuits in the Counter-Reformation. Unlike the early fusion of Church Slavonic and the vernacular in Muscovy where familiarity with Church Slavonic made renderings into the vernacular unnecessary, Byelorussian emerged as a distinct written language in the second half of the 16th century, as witness the translations made into it (especially by Ciapinski with parallel Church Slavonic and Byelorussian texts of the *Jevangelije*), while with Symon Budny's *Catechism* there appeared original religious writing in Byelorussian".

і былі больш прывабнымі і прагрэсіўнымі, чым праваслаўная традыцыйнасць. Культурная і сацыяльная паланізацыя, як правіла, цягнула за сабой таксама пераход у каталіцтва альбо ў адно з рэфарматарскіх веравызнанняў[3]. Праваслаўнае духавенства, якое імкнулася да царкоўнаславянскай мовы як мовы літургіі, няўхільна выцяснялася на задні план[4]. З гэтага у Вялікім Княстве Літоўскім XVI–XVII стст. пачынала складвацца яўная сітуацыя дыгласіі, якая канчаткова вызначылася ў наступных стагоддзях[5].

Вырашальным фактарам для ўсталявання польскай мовы ў царкоўна-рэлігійнай сферы, дзе дагэтуль традыцыйна дамінавала латынь, лічыцца Рэфармацыя.

Лютэранства досыць рана пранікла ў Польшчу, дзе яно хутка распаўсюдзілася сярод нямецкага бюргерства. З 1548 г. у краіну рынуліся *чэшскія браты* (анабаптысты), якія знаходзілі тут сваіх паслядоўнікаў. Адначасова пранікаў трэці напрамак – *кальвінізм*. У 1563 г. *антытрынітарыі* (арыяне, эбіяніты, польскія браты) адколваюцца як "*Ecclesia minor*" ад вялікай кальвінісцкай царквы, альбо "*Ecclesia major*".

Розныя групы разгортваюць актыўную публікацыйную дзейнасць, каб сваімі рэфармацыйнымі творамі распаўсюджваць і прапагандаваць "сапраўднае вучэнне" свайго руху. Звычайна пад патранажам магнатаў і князёў яны маглі бесперашкодна засноўваць уласныя друкарні і выдаваць творы на польскай альбо на беларускай мове. Так публікаваліся кнігі казань і катэхізісы, кнігі малітваў і песняў, Псалтыр, пропаведзі, а таксама палемічныя памфлеты на народнай мове, каб звярнуцца менавіта да тых слаёў, якія не валодалі лацінскай альбо царкоўнаславянскай мовай.

Другая палова XVI ст. стала ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім не толькі "залатым векам" у літаратуры, але таксама "залатым векам" біблійных

---

[3] Каталіцтва пашыралася на праваслаўным усходзе ў выніку культурнай паланізацыі, а не наадварот, паланізацыя ў выніку распаўсюджання каталіцтва. Таксама і пераход да пратэстанцкіх веравызнанняў пасля трыумфу Контррэфармацыі скончыўся, нарэшце, вяртаннем зноў у каталіцтва.

[4] У XVI ст. праваслаўным у Вялікім Княстве Літоўскім, як ужо згадвалася, станавілася незразумелай царкоўнаславянская мова, з-за чаго многія вернікі, каб разумець Святое Пісанне, знаходзілі прытулак у публікацыях пратэстантаў і католікаў, якія ў мэтах прапаганды пісалі творы на *простай* (г.зн. на беларускай) мове, але часцей па-польску. Такім чынам, польская мова была прынесена ў карэнную галіну беларускага праваслаўя, дзе яна ўпала на ўрадлівую глебу, і яе ўздзеянне праявілася як істотны фактар змены веры.

[5] Пра польскую культурную і моўную экспансію і ўзнікненне ў Вялікім Княстве Літоўскім сітуацыі дыгласіі (польска-беларускай) гл. аб'ёмістае даследаванне Мартэля (Martel (1938)).

перакладаў[6]. Усе рэлігійныя групоўкі імкнуліся перакласці на польскую мову і пракаментаваць у адпаведнасці са сваім веравызнаннем Святое Пісанне. Паміж 1550 і 1600 гг. з'явіліся наступныя сем перакладаў Бібліі:

– **1551** *Новы Запавет* Станіслава Мужыноўскага (1528–1553) – першы пераклад Бібліі для лютэранскай царквы Польшчы.

– **1553** *Біблія Леапаліты* (*Біблія Шрафенбергера*), выдадзеная ў Кракаве Мікалаем Шрафенбергерам (1519–1606) – каталіцкі пераклад, які, аднак, будучы занадта парафрастычным, не быў прызнаны афіцыйна і хутка адышоў у нябыт[7].

– **1563** *Брэсцкая Біблія* (*Радзівілаўская Біблія*) – першы пераклад Бібліі для кальвінісцкай царквы[8]. Пераклад і друкаванне Бібліі фінансава падтрымаў магнат-кальвініст Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565), які таксама меў моцную схільнасць да нонадарантызму.

– **1572/74** *Нясвіжская Біблія* / *Біблія Буднага* – пераклад Бібліі антытрынітарыя і нонадаранта Сымона Буднага (1530–1593). Пераклад прыцягваў асаблівую ўвагу радыкальнымі, антытрынітарнымі поглядамі Буднага.

– **1577** *Новы Запавет* – Новы Запавет, перакладзены антытрынітарыем Марцінам Чаховіцам (1532–1613). Гэты пераклад быў выдадзены ў Ракаве каля Сандаміра, у цэнтры польскіх антытрынітарыяў.

– **1593** *Новы Запавет* – Новы Запавет, перакладзены езуітам Якубам Вуекам (1540–1597). Вуек карыстаўся рэфарматарскімі перакладамі Бібліі.

– **1599** *Біблія* – поўны пераклад Бібліі езуіта Якуба Вуека. Гэты пераклад да сённяшняга часу з'яўляецца афіцыйным перакладам Бібліі для каталіцкай царквы Польшчы.

Яшчэ перад усімі польскімі перакладамі і выданнямі Бібліі рэфармацыйнага часу і нават за некалькі гадоў да надрукавання Бібліі Лютэра беларускі гуманіст, перакладчык Бібліі і друкар *Францыск Скарына* (нарадзіўся каля 1490 г. у Полацку, памёр каля 1541 г. у Празе) выдаў паміж 1517 і 1519 гг. у Празе 23 кнігі Бібліі на царкоўнаславянскай мове, моцна прасякнутай беларускімі моўнымі элементамі[9]. І ў іншых сваіх публікацыях Скарына свядома спрабаваў

---

[6] Гл. Mazur (1993), p. 199 f.; і таксама Frick (1989).

[7] Гл. Frick (1989), p. 50 ff.

[8] Гл. Frick (1989), p. 68: "In addition to Orszak, Lismanino, Statorius and Thénaud several other figures are presumed to have taken part in the work in various stages: Marcin Krowicki, Grzegorz Paweł z Brzezin, Szymon Żak, Jakub Lubelczyk and Andrzej Trzycieski".

[9] У 1990–1991 гг. Біблія Скарыны была перавыдадзена ў Мінску трохтамовым факсімільным выданнем; гл. Біблія Скарыны (1990).

адысці ад царкоўнаславянскай мовы, якая стала незразумелай для большасці праваслаўных, і наблізіцца да гутарковай беларускай народнай мовы (*простай мовы*)[10].

Каб супрацьстаяць усё больш моцнай паланізацыі Беларусі, беларускі патрыёт Васіль Цяпінскі (1540–1604) пераклаў у 1580 г. Новы Запавет на *простую мову*[11].

6.1. Кальвінізм, антытрынітарызм і нонадарантызм

У Вялікім Княстве Літоўскім магнацкая сям'я Радзівілаў[12] належала да ўплывовых апекуноў *кальвінізму* – рэфармацыі ў швейцарскім варыянце. Пры іх

---

[10] Гл. Bieder (1991), p. 434: "Найбольш значным прадстаўніком Рэнесансу і гуманізму ў Беларусі з'яўляецца ўраджэнец Полацка, вучоны, які атрымаў адукацыю ў Полацку і Вільні, а таксама ва ўніверсітэтах Кракава і Падуі, перакладчык Бібліі, пісьменнік і друкар Ф. Скарына (каля 1490 г. – каля 1541 г.), пераклады і арыгінальныя творы якога былі напісаныя часткова на беларуска-царкоўнаславянскай, часткова на беларускай пісьмовай мове (так званай простай мове). Хаця Скарына перакладаў розныя кнігі Бібліі (Псалтыр, Дзеянні Апосталаў, Стары Запавет) на царкоўнаславянскую мову ў беларускай версіі, але да яе дадаюцца прадмовы і каментары на *простай мове*. Скарына, які ў 1517–1519 гг. друкаваў сваю знакамітую Біблію ва ўласнай друкарні ў Празе, праклаў дарогу для кнігадрукавання сярод усходніх славян. Яшчэ пры яго жыцці мастацтва кнігадрукавання распаўсюдзілася ў некаторых гарадах Вялікага Княства Літоўскага (Львоў, Астрог, Вільна), у той час як у Маскоўскай дзяржаве кнігадрукаванне ўзнікла толькі ў 1564 г., калі рускі І. Фёдараў выдаў у Маскве руска-царкоўнаславянскі пераклад Дзеянняў Апосталаў".

[11] Гл. Bieder (1991), p. 435: "У духу Скарыны дзейнічаў таксама гуманіст і рэфарматар, кнігадрукар, асветнік і перакладчык В.М. Цяпінскі (каля 1540 г. – каля 1604 г.), які ў 1580 г. пераклаў на *простую мову* Евангелле. У прадмове да гэтага перакладу Евангелля Цяпінскі заклікаў да абароны беларускага народа і яго культуры, супраць каталіцтва і польскасці".

[12] У гэтым кантэксце трэба назваць у першую чаргу Мікалая Радзівіла Чорнага (1515–1565) (у канцы свайго жыцця ён схіліўся да нонадарантызму) і Мікалая Радзівіла Рудога (1512–1584).

Наконт магнацкай сям'і Радзівілаў гл. заўвагі Сякерскага (Siekierski (1978), p. 52): "The early history of the Radziwiłłs is not clear. It is certain, however, that they had a common ancestor with the Ościk (Astikas) family, and that they began using the family name of Radziwiłł (in its various early forms) in the 15th century. Throughout the 15th and 16th centuries, the Radziwiłłs increased their wealth and power by intermarriage with other magnate Lithuanian and Polish families, and by securing royal appointments to some of the highest offices in the Grand Duchy of Lithuania. By the early 16th century the family divided into three branches. One of them, which drew much of ist strength from huge estates in the westernmost province of the Grand Duchy, Podlasie, did not survive the first half of the 16th century. The heads of the remaining two branches, Nicholas Radziwiłł 'the Red' (1512–1584) and Nicholas Radziwiłł 'the Black' (1515–1565), obtained the titles of princes of the Holy Roman Empire from the Emperor Charles V in 1547. The same year, the Radziwiłłs scored another great success by seeing 'the Red's' sister, Barbara, marry King Sigismund Augustus. Both Radziwiłłs, 'the Black' and 'the Red', converted to Calvinism; however, only the heirs of the latter remained faithful to it. Their branch of the family became extinct at the end of the 17th century. The sons of Prince Nicholas 'the Black' returned to Catholicism shortly after their father's death in 1565. Their descendants are still alive today".

падтрымцы і пад аховай іншых шляхецкіх сем'яў, напрыклад княжацкай сям'і Кішкаў, у Вялікім Княстве Літоўскім таксама змог усталявацца *антытрынітарызм*[13] і асабліва яго радыкальны напрамак – *нонадарантызм*[14].

Самым значным правадыром і прадстаўніком нонадарантызму быў Сымон Будны (каля 1530–1593). Гуманіст і перакладчык Бібліі, ён увайшоў у гісторыю Вялікага Княства Літоўскага як найвялікшы ерэтык[15]. Праз свае творы ён спрабаваў прывабіць не толькі рэфарматарскія групы і каталікоў, але і пра-

---

[13] Уцекачы з Захаду, перш за ўсё італьянскія антытрынітарыі, напрыклад Бернардына Акіна (Bernardino Ochino, 1487–1564), Матэо Грыбальдзі (Mateo Gribaldi, 1506–1564), Джорджа Б'яндрата (Giorgio Biandrata, 1515–1588), Валянціна Джэнтыле (Valentino Gentile, 1520–1566), Леліо Сацыні (Lelio Sozzini, 1525–1562), Фаўста Сацыні (Fausto Sozzini, 1539–1604) і інш., адыгрывалі важную ролю для антытрынітарызму ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім (пра гэта гл. даследаванне Hein (1974), які вывучаў ранні перыяд антытрынітарызму ў гэтых краінах). Верхняя (Паўночная) Італія, а там перш за ўсё Венецыя, была пад час Рэфармацыі калыскай антытрынітарызму. Гуманістычна і рэлігійна-тэалагічна накіраваныя гурткі ўспрынялі творы іспанскага ўрача і тэолага Міхаэля Сервета (1511–1553), напр., "*De trinitatis erroribus*" (1531) і "*Christianismi restitutio*" (1553). Калі на пачатку 50-х гг. XVI ст. антытрынітарыі ў Італіі сталі ахвярай інквізіцыі, шмат прыхільнікаў антытрынітарызму ўцякло ў Швейцарыю і часткова ў Асманскую імперыю (Салонікі, Дамаск) (гл. Hein (1974), p. 121). Але і ў Швейцарыі прыхільнікі антытрынітарызму не маглі адчуваць сябе ў бяспецы. У кастрычніку 1553 г. у Жэневе за свае погляды знайшоў смерць у полымі Сервет, а ў 1566 г. у Берне быў абезгалоўлены італьянскі антытрынітарый Валянціна Джэнтыле. Вялікае Княства Літоўскае і Польшча дзякуючы рэлігійнай талерантнасці, якая панавала ў гэтых шляхецкіх рэспубліках, сталі месцам збору заходнееўрапейскіх антытрынітарыяў і наогул рэфарматарскіх "ерэтыкоў", якія пераследаваліся ў Заходняй Еўропе.

Разам з уздзеяннем заходнееўрапейскіх антытрынітарыяў у Вялікім Княстве Літоўскім і Польшчы да працэсу перамяшчэння сукупнасці антытрынітарных ідэй далучаецца ўзорная дзейнасць ліцьвіна Пятра з Гоняда – Ганезіўса (Petrus Gonesius, 1530–1581): пад час свайго навучання ў Падуі ён пазнаёміўся з вучэннем Сервета і поглядамі юрыста, тэолага і антытрынітарыя Матэо Грыбальдзі (1506–1564). Пасля свайго вяртання на радзіму пад патранажам князя Мікалая Радзівіла (Чорнага) і Яна Кішкі ён стаў адным з галоўных прадстаўнікоў антытрынітарызму і адначасова прапагандаваў ідэі анабаптызму чэшскага кірунку. (Пра пасярэдніцкую дзейнасць Ганезіўса гл. Hein (1974), p. 135–140; Kot (1953), p. 72 ff.)

[14] Наконт нонадарантызму ў Вялікім Княстве гл. Wilbur (1947), p. 367–374. Важныя перадумовы для поспеху там нонадарантызму Вільбур бачыць у моцнай юдэйскай прысутнасці і агітацыі: "From the middle of the sixteenth century a liberal religious movement fusing Judaism with rationalistic tendencies in the Russian Church had spread from northern Russia into Lithuania, opposing the Trinity and the deity of Christ, and also teaching radical social doctrines. The Jews there were numerous, wealthy and influential, had famous scholars, and carried on an aggressive propaganda" (гл. Wilbur (1947), p. 368).

[15] Дэталёвае апісанне жыцця і творчасці Буднага дае Kot (1956). Пра пераклады Будным Бібліі і яго значэнне як наватара ў галіне філалогіі гл. Frick (1989), p. 81–115. Наконт біблейскай філалогіі Буднага, яго дагматычных і сацыяльных поглядаў з беларускага пункту гледжання існуе даследаванне Івана Саверчанкі (1993).

васлаўнае насельніцтва[16], царкоўнаславянскую рэлігійную літаратуру якога ён добра ведаў, а таксама спрабаваў прыстасаваць польскую мову да мэтаў рэфармацыі і моўнага аднаўлення. Акрамя таго, ён меў кантакты з юдэйскімі абшчынамі Вялікага Княства[17].

Вільня ў другой палове XVI ст. была квітнелым цэнтрам юдэйскай культуры. З Вільні паходзілі выдатныя юдэйскія тэолагі, і там яны пісалі свае творы. Сярод іншых трэба назваць караіма Ісака з Трокаў[18], які ў сваім знакамітым творы *Ḥizzūk Emunā* (габр. Умацаванне веры) аспрэчваў догматы хрысціянскай рэлігіі, а таксама імкнуўся абараніць юдаізм. У 1681 г. пад назвай *Tela Ignea Satanae*[19] з'явіўся лацінскі пераклад кнігі, якая выклікала вялікую палеміку ў хрысціянскім свеце.

У Рэчы Паспалітай у другой палове XVI ст. разгарнулася вострая дыскусія вакол хрысціянскага догмата Святой Тройцы. Розныя антытрынітарныя гру-

---

[16] Адным з першых твораў Буднага быў Катэхізіс на (бела)рускай мове (Нясвіж, 1562), каб прывабіць менавіта "простых людзей" праваслаўнага насельніцтва Літвы: *"Катихисісъ то есть наука стародавная хрістіаньская от светого писма, для простыхъ людей языка рускаго, в пытаніахъ и отказехъ събрана"*. (Катэхізіс – гэта старажытная хрысціянская навука са Святога Пісання для простых людзей рускай мовы, сабраная ў пытаннях і адказах) (гл. Kot (1956), p. 67; Bieder (1991), p. 435). На год пазней з'явіўся Катэхізіс на польскай мове (Нясвіж, 1563).

[17] Для свайго перакладу Бібліі Будны карыстаўся паслугамі маладога, напэўна, юдэйскага асістэнта, які мог добра чытаць па-габрэйску, што вынікае з ліста Буднага ад 1572 г.: "[...] Chyba co mam młodzieńca, co dobrze czyta Hebrayskie, to mi czytał, a ia słuchaiąc przekładałem" (... хіба толькі маю юнака, які добра чытае па-габрэйску; ён мне чытаў, а я, слухаючы, перакладаў.) (Гл.: Kot (1956), p. 77, 78; Frick (1989), p. 109; Szyszman (1989), p. 49.)

[18] Ісак бен Абрагам (пам. 1594) быў юдэйскім вучоным з Трокаў – цэнтра "літоўскіх" караімаў (каля 30 км на захад ад Вільні). Пасля яго смерці твор *Ḥizzūk Emunā* (Умацаванне веры) быў дапоўнены яго вучнем Іосіфам бен Мардэхаем Маліноўскім (нарад. каля 1570 г. у Троках, пам. у Луцку каля 1635 г.). Ісак ведаў і цаніў антытрынітарныя творы Сымона Буднага і Марціна Чаховіца (і іншых), і чэрпаў з іх. (Гл. Kot (1956), p. 82–83; Mann (1972), p. 714–720.) Разам з Ісакам з Трокаў трэба назваць іншых інтэлектуалаў: знакамітага кракаўскага равіна Майсея Ісерлеса (Moses Isserles) (1510–1572), Саламона бен Ехіеля Лур'ю (Salomon ben Jechiel Luria) (1510–1573, Брэст) і менш вядомых Абрагама Горвіца (Abraham Horwic) і Якуба з Белжыц (Нахмана), які дыспутаваў з Марцінам Чаховіцам (гл. Tazbir (1977), p. 85 – 86; і Tazbir (1987), p. 111 ff.).

[19] *Tela ignea Satanae hoc est Arcani et horribiles Judaeorum adversus Christum Deum et Christianam Religionem Libri Anegdotoi*. Гэты твор у перакладзе на лацінскую мову быў выдадзены ў Альтдорфе ў 1681 г. правазнаўцам і арыенталістам Іаганам Хрыстафам Вагензейлем (Johann Christoph Wagenseil, 1633 – 1705), які набыў рукапіс у Сеуце (Іспанскае Марока). (Гл. Kot (1956), p. 83; Szyszman (1989), p. 53.) Ужо ў 1605 г. твор павінны былі надрукаваць у Амстэрдаме, куды быў дастаўлены адрэдагаваны Іосіфам бен Мардэхаем Маліноўскім манускрыпт; аднак выданне не было здзейсненае. Гэты твор усплыў на Захадзе ў першай палове XVII ст. у розных копіях і перакладах, так, напр., у 1621 г. у Іспаніі пад назвай *Fortificatión de la fé* Ісака Атыяса (*Izaak Athias*) і ў 1624 г. у Гамбургу ў нямецкім перакладзе Арона Лур'і (Aaron Luria).

поўкі сваёй палемікай распальвалі атмасферу[20]. Рэлігійныя дыспуты, асабліва ў Вялікім Княстве Літоўскім, эпізадычна набывалі пагражальныя памеры[21]. Толькі дзякуючы агульнавядомай *талерантнасці* ў рэлігійных пытаннях не дайшло да гвалтоўных сутыкненняў. Паказальным для становішча ў Вялікім Княстве быў удзел у палеміцы юдэйскіх вучоных – феномен, які быў бы немагчымым у Заходняй Еўропе XVI ст.[22] Яны наведвалі антытрынітарныя сіноды і выступалі ў дагматычных дыспутах. У выніку тых антытрынітарных тэолагаў, якія ў пытаннях адносна догмата Тройцы занадта наблізіліся да юдэйскага пункту гледжання, хутка пачалі вінаваціць у *юдаізаванні*[23].

Таксама добра вядомая з гісторыі Рэфармацыі блізкасць асобных антытрынітарыяў да *магаметанства*[24]. Тыповым паўстае, напрыклад, выпадак

---

[20] Тым часам як антытрынітарыі Польшчы ўсё больш падпадалі пад уплыў анабаптыстаў і ўсё больш выстаўлялі сацыяльныя ўтопіі, ззаду за якімі апынуліся дагматычныя, хрысталагічныя пытанні, у антытрынітарыяў Вялікага Княства хрысталагічныя пытанні і нонадарантызм стаялі на пярэднім плане. Напрыклад, нонадарант Будны ў сацыяльных пытаннях трымаўся памяркоўнай пазіцыі, таму што абараняў панаванне шляхты і прызнаваў сумяшчальнасць вайсковай службы з верай.

[21] У адным з лістоў магната Мікалая Радзівіла (Чорнага, 1515 – 1565), які быў напісаны 14.09.1564 у Брэсце да кальвіністаў у Жэневу і Булінгеру ў Цюрых, можна прачытаць, што рэлігійныя дыспуты аб важных догматах веры і перш за ўсё пра Святую Тройцу, якія выбухнулі ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім, нясуць вялікую небяспеку і раскол краіны і вядуць яе на мяжу разбурэння. Радзівіл просіць швейцарцаў аб пасярэдніцтве ў рэлігійных спрэчках і аб выразным выказванні сваёй пазіцыі адносна спрэчных догматаў. Ліст, напісаны на лацінскай мове, прыводзіцца ў Вочке (Wotschke (1908), p. 225 – 226).

[22] У першую чаргу трэба назваць ужо згаданных Ісака з Трокаў і Якуба з Белжыц (Нахмана) (гл. Tazbir (1987), p. 111–114). У той час як пра юдэяў вядома, што яны ўмешваліся ў палеміку і бралі ўдзел у хрысціянскіх сінодах, пра актыўны ўдзел "літоўскіх" татараў у рэлігійных дыспутах невядома нічога! Хаця татары прытрымліваліся сваёй першапачатковай рэлігіі, ісламу, але ў сярэдзіне XVI ст. у іх не было развітай інтэлектуальна-тэалагічнай навучальнай традыцыі, якая давала б ім магчымасць удзельнічаць у рэлігійных дыспутах; гл. Sobczak (1984), p. 106: "Ludność tatarska mimo swego niewątpliwego przywiązania do religii przodków nie była, jak się wydaje, przygotowana i skłonna do podejmowania teoretycznych sporów doktrynalnych i teologicznych. W okresie Rzeczypospolitej szlacheckiej nie wydali zresztą Tatarzy spośród siebie żadnej jednostki o szerszych horyzontach i zainteresowaniach intelektualnych na miarę chociażby Izaaka z Trok, sekretarza trockiej gminy karaimskiej, którego dzieło wywołało ożywione polemiki w świecie chrześciańskim".

[23] Як моцна напрыканцы XVI ст. ненавідзелі антытрынітарыяў, і сярод іх асабліва радыкальных нонадарантаў, паказвае каментар на смерць Буднага, які выйшаў з-пад пяра езуіта Марціна Лашча (Marcin Łaszcz) у 1597 г.: "Але калі Будны здыхаў, яго прызвалі, ён хацеў было шукаць падтрымкі ў Хрыста; але ён казаў: Пад час майго жыцця я мала турбаваўся пра яго, так і ён зараз далёка ад мяне. Так выпруціўся ён, нібы юдэй" (гл. Kot (1956), p. 111).

[24] Рэакцыі на антытрынітарны пераклад Бібліі Буднага 1574 г. былі падчас надзвычай рэзкімі. Яго папракалі не толькі ў *юдаізацыі*, але і звязвалі яго з "*магаметанамі*". Kot (Kot (1956), p. 82) цытуе ліст ужо згаданага езуіта Пятра Скаргі (1536–1612) з Вільні, у якім той абвінавачвае

гейдэльбергскага антытрынітарыя *Адама Нойзера* (Adam Neuser), які пасля сваіх уцёкаў з Германіі перабраўся спачатку ў Рэч Паспалітую і адтуль далей у Трансільванію, дзе ён далучыўся да групы вакол нонадараната Франца Давідзіса (Franz Davidis)[25]. Відавочна, пазней, ужо ў Трансільваніі, ён прыняў іслам і апынуўся, нарэшце, у Стамбуле[26].

Буднага ў "магаметанстве": "Паколькі біскуп Ежы Радзівіл быў вельмі абражаны гэтым творам, я казаў яму, каб ён не прымаў гэта блізка да сэрца, а замест гэтага ўпэўніўся, што адзін гэты катэхізіс Лютэра больш пашкодзіць божай царкве, чым такога кшталту відавочныя блюзнерствы, якія не далей за адзін крок ад магаметанства".

Пад націскам кракаўскіх кальвіністаў цюрыхскі тэолаг-рэфарматар Іосіас Зімлер (Josias Simler, 1530–1676) напісаў у 1575 г. пярэчанне на нонадарантызм Буднага: "*Assertio orthodoxae doctrinae de duabis naturis Christi opposita blasphemiis et sophismatibus Simonis Budnaei nuper ab ipso in Lituania evulgatis*" (Tiguri, 1575). Антытрынітарызм іспанца Сервета ён разглядае як выкліканы мусульманамі і бачыць яго як д'ябальскі план на пагібель хрысціян. Вучні Сервета ўцяклі на Усход, на ўскраіну хрысціянскага свету, на мяжу з Асманскай імперыяй, дзе многія з іх перайшлі да туркаў (гл. J. Simler, Assertio, 59v/60r): "et haec praeclara dogmata Servetus in Machumetanorum scholis hausit, quae eius discipuli nunc in vicinia Turcarum spargunt et, ut audio, non pauci ad Turcicas superstitiones deficiunt ac circumcisionem recipiunt" (гл. таксама Firpo (1977), p. 163).

Нямецкі рэфарматар Марцін Лютэр (1483–1546) бачыў у турках і ісламе не толькі палітычную, але таксама рэлігійную пагрозу. Бобцын (Bobzin (1985b), p. 263 f.) заўважае: "Але таксама з тэалагічнага або рэлігійна-палітычнага пункту гледжання туркі (у сэнсе мусульманскага панавання) уяўлялі небяспеку для заходнееўрапейскага хрысціянства, і прытым для прыхільнікаў як новага, так і старога вучэння. Пры гэтым мелася на ўвазе не толькі небяспека адпадання ад хрысціянскай веры, як гэта, напрыклад, адбылося з падданымі на нованабытых турэцкіх тэрыторыях альбо з ваеннапалоннымі, але, у большай меры, тэалагічнае спакушэнне, якім нібыта з'яўлялася ісламскае вучэнне для пэўных груп у выніку Рэфармацыі. Толькі на гэтым фоне робіцца зразумелай скарга страсбургскага царкоўнага кіраўніцтва, што "многія людзі лёгка вераць, нібы забабоны туркаў не такая ўжо блытаная, бязглуздая і непрыстойная рэч..." ('leichtlich fil leut beredt, es seie der Turcken aberglaube nicht so ein wüst wanwitziges und unflätigs ding …') [ліст да базельскага царкоўнага кіраўніцтва ад 27.11.1542, цыт. у Штэйнмана (M. Steinmann, Johannes Oporinus (Basel, Stuttgart 1967), p. 21, заўв. 3)]".

Далей Бобцын адзначае: "Калі Лютэр упэўнены, што 'іслам' як відавочна фальшывы напрамак веры можна сустрэць не толькі звонку, але менавіта ўнутры царквы, тады мог бы з'явіцца ў некалькі іншым святле той бок дзейнасці Лютэра, які абмінаюць ў большасці біяграфій альбо выкладаюць толькі мімаходзь, а менавіта яго імкненне да дакладнага ведання Карана як найважнейшага дакумента ісламу" (Bobzin (1985b), p. 269).

Наконт стаўлення Лютэра да Карана і да ісламу гл. таксама Bobzin (1995), p. 13–158.

[25] Франц, або Ферэнц, Давідзіс (Ferenc Dávidis)) (1510–1579) з Клаўзэнбурга ў Трансільваніі спачатку далучыўся да лютэранства; але ў далейшым ён паступова перайшоў да кальвінізму, які пачаў моцна пашырацца ў Трансільваніі. Па-за межамі унітарнай царквы ён, нарэшце, прыйшоў да радыкальнага вучэння нонадарантызму.

[26] Пра Адама Нойзера (нарадз. каля 1530 г., пам. у Канстанцінопалі ў 1576 г.) і пра гурток гейдэльбергскіх антытрынітарыяў – Іагана Сільвана, Якоба Зутэра, Матыяса Глірыўса/Bee (Johannes Sylvan, Jakob Suter, Matthias Glirius/Vehe) гл.: Wilbur (1947), p. 258–264, і перш за ўсё: G.E. Lessing. Theologiekritische Schriften I, von Adam Neusern. Einige authentische Nachrichten.

У антытрынітарным асяроддзі Вялікага Княства Літоўскага супер'інтэндант нонадарантаў *Пётр Вітроўск*[27] адкрыта прызнаваў боскасць Карана, як вынікае з яго ліста ад 1574 г. да Адама Нойзера, які знаходзіўся ў Стамбуле:

"Quaeso, mi Adame, diligenter interroga, an Alcoranus iste, quem Bibliander Tiguri edidit, sit authenticus, et veritati Arabicae conveniat. Nam isto libro nos valde delectamur, et divinum esse asserimus"[28].

З гэтага вынікае, што рэфарматары Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага ведалі Каран выключна праз базельскае выданне Тэадора Бібліяндэра. Інтэнсіўныя сувязі гэтых дзеячоў з Захадам, і ў прыватнасці са Швейцарыяй, добра даследаваныя. Але з гістарычных крыніц нічога не вядома пра канкрэтныя пункты судакранання і кантакты тэалагічна-дагматычнага характару паміж рэфарматарамі і мусульманска-татарскім насельніцтвам Вялікага Княства Літоўскага. Відавочна, татарская меншасць не ўяўляла асаблівай цікавасці для рэфармацыйнай агітацыі[29]. У Беларусі мэтаю як для каталіцкай, так і для рэфармацыйнай прапаганды было перш за ўсё праваслаўнае насельніцтва.

---

[27] Гл. Вочке: "Супэр'інтэндант апошніх, Пётр Вітроўск, так глыбока памыляўся, што Каран ставіў вышэй за Біблію і паважаў яго як боскі" (Wotschke (1911), p. 218). (Вочке свае звесткі запазычвае ў Лесінга: G.E. Lessing. Theologiekritische Schriften I, Von Adam Neusern. Einige authentische Nachrichten.)

[28] Гл.: G.E. Lessing. Theologiekritische Schriften I, von Adam Neusern. Раздзел 14. ("Даведайся, калі ласка, дакладна, дарагі Адам, ці з'яўляецца аўтэнтычным і адпаведным арабскаму арыгіналу выданне Карана, якое выдаў Бібліяндэр у Цюрыху. Бо мы вельмі радуемся гэтай кнізе і лічым яе боскай.") Наконт гэтага месца Лесінг заўважае: "Такім чынам, прынамсі гэтую польскую абшчыну творы Нойзера завялі так далёка, як толькі можа зайсці унітарная абшчына. Гэта далей, чым такая абшчына магла б сабе дазволіць без пагрозы страціць назву хрысціянскай абшчыны. Бо, сапраўды, так далёка не заходзілі ні сам Ф. Давідзіс, ні ўсе тыя, хто аспрэчваў пакланенне Хрысту нароўні з Богам; яны працягвалі прызнаваць боскімі кнігамі толькі выключна Стары і Новы Запавет, і нават гэта даказвалі. Так яны думалі, што хрысціянская мараль прынамсі пацвярджаецца і, безумоўна, устанаўліваецца гэтымі Богам дадзенымі кнігамі. Тыя ж польскія унітарыі, якія лічылі боскім таксама і Каран, былі альбо неабрэзанымі туркамі, альбо дэістамі (калі *боскае* тут павінна было значыць толькі *добрае* і *павучальнае*). Калі б усе польскія унітарныя абшчыны былі з імі згодныя, тады немагчыма было б казаць, што ў 1658 і 1660 гг. з Польшчы былі выгнаныя хрысціяне".

[29] Гл. Tazbir (1994), p. 176: "Among those who remained wholly indifferent to the Polish Reformation were adherents to Judaism and Islam. Only a few followers of the radical stream of the Reformation harboured utopian dreams of a unification of the three main religions, Christianity, Judaism and Islam. More down-to-earth thinkers viewed this prospect as unrealistic. The Arian Marcin Czechowic wrote that it was more difficult to convert a Jew than to unaccustom 'a wolf from the habit of killing sheep or a cat from catching mice'. [...] In direct contact Judaism appeard to be stronger than Protestantism: in the second half of the sixteenth century there spread among adherents of the radical Reformation a so-called 'Judaising' tendency, in which the Old Testament was considered the main basis of faith. / The Reformation did not manage to win over adherents of Islam settled in the Grand Duchy of Lithuania". Гэтай апошняй заўвагай аўтар закрывае тэму сувязяў рэфарматараў з "літоўскімі"

Аднак рэфармацыйна-антытрынітарная палеміка вакол догмата Тройцы і боскага сыноўства Хрыста не магла заставацца сакрэтам для мусульманскага насельніцтва. Буйныя постаці антытрынітарнага руху ў Вялікім Княстве Літоўскім на працягу другой паловы XVI ст. абаранялі ў публічных дыспутах і ў палемічных творах свае пазіцыі; і не толькі на лацінскай мове, але таксама на польскай і беларускай. Такія дыспуты праходзілі не толькі ў Вільні, але і ў малых гарадах Княства, напрыклад у Брэсце, Нясвіжы, Наваградку, Іўі, Лоску і Маладзечне. Вядома, што гэтыя дыспуты кожны раз распальвалі вялікія дыскусіі ў шырокіх колах насельніцтва (гл. >>> 18.3. Важны след).

Больш за тое, размежаванне паміж рознымі рэлігійнымі веравызнаннямі прайшло праз сем'і, у тым ліку і праз татарскія. Трэба падкрэсліць, што дзякуючы талерантнасці, якая панавала ў краіне, розная рэлігійная прыналежнасць не шкодзіла сямейным і саслоўным сувязям.

6.2. Суіснаванне розных рэлігійных канфесій

Як мы ўбачылі, у Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVI ст. існуе сумесь розных рэлігій, канфесій і сектаў.

Каталіцтва насуперак рэфармацыі захоўвае сваё панаванне і, нарэшце, перамагае "ерэтыкоў". Сярод рэфармацыйных груп *кальвінізм* дамінуе над *лютэранамі* і *анабаптыстамі*. *Антытрынітарызм* прысутнічае таксама і ў сваёй радыкальнай форме – *нонадарантызму*. Антытрынітарная прапаганда і моцная палеміка вакол догмату Святой Тройцы пагражала ўнутранаму адзінству краіны. Праваслаўныя, якія са сваім у большасці рутэнскім (беларускім)

татарамі. Паколькі стан крыніц з'яўляецца вельмі складаным, да сённяшняга часу не існуе спецыяльнага даследавання па гэтай тэме. Собчак робіць акцэнт на тым, што ў стаўленні розных хрысціянскіх веравызнанняў да татараў пытанне пра іх рэлігію было на другім плане: "Kwestia religii przez nich wyznawanej miała znikomy wpływ na stanowisko ludności chrześcijańskiej wobec nich i to zarówno katolików, jak i prawosławnych i ewangelików" (Sobczak (1984), p. 100).

Між тым устаноўлена, што татары, якія з Вялікага Княства пераехалі ў Польшчу, як правіла, пераходзілі ў каталіцтва. У хадзе паланізацыі шляхты Вялікага Княства, сярод якой таксама знаходзіліся знатныя татарскія сем'і, адбываўся пераход да каталіцтва альбо да рэфармацыйнага веравызнання, і татары іншых сацыяльных слаёў у гэтым сэнсе не складалі выключэння.

Так, невядомы аўтар *Risāle-i Tātār-i Leh* указвае на выпадкі, калі асобныя татары з тых, што перабраліся ў Літву, зракаліся сваёй ісламскай веры. Станіш прыводзіць папраўку да аднаго месца з *Risāle*, не зусім дакладна перакладзенага Мухлінскім, якая пралівае святло на гэты стан рэчаў: "Przekład oddaje naogół wiernie myśl autora. Wszelako nie ustrzegł się Muchliński od pewnych pomyłek, które wymagają tutaj sprostowania. I tak na str. 8 tekst turecki brzmi następująco: *'ve haif ki bazilar dinlerinden irtidad edüp o yerliler lisanile söylemege basladilar, lakiu ... simdiye kadar bazilar dinlerini hifz ediyorlar*', co Muchliński na str. 11 tłumaczy w ten sposób: 'Na nieszczęście porzucili swą mowę i używają języka krajowego, lecz ... zachowali dotychczas swą wiarę'. Jasną jest rzeczą, że dosłowny przekład tekstu powinien brzmieć: 'i na nieszczęście niektórzy, odstąpiwszy od swej religji, zaczęli mówić językiem krajowym, lecz niektórzy dotychczas zachowują swą religję'" (Stanisz (1935), p. 317f).

насельніцтвам складаюць у Вялікім Княстве Літоўскім дамінантную рэлігійную супольню, каснеюць у традыцыйнасці і стагнацыі. Паступальная паланізацыя ў культуры, грамадстве і рэлігіі прычыняла ім клопат. Каталіцтва праз Брэсцкую унію (1596) фармальна далучае частку праваслаўных да Рыма (*уніяцкая ўсходняя царква*). Акрамя таго, у Княства ўцякалі *праваслаўныя раскольнікі* з Расіі (стараверы і інш.). У дадатак існуюць дробныя суполкі *манафізітаўармян*, рассеяныя па ўсім Вялікім Княстве.

Юдэйская супольня ў XVI ст. перажывае культурны росквіт пад талерантным панаваннем польскіх каралёў і вялікіх князёў літоўскіх. У Вялікім Княстве юдэйская секта караімаў[30] з цэнтрам у Троках дае вучоных-тэолагаў высокага ўзроўню. Са сваёй экзегезай Святога Пісання, якая абапіралася толькі на тэкст Бібліі (выключаючы Талмуд), яны паказваюць пункты судакранання з крытычна-тэксталагічнымі метадамі інтэрпрэтацыі Бібліі, якія ўжываліся рэфарматарамі[31].

Іслам прадстаўлены ў форме татарскай меншасці. Татары значна асімілююцца ў плане мовы і культуры ў краіне, куды яны прыбылі, але моцна трымаюцца за сваю рэлігію, а таксама за свае сувязі з Крымам, волжскімі татарамі (Казань) і больш за ўсё – з Асманскай імперыяй. Вялікая колькасць "літоўскіх" татараў здзяйсняюць паломніцтва ў Мекку, прычым вандроўны шлях, зразумела, вядзе праз Стамбул і Малую Азію.

Вывучэнне канфесійных груп і рэлігійных меншасцяў, якія былі прадстаўлены ў Вялікім Княстве XVI–XVII стст., і перш за ўсё антаганізмаў, узаемадзеянняў і ўзаемасувязяў, якія ўзнікалі паміж імі, уяўляе сабою амаль бяскрайнюю галіну даследаванняў, да якой існуе значная навуковая літаратура. Аднак

---

[30] Абазначэнне групы – караімы – паходзіць ад габрэйскага кораня са значэннем «чытаць». Гл. Szyszman (1989), p. 19: "Le terme 'karaite' a pour étymologie soit le verbe *kara* - 'lire', 'étudier' [l'Ecriture Sainte], 'inviter', 'appeler' (ainsi les karaites seraient 'les partisans de l'Ecriture', 'ceux qui appellent', 'missionaires'); soit le nom arabe *qārī* - 'le lecteur' (ainsi les karaites seraient les 'lecteurs experimentés de l'Ecriture Sainte')". Пра гісторыю, вучэнне і значэнне караімаў гл. таксама слоўнікавы артыкул KARAITES (у EI-2) і Mann (1972), p. 553 – 768 (пра караімаў у Літве і Польшчы).

[31] Гл. Szyszman (1989), p. 19: "Chaque fidèle est poussé a étudier lui-mème la Bible et à ne pas accepter aveuglément les opinions des autres; ce principe a donné au karaisme une forte tendence individualiste qui va même parfois trop loin. Tous les livres bibliques ont une valeur égale à celle du premier (le Pentateuque) et leur ensemble est suffisant pour établir les normes religieuses sans équivoque et sans recours à d'autres sources législatives. Le rôle de la Bible est premier, mais renforcé par les traditions. Celles-ci sont fortement respectées et cultivées à condition toutefois de ne pas attenter à l'autorité de l'Ecriture Sainte. C'est pourquoi un texte de la Bible soigneusement établi est nécessaire aux karaites plus qu'aux fidèles de toutes les autres religions du Livre. Aussi les karaites se sont-ils particulièrement engagés dans l'étude approfondie du texte biblique, et leur oeuvre dans ce domaine est unanimement acceptée dans le monde. Par cette contribution, les karaites ont créé les bases de l'exégèse biblique moderne".

Гл. таксама: Szyszman (1989), p. 49: "A l'époque de la Réforme et de la Contre-Réforme, alors que tout le pays était en état de bouillonnement spirituel et intellectuel et que les disputes religieuses et philosophiques se multipliaient, les Karaites n'y restèrent pas étrangers. Selon A. Kraushar, ils participérent à la traduction de la Bible par Simon Budny en 1572".

таму, што крыніцы па гісторыі "літоўскіх" татараў мізэрныя, даследаванне іх становішча ў рэлігійнай структуры Літвы аказваецца досыць складаным.

6.3. Татары і караімы

Унутры рэлігійных груп Вялікага Княства Літоўскага асабліва цікавым з'яўляецца асвятленне адносін паміж юдэямі-караімамі і мусульманамі-татарамі, таму што абедзве меншасці цюркска-татарскага паходжання напрыканцы XIV ст. пры падобных абставінах прыйшлі ў Вялікае Княства, і там іх умовы жыцця таксама шмат у чым супадалі[32].

Агульнае паходжанне, моўная роднасць і блізкае суседства татараў і караімаў не маглі не адыграць істотнай ролі ў двухбаковых сувязях паміж абедзвюма групамі. Абедзве супольнасці ў большасці былі паселеныя ў часы вялікага князя Вітаўта (польск. Witold, 1392–1430). Ад тае пары яны жылі ў Вялікім Княстве Літоўскім прыблізна на тых самых землях, часткова ў непасрэдным суседстве[33].

Тым часам як "літоўскія" караімы выводзілі сваё паходжанне па прамой лініі з Крыма і ад крымскіх татараў[34], "літоўскія" татары складаліся з асобных груп, якія мелі карані на велізарных прасторах Залатой Арды, Цэнтральнай Азіі, але таксама і ў Крыме[35]. Этнічная і моўная гамагеннасць караімаў супрацьстаіць этнічнай і моўнай гетэрагеннасці і раздробленасці татараў. Гэтая розніца

---

[32] Паводле агульных меркаванняў, якія можна знайсці ў *Risāle-i Tātār-ı Leh*, дачыненні паміж татарамі і юдэямі не маглі быць найлепшымі: Muchliński (1858), *Risāle*, p. 25–26: "Żyd szachrajstwem i oszustwem potrafi sobie wydłużyć grosz; ale biedny Muślim, rządzący się prawidłami wiary swego proroka, który najsurowiej zabrania oszukiwać ludzi, musi z wielkiemi trudami dobijać się kawałka chleba".

Тамсама, p. 24: "Chociaż po większej części są oni bardzo biedni, jednak na ich pochwałę godzi się powiedzieć, że żyją cnotliwie i nie łączą się wcale z przeklętymi Żydami, których i tu zbyt wielka mnogość".

Аднак што датычыць стаўлення менавіта да юдэйскай секты караімаў, то ў *Risāle* нельга знайсці ніякіх звестак.

[33] Караімы і татары жылі, як згадана раней, на тэрыторыі, якая абмяжоўваецца прыблізна гарадамі Вільня, Мінск і Брэст. Часта яны выконвалі функцыю вайсковага саслоўя і служылі ў гвардыі, падпарадкаванай непасрэдна вялікаму князю. Вялікія князі давалі абедзвюм групам прывілеі, якія пацвярджаліся і ўмацоўваліся кожным кіраўніком Ягелонаўскай дынастыі і ў розных рэдакцыях Літоўскага Статута. (Пра Статут Вялікага Княства Літоўскага гл., напрыклад: Статут (1989).)

[34] Ці ўзыходзілі "літоўскія" караімы па сваім паходжанні да хазараў – спрэчнае пытанне ў навуцы. Пра этна- і лінгвагенез "літоўскіх" караімаў параўн.: Zajączkowski (1935), p. 217 ff.

[35] Сувязі "літоўскіх" татараў з Крымам у першай палове XV ст. былі асабліва шчыльнымі. Заснавальнік дынастыі Гірэяў, Хаджы-Дэўлет Гірэй (пам. 1468), нарадзіўся і вырас у Вялікім Княстве Літоўскім. Ён у 1424 г. прыйшоў да ўлады ў Крыме з дапамогай вялікага князя Вітаўта (1392–1430) і да канца свайго жыцця праводзіў у дачыненні да Вялікага Княства добразычлівую палітыку. Аднак яго сын, Менглі-Гірэй (пам. 1508 г.), парушыў гэтую традыцыю і заключыў саюз з Асманамі.

робіць зразумелым, чаму караімы змаглі захаваць сваю родную цюркскую мову, у той час як татары сваю, якая складалася з розных цюркскіх дыялектаў, хутка страцілі[36].

Другім важным фактарам, які садзейнічаў захаванню цюркскай роднай мовы ў караімаў, была іх рэлігійная традыцыя, у якой цюркская мова адыгрывала важную ролю побач з габрэйскай. Са сваёй былой радзімы, Крыма, караімы ўжо прынеслі ў Вялікае Княства Літоўскае цюркскі пераклад Бібліі. Напісаны габрэйскімі літарамі, ён займаў цэнтральнае становішча ў караімскай літаратуры, якая бурна развівалася ў XVI ст.[37]

"Літоўскія" татары, наадварот, у XVI ст. не маглі абапірацца на ўласную рэлігійную традыцыю, у якой родная цюркская мова іграла б вядучую ролю для развіцця літаратуры. Рэлігійнае пісьменства "літоўскіх" татараў, ужо ў XVI ст. моцна славянізаванае у моўным і культурным аспекце, развівалася ў выніку на беларускай і польскай мовах – на дзвюх найбольш распаўсюджаных мовах Вялікага Княства Літоўскага. Ужыванне арабскага алфавіта для пісьмовай фіксацыі абедзвюх гэтых моў можна зразумець, улічваючы рэлігійную традыцыю ісламу. Арабскі алфавіт разглядаўся як святое пісьмо і быў важным сувязным звяном, якое лучыла "літоўскіх" татараў з ісламам і ісламскім культурным колам[38].

Рэч Паспалітая, утвораная ў 1569 годзе, была вялікай усходнееўрапейскай дзяржавай. Яна ахоплівала Польскае Каралеўства і Вялікае Княства Літоўскае і, такім чынам, працягвалася ад Балтыйскага да Чорнага мора. На паўночным

---

[36] Наконт страты "літоўскімі" татарамі роднай мовы гл.: Szapszał (1932), p. 34 – 49. Важную падставу для гэтага ён бачыў у тым факце, што татарам іх асяроддзе не забараняла шлюбы з хрысціянкамі-славянкамі, якія ў далейшым перадавалі славянскую мову сваім дзецям. Параўн.: Łapicz (1986), p.33 ff.

[37] Гл. Szyszman (1989), p. 81: "Elle possède une certaine littérature laique en prose et en poésie, que l'on retrouve surtout dans les manuscrits. La littérature religieuse est, de loin, la plus riche; précieuses surtout sont les traductions de la Bible. Au début du XVIe siècle, les Karaites préparaient une édition de la Bible dans leur langue maternelle; elle aurait pu être un des premiers livres, ou même le tout premier livre, imprimé en Lituanie, mais les adversaires des Karaites s'y opposèrent. L'affaire arriva devant le roi, et les droits des Karaites furent pleinement confirmés. Cependant, les choses ayant traîné, le projet n'a pas vu le jour. La première Bible karaite imprimée dans son intégralité n'a pas paru que trois siècles plus tard en Crimée".

[38] Трэба заўважыць, што ва ўжыванні арабскага алфавіта "літоўскімі" татарамі і габрэйскага алфавіта караімамі існуе паралель паміж дзвюма групамі. Тым самым абедзве гэтыя групы падкрэслівалі ў кантэксце дыяспары сваю самаідэнтычнасць, сваю прыналежнасць да іншага культурнага кола: да ісламу альбо да юдэйства.

Вартае ўвагі тое, што знаходзяцца паралелі ва ўжыванні пісьма караімамі і татарамі: так, у татарскім ужыванні пісьма часта выкарыстоўваецца літара *'ayn* = ' у якасці *mater lectionis* для галоснага на пачатку слова; караімы пішуць габрэйскую літару *'ayn* = 'на пачатку слова пры галоснай задняга рада ў якасці *mater lectionis*. Для таго каб пазначыць мяккасць зычнага, караімы скарыстоўвалі габрэйскую літару *yod*; татары з гэтай мэтай ужывалі аналагічна графему *yā'* = j.

беразе Чорнага мора Рэч Паспалітая ўступала ў беспасярэднюю канфрантацыю з крымскататарскім ханствам[39] і Асманскай імперыяй.

Асманская імперыя ў сярэдзіне XVI ст. падчас праўлення султана Сулеймана Пышнага знаходзілася на вяршыні сваёй магутнасці і ўспрымалася ў Еўропе як вялікая пагроза для заходніх хрысціянскіх краін.

На фоне абвастрэння канфлікту караімам і татарам выпала роля пасярэднікаў. Вядома, што абедзве меншасці падтрымлівалі сувязі з Крымам і з Асманскай імперыяй і дзейнічалі ў якасці пасярэднікаў і перакладчыкаў у дачыненнях паміж Рэччу Паспалітай і Крымам, а таксама з Асманскай імперыяй[40]. Прадугледжвалася, што яны павінны валодаць цюркскімі мовамі гэтых зямель. Невядомы аўтар *Рысале-і Татар-ы Лех* (1558) нават заўважае, што большасць "літоўскіх" татараў адмовілася ад сваёй цюркскай мовы, але дадае, што яго мусульманска-татарскія суайчыннікі, якія перасяліліся ў Вялікае Княства Літоўскае толькі нядаўна, яшчэ валодалі цюркскай мовай[41].

Караімы падтрымлівалі традыцыйна добрыя зносіны з Крымам, і іх родная мова, якую яны захавалі, блізкая да крымскататарскай. Шмат караімаў супрацоўнічала з *ордэнам Святой Тройцы*[42], які выкупляў палонных хрысціян на землях, дзе панавалі туркі[43].

---

[39] Агляд гісторыі Крыма гл. у слоўнікавым артыкуле KIRIM (B. Spuler) у EI-2.

[40] "Літоўскія" татары часта суправаджалі польскія дыпламатычныя місіі ў Крым і Стамбул у якасці перакладчыкаў, пісараў і пасланнікаў. Іх выкарыстоўвалі для такога кшталту задач асабліва ў XVI ст. і далей у XVII ст. Аднак пазней іх значэнне для дыпламатыі прыкметна страчвалася. У актах Літоўскай метрыкі згадваюцца многія татары і менавіта іх функцыі (гл.: Kryczyński (1938), p. 162 f.). Наконт дыпламатычных зносін Рэчы Паспалітай з Крымам і Асманскай імперыяй гл. таксама: Zajączkowski / Reychman (1955), p. 112–124, дзе пералічваюцца імёны і функцыі польскіх пасланнікаў і іх суправаджэння (параўн.: Zajączkowski (1935), p. 226).

[41] Гл. Muchliński (1858), *Risāle*, p. 12: "Dzisiaj zatem mały poczet Muślimów używa tam mowy Otomańskiej, a to tylko tacy, którzy (jak wyżej rzekliśmy) sami w bliższej nam epoce przenieśli się w te strony".

[42] *Ordo Ss. Trinitatis de redemptione captivorum* быў заснаваны святым Жанам дэ Мата (пам. 1213) і Феліксам Валуа (пам. 1212). Ордэн запрашалі ў крыжовыя паходы, ён прысвяціў сябе вызваленню хрысціянскіх палонных і догляду хворых.

[43] Гл. Szyszman (1989), p. 49: "[...] maintenant des liens étroits avec leurs frères de Crimée, connaissant les langues de ces régions et jouissant de la confiance des deux côtés, aussi bien en Crimée qu'en Pologne et en Lituanie, les Karaites servaient souvent d'intermédiaires pour le rachat des prisonniers. Cette activité est à l'origine de leurs relations étroites avec l'Ordre de la Sainte Trinité pour la Délivrance des Prisonniers qui opérait dans les pays soumis à la domination musulmane". Параўн.: слоўнікавы артыкул KARAITES у EI-2.

7. АДБІТКІ КУЛЬТУРНАГА КАНТЭКСТУ

Спецыфічны кантэкст Рэчы Паспалітай і рэфармацыі, у якім узнік "літоўскі" тэфсір, знайшоў сваё адлюстраванне ў тэксце перакладу. У наступных фрагментах прыводзіцца ў якасці ўзораў і абмяркоўваецца некалькі характэрных месцаў з тэксту тэфсіра **L**.

7.1. Лацінізмы

У адным месцы сцвярджаецца, што Евангелле, якое часта пазначаецца арабізмам *inǧīl*, было дадзена на лацінскай мове:

Q(5:78) {**lu'ina lladīna kafarū min banī isra'īla 'alā lisāni dāwūda wa-'īsā bni maryama ḏālik bi-mā 'aṣaw wa-kānū ya'tadūna**}[1]

preklenstwa stalō tim ktōre newernikami stali z-sinow izra' elśk'ich wedlūg jenzika 'erabśk'egō dawidōwegō ā 'iśī sīne merjeminegō[2] *inǧīl*[3] *jenzik'em lacinśk'im preklenstwa za tō cō zgrešili i stali wipadajōncim[i] z-granic prikezanjá* (93b6).

Літаральны пераклад: Праклянцце стала тым, якія сталі няверні́камі з сыноў ізраільскіх у адпаведнасці з арабскай мовай Давідавай і (мовай) Ісы, сына Мар'ям, – Евангелле на лацінскай мове (дадзена). Праклянцце за тое, што саграшылі і сталі выходзіць за межы загаду.

Два экзегетычныя дадаткі з гэтага месца, "*арабскай мовай Давідавай і (мовай) Ісы, сына Мар'ям, – Евангелле мовай лацінскай (дадзена)*", змяшчаюць два памылковыя каментары арабскага тэксту: мова Давіда была, зразумела, не арабскай, і першапачатковай мовай Евангелля была не лацінская.

Першае сцверджанне стала вынікам таго, што для мусульманскага перакладчыка, безумоўна, мовай Давіда (які лічыцца таксама і ісламскім прарокам) павінна быць свяшчэнная мова ісламу.

Другое сцверджанне, што мовай Ісуса і Евангелля была лацінская, можна зразумець толькі ў кантэксце канфесійных спрэчак другой паловы XVI ст. Каталіцкая царква доўга абараняла лаціну як мову Евангелля, у той час як рэфарматары імкнуліся для біблейскага перакладу зацвердзіць польскую мову.

---

[1] **Q**(5:78): "Праклятыя мовай Дауда і Ісы, сына Мар'ям, тыя з сыноў Ізраіля, што не верылі. Гэта за тое, што яны паўставалі і паводзілі сябе злачынна".

[2] Ар. *'Isā ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі; ар. імя ўласнае *'Isā* = Ісус у польскай мове адносіцца да *a*-скланення; на канцы слова <*sīne*> ненаціскны канчатак роднага склону *–a* быў напісаны рэдукавана праз адну *fatḥa* = *e*.

[3] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

Мы знаходзім некалькі лацінізмаў, рассеяных па ўсім тэксце тэфсіра. Некаторыя з іх праніклі ў польскую мову толькі на працягу XVI ст., часта праз афіцыйную мову. Лацінізмы ўжываліся вельмі часта і склалі неадлучную частку лексікі перакладу.

Прыклады назоўнікаў: *atrament, deklaracyja, desperat, dyrekcyja, dyrektor, fatyga, forteca, fundusz, instygator, kollega, kolor, medyjator, nacyja, natura, okazyja, persona, prowizor, termin, wiktoryja* і г.д.

Прыклады дзеясловаў: *deklarować, dyrygować, fundować, konwersować, naterminować, obserwować, personić, praktykować, pretendować, publikować, ufundować* і г.д.

7.2. *Літоўская метрыка*

Арабскае слова *kitāb* (кніга) часта экзегетычна ідэнтыфікуецца з ар. *al-lawḥ al-maḥfūẓ* – "Патаемная скрыжаль" на небе, на якой, паводле мусульманскіх уяўленняў, напісаны спрадвечны Каран. Яно звычайна перакладаецца словам *метрыка*, якое ўжываецца ў рутэнскай мове канцылярыі Вялікага Княства. Літоўская метрыка з'яўляецца аб'ёмістым зводам тэкстаў, які ахоплівае каля 550 рэгістрацыйных кніг, збораў дакументаў і судовых актаў XV, XVI і XVII стст.[4]

Q(10:61) {[...] **wa-mā yu'ḏubu (!= ya'zubu) 'an rabbi-kum min miṯqāli ḏarratin fī l-arḍi wa-lā fī s-samā'i wa-lā aṣġara min ḏālika wa-lā akbara illā fī kitābin mubīnin**}[5]

bō ne-jest skritō ōd pana bōga twegō ōd wagī k'winti w źemi ānitež w nebōsach āni mnej ōd tegō ānī wencej tilkō wpisanō w metrik'i welk'e lewchi-l-mechfūẓ[6] (165b8).

Літаральны пераклад: Бо не схавана ад Пана Бога твайго ад вагі квінты ні на зямлі, ні на нябёсах; ні менш за гэта, ні больш за гэта, аднак не ўпісана ў Вялікія метрыкі, аль-Ляўх аль-Махфуз.

---

[4] Дакументы Літоўскай метрыкі некалі ўяўлялі сабой адзін з найважнейшых дзяржаўна-архіўных збораў названага перыяду. Аднак сёння яго рэшткі раз'яднаныя па розных архівах і бібліятэках (у Вільні, Варшаве, Санкт-Пецярбургу і Маскве). Часткі збору былі знішчаныя ў выніку шматлікіх войнаў, якія нішчылі землі Польшчы, Літвы і Беларусі на працягу стагоддзяў. З захаваных крыніц выданыя толькі асобныя; 28-я кніга (1522–1552) існуе ў выглядзе CD-ROM-версіі (Мінск, 2000). *Наконт Літоўскай метрыкі гл. Bieder (1991), p. 433; Г. Галенчанка / М. Спірыдонаў: Метрыка Вялікага Княства Літоўскага // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, т. 5, Мінск, 1999, с. 121–128 (са шматлікімі выявамі).

[5] **Q**(10:61): "Ад Пана твайго не схаваецца вага пылінкі ні на зямлі, ні на нябёсах; няма меншага за гэта, няма большага за гэта, чаго не было б у ясным Пісанні".

[6] У выразе *lewchi-l-mechfūẓ* пры назоўніку не быў пастаўлены артыкль, што можна растлумачыць цюркска-славянскім асяроддзем перакладчыка.

* *[Акрамя выданняў у Літве, Польшчы і Украіне, варта адзначыць выдадзеныя ў апошнія гады ў Беларусі кнігі "Літоўскай метрыкі" 28 (Мянжынскі (2000)), 30 (Мянжынскі (2008)), 43 (Мянжынскі (2003)), 44 (Груша (2001)), 46 (Мянжынскі (2006)), 70 (Мяцельскі (2008)), 523 (Груша (2003))].*

Q(11:6) {**wa-mā min dābbatin fī l-arḍi illā ʻalā llāhi rizqu-hā wa-yaʻlamu mustaqarra-hā wa mustawdaʻa-hā kullun fī kitābin mubīnin**}[7]

nimaš žadnegō rōbačka źwerenca bidlenca na źemi tilkō na panū bōgū pōžitkʻī īch i wjádōm jich meškana i rōzmōwī i ōbcōwana jich wšitkō tō w kśenga wipisanō w welkʻi metrikʻi (170b4).

Літаральны пераклад: Няма ніводнага чарвячка, жывёліны, скаціны на зямлі, чый дабрабыт не быў бы на Пану Богу. І Ён ведае іх жыллё, і размовы, і стасункі іх. Усё гэта ў Кнігу ўпісана – у Вялікія метрыкі.

Q(35:11) {[...] **wa-mā yuʻammaru min muʻammarin wa-lā yanquṣu (!= yunqaṣu) min ʻumuri-hī illā fī kitābin** [...]}[8]

i tež ōtō majōncij wek ne-wekūje ānitež ūmneša śe z-weku jegō tilkō tō wšitkō napisalō śe w matrice bōžej lewch-el-mechfūẓ (354b6).

Літаральны пераклад: Таксама той, хто мае век, не вякуе, а таксама не змяншаецца век яго. Толькі ўсё гэта напісана ў Метрыцы Божай, аль-Ляўх аль-Махфуз.

У наступным фрагменце арабскі тэкст змяшчае замест назоўніка *kitāb* (кніга) адпаведнік *imām* (літар. "правадыр; той, хто моліцца наперадзе", аднак тут у значэнні "кніга"). Так, напрыклад, ат-Табары перадае меркаванне артадаксальнай школы, дзе ён тлумачыць: "І сваім выказваннем {**усё Мы падлічылі ў ясным правадыру [imām mubīn]**} Ён (няхай узвысіцца памяць да Яго) гаворыць: І ўсё, што было або ёсць, гэта Мы падлічылі і пазначылі ў "Спрадвечнай кнізе" (ар. *umm al-kitāb* = літар.: маці кнігі), і гэта "*imām mubīn*" (правадыр, які ясна паказвае). І сказана "*mubīn*" (той, хто ясна паказвае), таму што яна ясна паказвае рэчаіснасць усяго, што было змешчана ў ёй"[9].

Q(36:12) {**innā naḥnu nuḥyī l-mawtā wa-naktubu mā qaddamū wa-āṯāra-hum wa-kulla šayʼin aḥṣaynā-hu fī imāmin mubīnin**}[10]

zapewne mī ōžiwīmī martwich bō napisanō są cō w prōdī činili učinkʻi i jūž te minelō i cō terez zwikli činic čiźle čidōbre i wšitkʻe rečī źličōne i spisane ū nas w peršich kśengach matrikach lewch-el-mechfūẓ (359a6).

---

[7] **Q**(11:6): "І няма жывёліны на зямлі, пракармленне якой не было б (клопатам) Алага. Ён ведае яе месцазнаходжанне і яе сховішча. Усё ў ясным Пісанні".

[8] **Q**(35:11): "[...] І не падаўжаецца жыццё доўгажыхара, і не скарачаецца век яго, акрамя як паводле Кнігі [...]"

[9] Гл. Ṭabarī да **Q**(36:12): "wa-qawlu-hū {**wa-kulla šayʼin aḥṣaynā-hu fī imāmin mubīnin**} yaqūlu taʻāla ḏikru-hū: wa-kullu šayʼin kāna aw huwa kāʼinun aḥṣaynā-hu, fa-aṯbatnā-hu fī ummi l-kitābi, wa-huwa l-imāmu l-mubīnu. Wa-qīla {**mubīn**}, li-anna-hū yubayyinu ʻan ḥaqīqati ǧamīʻi mā uṯbita fī-hi".

[10] **Q**(36:12): "Сапраўды, мы ажыўляем мёртвых і пішам, што яны зрабілі раней, і іх наступствы; і ўсё Мы падлічылі ў ясным правадыру (г.зн. у Каране)".

Літаральны пераклад: Пэўна, Мы ажывім мёртвых, бо напісана: ўчынкі, што раней рабілі, і гэта ўжо мінула, і што зараз прызвычаіліся рабіць, ці дрэнныя, ці добрыя, і ўсе рэчы падлічаныя і запісаныя ў Нас у першых кнігах – Метрыках аль-Ляўх аль-Махфуз.

7.3. Абазначэнне хрысціян (ар. naṣārā)

Вельмі рэдка для перадачы ар. *naṣārā* = "хрысціяне" ў тэксце тэфсіра ўжываецца польскае абазначэнне *chreścijanie* = "хрысціяне", як у наступным прыкладзе:
Q(5:18) {**wa-qālati l-yahūdu wa-n-naṣārā naḥnu abnā'u llāhi wa-aḥibbā'u-hū** [...]}[11]

i mōwili židzi i chreścane mī jesteśmi sinōwe bōžžī pōkōlena 'uźejirowegō[12] *i prijacelī bōžže* (85b3).

Літаральны пераклад: І гаварылі габрэі і хрысціяне: «Мы сыны Божыя / пакалення Узайра / і сябры Божыя».

Пераклад ар. *naṣārā* (хрысціяне) польскім словам *pomocnik* (памочнік) у наступным прыкладзе трэба тлумачыць шматзначнасцю арабскага кораня *nṣr*. Форма *naṣārā* з'яўляецца множным лікам ад адзіночнага ліку *naṣrānī* = хрысціянін (назарэй). Корань *nṣr* нясе таксама значэнне "дапамагаць, перамагаць". Таму назоўнік *naṣr* абазначае "дапамога, перамога", а назоўнік *naṣīr* (мн. л. *nuṣarā'*) – "памочнік, прыхільнік, апякун". Перакладчык увёў розныя значэнні кораня *nṣr* у пераклад, у якім ён пазначае хрысціян як "памочнікаў прарока Ісуса":
Q(5:14) {**wa-mina lladīna qālū innā naṣārā aḫaḏnā mīṯāqa-hum** [...]}[13]

i s-tich ktōre mōwili mī pewne pōmōcnici 'īśá prōrōke ōdebrališmi prirečene ōd nich (84b8).

Літаральны пераклад: І з тых, якія казалі: "Мы пэўна памочнікі Ісуса прарока!" – Атрымалі Мы абяцанне ад іх.

Побач з гэтым у тэфсіры скарыстоўваецца арабізм *kāfir* = "нявернік" для перадачы ар. *naṣārā* (хрысціяне). Гэтае абазначэнне хрысціян сустракаецца ў тэксце тэфсіра даволі часта:
Q(5:51) {**yā ayyuhā lladīna āmanū lā tattaḫiḏū l-yahūda wa-n-naṣārā awliyā'a ba'ḍu-hum awliyā'u ba'ḍin** [...]}[14]

---

[11] **Q**(5:18): "І сказалі юдэі і хрысціяне: "Мы сыны Алага і любыя Алагу [...]".

[12] Ар. *'Uzayr* = Эзра.

[13] **Q**(5:14): "І з тых, якія гавораць: " Мы хрысціяне!" – Мы ўзялі запавет [...]".

[14] **Q**(5:51): "О вы, якія ўверавалі! Не бярыце юдэяў і хрысціян сябрамі! Яны сябры адзін аднаму! [...]"

i te ktōre īman[15] *prijenli ne-mejce i ne-trimajce židōw i k'afirōw za prijacōli bō ōni są jedin prijacelmi drūgim* (90a6).

Літаральны пераклад: О тыя, якія веру прынялі! Не трымайце габрэяў і нявернікаў за сяброў, бо яны сябры адзін аднаму.

Аднак звычайна хрысціяне ў тэфсіры пазначаюцца як *grecy* = "грэкі", пад якімі разумеюцца, безумоўна, праваслаўныя, у адрозненне ад католікаў і рэфарматараў:

Q(5:69) {**inna lladīna āmanū wa-lladīna hādū wa-ṣābi'ūna wa-naṣārā man āmana bi-llāhi wa-l-yawmi l-āḫiri [...]**}[16]

pewne ci ktōre īman prijenli i te ktō židzi są i te ktōre klanajōn-še slōncū i greci ktōre ūwerili bōgū jednemū i dnū ōstatnemū (92b4).

Літаральны пераклад: Сапраўды, тыя, якія веру прынялі, і тыя, хто з'яўляецца габрэямі, і тыя, хто кланяецца сонцу, і грэкі, [тыя], якія ўверавалі ў Бога адзінага і дзень апошні.

Q(9:30) {**wa-qālati l-yahūdu 'uzayru bnu llāhi wa-qālati n-naṣārā l-musīḥu (!= l-masīḥu) bnu llāhi [...]**}[17]

i rekli židzī że 'uźejir jest sīn bōžžij i mōwili greci że maśijaš 'ejśá[18] *sīn bōžžij* (147b7).

Літаральны пераклад: І сказалі габрэі, што Узайр (Эзра) – сын Божы, і сказалі грэкі, што Месія Іса – сын Божы.

7.4. Перанос хрысціянскай тэрміналогіі

Мы часта знаходзім хрысціянскія абазначэнні для перадачы ісламскіх рэлігійных паняццяў.

7.4.1. Тэрміны *"kapłan"* і *"ofiarownik"*

Так, напрыклад, арабскае слова *imām* (= імам; той, хто моліцца наперадзе; правадыр; майстар) часта перакладаецца польскім словам *kapłan*:

Q(28:41) {**wa-ǧa'alnā (!= wa-ǧa'alnā-hum) a'immatan yad'ūna ilā n-nāri wa-yawmi (!= wa-yawma) l-qiyāmati lā yunṣarūna**}[19]

---

[15] Ар. *īmān* = вера.

[16] **Q**(5:69): "Сапраўды, тыя, якія ўверавалі, і тыя, якія юдэйнічалі, і сабіі, і хрысціяне, што ўверавалі ў Алага і ў апошні дзень [...]".

[17] **Q**(9:30): "І сказалі юдэі: "Узайр (г.зн. Эзра) – сын Божы!" І сказалі хрысціяне: "Месія – сын Божы!" [...].

[18] Ар. *'Īsā* = Ісус.

[19] **Q**(28:41): "І Мы зрабілі іх імамамі, што заклікаюць да агню, і ў дзень уваскрэсення не будзе ім дапамогі".

i wčiniliśmi jich[20] *staršimi pōwodirami i kaplanami dō newerenstwa ābi-jich wziwali dō pekla dna sōndnegō pōmōci mec ne-bendą* (314b1).

Літаральны пераклад: І Мы зрабілі іх старшымі правадырамі і капланамі да няверніцтва, абы іх заклікалі да пекла. У судны дзень не будуць яны мець дапамогі.

Арабскае слова *a'imma* (мн. л. ад *imām* = правадыр; той, хто моліцца наперадзе) было пераданае трыма польскімі адпаведнікамі, якія павінны адлюстраваць палісемію арабскага паняцця: *starszy*, *powodyr* (prowodyr), *kapłan*. Такі спосаб перакладу часта сустракаецца ў тэфсіры, бо ён дае магчымасць экзегетычна высвятляць з розных бакоў паняцці зыходнай мовы.

У наступным прыкладзе арабізм *imām* сам па сабе пераходзіць у пераклад і дадаткова тлумачыцца польскім адпаведнікам *kapłan*. Гэта таксама тыповы для тэфсіра прыём перакладу:

Q(28:5) **{wa-yurīdu (!= wa-nurīdu)**[21] **an namunna 'alā llaḏī (!= llaḏīna) staḍ'afū (!= stuḍ'ifū) fī l-arḍi wa-naǧ'alu-hum (!= wa-naǧ'ala-hum) a'immatan wa-naǧ'alu-humu (!= wa-naǧ'ala-humu) l-wāriṯīna**}[22]

ā mī chceliśmi żebi źmilōwali-śe na tim na tim ktōre źnewolōne bilī we-jehibce żebiśmi učinili īch īmamami i kaplanami i ūčinemō jich na jegō panstwe dzedzīčami i pōčinim jich krōlami šilnimi (310b1).

Літаральны пераклад: А Мы хацелі б змілавацца над тымі, якія былі зняволенымі ў Егіпце, каб Мы зрабілі іх імамамі і капланамі. І Мы зробім іх спадчыннікамі яго панства і зробім іх каралямі моцнымі".

Разам з выразам *kapłan* мы час ад часу знаходзім таксама абазначэнне *ofiarownik* (слова, вытворнае ад польск. *ofiara* < ням. *Opfer*). Антытрынітарый Сымон Будны аддаваў перавагу гэтаму неалагізму *ofiarownik* перад звычайным каталіцкім выразам *kapłan*[23].

---

[20] У арабскім кансанантным тэксце мае месца пропуск займенніка *-hum* (іх) у пазіцыі прамога дапаўнення. Нягледзячы на гэта, тэкст выяўляе сэнс і з'яўляецца граматычна карэктным: *wa-ǧa'alnā a'immatan yad'ūna ilā n-nāri* = і Мы стварылі імамаў (правадыроў), якія заклікаюць да агню. Аднак у перакладзе прыводзіцца займеннік; такім чынам, пераклад адпавядае кананічнаму тэксту. І значыць, пропуск займенніка ў арабскім тэксце не варта расцэньваць як наўмысны спосаб чытання.

[21] Памылка ў арабскім тэксце не адлюстроўваецца ў перакладзе; гэта перакладаецца 1-й ас. мн. л.!

[22] **Q**(28:5): "Мы жадаем зрабіць міласць тым, якія былі слабымі на зямлі, і зрабіць іх імамамі і зрабіць іх спадчыннікамі".

[23] Наконт неалагізма *ofiarownik* гл.: Frick (1989), p. 103. Ён цытуе з прадмовы Бібліі Буднага: Bud *Bible* (72): "Bo gdy prostak słyszy o którem z onych świętych, iako o Samuelu albo o Zachariaszu, ano go kapłanem zową, tedy domnima, że to tacy kapłani byli, iakowi teraz kapłani Rzymscy, gdyż są

Q(2:267) {**yā ayyuhā lad̲īna āmanū anfiqū min ṭayyibāti mā kasabtum wa-mimmā aḫrag̲nā la-kum mina l-arḍi wa-lā yatammamū (!= tayammamū) l-ḫabīṯa min-hu yanfiqūna (!= tunfiqūna) wa-lastum bi-āḫiḏī-hi illā an tuġmiḍū fī-hi [...]**}[24]

i ci ktōre w jednegō bōga werą ōfarūjce z-čistegō chelalnegō zarōbkū swegō i s-tegō cō wiprōwadziliśmi wam ź źemi dzešencine mace dac a ne-mašajce w tō ōbirkōw s-tegō cō ōfjárūjece ã wi też ōfarōwnici ne-berce tō tilkō jeślibiśce bili barzō glōdni (36b6).

Літаральны пераклад: О тыя, якія ў адзінага Бога верующь! Ахвяруйце з чыстага, дазволенага заробку свайго і з таго, што Мы вывелі вам з зямлі. Дзесяціну маеце даць, і не мяшайце ў гэта шалупінне з таго, што ахвяруеце. І таксама вы, *ахвяроўнікі*, не бярыце гэта, толькі калі б вы былі вельмі галоднымі.

7.4.2. Пераклад арабскага слова *міхраб* (малітоўная ніша)

Адпаведнікам да ар. *miḥrāb* = "ніша ў мячэці, якая паказвае напрамак малітвы; малітоўная ніша" ў тэфсіры звычайна з'яўляецца польскае слова *kaplica*, як у наступным прыкладзе:
Q(3:38) {**[...] wa-kaffala-hā zakarīyā kullamā daḫala ʻalay-hā zakarīyā l-miḥrābi (!= l-miḥrāba) waǧada ʻinda-hā rizqan [...]**}[25]

i dal jej za ōpekūna źek'erjū kōždim razem cō prijdze dō nij źek'erja dō kaplici najdūje pri nej dziwne pōžitk'ī dari bōžże (43b2).

Літаральны пераклад: І дай ёй апекуном Закарыю. Кожны раз, калі прыйдзе да яе Закарыя да капліцы, ён знойдзе пры ёй дзіўныя пажыткі – дары Божыя.

Q(3:39) {**hunālika daʻā zakarīyā rabba-hū qāla rabbi hab lī min ladun-ka durrīyatan ṭayyibatan inna-ka samīʻu d-duʻā'iâ Q**(3:40) **áfa-nādat-hu l-malā'ikatu wa-huwa qā'imun yuṣallī fī l-miḥrābi [...]**}[26]

---

rożnieyszy niż dzień z nocą. [...] Wszakże nie trudno to słowo y prostakom wyrozumieć. Bo ieśli onego słusznie papiernikiem zowiemy kto papir robi, a czemu też onego offiarnikiem nie nazwać, kto offiary sprawował?"

[24] **Q**(2:267): "О тыя, якія ўверавалі! Расходуйце лепшае з таго, што вы набылі, і з таго, што Мы вывелі вам з зямлі, і не майце намеру расходаваць з гэтага дрэннае, чаго б вы не ўзялі акрамя як заплюшчыўшы вочы [...]."

[25] **Q**(3:38): "[...] І даручыў яе Закарыі. Кожны раз, калі ўваходзіў да яе Закарыя ў міхраб, ён знаходзіў у яе харч [...]"

[26] **Q**(3:39): "Там маліўся Закарыя да Госпада свайго. Ён сказаў: "Гасподзь мой, дай мне патомства добрае! Сапраўды, Ты той, хто чуе малітву!" І абвясцілі яму анёлы, калі ён стаяў і маліўся ў міхрабе [...]"

w tejże kaplici mōdlil-śe źek'erja panū bōgū rekl bōże pane nadar mī z-lask'ī twojej pōtōmstwa čiste bō-ś-jest' slišōncij prōźbi i mōdlitwī ā w tim zawolal na negō ānōl ǧebra'il ā ōn stal mōdlonci-śe w kaplici (43b3).

Літаральны пераклад: У той самай капліцы маліўся Закарыя Пану Богу, кажучы: "Пане Божа, падаруй мне з ласкі Тваёй патомства чыстае. Бо Ты слухаеш просьбы і малітвы". Тады ўскрыкнуў да яго анёл Джабраіл, а ён стаяў і маліўся ў капліцы.

Як можна ўбачыць з кантэксту прыведзенага верша Карана, у перакладзе не выкарыстоўваецца выраз "малітоўная ніша ў мячэці", бо дадзенае месца ў тэксце датычыць перадісламскага часу Захарыі. Таму Paret (1966) перакладае гэты выраз праз "Tempel"[27]. А перакладчык тэфсіра выбірае для перакладу хрысціянскі выраз *kaplica*.

Як выключэнне разам са звычайнай перадачай праз польск. *kaplica* сустракаецца таксама пераклад праз польск. *ołtarz* (алтар):
Q(38:22) {**wa-hal atā-ka nabā'a (=! nabā'u) l-ḥaṣmi iḏ tasawwaru (=! tasawwarū) l-miḥrāba**} **Q**(38:23) {**iḏ daḫalū 'alā dāwūda fa-fazi'a min-hum** [...]}[28]

či-ne prišlō tōbe wjedōmōśc dwuch sprečnikōw k'edi wstōmpili na ōltar ā k'edi našli na dawida pretō pōstrašil-śe ōd nich (371a4).

Літаральны пераклад: Ці не прыйшло да цябе паведамленне пра двух ворагаў, калі яны ўвайшлі ў алтар? А калі яны прыйшлі да Давіда, то ён спалохаўся іх.

У наступным прыкладзе польск. *kaplica* з'яўляецца ў экзегетычным парафразе арабскага арыгінальнага тэксту. Пад ар. *maqāmu ibrāhīma* = "месца стаянкі Ібрагіма" падразумяваецца, як гэта вынікае з кантэксту верша, горад Мекка з яго свяцілішчам Каабай. Тэкст тэфсіра перадае гэта польскім *kaplica modlitwy ibrahimowej* = "капліца малітвы Ібрагімавай" – відавочным хрысціянскім выразам:
Q(3:97) {**inna awwala baytin wuḍi'a li-n-nāsi la-llaḏī bi-bakkata mubārakan wa-hudan li-l-'ālamīna**} **Q**(3:98) {**fī-hi āyātun bayyinātun maqāmu ibrahīma wa-man daḫala-hū kāna āminan wa-llāhi (!= wa-li-llāhi) 'alā n-nāsi ḥiǧǧu l-bayti** [...]}[29]

---

[27] Ням. der Tempel = храм (*заўв. перакл.*).

[28] **Q**(38:22): "Ці даходзіла да цябе гісторыя пра ворагаў, калі яны праз сцяну праніклі ў палац?" **Q**(38:23): "Калі яны ўвайшлі да Дауда, ён спалохаўся іх [...]"

[29] **Q**(3:97): "Сапраўды, першы дом, што быў пабудаваны для людзей, – які ў Беццы (г. зн. Меццы), – (пабудаваны) для добраславення і кіравання светамі!" **Q**(3:98): "У ім ясныя знаменні – месца Ібрагіма. І той, хто ўвайшоў у яго, – у небяспецы. А дзеля Алага на людзях хадж да гэтага дому [...]"

pewne perší dōm bōžij pōstanōwonij dla lūdzī ten ktōrij na śrōd świátâ pōświencōnij świentij ōdpūst wšitk'emū świátū w nim są cūda značne kaplica mōdlitwī ibrahīmōwī ktō kōlwek wnidze dō nej wolnij ōd grechū i ōd pekla bō farz[30] *bōžij na lūdzach nawedzic dōm bōžij* (49a1).

Літаральны пераклад: Пэўна, першы дом Божы, пастаўлены для людзей, – той, які пасярэдзіне свету, асвячоны, святы, адпушчэнне (грахоў) усяму свету. У ім ёсць цуды значныя – капліца малітвы Ібрагімавай. Хто-небудзь увойдзе ў яе, вольны ад граху і ад пекла, бо абавязак Божы на людзях – наведаць Дом Божы.

7.4.3. Тэрмін *"rozdział"* (раздзел, глава)

Тэрмін *"rozdział"* (раздзел) увёў у польскую біблейную тэрміналогію Сымон Будны. Словам *"rozdział"* Будны абазначаў раздзел Бібліі; тым самым ён парываў з традыцыйным абазначэннем *"kaput"* альбо *"kapituł"*, якія перайшлі з лацінскай мовы. Езуіт Якуб Вуек запазычыў у свой пераклад Новага Запавету (1594) гэты тэрмін, які надалей стаў трывалым складнікам польскай біблейнай тэрміналогіі[31].

У тэфсіры мы звычайна знаходзім тэрмін *rozdział* як абазначэнне асобных частак Карана, напр. як адпаведнік ар. *āya* = верш Карана альбо ар. *sūra* = сура. Частае ўжыванне слова *rozdział* у гэтай функцыі паказвае, што гэты тэрмін з'яўляецца ўстойлівым элементам тэрміналогіі тэфсіра. Для пацверджання можна было б прывесці толькі некалькі тыповых прыкладаў:

Q(57:9) {**huwa lladī yunazzilu 'alā 'abdi-hī āyātin bayyinātin li-yuḫriğa-kum mina ẓ-ẓulumāti ilā n-nūri wa inna llāha bi-kum la-ra'ūfun raḥīmun**}[32]

ōn jest ktōrij zeslal na chlōpa swegō rōzdzal piśmō rōzmiślajōnce chelal[33] *ōd cheramu*[34] *ābī was wiprōwadzil w ware zdrōwą a z-newernej cemnōti dō światlegō īmanu*[35] *bō pewne pan bōg bōg wam priwodca kū dōbremū milōserdnij* (441b5).

---

[30] Ар. *farḍ* = рэлігійны абавязак.

[31] Наконт тэрміна *rozdział* заўважае Смерэка ў сваёй прадмове да перавыдання перакладу Новага Запавету Вуека (1594): "Od Budnego przejął Wujek wyraz *rozdział* i dzielił tekst polski nie na dawne kaputy czy kapituły, lecz na rozdziały. Od jego czasu znajdzie ten wyraz zastosowanie powszechne w języku polskim oczywiście najpierw we wszystkich wydaniach Pisma św." Параўн. таксама ўказанне ў слоўніку Linde (1854), том V, слоўнікавы артыкул ROZDZIAŁ: "[...] §. Leopolita zowie capita bibliorum kapotami; a Brzescy tłumacze kapitułami; ja je zwałem rozdziałami. Budn.Bibl.praef., / (w druk. Kawieczyńskiego)". (Smereka (1966), p. XL)

[32] **Q**(57:9): "Ён той, хто пасылае рабу Свайму ясныя знаменні, каб вывесці вас з цемры да свету. Сапраўды, Алаг да вас міласцівы і міласэрны".

[33] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[34] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

[35] Ар. *īmān* = вера.

Літаральны пераклад: Ён той, які паслаў слузе Свайму раздзел, – Пісанне, якое аддзяляе дазволенае ад забароненага, каб вас вывесці ў веры здаровай і з няверной цемры да светлай веры, бо, пэўна, Пан Бог, Бог для вас правадыр да дабра, міласэрны.

Q(62:2) {**huwa lladī ba'aṯa fī l-ummīyīna rasūlan min-hum yatlū 'alay-him āyāti-hī wa-yuzakkī-him wa-yu'allimu-humu l-kitāba wa-l-ḥikmata wa-in kānū min qablu la-fī ḍalālin mubīnin**}[36]

ōn jest ktōrij wskrešil na'ūka čitac pisac ne'ūkōm ōtō prōrōk'em jest jedin ź nich čitac bendze wam rōzdzali korãnne i ūčic jich i na'ūči īch kśengi i mōndrōści bō gdi-ž bili pred muchemmedam ū blendach welk'ich (454a2).

Літаральны пераклад: Ён той, які ўваскрэсіў навуку чытаць, пісаць неадукаваным. Вось адзін з іх прарок. Ён будзе чытаць вам раздзелы каранічныя і вучыць іх, і навучыць іх кнізе і мудрасці, бо былі яны да Мухамада ў вялікім змане.

Q(62:5) {**maṯalu lladīna ḥummilū t-tawrāti (!= t-tawrāta) ṯumma lam yaḥmilū-hā ka-maṯali l-ḥimāri yaḥmilu asfāran bi'sa maṯalu l-qawmi lladīna kaḏḏabū bi-āyāti llāhi wa-llāhu lā yahdī l-qawma ẓ-ẓālimīna**}[37]

pōdōbenstwo tich ktōre prilōžōne ōd nas t'ewrīt'em[38] *ã pō tim ne-sprawowali-śe jak-śe pōdjeli tak'e jich jest pōdōbenstwo jakō na'ōjūčiš kśengi ã ne we cō w nich aj jak'e jest zle pōdōbenstwo tich lūdzej ktōre klamstwo meli na rōzdzeli bōžža korãnne bō pan bōg ne-prōwadzī kū dōbremū lūdzej kriwdnik'ōw* (454a5).

Літаральны пераклад: Падабенства тых, на якіх ускладзена ад Нас Тора, а потым не выконвалі як узяліся. Такое іх падабенства – наўючыш кнігі (на асла), а ён не ведае, што ў іх. Такое дрэннае падабенства тых людзей, якія хлусню мелі на раздзелы Божыя каранічныя, бо Пан Бог не вядзе да добрага людзей-крыўднікаў.

У наступным прыкладзе тэрмін *rozdział* з'яўляецца часткай экзегетычнага дадатка, якім тлумачыцца арабская figura etymologica, што ў арыгінальным тэксце Карана служыць для ўзмацнення выказвання. Фраза *wa-nazzalnā-hu tanzīlan* = (літар.) "і Мы паслалі яго пасланнем" у тэфсіры экзегетычна парафразуецца: *zeslališmi-gō ājet'ami rōzdzelami* = "паслалі Мы яго аятамі, раздзеламі":

---

[36] **Q**(62:2): "Ён той, які паслаў пасланніка з прастакоў. Ён чытае для іх знаменні Яго, ачышчае іх і навучае іх пісанню і мудрасці, хаця раней яны былі, вядома, у відавочным змане".

[37] **Q**(62:5): "Падобныя тыя, якім было дадзена несці Тору, а яны яе не нясуць, падобныя яны да асла, які нясе кнігі. Дрэннае падабенства людзей, якія палічылі лжывымі знаменні Алага. А Алаг не вядзе проста людзей несправядлівых".

[38] Ар. *tawrā* = Тора.

Q(17:106) {**wa-qur'ānan faraqnā-hu li-taqra'a-hū 'alā n-nāsi 'alā mukṯin wa-nazzalnā-hu tanzīlan**}[39]

i korān ten rōzlōnčiliśmi-gō na śūreji[40] *na ājet'i*[41] *žebi tōbe latwo bilō čitac na lūdzī pōtrebi i zeslaliśmi-gō ājet'ami rōzdzelami wedlūg žōndana* (229b5).

Літаральны пераклад: і Каран гэты, раздзялілі Мы яго на суры і аяты, каб табе было лёгка чытаць для людскіх патрэб. І паслалі Мы яго аятамі, раздзеламі, па жаданні.

Тут зноў з'яўляецца характэрная фігура гендыядыс з арабізмам *āya* (верш Карана) і адпаведным польскім выразам "*rozdział*" (раздзел, глава).

Звычайна тэрмін "*rozdział*" выкарыстоўваецца для перакладу ар. *sūra* (сура): **Q**(11:13) {**am yaqūlūna ftarā-hu qul fa-'tū bi-'ašrin (!= bi-'ašri) suwarin miṯli-hī muftarayātin wa-d'ū mani staṭa'tum min dūni llāhi in kuntum ṣādiqīna**}[42]

āle mōwą że korān muchemmed fałšiwe źmislil mow prineşce-ž wī z-dzešenc rōzdzalōw pōdōbne temū korānu zmišlōne fałšiwe i wziwajce i mōdlce-še cō šili wam staje ōprōč bōga balwanōw bōgōm swojich jeśli wī jesteśce prawdziwimi (171a8).

Літаральны пераклад: Але яны кажуць, што Каран Мухамад фальшыва выдумаў. Кажы: "Прынясіце ж вы з дзесятак раздзелаў, падобных да гэтага Карана, выдуманага фальшыва, і заклікайце, і маліце што сілы вам хапае, акрамя Бога, ідалаў, багоў сваіх, калі вы справядлівыя".

7.5. Тройца і трынітарыі

У многіх месцах тэфсіра згадваецца Тройца, хаця ні арабскі тэкст, ні адпаведныя каментары не змяшчаюць указанняў на яе. Як, напрыклад, у наступным вершы: **Q**(3:71) {**yā ahla l-kitābi lima talbisūna l-ḥaqqa bi-l-bāṭili wa-taktumūna l-ḥaqqa wa-antum ta'lamūna**}[43]

ī lūdze piśmō majōnce na cō-ž pōkriwace jedinōstwa bōžże prawdziwa wimišlōnim klamstwem trōjci i tajice prawda muchemmed prōrōke ā wī tō sami wedzōnc[44] *dōbra* (46b1).

---

[39] **Q**(17:106): "І Каран Мы раздзялілі, каб ты чытаў яго людзям не спяшаючыся. І Мы паслалі яго пасланнем".

[40] Ар. *sūra* = сура.

[41] Ар. *āya* = аят.

[42] **Q**(11:13): "Ці скажуць яны: "Ён выдумаў яго!", скажы: "Прынясіце дзесяць сур, падобных да яго, выдуманых. Паклічце каго можаце акрамя Алага, калі вы справядлівыя".

[43] **Q**(3:71): "О людзі, што маюць Пісанне! Чаму вы апранаеце ісціну хлуснёю, хаваеце ісціну, калі вы ведаеце".

[44] Выкарыстанне дзеепрыслоўя адначасовасці (wiedząc) замест фінітных формаў дзеяслова належыць разумець як адлюстраванне арабскай канструкцыі. У арабскай мове стаіць адвербіяль-

Літаральны пераклад: О людзі, што маюць Пісанне, чаму вы хаваеце сапраўднае адзінства Божае выдуманаю хлуснёю Тройцы і ўтойваеце праўду Мухамада-прарока? А вы гэта і самі ведаеце добра.

Тут трэба адзначыць, што ўсе мусульманскія каментатары звязваюць гэтае месца з пароцкай місіяй Мухамада, якую нібы аспрэчваюць юдэі і хрысціяне, хаця яна, быццам, пэўна пацвярджаецца іх уласнымі Пісаннямі[45]. А ў "літоўскі" тэфсір прыўносіцца тэматыка Тройцы.

У наступным фрагменце прыцягвае ўвагу тое, што ў кантэксце каранічнага верша канкрэтна называюцца хрысціяне. Пры гэтым арабскі выраз *naṣrānī* (хрысціянін) перакладаецца словам "грэк":

Q(3:68) {**mā kāna ibrāhīmu yahūdīyan wa-lā naṣrānīyan wa-lākin kāna ḥanīfan musliman wa-mā kāna mina l-mušrikīna**}[46]

ne-bil ibrahīm židem ānī grekam tilkō bil ščirim muśulmaninem w jednegō bōga weril ā ne-bil tim cō spōlenčnik'i s-trōjci wimišlają (46a4).

Літаральны пераклад: Не быў Ібрагім габрэем, ні грэкам, толькі быў ён шчырым мусульманінам, у адзінага Бога верыў, і не быў ён тым, што выдумляюць супольнікаў з Тройцы.

Ат-Табары дае да гэтага месца наступнае тлумачэнне: "Гаворыць Алаг (Магутны Ён і Вялікі!): "Не Быў Абрагам юдэем, і не быў ён хрысціянінам, і не быў ён са шматбожнікаў, якія служаць ідалам і кумірам або стварэнню без яго Стваральніка, які з'яўляецца Богам стварэння і іх Стваральнікам[47]". У тэфсіры каранічныя політэісты (ар. *mušrikūn*) ідэнтыфікуюцца з тымі, хто на падставе Тройцы надае Богу супольнікаў.

Закрананне тэмы Тройцы ў перакладзе Карана зразумелае на фоне рэфармацыйнай палемікі вакол догмату Тройцы ў другой палове XVI ст., гэты догмат адначасова з'яўляўся цэнтральным пунктам крытыкі хрысціянства і з боку строга монатэістычнага юдаізму, і з боку ісламу. У адхіленні догмату Тройцы юдаізм, іслам і вучэнне антытрынітарыяў і нонадарантаў супадалі.

ны акалічнасны сказ (*ḥāl*-сказ) (*wa-antum ta'lamūna*), які перакладчык спрабуе перадаць з дапамогай дзеепрыслоўя. Параўн. >>> 2.3.6. Адвербіяльныя абазначэнні акалічнасцей (ар. *ḥāl*).

[45] Гл. у Табары да Q(3:71): "**Wa-l-ḥaqqu llaḏī katamū-hu: mā fī kutubi-him min na'ti muḥammadin ṣallā llāhu 'alay-hi wa-sallam wa-mab'aṯi-hī wa-nubūwati-hī..**" = "І ісціна, якую яны ўтойваюць, – тое, што ў іх кнігах знаходзіцца пра вызначэнне Мухамада (няхай блаславіць яго Алаг!), і яго пасланніцтва, і яго пароцтва".

[46] **Q**(3:68): "Ібрагім не быў ні юдэем, ні хрысціянінам, а быў ён набожным, пакорным Алагу, і не быў ён шматбожнікам".

[47] Гл. Табары да **Q**(3:68): "yaqūlu llāhu 'azza wa-ǧalla: mā kāna ibrāhīmu yahūdīyan wa-lā naṣrānīyan wa-mā kāna mina l-mušrikīna llaḏīna ya'budūna l-aṣnāma wa-l-awṯāna aw maḫlūqan dūna ḫāliqi-hi llaḏī huwa ilāhu l-ḫalqi wa-bāri'u-hum".

Акрамя таго, вартым увагі ў дачыненні да тэмы Тройцы з'яўляецца той факт, што арабскае слова *mušrik* (політэіст) звычайна перадаецца польскімі абазначэннямі *trójczanin*, *trójczak* альбо *trójecznik* (трынітарый). Гэтую паслядоўную ідэнтыфікацыю каранічных політэістаў (ар. *mušrikūn*) з *трынітарыямі* можна разглядаць як водбліск гарачай антытрынітарнай палемікі ў перыяд узнікнення перакладу Карана:

Q(9:33) {**huwa llaḏī arsala rasūla-hū bi-l-hudā wa-dīni l-ḥaqqi li-yuẓhira-hū 'alā d-dīni (6) kulli-hī wa-law kariha l-mušrikūna**}[48]

ten bōg ktōrij pōslal [pōsla] swegō priwodzōnc na dōbrō korãnem i ź warą prawdziwą muśulmanską żebi rōzslawil ją nad inše warī wšitk'e chōcbi ne-chceli tegō newernici trōjčane (148a5).

Літаральны пераклад: Той Бог, які паслаў [пасланца] Свайго, ведучы да дабра Каранам, і з верай праўдзівай мусульманскай, каб ён праславіў яе над усімі іншымі верамі, хаця б і не хацелі гэтага нявернікі-трынітарыі.

У наступным прыкладзе тэкст тэфсіра экзегетычна дапаўняецца словам *trójecznik* у якасці суб'екта да арабскай дзеяслоўнай формы:

Q(59:24) {**huwa llāhu llaḏī lā ilāha illā huwa l-maliku l-qudūsu s-salāmu l-mu'minu l-muhayminu l-'azīzu l-ǧabbāru l-mutakabbiru subḥāna llāhi 'ammā yušrikūna**}[49]

ōn istōtnij bōg ktōre nemaš inšegō bōga tilkō ōn krōl wladca čistij na wek'i zdrōwij i zdrōwe dajōncij prawdziwij wladca i w keranjū wšitkō widzi na stworenjū swojem či-źle či-dōbre pōważnij spōsōbnij mōcar na wšitek świát najwenkšij za wšitkō čistij jest bōg cō trōječnik'i rōwnūją ōd tich kōleg i sinōw (450a2).

Літаральны пераклад: Ён сапраўдны Бог, акрамя якога няма іншага Бога! Толькі Ён – Цар, Валадар чысты, на вякі здаровы і той, хто дае здароўе, праўдзівы Валадар і ў пакаранні. Усё Ён бачыць у стварэнні Сваім: ці злое, ці добрае. Паважны, здольны Уладар, на ўвесь свет найвялікшы; чысты Бог ад усяго таго, што трынітарыі раўняюць, – ад тых сяброў і сыноў.

Ад кораня *šrk*, які нясе асноўнае значэнне "мець долю, быць партнёрам", паводле ўзору IV пароды, згодна з якім будуецца каузатыў, утвараецца форма *ašraka*. Дзеяслоў *ašraka* абазначае "рабіць супольнікам, партнёрам, таварышам; даваць долю; даваць у таварышы" альбо – у рэлігійнай сферы – "прыпісваць Богу супольнікаў; упадаць у грэх політэізму (ар. *širk*)". Літаральна перакладзенае гэтае месца {**subḥāna llāhi 'ammā yušrikūna**} гучыць: "Хвала Алагу! (Ён вышэйшы) за тое, што дадаюць Яму ў супольнікі". Дзеяслоў мае форму 3-й ас. мн. л.

---

[48] **Q**(9:33): "Ён той, які паслаў пасланніка Свайго з настаўленнем і рэлігіяй ісціны, каб паказаць яе вышэйшай за ўсялякую (іншую) рэлігію, (нават) калі б і ўзненавідзелі яго шматбожнікі".

[49] **Q**(59:24): "Ён Алаг, акрамя якога няма боства, Цар, святы, мірны, верны, абаронца, моцны, магутны, вялікі! Хвала Алагу! (Ён вышэйшы) за тое, што дадаюць Яму ў супольнікі".

у імперфекце: *yušrikūna* = "яны дадаюць (у супольнікі)". Суб'ект у арабскім арыгінальным тэксце не называецца. Тэфсір называе ў якасці суб'екта дзеяння "трынітарыяў" (*trójeczniki*), якія ўпадаюць у грэх політэізму, таму што яны раўнуюць "сяброў і сыноў" да Бога. Такім чынам, у тэфсіры тэкст зноў экзегетычна дапаўняецца і парафразуецца ў аспекце крытыкі хрысціянскага догмату Тройцы і яго прыхільнікаў.

У наступным прыкладзе абазначэнне *trójczanie* (трынітарыі) з'яўляецца незалежна ад каранічнага паняцця *mušrik* (політэіст) у экзегетычным парафразе арабскага арыгінальнага тэксту:
Q(42:14) {**šara'a la-kum mina d-dīni mā waṣṣā bi-hī nūḥan wa-llaḏī awḥaynā ilay-ka wa-mā waṣṣaynā bi-hī ibrāhīma wa-mūsâ wa-'īsā an aqīmū d-dīna wa-lā tatafarraqū fī-hi kabura 'alā l-mušrikīna mā tad'ū-hum ilay-hi llāhu yaǧtabī ilay-hi man yašā'u wa-yahdī ilay-hi man yunību**}[50]

pōstanōwil dla was wjárá cō bil źlecil nūchōwi jak'im spōsōbem wziwac bōga i też wjárá nadchneliśmi dō cebe ābiś mōwil {lā ilāha illā llāh} ōtō ż źlecilem abrahamōwī i mōjżešōwī i jezūsōwi wistawajce wjáre mōcne {lā ilāha illā llāh}[51] *ne-'ōdlōnčejce-śe ōd tegō namnej i ne-čince sprečk'ī jakō śe sprečali židzī greci trōjčane [...]*[52] *bōgū rōwnūjōncich cō tim wziwaš ōnich dō tegō īmanu*[53] *pan bōg ūbral dō śebe tegō kogō chcal i prōwadzi-go dō śebe tegō cō śe nawrōcil dō negō* (396b2-5).

Літаральны пераклад: Ён пастанавіў для вас веру, што Ён даручыў Нуху, – якім спосабам заклікаць Бога. І той самай верай Мы натхнілі цябе, каб ты казаў: "Няма Бога, акрамя Алага". Тое ж даручылі Мы Абрагаму, і Майсею, і Ісусу. Выказвайце веру моцна, – Няма Бога, акрамя Алага! – не адлучайцеся ад гэтага ні на крок, і не рабіце спрэчкі, як спрачаліся габрэі, грэкі, трынітарыі. (Таму што цяжка гэта для тых), хто раўняе бажкоў з Богам, што ты заклікаеш іх да гэтай веры. Пан Бог узяў да Сябе таго, каго захацеў, і Ён правядзе яго да Сябе – таго, хто звярнуўся да Яго.

Парафразаванае месца {**lā tatafarraqū fī-hi**} ("*не раздзяляйцеся ў ёй [у рэлігіі] на розныя групы!*") з'яўляецца дзеяслоўнай фразай, ключавую ролю ў якой адыгрывае арабскі дзеяслоў *tafarraqa*. Дзеяслоўная форма *tatafarraqū* з'яўляецца ўсечаным ладам 2-й ас. мн. л., які ў камбінацыі з адмоўем *lā* (не) выконвае функцыю адмоўнага імператыва. Дзеяслоў дапаўняецца прыназоўні-

[50] **Q**(42:14): «Ён узаконіў для вас з рэлігіі тое, што запаведаў у ёй Нуху, і што Мы адкрылі табе, і тое, што Мы запаведалі Ібрагіму, і Мусе, і Ісе: "Выконвайце рэлігію і не раздзяляйцеся ў ёй (на розныя групы)". Цяжкае для шматбожнікаў тое, да чаго ты заклікаеш іх. Алаг выбірае для Сябе таго, каго пажадае, і вядзе да Сябе таго, хто звяртаецца да Яго».

[51] Ар. *lā ilāha illā llāh* = Нямя Бога, акрамя Алага!

[52] У перакладзе адсутнічае адпаведнік да ар. *kabura* (*'alā*) = "быць вялікім/цяжкім (для каго-н.)".

[53] Ар. *īmān* = вера.

кам *fī* (на). Да яго далучаецца анафарычны займеннік *-hi* (<-*hu*), які ўказвае на назоўнік *dīn* (рэлігія) непасрэдна ў папярэднім кантэксце. Корань *frq*, які нясе асноўнае значэнне "раздзяляць, дзяліць, адрозніваць", утварае семантычнае ядро выказніка. Ад кораня *frq* выводзяцца назоўнікі, напрыклад: *farq* = раздзяленне, адрозненне, дыферэнцыяцыя; *firqa* = група, атрад, клас; *farīq* = група, партыя, атрад. Дзеяслоў *tafarraqa* стаіць у пародзе V (tafa''ala), якая ўзмацняе асноўнае значэнне кораня і ставіць дзеяслоў у рэфлексіўныя адносіны да суб'екта. Таму ў перакладзе дзеяслоў *tafarraqa* абазначае "быць альбо станавіцца раздзеленым, расколатым, падзеленым, рассеяным; дзяліцца, падзяляцца; расколвацца на групы і партыі".

Фраза {**lā tafarraqū fī-hi**}, "*не падзяляйцеся ў ёй (у рэлігіі) на розныя групы!*", у тэфсіры суправаджаецца тлумачэннем: "*Не рабіце спрэчкі, як спрачаліся габрэі, грэкі, трынітарыі*". З арабскага арыгінальнага тэксту тлумачэнне ў такой выразнасці і канкрэтнасці не вынікае. Назвы канкрэтных груп, а менавіта *грэкі* (праваслаўныя) і *трынітарыі*, можна высветліць толькі праз культурны кантэкст, у якім узнікаў пераклад. Пры гэтым тэкст тэфсіра, без вялікага перабольшвання, з выразнасцю і канкрэтнасцю сведчыць пра палеміку рэфармацыйнага часу.

8. ВЫСНОВЫ

1) З пэўнасцю можна казаць, што "літоўскі" тэфсір узнік толькі пры канцы XVI ст. Пра гэта сведчаць іншыя тагачасныя крыніцы: *Рысале-і Татар-ы Лех* (1558) і гістарычны твор асманскага гісторыка *Ібрагіма Печэві* (пам. 1642). Аднак і сам пераклад змяшчае доказы: дастаткова згадаць лексічныя сведчанні і водбліскі палемікі вакол Тройцы падчас Рэфармацыі.

2) Мы павінны зыходзіць з таго, што ў Вялікім Княстве Літоўскім Каран перакладаўся беспасярэдне з арабскай мовы на польскую. Вонкавая форма "літоўскага" тэфсіра ўзыходзіць да персідскіх, цэнтральнаазіяцка-цюркскіх і асманскіх узораў. Аднак дапушчэнне пра прамежкавы цюркскі пераклад не абгрунтаванае.

3) Рэфармацыя ў Рэчы Паспалітай праклала шлях для ўжывання польскай мовы як сакральнай мовы ў перакладах Бібліі. Польскія пераклады Бібліі маглі б разглядацца ў якасці ўзору пры падрыхтоўцы "літоўскімі" татарамі перакладу Карана. Пераклад Карана гарманічна ўключаецца ў шэраг біблійных перакладаў рэфармацыйнай эпохі.

4) Тое, што пераклад Карана ствараўся на польскай, а не на беларускай мове, можна тлумачыць выразнай сітуацыяй польска-беларускай дыгласіі ў Вялікім Княстве Літоўскім XVI–XVII стст. (і пазней). Польская мова як мова перакладу Бібліі, вышэйшай адукацыі і культуры характарызавалася высокім сацыяльным прэстыжам. Каран – святое Слова Бога, зразумела, павінны быў перадавацца гэтай мовай з высокім статусам.

5) Уздзеянне "літоўскага" Карана-тэфсіра не выходзіла за межы вузкага кола татарскай супольні; гэта зусім адрозніваецца ад сітуацыі з бібліяндэраўскім выданнем Карана (1543 г.), якое з Базеля дайшло да Вялікага Княства. Татары падрыхтавалі свой пераклад Карана для ўласнага ўжывання і запісалі яго арабскім пісьмом – пісьмом сваёй рэлігійнай традыцыі. Наадварот, пераклад Карана Бібліяндэра ў надрукаваным выглядзе і на лацінскай мове быў лёгка даступны для адукаваных сучаснікаў.

6) "Літоўскі" тэфсір – сапраўдны "*Alfurkan tatarski*" – трэба разглядаць у агульнаеўрапейскім кантэксце як адзін з першых найбольш поўных, дакладных і тэалагічна абгрунтаваных перакладаў Карана на еўрапейскую народную мову Новага часу.

7) Становішча "літоўскага" тэфсіра ў шэрагу еўрапейскіх перакладаў Карана да XVIII ст.:

Паўтоўстым шрыфтам пазначаныя пераклады Карана, якія залежалі ад перакладу Рабертуса Кэтэненсіса (Robertus Cetenensis) 1143 года і бібліяндэраўскага выдання Карана (1543 г.). *Курсівам* адзначаныя пераклады Карана, зробленыя з перакладу Дзюрые (Du Ryer) (1647 г.).

1143	**Рабертус Кэтэненсіс**	**лацінская мова**	**рукапіс**	I)
1210	Марк з Таледа	лацінская	рукапіс	II)
1456	Хуан з Сеговіі	лацінская, кастыльская	рукапіс	III)
	Хуан Андрэс	арагонская	рукапіс	IV)
1518	Эджыдыо да Вітэрба	лацінская	рукапіс	V)
	І.А. фон Відманштэтэр	**лацінская**	**рукапіс**	VI)
1543	**БІБЛІЯНДЭР**	**лацінская**	**друкаваны**	VII)
1547	**Андрэа Арывабене**	**італьянская**	**друкаваны**	VIII)
1600	"Літоўскі" тэфсір	польская	рукапіс	
1616	Саламон Швайгер	**нямецкая**	**друкаваны**	IX)
1640	Пётр Старкоўскі	польская	рукапіс	X)
1640	Казімір Заерскі	польская	рукапіс	XI)
1641	**Арабскі аль-Каран**	**галандская**	**друкаваны**	XII)
1647	*Андрэ Дзюрые*	*французская*	*друкаваны*	XIII)
1649	*Аляксандр Рос*	*англійская*	*друкаваны*	XIV)
1664	**Аль-Каран Магаметаў**	**нямецкая**	**друкаваны**	XV)
1698	Людовіка Марачы	лацінская	друкаваны	XVI)
1734	Джордж Сэйл	англійская	друкаваны	XVII)

Каментары да вышэйзгаданага спіса:

I). 1143 Рабертус Кэтэненсіс (Robertus Cetenensis альбо Robert of Ketton): гл. Bobzin (1993) і (1995).

II). 1210 Марк з Таледа (Marcus de Toledo). Пра Марка з Таледа гл. Bobzin (1995), p. 55–60. Побач з перакладам Роберта з Кетана (Robert of Ketton), які часцей выкарыстоўваўся на працягу ўсяго Сярэднявечча, пераклад Карана, зроблены Маркам, неўзабаве быў забыты. Пра якасць перакладу Марка Бобцын адзначае: "У адрозненне ад Роберта з Кетана (і Германа з Карынтыі) Марк, відавочна, быў добра дасведчаны ў арабскай мове па прычыне свайго паходжання з марыскаў, і таму яму быў не патрэбны ніякі асістэнт-"Мухамад". Яго стыль адпавядае іншым працам перакладчыкаў-марыскаў таго часу: 'fidélité au texte, aux dépens de l'élégance'. Яго пераклад Карана, з якога дагэтуль была апублікаваная толькі прадмова, вылучаецца значнай даслоўнасцю і ў той самай ступені – адноснай дакладнасцю альбо адпаведнасцю тэксту; Марк у значнай меры адмаўляецца ад таго, каб пісаць асабліва прыемным стылем альбо (як Роберт) парафразаваць цяжкі стыль Карана" (Bobzin (1995), p. 58).

III). 1456 Хуан з Сеговіі (Juan de Segovia): Пераклад Хуана з Сеговіі (пам. 1458) на лацінскую і іспанскую (кастыльскую) мовы захаваўся толькі ў рукапісе *HS Toledo 235* 1606 г. Арыгінал 1456 г. страчаны; гл.: Bobzin (1995), p. 64 ff.; Wiegers (1994); Lopez-Morillas (1982). Для свайго перакладу Карана *Хуан* мог залучаць у якасці супрацоўніка знаўцу Карана – Ісу дэ Сеговія (*Yça de Segovia* або *ʻĪsā de Ǧābir*). Гэты пераклад лічыцца найстарэйшым перакладам Карана на еўрапейскую народную мову.

Бобцын заўважае: "Хуанаўскі пераклад Карана, што існуе наогул толькі ў адзіным экзэмпляры, які ён, як паказана вышэй, завяршчаў універсітэту Саламанкі, у далейшым не мае аніякага ўплыву. У той час як у ходзе базельскай спрэчкі 1542/43 г. наконт Карана яго пераклад толькі вельмі цьмяна прыгадвалі, трыумфальнае шэсце перакладу Роберта з Кетана – нягледзячы на ўсе яго хібы – дасягнула свайго першага піка: ён стаў першым друкаваным перакладам Карана на Захадзе" (Bobzin (1995), p. 69).

Лопэз-Марылас выказвае гіпотэзу, што пераклад Хуана альбо Ісы дэ Сеговія мог бы быць узорам для перакладаў Карана, зробленых марыскамі, якія захаваліся з XVI ст. у досыць вялікай колькасці, але выключна ў выглядзе фрагментаў: "Over twenty years have passed since it was first suggested that ʻĪsā ibn Jābir's translation of 1456 might well have inspired all subsequent Morisco translations. But the unavailability of texts, and especially of different texts of the same Qur'ānic passages, has made it impossible to compare the Aljamiado versions among themselves. Whether there existed a 'standard' Ajamiado Qur'ān which later scribes merely reproduced, or whether any capable Morisco could undertake his own translation from the Arabic original, has not been established before now" (Lopez-Morillas (1982), p. 15).

IV). Хуан Андрэс (Juan Andrés): манускрыпт страчаны. Пра Хуана Андрэса Бобцын піша: "Хуан Андрэс быў мусульманскім неафітам, пра жыццё якога вядома зусім мала. Пэўным з'яўляецца толькі год яго звароту – 1487 г.; памёр ён праз некалькі гадоў пасля 1504 г. – года смерці каралевы Ізабэлы Кастыльскай. Па даручэнні дона Марціна Гарсія (каля 1441–1521), інквізітара Арагона, ён зрабіў арагонскі пераклад Карана, які, аднак, не захаваўся" (Bobzin (1995), p. 77 f.).

Гл. Bobzin (1995), p. 356: «Але Відманштэтэр, як гіпатэтычна можна дапусціць, мог бы карыстацца іншым творам Хуана Андрэса, які, на жаль, не захаваўся, аднак у прынцыповым існаванні якога цяжка сумнявацца, – яго перакладам Карана! Бо Хуан, як сцісла згадвалася раней, пераклаў Каран на арагонскую мову, як ён сам заяўляе ў прадмове да *Confusione*: ʻEt io per non stare otioso mi conuersi a translatar di Arabico in lingua Aragone tutta la legge di Mori, cio è l'Alcorano con le sue giose, e li sette libri della Zuna [ap. sunna = традыцыя, хадзіс – заўв. П. Сутэра], pur mosso á questo per mandato del molto Reuerendo Signore Mastro Martino Garcia Uescouo di Barcellona & inquisitore d'Aragon mio Signore'».

V). 1518 Эджыдыо да Вітэрба (Egidio da Viterbo): гл. Bobzin (1995), p. 87: "Але найважнейшым з'яўляецца манускрыпт, які знаходзіцца ў бібліятэцы Амбразіяна ў Мілане [Ms. D 100 inf.]. Гэта копія перакладу Карана, тэкст якога першапачаткова быў размешчаны ў чатыры калонкі; у першай з іх знаходзіўся тэкст, напісаны па-арабску, потым у другой ён быў перапісаны лацінскімі літарамі, далей у трэцяй даецца пераклад і ў чацвёртай – заўвагі. Як вынікае з уступных слоў, пераклад быў зроблены не вельмі вядомым мне Іаганам Габрыэлем Тарэленсісам для Эджыдыо ў 1518 г."

Ніжэй, на с. 88, Бобцын дадае: "Калі гэты пераклад Карана, ад якога, на жаль, захавалася толькі копія (аднак старая, якая паходзіць з канца XVI – пачатку XVII ст.), быў зроблены фактычна ў 1518 г., то ён уяўляе сабою першы поўны пераклад Карана ў Новы час. З ім мог пазнаёміцца Відманштэтэр, які меў, як яшчэ будзе паказана, шчыльныя сувязі з Эджыдыо, а пасля смерці апошняга – доступ да яго бібліятэкі. Але гэта нічога не даказвае".

VI). І. А. фон Відманштэтэр (Johann Albrecht von Widmanstetter). Пра тое, што Іаган Альбрэхт фон Відманштэтэр (1506–1557) на пачатку 40-х гадоў XVI ст. зрабіў пераклад Карана на лацінскую мову, сведчыць шмат сучаснікаў; гл. Bobzin (1995), p. 290: "У гэтай сувязі мае значэнне яго сустрэча з двума рэфарматарамі: Марцінам Фрэхтам з Ульма і Вольфгангам Мускулюсам з Аўгсбурга; ён паказваў ім менавіта падчас наведвання яго дома арабскі Каран і зроблены ім лацінскі пераклад Карана. Страсбургскі рэфарматар Марцін Буцэр таксама бачыў гэты пераклад, чытаў яго і падштурхваў Відманштэтэра да таго, каб яго апублікаваць, чаго апошні так і не зрабіў, як гэта будзе паказана ніжэй. Яшчэ ў тым самым 1541 годзе Відманштэтэр на кароткі час зноў адправіўся ў Італію".

Манускрыпт з перакладам Карана Відманштэтэра сёння страчаны. Аднак вытрымкі з перакладу захаваліся ў першым творы Відманштэтэра, апублікаваным у Нюрнбергу ў 1543 г., – *Mahometis Abdallae filii theologia dialogo explicata* – і асабліва ў другім раздзеле – *Epitome Alcorani*. Як сцвярджае Бобцын (Bobzin (1995), p. 336 ff.), апублікаваныя там тэксты залежаць ад *Corpus Toletanum*, г.зн. ад перакладу Рабертуса Кэтэненсіса (*Robertus Cetenensis*); гл. Bobzin (1995), p. 337: "Калі цяпер параўнаць тэкст надрукаванай у Відманштэтэра *Epitome* з поўным перакладам Роберта з Кетана, як ён быў надрукаваны ў Бібліяндэра, то дастаткова хутка становіцца зразумелым, што *Epitome* ў сваёй тэкставай рэдакцыі досыць выразна залежыць ад кетанаўскага тэксту [...]".

vii.) 1543 БІБЛІЯНДЭР (Bibliander): гл. Bobzin (1995); асабліва с. 159–277.

viii.) 1547 Андрэа Арывабене (Andrea Arrivabene): "L'ALCORANO DI MACOMETTO, NEL QUAL SI CONTIENE LA DOTRINA, LA VITA, I COSTUMI, E LE LEGGI SUE. Tradotto nuovamente dall'Arabo in lingua Italiana, Con Gratie, e Privilegii. MDXLVII"; гл. Bobzin (1995), p. 263: "У прысвячэнні Габрыэлю д'Арамону, першаму французскаму пасланніку пры асманскім двары, выдавец гэтай кнігі Андрэа Арывабене піша: "... dedicar questo libro, che

giá haueuo a commune utilita di molti fatto dal proprio testo Arabo tradurre nella nostra uolgar lingua Italiana ..." З гэтага вынікае, па-першае, што сам Арывабене не з'яўляецца перакладчыкам тэксту, як многія меркавалі, але, па-другое, што тэкст перакладаўся беспасярэдна з арабскай мовы, як сцвярджаецца ўжо ў назве кнігі. Ужо Жазэф Скалігер і Томас Эрпеній заўважылі, што апошняе не адпавядала фактам, а Сільвестр дэ Сасі гэта канчаткова і з пераканаўчай аргументацыяй даказаў. Наадварот, пераклад Карана цалкам залежыць ад надрукаванага ў Бібліяндэра лацінскага тэксту. Паколькі Каран Арывабене як каранічны пераклад не мае самастойнага значэння, то ніколі не зважалі на тое, што гэта першы захаваны пераклад на еўрапейскую народную мову". Пра выданне Карана Арывабене гл. Bobzin (1993) і (1995), p. 263–268.

IX). 1616 Саламон Швайгер (Salomon Schweigger). Пераклад лютэранскага тэолага Саламона Швайгера (1551–1622) цалкам грунтуецца на італьянскім выданні Арывабене; гл. Bobzin (1993) і (1995), p. 268–271.

У Бобцына (1995) на с. 268 прыводзіцца поўны загаловак нямецкага выдання: "ALCORANUS MAHOMETICUS, // Das is: // Der Türcken // Alcoran / Reli= // gion vnd Aberglauben. // Auss welchem zu vernemen / Wann vnd woher // ihr falscher Prophet Machomet seinen vrsprung oder anfang // genommen / mit was gelegenheit derselb diss sein Fabelwerk / lächerliche vnd // närrische Lehr gedichtet vnd erfunden / Auch von seinen Träumen vnd // verführischem Menschentand / Benebens von der Türcken / Gebett / Allmosen / Fasten / sampt andern Gottes= // diensten vnd ceremonien, // Erstlich auss der Arabischen in die Italianische: Jetzt aber // in die Teutsche Sprach gebracht. // Durch ... Herrn Salomon Schweiggern / Pre= / diger zu vnser Frauen Kirchen inn Nürnberg / sampt // dessen beygefügten Vorrede // Inn dreyen unterschiedlichen Theilen / vnd angeheng // tem ordentlichen Register inn den Truck gegeben. // Nürnberg // Inn Simon Halbmayern Buchladen zu finden. / [Schlussblatt:] Gedruckt zu Nürnberg / durch Ludovicum Lochner / im Jar 1616". Пра Сімона Гальбмаера (1587–1632) і Людвіга Лохнера (1592–1632) гл. Bobzin (1995), p. 268, заўв. 624.

X). 1640 Пётр Старкоўскі (Piotr Starkowski). Манускрыпт пасля смерці аўтара быў знішчаны; гл. Nosowski (1974), t. 2, p. 311: "7 (49). STARKOWSKI PIOTR. KORAN. Przekład z arabskiego. Dzieło w rękopisie zaginione wkrótce po śmierci autora. / Piotr Starkowski (żył na przeł. XVI i XVII w.), wywodził się z możnego rodu wielkopolskiego, brat senatora. Z czystego i bezinteresownego zamiłowania do orientalistyki poświęcił się studiom języków arabskiego, tureckiego i perskiego. W roku 1640 studiuje w Konstantynopolu, pielgrzymuje też do Ziemi św. Po powrocie do Polski rozpoczyna prace na dworze Władysława IV jako tłumacz języków wschodnich. Z zachowanych przekładów korespondencji dyplomatycznej widać, iż znał on zarówno języki wschodnie jak i sprawy polityczne Bliskiego Wschodu. Wzmianka o dokonanym przez Starkowskiego przekładzie polskim (z oryginału arabskiego) Koranu znajduje się w herbarzu Niesieckiego. Być może fragmenty

tego przekładu zostały przejęte przez współczesnych Starkowskiemu i późniejszych polemików, występujących przeciw religii mahometańskiej. Przekład Koranu Starkowskiego uległ zniszczeniu, lub, być może, został celowo zniszczony jako przekład utworu uchodzącego w mniemaniu ówczesnych fanatycznych apologetów chrystianizmu za dzieło 'heretyckie'. Zwłaszcza zwalczał je Krzysztof Warszewicki (zob. rkp. BN 'Różne', F. IV, 634, 24 v. 27 v.)".

У Насоўскага (Nosowski (1974), t. 2, p. 323) як варыянт прозвішча аўтара даецца таксама Старкавецкі (*Starkowiecki*). Шымель таксама прыцягвае ўвагу да польскага перакладу Старкоўскага, імя якога, аднак, яна перадае памылкова: "J. von Hammer, 'Die Orientalistik in Polen' schreibt, dass Mitte des 17. Jahrhunderts eine polnische Koranübersetzung von P. Starkiowcki gemacht worden sei" (Schimmel (1990), p. 365).

XI). 1640 Казімір Заерскі (Kazimierz Zajerski). І гэты манускрыпт таксама быў страчаны па смерці ягонага аўтара і, верагодна, знішчаны; гл. Nosowski (1974), t. 2, p. 312: "8 (50). ZAJERSKI KAZIMIERZ. KORAN. Przekład z originału arabskiego. Dzieło w rękopisie zaginione, bądź zniszczone. / Los tego przekładu był podobny do poprzedniego (Starkowskiego). / Niezbyt ścisłe wiadomości o życiu Kazimierza Zajerskiego podane są w akcie jego nobilitacji. (Rkp Bibl. Czartoryskich Nr 1663, str. 612.) / Na uwagę zasługuje także: 'Prognostyk, opisany Achum Turuley, z przednieyszych Machometańskiey sekty mądrego Filozofa urodzeniem Araba, który w r. 1200 prorokując na przyszłe czasy zgubę y zniszczenie Ottomańskiey Porcie ... po polsku wydany 1689.' (Zapewne falsyfikat, pochodzący z przekładów zachodnio-europejskich.) Wyprzedza on chronologią powstanie państwa ottomańsko-tureckiego".

XII). 1641 Арабскі аль-Каран: "De Arabische ALKORAN. Door de Zarazijnsche en de Turcksche Prophete MAHOMETH, In drie onderscheyden deelen begrepen: van der Turcken Religie, Ghelove, Aelmoessen, Vasten, Ghebeden, Bedevaert na Mecha met t'samen sijn Gods-diensten, ende Ceremonien, Wetten ende Rechten. Wt de Arabische spraecke nu nieuwelijcks in Hooghduytsch ghetranslateert met t'samem een aenhanghende Voorreden door Salomon Swigger, Prediker der Kercken tot Noorenbergh. Ende wederom uyt het Hooghduytsch in Nederlantsche spraecke ghestelt. Gedruckt voor Barent Adriaensz. Berentsma, Boeckverkooper tot Hamburgh, 1641" (Bobzin (1995), p. 271).

Гэты ананімна зроблены галандскі пераклад грунтуецца, як вынікае з вышэйпрыведзенага загалоўка, на нямецкім перакладзе Саламона Швайгера; гл. Bobzin (1995), p. 271 f.; гл. таксама Bobzin (1993).

XIII). 1647 Андрэ Дзюрые (André du Ryer): "L'Alcoran de Mahomet. Translaté d'Arabe en Français par le Sieur du Ryer, Sieur de la Garde Malezair", Paris: A. de Sommaville, 1647. Пераклад лічыцца "першым захаваным поўным перакладам Карана беспасярэдне з арабскай мовы арыгінала на еўрапейскую народную мову" (Bobzin (1995), p. 272). Андрэ Дзюрые, магчыма, ведаў сярэдневяковы

пераклад Карана Марка з Таледа і выкарыстоўваў яго ў сваім перакладзе; гл. Bobzin (1995), p. 59: "Бо М. Т. Д'Алверні прыцягвае ўвагу да таго, што Андрэ Дзюрые, верагодна, мог ужываць тэкст Марка пры падрыхтоўцы свайго французскага перакладу Карана, які быў апублікаваны ўпершыню ў 1647 г." (Бобцын спасылаецца на D'Alverny, M.-Th.: Deux traductions latines du Coran au moyen-âge, in: AHDL 22/23 [1947/48] 69–131). (AHDL = Archives d'histoire doctrinale et littéraire du moyen-âge, Paris.)

Наконт біяграфіі Дзюрые Бобцын (Bobzin (1995), p. 59) заўважае: "Дакладныя даты жыцця невядомыя. Дзюрые перыядычна быў французскім консулам у Леванце (Александрыя), а таксама спыняўся ў Канстантынопалі. Пасля свайго вяртання ў Францыю ў 1630 г. ён быў каралеўскім перакладчыкам з арыентальных моў. [...] Разам са сваім перакладам Карана ён апублікаваў таксама турэцкую граматыку (Парыж, 1630 і 1633 гг.) і пераклад з "Гюлістана" Саадзі (Парыж, 1634).

Пераклад Карана Дзюрые перавыдаваўся ў 1649 і 1672 гг. у Парыжы і ў 1683 г. у Гаазе. Акрамя таго, пераклад Андрэ Дзюрые паслужыў узорам для пералажэнняў на англійскую (1648 г.) і галандскую (1658 г.) мовы. У далейшым з галандскага перакладу быў зроблены нямецкі (1688).

У XVIII ст. пераклад Дзюрые склаў узор для першых рускіх перакладаў Карана.

Пётр Постнікаў. Гэты першы рускі пераклад Карана, надрукаваны ў 1716 г. у Санкт-Пецярбургу, быў зроблены на загад Пятра Вялікага. Постнікаў пераněс на рускую мову французскі пераклад Андрэ Дзюрые; гл. Крачковский (1990), с. 15; Крачковский (1955b); Röhling (1977), p. 208: "Зразумела, тут размова ідзе пра не зусім дакладны пераклад з таксама не зусім дакладнага (...), у сваю чаргу, узору француза Дзюрые, які, з'явіўшыся ўпершыню ў 1647 г., меў шмат выданняў і перакладаў на англійскую, галандскую, а з яе на нямецкую мову. [...] Пераклад Постнікава 1716 г. абапіраўся на парыжскае выданне 1672 г. і меў часавы інтэрвал у сорак чатыры гады".

М.І. Вяроўкін. Каранічны пераклад Вяроўкіна быў зроблены у 1790 г. у Санкт-Пецярбургу таксама з французскага ўзору Андрэ Дзюрые; гл. Крачковский (1990), с. 15; Крачковский (1955b); Röhling (1977), p. 209: "Пераклад у выданні 1790 г. здзейсніў перакладчык з некалькіх замежных моў, пісьменнік, марак паводле адукацыі (мічман), а пазней член Акадэміі М.І. Вяроўкін (1732–1795), камедыі якога яшчэ і сёння згадваюцца ў гісторыі літаратуры. Яго пераклад паслужыў Пушкіну крыніцай па магаметанстве. Таму яго значэнне для рускай духоўнай гісторыі большае, чым для рускай арабістыкі".

А.В. Калмакоў. Пераклад Калмакова 1792 г. абапіраецца на англійскі пераклад 1649 г., зроблены А. Росам з французскага ўзору Дзюрые. Але гэтае надрукаванае ў Санкт-Пецярбургу выданне Калмакоў дапоўніў перакладам на рускую мову каментару да Карана, які быў напісаны англійскім арыенталістам і перакладчыкам Карана Джорджам Сэйлам (1687–1736; гл. ніжэй);

гл. Röhling (1977), p. 209: "Памерлы ў 1804 г. пісьменнік і перакладчык Адміралцейскай калегіі, які перакладаў Штэрна і Эдысона, А. В. Калмакоў перакладаў Каран і Сэйла". (Параўн. таксама: Крачковский (1955b).)

XIV). 1649 Аляксандр Рос (Alexander Ross). Гэты надрукаваны ў 1649 г. у Лондане англійскі пераклад шатландца Аляксандра Роса цалкам абапіраецца на французскае выданне Андрэ Дзюрые.

XV). 1664 аль-Каран Магаметаў. Гэта пашыранае перавыданне нямецкага перакладу Саламона Швайгера (1616 г.), якое ананімна з'явілася ў Нюрнбергу; гл. Bobzin (1995), p. 272–274.

XVI). 1698 Людавіка Марачы (Ludovico Marracci): гл. Bobzin (1995), p. 274: "Alcorani textus universus. Ex correctioribus Arabum exemplaribus summa fide, atque pulcherrimis characteribus descriptus, Eademque fide, ac pari diligentia ex Arabico idiomate in Latinum translatus ... Auctore Ludovico Marraccio, Patavii 1698".

Параўн.: Schimmel (1990), p. 365: "Хоць папа Аляксандр II (1655–1667) забараніў публікаваць альбо перакладаць Каран, аднак незадоўга да змены стагоддзяў з'явіліся два важныя пераклады; адзін з іх – лацінскі пераклад езуіта Людавіка Марачы 1698 г., які, зразумела, у традыцыйным стылі быў забяспечаны refutatio і падрабязнай прадмовай".

XVII). 1734 Джордж Сэйл. The Koran, commonly called the Alcoran of Mohammad. Джордж Сэйл (George Sale, 1687–1736).

الحجاب حرف والحرف حجاب[1]

ياڭ زَمَ بَضْ چلَووَقَ نِچْ نَظناچ

طاڭ پسمَو بَضْ چلَووَقَ نِچْ نَظناچ[2]

9. УЖЫВАННЕ ПІСЬМА

Пра выкарыстанне арабскага пісьма для беларускай і польскай моў існуе дэталёвае даследаванне Антановіча (1968). Ён апісвае ўжыванне пісьма на падставе сукупнасці 24 манускрыптаў XVII–XIX стст., што ахопліваюць усе тыпы рукапісаў, якія вылучаюцца ў пісьменстве татараў Вялікага Княства Літоўскага. Паколькі ён вельмі грунтоўна вывучае графічны феномен, няма неабходнасці зноў выконваць графемны аналіз на базе манускрыпта тэфсіра, які даследуецца ў дадзенай працы. Рукапіс тэфсіра, які тут абмяркоўваецца, цалкам уключаецца ў апісаную Антановічам арфаграфічную сістэму.

Пры пытанні аб навуковай транслітарацыі арабскага пісьма ў яго ўжыванні для беларускай і польскай моў таксама можна звярнуцца да працы Антановіча. Выкарыстаная мною лацінская транслітарацыя абапіраецца ў прынцыпе на кірылаўскую транслітарацыйную сістэму, развітую Антановічам[3].

Пры перадачы арабскіх літар я імкнуўся да ўзаемаадназначнасці. Транслітарацыя, альбо дакладная замена літар ці знакаў, з'яўляецца абарачальнай, з транслітарацыі можа адназначна раскрывацца карціна арабскага пісьма. Далей пры выбары розных транслітарацыйных знакаў браліся па магчымасці тыя,

---

[1] Ар. *al-ḥiǧāb ḥarf wa-l-ḥarf ḥiǧāb* = "Пакрывала – гэта літара, а літара – пакрывала". Выказванне арабскага містыка Мухамада ібн 'Абд аль-Джабара аль-Ніфары (пам. каля 975 г.). (Гл. у EI-2 слоўнікавы арткул NIFFĀRÎ.)

[2] Польск. *jak ziemia bez człowieka nic nie znaczy tak pismo bez człowieka nic nie znaczy* = "як зямля без чалавека нічога не значыць, так і пісьмо без чалавека нічога не значыць". Выслоўе з "літоўскага" тэфсіра D 723 Інстытута усходазнаўства Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу. (Яно знаходзіцца на апошняй старонцы рукапісу, незалежна ад астатняга тэксту.)

[3] Прапановы для навуковай транслітарацыі на базе лацінскай графікі знаходзяцца ў Meredith-Owens / Nadson (1970) і Łapicz (1986), якія таксама спасылаюцца на працу Антановіча (Антонович (1968)). Гэтыя прапановы таксама былі ўзятыя мною пад увагу.

Ян Станкевіч (1934 і 1952) выкарыстоўваў лацінскую транслітарацыю пісьма "літоўскіх" татараў, якая, аднак, часта суб'ектыўная і навукова не заўсёды бясспрэчная.

якія з'яўляюцца звычайнымі ў нямецкай славістыцы. Прынцыпова звярталася ўвага на тое, каб пазбавіць знакі ад залішняй дыякрытыкі.

У наступным раздзеле больш падрабязна асвятляюцца некаторыя аспекты развіцця і самой сістэмы арабскага пісьма, якім у іншых даследчыкаў не надавалася альбо зусім мала надавалася ўвагі.

9.1. Паходжанне і традыцыя арабскага пісьма

Арабскі алфавіт развіўся з арамейскага пісьма, галіны паўночнасеміцкага пісьма. Арабы-набацеі Пальміры (Сірыя) і Петры (Іарданія) пачалі ўжываць з трэцяга стагоддзя арамейска-набацейскае курсіўнае пісьмо таксама і для пісьмовай фіксацыі арабскай мовы. У далейшым паміж чацвёртым і шостым стагоддзямі з практыкі пісьмаўжывання развіваўся трывалы набор асноўных графічных формаў арабскага пісьма. На працягу гэтага развіцця некаторыя графемы і алаграфы супадалі ў сваіх формах. Ужо ў ранні перыяд ісламу ў гэтым алфавіце, які праз гандлёвыя шляхі з Сірыі дасягнуў Хіджаза і Меккі, было пісьмова зафіксавана ісламскае Адкрыццё – Каран. Каб адназначна адлюстраваць на пісьме 28 кансанантных фанем арабскай мовы, мнагазначныя графемныя альбо алаграфныя формы ў ходзе далейшага развіцця дыферэнцыяваліся з дапамогай дыякрытычных кропак[4].

Арабскае пісьмо кансанантнае. Гэта значыць, што на пісьме праз графемы перадаюцца толькі зычныя. Галосныя першапачаткова зусім не адлюстроўваліся на пісьме. Пазней у якасці дапаможнага сродку сталі выкарыстоўвацца тры зычныя графемы, каб адзначыць прынамсі арабскія доўгія галосныя /ā/, /ī/ і /ū/: у якасці *mater lectionis* перш за ўсё функцыянавалі *yā'* = *ī* і *wāw* = *ū* (як у арамейскай мове), а таксама некалькі пазней далучаная *alif* = *ā*. А кароткія галосныя /a/, /i/ і /u/ дагэтуль не пішуцца. Для іх існуюць толькі арфаграфічныя дапаможныя знакі *fatḥa* = *a*, *kasra* = *i* і *ḍamma* = *u*; гэта дыякрытычныя знакі над або пад зычнымі графемамі. Гэтыя знакі, аднак, у звычайным ужыванні пісьма не выкарыстоўваюцца альбо выкарыстоўваюцца не больш як сродак вызначэння пэўнага спосабу чытання шматзначных напісанняў[5]. Гэты арфаграфічны прынцып прапускання кароткіх галосных на пісьме меў важныя наступствы для пісьмаўжывання ў дзвюх іншых важных мовах ісламу – персідскай і турэцкай – і ў далейшым, як яшчэ будзе паказана, у беларускай і польскай.

Калі арабскае пісьмо з экспансіяй ісламу распаўсюдзілася на самыя розныя мовы, у сферы зычных вышэйзгаданы прынцып дыферэнцыяцыі кансанант-

---

[4] Наконт развіцця арабскага пісьма гл.: Majidi (1984) і (1986). Пра развіццё каранічнага тэксту гл., напр., Nöldeke (1961).

[5] Аднак у гэтых адносінах складае выключэнне тэкст Карана, які заўсёды пішацца рупліва з асноўнымі формамі графем (ар. *rasm*), дыякрытычнымі кропкамі для дыферэнцыяцыі кансанантных графем і поўнай вакалізацыяй праз дыякрытычныя знакі для галосных. Параўн. Nöldeke (1961).

ных графем праз дыякрытычныя кропкі пазней часта выкарыстоўваўся для стварэння новых графем і прыстасавання алфавіта да кансанантнага складу фанем гэтых моў[6].

З прыняццем ісламу персамі і, крыху пазней, туркамі ў іх мовы перайшло таксама і арабскае пісьмо як святое пісьмо Карана. Як вынік ісламізацыі адбываецца ўпартае пранікненне ў персідскую і турэцкую мовы шматлікіх арабскіх элементаў. Арабскія словы і звароты, якія сюды праніклі, пераймаліся ў сваёй арыгінальнай арфаграфіі, так што нават графемы, якія абазначалі арабскія фанемы і былі чужыя для персідскай і турэцкай моў, увайшлі ў пісьмовы ўжытак гэтых моў. У сваім персідскім або турэцкім вымаўленні гэтыя графемы супадалі з блізкімі персідскімі ці турэцкімі фанемамі. Таму для напісання некаторых персідскіх і турэцкіх фанем мелася ў распараджэнні дзве ці больш арабскіх графем[7]. З іншага боку, персы дапоўнілі арабскі алфавіт яшчэ чатырма графемамі, каб запісваць тыя персідскія фанемы, якія невядомыя арабскай мове: *pe* = *p*, *če* = *č*, *že* = *ž* і *gāf* = *g*. Пры гэтым новыя літары ствараліся з наяўных арабскіх літар з дапамогаю дыякрытычных кропак. Туркі, са свайго боку, пераймалі ўсе персідскія новаўвядзенні ў алфавіт і часткова развівалі іх далей. Так, напрыклад, персідская графема *gāf* = *g* у турэцкай мове выкарыстоўвалася для перадачы насавога /ñ/. Таму ў туркаў гэтая графема носіць назву *ṣagır-ı-nūn* = "малая *nūn*" (г.зн. "малая *n*")[8].

Фармаванне парных графем у персідскай і ў турэцкай мовах большай часткай узыходзіць да арабскай фаналагічнай апазіцыі *эмфатычных* і *неэмфатычных* фанем[9], што адсутнічаюць у персідскай і турэцкай гукавой сістэме, як тыпова семіцкія.

Ужыванне розных парных графем у персідскай мове не мела сістэмнай арфаграфіі. Пры пісьмовай фіксацыі персідскіх слоў для напісання адной фанемы маглі выкарыстоўваць ці адну, ці іншую графему, так што спосабы напісання слоў маглі свабодна вар'іравацца. Часткова ў практыцы выразныя, дакладныя спосабы напісання бралі верх над іншымі. Напрыклад, прынцып сучаснай арфаграфіі выключае ўжыванне арабскіх эмфатычных графем пры напісанні чыста персідскіх слоў. Зразумела, існуе шмат выключэнняў з гэтага правіла з аглядкай на моцную пісьмовую традыцыю.

Сістэмнае ўжыванне парных графем у турэцкай мове, насупраць, мае традыцыю. Парныя графемы ўжываліся ўжо ў старажытнацюркскім рунічным пісьме

---

[6] Гл., напр., Majidi (1984).

[7] Парныя графемы ў персідскай і турэцкай мовах – гэта, напр.: *sîn* = *s*, *ṣād* = *ṣ*, *ṭā'* = *ṯ* для /s/; *tā'* = *t*, *ṭā'* = *ṭ* для /t/; *dāl* = *ḏ*, *zāy* = *z*, *ḍād* = *ż*, *ẓā'* = *ẓ* для /z/.

[8] Ар. графема *nūn* = *n* служыць у арабаў, персаў і туркаў для перадачы /n/.

[9] Эмфатычныя графемы – гэта *ṣād* = *ṣ*, *ṭā'* = *ṭ*, *ẓā'*, = *ẓ*, *ḍād* = *ḍ*. Гэтыя эмфатычныя графемы стаяць у апазіцыі да адпаведных неэмфатычных: *sîn* = *s*, *tā'* = *t*, *zāy* = *z*, *dāl* = *d*. (Лёгкай эмфатычнай афарбоўкай адзначаныя таксама *ḥā'* = *ḥ*, *ḫā'* = *ḫ*, *qāf* = *q*.) Наконт эмфатычных фанем арабскай мовы гл. Fischer (1972), § 29, § 31. Параўн. таксама ў Дэнца, які гаворыць пра "велярызаваныя" фанемы замест эмфатычных (Denz (1984), GAP I, p. 60).

для размежавання ў напісанні палатальных і велярных алафонаў[10]. Паводле старатурэцкай традыцыі пры перадачы арабска-персідскага алфавіта парныя графемы арабскага пісьма ўпляталіся ў арфаграфічную сістэму ў форме дадатку. Выбіральная пастаноўка той ці іншай графемы з цягам часу пачала падлягаць функцыянальным крытэрыям. Парныя графемы дадаткова былі падпарадкаваныя двум радам галосных: пярэднім і заднім. Арабскія эмфатычныя графемы як "цвёрдыя" абазначалі ў турэцкай мове велярныя пазіцыйныя варыянты зычных, як яны сустракаюцца ў атачэнні задніх галосных */a, ı, o, u/*. І наадварот, арабскія неэмфатычныя графемы як "мяккія" графемы абазначаюць у турэцкім ужыванні адпаведныя палатальныя алафоны, калі яны трапляюцца ў атачэнні пярэдніх галосных */e, i, ö, ü/*. Але строгі падзел у спосабе напісання велярных і палатальных алафонаў выконваўся ў асманскай мове толькі ў дачыненні фанемы */k/*: *kāf = k'* ужываецца для мяккага */k'/* у атачэнні пярэдніх галосных і *qāf = k* для цвёрдага */k/* у атачэнні задніх галосных. Аднак пры іншых фанемах, для якіх знаходзіліся ў распараджэнні парныя графемы, размежавальны, выбіральны спосаб напісання скарыстоўваўся непаслядоўна[11].

9.2. Алфавіт "літоўскіх" татараў

9.2.1. Напісанне зычных

Адаптацыю арабскага пісьма да беларускай і польскай моў можна зразумець на аснове асманскатурэцкай пісьмовай традыцыі. Адрозніванне "цвёрдых" і "мяккіх" графем у турэцкай мове выкарыстоўвалася ў беларускай і польскай мовах таксама для паказу фаналагічнай апазіцыі *цвёрды* : *мяккі*[12].

Для напісання спецыфічных беларускіх і польскіх зычных ужываўся стары арабскі метад стварэння праз дыякрытычныя кропкі (табл. 9.1). З арабскай эмфатычнай *ṣād = ṣ* праз пастаноўку трох дыякрытычных кропак знізу "лі-

---

[10] Пра старатурэцкае рунічнае пісьмо гл. Gabain (1959).

[11] Наступныя ар.-тур. графемы ў асманскай мове лічыліся цвёрдымі (*ṣakîl*): *ḥā' = ḥ, ḫā' = ḫ, ṣād = s, ḍād = d, ẓā' = z, ṭā' = t, 'ayn = ', ġayn = g, ğ, qāf = q*. Гэтыя цвёрдыя графемы супрацьстаялі мяккім (*ḥafil*) літарам: *tā' = t, ṯā' = s, ǧīm = c, ḏāl = z, zāy = z, že = j, sīn = s, šīn = ṣ, kāf = k* і *gāf = g* альбо *saġır-ı-nūn = c*.

Нарэшце, існаваў шэраг графем, якія не лічыліся ані цвёрдымі, ані мяккімі: *bā' = b, pe = p, ǧīm = ç, rā' = r, dāl = d, fā' = f, lām = l, mīm = m, nūn = n, wāw = v, hā' = h, yā' = y*. (Назвы адпавядаюць ар. абазначэнням літар, і гукавое значэнне вызначаецца адпаведнымі літарамі сучаснага турэцкага алфавіта.) Гэтае размеркаванне знаходзіцца ў Цімурташа (Timurtaş (1980), p. 25). Ад больш падрабязнага абмеркавання гэтага феномена пісьмовай тэхнікі ў асманскай мове тут можна адмовіцца. Інфармацыя пра гэта знаходзіцца ў кожнай асманскатурэцкай граматыцы, напр. Deny (1921), Timurtaş (1980).

[12] Lehfeldt (1969) даследаваў паўднёваславянскія тэксты ў арабскай графіцы з Босніі. Для гэтых тэкстаў немагчыма ўстанавіць уплыў асманскай пісьмовай традыцыі ў дачыненні да выкарыстання парных графем, гэта цалкам супярэчыць літаратуры "літоўскіх" татараў! Параўн. Таксама Lehfeldt (1989).

Табліца 9.1

Абазначэнне зычных

Назва	Арабская графема	Транслітарацыя	Польская фанема		Беларуская фанема	
			цвёрдая	мяккая	цвёрдая	мяккая
alif	ا	**'**	-	-	-	-
bā'	ب	**b**	b	b'	b	b'
pe	پ	**p**	p	p'	p	p'
tā'	ت	**t'**	t	(t')	t	(t')
ṯā'	ث	**ṡ**	-	s'	-	s'
ǧīm	ج	**ǧ**	dž	-	dž	-
čīm	چ	**č**	č	-	č	-
ḥā'	ح	**ch**	ch	(ch')	ch	(ch')
ḫā'	خ	**ch̨**	ch	(ch')	ch	(ch')
dāl	د	**d**	d	-	d	-
ḏāl	ذ	**ż**	-	z'	-	z'
dze	ڈ	**dz**	dz	dz' < d'	(dz)	dz' < d'
rā'	ر	**r**	r, rz	-	r	-
zay	ز	**ź**	-	z'	-	z'
že	ژ	**ž**	ž	-	ž	-
sīn	س	**ś**	-	s'	-	s'
ṣīn	ښ	**ṣ**	-	s'	-	s'
šīn	ش	**š**	š	-	š	-
ṣād	ص	**s**	s	-	s	-
ḍād	ض	**z**	z	-	z	-
ce	ڜ	**c**	c	c' < t'	c	c' < t'
ṭā'	ط	**t**	t	-	t	-
ẓā'	ظ	**ẓ**	z	-	z	-
'ayn	ع	**'**	-	-	-	-
ġayn	غ	**g**	g	g'	-	-
fā'	ف	**f**	f	f'	(f)	(f')
qāf	ق	**k**	k	-	k	-
kāf	ك	**k'**	-	k'	-	k'
gāf	ڭ	**ñ**	-	n'	-	n'
lām	ل	**l**	ł, l	l'	l	l'
mīm	م	**m**	m	m'	m	m'
nūn	ن	**n**	n	n'	n	n'
hā'	ه	**h**	h	(h')	h	(h')
wāw	و	**w**	w	w'	v, ŭ	v'
yā'	ي	**j**	-	j	-	j

тоўскімі" татарамі стваралася графема *ce* = *c* (для /*c*/ і /*c′*/). Аналагічна ад арабскай графемы *dāl* = *d* з дыферэнцыяцыяй праз тры дыякрытычныя кропкі знізу ўзнікла графема *dze* = *dz* (для /*dz*/ і /*dz′*/)[13]. У прынцыпе гэта ўсе інавацыі, якія "літоўскія" татары ўнеслі ў сістэму арабскага пісьма. Аднак гэтыя спецыфічныя літары знаходзяцца цалкам у арабскай, персідскай і турэцкай пісьмовай традыцыі (табл. 9.1).

9.2.2. Тлумачэнне да зычных графем

Кожнай арабскай графеме належаць тры пазіцыйныя варыянты (алаграфы): для знаходжання знака ў пачатку, у сярэдзіне і на канцы слова. Гэтая асаблівасць пісьмовай тэхнікі арабскага алфавіта без змены датычыць таксама і пісьма татараў Вялікага Княства Літоўскага.

У іх пісьменстве звычайна не сустракаюцца спосабы напісання, пры якіх, напрыклад, некаторыя марфемы стаяць асобна ад саміх слоў, як гэта здараецца ў персідскай, і галоўным чынам, у турэцкай мове. Праўда, у тэксце тэфсіра лінія пісьма часта перарываецца ў сярэдзіне слова і зноў пачынаецца пад радком арабскага тэксту, каб гарантаваць па магчымасці паралельнасць паміж арабскім тэкстам Карана і падрадковым перакладам.

Інавацыі ў складзе алфавітных знакаў былі, як згадвалася раней, зведзеныя да мінімуму; яны датычаць увядзення графемы *ce* = *c* для /*c*, *c′*/ і *dze* = *dz* для /*dz*, *dz′*/ пры перадачы гэтых спецыфічных польскіх і беларускіх фанем.

Персідскія графемы *pe* = *p*, *čīm* = *č*, *že* = *ž* і *gāf* = *g*, г.зн. турэцкая *ṣagır-ı-nūn* = *ñ*, пераймаліся без змен з персідска-турэцкага алфавіта.

Амаль не выкарыстоўваліся альбо выкарыстоўваліся зусім мала ў пісьмовай практыцы графемы *d̲āl* = *ż*, *ḥā'* = *ch* і *ṣīn* = *ṣ*[14].

Персідская графема *gāf* = *g* адпавядае турэцкай *ṣagır-ı-nūn* = *ñ* і ўжываецца ў польскіх тэкстах пераважна для пазначэння *o*-насавога ў канцы слова. У манускрыптах "літоўскіх" татараў гэтая графема часам абазначае насавы /*ñ*/ у сярэдзіне слова: так, напрыклад, пры раз'яднаным напісанні польскіх насавых галосных /*ą*/ > /*oñ*/ і /*ę*/ > /*eñ*/.

---

[13] Гл. Мухлинский (1857), с. 63: "Звук *с* (ц) и *ć* (ц мягкое) по большей части выражается буквою *сад* с тремя точками внизу, а *дз* (*дз*) буквой *даль* с тремя точками вверху". Графема *dāl* з трыма дыякрытычнымі кропкамі зверху для напісання фанем /*dz*, *dz′*/ згадваецца толькі ў Мухлінскага, у той час як такое пісьмаўжыванне нідзе больш не апісваецца. Антановіч (Антонович (1968), с. 257) звяртае ўвагу на ўжыванне *ṣād* з трыма дыякрытычнымі кропкамі зверху для напісання фанемы /*c*/ і /*c′*/ у манускрыпце пачатку XVII ст. У тым манускрыпце цвёрдая фанема /*d*/ і мяккая фанема /*dz′*/ пішуцца праз графему *dāl* = *d* без графічнай дыферэнцыяцыі; гл. Антонович (1968), с. 109–120, 209.

[14] Графема *ṣīn* = *ṣ* – гэта архаічны спосаб напісання арабскай графемы *sīn* = *s* з трыма дыякрытычнымі кропкамі знізу, які застаўся ў пісьменстве "літоўскіх" татараў.

9.2.2.1. Знак *"šadda"*

У арабскім пісьме па магчымасці пазбягаюць пісаць дзве ідэнтычныя зычныя графемы адну за адной. Каб паказаць падваенне зычных, над зычным, які трэба падвойваць, пішуць дыякрытычны дапаможны знак *šadda* (ар. *šadda* = "узмацненне"), які мае форму графемы *sīn* = *s*. У транслітарацыі зычны кожны раз пішацца падвойным.

9.2.2.2. Асаблівая функцыя *'ayn* і *alif*

Графема *'ayn* = *'* не мае гукавога значэння, а функцыянуе пры галосным на пачатку слова як *mater lectionis* альбо ў інтэрвакальнай пазіцыі як паглынальнік хіятуса.

Графема *alif* = *'* функцыянуе ўвогуле як *mater lectionis* для галосных на пачатку слова, і тым самым яна цалкам знаходзіцца ў арабскай, персідскай і турэцкай пісьмовай традыцыі. У гэтай функцыі *alif* не мае ўласнага гукавога значэння і не паказваецца ў транслітарацыі. Аднак калі *alif* дзейнічае як паглынальнік хіятуса, то яна транслітаруецца з дапамогай *alif* = *'* (напр., *na'uka*). Акрамя таго, *alif* служыць як асноўны знак пры поўным напісанні (*scriptio plena*) галоснага */a/*. (Параўн. ніжэй >>> 9.4. Напісанне галосных.)

Акрамя таго, гэтая графема сустракаецца як *alif pleonasticum* без гукавога значэння. У гэтым выпадку яна транслітаруецца праз *alif* = *'*. *Alif pleonasticum* знаходзіцца пераважна на канцы слова пасля графемы *wāw* = *w*. Гэта чыста механічнае перайманне з арабскай арфаграфіі для канчатка *-ū* 3-й ас. мн. л. м. р. дзеясловаў у перфекце альбо апакопе. Часам *alif pleonasticum* ставіцца таксама ў сярэдзіне слова і ў рэдкіх выпадках нават пашыраецца на графемы, па форме падобныя да *wāw* = *w*, такія як *rā'* = *r, zāy* = *ź, že* = *ž, dāl* = *d, dze* = *dz* і нават *lām* = *l* у канцы слова[15].

9.2.3. Выражэнне палатальнасці

Для выражэння на пісьме апазіцый */k/ – /k'/*, */s/ – /s'/* і */z/ – /z'/*, якія маюць цэнтральнае значэнне ў беларускай і польскай фаналагічных сістэмах, выкарыстоўваюцца, паводле турэцкага ўзору, парныя графемы. Арабскія эмфатычныя альбо турэцкія цвёрдыя графемы пазначаюць пры гэтым цвёрдыя фанемы, а арабскія неэмфатычныя альбо турэцкія мяккія графемы – мяккія фанемы[16]:

---

[15] Параўн.: Антонович (1968), с. 330. Асабліва часта мы знаходзім *alif pleonasticum* у рукапісе U.

[16] Параўн. спіс цвёрдых і мяккіх графем у турэцкай мове: >>> 9.1. Паходжанне і традыцыя арабскага пісьма. Заўв. 11.

цвёрдыя фанемы эмфатычныя графемы	**мяккія фанемы неэмфатычныя графемы**
ق *qāf* = *k* для */k/*	ك *kāf* = *k′* для */k′/*
ص *ṣād* = *s* для */s/*	س *sīn* = *ś* для */s′/*
	ش *ṣīn* = *ṣ* для */s′/*
	ث *ṯā’* = *ś* для */s′/*
ض *ḍād* = *z* для */z/*	ز *zay* = *ź* для */z′/*
ظ *ẓā’* = *ẓ* для */z/*	ذ *ḏāl* = *ż* для */z′/*

У марфалагічнай сферы з’яўляюцца як апазіцыйныя пары */t/ – /c′/ (< /t′/)* = *цеканне* і */d/ – /dz′/ (< /d′/)* = *дзеканне*[17]:

цвёрды	**мяккі**
ط *ṭā’* = *ṭ* для */t/*	چ *ce* = *c* для */c′/*
ت *tā’* = *t* для */t/*	(ت *tā’* = *t′* для */t′/*)
د *dāl* = *d* для */d/*	ڈ *dze* = *dz* для */dz′/*

Такім чынам, графемы *ce* = *c* і *dze* = *dz* адначасова рэпрэзентуюць гістарычна мяккія фанемы */c/* і */dz/*[18], якія пайшлі ад другой агульнаславянскай палаталізацыі гутуральных */k/ > /c/ і /g/ > /dz/ > /z/*[19], а таксама іх мяккія апазіцыі */c′/* і */dz′/*, якія ўзніклі ў выніку спецыфічных польскіх і беларускіх працэсаў *цекання* і *дзекання*.

Графема (у арабскай мове неэмфатычная) *tā’* = *t′* у самых ранніх захаваных манускрыптах татараў Вялікага Княства XVII ст. часам знаходзіцца ў пазіцыі */c′/*[20]. Гэтая функцыя графемы *tā’* = *t′* з’яўляецца архаічнай. Магчыма, у гэтым ужыванні *tā’* = *t′* таксама адлюстроўваецца гукавы стан беларускіх дыялектаў, у якіх яшчэ не адбыўся пераход */t′/ > /c′/* пры канцы XVI альбо на пачатку XVII ст.[21] Але паколькі гэта мяккае */c′/ < /t′/* ужо ў найстарэйшых захаваных манускрыптах звычайна пісалася праз *ce* = *c*, *tā’* = *t′* функцыянавала ў далейшым як рэпрэзентант цвёрдага */t/* аналагічна графеме *ṭā’* = *t*.

У наступных графем не адрозніваюцца паміж сабой цвёрдая і мяккая, г.зн. графема рэпрэзентуе адначасова і цвёрдую і адпаведную змякчаную апазіцыю: *bā’* = *b*, *pe* = *p*, *ḥā’* = *cḥ*, *ḫā’* = *cḫ*, *rā’* = *r*, *ġayn* = *g*, *fā’* = *f*, *lām* = *l*, *mīm* = *m*, *nūn* = *n*, *hā’* = *h*, *wāw* = *w*.

---

[17] Наконт цекання і дзекання ў беларускай мове гл. Wexler (1977), p. 169 ff. Параўн. далей Stankievič (1952), c. 66. Пра развіццё ў польскай мове гл. Stieber (1973), p. 43.

[18] Гістарычна мяккая фанема */dz/* адыгрывае ў беларускай фаналагічнай сістэме маргінальную ролю. Гэта адбываецца пераважна ў паланізмах, якія праніклі ў беларускую мову, і статус */dz/* у якасці фанемы не замацаваны. Гл. Wexler (1977), p. 174. У беларускай мове фанема */dz/*, якая ўзнікла з */g/* у выніку другой і трэцяй агульнаславянскай палаталізацый */k, g, x/* (VI або IX ст.), спрошчваецца да */z/*. Гл. Wexler (1977), p. 103.

[19] Гл. Bräer (1961), Bd. 1, p. 189–192. Параўн.: Wexler (1977), p. 68. Параўн.: Stieber (1973), p. 17.

[20] Гл. Антонович (1968), с. 249 і далей.

[21] Гл. Wexler (1977), p. 171.

Наступныя графемы абазначаюць фанемы, якія не ўдзельнічаюць у апазіцыі цвёрды – мяккі: *ǧīm = ǧ, čīm = č, že = ž, šin = š, dāl = d, ṭā' = t, tā' = t, yā' = j.*

У білабіяльных фанемах */p, p', b, b', f, f', w, w', m, m'/*, для якіх арабскі алфавіт не дае парных графем для дыферэнцыйнага напісання цвёрдых і змякчаных апазіцый, змякчаныя апазіцыі пазначаюцца наступнай другаснай *yā' = j*: *< pj, bj, fj, wj, mj >*[22]. Такі спосаб напісання асабліва характэрны для польскіх тэкстаў. Іх фаналагічнай асновай з'яўляецца асінхронная, біфанемная артыкуляцыя змякчаных білабіяльных у польскай мове[23].

На гэтым фоне кола графем, у якіх цвёрдасць альбо мяккасць ніколі не пазначаецца, істотна звужваецца. Размова ідзе толькі пра графемы *ḥā' = ch, ḫā' = cḥ, hā' = h, rā' = r, ġayn = g, lām = l, nūn = n.*

У фанем */ch/* і */h/* статус мяккіх апазіцый */ch'/* і */h'/* як фанем у польскай і беларускай мовах не замацаваны, і яны адыгрываюць у фаналагічнай сістэме абедзвюх моў толькі вельмі маргінальную ролю[24].

Фанема */r/* і гістарычна мяккая апазіцыя */r'/ > /rz/* у польскай мове не адрозніваюцца ў арабскім пісьме, і існуе шмат пэўных доказаў, што ў польскай мове тэфсіра, які тут даследуецца, адбылося зацвярдзенне */r'/ > /r/*, як у беларускай мове[25].

Графема *ġayn = g* не адрознівае цвёрдую */g/* і змякчаную */g'/*, а змякчаная апазіцыя і тут адыгрывае хутчэй падпарадкаваную ролю ў фаналагічнай сістэме[26]. Акрамя таго, графема *ġayn = g* сустракаецца пераважна ў польскіх тэкстах, таму што ў беларускай мове адбылася змена */g/ > /h/*[27].

У фанемах */l/* і */n/* альбо ў змякчаных апазіцый */l'/* і */n'/* у арабскім пісьме існуюць другасныя ўказанні на змякчэнне: сібілянты ў пазіцыі перад мяккім */l'/* альбо */n'/* часта пішуцца ў сваёй асіміляванай форме праз мяккія графемы *zāy = ź* і *sīn = ś* альбо *ṯā' = s* (рэдка *ḏāl = z* альбо *ṣīn = ṣ*)[28].

9.3. Напісанне галосных

Для пісьмовай фіксацыі галосных, як і для напісання зычных, у арабскім пісьме маецца шмат графічных магчымасцей. Так, у спосабах напісання галосных

---

[22] З наступнай графемай *yā' = j* таксама часта пішацца графема *nūn = n*; напр. *anioł.*

[23] Гл. >>> 11.6. Асінхронная артыкуляцыя ў палатальных білабіяльных; гл. таксама >>> 10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка. Параўн. Антонович (1968), с. 288. Параўн. Stankievič (1952), с. 24. Параўн. Wexler (1977), p. 120.

[24] Гл. Stieber (1973), § 87. Параўн. Wexler (1977), p. 145; гл. таксама >>> 11.2. Фанемы */ch/, /h/* і */g/*.

[25] Наконт зацвярдзення */r'/* параўн. Wexler (1977), p. 152. Параўн. Stieber (1973), § 48, § 82. Параўн. >>> 11.4. Фанемы */r/, /ŕ/* і */ž, š/ (< /ŕ/)*.

[26] Гл. Stieber (1973), p. 107.

[27] Гл. Wexler (1977), p. 97. Гл. таксама >>> 11.2. Фанемы */ch/, /h/* і */g/*.

[28] Гл. >>> 11.5.3.2. Ускосны паказчык палатальнасці.

павялічваецца колькасць індывідуальных рыс асобных перапісчыкаў. Яны будуць захаваныя ў нашай транслітарацыі, бо яна паказвае больш тонкае адрозненне, чым у Антановіча (1968)[29].

У наступнай табліцы прыводзяцца разам спосабы напісання галосных, якія сустракаюцца ў манускрыптах "літоўскіх" татараў. Гэтыя розныя спосабы напісання цалкам абапіраюцца на інвентар графічных знакаў, які арабскае пісьмо выкарыстоўвае для напісання галосных. Графемы *alif*, *yā'* і *wāw*, якія першапачаткова абазначаюць кансананты, служаць як у арабскай, персідскай, турэцкай пісьмовай традыцыі, так і ў спосабе пісьма "літоўскіх" татараў для адлюстравання галосных. Арабскія дыякрытычныя дапаможныя знакі *fatḥa, kasra, ḍamma, alif diacriticum* і *alif subscriptum* у "літоўскіх" татараў зрабіліся сталай складовай часткай арфаграфіі і атрымалі ў некаторай ступені статус графем. Праз камбінацыю названых арабскіх графем з дыякрытычнымі дапаможнымі знакамі ажыццяўляюцца розныя спосабы напісання галосных.

Як у арабскай, персідскай, турэцкай пісьмовай традыцыі, так і ў пісьме "літоўскіх" татараў *alif* дзейнічае як *mater lectionis* для галосных на пачатку слова. Але разам з тым у "літоўскіх" татараў існуе значнае адхіленне ад гэтага. Як *mater lectionis* для галосных на пачатку слова таксама часта сустракаецца графема *'ayn* = ʿ. У многіх рукапісах спосаб напісання праз *'ayn* амаль цалкам выцесніў *alif* перад галоснымі на пачатку слова. Такі спосаб напісання мае месца ўжо ў XVIII ст., і асабліва ў XIX ст.[30] (табл. 9.2).

---

[29] Можна прынцыпова пагадзіцца з заўвагамі, зробленымі Лапічам (Łapicz (1986), p. 98, 103–123), што транслітарацыя павінна быць як мага больш дакладным адлюстраваннем арабскага шрыфту, каб захаваць характэрную графічную своеасаблівасць розных рукапісаў. Аднак Лапіч зайшоў занадта далёка ў дыферэнцыяцыі асобных спосабаў напісання.

[30] Параўн. Антонович (1968), с. 321 і далей, 328.

Лапіч (Łapicz (1986), p. 94) хацеў паставіць дадатковую дыстрыбуцыю *alif* і *'ayn* у залежнасць ад беларускіх дыялектаў: "Na szerszej bazie tekstowej można stwierdzić, że np. w tekstach, w których przeważają cechy dialektalne typowe dla południowo-zachodniej grupy gwar połockich oraz północno-zachodnich gwar środkowobiałoruskich dla oznaczenia samogłosek nagłosowych używa się litery ajn. W rękopisach wykazujących cechy białoruskich gwar południowo-zachodnich w funkcji oznaczania samogłosek przeważa litera alif."

Лефельт згадвае спосаб напісання з дапамогай *'ayn* = ʿ у якасці *mater lectionis* у баснійскім альхаміяда-пісьменстве толькі як зусім рэдкае выключэнне (Lehfeldt (1969), p. 78, 89).

'Ayn = ʿ як *mater lectionis* для галосных на пачатку слова сустракаецца таксама ў цэнтральнаазіяцкацюркскім пісьмаўжыванні (гл. Zenker (1967), p. 617 пад *'ayn*: "Ва ўсходнецюркскай і туркменскай мовах яна часта стаіць замест эліф, напр. *'ādam* замест *ādam*").

Ужыванне графемы *'ayn* як *mater lectionis* для галосных на пачатку слова сустракаецца таксама ў пісьменстве караімаў з Трокаў (гл. >>> 6.3. Татары і караімы), якія ўжываюць габрэйскую літару *'ayn* як *mater lectionis*, перш за ўсё ў камбінацыі з галоснымі велярнага раду на пачатку слова (гл. Pritsak (1959), p. 326).

Трэба таксама заўважыць, што літара *'ayn* у мове ідыш, якая выкарыстоўвае габрэйскі алфавіт, перадае галосны /e/, зноў служачы для галоснай як *mater lectionis*, праўда, ва ўсіх пазіцыях (гл. Landmann (1992), p. 368. Параўн. Fuks (1957), уводзіны).

Табліца 9.2

Абазначэнне галосных

Графемы			Транслітарацыя	Галосныя		Абазначэнне
У канцы слова	У сярэдзіне слова	У пачатку слова		польск.	бел.	
ـَا	ـَا	اَ	**a**	a	a	*alif* + *fatḥa*
–	–	آ	**ã**	a	a	*alif* + *madda*
ا	ا	–	**á**	a	a	*alif diacriticum*
اٰ	اٰ	اٰ	**â**	a	a	*alif* + *alif diacriticum*
ـَ	ـَ	اَ	**e**	e	e	*fatḥa*
ـِ	ـِ	اِ	**i**	i, y	i, y	*kasra*
ـِي	ـِـيـ	اِي	**ī**	i, y	i, y	*yā'* + *kasra*
ـِ	ـِ	–	**í**	i, y	i, y	*alif subscriptum*
ـِي	ـِـيـ	اِي	**î**	i, y	i, y	*yā'* + *alif subscriptum*
ـُ	ـُ	اُ	**u, o**	u, o	u, o	*ḍamma*
ـُو	ـُو	اُو	**ū, ō**	u, o	u, o	*wāw* + *ḍamma*
ـَو	ـَو	اَو	**ô**	o	o	*wāw* + *fatḥa*
ـُوٟ	–	–	**ą**	ą	-	*wāw* + *ḍamma* + *saġīr-ı-nūn*

9.3.1. Заўвагі да спосабаў напісання галосных

Alif* + *fatḥa* = *a: звычайны спосаб для напісання галоснай /*a*/ ў рукапісах. Гэты спосаб напісання адпавядае арабскаму і персідскаму поўнаму напісанню (*scriptio plena*) доўгага галоснага /*ā*/.

Alif* + *madda* = *a: адпавядае асобаму спосабу поўнага напісання (*scriptio plena*) доўгага галоснага /*ā*/ ў арабскай мове[31]. У персідскім пісьмаўжыванні *alif* + *madda* ўжываецца выключна для напісання доўгага галоснага /*ā*/ на пачатку слова. У пісьменстве "літоўскіх" татараў гэты спосаб напісання, за выключэннем некаторых праніклых арабізмаў (напр. korān), таксама сустракаецца толькі на пачатку слова.

Alif diacriticum* = *á: у старой арфаграфіі арабскай мовы доўгі галосны /*ā*/ адпаведна правілу часта не адлюстроўваўся на пісьме графемай *alif*. Пры ва-

[31] Пры сутыкненні дзвюх *alif* у арабскім пісьме яны аб'ядноўваюцца і пазначаюцца дапаможным знакам *madda* (маленькай хвалістай лініяй над *alif*). *Alif* + *madda* сустракаецца ў арабскай мове не толькі на пачатку, але таксама ў сярэдзіне слова.

калізацыі тэксту, напр., у Каране, *alif* устаўлялася дыякрытычна над лініяй тэксту. У пісьменстве "літоўскіх" татараў адносна рэдка ўжываецца толькі *alif diacriticum* = *a*. Яна часта з'яўляецца ў польскіх тэкстах толькі ў камбінацыі з графемай *jā'* = *j* (*jā'* + *alif diacriticum* = *já*)[32].

***Alif* + *alif diacriticum* = *â*:** адпавядае *scriptio plena* галоснага */a/* і вельмі тыповая для пісьменства "літоўскіх" татараў XIX ст. Але гэты спосаб напісання сустракаецца таксама ўжо ў XVII і XVIII стст.[33]

***Fatḥa* = *e*:** праз *fatḥa* = *e* ў пісьменстве "літоўскіх" татараў звычайна пазначаецца галосны */e/*[34]. Гэты спосаб напісання ўзыходзіць да *scriptio defectiva* кароткага галоснага */a/* ў арабскай мове. Побач з гэтым *fatḥa* = *e* мае значэнне рэдукаванага (*scriptio defectiva*) напісання галоснага */a/* (гл. ніжэй).

***Kasra* = *i*:** знак *kasra* = *i* звычайна ўжываецца для напісання галосных */i/* і */y/*. Гэты спосаб напісання ўзыходзіць да *scriptio defectiva* кароткага галоснага */i/* ў арабскай мове.

***Yā'* + *kasra* = *i*:** адпавядае арабскаму *scriptio plena* доўгага галоснага */i/*. *Scriptio plena* галосных */i/* і */y/* камбінацыяй *yā'* + *kasra* = *i* сустракаецца ў пісьмаўжыванні "літоўскіх" татараў значна радзей, чым выкарыстанне толькі *kasra* = *i*. Толькі на канцы слова можна назіраць некалькі павышаную тэндэнцыю да *scriptio plena* галосных */i/* і */y/*.

***Alif subscriptum* = *í*:** аналагічна *alif diacriticum* = *á* ў пісьменстве "літоўскіх" татараў зрэдку ўжываецца таксама *alif subscriptum*, якая служыць для напісання галосных */i/* і */y/* і пішацца пад лініяй як знак *kasra* = *í*. Вядома, гэты спосаб напісання надзвычай рэдкі.

***Yā'* + *alif subscriptum* = *î*:** зусім рэдка для напісання галосных */i/* і */y/* выкарыстоўваецца камбінацыя *yā'* + *alif subscriptum* = *î*. Хаця яна знаходзіць прататып у арабскім пісьмаўжыванні, яна з'яўляецца рэдкай у "літоўскіх" татараў і хутчэй характарызуе індывідуальны стыль перапісчыка (гл. перш за ўсё рукапіс тэфсіра **U**).

---

[32] Параўн. Антонович (1968), с. 288. Параўн. >>> 10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка; гл. >>> 11.6. Асінхронная артыкуляцыя пры палатальных білабіяльных.

[33] Транслітарацыя Антановіча (1968) не адрозніває камбінацыі *alif* + *fatḥa* = *a* і *alif* + *alif diacriticum* = *â* (гл. Антонович (1968), с. 194, 287 і далей). Параўн. таксама Łapicz (1986), p. 103 ff. Ён у транслітарацыі адрозніває абодва спосабы напісання. Праз дыферэнцыяцыю, як мы далей яшчэ ўбачым, могуць быць патлумачаныя некаторыя важныя сістэмныя асаблівасці літоўскататарскага пісьмаўжывання. (Таксама Лефельт (Lehfeldt (1969), p. 77, 79, 83) згадвае спосаб напісання *alif* + *alif diacriticum* = *â* ў баснійскім альхаміяда-пісьменстве. Аднак сувязь паміж баснійска-мусульманскім і літоўскататарскім пісьменствам у дачыненні да гэтага спосабу напісання можна выключыць.)

[34] У літоўскататарскім пісьменстве ў канцы слова часам сустракаецца напісанне */e/* праз *hā-i resmiye* = *h*. Асманы называлі *hā-i resmiye* графему *hā'* = *h*, якая сустракалася на пісьме і не вымаўлялася, а служыла толькі для пазначэння */e/* ў канцы слова. Такі спосаб напісання */-e/* ў канцы слова ўзыходзіць да персідскага пісьмаўжывання, якое магло быць звязанае са спосабам напісання арабскага канчатка жаночага роду *-ah (atun)*. Параўн. Антонович (1968), с. 207 і далей.

Галосныя */i/* і */y/* на пісьме не адрозніваюцца. Аднак у камбінацыі з цвёрдымі і мяккімі зычнымі графемамі якасць галоснага паказваецца беспасярэдна праз зычную графему: цвёрдая зычная графема ў спалучэнні з адным з гэтых спосабаў напісання галосных */i, y/* паказвае на */y/*. Мяккая зычная графема ў спалучэнні з адным з гэтых спосабаў напісання галосных */i, y/*, наадварот, указвае на галосны */i/*.

Ḍamma = u альбо ***ḍamma = o:*** узыходзіць да *scriptio defectiva* арабскага кароткага галоснага */u/*. У пісьме "літоўскіх" татараў праз *ḍamma = o* абазначаецца таксама галосны */o/*. Такім чынам, у арабскім пісьме розніца паміж */u/* і */o/* не пазначаецца, і адрозненне паміж абодвума галоснымі ў транслітарацыі адбываецца на падставе інтэрпрэтацыі арабскага напісання.

Wāw + ḍamma = ū альбо ***wāw + ḍamma = ō:*** гэты спосаб напісання ўзыходзіць да арабскага *scriptio plena* доўгага галоснага */u/* праз графему *wāw* з дапамогай дыякрытычнага знака *ḍamma*. Галосныя */u/* і */o/* пазначаюцца як адным толькі знакам *ḍamma*, так і разам з гэтым праз спалучэнне *wāw + ḍamma*. Адрозненне іх у транслітарацыі (*wāw + ḍamma = ū* альбо *wāw + ḍamma = ō*) зноў засноўваецца на інтэрпрэтацыі.

Wāw + fatḥa = ô: абодва галосныя */o/* і */u/* доўгі час у "літоўскіх" татараў не адрозніваліся. Камбінацыя *wāw + fatḥa = ô*, якая спарадычна сустракаецца ўжо ў рукапісах XVII–XVIII стст., перамагла ў канцы XVIII ст. як адзіны спосаб напісання галоснага */o/*[35]. Для спосабу напісання *wāw + fatḥa = ô* не знаходзяць ніякага прататыпу ў арабскім, персідскім і турэцкім пісьмаўжыванні, г.зн., што ён уяўляе сабой уласную інавацыю пісьма "літоўскіх" татараў. Адрозненне галосных */o/* і */u/* на пісьме з'яўляецца графічнай асаблівасцю, якая дазваляе зрабіць даволі надзейную выснову пра час узнікнення рукапісу.

Ṣaġır-ı-nūn = ñ: на асаблівасці асманскай пісьмовай традыцыі засноўваецца ўжыванне персідскай літары *gāf = g* як *ṣaġır-ı-nūn = ñ* для абазначэння польскага *o* насавога ў канцы слова. *Ṣaġır-ı-nūn = ñ* сустракаецца ў гэтай функцыі заўсёды ў камбінацыі з адным са спосабаў напісання галоснага */o/*. Звычайна мы знаходзім камбінацыю *wāw + ḍamma + ṣaġır-ı-nūn = -ōñ* са *scriptio plena* галоснага */o/*. Некалькі радзей сустракаецца спосаб напісання *ḍamma + ṣaġır-ı-nūn = -oñ* альбо *wāw + fatḥa + ṣaġır-ı-nūn = -oñ*. Як выключэнне можна знайсці таксама спосаб напісання *alif + fatḥa + ṣaġır-ı-nūn = -añ*[36]. Пералічаныя тут спосабы напісання ахопліваюцца ў транслітарацыі на канцы слова графемай *-ą*, звычайнай у польскай мове для *o* насавога[37].

---

[35] Гл. Антонович (1968), с. 298 і далей.

[36] Спосаб напісання *-ą* праз *alif* з'яўляецца рэдкім, напр., у (139b7): *prineś nam menke gōrką (-añ)* альбо (270b6): *pewne-ś-tī jesteś naprōwadzōnij na drōge prawdziwą (-añ)*. Аднак гэта не варта разглядаць як асобную функцыю ў параўнанні са звычайным спосабам напісання праз *wāw + ḍamma + ṣaġır-ı-nūn*. Параўн. Антонович (1968), с. 341 і наст.

[37] Ужыванне *'ayn = '* замест *ṣaġır-ı-nūn = ñ* для абазначэння *o* насавога ў канцы слова, разгледжанае цалкам, – гэта вельмі маргінальная з'ява ў літоўскататарскім пісьмаўжыванні; гл. Антонович (1968), с. 342.

9.3.2. Дапаможныя арфаграфічныя знакі *sukūn* і *hamza*

***Sukūn**:* у арабскім пісьме ёсць спецыяльны дапаможны арфаграфічны знак для абазначэння адсутнасці галоснага. Гэты знак, які называецца ў арабскай мове *sukūn* = "спакой, цішыня", пішацца дыякрытычна ў форме маленькага круга над зычнай графемай, калі за ёй не ідзе галосная. У пісьменстве "літоўскіх" татараў гэты знак звычайна ставіцца.

***Hamza**:* знак *hamza* абазначае ў арабскай мове галасавы прыступ (глытальную паўзу /ʼ/) пры галосных на пачатку слова. Гэты знак не мае ў пісьмаўжыванні "літоўскіх" татараў сістэмнай функцыі. Ён сустракаецца пераважна ў арабізмах.

9.3.3. *Scriptio plena* і *scriptio defectiva* галосных

Спосабы напісання, у якіх прымаюць удзел тры графемы *alif, jāʼ* і *wāw*, называюцца *scriptio plena*, таму што галосныя на пісьме рэгулярна пазначаюцца праз арабскія графемы. Спосабы пісьма, у якіх ужываюцца толькі дыякрытычныя знакі *fatḥa*, *kasra*, *ḍamma*, *alif diacriticum* і *alif subscriptum*, наадварот, называюцца *scriptio defectiva*.

У арабскай мове размеркаванне *scriptio plena* і *scriptio defectiva* абумоўленае катэгорыяй даўжыні, якая пануе ў арабскай сістэме галосных. Доўгія галосныя */ā, ī, ū/* пішуцца з дапамогай графемы *alif* для */ā/*, *jāʼ* для */ī/* і *wāw* для */ū/ – scriptio plena*. Кароткія галосныя */a, i, u/* на пісьме, як правіла, не пішуцца, але яны могуць пры неабходнасці пазначацца праз дыякрытычныя знакі *fatḥa* для */a/*, *kasra* для */i/* і *ḍamma* для */u/ – scriptio defectiva*. У персідскай мове размеркаванне *scriptio plena* і *scriptio defectiva* галосных рэгулявалася аналагічна арабскай мове. У персідскай мове таксама вызначальнай была катэгорыя даўжыні для спосабу напісання галосных, бо персідская мова падчас запазычвання арабскага алфавіта адрознівала доўгія */ā, ī, ū/* і кароткія */a, i, u/* галосныя. Таму арабская сістэма напісання галосных магла быць запазычанай без вялікіх змен[38].

У турэцкай вакальнай сістэме колькасць не адыгрывае ролі, таксама няма выразнай акцэнтнай сістэмы. Значыць, адсутнічаюць фаналагічныя асновы, якія пры запазычванні арабскага алфавіта былі б вырашальнымі для размеркавання *scriptio plena* і *scriptio defectiva*. Тым самым пры напісанні галосных немагчыма было прыбягаць да арабскай і персідскай мадэлі размеркавання *scriptio plena* і *scriptio defectiva*. Такім чынам, турэцкія галосныя пісаліся то

---

[38] Побач з доўгімі галоснымі */ā, ī, ū/* у класічнай новаперсідскай мове існавалі яшчэ доўгія галосныя */ē/* (*yāʼ-i maǧhūl*) і */ō/* (*wāw-i maǧhūl*), якія пайшлі са стараперсідскіх дыфтонгаў. Прыблізна ў XIV ст. яны супалі з доўгімі галоснымі */ī/* і */ū/*. У далейшым развіцці персідскай сістэмы галосных сфармавалася сістэма колькасці, блізкая да сістэмы якасці, пры якой адбыліся наступныя змены: */ī/ > /i/*, */ū/ > /u/*, */a/ > /ä/*, */i/ > /e/*, і */u/ > /o/*. Доўгі галосны */ā/* вымаўляецца амаль як доўгі */ō/*, перад */n/* амаль як доўгі */ū/*. Аднак яшчэ сёння спосаб напісання галосных засноўваецца на тагачасным адрозненні доўгіх і кароткіх галосных: так, кантынуанты доўгіх галосных */ā, i, u/* запісваюцца *scriptio plena*, а кантынуанты кароткіх галосных */ä, i, u/ – scriptio defectiva*.

scriptio plena, то *scriptio defectiva* з выкарыстаннем дыякрытычных дапаможных знакаў альбо без іх. Да самага пераймання лацінскага алфавіта ў 1927 г. у асманскай арфаграфіі не існавала ясных правілаў для напісання галосных[39].

Наконт дыстрыбуцыі *scriptio plena* і *scriptio defectiva* ў рукапісах "літоўскіх" татараў застаецца шмат пытанняў. Перш за ўсё існуе спроба карэліраваць розныя спосабы напісання праз націск, што, аднак, не вядзе да канчатковых вынікаў. Побач з націскам, які адназначна ўдзельнічае ў якасці лінгвістычнага фактару пры размеркаванні абодвух спосабаў напісання, павінны таксама разглядацца менавіта чыста фармальна-графічныя, пісьмова-тэхнічныя падыходы.

Перш за ўсё неабходна адзначыць, што *scriptio plena* значна дамінуе, акрамя галосных */e/* і */i, y/*.

Галосны */a/* звычайна пішацца *scriptio plena* праз графему *alif* у камбінацыі з дыякрытычнымі дапаможнымі знакамі *alif* + *fatḥa* = *a*, *alif* + *madda* = *ā* або *alif* + *alif diacriticum* = *â*.

Scriptio defectiva галоснага */a/* мае месца ў выкарыстанні *alif diacriticum* = *á*, якая звычайна звязана ў камбінацыю з графемай *yā'* = *j*. Камбінацыя *yā'* + *alif diacriticum* = *já* звязана з ляхіцкай перагаласоўкай, дзе біфанемная артыкуляцыя пры *палатальных білабіяльных* знаходзіць сваё выражэнне на пісьме праз *yā'* + *alif diacriticum* = *já*[40].

Другі від *scriptio defectiva* галоснага */a/* прадстаўлены выкарыстаннем толькі *fatḥa* = *e*. У камбінацыі з цвёрдай графемай *qāf* = *k* часта знаходзіцца толькі адна *fatḥa* = *e* як рэпрэзентант */a/* як у націскной, так і ў ненаціскной пазіцыі. У камбінацыі *qāf* + *fatḥa* = *ke fatḥa* павінна, аднак, інтэрпрэтавацца як */a/*, бо змякчэнне */k/* > */k'/* перад галоснай */e/* на пісьме звычайна выражаецца праз пастаноўку мяккай графемы *kāf* = *k'*[41].

Побач з гэтым можна назіраць *scriptio defectiva* */a/* праз адну толькі *fatḥa* = *e*, якая выразна звязаная з націскам. У ненаціскной пазіцыі галосны */a/*, а таксама галосны */o/* адносна часта пішацца *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*. Гэта можна разглядаць як спробу пазначыць рэдукцыю галосных */a/* і */o/* ў ненаціскной пазіцыі. Але ёсць выпадкі, калі галосныя */a/* і */o/* пішуцца толькі праз *fatḥa* = *e* таксама пад націскам.

---

[39] Паколькі тут немагчыма больш дэталёва затрымлівацца на гэтай тэме, належала б указаць на працу Дэні (Deny (1921), p. 34, § 26 і далей). На працягу стагоддзяў у асманскай арфаграфіі ўсё больш замацоўвалася тэндэнцыя да *scriptio plena*. Дэні спрабуе падсумаваць няўстойлівую асманскую пісьмовую практыку, якая з цяжкасцю паддаецца правілам, прычым ён уключыў у апісанне дыяхронны аспект. Асманскатурэцкая вакальная сістэма ўключае восем галосных: */e, a, i , ı, ö, o, ü, u/*. З-за таго, што арабскі алфавіт не дае ў распараджэнне дастаткова знакаў, каб па-рознаму перадаць усе галосныя, сітуацыя яшчэ больш ускладняецца. Параўн. Lehfeldt (1969), p. 60 ff.

[40] Гл. >>> 11.6. Асінхронная артыкуляцыя пры палатальных білабіяльных.

[41] Параўн. Stankievič (1952), c. 16 "[...] з іншае прычыны пішацца ў рукапісе **e** на месцы этым. **a** па **k**, **ch**, **t** і па **ajn** (ʿ). Туркі й татары, а так-жа крывіцкія мусульмане літару **e** па **k**, **ch**, **t**, ды **e** з ʿ (ajn) вымаўляюць як **a**".

Вельмі характэрнае дамінаванне пры напісанні галосных /i/ і /y/ *scriptio defectiva* толькі з *kasra* = *i*[42]. Нельга даць выразнае правіла для дыстрыбуцыі *scriptio plena* праз *yā'* + *kasra* = *ī* або вельмі рэдкую камбінацыю *yā'* + *alif subscriptum* = *î*. Вельмі хісткім правілам можна лічыць тое, што пры існаванні двух /i, y/ ў адным і тым жа слове *scriptio plena* запісваецца хутчэй другі галосны. Перш за ўсё прыцягвае ўвагу тое, што ў канцы слова некалькі часцей канстатуецца *scriptio plena*, што не можа абгрунтоўвацца націскам або іншымі лінгвістычнымі фактарамі, а хутчэй можа расцэньвацца як чыста пісьмова-тэхнічная схільнасць асобных перапісчыкаў.

Таксама ўнутры слоў звяртае ўвагу дамінаванне *scriptio defectiva* з *kasra* = *i*, і для рэдкіх *scriptio plena* немагчыма вызначыць карэляцыі з лінгвістычнымі фактарамі. Дамінаванне *scriptio defectiva* грунтуецца на нязначнай функцыянальнай нагрузцы знака *kasra* = *i*. *Kasra* = *i* служыць выключна як рэпрэзентант галосных /i/ і /y/ і не выконвае ў сістэме пісьма іншых функцый. Значэнне *scriptio defectiva alif subscriptum* = *i* з'яўляецца маргінальным і належыць да сферы індывідуальных пісьмовых стыляў некаторых перапісчыкаў.

Галосны /o/ ў асноўным запісваецца *scriptio plena* праз камбінацыю *wāw* + *ḍamma* = *ō* альбо, з канца XVIII ст., праз *wāw* + *fatḥa* = *ô*. *Scriptio defectiva* /o/ толькі праз *ḍamma* = *o* немагчыма карэлірваць з націскам, як гэта спрабаваў Антановіч[43]. Дыстрыбуцыя *scriptio plena* і *scriptio defectiva* пры галосным /o/ абумоўленая чыста графічна. У спалучэнні з графемай *wāw* = *w*, якая служыць для зычнага /w/, аддаецца перавага *scriptio defectiva* з адной толькі *ḍamma* = *o*, каб пазбегнуць залішняй частаты гэтай графемы ў карціне пісьма. Пры гэтым у пазіцыі перад зычным /w/ галосны /o/ звычайна запісваецца *scriptio plena* <*ōw*>, але ў пазіцыі пасля /w/ *scriptio defectiva* <*wo*>. З увядзеннем камбінацыі *wāw* + *fatḥa* = *ô* ў канцы XVIII ст. гэтае адрозненне знікае, і *scriptio plena* праз *wāw* + *fatḥa* = *ô* робіцца адзіным спосабам напісаня галоснага /o/ таксама і побач з зычным /w/.

Пры напісанні галоснага /u/ дамінуе *scriptio plena* праз *wāw* + *ḍamma* = *ū* як у націскной, так і ў ненаціскной пазіцыі. Аднак *scriptio defectiva* толькі з *ḍamma* = *u* знаходзіцца ў ненаціскной пазіцыі значна часцей, чым у націскной. Тут мае месца выразная карэляцыя паміж *scriptio plena* і *scriptio defectiva*, з аднаго боку, і націскам, з другога[44]. Пры галосным /u/, таксама як і пры галосным /o/ ў спалучэнні з графемай *wāw* = *w*, аддаецца перавага *scriptio defectiva* гэтага галоснага[45].

---

[42] Параўн. Антонович (1968), с. 314–317.

[43] Гл. Антонович (1968), с. 301 і далей.

[44] Гл. Антонович (1968), с. 312 і наст. Высновы Антановіча, якія датычаць спосабаў напісання галоснага /u/, цалкам пацвярджаюцца на падставе матэрыялу з рукапісаў тэфсіра (гл. ніжэй).

[45] Параўн. Deny (1921), § 25. Дэні ўказвае на дамінаванне ў асманскай мове *scriptio plena* для галоснага /o/ ў параўнанні са *scriptio plena* для галоснага /u/, які пішацца *scriptio defectiva* часцей, чым /o/. Менавіта такі ўзор выяўляецца і ў літоўскататарскім пісьмаўжыванні.

9.4. Асабістыя пісьмовыя стылі

Магчымасць пры галосных і пэўных зычных фанемах выбраць паміж многімі спосабамі напісання спрыяла развіццю розных стыляў напісання. Асобныя перапісчыкі аддавалі перавагу той ці іншай графеме і ўносілі такім чынам у перапісаныя імі манускрыпты характэрныя графічныя асаблівасці, якія былі выяўленнем іх асабістага стылю напісання. Графічныя "профілі" асобных рукапісаў могуць служыць сёння ў якасці крытэру для вызначэння сувязяў і залежнасці паміж асобнымі рукапісамі.

Для напісання галосных */a, i, y, o, u/* і зычных */s', z', z, t, ch/* у распараджэнні кожны раз маюцца шматлікія графемы або камбінацыі графем. Наогул можна сцвярджаць, што магчымасці выбару пры галосных больш, чым пры зычных. У наступным спісе аб'ядноўваюцца магчымасці выбару, якія адзін перапісчык мае для пісьмовай фіксацыі асобных фанем.

Галосныя

Фанемы:	**Спосаб напісання:**
/a/	*a, ã, á, â, e*
/i, y/	*i, ī, í, î*
/o/	*o, ō, ô*
/u/	*u, ū*

Галосныя на пачатку слова: *alif, 'ayn*

Зычныя:

Фанемы:	**Спосаб напісання:**
/s'/	*ś, ṣ, ṡ*
/z'/	*ź, ẓ*
/z/	*z, ẓ*
/t/	*t, t'*
/ch/	*ch, ch̦*

9.5. Тэндэнцыі развіцця ў сістэме пісьма

Для часавага размеркавання недатаваных манускрыптаў можна звяртаць увагу таксама на графічныя асаблівасці рукапісаў. У пісьмаўжыванні "літоўскіх" татараў, разгледжаным дыяхранічна, улоўліваюцца тэндэнцыі развіцця, якія не з'яўляюцца толькі выражэннем індывідуальнага пісьмовага стылю, але і могуць тлумачыцца як агульны працэс убок уніфікацыі пісьмаўжывання. Гэты працэс з'яўляецца прыкметным ужо на падставе вядомых рукапісаў, хоць інвентар рукапісаў "літоўскіх" татараў навукова яшчэ цалкам не ахоп-

лены. У XIX ст. у іх пісьменстве можна канстатаваць ў высокай ступені уніфікаванае пісьмаўжыванне.

Як ужо было вызначана раней пры абмеркаванні *scriptio plena* і *scriptio defectiva* галосных, у асобных спосабах напісання як фактары дзейнічаюць графічна-сістэмныя падыходы. Такія графічна-фармальныя фактары належыць разглядаць таксама пры пытаннях пра тое, чаму асобныя спосабы напісання нарэшце перамаглі, а іншыя зніклі.

Спосаб напісання *scriptio plena alif* + *fatḥa* = *a* доўгі час быў самым распаўсюджаным відам напісання галоснага /*a*/, але ў ходзе развіцця ён быў заменены "літоўскімі" татарамі характэрным спосабам напісання *alif* + *alif diacriticum* = *â*, які з канца XVIII ст. зрабіўся дамінантным спосабам напісання галоснага /*a*/ ва ўсіх пазіцыях і таксама паступова выцясняў з пачатку слова пазіцыйны варыянт *alif* + *madda* = *ā*. Падставы для таго, чаму *alif* + *alif diacriticum* = *â* перамагала *alif* + *fatḥa* = *a*, маюць графічна-сістэмны характар і звязаныя з дыякрытычным знакам *fatḥa*. Знаку *fatḥa* ў сістэме напісання галосных надаецца вялікая функцыянальная вага. *Fatḥa* = *e* з'яўляецца адзіным знакам для напісання галоснага /*e*/. Але *fatḥa* таксама ўдзельнічае ў *scriptio plena* галоснага /*a*/ праз *alif* + *fatḥa* = *a*. З канца XVIII ст. знаку *fatḥa* да таго ж надаецца дыферэнцыйная функцыя пры спосабе напісання *wāw* + *fatḥa* = *ô*, з дапамогай якога галосны /*o*/ на пісьме адрозніваецца ад /*u*/. З распаўсюджаннем спосабу напісання *alif* + *alif diacriticum* = *â* для галоснага /*a*/ функцыянальная вага знака *fatḥa* змяншаецца.

Як выказвалася вышэй, пры спосабе напісання галосных /*i, y*/ пануе *scriptio defectiva* са знакам *kasra* = *i*. Спосаб *scriptio plena* з *yā'* + *kasra* = *ī* не перамог, хаця пры ўсіх іншых галосных, акрамя /*e*/, захоўваецца вельмі моцная тэндэнцыя да *scriptio plena*. Гэта грунтуецца не толькі на тым факце, што знаку *kasra* ў якасці адзінай функцыі ў сістэме пісьма надаецца рэпрэзентацыя галосных /*i*/ і /*y*/. Найважнейшы фактар для падаўлення *scriptio plena* /*i, y*/ мае пісьмова-тэхнічную прыроду. Формы напісання графемы *yā'* на пачатку і ў сярэдзіне слова супадаюць з тымі самымі формамі графем *bā'* = *b*, *pe* = *p*, *tā'* = *t'* і *ṯā'* = *ṡ*, ад якіх яны адрозніваюцца толькі колькасцю і размяшчэннем дыякрытычных кропак. Праз ухіленне ад *scriptio plena* галосных /*i*/ і /*y*/ пазбягаецца нагрувашчванне ідэнтычных графемных формаў, дзякуючы чаму карціна пісьма набывае яснасць. Акрамя таго, пазбягаецца небяспека, што праз няправільнае размяшчэнне дыякрытычных кропак узнікнуць дадатковыя памылкі.

Па-іншаму складваецца сітуацыя пры спосабе напісання галосных /*i, y*/ ў канцы слова, дзе графема *yā'* ў арабскім пісьме праз сваю характэрную канцавую форму выконвае функцыю маркера мяжы слова. У канцы слова мы канстатуем для галосных /*i, y*/ таксама толькі нязначна павышаную тэндэнцыю да *scriptio plena* праз *yā'* + *kasra* = *ī*.

Прыкметнай асаблівасцю ў пісьменстве "літоўскіх" татараў з'яўляецца ўжыванне графемы *'ayn* = *ʻ* як *mater lectionis* пры галосных на пачатку слова. Гэтае ўжыванне *'ayn* знаходзіць сістэмнае распаўсюджанне ў рукапісах галоўным чынам у XIX ст., пасля таго як у XVIII ст. яно сустракалася толькі

ў асобных манускрыптах. Тым самым да канца XVIII ст. ужыванне *ʻayn* у якасці *mater lectionis* належала да сферы індывідуальнага пісьмовага стылю асобных перапісчыкаў і з пачатку XIX ст. ператварылася ў істотную рысу пісьмаўжывання. *ʻAyn* = ʻ графічна больш заўважальная, чым *alif*, і функцыянальна не так моцна нагружаная, як апошняя, – два фактары, якія падтрымліваюць ужыванне *ʻayn* = ʻ замест *alif* на пачатку слова. У рукапісах тэфсіра, якія даследуюцца ў гэтай працы, *ʻayn* = ʻ ужываецца, зразумела, умоўна як паглынальнік хіятуса і наўрад ці як *mater lectionis*.

Для зычных у пісьмаўжыванні ўстанаўліваюцца такія самыя уніфікацыі, як і для галосных. Так, у напісанні фанемы */z/* змагла перамагчы графема *ẓā’ = z*, бо яна мае ў параўнанні з *ḍād = z* графічна больш прыкметную форму і лягчэй ідэнтыфікуецца ў агульнай карціне пісьма. Асноўныя формы графемы *ḍād = z* супадаюць менавіта з такімі самымі формамі графемы *ṣād = s* і характэрнай графемы “літоўскіх” татараў *ce = c*. Гэтыя тры графемы адрозніваюцца толькі колькасцю і размяшчэннем дыякрытычных кропак. З-за ўжывання больш прыкметнай *ẓā’ = z* замест графемы *ḍād = z* карціна пісьма магла зноў пазбавіцца ад нагрувашчвання асноўных графічна ідэнтычных формаў. Амаль выключнае ўжыванне *ẓā’ = z* для напісання цвёрдага */z/* з’яўляецца прыкметнай асаблівасцю рукапісаў XIX ст.[46]

У дачыненні да графем *sīn = ś* і *ṯā’ = ṡ* для палатальнага */s’/* у многіх манускрыптах канстатуецца дадатковае размеркаванне ва ўжыванні. Так, напрыклад, у тэксце тэфсіра графема *ṯā’ = ṡ* знаходзіцца пераважна ў такой марфеме, як канчатак *-ość*, або звычайна ў зваротным займенніку *się*. У прыметніку на *-ski* таксама часта знаходзяцца спосабы напісання праз графему *ṯā’ = ṡ*, якая ўказвае на змякчэнне */s/ > /s’/* перад змякчаным */k’/*[47]. Па-за такімі тыповымі пазіцыямі графема *ṯā’ = ṡ* радзей ужываецца ў тэксце тэфсіра, і ўсюды дамінуюць спосабы напісання праз *sīn = ś*.

Антановіч, які даследаваў вялікую колькасць манускрыптаў, адзначае, што ў дыстрыбуцыі графем *ṯā’ = ṡ* і *sīn = ś* не заўважаецца ніякай рэгулярнасці альбо развіцця ва ўжыванні, і што абедзве графемы сустракаюцца амаль аднолькава часта[48]. Наданнем перавагі адной графеме перад іншай не дасягаецца пісьмова-тэхнічнага, сістэмнага паляпшэння ў карціне пісьма, таму што абедзве графемы *sīn = ś* і *ṯā’ = ṡ* у пісьмаўжыванні “літоўскіх” татараў засталіся свабоднымі варыянтамі, калі не прымаць да ўвагі апісаныя вышэй дадатковыя сферы ўжывання, якія знаходзяцца ў асобных манускрыптах. На гэтай падставе можна зрабіць выснову, што ў наданні перавагі той ці іншай графеме адлюстроўваўся індывідуальны пісьмовы стыль перапісчыка[49].

---

[46] Гл. Антонович (1968), с. 221; с. 374, заўв. 39.

[47] Гл. >>> 11.5.3.4. Змякчэнне */s/ > /s’/* у пазіцыі перад */k’/*.

[48] Гл. Антонович (1968), с. 243 і далей.

[49] Архаічнае *ṣīn = ṣ* з трыма дыякрытычнымі кропкамі знізу займае ў цэлым маргінальную пазіцыю і засноўваецца таксама на індывідуальных прэферэнцыях.

Для графем *ṭā' = t* і *tā' = t'* таксама можна канстатаваць адмысловыя сферы ўжывання. Так, напрыклад, у тэксце тэфсіра мы часта знаходзім графему *tā' = t'* у польскай звязцы *jest* (напр., *ōn jest' ktōrij stworil dla was tō cō jest' dla was w źemi* [8a8]). Але ў іншых пазіцыях гэтая графема сустракаецца надзвычай рэдка, і тады яна стаіць замест цвёрдай графемы *ṭā' = t*. Графема *tā' = t'*, верагодна, першапачаткова стаяла як рэпрэзентант змякчанага */t'/*, які ў польскай і беларускай мовах перайшоў у */c'/*. Аднак гэтае архаічнае ўжыванне можна знайсці толькі ў вельмі нязначнай колькасці манускрыптаў пачатку XVII ст.[50] Але з самага ранняга часу абедзве графемы дзейнічаюць як рэпрэзентанты цвёрдай фанемы */t/*, прычым ужыванне *tā' = t'* з цягам часу ўсё больш адцяснялася.

Абсалютную раздзяляльную лінію паміж індывідуальнымі пісьмовымі стылямі перапісчыкаў і агульнапрынятымі арфаграфічнымі правіламі правесці немагчыма. Тым не менш, на падставе розных рукапісаў вылучаецца ўсё большая уніфікацыя пісьмаўжывання. У якасці фактараў, якія прывялі да фармавання пісьмаўжавання, можна назваць наступныя: 1. Імкненне да адназначнасці ў карціне пісьма; фанема павінна рэпрэзентавацца праз адну графему. 2. Аддаецца перавага графічна больш выразнай і багатай кантрастамі графеме. 3. Функцыянальная нагрузка асобных графічных знакаў і формаў па магчымасці змяншаецца. 4. Больш рэдкія спосабы напісання ўсё больш выходзяць з ужывання.

Паралельнае ўжыванне *sīn = ś* і радзей *ṯā' = ṡ* для */s'/*, а таксама выключнае ўжыванне *ẓā' = z* для */z/* і *zay = ź* для */z'/* належыць да тыповай арфаграфіі рукапісаў "літоўскіх" татараў XIX ст. незалежна ад індывідуальных пісьмовых стыляў перапісчыкаў. Да таго ж сустракаецца ўжыванне камбінацый *alif + alif diacriticum = â, wāw + fatḥa = ô, wāw + ḍamma = ū* як тыповых спосабаў напісання галосных у XIX ст., а таксама частае выкарыстанне *'ayn = ‘* у якасці *mater lectionis* на пачатку слова.

Большасць непаслядоўнасцей існуе пры перадачы фанем */z/* і */s/*. Так, напрыклад, у тэксце тэфсіра **L** можна знайсці спосабы напісання, пры якіх вельмі часта цвёрдыя і мяккія карэляцыйныя пары */z/ – /z'/* і */s/ – /s'/* змешваюцца[51]. Астатнія зычныя, наадварот, запісваюцца ўвогуле досыць паслядоўна.

Магчымасці выбару, заснаваныя на арабскім алфавіце, ускладняюць рэгулярны правапіс у пісьмовай практыцы. Адно і тое ж слова можа з'яўляцца ў розным графічным абліччы. Але розныя спосабы напісання заўсёды рухаюцца ўнутры свабоднай прасторы, якую дае сістэма арабскага пісьма[52].

Разглядаючы ў цэлым, варта адзначыць, што ў выкарыстанні пісьма татарамі Вялікага Княства Літоўскага існуе арфаграфія, у якой надзвычай трапным чынам адлюстроўваюцца важныя асаблівасці фаналагічнай сістэмы беларус-

---

[50] Гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці.

[51] Гл. >>> 11.8. Змяшэнне */s/* з */s'/* і */z/* з */z'/*.

[52] Параўн. Антонович (1968), с. 385; Антановіч пералічвае 20 розных спосабаў напісання слова *ўнук*.

кай і польскай моў, і пры гэтым арабская пісьмовая сістэма і персідска-турэцкая пісьмовая традыцыя не парушаюцца ненарматыўнымі, неартадаксальнымі інавацыямі.

9.6. Частотнасць графем

Спосабы напісання асобных фанем альбо ўжывання асобных графем будуць тлумачыцца тут з дапамогаю колькаснага матэрыялу з трох рукапісаў. Тэкст, для якога з дапамогай кампутара вызначаныя колькасныя паказчыкі, ахоплівае пераклад другой суры Аль-Бакара, якая складаецца з васьмідзесяці старонак манускрыпта[53].

Тры манускрыпты:
(1) Тэфсір L з Беларускай бібліятэкі імя Францыска Скарыны ў Лондане, 1725 г.
(2) Тэфсір I з Інстытута ўсходазнаўства ў Санкт-Пецярбургу, канец XVIII ст.
(3) Тэфсір U з Санкт-Пецярбургскага універсітэта, 1825 г.

Тры манускрыпты могуць разглядацца як выпадкова выбраныя з агульнай масы рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага. Яны ахопліваюць перыяд у сто гадоў, пры гэтым тэфсір **I** ўзнік прыблізна пасярэдзіне паміж рукапісам **L** (1725) і рукапісам **U** (1825).

9.6.1. Спосабы напісання галосных

Камбінацыя *alif* + *alif diacriticum* = *â* ў тэфсіры **L** не ўжываецца, у тэфсіры **I** ўжываецца прыблізна ў палове выпадкаў, а ў тэфсіры **U** – амаль без выключэнняў. З другога боку, *alif* + *madda* = *ā* для напісання галоснага */a/* на пачатку слова ў тэфсіры **U** амаль не сустракаецца. Наадварот, у тэфсірах **L** і **I**, абодва XVIII ст., галосны */a/* на пачатку слова запісваецца звычайна праз *alif* + *madda* = *ā*. Выразна бачна, што спосаб напісання *alif diacriticum* = *â* не ўжываецца, бо гэта напісанне галоснага *scriptio defectiva* (табл. 9.3).

Наогул ва ўсіх трох тэфсірах, **L**, **I** і **U**, *scriptio plena* галоснага */o/* з'яўляецца правілам. *Scriptio defectiva* галоснага */o/* толькі праз *ḍamma* = *o*, напэўна, з'яўляецца пазіцыйным варыянтам, звязаным з графічным кантэкстам. Выразна праяўляецца правіла, паводле якога *scriptio defectiva* галоснага */o/* пачынае ўжывацца побач з */w/*, які запісваецца графемай *wāw* = */w/*. Пры гэтым высвятляецца, што ў пазіцыі перад */w/* аддаецца перавага *scriptio plena*, а ў пазіцыі пасля */w/* – *scriptio defectiva*. Тэфсіры **L** і **I**, абодва XVIII ст., паводзяць сябе ў дачыненні да напісання галоснага */o/* абсалютна аднолькава. Прыцягвае ўвагу толькі тое, што ў тэфсіры **I**, у параўнанні з тэфсірам **L**, у пазіцыі пасля */w/* галосны */o/*

[53] Транслітараваныя тэксты другой суры з трох манускрыптаў дадаюцца ў канцы гэтай працы ў поўным аб'ёме. Між іншым, вынікі адносна *scriptio plena* і *scriptio defectiva*, а таксама тэндэнцый развіцця, сфармуляваныя вышэй, грунтуюцца не толькі на наступных лічбах, але таксама абапіраюцца на назіранні аўтара над іншымі манускрыптамі літоўскататарскага пісьменства.

часцей запісваецца *scriptio plena* праз *wāw* + *ḍamma* = *ō*[54]. Тэфсір **U**, тыповы прадстаўнік XIX ст., наадварот, зрабіў агульным *scriptio plena* галоснага */o/* праз камбінацыю *wāw* + *fatḥa* = *ô* ва ўсіх пазіцыях, асабліва побач з */w/*[55] (табл. 9.4).

Табліца 9.3

Галосны /a/ наогул і на пачатку слова

Графема	L (1725)		I (каля 1790)		U (каля 1825)	
	n	%	*n*	%	*n*	%
a	3978	88	1925	42	50	1
â	0	-	1974	44	4571	98
á	84	2	159	4	30	1
ã	453	10	484	10	2	-
a-	72	14	7	1	4	1
â-	0	-	9	2	483	99
á-	0	-	0	-	0	-
ã-	430	86	463	97	2	-

Табліца 9.4

Галосны */o/* наогул, на пачатку, у канцы слова і ў камбінацыі з */w/*

Графема	L (1725)		I (каля 1790)		U (каля 1825)	
	n	%	*n*	%	*n*	%
ô	0	-	9	-	4924	100
ō	4328	93	4307	93	9	-
o	312	7	325	7	6	-
ô-	0	-	1	-	609	100
ō-	580	99	574	98	2	-
o-	6	1	11	2	1	-
-ô	0	-	2	-	1635	100
-ō	1237	99	1241	97	2	-
-o	11	1	37	3	1	-
wo	192	100	196	84	0	-
wō	0	-	37	16	0	-
wô	0	-	0	-	254	100
ow	41	10	34	9	1	-
ōw	371	90	357	91	0	-
ôw	0	-	1	-	423	100

[54] У гэтым праяўляецца тэндэнцыя развіцця, што ўсталявалася ў літоўскататарскім пісьменстве, згодна з якой *scriptio plena* паступова распаўсюджвалася.

[55] Гэтыя вынікі супярэчаць Антановічу (Антонович (1968), с. 301 і далей), які спрабуе карэляваць дыстрыбуцыю *scriptio plena* і *scriptio defectiva* галоснага */o/* з націскам і пры гэтым не прыходзіць да пераканаўчых высноў. Антановіч дае суадносіны *scriptio plena* і *scriptio defectiva* галоснага */o/* як 91 да 9%, што супадае з лічбамі, вызначанымі тут на падставе тэфсіраў.

У параўнанні з галосным /o/ галосны /u/, калі яго разглядаць наогул, ва ўсіх трох тэфсірах, **L**, **I** і **U**, значна радзей пішацца *scriptio plena*. Зноў можна канстатаваць, што тэфсіры **L** і **I** пры спосабах напісання галоснага /u/ паводзяць сябе аднолькава. У тэфсіры **U** ў параўнанні з двума іншымі рукапісамі, **L** і **I**, значна больш ужыванняў *scriptio plena* /u/, што асабліва выразна бачна на пачатку слова.

Звяртае ўвагу тое, што тэфсір **I**, у якім галосны /u/ ў канцы слова амаль у палове выпадкаў пішацца з адным толькі *ḍamma* = *u*, значна адстае ў гэтым ад іншых манускрыптаў: **L** і **U**.

Аналагічна галоснаму /o/ пры галосным /u/ побач з /w/ выяўляецца моцная тэндэнцыя да *scriptio defectiva*. Пры гэтым зноў пацвярджаецца правіла, паводле якога галосны ў пазіцыі перад /w/ пішацца праз *wāw* + *ḍamma* = *ū*, а ў пазіцыі пасля /w/ – *scriptio defectiva* толькі праз *ḍamma* = *u*. Тэфсір **U** парушае гэтае правіла, як можна было вызначыць ужо пры спосабах напісання галоснага /o/, і галосны /u/ ў ім пішацца *scriptio plena* незалежна ад яго пазіцыі перад /w/ альбо пасля яго.

Тое, што для галоснага /u/ значна слабей выяўляецца тэндэнцыя да *scriptio plena*, чым для галоснага /o/, грунтуецца на тым факце, што пры *scriptio plena* і *scriptio defectiva* галоснага /u/ больш вырашальным фактарам з'яўляецца націск слова.

З тэксту трох тэфсіраў, **L**, **I** і **U**, прымаючы да ўвагі націск на перадапошні склад, можна ўстанавіць наступныя працэнтныя лічбы (табл. 9.5).

Табліца 9.5

Галосны /u/ наогул, на пачатку слова, у канцы слова і ў камбінацыі з /w/

Графемы	L (1725)		I (каля 1790)		U (каля 1825)	
	n	%	*n*	%	*n*	%
ū	934	78	913	74	1263	88
u	269	22	315	26	170	12
ū-	162	78	195	92	227	100
u-	46	22	18	8	1	-
-ū	282	67	225	53	376	86
-u	140	33	199	47	62	14
ūw	29	78	33	92	53	100
uw	8	22	3	8	0	-
wū	1	12	2	20	14	93
wu	7	88	8	80	1	7

Асаблівую ўвагу прыцягвае тое, што дыстрыбуцыя *scriptio plena* і *scriptio defectiva* галоснага /u/ адносна націску ва ўсіх трох тэфсірах амаль аднолькавая.

Scriptio plena праз *wāw* + *ḍamma* = *ū* аднолькава сустракаецца як у націскной, так і ў ненаціскной пазіцыі. Пры гэтым прыкметна тое, што *scriptio plena* ў ненаціскной пазіцыі нават мае невялікую перавагу.

У ненаціскной пазіцыі ва ўсіх рукапісах цалкам дамінуе *scriptio defectiva* праз *ḍamma* = *u*. Наадварот, *scriptio defectiva* галоснага /*u*/ ў націскной пазіцыі распаўсюджана зусім нязначна.

Працэнтная лічба, вызначаная на падставе трох рукапісаў тэфсіра, **L**, **I** і **U**, супадае з вынікамі Антановіча (1968), якія для параўнання прыводзяцца ў табліцы 9.6[56].

Табліца 9.6

Галосны /*u*/ ў націскной і ненаціскной пазіцыі

Графема	L (1725)		I (каля 1790)		U (каля 1825)		Антановіч[57]	
	націск	%	націск	%	націск	%	націск	%
ū	+	44	+	46	+	46	+	49
	-	56	-	54	-	54	-	51
u	+	8	+	4	+	4	+	25
	-	92	-	96	-	96	-	75

Scriptio defectiva галоснага /*i, y*/ праз *kasra* = *i* даволі стабільна выяўляецца ва ўсіх рукапісах прыблізна ў 90 %, як у цэлым, так і ў пазіцыі на пачатку слова. Адзін тэфсір **U** ў гэтай пазіцыі амаль цалкам аддае перавагу *scriptio defectiva*. Гэта звязана, як ужо згадвалася, з мінімальнай функцыянальнай нагрузкай знака *kasra* = *i* ў пісьмовай сістэме "літоўскіх" татараў. Вартую ўвагі частату *scriptio plena* праз *yā'* + *kasra* = *ī* альбо *yā'* + *alif subscriptum* = *î* можна назіраць ва ўсіх манускрыптах у канцы слова. Графема *yā'* мае ў гэтай пазіцыі асаблівую графічную форму і з-за гэтага з'яўляецца прыдатнай для пазначэння канца слова.

Таксама пры *scriptio plena* галоснага /*i, y*/ ўступае ў сілу закон, які аналагічна можна было заўважыць ужо пры спосабах напісання галосных /*o*/ і /*u*/: побач з /*j*/, які пішацца праз графему *yā'* = *j*, ва ўсіх рукапісах сістэматычна пазбягаюць *scriptio plena* праз *yā'* + *kasra* = *ī* альбо *yā'* + *alif subscriptum* = *î* для ўнікнення частага ўжывання графемы *yā'* (табл. 9.7).

Насавы галосны *ą* пазначаны праз *ṣagır-ı-nūn* у рукапісе L (1725) 375 разоў, у рукапісе **I** (1790) – 313, у рукапісе U (1825) – 13.

Лічбы адлюстроўваюць ступень дэназалізацыі *o* насавога ў канцы слова. У тэфсіры **L** маркіроўка насавога *o* праз *ṣagır-ı-nūn* = *ñ* альбо *-ą* з'яўляецца правi-

---

[56] Гл. Антонович (1968), с. 313: «Отметим еще, что знак ʼ[ḍamma] в ударном положении находим реже, чем в безударном. Это относится ко всем без исключения рукописям в отдельности и к итоговым данным, которые, как видно из таблицы, выражаются цифрами 118 и 362. Знак ﻭٗ [wāw + ḍamma] в количественном отношении одинаково употребляется в ударном и безударном положении /238 и 243/. В заключение нам важно отметить, что никаких заметных различий в обозначении ударного и безударного /u/ в памятниках 17–18 вв., с одной стороны, и 19–20 вв., с другой, не наблюдается».

[57] Гл. Антонович (1968), с. 312.

лам, а дэназалізаваныя спосабы напісання без *ṣagır-ı-nūn* мінімальныя. Наадварот, у рукапісе **U** дэназалізаваны спосаб напісання без *ṣagır-ı-nūn* = *ñ* альбо *-ą* значна дамінуе. Рукапіс **U** з'яўляецца тыповым прадстаўніком XIX ст. і паказвае разам з дэназалізацыяй таксама іншыя асаблівасці моцнага беларускага ўплыву, напр. сістэматычнае падваенне групы гукаў *n'j* > *nn* у аддзеяслоўных назоўніках.

Табліца 9.7

Галосны /i, y/ наогул, на пачатку слова, у канцы слова і ў камбінацыі з /j/

Графема	L (1725)		I (каля 1790)		U (каля 1825)	
	n	%	*n*	%	*n*	%
ī	592	11	399	7	135	2
î	0	-	211	4	698	13
i	5046	89	5002	89	4817	85
ī-	93	10	93	10	3	-
î-	0	-	1	-	13	2
i-	797	90	844	90	873	98
-ī	474	19	257	10	73	3
-î	0	-	210	8	565	20
-i	2064	81	2130	82	2103	77
j̄ī	0	-	0	-	1	-
j̄î	0	-	0	-	0	-
j̄i	199	100	159	100	241	100
ī̱j	2	-	0	-	0	-
î̱j	0	-	0	-	1	-
i̱j	347	100	309	100	127	100

9.6.2. Спосабы напісання зычных

Лічбы, вызначаныя на падставе тэфсіраў **L**, **I** і **U**, для спосабу напісання цвёрдага /z/ пацвярджаюць, што ў рукапісах "літоўскіх" татараў пісьменства можна прынцыпова канстатаваць: у XIX ст. графема *ḍād* = *z* выйшла з ужытку і была выцесненая выразнай графемай *ẓā'* = *ẓ*[58]. Падставы для гэтага маюць графічна-сістэмны характар, як будзе сказана ніжэй.

Абодва спосабы напісання, *zāy* = *ź* і *d̲āl* = *ż*, ніколі не канкурыравалі, таму што яны графічна вельмі падобныя. Пры беглым напісанні абедзве літары кепска адрозніваюцца. Лічбы даказваюць, што графема *d̲āl* = *ż* у пісьмаўжыванні "літоўскіх" татараў заўсёды адыгрывала толькі вельмі маргінальную ролю (гл. табл. 9.8).

Графема *ṣīn* = *ṣ*, разгледжаная ў цэлым, у пісьмаўжыванні "літоўскіх" татараў заўсёды адыгрывала падпарадкаваную ролю[59]. *Ṣīn* = *ṣ* з'яўляецца толькі вары-

[58] Параўн. Антонович (1968), с. 374, заўв. 39: «Во второй половине 19 в. абсолютное большинство писцов твердый звук /z/ обозначает буквой ظ [*ẓā'* = *ẓ*], буква же ض [*ḍād* = *ḍ*] совсем исчезает [...]».

[59] Гл. Антонович (1968), с. 246 і наст.

Табліца 9.8

Спосабы напісання зычных

Графема	L (1725)		I (ca. 1790)		U (ca. 1825)	
	n	%	*n*	%	*n*	%
z	692	97	620	90	16	2
ẓ	19	3	69	10	698	98
ź	202	100	204	100	185	100
ż	2	-	2	-	2	-
ś	305	36	569	66	544	68
ṡ	514	61	298	34	259	32
ṣ	22	3	0	-	0	-
t	1684	91	1811	96	1830	96
t'	172	9	73	4	77	4

янтам графемы *sīn* = *ś* з трыма дыякрытычнымі кропкамі знізу, ужыванне якой залежыць ад індывідуальнага пісьмовага стылю асобных перапісчыкаў.

Як можна ўбачыць з лічбаў, тэфсіры **I** і **U** пры спосабе напісання палатальнага /*s'*/ паводзяць сябе аднолькава, аднак адрозніваюцца ад рукапісу **L**. Лічбы, здаецца, паказваюць некаторае развіццё, пры якім графема *sīn* = *ś* усё больш перамагае графему *ṯā'* = *ṡ*, пакуль канчаткова не выцясняе яе. Гэтае ўражанне ўводзіць у зман, бо абедзве графемы, *sīn* = *ś* і *ṯā'* = *ṡ*, ва ўсіх рукапісах ужываюцца паралельна. З графічна-сістэмнага пункту гледжання перавагай той ці іншай графемы істотнае сістэмнае паляпшэнне ў карціне пісьма не дасягаецца. Выбар гэтай графемы з'яўляецца выражэннем асабістага пісьмовага стылю перапісчыка. Таму графема *ṯā'* = *ṡ* можа ўпарта трымацца ў тыповых спосабах напісання некаторых марфем (напр., у канчатках *-ość*, *-śmy*, *-ście*) (гл. табл. 9.8).

Ва ўсіх трох рукапісах, **L**, **I** і **U**, спосаб напісання цвёрдай фанемы /*t*/ праз графему *tā'* = *t'* адыгрывае падпарадкаваную ролю. Ва ўсіх трох тэфсірах спосабы напісання праз *tā'* = *t'* звязаныя з пэўнымі словамі альбо словаформамі; напр. арабізмамі: *ajjet*[60], *tewrit*[61], *ziekiat*[62], *tekbir*[63]. У гэтых выпадках ужыванне графемы *tā'* = *t'* адпавядае этымалагічнаму спосабу напісання. Побач з гэтым у рукапісе **L** звязка *jest* прыблізна ў 80 % выпадкаў пішацца таксама праз *tā'* = *t'*. У тэфсірах **I** і **U**, акрамя арабізмаў і звязкі *jest*, праз *tā'* = *t'* часта пішуцца іншыя славянскія словы, напр. *tylko* (гл. табл. 9.8).

---

[60] Ар. *āya* = знак, цуд, верш Карана.

[61] Ар. *tawrā* = Тора.

[62] Ар. *zakā* = міласціна.

[63] Ар. *takbīr* = малітоўная формула "*Allāhu akbar*" (Алаг вялікі).

10. ВАКАЛІЗМ РУКАПІСУ

10.1. Польская сістэма галосных

У XVI ст. польская літаратурная мова ўключала 11 наступных галосных: */i, y, e, é, a, á, o, ó, u, ę, ą*/[1].

Пры гэтым закрытыя галосныя (*samogłoski pochylone*) */é, á, ó/* ў канцы XV ст. узніклі з доўгіх галосных, што існавалі раней. Старапольская вакальная сістэма рэгулявалася квантытатыўнай апазіцыяй. Галосныя кожны раз выступалі ў пары доўгай і кароткай апазіцыі: *ī:i, ē:e, ā:a, ō:o, ū:u.* Гэтая сістэма сфармавалася ў старапольскай мове ў ходзе яе развіцця, і пры гэтым доўгія галосныя: 1) былі атрыманыя ў спадчыну ад праславянскай мовы; 2) паходзяць з падаўжэння галоснага пры выпадзенні суседняга гука пры скасаванні стараславянскіх рэдукаваных галосных альбо 3) узніклі са сцяжэння групы галосных, раздзеленай */j/*. Сістэма квантытатыўных апазіцый трымалася ў польскай мове да другой паловы XV ст. Пасля гэтага яна перайшла ў сістэму якаснай апазіцыі. Доўгія галосныя пры гэтым альбо супалі ў сваёй артыкуляцыі з адпаведнымі кароткімі, як галосныя */ī/* і */ū/*, альбо яны збліжаліся ў афарбоўцы гучання з іншымі галоснымі: */ē/ > /é/ > /i/*; */a/ > /á/ > /o/*; альбо */o/ > /ó/ > /u/*. У XVI ст. у літаратурнай мове артыкуляцыя закрытага */é/* знаходзіцца паміж */e/* і */i/*, закрытага */á/* – паміж */a/* і */o/*, а */ó/* – паміж */o/* і */u/*. У далейшым развіцці літаратурнай мовы на працягу XVII–XVIII стст. закрытыя галосныя */é, á, ó/* пасля большменш доўгага перыяду няўстойлівай артыкуляцыі сталі падобнымі да суседніх галосных. Закрыты */á/* ўжо ў XVII ст. супаў з галосным */a/*. Закрыты */o/* ў XVIII ст. канчаткова стаў падобны да галоснага */u/*. У артыкуляцыі закрытага */e/* ваганні (*/é/ > /i/* альбо */ é/ > /e/*) часткова захаваліся ажно да канца XIX ст.[2]

Запазычаныя з праславянскай мовы насавыя галосныя */ę/* і */ǫ/*, якія ў старапольскай мове выступалі спачатку і як доўгія, і як кароткія, збліжаліся на працягу старапольскага перыяду ў сваёй афарбоўцы гучання. У далейшым пярэдні кароткі насавы галосны */ę/* якасна супаў з заднім кароткім насавым галосным */ǫ/*. Такім жа чынам сышліся ў якасці пярэдні і задні доўгія насавыя галосныя. Тым самым у XV ст. у польскай мове існаваў адзін насавы галосны з артыкуляцыяй паміж */ę/* і */ǫ/* ў двух колькасных варыянтах. Са знікненнем квантытатыўнасці ў польскай вакальнай сістэме ў канцы XV ст. колькасць перайшла ў якасць

---

[1] Гл. Stieber (1973), p. 96. Наконт пытання аб фанемным характары */y/* пануюць розныя думкі, ад абмеркавання якіх тут належыць адмовіцца. У далейшым разглядзе */y/* трактуецца як фанема.

[2] Кароткі агляд развіцця закрытых галосных знаходзіцца, напр., у Струтынскага (Strutyński (1993), p. 56–58). Апрача таго, можна ўказаць на апісанне развіцця доўгіх галосных і іх кантынуантаў у гістарычных граматыках польскай мовы.

таксама і ў насавых галосных. З кароткіх старапольскіх насавых пайшоў пярэдні насавы галосны /ę/, у той час як доўгі старапольскі насавы перайшоў у задні насавы галосны /ą/. У XVII–XVIII стст. яшчэ сустракаліся ваганні і выраўноўванні па аналогіі ў сістэме насавых галосных[3].

Ужо ў XVI–XVII стст. распаўсюджваецца расчапленне артыкуляцыі насавых галосных у сярэдзіне слова: */ę/ > /en/, /ą/ > /on/.* Сінхроннае вымаўленне насавых галосных захавалася перш за ўсё ў пазіцыі перад */s, s', š, z, z', ž/.* У XVII ст. дэназалізацыя абодвух насавых у пазіцыі перад */ł, l/* сустракаецца ўжо рэгулярна: *ęł, l > eł, l* альбо *ął, l > oł, l.* Акрамя таго, насавы *e* падлягаў дэназалізацыі таксама ў канцы слова: */-ę/ > /-e/*; наадварот, насавы *o* */-ą/* у канцы слова захоўваецца[4].

10.2. Беларуская сістэма галосных

Сістэма галосных беларускай мовы ў XVI ст. была некалькі прасцейшай, чым у польскай мове. Беларуская мова не ведала закрытых галосных, якія сустракаліся ў польскай мове. Насавыя галосныя ў беларускім інвентары галосных XVI ст. таксама ўжо не сустракаліся. Ужо ў ранняй фазе развіцця яны ператварыліся ў ненасавыя галосныя, як наогул ва ўсходнеславянскіх мовах[5]. Інвентар беларускіх галосных у XVI ст. змяшчаў шэсць наступных галосных: */i,* [*y*], *e, a, o, u/*; ён ужо меў пры гэтым сённяшні склад[6].

Сістэма беларускіх галосных можа быць падзеленая, у адрозненне ад польскай вакальнай сістэмы, на дзве падсістэмы, якія карэлююцца націскам: у націскной пазіцыі сустракаецца ўвесь склад галосных: */i,* [*y*], *e, a, o, u/*. У ненацiскной пазіцыі, наадварот, ужываецца склад, скарочаны на два галосныя: */i,* [*y*], (*e*), *a,* (*o*), *u/*. Галосныя */o/* і */e/* падлягаюць аканню = (ненаціск.) */o, e/ > /a/* (у пераднаціскным і паслянаціскным складзе); і яканню = (ненаціск.) */'e/ > /'a/* (толькі ў першым пераднаціскным складзе)[7].

У беларускай мове рэдукцыя ненаціскных галосных у астатнім мае не такія вялікія наступствы, як у рускай. Ненаціскныя галосныя вымаўляюцца карацей,

---

[3] Гл. Strutyński (1993), p. 58–60.

[4] Гл. Stieber (1973), p. 102, § 76; Klemensiewicz (1965), t. 2, p. 93: "Na podstawie analizy rękopiśmiennych zapisek sądowych oraz rymów przybliżonych można przypuszczać, że już w drugiej połowie XVI w. Wielkopolska ma stan właściwy naszym czasom: rozszczepienie przed innymi niż szczelinowe i spółotwarte oraz odnosowienie ę w wygłosie".

[5] Як правіла, змяняліся пярэдні насавы *ę > (')a*; а задні *ǫ > u;* гл., напр., Wexler (1977), p. 104–106.

[6] Гл. Wexler (1977), p. 178. Пра статус у беларускай мове галоснага */y/*, які з XII ст. функцыяне ўжо не як фанема, а як алафон */i/* [*y*] гл. Wexler (1977), p. 128.

[7] У беларускай дыялекталогіі праводзіцца адрозненне паміж рознымі тыпамі акання і яканння: моцнае, асіміляцыйнае, дысіміляцыйнае аканне/яканне. Дэталёвае абмеркаванне гэтых розных тыпаў знаходзіцца ў Векслера (Wexler (1977), p. 78–84; 146–149); гл. таксама Rott-Żebrowski (1992), p. 69. Наконт акання ў сучаснай літаратурнай мове гл. Кривицкий (1990), с. 26–27.

чым галосныя пад націскам, аднак гэта, у адрозненне ад рускай мовы, не прыводзіць да змен у якасці і афарбоўцы гучання галосных[8].

10.3. Напластаванне абедзвюх сістэм

У Вялікім Княстве Літоўскім сістэма галосных польскай літаратурнай мовы знаходзілася пад уплывам беларускага субстрату. На базе беларускай мовы з яе істотна прасцейшым у параўнанні з польскай мовай складам галосных і фактарамі акання і якання, а таксама рэдукцыяй яна значна змянілася. З аднаго боку, у польскай мове тыя тэндэнцыі развіцця, якія ўжо існавалі, узмацніліся альбо яны пайшлі ў іншым накірунку. Як самае важнае ўздзеянне беларускага субстрату на польскую сістэму галосных можна было б прывесці наступнае.

Паскорылася элімінацыя закрытых галосных, г.зн. супадзенне іх з суседнімі галоснымі фанемамі. Найхутчэй элімінаваў закрыты */á/*, і, адпаведна, яго артыкуляцыя супала з артыкуляцыяй */a/*[9]. У закрытым */é/* выяўляюцца дзве супрацьлеглыя тэндэнцыі. Артыкуляцыя */é/ > /e/* пераважае ў літаратурнай мове. Артыкуляцыя */é/ > /i/*, аднак, упарта трымаецца як у літаратурнай мове, так і ў польскай мове раёнаў з усходнеславянскім субстратам. Артыкуляцыя */é/ > /i/* выступала ў пазіцыі перад */r/* і */j/*(канцавым), а таксама была згрупавана ў абмежаванай колькасці лексем[10]. Для закрытага */ó/* праяўляюцца дзве супярэчлі-

---

[8] Гэта з'яўляецца нормай у сучаснай літаратурнай мове. Аднак рэдукцыя ненаціскнога */a/*, самага частага галоснага ў ненаціскным стане, сустракаецца ў дыялектах. Наконт рэдукцыі ў беларускай мове гл.: Кривицкий (1990), с. 55–56; а таксама Mayo (1976), p. 8 "There is some divergence of opinion among Byelorussian scholars on this point. Я.М. Камароўскі (Беларускі правапіс, Мінск, 1965, с. 60–61 and Беларуская мова. Арфаграфія, Мінск, 1972, с. 27–28) states that vowel reduction takes place".

[9] Гл. Kurzowa (1993), p. 66: "W tekstach AWK nie ma ani jednego wypadku zastępowania á przez o, natomiast é = i, y, o = u zdarza się niejednokrotnie. Fakty te potwierdzają dotychczasowe opinie, że Polacy kresowi nie znali á. Przypomnieć można za S. Urbańczykiem świadectwo gramatyki Kazimierza Malickiego z 1699 r., stwierdzającego, że w oznaczaniu á Polacy popełniają liczne błędy i nie powinni się go uczyć od Litwinów, którzy tego á nie umieją wcale wymawiać". Смалінска, якая даследавала тэксты з паўночных крэсаў мяжы XVII–XVIII стст., таксама заўважае адсутнасць закрытага */á/* (Smolińska (1983), p. 33).

[10] Дакладны шлях развіцця закрытага /e/ не зусім ясны (гл. Stieber (1973), p. 98, § 72). Клемянсевіч заўважае: "Trzeba przyjąć, że u schyłku doby średniopolskiej dawne é utożsamiło się albo z e albo z y,i i oba sposoby wymawiania były w obiegu. Drugi wariant trafił się rzadziej, miał charakter raczej regionalny, był uwarunkowany fonetycznie, np. w wygłosowej grupie -ej, i tradycyjną obecnością w niektórych tylko wyrazach, których liczba z czasem coraz bardziej się kurczy. Wydaje się też, że taka wymowa é jak y,i uchodziła za gminną, mniej staranną. Zaważyło to na jej losach w dobie nowopolskiej, która zapewniła w języku ogólnym wyłączność jednemu fonemowi e" (Klemensiewicz (1965), t. 2, p. 88).

Развіццё закрытага */é/* у Літве, відавочна, адбывалася паралельна польскай літаратурнай мове. Артыкуляцыя */é/ > /i/* побач з */é/ > /e/* была даволі распаўсюджанай, перш за ўсё ў тыповых фанетычных пазіцыях перад */j, r/* (гл. Kurzowa (1993), p. 67–68). Параўн. Smolińska (1983),

выя тэндэнцыі. Артыкуляцыя */ó/ > /u/*, якая панавала ў польскай літаратурнай мове ўжо ў XVII–XVIII стст., не мела поспеху ў Літве, бо там дзякуючы беларускаму субстрату перамагла артыкуляцыя */ó/ > /o/*[11].

З прычыны адсутнасці насавых галосных у беларускай мове ў */ę, ą/* падмацоўваліся і паскараліся тэндэнцыі, якія ўжо існавалі ў польскай літаратурнай мове: 1) расчапленне артыкуляцыі */ę/ > /en/* і */ą/ > /on/* у сярэдзіне слова, а таксама 2) дэназалізацыя не толькі *-e* насавога ў канцы слова */-ę/ > /-e/*, але і *-o* насавога */-ą/ > /-o/*. Можна разглядаць як інтэрферэнцыю з беларускай мовай дэназалізацыю ў сярэдзіне слова альбо перадачу польскіх слоў з адпаведнымі беларускімі ненасавымі галоснымі замест насавых. Іншай характэрнай рысай польскай мовы на беларускім субстраце з'яўляецца змяшэнне пярэдніх і задніх галосных[12].

Беларускае аканне пераносілася на польскую мову, так што сістэма галосных, скарочаная на тры закрытыя галосныя, як у беларускай мове, падзялялася на дзве субсістэмы: у націскной пазіцыі сустракаецца поўны склад галосных */i, y, e, a, o, u/*, тады як у ненаціскной пазіцыі часта (але неабавязкова і нерэгулярна) абедзве галосныя */o/* і */e/* пераходзяць у */a/*; тым самым у ненаціскной пазіцыі знаходзіцца скарочаны склад галосных */i, y,* (*e*), *a,* (*o*), *u*/[13].

р. 31–33; яна канстатуе ў даследаваным ёю матэрыяле з мяжы XVII–XVIII стст. толькі нязначнае распаўсюджванне артыкуляцыі */é/ > /i/*, што можа быць звязана з высокім узроўнем адукацыі даследаваных ёю аўтараў.

[11] Гл. Kurzowa (1993), p. 74–75: "Ludność ruska Wielkiego Księstwa Litewskiego polonizując się i przejmując język polski, nie miała poczucia historycznie ustalonych w polszczyźnie alternacji o || ó, musiała więc jakby uczyć się rozkładu samogłosek o - ó w poszczególnych wyrazach i w ich formach [...] Tak więc na przykładzie tekstów AWK oraz pamiętników i diariuszy Poczobuta i Sapiehy możemy uchwycić na żywo dwie sprzeczne czy też krzyżujące się tendencje: idącą od białoruszczyzny ó -> o oraz oddziałującą ze strony polskiego języka ogólnego ó -> u. Ponieważ obie one są stale żywe na skutek ciągłego dwustronnego kontaktu dialektu północnokresowego z językiem białoruskim i polskim językiem literackim, stan wahań o || ó (u) utrzymuje się jako wciąż żywa cecha tego dialektu".

Параўн. Smolińska (1983), p. 26–33. Артыкуляцыя */ó/ > /u/* падтрымлівалася ўкраінскай, але не беларускай мовай; гл. Stieber (1973), p. 144.

[12] Змяшэнне насавых галосных было распаўсюджана яшчэ ў XVII–XVII стст. у агульнапольскай мове, як заўважае Курцова: "Oboczność ta, zupełnie szczątkowa w dzisiejszym języku polskim, była żywa w tematach fleksyjnych i słowotwórczych jeszcze w XVIII w., choć jak stwierdza I. Bajerowa (I, s. 63) i cytowany przez nią S. Westfal, w tym właśnie stuleciu widać powolne zmiany polegające na zamieraniu archaicznych postaci z nosówką i szerzeniu się form analogicznych" (Kurzowa (1993), p. 89). Ваганні ў насавых галосных не маглі адбывацца з-за беларускага субстрату альбо з прычыны знаходжання Вялікага Княства на перыферыі польскай моўнай тэрыторыі. (Параўн. Smolińska (1983), p. 41, 60.)

[13] Гл. Smolińska (1983), p. 61: "Tak więc zasób fonemów samogłoskowych układałby się następująco: w pozycji akcentowej: i, y, e, a, o, u oraz warianty kombinatoryczne ę, ą; w pozycji nieakcentowanej: i, y, /e/, a, /o/, u oraz warianty kombinatoryczne ę, ą". (Знакам // у дадзенай цытаце пазначаюцца факультатыўныя фанемы.)

Няўпэўненасць, абумоўленая беларускім аканнем, вяла беларусаў, якія размаўлялі па-польску, да гіперкарэктных формаў у дачыненні да якасці ненаціскных галосных */e, o, a/*. Але гэтая няўпэўненасць магла таксама прывесці да таго, што нават пад націскам галосныя */e, o, a/* часта змешваліся[14].

Акрамя таго, беларус, які размаўляе па-польску, паказвае няўпэўненасць пры чаргаваннях, якія ўзніклі з-за працэсаў перагаласоўкі і падаўжэння галоснага пры выпадзенні суседняга гука ў сферы закрытых і насавых галосных.

Як асаблівасць пісьмовай сістэмы "літоўскіх" татараў на абліччa тэксту ўплывае *scriptio defectiva* */a/* праз *fatḥa* = *e*, што бачна ў транслітарацыі. Пры гэтым належыць адрозніваць чыста тэхнічнае выкарыстанне на пісьме камбінацыі цвёрдай графемы *qaf* = *k* з *fatḥa* = *e* ад ужывання знака *fatḥa* = *e* для *scriptio defectiva* галоснага */a/* ў іншых пазіцыях.

Камбінацыю *qāf* + *fatḥa* = *ke* можна заўсёды патлумачыць як */ka/* альбо */kę/*. Па-іншаму выглядае справа ў выпадках, у якіх галосны */a/* запісваецца незалежна ад графемы *qāf* = *k* толькі з дапамогаю *fatḥa* = *e*. Хаця такія *scriptiones defectivae* галоснага */a/* сустракаюцца ва ўсіх пазіцыях, але больш за ўсё іх у ненаціскных складах. У гэтым знаходзіцца моцны доказ таго, што з дапамогай *fatḥa* = *e* павінна была перадавацца рэдукцыя */a/* ў ненаціскной пазіцыі, зразумела, не будучы сфармуляваным арфаграфічным правілам[15].

Такім чынам, за знакам *fatḥa* = *e* могуць хавацца некалькі галосных: */e/* ва ўсіх пазіцыях, ненаціскны */a/*, а таксама ненаціскны галосны */o/*, які пад уплывам акання змяніўся ў */a/*. У канцы слова за знакам *fatḥa* хаваецца таксама дэназалізаванае польскае *e* насавое.

10.4. Закрытыя галосныя

У арфаграфіі польскай літаратурнай мовы закрытыя галосныя, як правіла, пісаліся праз "крэскаваныя" літары *á, é* і *ó*; таму сапраўдная артыкуляцыя хаваецца за арфаграфіяй[16]. Спосабы напісання, якія рабілі зразумелым пераход закрытых галосных у суседнія чыстыя галосныя гукі, */á/* > */o/*; */é/* > */i/*, */y/* і */ó/* > */u/*, рэдка з'яўляюцца ў старадруках, але сустракаюцца ў манускрыптах.

---

[14] Гл. напр., Łapicz (1986), p. 154.

[15] Гл. Антонович (1968), с. 283: "И в других известных нам рукописях звук /'а/ в безударном положении, как правило, обозначаецца фатхой, то есть тем знаком, который употребляется для обозначения звука /е/ в ударном и безударном положении […]". Гл. таксама с. 285: "Фатха употребляется и для обозначения безударных звуков /а/ и /о/ после твердых согласных".

[16] "Крэскаваныя" літары для галосных *é* і *ó* (= *é, ó* kreskowane) ужываліся звычайна для закрытых галосных *é* альбо *ó*, у той час як закрыты галосны */á/* перадаваўся "некрэскаванай" *a*, а "крэскаваная" *á* (*á* kreskowane) пазначала чысты галосны */a/*. Ужо ў XVII ст. у друкаваных выданнях адбывалася хаатычнае змяшэнне спосабаў напісання *á* і *a*, што можна патлумачыць як адзнаку хуткага знікнення дыферэнцыйнай артыкуляцыі закрытага */á/* і яснага */a/*.

У алфавіце "літоўскіх" татараў ясна паказваецца пераход у артыкуляцыі закрытых галосных. На месцы закрытага галоснага */á/* знаходзіцца адзін са спосабаў напісання галоснага */o/ <ō, o, ô>*, для закрытага галоснага */é/* адзін са спосабаў напісання галоснага */i/ <ī, i, í, î>*, а для закрытага галоснага */ó/* – адзін са спосабаў напісання галоснага */u/ <ū, u>*. Пры гэтым на падставе рукапісаў, у якіх графічна не адрозніваюцца */o/* і */u/*, пра артыкуляцыю закрытага */ó/* сказаць нічога немагчыма.

10.4.1. Закрыты */á/*

Рэфлексы закрытага */á/ > /o/*[17] у тэфсіры **L** рэгулярна сустракаюцца ў шэрагу лексем. У некаторых прыкладах характэрнай з'яўляецца пазіцыя закрытага */á/* перад плаўнымі і насавымі:

bálwan (боства) *ne-lajca bōlwanōw jich pūblične* (109b6), *i ješčō mōwą ōtō te ōbrazi bōlwani pričinci naši ū bōga* (161b3), *nemaš ōprōč bōga ōd bōlwanōw prijaźni* (172a6), *či-trimali za bōgi ōprōč-negō bōlwani* (257b4), *rekl ibrahīm zapewne wī trimace śe i trimališce ōprōč bōga bōlwani ōbrazi* (321b7). Аднак побач з гэтым знаходзіцца таксама *bálwan* без рэфлекса */á/ > /o/*: *činil bōgū rōwnimi balwani ōbrazi ābi zwedli lūdzej z-drōgī jegō* (200b3).

bráma (брама): *mōwiliśmi jim idzce w brame jeriche i ōddajce w brōme pōklōn* (79a7), *k'edī biśmi ōtworili na nich wrōta i brōmī nebeśk'e* (203a8), *pretō zabije-śe medzi nimi ścana i w tej ścene brōma pōtajemna* (442a7).

dáktylowy (фінікавы): *ōd tich watrōw pōschli ī pōgineli wlaśne jakōbi pōschli pni dōktilōwe i pōčernali* (466a8).

fundátor (фундатар): *ābō činice rōwnimi tich k'afirōw*[18] *cō karmą i būdūją chaǧijōw*[19] *i fūndōtōrōw k'e'bejśk'ich*[20] (146b2); але: *ūpadli te fūndatōrōwe is-tim meśǧidem*[21] *w ōgen pek'elnij* (157a5).

okłámanie (падман): *priwodzili gō dō bed dō ōklōmana* (470b2).

Высвятляецца, што ў тэксце тэфсіра **L** існуюць сляды закрытага */á/*, хаця на падставе беларускага субстрату тэарэтычна мяркуецца элімінацыя закрытага */á/* з вакальнай сістэмы польскай мовы на карысць артыкуляцыі */á/ > /a/*.

10.4.2. Закрыты галосны */é/*

У закрытым */é/* выяўляюцца дзве артыкуляцыі: */é/ > /e/* і */é/ > /i/*. Пры гэтым зусім выразна дамінуе артыкуляцыя */é/ > /e/*. Рэфлекс */é/ > /i/* асабліва праяўляецца

---

[17] Параўн. Kurzowa (1993), p. 66.

[18] Ар. *kāfir* = нявернік.

[19] Ар. *ḥaǧǧī* = той, хто здзейсніў паломніцтва (ар. *ḥaǧǧ*) у Мекку.

[20] Ар. *ka'ba* = Кааба.

[21] Ар. *masǧid* = мячэць.

ў тыповых кантэкстах перад */j/* у канцы слова і перад */r/*, але і перад назальнымі (гл. >>> 10.7.3.), а таксама ў шэрагу тыповых для гэтага лексем і каранёў[22].

Часта паралельныя формы знаходзяцца пры *niemasz* (няма); звычайнай формай з'яўляецца *niemasz*: *ã zaś kogō zwedze pan bōg nemaš t'emū ōd direktorew nikōgō* (377b3), *chcelibi ōnī żebi wišli z-ōgna pek'elnegō i nemaš jim wijśca s-tamtōnd* (88a1). Але побач з гэтым таксама выяўляецца пераход */é/ > /i/*: *korãn jenzik'em 'erabśk'im*[23] *zeslali że w nim nimaš na'uk'i kriwej* (378a1).

Акрамя таго, тыповай лексемай, у якой мае месца пераход */é/ > /i/*, ёсць назоўнік *pieniądze* (грошы): *naleźli penōndze swoje wrōcōne dō nich rekli aj ōjča naš ne-jesteśmi neprijacela ōtō pinōndze naše wrōcili-śe dō nas* (187a6), *pōslali jednegō ź nich s-pinondzmī ōtō dō tegō masta* (232a2). Характэрным у абодвух прыведзеных прыкладах з'яўляецца знаходжанне звужанага */é/* ў пазіцыі перад насавым.

Дзеясловы *rozlewać* (разліваць) і *polewać* (паліваць) звычайна з'яўляюцца з рэфлексам */é/ > /i/*: *rōzliwac bendze krew* (8b3); *że-śce ne-meli rōźliwac krew wašą* (13b2), *ne pōliwala pašnī* (12a5). Гэтае вымаўленне з */é/ > /i/* адназначна падтрымліваецца адпаведнымі беларускімі лексемамі *адліваць, пралiваць, выліваць, ліць*.

Асабліва часта можна назіраць пераход */é/ > /i, y/* ў канчатках прыметнікаў жаночага роду ў родным, давальным і месным склонах адзіночнага ліку[24]. Паралельна звычайнаму канчатку *-ej* часта з'яўляецца канчатак *-ij* (< *-éj*), які можа пераходзіць у */i, y/* пры адсутнасці */-j/* у канцы слова[25]: *i dirigūje kōgō chce dō drōgī prawdziwij* (162b5), *kōžda dūša skōštūje śmerci gōrk'ī* (258b2), *żebi was ōdwrōcil ōd chwali bōžži i ōd nemaźu*[26] (95a6).

Часам пераход */é/ > /i/* можна назіраць таксама перад */-j/* у сярэдзіне слова: *zijdōn-śe* (12b6), *ōdijscū* (14b4), *ōdimūją* (36a2) (= odejmują)[27].

Гукаспалучэнне */ir, yr/* (< **ir, *yr*, складаўтваральны **r̥*) у агульнапольскай мове ў канцы XVI ст. змянілася ў */er/*. Пры гэтым на прамежкавай ступені яно спачатку перайшло ў закрыты */é/*: */ir, yr/ > /ér/, /er/*[28]. Гукаспалучэнне */ir, yr/* замест */er/* належыць разглядаць альбо як працяг архаічнага стану, альбо як рэфлекс */ér/ > /ir/*.

---

[22] Пра закрыты */é/* ў польскім дыялекце паўночных крэсаў гл. Kurzowa (1993), p. 66–68.

[23] Ар. *'arab* = арабы.

[24] Параўн. >>> 14.1.11. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду; 14.1.12. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду; 14.1.15. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[25] Можна казаць таксама пра магчымае захаванне старога канчатка *-e*, які пераходзіць у закрыты */é/*, а далей у */i, y/*; гл. >>> 14.1.11. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[26] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[27] Магчыма, гэта можна патлумачыць інтэрферэнцыяй з беларускімі словаформамі.

[28] Гл. Kuraszkiewicz (1981), p. 64: "Сфера паводзін звужанага é ў польскай мове распаўсюджвалася на спалучэнні ir, irz, yr, yrz, напр., cirń, wirzba, wycirać, syr, cztyrzy вымаўляліся з é і з XV ст. запісваліся праз e: cierń, wierzba, ser, czterzy".

Параўн. Stieber (1973), p. 85: "One thinks of the following explanation: in forms of the type śmirć, sirce, etc., i broadened in the southwest while quantity still existed. Since i was here short, it broadened

У тэфсіры **L** у шэрагу лексем і каранёў звычайна можна назіраць спалучэнне гукаў */ir, yr/* замест */er/*. Самыя частыя лексемы – гэта *czterdzieści* (сорак), *cztery* (чатыры), *obierać* (абіраць), *obierka* (шалупінне), *odbierać* (адбіраць), *opierać* (абапіраць), *pasterz* (пастыр), *przymierze* (саюз), *rozpościerać* (распасціраць), *sierota* (сірата), *szczery* (шчыры), *umierać* (паміраць), *zabierać* (забіраць), *zacierać* (заціраць), *zbierać* (збіраць), *zwierzchność* (верхавенства). Гучанне */ir, yr/* у прыведзеных лексемах абапіраецца, зразумела, на адпаведныя беларускія карані і лексемы: *чатыры, адбіраць, выбіраць, збіраць, сірата, шчыры, паміраць* і г.д.[29]

Прыклады: *čtirdześce* (10a5), *čtiri* (29b8) (31b3) (35b6), *ōbira* (16a8), *ōbirkōw* (36b6), *ōdbira* (37b7), *ōdbirac* (30a7) (30a8), *ōdbirajce* (38a5), *ōdbiral* (13a7), *ōdbirali* (14a5) (30a7), *pastira* (22b8), *pōwodirem* (18a3), *primira* (25a8) (25b1) (25b6), *rōspōścira* (32b8), *ščire* (14b7) (19b4) (24b6) (32a7) (36a8), *śirōt* (28a5), *śirōtach* (29a2), *śirōtam* (13a8) (23b3), *umirają* (31b2) (32a8), *umirajce* (19a1), *ūmirajōnc* (18b8), *zabirali* (33a3), *zacirace* (13b6), *zacirajōncij* (20a5) *zbirami* (35b3), *źwirchnōśc* (39b6), *w tich čtirech lit'erech zawira śe calij korān* (116b7), *bendōn-śe zapirac i preklinac* (209b2), *rekl mūśá*[30] *ōtō tō laska cō śe ōpiram na ną i ōną ōbijam liśce na 'ōwečk'i mōje* (248a2)[31]. Цалкам звычайнымі з'яўляюцца паралельныя формы ў блізкім кантэксце: *wźōnleś primera ōd nich pōtim zlamali primira i priśengi swoje* (142a7).

Лексемы, якія амаль ніколі не паказваюць рэфлекс */ér/ > /ir/* – гэта, напр., *śmierć* (смерць), *szeroki* (шырокі), *pierś* (грудзі), а таксама ўсе дэрываты ад *cierpieć* (цярпець): *čemū-ž ne-žōndace sōbe śmerci* (14b8), *šerōk'e fūndamentī majestatū jegô' ōgarneli nebōsa i źemi* (34b6), *pretō nadchneliśmi duchem našim dō matk'ī mōjžešōwi że pōkarmi perścami mūśu*[32] (310b3), *karmili inše matk'ī perścami dzatk'ī waši* (31a8), *jakō wicerpą ōni na tim ōgnū pek'elnim* (23a7), *pewne bōg jest' zawše z-cerpliwimi* (21a6), *wlej na nas witriwalōśc cerpliwośc* (34a1).

Некалькі запазычаных слоў з этымалагічнай групай */ir/* вагаюцца ў сваім абліччы. Лацінізм *dyrekcyja* і яго дэрываты паказваюць, напр., паралельныя

---

into the nearest short phoneme, i.e. into short e, which, as we know, was to yield open e after the loss of quantity. But at the time when i underwent broadening in the other forms, quantity – as the manuscripts show, – no longer existed. Now the broader phoneme nearest to i was é; the fact that in other cases, it reflected the former long ē constituted no great obstacle at that time. Thus, at the beginning of the fifteenth century, such forms arose as v'eřx < v'iřx, etc. In the north ir was generally broadened after the loss of quantity; such forms are thus prevalent there as p'yrśi, śm'yrć, etc. This also explains why CS antevocalic ir, when it was undergoing broadening in sixteenth-century P (OP zbirać > MoP zbierać, etc., cf. above), always passed into ér and not er". Параўн. Klemensiewicz (1965a), p. 70.

[29] Параўн. Kurzowa (1993), p. 223.

[30] Ар. *Mūsā* = Майсей.

[31] Параўн. з прыкладамі, прыведзенымі ў Курцовай (Kurzowa (1993), p. 67).

[32] Ар. *Mūsā* = Майсей.

формы са змяненнем /ir/ >/er / і без яго: *prijdze wam direkcija prez piśma lūb prez prōrōk'i* (254b7), *derekciją* (6a2), *i dirigūje kōgō chce dō drōgī prawdziwij* (162b4), *pan bōg ne-derigūje na dōbrą ōšūkaninī*[33] *zdrajcōw* (186a5). Сустракаюцца таксама паралельныя формы ў арабізме *fir'awn* (фараон) і ўтвораным яд яго прыметніку: *fir'ūnew* (8a2), *fera'unew* (10a4), *feranōwich* (10a2). Аднак заўсёды ў сваёй першапачатковай форме спалучэнне гукаў /ir/ з'яўляецца ў арабізме *kāfir* (нявернік) і вытворных ад яго: *ne-bendą jemū newernikami tilkō lōtrowe židzī k'afirę* (15a6), *ōdwrōcili was pō prijencū īmanū*[34] *wašegō kū warī k'afirśk'ij* (16b1). Наадварот, у этымалагічнай групе /er/, напр. у лацінізме *wiersz* (верш), як правіла, сустракаецца рэфлекс /ér/ > /ir/: *wi śpewajce pešni wirši* (392b4), *ōni mōwą na ce že ti jest wiršownik* (430b5).

10.4.3. Закрыты /ó/

На падставе рукапісаў **L** і **I** немагчыма зрабіць выснову пра якасць закрытага /ó/, бо галосныя /o/ і /u/ графічна не адрозніваюцца: абодва пішуцца альбо *scriptio defectiva* праз *ḍamma* = *u*, *o*, альбо *scriptio plena* праз камбінацыю *wāw* + *ḍamma* = *ū*, *ō*[35].

У рукапісе **U** паміж абодвума галоснымі, /o/ і /u/, графічна праводзіцца адрозненне, прычым для /o/ ўжываецца адмысловая камбінацыя *wāw* + *fatḥa* = *ô*. Як рэфлекс закрытага /ó/ ў рукапісе **U** выяўляюцца абедзве артыкуляцыі, /ó/ > /o/, /ó/ > /u/, прычым мацней прадстаўлена супадзенне /ó/ з /o/.

Суадносіны /o/ : /u/ як рэфлексу закрытага /ó/ ў тэксце суры "Аль-Бакара"[36] ў рукапісе **U** паказваюць наступную карціну:

Лексемы: *bóg* 91 : 83; *córka* 0 : 1; *dowód* 4 : 0; *główszczyzna* 1 : 1; *góra* 3 : 3; *król* / *królestwo* 13 : 1; *który* 126 : 0; *mój* 3 : 1; *mówić* 50 : 13; *napój* 1 : 0; *naprzód* 3 : 0; *ogórek* 0 : 1; *ogród* 2 : 0; *oprócz* 5 : 0; *płód* 1 : 0; *podróżny* 3 : 0; *powtórnie* 2 : 0; *pójść* 4 : 3; *póki* 5 : 0; *próbować* 2 : 0; *próżny* 2 : 0; *rozwód* 7 : 0; *równy* 5 : 0; *spór* 1 : 0; *śród* 3 : 0; *twój* 2 : 1; *ubóstwo* 2 : 0; *włóczyć* 1 : 0; *wół* 1 : 0; *wprzód* 1 : 0; *(na-; od-; po-; przy-) wrócić* 2 : 33; *wschód* 3 : 0; *zabójca* 2 : 2; *zabójstwo* 3 : 0; *zachód* 2 : 0; *znów* 3 : 1; *źródło* 1 : 0; *żółty* 0 : 1.

Словаформы і канчаткі: *bój* / *bójcie się* 20 : 0; *dwóch* / *dwóma* 0 : 6; *módł się* 3 : 0; *mógł* 1 : 0; *nieprzyjaciół* (род. скл. мн. л.) 1 : 0; *(pod-; z-) niósł* 4 : 0; *wód* (род. скл. мн. л.) 0 : 1; *-ów* (род. скл. мн. л.) 115 : 0.

---

[33] Польск. *oszukanina* з'яўляецца аўгментатыўным утварэннем з суфіксам *-ina*. Параўн. Budziszewska (1994), p. 101.

[34] Ар. *īmān* = вера.

[35] У рукапісах, якія графічна не адрозніваюць /o/ і /u/, у пазіцыі, дзе можна чакаць закрытае /ó/, ужывалася транслітарацыя *o*, *ō*, таму што ў польскай мове Літвы з яе беларускім субстратам пануе артыкуляцыя /ó/ > /o/.

[36] Ар. *al-baqara* = "Карова" – назва 2-й суры. Гэты тэкст ахоплівае каля 80 старонак манускрыпта. Наконт рукапісу **U** гл. >>> 17.3. Рукапіс тэфсіра **U**.

У сукупнасці: 504 (o) : 152 (u).

Суадносіны паміж абедзвюма артыкуляцыямі, */ó/ > /o/*, */ó/ > /u/*, можна паказаць у цэлым як 77 % (o) да 23 % (u). Пры гэтым большая частка артыкуляцыі */ó/ > /o/* належыць адноснаму займенніку *którzy* і канчатку множнага ліку роднага склону *-ów*, якія сустракаюцца вельмі часта. Некаторыя лексемы паказваюць выразную тэндэнцыю да дамінавання: */ó/ > /o/* ў дзеяслове *mówić*. Артыкуляцыю */ó/ > /u/* ў гэтым слове можна знайсці толькі ў імператыве *mów*. Наадварот, дзеяслоў *wrócić* і яго дэрываты паказваюць галоўным чынам рэфлекс */ó/ > /u/* і толькі як выключэнне – */ó/ > /o/*. Назоўнік *bóg* паказвае роўнае размеркаванне з лёгкай перавагай */ó/ > /o/*. Нязначнае дамінаванне рэфлексу */ó/ > /o/* з'яўляецца тыповым для большасці лексем, якія паказваюць няўстойлівую артыкуляцыю.

10.5. Насавыя галосныя

10.5.1. Насавыя галосныя ў сярэдзіне слова

Расчапленне артыкуляцыі насавых у сярэдзіне слова першапачаткова было асаблівасцю вялікапольскага дыялекту і адтуль распаўсюдзілася на літаратурную мову. Гэтая артыкуляцыя падыходзіла таму, для каго роднай мовай была беларуская, і каму насавыя галосныя былі невядомыя. На беларускім субстраце тэндэнцыя да расчэпленай артыкуляцыі ў сярэдзіне слова яшчэ большая, чым у польскай мове, бо яна ахоплівае таксама насавыя галосныя ў пазіцыі перад */s, s', š, z, z', ž/*, у якіх у польскай мове пануе сінхронная артыкуляцыя[37].

Спосаб напісання насавых галосных у іх расчэпленай артыкуляцыі, */ą/ > /on/* і */ę/ > /en/*, са знакамі галосных *<o, ō, ô, e>* і *nūn = n* у сярэдзіне слова з'яўляецца звычайным спосабам перадачы насавых. Дэназалізаныя спосабы напісання, пры якіх не ўжываецца *nūn = n*, а пазначаецца толькі галосны, сустракаюцца рэдка. Пры гэтым часам можна назіраць пранікненне беларускіх рэфлексіўных галосных замест польскіх насавых: *ǫ > u* і *ę > (ʼ)a*.

---

[37] Гл. Kurzowa (1993), p. 82: "W dialekcie północnokresowym, jak można wnosić z przytoczonych wyżej przykładów, tendencja do wymowy samogłosek nosowych jako połączeń eń, oń ma szerszy niż w języku ogólnopolskim zakres, gdy ogarnie nawet pozycje przed spółgłoskami szczelinowymi. Podobna realizacja samogłosek nosowych jako en, on nawet przed S cechuje dialekt południowokresowy. / Przyczyny tego wynikają z kontaktu polszczyzny kresowej z językami ruskimi. Nie znająca bowiem samogłosek nosowych ruskojęzyczna ludność Wielkiego Księstwa Litewskiego, musiała niejako uczyć się wymowy polskich samogłosek ę, ǫ. Przyswajała je podstawiając samogłoski własnego systemu w miejsce odpowiednych "trudnych" głosek języka przyswajanego. I tak w miejsce ogólnopolskiego ę podstawiała znane białoruszczyźnie e+N, w miejsce ogólnopolskiego ǫ połączenia o+N. Było to zgodne z wymową ogólnopolską, gdy e, o + N występowało przed spółgłoską zwartą i zwartoszczelinową, natomiast niezgodne przed spółgłoskami szczelinowymi, gdzie polszczyzna wymawia samogłoski nosowe wokalicznie".

Наогул насавыя пішуцца ў расчэпленым спосабе напісання як у сярэдзіне слова, так і перад суфіксальным зваротным займеннікам *się*, а часам і перад энклітычнымі асабовымі займеннікамі.

Прыклады расчэпленай артыкуляцыі /ę/ > /en/ і /ą/ > /on/ у сярэдзіне слова ў розных фанетычных кантэкстах: *dzewčente* (10a3), *ōkrentach* (22a3), *blendnimi* (26b2), *pōčōntk'em* (9b2), *žōndac* (18b5), *meśenčnej* (29b1), *spōlenčnik'i* (15a2), *celenca* (14b6), *dzešencina* (23b4), *pamenci* (16a4), *gōrōncij* (36b4), *meśōnc* (24b1), *menka* (6b3), *renkōma* (13a1), *wenkšij* (28b8), *rōnk* (25b7), *pōwścōngną* (25b3).

Як у сярэдзіне слова, так і перад суфіксальным зваротным займеннікам *się* насавыя пішуцца ў расчэпленай артыкуляцыі /ę/ > /en/ і /ą/ > /on/: *ã k'edi prišedl dō rōzūmū rekl čistij chwalebnij tī bōžže kajen-śe tōbe i ja-m jest peršij werōncij* (129b6), *bōže mōj jestem-neščenśliwij i zapewne bōjen-śe sinōwcōw mōjich* (240b6), *slūžą i klanajōn-śe ōprōč bōga ōbrazōm balwanōm* (213b6), *pōdnōšōn-śe w picha na źemi bez prawdi ã chōc widzeli wšitk'e cūdō ź neba idōnc jūž ne ūwerą* (130a3).

Папярэдні /k/ не змякчаецца галосным /e/, які паходзіць з расчэпленай артыкуляцыі *e* насавога. У камбінацыі /kę/ > /ken/ звычайна ўжываецца цвёрдая графема *qāf* = *k* для напісання цвёрдага /k/. А для змякчанага /k'/ заўсёды пішацца графема *kāf* = *k'*. Можна параўнаць *kędy* і *kiedy* ў наступных двух прыкладах: *pōtim zejdzece tą drōgą kendī šlī lūdze* (26b3), *rūc laska twōją ã k'edi rūcil ōbačil że śe rūša i chōdzi wlaśne jakō k'edī wenž ābō smōk* (303a4).

Перад білабіяльнымі /p, b/ побач з расчапленнем артыкуляцыі /ę/ > /en/ і /ą/ > /on/ адбываецца яшчэ асіміляцыя /n/ > /m/, якая можа адлюстроўвацца альбо не адлюстроўвацца ў напісанні: *wistenpūjce* (30b5), *wistempūjce* (30b1), *wistempek* (39a2), *pewne ci ktōre trimają za bōga cele prendkō prijdze jim srōge kerene ōd bōga īch i pōhanbene znak žoltij na gembe īch* (131a1), *čemū wī īdzece i prestempūjece*[38] *dō mōnžčiznī činōnc grech sōdōmśk'ij* (300a4), *ōdstōnpili* (13b1), *pristōnpi* (30b1), *skompstwa* (36b8), *stōmpi* (34a1), *wistōmpce* (9a6), *wistōmpice* (11a5).

Перад /l, ł/ у дзеясловах прошлага часу дамінуе, як правіла, дэназалізаваны спосаб напісання, які адпавядае дэназалізаванай артыкуляцыі польскай літаратурнай мовы. Але таксама рэгулярна сустракаюцца спосабы напісання з *nūn* = *n*: *dōtknelō* (28a3), *mineli* (7b1), *ī ōbačiš ānjōlōw ōgarneli ōkōlici 'eršu*[39] *majstatū bōžžegō wšisci chwalą chwalą*[40] *bōga* (382a7), *ã k'edi blisnela swjátlōśc pânska na gōri ūčinila-śa jak ōlōw rōstōpila-śa i splinela i padl mōjžeš i splinōl na dōl beẓ pamenci* (129b5), *āž k'edī wźenla źemjá k'wját* (162b1), *ī prōrōče nech-ne-frasūją*

---

[38] Маецца на ўвазе *przystępować*; змяшэнне прэфіксаў *przy-* і *prze-* з'яўляецца тыповай асаблівасцю польскай мовы крэсаў.

[39] Ар. *'arš* = трон.

[40] Тут мае месца не дыплаграфія (памылковы паўтор [*заўв. перакл.*]), а *figura etymologica*, з дзеяслоўнай формай 3-й ас. мн. л. цяп. ч. у камбінацыі з назоўнікам у творным склоне.

te ktōre ṣpešajōn-śe w newernōśc s-tich ktōre mōwili iman[41] *prijenli ūsti našimi* (88a7), *mōjžeš pōčōl ōd negō ūcekac* (303a5), *ōgarnōl* (7a6), *prijōl* (10b1), *ščisnōl* (18a2), *wźōl* (10b2), *zaklōl* (14a4), *wźōnleś primera ōd nich pō tim zlamali primira i priśengi swoje* (142a7), *k'edī prišli pōsli naši dō lūta*[42] *zafrasōwal-śe ōnim lūt prōrōk a ścisnōlō-śe*[43] *serce jegō frasūnk'em i strachem* (422b5).

Як і перад */l, ł/*, насавы галосны дэназалізуецца таксама ў дзеепрыметніку прошлага часу перад */w/*: *i blisk'im stal jeden drūgegō scisnowši-śe*[44] *jeden na drūgim dla prislūchana čitanja muchemmedowegō* (472a3).

У пазіцыі перад */s, s', š, z, z', ž/* у польскай літаратурнай мове захоўваецца сінхронная артыкуляцыя абодвух насавых: */ę, ą/*. У тэфсіры **L** у арабскім пісьме ў гэтых пазіцыях галосныя звычайна пішуцца расчэплена праз галосную графему + *nūn* = *n*. Некалькі прыкладаў: *mensō* (23a2), *čenśc* (14a3) (20b4) (26b7), *ščenśce* (33a6) *trenśene* (28a3), *cenšk'imi* (29a4), *wenźene* (13b6) *cenžaru* (39b3), *cenžka* (9b6), *menža* (30b2), *nedōlenžnōśc* (26a1), *ōcenžil* (39b2), *zwicenžili* (34a1), *čōnstk'i* (15b7), *źwonskū* (31b7), *źwonzek* (32a5), *mōnž* (38b4).

Часам пры насавых галосных */ę, ą/* у пазіцыі перад */s, s', š, z, z', ž/* звяртае ўвагу асаблівы спосаб напісання, які хаця вельмі рэдка сустракаецца, аднак можа тлумачыцца як спроба пазначыць сінхронную артыкуляцыю насавых */ę, ą/* на пісьме. Пры расчэпленым спосабе напісання насавых у сярэдзіне слова замест графемы *nūn* = *n* ужываецца графема *sagır-ı-nūn* = *ñ*, якая звычайна абазначае *о* насавы ў канцы слова. Некалькі такіх спосабаў напісання сустракаюцца, напр., у назоўніку *mąż* (муж): *i zawolają ōbiwatele bendōnc w a'rafe*[45] *meñžōwe uznawši īch pō čarnōści twari jich* (121a5), *jeśli bendze z-was dwadześce meñžōw menžnich cerpliwich* (143a3), *ā ne-jest' tak mōñž jakō newjesta* (43a6).

Такія спосабы напісання *sagır-ı-nūn* = *ñ* у сярэдзіне слова часам сустракаюцца перад іншымі зычнымі-несібілянтамі, напр., *pewne ci ktōre zradliwe ōdstą-pili*[46] *[z] was w dzen pōtkane wojsk našich i k'afirśk'ich*[47] (54b4). Нават у пазіцыі перад */ł/*, у якой правілам з'ўляецца дэназалізаваная артыкуляцыя,

---

[41] Ар. *īmān* = вера.

[42] Ар. *Lūṭ* = Лот.

[43] Змяшэнне двух насавых галосных */ę/* і */ą/* сустракаецца адносна часта і з'яўляецца характэрнай рысай польскай мовы крэсаў (параўн. ніжэй >>> 10.5.4. Змяшэнне насавых галосных). Гэтую дзеяслоўную форму на падставе арабскага пісьма можна таксама прачытаць з беларускім */u/*.

[44] Таксама ў гэтым прыкладзе дзеяслоўную форму можна хутчэй чытаць па-беларуску. Параўн. Kurzowa (1993), p. 80; гл. таксама ніжэй >>> 10.5.6. Дэназалізаваныя спосабы напісання.

[45] Ар. *a'rāf* = назва 7-й суры – Аль-Араф. Дадзены тэкст паходзіць з **Q**(7:48).

[46] Перапісчык напісаў тут графему *sagır-ı-nūn* = *ñ* у яе канцавой форме, такім чынам ён перапыніў росчырк і рэшту слова *-pili* напісаў асобна.

[47] Ар. *kāfir* = нявернік.

часам ужываецца спосаб напісання *sagır-ı-nūn = ñ*: *pretō priją-l ōd nich pan bōg īch prōźbi* (58b7). Такія (гіперкарэктныя) спосабы напісання паказваюць на тое, што перапісчык стараўся пісаць па-польску.

10.5.2. Насавы *e* ў канцы слова

Наогул ва ўсіх даследаваных рукапісах тэфсіра, **L**, **I** і **U**, насавы *e* ў канцы слова пішацца дэналізавана */-ę/ > /-e/* праз адзін толькі знак *fatḥa = e*: *wedz że ōstatna gōdzina sōndna ma prijšc jegō čas ne ōznajmuje taje dla zaplacena kōždej dūši za tō cō zarōbila* (247b7), *rekl mōjžeš pane daj-mi še widzec nech wejzre na ce rek pân bōg ne-mōžeš widzec mne* (129b4), *stworil nebōsa i źeme i spuścil ź neba wode žebi wprōwadzil tim z ōwocōw pōžitek wam* (200b7).

Зваротны займеннік *się* наогул з'яўляецца ў дэназалізаванай форме *sie*: *ōtō š pewne prijdze i źjawi-še na was ōd bōga wašegō kerane* (123b1). Зваротны займеннік ёсць таксама ў дэназалізаванай форме перад суфіксальным энклітычным займеннікам: *ne-ma-şe-gō tikac* (5a1).

Насавы *e*, дэназалізаваны ў канцы слова */-ę/ > /-e/*, ніколі не змякчае папярэдняга */k/*. Ён звычайна пішацца праз цвёрдую графему *qāf = k*: *rekl mōjžeš zapewne ja pōddajen-še w ōpeke i w ōbrōne bōga* (385a1).

Дэназалізаваны */-ę/ > /-e/* ў канцы слова можа дадаткова падлягаць аканню[48] – */-ę/ > /-e/ > /-a/*[49]: *ne-prijma ja* (18a3), *ne-benda* (7b5), *prikezūje wam że-biśce zarzneli krōwa albō wolū* (11b7), *pisali t'ewrīt*[50] *kśenga renkōma swajimi* (13a1), *za cena malą* (13a2).

10.5.3. Насавы *o* ў канцы слова

Насавы *o* ў канцы слова, як правіла, пазначаецца асаблівым чынам – персідска-турэцкай графемай *sagır-ı-nūn = ñ*. У рукапісах **L** і **I** */-ǫ/* ў канцы слова даволі рэгулярна пішацца праз *sagır-ı-nūn = n*. Некалькі прыкладаў: *bendą* (11b6), *chōdzą* (22a3), *derekciją* (6a2), *drōgą* (5b4), *mōją* (9b1), *mōwą* (6b7), *ōfarūją* (6a4), *pōfalšūją* (9a8), *prijdą* (6b7), *rōzumeją* (37a8), *są* (21b7), *tōbą* (6a4), *twarą* (20a6), *ūwerą* (19b1), *welką* (23b8), *wicerpą* (23a7).

Побач з гэтым сустракаецца *o* насавы ў канцы слова ў дэназалізаваным спосабе напісання. Тады адпаведна прапускаецца *sagır-ı-nūn* і паказваецца толькі галосны */o/*, у асобных выпадках */a/*. Дэназалізаваны спосаб напісання, аднак, больш рэдкі ў параўнанні са спосабам напісання з *sagır-ı-nūn*. Некалькі прыкладаў: *bendō* (24a1) (24a2), *drōgō* (5b4), *jakō* (25a5), *sedekūjo* (28a5), *skritō* (5a1), *k'edi še spelnō terminī* (31b3), *ūpadnō* (7a6), *žadnō* (18a1), *žōnō* (15b5), *ī prōrōče wojūj newernikōw šablō* (461a4).

---

[48] Гл. >>> 10.9.4. Аканне */e/ > /a/* пасля націску.

[49] Параўн. Антонович (1968), с. 344.

[50] Ар. *tawrā* = Тора.

У рукапісе **U** ў канцы слова наогул мае месца дэназалізаваны спосаб напісання насавога *o* без *sagır-ı-nūn* = *ñ*; у арабскім пісьме замест насавога *o* ўсюды пішацца галосны *o* праз камбінацыю *wāw* + *fatḥa* = *ô*. У канцы слова насавы *o* зрэдку сустракаецца ў расчэпленым спосабе напісання з графемай *nūn* = *n*, так як гэта звычайна адбываецца ў сярэдзіне слова.

У польскай мове Літвы ў назоўніках жаночага роду сустракаецца ўжыванне прыметнікавага акузатыўнага канчатка *-ą* замест канчатка *-ę* пасля мяккіх і цвёрдых асноў[51]. Канчатак *-ą* пры мяккай аснове добра вядомы са старадрукаў, так, як у тэфсіры: *rekną chwala panū bōgū ktōrij sprawdzil dekleracijąswoją* (382a5). Тыповым для тэфсіраў з'яўляецца перанос гэтага канчатка таксама на цвёрдую аснову: *zapewne pristōji nam prowadzic was na dōbrą drōgą* (490b7). Пры дэназалізаваным спосабе напісання гэтага канчатка вінавальнага склону *-ą* > *-ō, -o* на пісьме выяўляецца двухсэнсоўнасць у тых самых рукапісах, у якіх графічна не адрозніваюцца */o/* і */u/*: канчатак можа інтэрпрэтавацца як *-o* альбо па-беларуску як *-u*: *k'edi wizwolilišmi gō i ṣemjū*[52] *jehō wšitk'ich* (368b3). У дадзеным кантэксце беларусізм *sjam'ja* чытаўся з беларускім канчаткам *-u*, тым больш што прыналежны займеннік *jeho* надаваў усёй фразе беларускую афарбоўку. Інакш выглядае справа ў наступных прыкладах, дзе польскі назоўнік *łalska* сустракаецца з дэназалізаваным канчаткам вінавальнага склону *-ą* > *-o*: *ześle pan bōg laskō swoją świętą na prōrōke* (149a7), *rekl pan bōg ī 'īśá sīn merjemin*[53] *wspōmni laskō mōją* (97b3)[54].

Надзвычай рэдка ў тэфсіры **L** сустракаецца расчэплены спосаб напісання насавога *o* праз знак галоснага + *nūn* = *n* у канцы слова: *prinōsōn ją ānijōlōwe* (33b2), *takōwe lūdze sōn ōnī newernikami w newernōści* (78b8)[55].

Спарадычна ў манускрыпце тэфсіра адлюстроўваецца артыкуляцыя *o* насавога ў канцы слова */-ą/* > */-om/*, якая паходзіць з вялікапольскага дыялекту. Пры гэтым у арабскім пісьме замест графемы *sagır-ı-nūn* = *ñ* з'яўляецца графема *mīm* = *m*. Вялікапольская артыкуляцыя */-ą/* > */-om/* пранікае ў суседнія дыялекты і часткова нават ў літаратурную мову[56].

---

[51] Параўн. >>> 12.3.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[52] Адсутнічае яканне.

[53] Ар. *'Īsā ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[54] Для параўнання цікава глянуць на рукапіс **U**. У рукапісе **U** графема *sagır-ı-nūn* = *ñ* не ўжываецца. Акрамя таго, у рукапісе графічна не адрозніваюцца галосныя */o/* і */u/*. Насавы *o* ў канцы слова наогул пішацца дэназалізавана; звычайным з'яўляецца напісанне галоснага */o/* замест канцавога */-ą/*. Некалькі прыкладаў: *bendô'* U(6a3), *chôdzô'* U(5b1), *ẓ-dôbrôścô'* U(23b8) і г.д. Канчатак вінавальнага склону *-ą* з'яўляецца ў дэназалізаваным выглядзе як *-o*: *ô' detnô' ôd nich kônwersâcijô' i milôśc* U(20a6).

[55] Такія спосабы напісання параўнальна часта ўжываюцца ў рукапісе **I**.

[56] Гл. Kuraszkiewicz (1953), p. 53: "Dowodem wpływu wielkopolskiej wymowy nosówek na sąsiednie gwary małopolskie aż do Krakowa jest również obecny zasięg wymowy typu *oni idom s*

У рукапісе **L** адносна часта паказваецца змена */-ą/ > /-om/*: *ã jeślī nedūži bendōm wam žebi-še bili z-wami i pōšlą dō was prōšic pōkōjū* (71a8), *tedī nimaš grechū ōbōjim jim že še zgōdzą medzi sōbōm zgōdą* (76a6), *bili prōrōkami ješčō pred tōbōm* (381a5), *ōtō ten korān jest widōmij priklad lūdzōm i priwodcōm drōgi prawdziwej i laską bōžą dla lūdzej werōncich we-n* (409b6), *ã ten cō nawrōci-še twarōm swoją* (334b2), *ābim ne-bil karanij menkōm dnjá welk'egō* (376b1), *ālbō ktō jest tworcōm nebōs i źemī* (307a8), *znōwu ce ōženami ź newestōm* (343b2), *gdzekōlwek najdōm-še lapaj jich* (346b5).

Звычайна гэты канчатак з'яўляецца нават з аканнем: *pewne ja tworcam jest člōweka s-sūchej glinī z-čarnej i z-rōznich kōlōrōw ōdmennich* (204a5)[57].

10.5.4. Змяшэнне насавых галосных

У сярэдняпольскі перыяд (пачатак XVI – сярэдзіна XVIII ст.) у сферы якасці насавых галосных, якія з пачатку XVI ст. страцілі квантытатыўнасць, пачынаюцца ваганні і выраўноўванні па аналогіі ўнутры парадыгмаў і груп аднакаранёвых слоў. На працягу XVIII ст. стабілізаваліся характэрныя чаргаванні ў парадыгмах і дэрыватах. Архаічныя формы знікалі на карысць новых формаў, што ўзніклі на падставе аналогіі[58].

Месцазнаходжанне Вялікага Княства Літоўскага на перыферыі польскага моўнага арэала спрыяла запаволенаму развіццю і падаўжэнню нестабільнасці ў сферы насавых галосных. Побач з гэтым архаічныя формы таксама маглі трымацца значна даўжэй, чым у агульнапольскай мове.

Да таго ж нявызначанасць у дыстрыбуцыі насавых */ę/* і */ą/* у парадыгмах і дэрыватах у групах аднакаранёвых слоў абумоўліваў беларускі субстрат. Чаргаванні паміж */ę/* і */ą/* у розных формах, якія ўзыходзілі, напрыклад, да такіх працэсаў, як перагаласоўка альбо падаўжэнне галоснага пры выпадзенні суседняга гука, на субстраце беларускай мовы, якой былі чужыя гэтыя працэсы

---

tobom, czyli -om zamiast końcowego -ą. Wymowa taka powstać mogła na drodze fonetycznej, tj. we wszystkich kategoriach gramatycznych, w 3 pl. praes. i w instr. sg., tylko w gwarach o rozwiniętej już uprzednio rozszczepionej, wielkopolskiej wymowie samogłosek nosowych".

[57] Назоўнік *twórca* (творца) скланяецца паводле мадэлі імёнаў жаночага роду. Творны склон адзіночнага ліку правільна было б утвараць з канчаткам *-ą*: *twórcą*. Альбо належыць прыняць для назоўніка *twórca* змену ў тыпе скланення, альбо гэты канчатак трэба тлумачыць як вялікапольскую змену */-ą/ > /-om/*, на якую дадаткова напластоўваецца беларускае аканне; пры гэтым адначасова дзейнічае тэндэнцыя да марфалагічнай інтэрферэнцыі з беларускай мовай, якая з'яўляецца моцнай менавіта ў сферы творнага склону мужчынскага роду. На гэтым апошнім прыкладзе выразна паказваецца лінгвістычная складанасць, з якой мы сутыкаемся ў тэфсіры. У сферы марфалогіі часта маюць месца парушэнні, пераходы і змяшэнні паміж асобнымі дакладна вызначанымі класамі і дыстрыбуцыямі ў стандартнай мове, абумоўленыя фаналагічнымі працэсамі і лінгвістычнымі інтэрферэнцыямі. Параўн. >>> 13. Змена роду.

[58] Гл. Klemensiewicz (1965), t. 2, p. 93; гл. Mazur (1993), p. 216.

і чаргаванні, сталі крыніцай памылак[59]. Пры гэтым польская літаратурная мова заўсёды ўздзейнічала як фактар, які рэгулюе і нарміруе; уздзеянне яго, аднак, залежала ад ступені адукаванасці носьбіта.

10.5.4.1. Архаічныя гучанні

У польскай мове паўночных крэсаў архаічнае гучанне шматлікіх слоў трымалася даўжэй, чым у агульнапольскай мове, як гэта вызначылі, напр., Курцова (1993) і іншыя даследчыкі польскай мовы крэсаў. Таксама ў тэфсіры сустракаюцца асновы слоў, у якіх насавыя галосныя выступаюць у сваёй архаічнай якасці. Так, напр., *ciężyć, obciążyć* || *obciążać* (абцяжарваць) рэгулярна з'яўляюцца ў архаічных формах: *ōcenžac* (31a5), *ōcenžaj* (39b4), *ōcenži* (39a5), *ōcenžil* (39b2), *ōcenžilbi-śe* (29a4). Такім самым чынам у назоўніку *świętobliwość* || *świątobliwość* (святасць) паказваецца архаічнае гучанне з насавым *ę* замест */ą/*, якое несумненна падтрымліваецца іншымі словамі ад таго самага кораня, такімі як *święty, świętość, świętować, poświęcić* і г.д.: *dla <u>św</u>entabliwości šerengi sprawujōnc gazejōw*[60] *w šereng* (363b8), *rekl zwodzicel dla <u>św</u>entōbliwości swojej pōzwolilem zwodzic jich wšitk'ich* (374b2), *dla <u>św</u>entōbliwōšci lechk'egō serce mōjegō korān zeslanij ōd laskawegō milōserdnegō bōga* (390a8). У дзеяслове *powściągnąć się* (стрымацца) выяўляюцца паралельныя формы са старым і сучасным гучаннем насавых галосных, прычым сучасныя формы дамінуюць: *pōwścengne-śe* (37b6), *pōwścōngną śe* (25b3), *pōwşcōngnece-śe* (25b4).

10.5.4.2. Варыянты назоўніка "*wątpliwość*" (сумненне)

Назоўнік "*wątpliwość*" (сумненне) сустракаецца ў тэфсіры ў шматлікіх варыянтах: *wątepliwość*, *wątopliwość*, *wątapliwość*, *wętepliwość* і *wętopliwość*. Аналагічна гэтаму ў шматлікіх варыянтах з'яўляецца прыметнік *wątpliwy* (сумнеўны).

Розныя формы перш за ўсё паказваюць ваганні ў якасці насавога галоснага паміж */ę/* і */ą/*. Дадаткова маніфестуюцца імкненні парушыць праз дапаможны галосны спалучэнне зычных */tpl/*, якое яшчэ больш павялічваецца расчэпленай артыкуляцыяй насавога галоснага (*/ntpl/*). Спосаб напісання гэтага слова ў кірылаўскім пісьме, дзе */t/* пішацца з цвёрдым знакам ъ, можа высветліць гукавы

---

[59] Беларуская мова таксама ведае чаргаванні галосных ўнутры парадыгмаў. Аднак прырода гэтых беларускіх чаргаванняў галосных адрозніваецца ад чаргаванняў галосных у польскай мове. У беларускай мове змена якасці галоснага звязвалася з аканнем і яканнем, і правілы падзелу галосных задаваліся ўнутры парадыгмы націскам. Размова ідзе пра сінхронныя сістэматычныя правілы, якія маглі ўжывацца прадуктыўна. Аднак у польскай мове чаргаванні былі абумоўленыя гісторыяй мовы. Правілы чаргавання шмат у чым абапіраліся на працэсы, якія робяцца зразумелымі толькі пры дыяхронным разглядзе, і якія, да таго ж, былі звязаныя з дакладнымі складанымі ўмовамі, угледзець якія сінхронна вельмі няпроста.

[60] Гл. 3.1.1. Арабізм "*ġāzī*" (змагар за веру).

воблік слова, як мы знаходзім яго ў тэфсіры: *вонтъпливость*[61]. Галосны, устаўлены замест цвёрдага знака ъ, адпавядае альбо ўсходнеславянскаму рэфлексу ъ > *о*, альбо заходнеславянскаму рэфлексу ъ > *е*. Паколькі галосны стаіць у ненаціскной пазіцыі, ён таксама можа падлягаць аканню і таму вагаецца ў сваёй якасці паміж */o/*, */e/* і */a/*. Гэтае слова надзвычай часта сустракаецца ў тэксце тэфсіра ў сваіх варыянтах, якія не дазваляюць вызначыць правіла, якое ахоплівала б іх дыстрыбуцыю: *wentepliwości* (6a2) (7b4) (13a1), *nimaš wentepliwości w nim* (71a1), *nimaš wontepliwości w nim* (100a3), *ne-bōndz tī z-wontopliwimi* (110b3), *pō tim cō prišla wontapliwośc na sercō jich* (158a5), *tī muchemmed jeśli bendzeš w wentepliwości w tim korāne cō śmi zeslali tōbe* (168b8), *ne-bōndz wontopliwij ō tim korāne* (171b8), *w wentopliwośc wpadli* (324b1), *zapewne daliśmi mūśī*[62] *k'itab*[63] *t'ewrīt*[64] *ne-bōndz tī ja*[65] *muchemmed wentepliwij w nej* (338a1), *ā gdi ne-werili temū korānu ješčō wprōdī pōmawali gō zlim[i] slōwī tō jest wontopliwoścą ōd strōn dalek'ich* (353a7), *ne-werilišce wī tilkō bili w wontopliwości ōd tegō š-čim prišed dō was* (385b5), *pewne sondnij čas ma kōnečne prijśc nemaš wentepliwości w tim* (388a1).

10.5.4.3. Змяшэнні насавых у парадыгмах

Унутры парадыгмаў паказваюцца ў тэфсіры выраўноўванні па аналогіі, якія парушаюць дыстрыбуцыі галосных стандартнай мовы */ą/* і */ę/*. Такое чаргаванне, як *błąd : błędu, krąg : kręgu, ksiąg : księga*, на падставе беларускага субстрату, які не ведае гэтай змены ў сваёй сістэме, часта не выконваецца: *blōnd* (7a1) : *blōndu* (22b5). Побач з гэтым таксама сустракаюцца цалкам звычайныя формы: *blendu* (35a2) (35a3), *blendze* (6b8) (23a8). Аднак здараецца, што назоўны склон паказвае гучанне ўскоснага склону: *jawnij stal blend i zamūtek na sūśi na źemi i na mōrū* (330a8). Аналагічна паводзяць сябе іншыя названыя вышэй лексемы: *i meśōnc też za priklad rōndziliśmi pō krōngū slōnečnim na dwadześca ōśim stōmpnōw* (361a3), *pewne ci ktōre prečą prōciw kśeng* (23a8).

Сюды адносяцца таксама такія выпадкі, як наступны, у якім у 3-й асобе адзіночнага ліку ў прошлым часе *ogarnął* насавы галосны не паказвае рэфлексу падаўжэння галоснага пры выпадзенні суседняга гука: *bō ōgarnel pan naš wšitk'ī rečī na' ūką* (125b1). Такія спосабы напісання паўтараюцца ў тэксце тэфсіра.

---

[61] Гэтае слова сустракаецца як паланізм, напр., у Літоўскім Статуце 1588 г.; гл. Статут (1989), с. 112.: «*А о таковых добрах и грунтех шляхетских, абы вонтъпливость жадная не была, волно завжды зо всими пожитками, которые бы се кольвек на их грунтех показовали, теж и крущцы всякие, и окна сольныя зоставати мають*» (Статут Вялікага Княства Літоўскага, раздзел трэці, артыкул 2, с. 66:18). Параўн. Stang (1935), p. 144.

[62] Ар. *Mūsā* = Майсей.

[63] Ар. *kitāb* = кніга.

[64] Ар. *tawrā* = Тора.

[65] Ар. *yā* = клічная часціца.

У лексеме *męka : mąk* і *ręka : rąk* чаргаванне здзейснілася па аналогіі з тыпам *księga : ksiąg*[66]. Вымаўленне *męk* у родным склоне множнага ліку магло б у прынцыпе разглядацца як першапачатковая форма без выраўноўвання па аналогіі: *jakbi-śe ōdwrōcil ōd prikezana našegō dami mū skōštōwac ōd menk pek'elnich* (349a4). З другога боку, прасоўванне вымаўлення, якое грунтуецца на аналогіі, можна назіраць таксама па-за родным склонам множнага ліку, напр. у творным склоне множнага ліку (альбо творным склоне парнага ліку): *rōnk* (25b7), *tō cō zarōbili rōnkōma swimi* (330a8). Даволі тыповым для тэксту тэфсіра **L** з'яўляецца суіснаванне ў блізкім кантэксце формаў, ідэнтычных граматычна, але дублетных: *k'edi prišlō na nich bōžže menka ōd tōnd skōnd ne-spōdzewali i wrōcil w sercach jich strach pūstōšili sami renkōma swojimi i rōnkōma werōncich muśulman* (447b6).

У якасці выключэння тут належала б прывесці некалькі прыкладаў, якія паказваюць змяшэнне насавых галосных у дзеяслоўным канчатку 1-й асобы адзіночнага ліку *-ę*: *zapewne ja bōjōn-śe że mne tam oklamają* (313b6), *pewne ja bōjōn-śe pana bōga* (449b2). Правільныя формы, аднак, выразна дамінуюць: *zapewne bōjen-śe sinōwcōw mōjich* (240b6), *pewne ja bōjen-śe że prewrōci i premeni warą našą* (384b8).

10.5.4.4. Змяшэнні насавых у групах аднакаранёвых слоў

Таксама пры дэрывацыі ўнутры групы аднакаранёвых слоў выяўляюцца змяшэнні насавых галосных, якія супярэчаць літаратурнамоўнай, заснаванай на гукавых законах альбо на аналогіі дыстрыбуцыі /ę/ і /ą/; так, напрыклад, *błąd* (памылка) ~ *błędny* (памылковы): *blondnimi* (5b5); *miesiąc* (месяц) ~ *miesięczny* (месячны): *meśōnčne*; *mąż* (муж) ~ *mężczyzna* (мужчына): *čemū wī īdzece i prestempūjece dō mōnžčiznī* (300a4); *stąpać* (ступаць) ~ *stęp* (крок) ~ *stopień* (ступень): *wmōcnī stōmpi nōg našich* (34a1), *i meśōnc też za priklad rōndziliśmi pō krōngū slōnečnim na dwadześca ōśim stōmpnōw* (361a3); *głąb* (глыб) ~ *głęboki* (глыбокі): *ālbō jakō cemnōśc w mōrū glōnbōk'em* (283b7); *trąd* (праказа) ~ *trędowaty* (пракажоны): *i ūleče ślepōrōdzōnegō i trōndōwategō* (44b4); *strząsnąć / trząść* (стрэсці, трэсці) ~ *trzęsienie* (трасенне): *k'edī strōnśne-śe źemjá trōnśenem welk'im* (438b1); *potępiony* (асуджаны): *rekną ci ktōre newernimi są z-lūdzej mek'ejśk'ich*[67] *ne-jesteśce wī tilkō pōtōmpōne klamci* (332a5).

---

[66] У якасці першапачатковай формы роднага склону множнага ліку ад *męka* і *ręka* можна было б вызначыць *męk* альбо *ręk*, таму што перад глухім зычным /k/ пры выпадзенні канцавых "*epaŷ*" не адбылося падаўжэння галоснага ў папярэднім складзе. Пры гэтым са знікненнем квантытатыўнасці ў насавых галосных таксама не выяўляецца дыферэнцыяцыя адносна асновы назоўнага склону. Формы *mąk* і *rąk* узніклі другасна па аналогіі са словамі са звонкім зычным у канцы асновы паводле тыпу *księga : ksiąg*, дзе гэта прыводзіць да падаўжэння галоснага пры выпадзенні суседняга гука.

[67] Ар. *Makka* = Мекка.

У астатнім змяшэнне якасна адрозных насавых гукаў унутры парадыгмаў і дэрывацый не мае характару ўстойлівай заканамернасці, а тое ці іншае гучанне ўзнікае спарадычна.

10.5.4.5. Пераходы ў спосабе напісання

У арабскім пісьме, як апісвалася вышэй, расчэпленая артыкуляцыя насавых перадаецца ў рэгулярнай арфаграфіі. Для *е* насавога выкарыстоўваецца *fatḥa* + *nūn* = *en*, а для *о* насавога – *wāw* + *ḍamma* + *nūn* = *ōn*, калі пішацца *scriptio plena*, альбо *ḍamma* + *nūn* = *on* пры *scriptio defectiva*. Такім чынам абодва галосныя, /ę/ і /ǫ/, выразна адрозніваюцца на пісьме: *zeslanja korānu ōd pana bōga pōważnegō krōla mendregō cesara* (374b8), *pewne ti-jest pōważnij krōl i mōndrij cesar* (383a6).

У тэксце тэфсіра часам можна назіраць пераходы ў спосабах напісання, якія замацоўваюць няпэўнасць напісанага ў дачыненні да якасці насавых /ę/ ~ /ǫ/, якія трэба пазначыць. У наступным прыкладзе ў назоўніку *pajęczyna* (павуцінне) прысутнічае пераход ад спосабу напісання *е* насавога да спосабу напісання *о* насавога: *i bendōn-śe lataţ gōri jak ōblōka a bendą jakō pajančina* (480a3). Насавы галосны напісаны расчэплена праз *alif* + *nūn* = *an*. Гэты спосаб напісання адрозніваецца ад звычайнай арфаграфіі і можа быць інтэрпрэтаваны як прамежкавая ступень, бо якасць насавога, які знаходзіцца да таго ж у ненаціскной пазіцыі, была, відавочна, не зусім зразумелай таму, хто пісаў[68].

10.5.5. Назалізацыя этымалагічных гукавых груп */en/*, */an/* або */on/*

У запазычаных словах можна назіраць пераход этымалагічных гукавых спалучэнняў */en/*, */an/* альбо */on/* у насавыя галосныя. У прыметніку *pomarańczowy* (апельсінавы, аранжавы) гукавая група */an/* запісвалася, напр., як расчэплены *о* насавы /ǫ/ праз *wāw* + *ḍamma* + *nūn* = *ōn*: *bendą medzi cedrami owoc dajōncim[i] i pō[d] drewami pōmarōnčōwemi* (439a3). У дадзеным спосабе напісання мае месца выразнае ўказанне на назалізацыю */añ/* > /ǫ/. Аналагічны спосаб напісання для этымалагічнай гукавай групы */en/* мы знаходзім у лацінізме *pretendować* (прэтэндаваць): *aj jak'e zle nadzeji cō sōbe pretōndūją* (319b6).

Яшчэ на адзін крок далей ідзе перапісчык у лацінізме *ukontentować* (задавальняць): *ūkōntą tujim jich na ōnem świece zaplatō welką* (210b8). Гукавая група */en/* інтэрпрэтуецца як насавы галосны і запісваецца адпаведна гэтаму. Спосаб напісання праз *wāw* + *ḍamma* + *sagır-ı-nūn* = *-ōñ* = *ą* адпавядае звычайнай арфаграфіі *о* насавога ў канцы слова. Лінія арабскага пісьма пасля *sagır-ı-nūn* пе-

[68] Параўн. Антонович (1968), с. 338: "...*ванжов* 62б9. Во втором примере /с -ан-/ можно предполагать ударение на втором слоге, вследствие чего в первом предударном слоге произошел переход /ǫ/ в /а/".

рарываецца і зноў пачынаецца для другой часткі слова. Спосаб напісання выразна паказвае, што перапісчык свядома хацеў перадаць насавы галосны /*ą*/[69].

10.5.6. Дэназалізаваныя спосабы напісання

Не вельмі часта, але рэгулярна для польскіх насавых галосных у сярэдзіне слова замест расчэпленых спосабаў напісання праз знак галоснага + *nūn* = *n* з'яўляюцца зусім дэназалізаваныя спосабы напісання[70] без *nūn* = *n*, напр.: *rōzlōka* (29b8), *rekl šetan pewne ja ōdlōčam-še ōd cebe* (449b2), *pristōpūjece w zakazanij wam člōnek nepristōjnij menščinšk'ij* (322a7), *źwerete* (22a5), *ā k'edī spūščimi na-ne wode dežčōwa ōdwilžiwši-še ōžije i wida naśene trawī z-šebe i wirōšci ze-wšitk'ich kōlōrōw peknich ōčōm milich* (264b6), *pretō jakō jest pekna zaplata dōbre ūčink'i činōncim* (382a6), *ōgarnōl bōg mōj wšitk'i rečī ūmejetnōšcą* (106b7). Першыя тры прыклады на аснове арабскага пісьма можна было б прачытаць як *rōzlūka*, *ōdlūčam-še* або *pristūpūjece* з гучаннем /*u*/, што бліжэй да беларускай мовы. Для *piękny* || *piekny* (прыгожы) у літаратурнай мове XVI ст. былі распаўсюджаныя абодва спосабы напісання.

Сляды бясспрэчна беларускага гучання, якое пранікла ў тэфсір, хаатычна рассеяныя па ўсім тэксце. Замест польскіх насавых галосных /*ę*/ і /*ą*/ ужываюцца адпаведныя беларускія ненасавыя галосныя /*a*/ і /*u*/: *ne-būdzece bōjaci-še bō we pan bōg tō cō ne-wece wī* (422a2), *spitają ū cebe ō žī-l-kernejni*[71] *tō jest aleksandra mow ī muchemmed būdū pec wam ō nem wjádōmōšci jegō* (238b1), *zawodzic was w blūd chcą* (51a2), *dami mū skōštōwac dna sōndnegō z-mūk pek'elnich palōncich* (265a3), *pretō ōgarneliš jich traśenem źemī* (323a4), *īma* (17a3), *reče wimišlene tō lūdzī tich cō pred namī bilī i pōznakūjem takōwich rōspalōnim patnem*[72] *na nōgach jich* (464b1). Наступны прыклад варты ўвагі не толькі з-за беларускага гучання *męka* > *muka*, але таксама з-за нагрувашчвання іншых беларускіх асаблівасцей: *śiğğīn*[73] *jest najhlibše ōd śedmi pekal tūrma zapečentōwanō pečencą bōžą pek'elna mūka* (484b4)[74].

Тут таксама ў блізкім кантэксце адны і тыя ж словы могуць з'яўляцца паралельна ў польскім і беларускім гукавым выглядзе: *pewne jest ū mne dla nich lancūchi ōkōwī ōgniste i peklō i rōźne mūk'i i pōtrawi majōnc w sōbe badzōlk'ī želaźne i menka serca palōnca* (473a4).

---

[69] Такія з'явы можна разглядаць як гіперкарэктныя формы на падставе беларускага субстрату, які не ведае насавых галосных. Пра інтэрпрэтацыю этымалагічных гукавых злучэнняў галосны + *n* як польскіх насавых галосных параўн.: Kurzowa (1993), p. 82–85.

[70] Гл. Kurzowa (1993), p. 79.

[71] Ар. *Dū al-Qarnayni* = літар. "той, хто з двума рагамі"; Аляксандр Вялікі.

[72] Польск. *piętno*; бел. *пятно*; гл. Мацкевіч / Грынавецкене / Рамановіч (1979): Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. Мінск, 1979. Т. 4, с. 224.

[73] Ар. *siğğīn* = пякельная турма.

[74] *najhlibše*: бел. форма; *pekal*: з аканнем і зацвярдзеннем /*k'*/ > /*k*/; усходнеслав. *tūrma*.

10.5.7. Другасная назалізацыя

Характэрнай з'явай для ўсіх татараў Вялікага Княства Літоўскага рукапісаў з'яўляецца адсутнасць другаснай назалізацыі галоснага */e/* ў прыназоўніку *między* (паміж). Напр., у тэфсіры **L** без выключэння ўжываецца неназалізаваная форма *miedzy*, якую ўжо ў XVII ст. можна разглядаць як архаізм[75]: *rōzlōnčają tim medzi menžem ã žōnō jegō* (15b5), *medzī neba ī źemi* (22a5)[76].

Назоўнік *uczęsnik* (супольнік) з этымалагічным *e* насавым у XVI ст. выяўляецца пераважна ў дэназалізаванай форме *uczes(t)nik*. У далейшым адбываецца другасная назалізацыя *uczes(t)nik* > *uczęstnik*[77]. У тэфсіры выяўляюцца назалізаваныя формы, якія, адпаведна, можна ўспрымаць як архаізмы з захаваннем этымалагічнага */ę/* альбо як другасную назалізацыю асновы XVI ст. *uczes(t)nik*: *ne-jest' ūčenśnik'em bōgū 'īśá sīn merjemin*[78] *tilkō pōsōl i prōrōk tak'ij jakō inšij* (93a8), *i ne-trimal sōbe sina āni-jest jemū kōlegō ūčenśnik'em nicht w krōlewstwe jegō* (287b6)[79].

Другасная або гіперкарэктная назалізацыя адбываецца ва ўсходнеславянскіх назоўніках *veličestvo* (вялікасць) і *proročestvo* (прароцтва), якія рэгулярна ўжываюцца ў тэксце тэфсіра: *jegō jest veličenstwa w nebōsach i na źemi i ōn jest bōg samij mōndrij pōważnij i mōndrec* (411a4), *dal bōg pišmō kśengi i mōndrōšci i prōrōčenstwa ã pōtim bi mōwili dō lūdzej bendzece wī slūgami i klanajce-še mne ōkrōm bōga* (47a8). Часам мы таксама знаходзім у *doczesny / doczasny* спосабы напісання, якія паказваюць на назалізацыю: *pōdōbenstwa cō ōfarūją na ten dōčensnij śwját i na chlūba jegō jakō pōdōbenstwa że w nim jest' mrōz i prijdze na pašnâ lūdzem grešnim* (50b8).

Другасная назалізацыя мае месца ў неалагізме **oświęć* / **oświęcie* (*oświecenie* = асвячэнне): *za kōždim ōświencem bliskawici chōdzą w tej świátlōšci* (7a7), дзе насавы */ę/* этымалагічна неабгрунтаваны.

10.6. Перагаласоўка

Перагаласоўка з'яўляецца прыкметнай гукавой асаблівасцю, якая адрозніває польскую мову ад усходнеславянскіх моў. На раннім этапе развіцця (IX–X стст.) у польскай мове адбываюцца два працэсы перагаласоўкі, якія ахопліваюць галосныя */ě, e, ę/* і складаўтваральныя */r', l'/* у пазіцыі перад цвёрдымі апікальнымі */t, d, s, z, n, r, ł/*. Пры гэтым галосны */ě/* падлягае змене *ěT* > *'aT*, якая называецца ляхіцкай перагаласоўкай (*przegłos lechicki*). Галосны */e/* ў пазіцыі

[75] Гл. Kurzowa (1993), p. 79. Параўн. таксама Łapicz (1986), p. 122.

[76] Прыведзеныя прыклады ілюструюць ваганні ў кіраванні (творны альбо родны склон) прыназоўніка *między*.

[77] Гл. Kurzowa (1993), p. 58.

[78] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[79] Гл. Kurzowa (1993), p. 79.

перад цвёрдым апікальным падлягае змене *eT* > *'oT*, вядомай як польская перагаласоўка (*przegłos polski*)[80].

Вынікам гэтага працэсу перагаласоўкі было ўзнікненне чаргаванняў галосных *'e : 'a* і *'e : 'o* ў розных словаформах унутры парадыгмаў, а таксама ў дэрыватах унутры груп аднакаранёвых слоў. На ўсходнеславянскім, беларускім субстраце ў межах гэтага чаргавання адбываюцца парушэнні і змяшэнні, якія грунтуюцца на гіперкарэктнасці альбо выраўноўванні па аналогіі, а таксама інтэрферэнцыі з беларускімі формамі.

У рукапісе тэфсіра **L** выяўляюцца чаргаванні са сферы ляхіцкай і польскай перагаласоўкі ў адпаведнасці з фанетычнымі законамі. З матэрыялу тэксту тэфсіра можна зрабіць выснову, што адхіленні, якія сустракаюцца ў сферы ляхіцкай і польскай перагаласоўкі, наўрад ці анамальна перавышаюць памеры, вядомыя са стара- і сярэдняпольскай моў, а таксама з цяперашніх польскіх дыялектаў. У цэлым выключэнні і адхіленні адступаюць на задні план.

10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка

Ляхіцкая перагаласоўка ў тэфсіры **L** праяўляецца рэгулярна: *ōfarōwac* (28a5), *pōwada* (38b1), *świadectwa* (27a2), *wadōmij* (18b2), *jadl mensō brata jegō z-cala martwegō* (242a3), *pretō rōzeslal fera'ūn*[81] *pō mastach āgibśk'ich wojska* (296a5), *pretō berce t'ejemmum*[82] *pask'em čistim ābō pōtrice pō twari wašej i pō renkach wašich tim pâsk'em* (83b5), *āle tilkō ōcenžil pan bōg wijazd jich* (150a2).

У арабскім пісьме пры графічнай фіксацыі ляхіцкай перагаласоўкі ў пазіцыі пасля палатальных білабіяльных фарміруецца характэрнае пісьмаўжыванне, якое звязана з асінхроннай артыкуляцыяй палатальных білабіяльных. Пасля графемы для білабіяльнага асінхронна артыкуляваная палатальнасць абазначаецца праз *yā'* = *j*, і галосны */a/* запісваецца непасрэдна над графемай *yā'* праз *alif diacriticum* = *á* <-já->, што з'яўляецца *scriptio defectiva* галоснага[83]. Часцей за ўсё такія спосабы напісання ўжываюцца пры білабіяльных */f'/* і */w'/*: *ōfjárōwac* (37b1), *świjádectwa* (19b6), *wjádōmij* (39a5), *k'edī ōgarnela nad nimi nōc ōbačil gwjázda ijōwiša*[84] *rekl ōtō tō bōg mōj* (106b1), *chelalem*[85] *wam też cnōtliwe z-muślelmanek i s-tich cnōtliwich newjást ktōrim dane kśenge t'ewrīt' inǧīl źebūr*[86] *pred wami* (83b6), *wiprōwadzami s-tegō k'wját wiwodzimi ź negō źarnō* (109a1).

---

[80] Наконт перагаласоўкі гл. Strutyński (1993), p. 41–46; Klemensiewicz (1965), p. 76–83; Kuraszkiewicz (1981), p. 55–58.

[81] Ар. *fir'awn* = фараон.

[82] Ар. *tayammum* = рытуальнае абмыванне.

[83] Гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці; гл. >>> 11.6. Асінхронная артыкуляцыя пры палаталізаваных білабіяльных.

[84] Польск. *Jowisz* = Юпітэр.

[85] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[86] Ар. *tawrā* = Тора; ар. *inǧīl* = Евангелле; ар. *zabūr* = Псалмы.

У лексемах з этымалагічным складаўтваральным /r'/ і са зменай /r'/ > /'er/ > /ar/ (з зацвярдзеннем папярэдняга зычнага) таксама выразна праяўляецца перагаласоўка: *martwe* (8a7), *martwegō* (12a8), *martwich* (35b4), *twardij* (13b7) (26a6), *twardzejša* (12b1), *čarnejšij* (25a2). У назоўніку *ziarno* (зерне) захоўваецца палатальнасць папярэдняга зычнага /z'/, які ў арабскім пісьме ўсюды запісваецца мяккай графемай *zāy* = *ź* як палатальны: *w każdim klōśe stō źarn* (35b8).

Побач з гэтым мы звычайна знаходзім вядомыя выключэнні, якія і сёння сустракаюцца ў літаратурнай мове без перагаласоўкі: *za cene malą* (9b3), *nektōre mowili trech bilō čwartij pesek jich ā drūge mōwili penc bilō ā šōstij pesek īch* (232b1), *bō ōn jest świentij pōważnij mōndrij cesar* (447b2), *kresla s-parenčami* (403a1).

Ясна выяўляюцца тыповыя чаргаванні ў розных формах парадыгмы, напр., у назоўніку *świat* (свет): *ten świat dōčasnij*[87] *ā tamten wečistij* (29a2), *na dōžiwotnim świece* (27a2). У адпаведнасці з гукавымі законамі рэгулярна выяўляюцца чаргаванні таксама ў дзеяслоўных формах: *bendze wedzal że pewne jūž śe rōzlōnči z-calem* (476a6), *jeśli-biśce tō wedzeli* (24b1). Аднак часам пранікаюць формы з адхіленнем, без перагаласоўкі: *wedzel pan bōg* (24b7). Тут таксама можа мець месца *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага /a/ толькі праз *fatḥa* = *e*[88].

Назоўнікі *wiara* (вера) і *ofiara* (ахвяра) таксама рэгулярна сустракаюцца з ляхіцкай перагаласоўкай: *trimajce wara bōžą čija wjára lepša ma bic ōd bōžij warī* (19b2), *te ktōre werą w jedinegō bōga i ne-pōmešali wjárī swojej ź warą newernich pōgan* (107a2), *'ak'if*[89] *jest' ōfara s-pōstem k'ilka dnej* (25a2). Толькі зусім рэдка сюды пранікаюць формы з адхіленнямі, без перагаласоўкі: *ābi ōtrimali źwirchnōśc i sprečali-śe s-klamliwą werą abi-zgašili na tim świece prawdziwej wari* (382b7).

У абодвух назоўніках, *wiara* і *ofiara*, і іншых назоўніках жаночага роду на *-ra* давальны і месны склоны адзіночнага ліку з канчаткам *-i* (*-y*), які паходзіць з мяккіх асноў, знаходзяцца пад беларускім уплывам: *žebi ōdwrōcili was pō prijencū īmanū wašegō kū warī k'afirśk'ij*[90] (16b1), *jak'e tō zle prikezane w tej warī wašej (14b6), na tak'ej swojej ōfari* (36a7). Беларускі ўплыў робіцца відавочным пры параўнанні з фанетычна заканамернымі польскімі формамі *wierze* і *ofierze* без перагаласоўкі. Формы *wiary* і *ofiary* паказваюць ляхіцкую перагаласоўку і пры гэтым выразна дэманструюць тыповае для беларускай мовы зацвярдзенне /r'/ > /r/[91].

---

[87] Бел. *дачасны* : польск. *doczesny*.

[88] Гл. >>> 10.9.5. Scriptio defectiva /a/ праз *fatḥa* = *e*.

[89] Ар. *'ākif* = стан рытуальнай чысціні.

[90] Ар. *kāfir* = няверні к.

[91] Гл. >>> 11.4. Фанемы /r/, /ř/ і /ž, š/ (< /ř/); гл. >>> 12.3.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду; гл. >>> 12.3.6. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

Як правіла, размеркаванне правільных формаў з перагаласоўкай альбо без яе ў розных дэрыватах унутры груп аднакаранёвых слоў выразна праяўляецца: *pewne pan bōg twardegō kerane i menk'ī* (82b2), *prirečene ktōre ūtwerdzil z-wami w dūšach wašich* (83b8), *chcelibi-še wrōcic w nedōwarstwō pōneślibi ten zamūtek i newernōšc* (340a7). У назоўніку *niewierność* (нявернасць) */r'/* падчас ляхіцкай перагаласоўкі (IX–X стст.) быў яшчэ мяккі, і з-за гэтага не адбылося змены */'e/ > /'a/*. У наступным прыкладзе перад функцыянальна мяккім */l/* у дзеяслоўнай форме *wydzielać* (вылучаць) перагаласоўка не адбывалася. Перад цвёрдым */ł/* у назоўніку *wydział* (аддзел), утвораным ад таго самага кораня, наадварот, мае месца перагаласоўка: *i widzelace jim widzali s-tegō cō [z] pōžitkōw wam nadali* (212a1).

Спосаб напісання дзеяслова *strzelać* (страляць) у наступным прыкладзе можна разглядаць як гіперкарэктны. Магчыма, ён узнік пад уплывам назоўнікаў *strzał, strzała* (стрэл, страла): *ci ktōre stralają slōwami na cnōtliwe žōni bez žadnich dōwodōw* (281a6). Часам спосаб напісання *alif* + *fatḥa* = *a* з'яўляецца і вынікам беларускага акання.

Наступныя прыклады знаходзяцца пад моцным беларускім уплывам. Параўн. бел. *удараць* / *ударыць* з польск. *uderzać* / *uderzyć*: *rekliśmi ūdar laską twoją w kamen* (11a1), *udarce* (12a8), *udari-še* (11a6). Прыклады зноў паказваюць на беларускае зацвярдзенне */r'/ > /r/*.

У назоўніку *rozdział* (раздзел) адзначаюцца змяшэнні правільных формаў і формаў з адхіленнем, якія маглі б знаходзіцца пад беларускім уплывам, параўн. *раздзел, аддзел*. Правільныя формы звычайна маюць перагаласоўку: *jedin ź nich čitac bendze wam rōzdzali korānne* (454a2). Але часта побач з гэтым знаходзяцца адхіленні: *aj jak'e jest zle pōdōbenstwo tich lūdzej ktōre klamstwo meli na rōzdzeli bōžža korānne* (454a5), *bō ōn jest ktōrij zeslal wam kśenge korān ājet'ami*[92] *rōzdzelami* (110b2).

У назоўніку *biada* (бяда), з аднаго боку, таксама праяўляецца форма, якая адпавядае гукавым законам: *ālbō też reče času ōbačiwši kerana i*[93] *bjada mōja k'edī bim zapewne pōšed na świát pōwtōre pretō mōgbim bič dōbrōtliwij* (380b5). З іншага боку, у функцыі выклічніка з'яўляецца форма без перагаласоўкі: *rekla śara*[94] *i bjeda či-mam ja rōdzic ā ja-m jest nedūža baba lat mam 99* (177a1), *mōwili i beda ne-wedzelišmi že pan bōg śila daje* (318b6), *rekną newernici i beda naša* (480b6). Формы ўжываюцца без звычайнай для сучаснай польскай мовы семантычнай дыферэнцыяцыі: назоўнік *bieda* (бяда, гора) у процілегласць выклічніку *biada* (бяда! гора!).

---

[92] Ар. *āya* = знак, цуд, верш Карана.

[93] Тут і ў наступных прыкладах *i* з'яўляецца клічнай часціцай, а не злучнікам; гл. >>> 12.1.7. Клічны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду.

[94] Ар. *Sāra* = Сара (імя ўласнае).

Далей сабрана некалькі тыповых прыкладаў адхіленняў ад ляхіцкай перагаласоўкі, якія часта сустракаюцца ў тэксце тэфсіра: *chcel* (7a7) (34b1), *menōwanegō* (38a8), *menōwice* (15a1), *mestem* (18a6), *nedōwerk'em* (11b8), *newesta* (23b7) (23b7), *neweste* (31b5), *newjest'* (32b3), *newjedōmij* (37a8), *oświedči-śe* (24b2), *pesk'em* (36a6), *premene* (11b6), *świedkami* (13b3), *wedōmij* (29b6), *wjedōmij* (19b2), *wedzel* (24b7), *wenem* (30a8), *āž pricisneliśmi ōbiwatelōw tich mjást napaścami i bedami* (125b8), *zwestūjōnc* (15a4), *jūž tō bilō ōd nas pred časem wedōme cō śmi jemū teraz činili* (261b3), *ūtworiliśmi sinōw ādamśk'ich ź menśk'ej žōndzi zlōnčōnej [ž-] žōndzą belaglōwską* (476b6).

У стара- і сярэдняпольскай мовах можна было назіраць адхіленні ад ляхіцкай перагаласоўкі, асабліва пасля лабіяльных: *niewiesta, kwiet, wieno, piestun*[95]. У прыкладах, прыведзеных вышэй, вылучаюцца пазіцыі пасля лабіяльных зычных: */m', w', b', p'/*. З іншага боку, характэрным з'яўляецца існаванне адной і той жа лексемы то з ляхіцкай перагаласоўкай, то без яе: *pewne mī swestūjem cebe sinem īme jemū jechjá*[96] (241a1), *a tō žibiś śwjástōwal tim bōjaźnikōm bōžim i žebiś pōstrašal tim lūdzej neprijaźnich sprečnikōw* (247a2).

10.6.2. Польская перагаласоўка

Таксама ў польскай перагаласоўцы */'e/ > /'o/* ў тэксце тэфсіра з'яўляюцца фанетычна заканамерныя формы: *ānjōlōwe wnidą dō nich ze-wšitk'ich bram i fōrt* (120a7), *pōmrą ōd dūchū tegō ōgnistegō bliskana ci cō w nebōsach i ci cō w źemi* (381b1), *wijachal karūn*[97] *dō lūdzej swojich w ōzdōbe strōjnej na balem mūle zlōtō śōdlō* (318a8), *mōwili i merjema*[98] *pewne zlij ūčinek ūčinila[ś] i*[99] *śōstra harūnōwa*[100] *ne-bil ōcec člōwek'em zlim* (242a8), *wišedl źek'erja*[101] *na lūdze swoje z-ōltarōw ōznajmil jim napisawši palcem na źemi chwalca bōga ranō i wečōr* (241a6), *k'edī swjástūją jednemū z-was dzewčiną ūrōdzōną weśōlōśc twari jegō źmeni-śe i ščerni ōn bendze pelen gnewu na žōna i tajic tō bendze ōd lūdzej* (212a3).

У дзеяслоўнай парадыгме цяперашняга і прошлага часу чаргаванне */'e/ : /'o/* звычайна з'яўляецца ў карэктным з пункту гледжання фанетычных законаў размеркаванні: *ne-prineśe tōbe pōžitkū* (18a1), *rekl fera'ūn*[102] *prineś tō i mōjžeš*

---

[95] Гл. Klemensiewicz (1965a), p. 82. Параўн. Kuraszkiewicz (1981), p. 57: "Наадварот, з помнікаў і цяперашніх гаворак, перш за ўсё мазавецкіх, вядомыя формы без перагаласоўкі, звычайна пасля лабіяльных зычных, у той час як цяперашняя літаратурная мова мае формы з перагаласоўкай, напр. *wiedro, kwiet, niewiesta, ofiera, piestować, dowiedować się, powiedać, odmietować*".

[96] Ар. *Yaḥyā* = Ян.

[97] Ар. *Qārūn* = Каран.

[98] Ар. *Maryam* = Марыя.

[99] Размова ідзе пра клічную часціцу *i* (о!), а не пра злучнік *i*.

[100] Ар. *Hārūn* = Арон.

[101] Ар. *Zakariyā* = Захарыя.

[102] Ар. *fir'awn* = фараон.

jeśli-ś-tī jest ōd prawdziwich (295a3), *prinōsōn ją ānijōlōwe* (33b2), *ja zapewne widzalem ōgen ãzali prinōse wam s-tamtōnd z-halawnōju* (247b3), *ōn bil prawdziwim prōrōk'em i pōdneślišmi ōnegō na mejsce wisōk'e dō raju* (244b1), *stalō cebe žebiś pōšedl i prinōsl cūde spōd źemi ālbō drabina dō neba i prinōslbiś jim cūda ne ūwerą* (102a3), *ne-zwedli was i ne ōdwedli ōd dōmū bōžžegō chramu* (82a8), *i źwodl-jich šetan* (9a3)[103].

Чаргаванне */'e/ : /'o/* аднолькава праяўляецца ў карэктным з пункту гледжання фанетычных законаў размеркаванні ў розных формах унутры склонавай парадыгмы: *naprawadzenī* (10a7) *versus naprawadzōnimi* (21a3), *mow ī muchemmed pewne zabrōnōne mī žebim jâ mjál slūžic i klanac-śe tim bōgōm ktōrim wī mōdlīce-śe* (104a5), *pō tim wī znōwa wrōcace-śe dō swich bōgōw zmišlōnich* (105a4). У назоўным склоне мужчынска-асабовага множнага ліку пасіўнага дзеепрыметніка прошлага часу звычайна з'яўляецца першапачатковае гучанне без перагалосоўкі: *nawrōceni* (7a4), *naprōwadzenī* (19b1), *źwedzeni* (15b4), *wizwolenī* (25a8). Як выключэнне трапляюцца гіперкарэктныя альбо заснаваныя на аналогіі формы з перагалосоўкай: *takōwi lūdzi pōtenpōnī* (28b4).

Тыповымі прыкладамі адхіленняў ад польскай перагалосоўкі з'яўляюцца *berōnc* (14b4), *ōznajmene* (32a1), *perūni* (7a5) (7a6), *perūnōw* (7a5). Для гэтых формаў без перагалосоўкі зноў характэрная пазіцыя пасля лабіяльных зычных, як пры ляхіцкай перагалосоўцы.

У наступным прыкладзе на падставе пісьма і кантэксту не зусім ясна, якая форма маецца на ўвазе. Тут можна дапусціць адзіночны лік *ziele* ці *zioło* з аканнем у канцы – *ziela / zioła* альбо множны лік *zioła*. Тады, зразумела, у формах *zioło / zioła* мае месца адхіленне ў перагалосоўцы: *wźenla źemjá k'wját i ōzdōbi jej i pri' ōzdōbila śa pašna i źela* (162b2). У другім кантэксце знаходзяцца фанетычна заканамерныя формы з перагалосоўкай: *wiprōwadzami ōną wodą rōźma' itą pašne i źōla rōźnich kōlōrōw w rōźnōści tich źōl jest priklad lūdzem* (249b7).

Формы *neprijacelmi* (9a4) (35a2), *tak-tež učiniliśmi kōždemū prōrōku neprijacelmi šetanōw* (110a6), верагодна, знаходзяцца пад беларускім уплывам (параўн. бел. *прыяцель* з польск. *przyjaciel*, наз. скл. множнага ліку *przyjaciele*; але род. і він. скл. мн. л. *przyjaciół*, мн. л. твор. скл. *przyjaciółmi*) альбо захоўваюць архаічнае гучанне. У такіх формах, як *neprijacelmi*, у пазіцыі перад мяккім */l'/* з'яўляюцца карэктныя з пункту гледжання фанетычных законаў формы без перагалосоўкі. Наадварот, перагалосоўка выразна і рэгулярна з'яўляецца ў род. і він. скл. мн. л. у пазіцыі перад цвёрдым */ł/*: *pewne ja widze cebe i prijacōl twojich w blendach jawnich welk'ich* (106a7), *pewne šetani natichają dūchem nečistim*

---

[103] Не трэба блытаць з перагалосоўкай чаргаванні *e* : *o* (*ę* : *ą*) у дзеясловах на *-ąć*: *ãbō ci-wźōl ōd pana bōga prirečene i dekleraciją (246a4), ci ktōre īman prijeli (49a6)*. У дзеясловах на *-ąć* дэназалізуюцца насавыя галосныя */ą/ > /o/* альбо */ę/ > /e/* перад канцавым */-ł, -l/* дзеепрыметніка прошлага часу. Чаргаванне */ą/* і */ę/* альбо */o/* і */e/*, якое са стратай колькасці ператварылася ў якаснае адрозненне, узыходзіць да падаўжэння насавога галоснага пры выпадзенні суседняга гука.

dō prijacōl swich newernikōw (111a4), *ābō jich ōgarne strachem neprijacōl jich* (211a7). Але побач з гэтым мы таксама знаходзім род. скл. мн. л. на *-ow* і без перагаласоўкі: *nemaš wam ōprōč allahâ bōga [ratującego] od neprijacelow* (180a7)[104]. Сучасная форма твор. скл. мн. л. *przyjaciółmi* з зацвярдзелым */ł/* і перагаласоўкай утворана па аналогіі з род. скл. мн. л. *przyjaciół*.

10.7. Уплыў плаўных і насавых на галосныя

У пазіцыі перад плаўнымі */r, r', l, ł/* і насавымі */n, n', m, m'/* у працэсе развіцця стара- і сярэдняпольскай моў адбылася змена ў якасці галосных. Пры гэтым пераважна меў месца пераход */i, y/ > /e/*.

10.7.1. Змена *iR > eR*

Змена *iR > eR* з'яўляецца характэрным для польскай мовы пераходам, які пачынаецца яшчэ ў старапольскім перыядзе і заканчваецца ў канцы XVI ст. З развіццём закрытых галосных пранікненне закрытага */é/* ў гукавую групу *iR* у XVI ст. дадаткова напластоўваецца на змену *iR > eR*[105]. З-за таго, што ў далейшым канкурыравалі дзве розныя артыкуляцыі закрытага */é/*, */é/ > /e/* і */é/ > /i/*, гукавыя групы *iR || éR || eR* змешваюцца. Таму гукавая група *iR* магла інтэрпрэтавацца па-рознаму: яна можа разглядацца то як працяг архаічнага гучання, то як рэфлекс артыкуляцыі закрытага */é/ > /i/*[106]. Тыповымі прыкладамі змены *iR > éR > eR* з'яўляюцца *sirota > siérota || sirota || sierota* (сірата); *syr > sér || syr || ser* (сыр); *śmirć > śmiérć || śmirć || śmierć* (смерць); *wirzch > wiérzch || wirzch || wierzch* (верх). Пры гэтым доўгі час ужываліся паралельныя формы. Гукавыя групы *éR* і *iR* стабілізуюцца паралельна артыкуляцыі закрытага */é/* ў сваёй сённяшняй форме *eR* на працягу XVIII і часткова XIX ст.[107] У "*пальшчызне крэсовай*" ваганні ў гукавых групах *iR || éR || eR* маглі трымацца даўжэй і ў большым аб'ёме, чым у агульнапольскай мове, з прычыны перыферыйнага месцазнаходжання і ўсходнеславянскага субстрату.

Характэрныя прыклады змены *iR > éR > eR*, якія сустракаюцца ў тэксце тэфсіра, абмяркоўваліся вышэй пры разглядзе закрытых галосных. Там таксама прыводзілася некалькі тыповых прыкладаў[108]. Гукавая група *iR* рэгулярна сустракаецца ў невялікай колькасці тыповых лексем. Трэба падкрэсліць, што суадносіны груп *iR || éR || eR* у тэксце тэфсіра не перавышаюць паказчыкаў, вядомых з польскай мовы XVII–XVIII стст.

---

[104] Гл. >>> 12.1.9. Родны склон множнага ліку мужчынскага роду.

[105] Гл. Kuraszkiewicz (1981), p. 64; параўн. Klemensiewicz (1965a), p. 70.

[106] Параўн. Kurzowa (1993), p. 67.

[107] Параўн. Kurzowa (1993), p. 68. Гл. Klemensiewicz (1965b), t. 2, p. 88, 95.

[108] Гл. >>> 10.4.2. Закрыты */é/*.

10.7.2. Змена *iL* > *eL*

У групах */il, yl, ił, ył/* ужо з XIV–XV стст. спарадычна адбываецца змена */i, y/* > */e/*. Яна асабліва павялічвалася ў XVII ст., аднак не дасягнула шырокага распаўсюджання. У літаратурнай мове яна лічылася некарэктнай. Тыповыя прыклады змены *iL* > *eL*: *był* > *beł*, *byli* > *beli*, *tylko* > *telko*, *dokonczył* > *dokonczeł* et cetera[109].

У тэксце тэфсіра гэтая змена з'яўляецца толькі ў выглядзе асобных слядоў. У польскіх словах звычайна сустракаюцца гукавыя групы */il, yl, ił, ył/* без змены *iL* > *eL*: *śila* (31a5) (14a4) (33a7) (33b6), *tilkō* (6b7) (8a5) (8b6) (9a1) (9b6) (12b8).

Як выключэнне можна разглядаць існаванне прыслоўя *telko* (*tylko* = *толькі*) у наступным прыкладзе: *ālbō winidzce z-dōmōw swojich ne ūčinilibi telkō tilkō newele ź nich* (68b3). Аднак у дадзеным прыкладзе мы, магчыма, маем справу толькі з апіскай перапісчыка. Калі прыняць да ўвагі арабскі тэкст[110], то замест *tylko* трэба чытаць *tego*: *nie uczyniliby tego tylko niewiele z nich* (68b3). Напісанне слоў *tegō* і *tilkō* ў арабскім пісьме вельмі падобнае.

Няўстойлівы спосаб напісання з адначасовай пастаноўкай дыякрытычных знакаў для галосных *fatḥa* = *e* і *kasra* = *i* выкарыстоўваецца ў: *ōdwrōcace īch ōd drōgī bōżżej teilkō*[111] *cō īman*[112] *prijeli i ūweri bōgū* (125a1). Гэты прыклад, зразумела, з'яўляецца адзінкавым выпадкам.

Змена *iL* > *eL* адбываецца ў назоўніку *pielgrzym* (пілігрым): *ōčiścil mōj dōm dla pelgrimōw* (18a5). Але і гэты прыклад сустракаецца адзін раз.

Змена *iL* > *eL* у дзеясловах прошлага часу мае выпадковы характар: *pōtim wskreśeli mī was pō tak'ej śmerci waśej* (10b3), *zecisneliśmi lūd fera'ūnōw*[113] *latī zlimi ne'ūrōdzajnimi i ūmnejšelī z-'ōwocōw* (128a6).

Змену *iL* > *eL* у тэксце тэфсіра можна разглядаць як надзвычай маргінальную з'яву. Сітуацыя ў тэфсіры **L** цалкам адпавядае польскай літаратурнай мове XVII–XVIII стст.

10.7.3. Змена *iM* > *eM*

Ад змены *iM* > *eM* у тэксце тэфсіра засталіся толькі нязначныя сляды. Паралельныя формы выяўляюцца, напр., у запазычаным слове *kryminał* (кроўная

---

[109] Гл. Strutyński (1993), p. 51; Kuraszkiewicz (1981), p. 64; Klemensiewicz (1965b), t. 2, p. 95; ён жа (1965a), p. 71; Mazur (1993), p. 86.

[110] **Q**(4:67): {[…] "**'uḫruǧū min diyāri-kum mā fa'alū-hu illā qalīlan min-hum**" […]} = "Выйдзіце з дамоў вашых! Гэта зрабілі б толькі нямногія з іх".

[111] *tylko* стаіць тут у сэнсе *акрамя*: "Вы зводзіце іх са шляху Божага, акрамя тых, што прынялі веру і ўверавалі ў Бога".

[112] Ар. *īmān* = вера.

[113] Ар. *fir'awn* = фараон.

помста) альбо ва ўласным імені *Nimrod*, дзе некалькі часцей сустракаюцца формы з *iM* > *eM*: *ōka za ōka nōs za nōs ūchō za ūchō zōmb za zōmb ã za centara kriminal* (89a7), *kreminal* (23b6) (23b8) (24a1), *ãle zbitkōw ne-činic w kreminalach tilkō dūša za dūša* (222b7), *rekl nemrūd ja ōżiwe i ūmōre* (35a5).

У месн. скл. адз. л. скланення прыметнікаў мужчынскага і ніякага роду ўжываюцца два канчаткі: *-em* і *-im* (*-ym*). Канчатак *-em* – гэта атрыманы ў спадчыну ад старапольскай мовы канчатак месн. скл. адз. л. Канчатак *-im* / *-ym* пранік з творнага склону адзіночнага ліку у месны склон адзіночнага ліку і замацаваўся з XVIII ст. у якасці адзінага прадукцыйнага канчатка. Змена *iM* > *eM* уяўляе сабою фаналагічную падставу для гэтага змяшэння канчаткаў твор. скл. адз. л. і месн. скл. адз. л.[114] Так, напр., у тэксце тэфсіра мы часта знаходзім у месн. скл. адз. л. абодва канчаткі ў блізкім кантэксце: *na'ūči jich pišma korãn słōwa bōżże i mōndrōści sōndōw choca śce bili pred tim w blendze welk'em i jawnim* (55b4). Для месн. скл. адз. л. можна з лёгкасцю прывесці прыклады, якія фіксуюць змяшэнне абодвух названых канчаткаў. Аднак не такая сітуацыя ў твор. скл. адз. л., у якім мы знаходзім у тэксце тэфсіра *-im* (*-ym*) у якасці адзінага канчатка[115].

Пры скланенні прыметнікаў мы знаходзім зусім нязначныя сляды змены *-im* (*-ym*) у дав. скл. мн. л.: *ci ktōrem daliśmi jim kśenge t'ewrīt'*[116] (17b5), *pretō ktōrim cūdam bōżżem ne-dōwerac bendzece* (389b8).

Часцей можна канстатаваць змену канчатка твор. скл. мн. л. *-imi* (*-ymi*) (гл. >>> 14.1.21): *cerpliwemi* (23b4), *ne-mōdl-śe i ne-prōś za tich ktōre kriwdnici i newernici są pewne bendą ōnī ūtōpōnemi* (173b6), *żebi was ōdwrōcil ōd chwali bōżżi i ōd nemaźū*[117] *ci-ne-możece wī bic pōwścōngnōnemi* (95a6), *pōd drewami pōmarōnčōwemi* (439a3); таксама: *ã k'edī prišli pōslanci naśī lūtōwi*[118] *i zafrōsawali-śe*[119] *nemī i casnō stalō preź nich serca jegō* (177a6).

Пры спражэнні звяртае ўвагу пераход *iM* > *eM* у 1-й ас. мн. л. (гл. >>> 16.2.4. 1-я асоба множнага ліку цяперашняга часу): *slišemi* (39b5), *weremī bōgū ã ti bōndz świádk'em na tim że mi pewne jesteśmi muśulmanami* (45a2), *w ten dzen prizōwemi ūšitk'ich lūdzej* (226b1), *rekną newernici cō tō jest nam że mi*

---

[114] Гл. Klemensiewicz (1965b), t. 1, p. 108: "Ta zmiana, której pełne nasilenie przypada dopiero na dobę średniopolską, jest z tego względu ważna, że odbija się w chwiejności lub analogicznych wyrównaniach form deklinacyjnych odmiany zaimkowo-przymiotnikowej z końcówką narzędnika i miejscownika męskiego i nijakiego l-poj.: -im, -ym, -em i z koncówką narzędnika l.mn.: -imi, -ymi, -emi; także w zakresie koniugacji chwiejnością końcówki 1 os.l.mn. czasu teraźniejszego: -im(y) obok -em(y), np. widzim(y), czynim(y) obok widziem(y), czyniem(y)". Параўн. таксама : Mazur (1993), p. 86.

[115] Гл. >>> 14.1.8. Месны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду; >>> 14.1.7. Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду.

[116] Ар. *tawrā* = Тора.

[117] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[118] Ар. *Lūṭ* = Лот.

[119] Зразумела, маецца на ўвазе *zafrasowali się*.

ne-widzim tich menžōw cō bili nam zwodzicelami [...] zacmeli-śe ōči naše ōd nich że jich ne-widzemi na wečnim świece (373b5), *ūčinemi jich pōdbijemi pōd stōnpi nōg našich i ūčinemi ōd pōnižōnich* (392b8).

Таксама на мяжы слоў спарадычна адзначаецца змена, тыповая побач з прыназоўнікам *między*: *jūž ōbačili kerane menka i padl dekret medze nimi sprawedliwij* (165a6), *ale stal-śe rōzsondak i wirōk bōžij medze nimi* (396b7).

У тэксце тэфсіра таксама можна выявіць адваротны працэс звужэння (*pochylenie*)[120] /*e*/ > /*é*/ > /*i*/ перад /*m*/, як, напр., у дзеяслове *domniemać* (меркаваць): *sami dōmnimają że tō ne-są bōgi āle tak'ich dōmnimane ne-zastōnpi jich ōd bōga prawdziwegō w žadnij reči* (163b6). Працэс *eM* > *éM* > *iM* характэрным чынам праяўляецца ў некаторых тыповых граматычных канчатках. Так, напр., мы знаходзім у назоўніках творны склон адзіночнага ліку на *-im* (*-ym*) (параўн. >>> 12.1.5. і 12.2.5.): *dō pana bōga majstatim wladajōncegō drōgi bi nalaźl* (223b3), *ābō jich trimac w prijaźni ālbō ōdprawce z-dōbrim jej* (30b5). Можна прывесці ўсяго адзін прыклад для дав. скл. мн. л.: *takōwim lūdzīm zaplata īch ōdpūščene grechōw ōd bōga* (52b2). Тут, верагодна, мае месца толькі арфаграфічная памылка.

Змена *eM* > *éM* > *iM* пакінула свае сляды ў дзеясловах перадусім у 1-й ас. мн. л. цяп. ч. альбо цяп.-буд. ч. (параўн. >>> 16.2.4.). Спарадычна мы таксама знаходзім прыклады таго, як гэты працэс адбываецца ў 1-й ас. адз. л. пр. ч. (параўн. >>> 16.3.1.): *pōjdzim* (22b6), *naśladūjim pōsla twegō 'ejśjá*[121] (45a3), *ne-mōžim mī ōdwrōcic bōgi naši ōd slōwa twegō i ne-mōžim mī tōbe bic werōncimi ne-mōžem mōwic* (175a6), *ūkōntątujim jich na ōnem świece zaplatō welką* (210b8), *ā te ktōre īman*[122] *prijenli i ūčink'i činili dōbre ūgrūntūjim ū nich ōd rajōw rōźnich i palacōw* (325a6), *napōminačem bilim wam tilkō ž wī ne-lūbiliśce napōminane i napōminača* (124a7), *rekl ī lūdze wšak dōnōśilim wam pōselstwa pana megō* (125b6)[123].

Карціна змены *iM* > *eM* альбо *eM* > *éM* > *iM* у тэфсіры, разгледжаная ў цэлым, істотна не адхіляецца ад сітуацыі ў польскай літаратурнай мове XVII – XVIII стст. Некаторыя канчаткі, напрыклад твор. скл. адз. л. прыметнікаў на *-em* і твор. скл. мн. л. на *-emi*, у рукапісе **L** прадстаўлены нават слабей, чым гэта можна было чакаць пры іх шырокім распаўсюджанні ў літаратурнай мове сярэдняпольскага перыяду. Пры гэтым беларускі субстрат, безумоўна, адыгрываў вырашальную ролю.

---

[120] Гл. >>> 10.4.2. Закрыты галосны /*é*/.

[121] Ар. *'Īsā* = Ісус.

[122] Ар. *īmān* = вера.

[123] Параўн. Kurzowa (1993), p. 198.

10.8. Звужаная артыкуляцыя ненаціскных /e/ і /o/

Звужаная артыкуляцыя ненаціскных галосных */e/ > /i, y/* і */o/ > /u/* з'яўляецца прыкметнай рысай польскай мовы паўднёвых крэсаў – тэрыторыі з украінскім субстратам[124].

У паўночных крэсах з іх беларускім субстратам рэдукцыя */e/ > /i, y/* і */o/ > /u/* адыгрывае толькі вельмі маргінальную ролю. Звужаная артыкуляцыя */e/* і */o/* адступае назад перад панаваннем феномена акання */o, e/ > /a/*, які з'яўляецца дзейсным фактарам у "*пальшчызне крэсовай*"[125].

У тэксце тэфсіра звужэнне галосных */e, o/* ў параўнанні з панаваннем беларускага акання мае характар другараднага феномена. Звужаная артыкуляцыя */e/ > /i, y/* выразна паказваецца ў арабскім пісьме, у якім замест *fatḥa = e* з'яўляецца *kasra = i* альбо *scriptio plena yā' + kasra = ī*. А звужэнне ненаціскнога */o/ > /u/* ў арабскім пісьме робіцца ясным толькі ў рукапісах, у якіх абодва галосныя, */o/* і */u/*, пішуцца па-рознаму[126].

10.8.1. Звужэнне ненаціскнога /e/ > /i, y/

Ужо ў старапольскай мове з'яўляюцца як лексікалізаваныя варыянты, якія не звязаны са звужанай артыкуляцыяй */e/ > /i, y/*, розныя лексемы, такія як *cebula* || *cybula* (цыбуля). У тэфсіры мы знаходзім, напр.: *sōčōwici i cibūli* (11a4)[127].

У наз. і він. скл. мн. л. у назоўніках з мяккім альбо гістарычна мяккім канчаткам асновы замест агульнапольскага канчатка *-e* даволі сістэмна супрацьстаіць канчатак *-i* (*-y*) (параўн. >>> 12.1.8.). Тут размова ідзе пра марфалагічную інтэрферэнцыю з беларускай мовай, як фанетычную падставу якой трэба разглядаць рэдукцыю ненаціскнога */e/ > /i, y/*[128]: *wnet ūpadnō perūni i bliskawici* (7a6), *takōwe lūdzī są ōnī kriwdnikami* (30b1), *takōwe lūdze są towarīši pek'elne* (35a3), *tak'e jest' granici prikezana bōžžegō* (25a3), *ne-'ōšūkają tilkō sami śebe i dūši jich* (6b2).

---

[124] Гл. Kurzowa (1985), p. 73–77; напр., p. 75: "(...) 'ude mni' (= ode mnie)". Для параўнання: у тэфсіры **L** мы пастаянна знаходзім звычайную польскую форму: *ōdešła śila ōde mne* (240b5).

[125] Параўн. Kurzowa (1993), p. 86: "Zjawiskiem częstszym jest w AWK redukcja *e*, *o* > *a* niż *e* > *i*, *y*, *o* > *u*." Параўн. таксама p. 230: "Przedstawiony materiał wykazuje liczebną przewagę przykładów redukcji *e*, *o* do *a* niż do *i* (*y*) oraz *u*. Można by stąd wnosić, że silniejsza była w dialekcie aż do II wojny światowej tendencja do akania". Параўн. таксама Smolińska (1983), p. 34.

Працэс рэдукцыі ненаціскнога */e/ > /i, y/* і */o/ > /u/* трэба адрозніваць ад артыкуляцыі закрытага */é/ > /i/* і закрытага */ó/ > /u/*. Як фактар развіцця закрытых галосных прымаецца шматразовы ўплыў усходнеславянскага субстрату. Параўн., напр., Mazur (1993), p. 213; Klemensiewicz (1965a), t. 2, p. 88.

[126] Гл. >>> 9.4.2. Заўвагі да спосабаў напісання галосных.

[127] Параўн. Kurzowa (1993), p. 91.

[128] Параўн. Kurzowa (1993), p. 86, 168, 176.

У канчатку дзеясловаў таксама сустракаюцца аказіянальныя звужэнні галоснага */e/*, якія можна тлумачыць на падставе рэдукцыі */e/ > /i, y/*[129]: *ne-jestiš-tī werōncim nam* (182b1), *pewne tī ne-bendziš prečil dekleracī terminī* (58b7), *ne-bendziš mowil lūdzōm tri dnī spelnō* (241a5), *weźmi gō picha i zlōšc* (27a5), *bajramnij*[130] *meśōnc ne-pōkaži-še pri pōgōdze* (24b4), *ā wźeliš za žōndze celesną pjanstwa i cūdzōlōstwa* (244b5), *nic tō ne-jest' tilkō tajemna zmōwa wi zmōwiliści-še ź nimi ōbačiwši-še w meśce* (127b4).

Характэрныя змяшэнне і блытаніна, звязаныя з рэдукцыяй ненаціскавага */e/ > /i, y/*, сустракаюцца ў прэфіксах *prze-* і *przy-*, што з'яўляецца тыповым для польскай мовы ў крэсах[131]: *za tō że stali prekezane lamōncimi* (10b8), *ktō pristōnpi granici prikezana bōžžegō* (30b1), *čemū wī īdzece i prestempūjece dō mōnžčiznī činōnc grech sōdōmśk'ij* (300a4).

Рэдукцыю */e/ > /i, y/* ў прыназоўніку *bez* (без) у наступных прыкладах можна тлумачыць праклітычнай пазіцыяй: *prispōri tō dla negō prispōrenem mnōgim biź liġbi* (32b8). У займенніку *żaden* (ніводзін) у наступным фрагменце пазіцыя */e/* перад насавым магла б быць важным фактарам для змены */e/ > /i, y/*[132]: *ne-bil žadin s-prōrōkaw žebi prišed z-cūdami tilkō za pōzwolenem bōžim* (389b3). Аднак застаецца пытанне, ці не прысутнічае тут проста арфаграфічная памылка. Гэта датычыць і наступнага прыкладу *przykazanie* (загад), што сустракаецца толькі адзін раз, і аналагічных выпадкаў мы не знаходзім: *napisaliśmi jemū w tablicach ō kōždej rečī prikezani i zakezane* (130a1).

У якасці гіперкарэктных формаў альбо арфаграфічных памылак з-за сваёй адзінкавасці можна разглядаць і наступныя прыклады: *nadchneleśmi dūchem našim w sercō twojej matk'ī žebi-še sprawila wedla dūcha nadchnōnegō* (248b4), *tak'e naciji mają bic w welk'em pōneženū i zginenū* (447a3).

У наступных вытрымках з тэксту прадстаўлены, верагодна, гіперкарэктныя спосабы напісання лацінізма *wyktoryja*, якія можна звязаць з рэдукцыяй */e/ > /i, y/*: *wkare jich pan bōg renką wašą i zwicenźi īch i da wektōriją wam nad nimi* (145b8), *wmōcōwali jich wektōriją* (421a2). Аднак часцей побач з імі мы знаходзім у тэксце тэфсіра правільныя формы: *ālbō wiktorija ālbō šehīdem*[133] *ūmrec* (150b3).

У лацінізмах на *-yja*, напр. *dyrekcyja, bestyja, fundacyja* і *nacyja*, у канчатку замест этымалагічна правільнага галоснага */i, y/* часта выяўляецца спосаб напісання праз *fatḥa* = *e* (*-eja*), які можна тлумачыць як гіперкарэктны ў дачыненні да рэдукцыі */e/ > /i, y/*: ōtō *tō jest derekceje bōžže prōwadzī ōną kōgō chce*

---

[129] Параўн. Kurzowa (1993), p. 230.

[130] Тур. *bayram* = свята.

[131] Гл. Kurzowa (1993), p. 86, 156, 230; Kurzowa (1985), p. 76. Параўн. Smolińska (1981), p. 35–36.

[132] Параўн. >>> 10.4.2. Закрыты */é/*; 10.7.3. Змена *iM > eM*.

[133] Ар. *šahīd* = пакутнік.

(377b2), *ūčinil ź nich besteji beźjani i świne* (91b1), *ne-prijentō fūndaceja īch ktōre fūndawana w wontepliwości* (157a6), *takōwe naceje bendą wolac ōd mejsc dalek'ich pridk'imī slōwami* (394a7), *takōwe naceji ōni są naprōwadzene na drōge dōbrą* (423b1); побач з частай формай *takōwe naciji ōni są lōtrōwe grešnici* (449b6).

10.8.2. Звужэнне ненаціскнога /o/ > /u/

У тэфсіры **L** 1725 г., які служыць асновай для гэтага даследавання, галосныя /o/ і /u/ не адрозніваюцца на пісьме. У рукапісе **I**, які паходзіць з канца XVIII ст., гэтыя галосныя /o/ і /u/ таксама не дыферэнцуюцца пісьмова.

Такое адрозненне канстатуецца толькі ў рукапісе **U** першай чвэрці XIX ст. Для /o/ ўжываецца камбінацыя *wāw* + *fatḥa* = *ô*, у той час як для галоснага /u/ былі ў распараджэнні *scriptio plena wāw* + *ḍamma* = *ū* альбо *scriptio defectiva* праз *ḍamma* = *u*.

У рукапісе **U** выяўляюцца толькі асобныя гучанні, якія маглі ўжывацца ў сувязі з рэдукцыяй ненаціскнога /o/ > /u/: *žūnâmi* U(25a2), *grūmâdô'* U(33b7), *grūmâtkô'* U(33b7), *bôgūmôlcem* U(37a4). Характэрным для прыведзеных прыкладаў з'яўляецца пазіцыя перад насавымі зычнымі. Гэтая пазіцыя галосных /o/ і /u/ садзейнічае агульнаму звужэнню ў артыкуляцыі[134]. Пра ўздзеянне наступных насавых зычных гавораць перш за ўсё прыклады, у якіх этымалагічны галосны /o/ ў націскной пазіцыі на пісьме пазначаецца як /u/: *člūnek* U(29b2), *žundâc* U(18b5), *persūnî* U(11b6).

Як выразную прыкмету дзеяння працэсу рэдукцыі /o/ > /u/ ў рукапісе **U** можна разглядаць спосабы напісання ненаціскнога /o/ праз *wāw* + *ḍamma* = *ū* ў пазіцыі перад ненасавымі зычнымі ў некаторых словах: *ūšūk'iwâjô'* U(6b1) побач з *ôšūkâjô'* U(6b2), *ôbôstwū'* U(36b7), *ūjūčileś* U(39b4), *ūpômentânne* U(37b6)[135].

Побач з гэтым знаходзяцца формы, у якіх замест этымалагічнага галоснага /u/ пішацца праз *wāw* + *fatḥa* = *ô* галосны /o/: *wakô''istej* U(25b8), *wekô''iste* U(33b1), *ô negô'* U(36b2), *ôbôstwū'* U(36b7), *pôblične* U(38b8).

10.9. Аканне

Развіццё акання ў тэксце тэфсіра вельмі моцнае і выразнае. Аканне выяўляецца ў фаналогіі, а таксама па-за ёй, у марфалогіі рукапісу, як найважнейшы ўплыў беларускага субстрату на польскую мову рукапісу.

Адкрытасць артыкуляцыі ненаціскнога /e, o/ > /a/ ў арабскім пісьме пазначаецца праз *alif* + *fatḥa* = *a*, *alif* + *alif diacriticum* = *â* альбо *alif* + *madda* = *ā*

---

[134] Гл. Strutyński (1993), p. 51. Параўн. >>> 10.4. Закрытыя галосныя; 10.7. Уплыў плаўных і насавых на галосныя.

[135] У прыведзеных прыкладах не можа застацца па-за ўвагай, што гэта могуць быць проста архаічныя спосабы напісання галоснага /o/ праз *wāw* + *ḍamma* = *ō* / *ū* альбо толькі праз *ḍamma* = *o* / *u*.

замест *wāw + ḍamma = ō* альбо толькі *ḍamma = o* для галоснага */o/* і *fatḥa = e* для галоснага */e/*.

Як рэпрэзентант галоснага */a/* на пісьме таксама часам з'яўляецца *scriptio defectiva* праз *fatḥa = e*. Такія спосабы напісання толькі праз *fatḥa = e* для */a/* паказваюць на якасную рэдукцыю ненаціскнога */a/ > /e/*, якая хоць і супярэчыць агульнапрынятым нормам вымаўлення сучаснай беларускай мовы, але існуе ў паўднёва-заходнім дыялекце[136].

10.9.1. Аканне */o/ > /a/* перад націскам

Выпадкі акання */o/ > /a/* ў пераднаціскным складзе вельмі шматлікія. Тут можна прывесці падборку найбольш выразных прыкладаў: *ābserwowac* (25b5), *tilkō pan bōg we ā ōni ne-wedzą i ne-spadzewajōn-śe k'edi mają bic wskrešeni* (308a4), *zastawują* (31b2), *naprawadzōnimi* (21a3), *we pan bōg ā ūčinkach wašich* (26a8), *ci ktōre sprečka činą ā jedinōstwe bōžžem* (397a4), *bijōn-śe na drōdze balwanōw ābrazōw* (69b2), *zapewne ōni stali lūdem latrōwśk'im zbitečnim* (404a4), *bō pan bōg wšechmōcnij dūžij manarcha* (451a7), *naprawadzī* (26b2), *prawadzī* (36a7), *stwarena* (21b8), *swajimi* (13a1), *ābačim* (10b2), *w mōrū śe tapili* (386b7), *wiprōwadziliśmi jich z-jerūzalima dō źemi ūradzejnej dō damaškū i ōd nej dō jehibtū* (275a4), *uspakōjili-śe* (28a3), *pewne tī bendzeš ōd ūwalnōnich* (313b1), *pōdnōsl was jednich na drūgich mejscami ūrendami skarbami ščenścam ābī was wiprabōwal* (116b5), *i wiprabūjem was we zlōścach i w dōbrōcach w ōšūkanū śwatōwim* (258b2), *wiprawadzi* (35a1).

Характэрным для ўсяго тэксту з'яўляецца бессістэмнае размеркаванне акання. У блізкім кантэксце могуць сустракацца тыя самыя словы з аканнем альбо без яго: *pewne newernik'i ci ktōre mōwili pewne bōg ōn pâmazanec 'īśá sīn merjemin*[137] *mōw ī muchemmed ā ktō wirwe ōd bōga jaką reč jeślī zachce žebi zgūbil pōmazanca 'īśá sīna merjeminegō* (85a7).

Аканню падлягае перш за ўсё галосны */o/* ў першым складзе перад націскам, у той час як другі склад перад націскам не закранаецца: *ōsabliwe* (37a7), *i ne-mają pōwadira sōbe w tej drōdze* (72b8), *pōzwalenem* (15b6), *bogabōjnij* (24a3). У прыведзеных тут прыкладах звяртае ўвагу тое, што аканне */o/ > /a/* заўсёды адбываецца там, дзе ў націскным складзе знаходзіцца любы іншы галосны, акрамя */a/*, што ў прынцыпе з'яўляецца тыповым для гэтак званага дысіміляцыйнага акання[138]. Указанне на дысіміляцыйнае аканне маецца ў рэдукаваным спосабе напісання галоснага */o/* праз *fatḥa = e* непасрэдна перад націскным складам з галосным */a/*: *naprōd wojewali zamk'i ōdbirali na īma muchemmeda i wajewali na tich ktōre ne-werili* (14a5), *zwedze tim mnōgich i naprewadzi tim*

---

[136] Гл. De Bray (1980), p. 189.

[137] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[138] Гл. Wexler (1977), p. 79. Параўн. De Bray (1980), p. 189. Дысіміляцыйнае аканне сустракаецца на паўночным усходзе беларускага моўнага арэала.

mnōgich (8a4). Зразумела, можна лёгка прывесці супрацьлеглыя прыклады, у якіх пераднаціскны галосны /o/ запісваецца праз *fatḥa* = *e* незалежна ад галоснага ў націскным складзе: *k'edī prijdą dō was werōnce muśulmank'ī ōd newernikōw ūcekši pretō prebūjce jich či-'ōd menžōw ūcekli či-wara ūlūbilī* (451b4), *i zbitečnij majstrū čarōwnik nawjádōmšij mōdl-še za nami bōgū twejemū* (403b7), *reklī prōrōci jich či-wī ō bōgū wentpice*[139] *tworci nebōs i źemī* (198a8), *bōndzece pōwelnimi i pōslūšnimi bōgū i pōslūšnimi prōrōku* (95a6).

Таксама калі немагчыма даказаць дзеянне дысіміляцыйнага акання, то можна вызначыць правіла, што *scriptio defectiva* ненаціскнога /o/ толькі праз *fatḥa* = *e* характэрнае для першага складу перад націскам і што яно відавочна выражае рэдукцыю /a/ > /e/[140].

10.9.2. Аканне /o/ > /a/ пасля націску

Аканне пры ненаціскным /o/ > /a/ ў складах пасля націску – гэта марфалагічная з'ява. Далей будзе разглядацца некалькі тыповых марфалагічных катэгорый, у якіх аканне праяўляецца асабліва выразна.

10.9.2.1 Аканне /o/ > /a/ ў скланенні назоўнікаў

– У наз. і він. скл. адз. л. н. р.[141]: аканне вельмі распаўсюджанае, асабліва ў назоўніках род. скл. на *-stwo*: *nad nimi jest' błōgōslawenstwa ōd bōga* (21b2), *wźenlišce za tō cō čitają jim šetani čarōdzejstwa* (15b2), *uwerili w jedinōstwa bōžże* (27a7), *tilkō tō šetani cō krōlewstwa jemū wźeli* (15b2), *wam prišlō pōdōbenstwa tich* (28a2), *berōnc zlōta na cela* (14b4), *mace dac jej należnōści wjána i ōdzeža* (32a2), *ōka za ōka nōs za nōs ūchō za ūchō zōmb za zōmb* (89a7). У складах пасля націску таксама знаходзіцца *scriptio defectiva* ненаціскнога /o/ толькі праз *fatḥa* = *e*: *ōddal diwidowi pan bōg krōlewstwe jegō* (34a2), *ōwšem ten korān pišmō i cūde bōžże* (324b2).

Пад уплывам акання ў назоўніках ніякага роду можа адбывацца змена роду: пераход у жаночы тып скланення. Такая змена роду характэрная для беларускай мовы: *āle ten cō ūweril [w] jedinōstwa bōžžą i dōbre ūčink'i činil* (238b7). Змена роду робіцца тут выразнай праз камбінацыю назоўніка з прыметнікам жаночага роду[142].

– У твор. скл. адз. л. м. і н. р. побач са звычайным польскім канчаткам *-em* не вельмі часта сустракаецца беларускі канчатак *-om*. Пад уплывам акання да-

[139] Тут *o*, якое паходзіць ад *o* насавога, падлягае рэдукаванаму спосабу напісання /o/ > /e/, калі гэта не анамалія, звязаная з насавымі галоснымі.

[140] Параўн. Антонович (1968), с. 286; ён таксама звяртае ўвагу на гэтую з'яву: "Создается, однако, впечатление, что такое употребление фатхи заметно чаще встречается в первом предударном слоге, чем в других безударных слогах".

[141] Гл. >>> 12.2.1. і 12.2.4.

[142] Гл. >>> 13. Змена роду.

даткова з'яўляецца канчатак *-am*[143]. Асабліва часта канчатак *-am* з'яўляецца ў назоўніках н. р. на *-stwo*: *glūpstwam* (6b8), *klamstwam* (9b3), *lōtrōwstwam* (6b4), *newerenstwam* (14a4), *pōdōbenstwam* (12a4), *rōzkazanjam* (15a4). Характэрнае суіснаванне розных канчаткаў у блізкім кантэксце: *ktō stane <u>židōm</u> ābō <u>grek'em</u> (16b5), ne-bil ōn <u>židam</u> āni <u>mušrik'em</u>*[144] (19a6), *ōn bendze <u>člōwek'em</u> i pewne ōn bendze welk'im <u>člōwekam</u>* (188a3), *rekl člōweku pōbōžnemū bōndz <u>k'afirinem</u>*[145] *ā k'edi stal <u>k'afirinam</u> rekl šetan pewne ja ōdlōčam-še ōd cebe* (449b1).

– У род. скл. мн. л. побач з канчаткам *-ow* (*-ów*) часта выкарыстоўваецца канчатак *-aw* (гл. >>> 12.1.9.): *ōd bōbaw i grōchaw* (11a4), *ōjcaw* (19a2), *prōrōkaw* (34a4). Побач з гэтым рэгулярна ўзнікае *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*: *prōrōkew* (7b4), *prōrōkew pōslancew* (34a5), *ōbrendew* (21b3), *kōgō zwedze pan bōg jūž nemaš temū ōd <u>direktōrew</u> nikōgō* (377b3), *ōdzene iź źelōnich <u>ātlasew</u> i ź žōltich <u>ōtlasōw</u>* (408a1).

– У дав. скл. мн. л. пры моцным распаўсюджванні канчатка *-am* замест звычайнага ў сучаснай польскай мове канчатка *-om* у якасці магчымага дадатковага абгрунтавання акання побач з марфалагічнай інтэрферэнцыяй з беларускім субстратам можна прыняць тое, што ў дав. скл. мн. л. канчатак *-am* з *a*-скланення стаў агульным[146].

– У месн. скл. мн. л. побач са звычайным канчаткам *-ach* у асобных выпадках сустракаецца канчатак *-ech*. Часам гэты канчатак *-ech*, які ўзнікае спарадычна, з'яўляецца толькі *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага /*a*/ праз *fatḥa* = *e*[147].

10.9.2.2. Аканне /*o*/ > /*a*/ ў скланенні прыметнікаў

– У скланенні прыметнікаў /*o*/ ў канчатку род. і він. скл. адз. л. м. і н. р. *-ego* ніколі не падлягае аканню[148].

10.9.2.3. Аканне /*o*/ > /*a*/ ў спражэнні

– У 3-й ас. н. р. пр. ч. пры аканні ў некаторых выпадках супадаюць формы н. і ж. р.[149]: *pō tim cō <u>prišla</u> tōbe ōd na' ūk'i* (20b3), *k'edi ōbačice že <u>prichōdzila</u> wam kerane bōžže* (102b4), *bō pewne peklō <u>ōgarnela</u> newernikōw* (150a7)[150]. Наступныя

---

[143] Гл. >>> 12.1.5. і 12.2.5.

[144] Ар. *mušrik* = шматбожнік.

[145] Ар. *kāfir* = нявернік.

[146] Гл. >>> 12.1.10; 12.2.9; 12.3.10.

[147] Гл. >>> 12.1.13; 12.2.12; 12.3.13.

[148] Гл. >>> 14.1.3.

[149] Параўн. Kurzowa (1993), p. 86.

[150] Часам узнікае сумненне: мае тут месца аканне альбо змяшэнне польскага і арабскага сінтаксісу. Так, напр., у апошнім прыкладзе магчымая інтэрферэнцыя з арабскай мовай: {**wa-inna ğahannama la-muḥīṭatun bi-l-kāfirīna**} = *bō pewne peklō ōgarnela newernikōw*. Гэтае месца

прыклады можна разглядаць як гіперкарэктныя альбо як сінтаксічна недапасаваныя формы: *gdiž prišlō mne wjádōmōšc ōd na'ūk cō ne prišlō dō cebe* (243b1), *pretō jich wźelō srōgōšc mōja* (382b7). Тут таксама часам сустракаюцца спосабы напісання толькі праз *fatḥa* = *e*: *bō ješče ne-bile pōdōbenstwa muchemmedu* (22b7)[151].

– У н. р. пасіўнага дзеепрыметніка пр. ч. таксама калі-нікалі адзначаецца аканне ў канчатку: *žebi-tam chwalōna w nim īma jegō* (17a3).

10.9.2.4. Аканне /*o*/ > /*a*/ ў прыслоўях

У прыслоўях на *-o* аканне сустракаецца ў асобных выпадках. У наступным прыкладзе можна прыняць за падставу тое, што фіналь прыслоўя *-o* пранікла з беларускай мовы: *spōkōjna chwalce bōga* (32a8).

10.9.3. Аканне /*e*/ > /*a*/ перад націскам

Аканне ў галосным /*e*/ > /*a*/ ў пераднаціскным складзе сустракаецца не так часта, як у галосным /*o*/ ў той самай пазіцыі: *ōbweściliśmi dō mōjžeša i dō brata jegō žebi-śe fūndōwali mešk̃ane dla lūdzej swojich w agībce* (168a3), *pōdōbenstwo jich w ãwaneliji (422b1), ã ne-jest ten korãn slōwo pōãtick'e* (467b3). Для галоснага /*e*/ ў пераднаціскной пазіцыі характэрным з'яўляецца тое, што аканне ў пазіцыі пасля цвёрдых зычных, асабліва пасля гістарычна мяккіх /*č, š, ž*/, узнікае часцей[152]: *či-bendzece sprečaci-śe z-muchemmedam cō widzal w zūpelnōj parsōne gebrijela* (431b8), *čakami na cebe* (430b5), *sōčawici* (11a5), *dla śirōt i dla žabrakōw* (448a6). Асабліва звяртае ўвагу аканне /*e*/ > /*a*/ пасля гістарычна мяккага ў польскай мове /*rz*/ (< /*r'*/), што ўказвае на зацвярдзенне /*r'*/ > /*r*/, як гэта адбываецца ў беларускай мове[153]: *pradali* (23a4), *spračali-śe* (34a8), *spračajōn-śe s-tōbą ō prawdī*[154] *pō ōznajmenū jim že mają źwirchnōšc i wiktōriją* (137a8), *prawraca nōc na dzen i prawraca dzen na nōc* (375a7). Тут таксама частымі з'яўляюцца ваганні ў размеркаванні акання, бо аднолькавыя формы сустракаюцца як з аканнем, так і без яго: *zapradali tim dūši jich* (14a6), *zapredali tim dūša swoje* (15b7).

перакладалася цалкам паралельна арабскаму тэксту, і форму ж. р. дзеяслова *ōgarnela* ў польскай мове можна разглядаць як рэфлекс арабскага актыўнага дзеепрыметніка ж. р. *muḥīṭatun*, які функцыянуе як фінітная дзеяслоўная форма.

[151] Такія фрагменты тэксту выглядаюць у розных рукапісах па-рознаму. У рукапісе **I** стаіць адз. л. *bō ješče ne-bilō pōdōbenstwo muchemmeda* I(22b7), у той час як у рукапісе **U** дапускаецца мн. л. *bô' ješče ne-bîlī pô'dô'benstwâ muchemmedâ* U(22b7).

[152] Параўн. Антонович (1968), с. 294; ён згадвае пераход ненаціскнога /*e*/ > /*a*/ ў пазіцыі пасля /*č, ž , š*/ і асабліва пасля зацвярдзелага /*r'*/ > /*r*/ як тыповы.

[153] Наконт беларускага зацвярдзення /*r'*/ > /*r*/ і развіцця польскага /*r'*/ > /*ř*/ > /*ž*/ гл. >>> 11.4. Фанемы /*r*/, /*ř*/ і /*ž, š*/ (< /*ř*/).

[154] Магчыма, *-i (-y)* тут трэба разглядаць як канчатак роднага склону і інкангруэнцыю ў сінтаксісе.

Наступны адзінкавы прыклад можна разглядаць хутчэй як гіперкарэктную форму, звязаную з ляхіцкай перагаласоўкай, чым як аканне: *ne-mašajce w tō ẓlīch ōbirkōw* (36b6). Выпадкі якання ў тэксце тэфсіра нельга даказаць. Яканне ў беларускіх тэкстах татараў Вялікага Княства Літоўскага наогул сустракаецца вельмі рэдка[155].

10.9.4. Аканне /e/ > /a/ пасля націску

У процілегласць пазіцыі перад націскам пераход ненаціскнога /e/ > /a/ ў пазіцыі пасля націску праяўляецца вельмі шырока.

Часта сустракаецца пераход ненаціскнога /e/ > /a/ ў паслянаціскным складзе ў суфіксе *-ek*[156]: *datak* (16b4), *chcelibi-śe wrōcic w nedōwarstwo pōneślibi ten zamūtak i newernōśc* (340a7), *na źemi jawnij zamūtak ūčini* (384b8), *bō pân bōg jest ktōrij učinil dla was bidlenta dla wśedena na nich i jazdi ōd nich prendk'ej ā nektōre ź nich cō mace jeśc i dla was jest w tim pōžitak welk'ij* (389b6), *āle stal-śe rōzsondak i wirōk bōžij medze nimi* (396b7).

Прыкметна адбіваецца паслянаціскное аканне /e/ > /a/ на сістэме скланення і спражэння. Пераход галоснага /e/ > /a/ ў канцы слова вельмі распаўсюджаны. Пры гэтым змена ненаціскнога канцавога /-e/ > /-a/ праяўляецца ў адпаведных канчатках скланення і спражэння, а таксама ў тых канчатках, якія ўзыходзяць да дэназалізаванага /-ę/ > /-e/. Зараз яшчэ раз абмяркуем найважнейшыя марфалагічныя катэгорыі, у якіх мы часта знаходзім аканне.

10.9.4.1. Аканне /e/ > /a/ ў скланенні назоўнікаў

– Наз. і він. скл. адз. л. н. р. на *-e*: *rozlōnčilem dla was mōra* (10a4), *bōg priwodzī slōnca ōd ūschōdu (35a6), casnō stalō preź nich serca jegō* (177a6), *daj-nam na tim świece dōbrō pōžice ā na ōnim świece zbawene i spaşena* (26b6), *dla was jest twarda kerana i grekōwe ōd tegō cō bōga klamliwe persōnice* (257a6)[157].

– Наз. і він. скл. адз. л. н. р. на дэназалізаваны */-ę/ > /-e/*: *zamk'i ōdbirali na īma muchemmeda* (14a5), *berōnc zlōta na cela* (14b4). Але паралельна гэтаму заўсёды

---

[155] Гл. Антонович (1968), с. 284: "В безударных же слогах после мягких согласных в изучаемых нами текстах фатха употребляется значительно чаще, чем буква е в современных белорусских текстах, где, как известно, /'e/ в первом предударном слоге и /'a/ во всех безударных слогах обозначается буквой я".

[156] Марфемы *-ek* і *-ak* у сярэдняпольскі перыяд канкурыравалі паміж сабой.

[157] Гл. ДАБМ № 17: канцавое *-e* часта пераходзіць у *-o*, што з'яўляецца дыялектнай асаблівасцю беларускай мовы (гл. >>> 10.11. Змена */e/ > /o/* ў канцы слова). Асабліва часта ў тэксце тэфсіра знаходзяцца такія формы, як *slōncō, mōrō, mejscō, sercō*. (Гл. >>> 12.2.1; 12.2.4.) З прычыны гэтага можна лічыць пераход *-e > -o* прамежкавай фазай на шляху да акання.

з'яўляюцца формы без акання: *swestūjem cebe sinem īme jemū jechjá*[158] (241a1), *wźelišce za bōga cele* (14b3)[159].

– У він. скл. адз. л. ж. р. з дэназалізаваным канчаткам /-ę/ > /-e/ аканне праяўляецца вельмі часта. Канчатак *-a* ў він. скл. адз. л. ж. р. з'яўляецца тыповай рысай польскай мовы паўночных крэсаў. Гэты канчатак звычайна тлумачыцца як перанос канчатка наз. скл. адз. л. *-a* ў він. скл. адз. л.[160]: *pisali t'ewrīt'*[161] *kśenga renkōma swajimi* (13a1), *zapredali w tim prawda za cena malą* (13a2), *trimajce wara bōžą* (19b2); *naprōwadzil was na drōge prawdziwą ãzale wī chwala ōddawac bendzece* (24b5), *zamknice jich w dōm ālbō w tūrma* (62a4), *pewne pan bōg jest kajeta prijmūjōncij* (62a6), *ōtō dziś spelnilem wam wjára waša* (82b7), *ã wchōdzōnc w brōma padnice twarem dō źemi* (132b3).

– У месн. скл. адз. л. усіх родаў: *w tej strōna* (17a5), *w śila i w na'ūce* (33a7), *ã pōtim ne-wontpili ni-w čim i starali-śe welk'im staranem i skarbami swīmi i dūšami swojimi na drōdze bōžžej na gezejstwa*[162] (424b2).

– У кл. скл. м. р.: *pewne ja widzalem prez sen że ja mam zarznōnc cebe pretō rōzūmem że i tī widzaleś rekl sīn ī ōjča čin-tō cō tōbe rōzkazanō* (367b1).

– У наз. і він. скл. мн. л. (не мужчынска-асабовая форма): *zapredali tim dūša swoje* (15b7), побач з: *zapradali tim dūši jich* (14a6), *w ten dzen ōbači člōwek cō zarōbili renca jich i rekną newernici i*[163] *beda naša* (480b6).

10.9.4.2. Аканне /e/ > /a/ ў скланенні прыметнікаў

– У наз. і він. скл. адз. л. н. р.: *serce waša jakō kamene albō twardzejša* (12b1), *serca naše jest' zakrita* (14a4), *trafil na weś ālbō mastō ã ōne bilō pūsta* (35a7), *činil cheramem*[164] *je'kūb mensō werblōndōwa* (48b5). З іншага боку, характэрным з'яўляецца паралельнае ўжыванне з аканнем і без яго: *lepše i wiżša pōšanōwane* (30a5).

– У він. скл. адз. л. ж. р. сустракаецца канчатак *-ę*, які перайшоў са скланення назоўнікаў, замест *-ą*, які ў канцы слова дэназалізуецца /-ę/ > /-e/: *wprōwadzī jich pan bōg w laske swoją świente* (156a2)[165]. Як у назоўніках, так і ў прыметніках

---

[158] Ар. *Yaḥyā* = Ян.

[159] Параўн. польск. *imię* з бел. *імя*, польск. *cielę* з бел. *цяля*. Замест акання /-ę/ > /-e/ > /-a/ тут можна з такім жа поспехам прыняць пераход /-ę/ > /-a/ ў беларускай мове.

[160] Гл. >>> 12.3.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[161] Ар. *tawrā* = Тора.

[162] Гл. >>> 3.1.1. Арабізм " *ġāzī*" (змагар за веру).

[163] Тут размова ідзе пра клічную часціцу *i* (о).

[164] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

[165] Гл. >>> 14.1.13. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду; параўн. Klemensiewicz (1965a), p. 315. Канчатак *-ę* у прыметніках можа ўзнікаць таксама па аналогіі з прыналежнымі займеннікамі. Канчатак /-ę/ > /-e/ з'яўляецца першапачатковым канчаткам прыналежных займеннікаў: *zlam gō na swoje śije* (25b6).

дэназалізаваны канчатак /-ę/ > /-e/ падлягае аканню і таму часта з'яўляецца як *-a*: *k'edi ōdprawice cheğğ*[166] *i ōfara waša znōwu wspōminajce pana bōga* (26b4), *ōtō dziś spelnilem wam wjára waša i spelnilem nad wami laską mōją* (82b7), *pewne pan bōg nagōtōwal dla newernikōw menka pōtenpōna* (73b5), *tak was premeni s-taj natūri w inša natūre* (486a3).

– У твор. скл. адз. л. ж. р. замест канчатка *-ą* часам з'яўляецца спосаб напісання праз *alif* + *fatḥa* = *a*, а ў асобных выпадках нават *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e* без пазначэння назальнасці праз *sagır-ı-nūn* = *ñ*: *takōwe naciji są wojską [!] bōžža*[167] (447a8), *wšak bilišce martwe źemą i ōżiwil was* (8a7). Такія спосабы напісання маюць месца ў твор. скл. адз. л. толькі зрэдку, і іх трэба тлумачыць на падставе сціравання розніцы паміж формамі склонаў праз аканне і праз рэдукаванае *scriptio defectiva* ненаціскнога */o, a/* з дапамогай толькі *fatḥa* = *e*, якое сустракаецца адносна часта[168].

– У наз. і він. скл. мн. л. (не мужчынска-асабовая форма): *pōdnōsl nektōrich na pōdwišona mejsca* (34a6), *pewne bōjaźnik'i bōžža w mejscach spōkōjnich w rajach* (408a1). Тут таксама характэрнай з'яўляецца наяўнасць у блізкім кантэксце аднолькавых канчаткаў з аканнем альбо без яго: *škōdliwe reči īm i zarazliwa* (15b6), *mōwili pewne dōmi naše ōtwarta są ā ōni są ne'ōdtwarte* (340a5).

10.9.4.3. Аканне /e/ > /a/ ў спражэнні

– У 1-й ас. адз. л. цяп. ч. альбо цяп.-буд. ч. пры дэназалізаваным канчатку: *ne-prijma ja ōd wšitk'ich* (18a3), *ūprawadza jich dō rajōw ceką spōd nich rek'i* (59a2), *ā ja benda činil cō mne pristōji* (112b4), *ōtō tō wšitkō z-lask'i darū pana bōga megō dla wiprōbōwana mne či-benda ja chwalōncij jegō* (305b7), *pewne ja prijda dō was i ź welk'imi dōwodami i ź jawnimi cūdami* (406b7).

– Як рэдкія трэба разглядаць наступныя прыклады пр. ч. 1-й і 2-й ас. адз. л.: *rekl mūśjá*[169] *bōže mōj pewne ja skriwdzilam grechami dūše mōje* (311b4), *prišlō dō cebe pišmō mōje korān pretō ōklamalaś gō i pōdnōslaś-śe w picha i zostaleś ōd newernich* (380b6).

– У 2-й ас. мн. л. цяп. ч.: *āle terez wī bendzeca zwicenžcami jeśli bendzece dōbra weric* (52b6), *pō tim dō negō pōwrōcica* (104b6).

– У 2-й ас. мн. л. заг. л.: *ne-bōndzca wi tak'imi jakō ktōre newernikami stali* (54b6), *ā k'edī ōddawac bendzece dō nich skarbi jich mejca śwjádka na tō* (60b2), *nic tō ne-jest tilkō čarōwnik barzō ūčōnij chce ōn żebi wiprōwadzil was ź źemī wašej cō nam kežeš jemū činic rekli ūsadzca jegō w tūrme* (127a3). Зноў характэрным з'яўляецца тое, што ў блізкім кантэксце заг. л. выступае з аканнем і без яго:

---

[166] Ар. *ḥağğ* = паломніцтва ў Мекку.

[167] Гл. >>> 13. Змена роду.

[168] Параўн. >>> 10.10. Змяшэнне галосных /a/, /e/ і /o/ пад націскам.

[169] Ар. *Mūsā* = Майсей.

reče pan bōg dō mūkarōw weźce gō i zaprowadzca dō nagōršegō pekla (407b7), *rekl mōjžeš dō lūdzej swojich prōšca pōmōci i pōlecajce-śe panū bōgū* (128a2), *bōjce-śe bōga i prōšca ū negō* (87b5).

– Зваротны займеннік *się* звычайна з'яўляецца ў форме *sia*[170] з беларускай зменай /'ę/ > /'a/. Фактарам гэтага магло быць аканне, бо канцавое дэназалізаванае /-ę/ > /-e/ звычайна падлягае аканню і ў такім выпадку запісваецца праз *alif + fatḥa = a*: *ā ktō bi znendzal w glōdze ne-žondajōnc tegō pred tim strōnil-śa dla grechu a ź newoli jadl ne-dō sitū* (83a1) *pri' ōzdōbila śa pašna i źela (162b2), ten jest bōgem ktōrij pōdnōsl i pōstanōwil nebōsa bez žadnegō filarū widzice ōni ā pōtim ōpanōwala śa mōc jegō na 'eršu*[171] *majstace* (192a1), *także ūčinila śa ścana mōcnō ne-mōgli preleźc i też ne-stawalō īm śilī na tō žebi ją prebic* (239b1), *rekl źek'erja i karmicelū mōj pewne ū mne kōści ōslabili ōdešla śila ōde mne i ōświecila śa i ōśiwala glōwa prez starōśc* (240b5), *źbližila śa gōdzīna sōndnegō dna* (433b6).

10.9.4.4. Аканне /e/ > /a/ ў прыслоўях

Аканне нерэгулярна з'яўляецца таксама ў прыслоўях. Тут мы маем справу альбо з аканнем */e/ > /a/*, альбо ў яго аснове ляжыць беларускі канчатак *-o*, які падлягае аканню: *pan bōg we ktō jim miśli źle a ktō dōbra* (29a4), *jak wela wigūbiliśmi pred nimi ōd grešnich* (245b6).

10.9.5. Scriptio defectiva */a/* праз *fatḥa = e*

Акрамя акання, якое моцна ўплывае на вакальную сістэму тэфсіра, пра што падрабязна мы казалі вышэй, сустракаецца *scriptio defectiva* галоснага */a/* толькі праз *fatḥa = e*. Гэта *scriptio defectiva* галоснага */a/* дадаткова ўскладняе карціну якасці галосных у тэксце тэфсіра.

Тыповым для ўжывання ва ўсім пісьменстве "літоўскіх" татараў, а таксама ў тэксце тэфсіра, з'яўляецца *scriptio defectiva /a/* ў пазіцыі пасля цвёрдай графемы *qāf = k*: *prijōl muchemmeda za prōrōke* (397a4), *na ōčach jich zaslōne i dla nich menke welka* (6a8), *newolnica muśulmanke jest lepša ōd k'afirk'i*[172] (19a5). Гэты спосаб напісання ў прынцыпе можна патлумачыць як чыста графічны варыянт.

Паралельна гэтаму неабходна разгледзець таксама *scriptio defectiva /a/* незалежна ад графемы *qāf = k*. За некаторымі выключэннямі, яны знаходзяцца ў ненаціскной пазіцыі. Прыклады ў складзе перад націскам: *mī ōdeklerawališmi*

---

[170] Зваротны займеннік у прыведзеных прыкладах мае сваё беларускае аблічча *sja*. Як паказвае прыклад, ён згодна з беларускай нормай для дзеяслоўных формаў, якія канчаюцца на галосны, не скарачаецца, як гэта адбываецца ў рускай мове. Пазіцыя займенніка пасля дзеяслова адпавядае беларускай мове, якая не ведае энклітычнага ўжывання зваротнага займенніка, што пераважае ў польскай мове.

[171] Ар. *'arš* = трон.

[172] Ар. *kāfir* = няверник.

termin dōbrij (316b2), *staral-śe ū negō steranōm dōbrim i ūčinkami dōbrimi* (221b2), *gdiž ōbrechūjemi śe i ōbličimi śe jich liġbō* (246b7), *na drōdze bōžžej na gezejstwa*[173] (424b2), *sprewedliwim* (20a2), *ten ktōrij stworil mne ōn prawdziwij prōwadzi drōgą prewdziwą* (297a2), *bō pewne pan bōg cōkōlwek jest āgernōl wšitk'e rečī wjádōmōścą* (459b8).

Прыклады *scriptio defectiva* галоснага */a/* толькі праз *fatḥa* = *e* ў пазіцыі пасля націску: *sprečka jich pōtōnpōne* (397a4), *ja ne-mōwa wam že pri mne jest skarbnica bōžže* (103b2), *wipadli s-prikazane bōžegō* (11a8), *z-naśene našegō* (18b2), *dla rōzsōndzene* (27b7), *ōšūk'iwają pana bōge* (6b1), *dla nich jest' zaplata jich ū bōge* (37b3), *ā dnje sondnegō ōbačiš tich ktōre klamali na bōga twari jich čarne bendą* (380b7), *zlašče* (7b3) (25a5), *znak'i jedinōstwe bōžžegō* (58a8), *pewne dekleracija bōžže prawdziwa* (311a5), *tō jest direkceje bōžže prōwadzi ōną kōgō chce* (377b3), *bendōn-śe rōskōšōwec tam na majstatach* (477a6), *preprawiliśmi mōješe ī tich cō ź nim ōraz wšitk'ich* (297a2), *terez* (12a6) (13a1) (22b2) (24b8) (35b3). *Scriptio plena* праз *alif* + *fatḥa* = *a* сустракаецца толькі адзінкава ў слове *teraz*: *jūž tō bilō ōd nas pred časem wedōme cō śmi jemū teraz činili* (261b3).

Як можна бачыць, спосаб напісання */a/* толькі праз *fatḥa* = *e* ахоплівае галосны */a/* незалежна ад яго марфалагічнай катэгорыі і функцыі, у якіх ён выступае. Прыведзеныя прыклады сведчаць пра тое, што са *scriptio defectiva* праз *fatḥa* = *e* праяўляецца рэдукцыя ў якасці галоснага */a/* > */e/*[174].

10.9.6. Моцнае (поўнае) аканне

Здаецца, што мы ў тэксце тэфсіра маем справу з уздзеяннем *моцнага (поўнага) акання*. Аканне адлюстроўваецца перад націскам і пасля яго, ахоплівае прынцыпова ўсе ненаціскныя склады, і асабліва ў канцы слова. Уздзеянне *дысіміляцыйнага акання* можна адзначыць толькі ў адзінкавых выпадках і толькі ў форме рэдукцыі[175].

Мы не знаходзім у тэксце тэфсіра слядоў *якання*, якое характэрнае для сучаснай беларускай нарматыўнай мовы, аднак не сустракаецца ў паўднёва-заходнім дыялекце[176].

---

[173] Гл. 3.1.1. Арабізм "*ġāzī*" (змагар за веру).

[174] Параўн. De Bray (1980), p. 189. Параўн. Łapicz (1986), p. 111–112.

[175] Гл. Wexler (1977), p. 79, 148–149; гл. p. 79: "Broadly speaking, the NE area now has dissimilative akan'e, while strong akan'e (also called full akan'e) is mainly characteristic of the Ce areas (though it can be found in other areas as well); at the same time, there is also evidence of dissimilative akan'e in the Ce areas".

Параўн. таксама Łapicz (1986), p. 109. Лапіч канстатуе ў даследаваным кітабе "змешанае" аканне, поўнае і няпоўнае, таму што ў тэксце кітаба канец слова часта не закрануты аканнем.

[176] Гл. Wexler (1977), p. 81, 146 f. Параўн. Łapicz (1986), p. 111.

Уздзеянне акання несістэматычнае, г.зн., што аканне хаця і ахоплівае галосныя /o/ і /e/ ва ўсіх пазіцыях, аднак не абавязкова. Аканне не з'яўляецца складнікам фаналагічнай сістэмы мовы тэфсіра, а несістэматычна пранікае як фаналагічная асаблівасць беларускага субстрату, будучы нерэгулярна рассеяным па польскім тэксце. Ідэнтычныя словы і формы могуць выступаць то з аканнем, то без яго, без відавочнага правіла дыстрыбуцыі. Хаця, здаецца, сфармаваныя праз аканне склонавыя канчаткі ў некаторых выпадках займаюць месца ў марфалагічнай сістэме імёнаў[177]. Але ўяўляецца, што іх размеркаванне і ўжыванне застаецца ўрэшце выпадковым.

У пазіцыі перад націскам можна заўважыць відавочную тэндэнцыю да дадатковай рэдукцыі /a/ > /e/, перадусім у першым пераднаціскным складзе. Наогул *scriptio defectiva* галоснага /a/ толькі праз *fatḥa* = *e* звяртае на сябе ўвагу таксама ў іншых пазіцыях, што пераважна з'яўляецца надзейнай прыкметай рэдукцыі ненаціскавага /a/ > /e/. З іншага боку, спосаб напісання галоснага /a/ праз адну толькі *fatḥa* = *e* пасля цвёрдай графемы *qāf* = *k* трэба строга аддзяляць ад акання – умоўнай рэдукцыі /a/ > /e/ – як толькі графічны феномен. Наступствам моцнага акання і рэдукаванага спосабу напісання галоснага /a/ з'яўляецца змяшэнне галосных /a/, /o/ і /e/; яно перш за ўсё ўплывае на марфалогію.

10.9.7. Гіперкарэктнае гучанне, звязанае з аканнем

У сувязі з аканнем выступаюць гіперкарэктныя формы, у якіх замест этымалагічна карэктнага ненаціскнога галоснага /a/, /o/ альбо /e/ паказваецца іншая галосная. Такія спосабы напісання сведчаць, што ў вакальнай сістэме роднай мовы перапісчыка ў ненаціскных галосных адбываюцца рэдукцыйныя працэсы, якія з'яўляюцца прычынай няўпэўненасці наконт якасці этымалагічных галосных, якія знаходзяцца ў яе аснове. Аднак у прыкладах з закрытым /á/ трэба прымаць да ўвагі таксама рэфлекс /á/ > /o/[178].

– **Abraham** (Абрагам): *k'edi prišli pōsli naši dō ōbrahama* (322b2).

– **aspekt** (аспект – у астранамічным сэнсе): *nemaš na tō ktō bi tō ōdbil ōd bōga pana planet i ōspektōw wšitk'ich śedmi nebōs* (468a2).

– **atlás** (атлас – від каштоўнай тканіны): *ōdzene iź źelōnich ātlasew i ź žōltich ōtlasōw* (408a1).

– **azali** (аптатыўная часціца): *pan bōg jest ktōrij dal wam wladac mōrem ābi-chōdzili ōkrente waši w nich watrōwą mōcą našą i šūkajōnc z-lask'i našej z-darow našich i ōzalebišce bili chwala ōddawac* (409a3).

– **majestat** (трон): *rekl ī staršina wojsk mōjich ktō z-was prineše i prijdze z-mōjstatem* (305b3).

– **niedaleki** (недалёкі): *ā k'edi ōbačiš i muchemmed k'edi pōstrašōn-še pretō nimaš jim wizwolena i pōbrani wenźnami w nedōlek'im kraju* (353a5).

---

[177] Гл. напр. >>> 12.3.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду на *–a* (< *-ę*).

[178] Гл. >>> 10.4.1. Закрыты /á/.

– **ratować** (ратаваць): *nemaš mū rōwnegō dō pōrōtōwana i ne-bendze mū pōratūnku w ten dzen* (234b5), *ābi gō wspōmōgli i rōtōwali ōd menk'i bōžej* (318b4).
– **sprawować się** (паводзіць сябе): *žebi ōni tim sprōwowali-śe i wučink'i činili* (402a2).
– **zafrasować się** (занепакоіцца): *ōči jich pōceką ōd slōź zafrōsōwawši-śe że jim ne-dōstawa čim-bi-śe mali wiprawic (155a4), ā k'edī prišli pōslanci našī lūtōwi i zafrōsawali-śe nemī i casnō stalō preź nich serca jegō* (177a6).
– **zataić** (затаіць): *zatōjili*[179] *ānjōlōw w newerenstwa dūš jich* (209a1).
– **żalować** (шкадаваць): *ā tō dla tegō žebiśce ne-žōlōwali cō ōd was pōślō* (443b4).
– Як гіперкарэктныя формы альбо як памылкі ў кангруэнцыі можна разглядаць наступныя выпадкі: *prišlō na nich bōžże menka ōd tōnd skōnd ne-spōdzewali i wrōcil w sercach jich strach* (447b6).

Як выпадковае трэба разглядаць звужэнне галоснага /a/ > /á/ перад насавымі зычнымі *aN* > *áN* > *oN* / *uN*. Перад насавымі зычнымі можа адбывацца пераход галоснага /a/ ў закрыты /á/ і да артыкуляцыі /á/ > /o/. Гэты /o/ можа далей звузіцца ў артыкуляцыі да галоснага /u/[180]. У рукапісе **L**, які графічна не дыферэнцыруе галосныя /o/ і /u/, таксама магчымым з'яўляецца спосаб чытання /u/:
– **opanować** (авалодаць): *ōkrōnžili i ōpōnōwali dōkōla panstwa waše za grechi waši i bilō tō naterminōwanō že śe malō wam zdzelac* (220a3), *bōg laskawij milōserdnij na 'eršū*[181] *majestace ōpōnōwal-śe mōcą swoją* (247a7), *pō tim mōc jegō ōpōnōwala 'erš* (336a6), *tī jesteś gōdzen ōpōnōwac te masta* (489b3).
– **poszanowanie** (пашана): *taka laska i pōšōnōwane ōd pana bōga* (68b8).

У сферы ненаціскнога этымалагічнага /e/ характэрныя ваганні паміж формамі з аканнем /e/ > /a/ і гіперкарэктным /o/. Такія гіперкарэктныя формы ясна паказваюць на панаванне няўпэўненасці адносна якасці ненаціскных галосных.

Даволі часта такія ваганні з'яўляюцца ў суфіксе *-ek*, як у назоўніку *pożytek* (карысць, выгада), *zamutek* (замяшанне)[182] і *uczynek* (учынак): *či-ne-widzeli ōni że-pewne pan bōg rōspōstarl i pōžitōk dla nich* (329b7), *chcelibi-śe wrōcic w nedōwarstwo pōneślibi ten zamūtak i newernōšc* (340a7), *kōždij učinak z-natūri jich pōchōdzi* (227b3).

Як адзіночны выпадак і, верагодна, як арфаграфічная памылка павінна разглядацца наступная форма дзеяслова 2-й ас. адз. л. пр. ч.: *prišlō dō was pišma naše pre tō zapōmnalōš ją* (255a2). Некалькі часцей з'яўляюцца ў гэтай дзеяслоўнай форме выпадкі акання: *a k'edi ūlepilaš z-glini jaką persōne ptaka [...] i nadchneleš w negō i stanōl ptak'em* (97b5).

---

[179] Магчымая таксама аналогія з беларускім *затаіць* / *затойваць*.

[180] Гл. >>> 10.4.1. Закрыты /á/. Параўн. Strutiński (1993), p. 51.

[181] Ар. *'arš* = трон.

[182] Польск. *zamęt*; бел. *замяшанне*.

– **czerwony złoty** (чырвоны злоты): *są nektōre z-lūdzej piśmennich židōw i grekōw tak'ī cō jeśli pōweriš mū sentar zlōta čerwōnich zlōtich dzešenc tišencej wijści-še tōbe a ź nich też jest' cō jeśli pōweriš mū jeden denar čōrwōnij zlōti ne ōdda tōbe tilkō ž ūstawične bendzeš stal ziskūjōnc ā tō za chelāl*[183] *meli dla tegō że mōwili nimaš jim nad muchemmed-čikōm drōgi ziskōwac i jawne mōwą čegō nemaš w t'ewrīt'u*[184] *ā na bōga kladą klamstwa ā i sami wedzą że nemaš w piśme* (46b7)[185].
– **mesjasz** (месія): *pewne k'efirmi*[186] *stali te ktōre mōwili pewne pan bōg ten maṣijaš 'īśá sīn merjemin*[187] (93a2), *pewne zabiliśmi mōśijaša 'īśâ jezūsa sina panni mariji pōsla bōžegō āle ne-zabili gō āni wešali gō* (79b3).
– **coczewica** (сачавіца): *sōčōwici i cibūli i sōčawici* (11a5).
– **zeslać** (саслаць): *pewne mī zōslališmi na cebe korān zeslanem* (477b7).
– **prezbiter** (прэсвітэр): *pretō zōstane preźbitōrem jawnō bendze mōdlil* (395a4).

10.10. Змяшэнне галосных */a/*, */e/* і */o/* пад націскам

З прычыны акання і ўтварэння гіперкарэктных формаў, а таксама *scriptio defectiva* галосных */a/* і */o/* толькі праз *fatḥa* = *e* адбываецца змяшэнне галосных */a/*, */o/* і */e/* не толькі ў ненаціскных складах, але часам таксама пад націскам, што даказваюць наступныя прыклады: *welnōšc* (13a4), *wejska* (33b8), *dō źemi ūradzejnej* (275a4), *ne-bendą skriwdzeni u spašenach swojich w žednej reči* (244b7), *i pōdneśli-še ne-chcōnc prijōnc īman*[188] *w gerdōšc welką* (470a1), *bō pân bōg jest ktōrij učinil dla was bidlenta dla wšedena*[189] *na nich i jazdi ōd nich prendk'ej* (389b6). У назоўніку *szatan* на працягу ўсяго манускрыпта галосны */a/* пад націскам рэгулярна пішацца *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*: *šetan* (9a1) (9a3) (22b4) (27b4) (36b7) і г.д. Такія спосабы напісання можна было б тлумачыць як рэфлекс рэдукцыі ненаціскнога */a/* > */e/*, калі б тут можна было дапусціць іншы націск, чым польскі на перадапошнім (параксітанічным) складзе.

---

[183] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[184] Ар. *tawrā* = Тора.

[185] **Q**(3:75): "Сярод людзей Пісання ёсць такія, што калі ты даверыш ім *кінтар*, то яны вернуць яго табе (самахоць). А ёсць сярод іх і такія, што, калі ты даверыш ім дынар, то яны вернуць яго табе толькі тады, калі ты будзеш доўга стаяць над імі".

Цікавым з'яўляецца ў тэксце тэфсіра ар. *qintār* = "назбіранае багацце". У перакладзе ар. *qintār* перадаецца польск. *sentar* = *centnar* / *cetnar* = "цэнтнер"; а апошняе інтэрпрэтуецца як "цэнтнер золата" (*cetnar złota*). Наступны тэкст экзегетычна парафразуецца: "*czerwonych złotych dziesięć tysięcy wyjści się tobie*" (10 000 дукатаў ён вяртае табе). Такім чынам, цэнтнер (50 кг) золата прыраўноўваецца да 10 000 дукатаў (*czerwonych złotych*). Было б цікавым больш грунтоўна даследаваць гэтыя коштавыя суадносіны, дадзеныя як каментар, у гаспадарчым кантэксце XVI ст.

[186] Ар. *kāfir* = нявернік.

[187] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[188] Ар. *īmān* = вера.

[189] Польск. *wsiadanie* = пасадка. Наконт перагалосоўкі гл. 10.6.1.

У беларускім слове *kajata* (пакаянне)[190], вельмі верагодна, можна зыходзіць з беларускага націску на канцавы /*a*/. Спосаб напісання праз *fatḥa* = *e* сустракаецца ў першым пераднаціскным складзе, у якім аддаецца перавага такому рэдукаванаму спосабу напісання: *i zgrešil ādam bōgū swemū i zblōndzil pōtim wibral-gō pan bōg i dal kajete na nich i naprōwadzil jich na drōge* (254b5).

Далей звяртаюць увагу выпадкі напісання галоснага /*e*/ праз *alif* + *fatḥa* = *a*: *wa ōn cō ma bic* (34b5), *aj jak wale pōgūbilišmi pred mek'k'ejšk'imi*[191] *lūdzmi z-rōznich wjár* (247a2), *ī wam ōd bōga tō cō ne-wece wī* (122b5), *ānitež wam za' ōčne skritōšc ānitež mōwe wam že jest ānijōl ja* (103b2)[192].

Побач з гэтым таксама знаходзіцца відавочная інтэрферэнцыя з беларускім субстратам. Польскі прыметнік *doczesny* (часовы) рэгулярна з'яўляецца, напрыклад, у рукапісе **L** у форме *doczasny*, якую трэба разглядаць як лексічную інтэрферэнцыю з беларускай мовай: *dočasnij* (29a2), *na tim świece dōčasnim ūmremi* (410a4)[193]. У прыназоўніку *przeciw* (супраць), які паказвае ў беларускай мове шматлікія варыянты (*проці, проціў, прэці, прэціў*)[194], у рукапіс таксама пранікае беларускае гучанне: *prečą prōciw kśeng* (23a8), *īdą prendkō prōciw mōjžeša* (250b4).

У такіх выпадках, як, напр., пасіўны дзеепрыметнік прошлага часу "*oznajmione*" існуе, аднак, анамалія, якая звязана з польскай перагаласоўкай: *ōznajmene* (32a1).

10.11. Змена /*e*/ > /*o*/ ў канцы слова

Сляды велярызацыі /*e*/ > /*o*/ ў канцы слова, што з'яўляецца тыповым для паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы[195], часта сустракаюцца ў тэксце тэфсіра ў шэрагу лексем: *serce* (сэрца), *miejsce* (месца), *słońce* (месца) альбо *jeszcze* (яшчэ): *rekl ibrahīm*[196] *tak jest were tilkōž lipej-bi-śe ūspōkōjilō sercō mōje* (35b5), *ten ōcenži grechem sercō jegō* (39a5), *tedī ta dōbrōc ma bic i na tim świece i na meškanū wečnim ješče lepša aj jak'e jest mejscō dōbre dla bōjaźnikōw bōžich*

---

[190] Наконт фразеалагічных дзеясловаў, утвораных з бел. *kajata*, гл. Suter (1993).

[191] Ар. *Makka* = горад Мекка.

[192] У апошнім прыкладзе спосаб напісання <*wam*> для *wiem* (ведаю) мог знаходзіцца пад уплывам займенніка *wam*, які ідзе ў непасрэдным кантэксце, і быць патлумачаным чыста тэхнічнымі прычынамі (пралепсіс).

[193] Гл. Kurzowa (1993), p. 349: "Na tle języka literackiego XVIII i XIX w. *doczesny* 'chwilowy' stanowi na kresach północnych archaizm semantyczny utrzymujący znaczenie wspólnie z językiem białoruskim w którym *dačásny* znaczy 'krótkotrwały'." Параўн.: Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча, т. 2, с. 32.

[194] Гл. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча, т. 4, с. 115.

[195] Гл. ДАБМ № 17.

[196] Ар. *Ibrāhīm* = Абрагам.

raj 'eden[197] *wnidą tam cō cekną ze-spōdkū jegō rek'i dla nich tam cō sami zachcą tak wlaşne placi pan bōg bōjaźnikōm* (209b6), *i dla tich ktōre ne-'ūwerili w bōga swegō menka pek'elna ō jak'e zle mejscō jim nagōtōwana* (462a5), *ōn stworil dla was rōźne bidlenta ālbo ne-widzice jakō stworil bōg śedmi nebōs sklepōnō jednō na drūgą i ūčinil meśōnc w nich świátlem i ūčinil slōncō chōdzōnce świecą* (470a6), *gdi na mne klamac bendzece pretō tak klamali k'ilka ūmmet'ow*[198] *swojich imamōw*[199] *ješčō pred wami* (321a5), *dō warī ne-prišlišce ale žebišce mowili zdrōwim sercem i ščirim żeśmi muśulmane bō ne-wstōnpil īman*[200] *ješčō w serca waše* (424a7). Але таксама тыповым з'яўляецца ўжыванне рэгулярных формаў: *ōdlōnčila śa ōd lūdzej swojich na mejsce jedne kū wschōdū slōnca i ūčinila sōbe ōd innich zapūna* (241b3).

[197] Ар. *'adn* = Эдэн.

[198] Ар. *umma* = супольнасць вернікаў.

[199] Ар. *imām* = той, хто моліцца наперадзе; імам.

[200] Ар. *īmān* = вера.

11. КАНСАНАНТНАСЦЬ РУКАПІСУ

11.1. Сукупнасць зычных фанем

На беларускім субстраце польская мова Вялікага Княства Літоўскага набывае адрозненні ў некаторых зычных фанемах, якіх нельга знайсці ў літаратурнай мове.

Інвентар зычных фанем польскай літаратурнай мовы на мяжы XVII–XVIII стст. уключае */p, p', b, b', t, d, k, k', g, g', c, c', dz, dz', č, dž, f, f', v, v', s, s', z, z', š, ž, ch, m, m', n, n', r, ł, l, j/*[1], г.зн. 35 зычных фанем.

Беларуская кансанантная сістэма ў прынцыпе ўжо ў XVI ст. мела склад, які існуе і сёння: */p, p', b, b', t, d, k, k', (g), (g'), c, c', (dz), dz', č, (d,), (f), (f'), v, v', s, s', z, z', š, ž, ch, ch', h, h', m, m', n, n', r, l, l', j/*[2]. У беларускай мове налічваецца 32 фанемы. Шэсць дадатковых фанем */g, g', dz, dž, f, f'/* патрапілі ў фаналагічную сістэму беларускай мовы праз запазычаныя словы, пераважна паланізмы.

Для зычных фанем польскай мовы паўночных крэсаў на працягу XVII–XVIII стст. можна вызначыць наступны інвентар: */p, p', b, b', t, d, k, k', g, g', c, c', dz, dz', č, d,, f, f', v, v', s, s', z, z', š, ž, ch, h, m, m', n, n', r, ř, ł, l', j/*[3]. У параўнанні з польскай літаратурнай мовай на падставе беларускага субстрату вызначаюцца наступныя адхіленні: 1.) адрозненне глухога */ch/* і звонкага */h/*; 2.) наяўнасць змякчанага */l'/*; 3.) запавольванне ў развіцці змякчанага */r'/ > /ř/ > /ž, š/* альбо нават зацвярдзенне */r'/ > /r/* паводле беларускага ўзору.

11.2. Фанемы */ch/*, */h/* і */g/*

Звонкі */h/* у польскай мове Вялікага Княства выразна адрозніваецца ад глухога */ch/*. Гэтае адрозненне абапіраецца на субстрат беларускай мовы, у кансанантнай сістэме якой фанема */h/*, што ўзнікла шляхам змены */g/ > /h/*[4], сустракаецца вельмі часта[5]. Адрозненне глухога */ch/* і звонкага */h/* сёння лічыцца нормай у польскай мове высокага стылю, а таксама ў мове тэатра. У польскай што-

---

[1] Гл. Stieber (1973), p. 112–114, § 86. Наконт інвентару польскай кансанантнай сістэмы ў XV ст. гл. Stieber (1973), p. 55: */p, p', b, b', t, d, k, g, c, c', dz, dz', č, dž, f, f', v, v', s, s', z, z', š, ž, ch, m, m', n, n', r, ř, ł, l', j/*.

[2] Гл. Wexler (1977), p. 177.

[3] Гл. Smolińska (1983), p. 61–62.

[4] Гл. Wexler (1977), p. 97.

[5] Гл. Stieber (1973), p. 144 – 145: "Moreover, under U and Br influence the speech of the borderland Poles acquired a new phoneme: h, the voiced counterpart of their voiceless x. They pronounced it (and sometimes still do) in loanwords from U or Br like *hałas* 'noise', *hołota* 'rabble', *hreczka* 'buckwheat', *hodowla* 'breeding', *hulać* 'revel', etc."

дзённай мове, а таксама ў прыродных польскіх дыялектах, наадварот, звонкі /h/ традыцыйна не адрозніваецца ад глухога /ch/[6].

Арабскае пісьмо выкарыстоўвае для дыферэнцыйнага спосабу напісання абедзвюх фанем, /ch/ і /h/, адпаведныя графемы. Графема *ḥā'* = *ch* рэгулярна ўжываецца для глухой /ch/, а графема *hā'* = *h* – для звонкай /h/[7].

Таксама абодва зычныя, /g/ і /h/, у арабскім пісьме выразна адрозніваюцца графемамі *ġayn* = *g* і *hā'* = *h*. Тым самым польскі і беларускі тэксты істотна адрозніваюцца нават вонкава. Спірантызацыя /g/ > /h/, для якой маюцца доказы з XIV ст., маніфестуецца на пісьме, прычым у беларускіх тэкстах дамінуе графема *hā'* = *h*, а ў польскіх тэкстах – *ġayn* = *g*[8].

Прыклады напісання глухога зычнага /ch/ праз графему *ḥā'* = *ch*: *chcalbi* (15a2), *chiba* (17a4), *chmūra* (7a4), *chōrōba* (6b3), *chwala* (23a1), *dūch* (16a3), *grech* (13a5) (15b8), *lechk'e* (11a5), *nechaj* (20b5), *pōcecha* (17b2), *słūchac* (14b5), *zachōd* (20a1), *zanechac* (19a4). Звонкі /h/ сустракаецца ў тэксце тэфсіра ў шэрагу лексем, якія праніклі ў старапольскую мову з чэшскай, нямецкай альбо грэчаскай моў: *člōweče meškaj tī i žōna twoja w raju i jedzce ź negō hōjne* (9a2), *dla nich na tim świece pōhanbene newola* (17a4), *zhōldōwal wam rek'ī i zholdowal gwoli wam slōnca i meśōnc* (201a1), *k'edī śe reklō jim cō tō zeslal pan bōg waš rekli başni histōrije peršich lūdzej* (209a2). Побач з гэтым у шэрагу лексем з усходнеславянскай мовы з'яўляецца звонкі /h/, які пайшоў ад /g/: *kurhanek* (35b6), *śilnij hōspōdar pōważnij cesar* (176b3).

Нешматлікія лексемы і формы, колькасць якіх ледзь перавышае тузін, рэгулярна з'яўляюцца ў сваім беларускім абліччы са зменай /g/ > /h/ і іншымі асаблівасцямі, такімі, як усходнеславянскае поўнагалоссе[9] і беларускія склонавыя канчаткі: *w najhlibšim*[10] *ōd wšitk'ich pek'el hadije*[11] *nazwana* (78a8), *bō ja zapewne widzalem ōgen ãzali prinōse wam s-tamtōnd z-halawnōjū*[12] (247b4), *bridzce-śe ōd prehaworū i bōjce-śe pana bōga* (424a4), *pretō winidz ź jehibtū zapewne ja tōbe jest napōminačem* (312a4).

Побач з гэтым беларуская змена /g/ > /h/ пранікае несістэмна і толькі выпадкова. У наступных прыкладах яна паказваецца ў прыналежным займеннику *jego*,

---

[6] Агляд дыферэнцыяцыі /ch/ і /h/, уключаючы ўсходне- і заходнеславянскія мовы, прапануе Urbańczyk (1979).

[7] Толькі зусім зрэдку ўжываецца графема *ḥā'* = *cḥ* як рэпрэзентант /ch/. Графемы *ḥā'* = *ch* і *ḥā'* = *cḥ* адначасова абазначаюць цвёрды /ch/ і мяккі /ch'/, а графема *hā'* = *h* – цвёрды /h/ і мяккі /h'/. Мяккія /ch'/ і /h'/ у польскай кансанантнай сістэме адыгрываюць вельмі маргінальную ролю і статус іх як фанем няпэўны (гл. Stieber (1973), p. 114, § 87). Наконт графем *ḥā'* = *ch*, *ḥā'* = *cḥ*, *hā'* = *h* і *ġayn* = *g* гл. Антонович (1968), с. 204–207, 265.

[8] Графема *ġayn* = *g* аднолькава пазначае цвёрды /g/ і мяккі /g'/.

[9] Гл. >>> 11.12. Поўнагалоссе.

[10] Бел. *глыбокі*.

[11] Аід.

[12] Польск. *głownia* = галавешка.

а таксама ў беларускіх назоўніках *kniga* і *god*. Аднак характэрна, што, напр., канчатак прыметнікаў род. скл. адз. л. м. і н. р. *-ego* ніводнага разу не паказвае спірантызацыі: *zapewne lūt*[13] *bil także z-murśelōw*[14] *prōrōkow k'edi wizwoliliśmi gō i ṣemjū jehō wšitk'ich* (368b3), *prōrōk jehō milōšt'*[15] *mōdlil-śe na chira*[16] *gōrī k'e'bejśk'ej*[19] *i ōbačil ǧebra'ila stempōncegō ź neba i pōstrachawši-śe pribeg dō dōmū* (474a1), *dla lechkōserdnōści bōžžej knihi zeslane tō jest korān ōd pana bōga pōważnegō mōndregō* (411a6), *zabawili-śe w pečarī jich trista hōd i wencej ješčō dzewenc lat* (232b7), *bendą pitac ū hrešnich lūdzej cō prōwadzilō was dō pekla* (475a3), *i ne ōdwodzil tarhōwli anitež prōdażī ōd chwali źik'erū*[20] *bōžžegō* (283b1), *tak dahadem mōwili ne-wedzōnc* (232b2), *pan bōg učinil dla was w dōmach wašich spōkōjne meškane i wčinil dla was pōdrōżnich [s-]skōr bidlencich i z-welni katarhī dla lehk'egō nōšena* (214b5).

З наступнага прыкладу праз зробленае перапісчыкам выпраўленне становіцца зразумелым, што ён стараўся ўнікаць беларускага /*h*/ замест польскага /*g*/: *chcą żebi rōzlōnčili medzī bōha ga i prōrōkōw jegō* (78b6).

Як вызначана, беларуская змена /*g*/ > /*h*/, якая пранікла ў польскі тэкст, нерэгулярна рассеяна па тэксце. У некаторых выпадках яна звязана з пэўнымі лексемамі. І, наадварот, ні разу не сустракаюцца гіперкарэктныя формы з графемай *ġayn* = *g* замест этымалагічнага /*h*/ альбо /*ch*/. Таксама ў тэфсіры **L** адсутнічаюць доказы змяшэння глухога /*ch*/ і звонкага /*h*/[21], калі не прымаць да ўвагі варыянтаў слова *lekki* (лёгкі), якія сустракаюцца ў вышэйпрыведзеных прыкладах: *dla lechkōserdnōści* (411a6), *dla lehk'egō nōšena* (214b5).

11.3. Фанемы /*ʌ*/, /*l*/ і /*l'*/

Да пачатку XVI ст. у польскай кансанантнай сістэме ўсталявалася апазіцыя паміж цвёрдым /*l*/ і мяккім /*l'*/. У XVI ст. у літаратурнай мове адбылося зацвярдзенне /*l'*/ > /*l*/, а паралельна гэтаму цвёрды /*l*/ ператварыўся ў /*ł*/ (*ł walczone*)[22].

---

[13] Ар. *Lūṭ* = Лот.

[14] Ар. *mursal* = пасланнік.

[15] Гэты спосаб напісання з'яўляецца адным з зусім рэдкіх прыкладаў ужывання *tā'* = *t'* замест графемы *c* = *c* для напісаня змякчанага /*t'*/ (> /*c'*/).

[16] Ар. *Ḥirā' / Harā'* = Хіра – назва гары на паўночны ўсход ад Меккі. У пячоры гэтай гары Мухамад, паводле ісламскай традыцыі, атрымаў першае адкрыццё (гл. EI-2).

[17] Ар. *ka'ba* = Кааба.

[18] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

[19] Гл. >>> 3.3.1. Прыметнік "*lekkosierny*" (лёгкасардэчны).

[20] Ар. *ḏikr* = упамінанне Бога; форма працяглай рытуальнай малітвы.

[21] Гл. Kurzowa (1993), p. 106.

[22] Гл. Stieber (1973), p. 110–112, § 83–84. Гл. Klemensiewicz (1965b), t. 2, p. 98.

У польскай мове крэсаў на ўсходнеславянскім субстраце яшчэ дагэтуль захаваўся мяккі /l'/[23].

У польскіх тэкстах для напісання ўсіх трох фанем ва ўсіх выпадках служыць графема *lām* = *l*, як можна бачыць у наступным прыкладзе на падставе дзеяслоўных формаў *zesłaliśmy, zgorszył, umieli* і *chwalić*, а таксама прыслоўя *tylko*: *ne-zesl̲a̲liśmi na cebe korān ābiś zgōrśil̲ til̲kō ābiśce ūmel̲i chwal̲ic pana bōga* (247a5). Пры гэтым адбываецца характэрная амаграфія, так, напр., *laska* (ляска) і *łaska* (ласка): *rūcil laska jegō ā w tim ōn [stal] smōk'em i wenžem welk'im* (126b8), *rekl ibrahīm*[24] *laska bōžža bendze nad tōbą* (243b5). Гэтае супадзенне ў арабскім пісьме сцірае адрозненне паміж мужчынска-асабовымі і не мужчынска-асабовымі формамі пр. ч.: *wšak prichōdzili dō nich prōrōk'i īch z-rōźnimi cūdami ale ōni ne-bili werōncimi tim prōrōkōm* (126b1), *ābi ne-kōchali-śe w tim ṣwece dūši waši* (14a3).

Дзеяслоўны канчатак 3 ас. м. р. адз. л. пр. ч. *-ł* у польскіх тэкстах даволі паслядоўна пішацца праз *lām* = *l*[25]: *wol̲a̲l bōga swegō wolanjōm milčōncim* (240b3), *skōnt bendze mne sīn bō ne-tikal-śe mne člōwek menščizna* (241b6), *jezūs rekl pewne ja slūga bōžžij danō mne kśenga i wčinil-mne prōrōk'em i wčinil mne świentim gdzekōlwek bende i prikezal mi ūčic* (242a2), *ten 'īśâ sīn merjemin*[26] *ze-slōwa narōdzil-śe bōžžegō* (242a6).

У беларускай мове ў ходзе білабіялізацыі /l/ у канцы слова або перад зычным у дзеясловах пр. ч. 1–3 ас. адз. л. м. р. адбываецца змена канцавога /ł/ > /ŭ/[27]. У арабскім пісьме гэтая змена робіцца відавочнай, таму што для названага дзеяслоўнага канчатка рэгулярна ўжываецца графема *wāw* = *w*[28]. Для беларускага цвёрдага /l/ і мяккага /l'/ у арабскім пісьме рэгулярна ўжываецца графема *lam* = *l*. Некалькі прыкладаў ужывання графемы *wāw* = *w* для /ŭ/ у беларускай мове з кітаба **K**: *cemnô bilô 'ôči świâtlôści ne-widzeli kuri ne-peli*

---

[23] Гл. Stieber (1973), p. 110: "It has remained palatalized only in the language of the borderlands: [l'as], [l'ubić] like".

[24] Ар. *Ibrāhīm* = Абрагам.

[25] Прынамсі з канца XVII ст. розныя спосабы напісання 3 ас. адз. л. м. р. у пр. ч. то праз *wāw* = *w*, то праз *lām* = *l* з'яўляюцца крытэрам для адрознення беларускіх і польскіх тэкстаў. Аднак гэтыя спосабы напісання ў тэкстах кітабаў часта змешваюцца. Спосабы напісання праз *lām* = *l* можна ацэньваць як польскі ўплыў. Параўн. Wexler (1973), p. 46.

[26] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[27] Гл. Wexler (1977), p. 165. Параўн. de Bray (1980), p. 235.

[28] У гэтай функцыі ў ранніх беларускіх тэкстах побач з графемай *wāw* = *w* часта сустракаецца графема *lām* = *l*. Спосаб напісання праз *wāw* = *w*, аднак, неўзабаве перамагае і ў канцы XVII ст. робіцца правілам (гл. Антонович (1968), с. 201). Графема *wāw* = *w* таксама выкарыстоўваецца, каб адлюстраваць на пісьме білабіялізацыю, г.зн. пераход /ł, v/ > /ŭ/ у закрытым складзе ў пазіцыі перад зычным, а таксама /u, v/ > /ŭ/ у прыназоўніках і прэфіксах. Параўн. >>> 11.11. Змяшэнне /w/ і /u/ ў канцы слова, інтэрвакальны /w/ (ŭ); гл. таксама Wexler (1977), p. 165; Антонович (1968), с. 199–204; Łapicz (1986), p. 137, 144–145.

sâbâk'i ne-brechâli dôžğ išôw wecer wejew cemnô bilô râzumew štô sudnij dzen nâstâw meži sefâ i merwá[29] *châdziw mišleči meži jich stâjâw 'â žemli 'â nebesâch miśliw môci bôžej dziwôwâw-še mūwilem že tô môcnij prâwdziwi pân jâk stwâriw žemlū i nebôsâ nâ pâwetru* K(87b1-4)[30].

У тэксце тэфсіра такія беларускія дзеяслоўныя канчаткі з графемай *wāw* = *w* замест *lām* = *l* – вельмі рэдкая і маргінальная з'ява: *ktō še ūdaw w te drōga ne-bendze strachu nad nim* (9a7), *pewne naleźliśmi tō cō ōbecīwal nam bōg naš wšitkō prawdziwe też wī či-naleźlišce cō deklerōwaw bōg waš* (120b7). Усеагульнае ўжыванне прошлага часу з графемай *lām* = *l* з'яўляецца праявай намеру перапісчыка пісаць па-польску, а не па-беларуску.

На існаванне мяккага */l'/* у канцанантнай сістэме польскага тэксту тэфсіра непасрэдна ўказваюць спосабы напісання, пры якіх, напр., прыназоўнікі *z* і *bez* пішуцца ў сваёй палаталізаванай форме з мяккай графемай *zāy* = *ź* замест цвёрдай *ḍād* = *z*: *wprōwadzī nas pan bōg dō raju ź lūdzmī dōbrimi świentimi* (94b2), *prispōri tō dla negō prispōrenem mnōgim biź liğbi* (32b8)[31].

11.4. Фанемы */r/*, */ř/* і */ž*, *š/ (< /ř/)*

У беларускай мове ў XIV ст. усталёўваецца дэпалаталізацыя змякчанага */r'/*, які ў далейшым супаў з цвёрдым */r/*[32]. У польскай мове на працягу доўгага перыяду, пачатак якога ўзыходзіць да XIII – XIV стст., змякчаны */r'/* развіваецца ў */ž/* праз прамежкавую ступень */ř/*. У XVIII ст. ён супадае ў літаратурнай мове з гістарычна мяккай фанемай */ž/*[33]. У польскай мове Літвы беларускі субстрат садзейнічаў запавольванню ў гэтым развіцці, так што змена */ř/* > */ž/* у XIX ст. яшчэ не была завершана[34]. Акрамя таго, на падставе беларускага субстрату ў польскай

---

[29] Аль-Сафа і Аль-Марва – назвы двух узгоркаў каля Мекі, якія наведваюцца падчас паломніцтва.

[30] Гэты тэкст паходзіць з рукапісу кітаба пачатку XIX ст., які сёння знаходзіцца ў Брытанскім музеі ў Лондане пад шыфрам OR.13.020. Фрагмент тэксту з'яўляецца падрадковым перакладам пачатку *Mi'rāğ*-легенды, распаўсюджанай у пісьменстве "літоўскіх" татараў. Параўн. Станкевіч (1934), с. 374. (Параўн. >>> 17.5.1.7. З пачатку *Mi'rāğ*-легенды.)

Гэтае месца, якое Іван Луцкевіч памылкова лічыў каранічнай цытатай, служыла яму ў якасці доказу існавання беларускага тэфсіра (гл. "Наша Ніва", Вільня, 1920; рэпрынт у: "Спадчына", Мінск, 1992, № 3). Параўн. >>> 5.1. Манускрыпты.

[31] Гл. >>> 11.5.3.2. Ускосны паказчык палатальнасці.

[32] Гл. Wexler (1977), p. 152; першыя доказы з XIV–XV стст.; мяккі */r'/* сустракаецца сёння ва ўсходніх беларускіх гаворках з прычыны рускага ўплыву.

[33] Гл. Stieber (1973), p. 68, § 48; p. 109, § 82. Параўн. Strutyński (1993), p. 69, § 81.

[34] Гл. Stieber (1973), p. 109: " [...] we can learn something from the rhymes of the early poets. Those of the sixteenth and seventeenth century do not yet use such rhymes as zorze 'dawn' - morze 'he can' which only appear in the eighteenth century, and only in poets from Poland proper, while the poets from the borderlands continue to avoid them even in the early nineteenth century".

мове паўночных крэсаў можна было назіраць як характэрную рысу пранікненне цвёрдага /r/ замест польскіх кантынуантаў змякчанага /r'/ > /ř, ž, š/[35].

На гэтым фоне не дзіўна, што як для цвёрдай фанемы /r/, так і для польскіх кантынуантаў змякчанага /r'/ > /ř, ž/ у арабскім пісьме ўжываецца толькі адна графема, а менавіта *rā'* = *r*. Тым самым польская змена /r'/ > /ř, ž, š/, як правіла, не знаходзіць графічнага выражэння. Толькі з другой паловы XIX ст. у польскамоўных тэкстах татараў Вялікага Княства Літоўскага часцей сустракаюцца графемы *že* = *ž* і *šīn* = *š* для напісання кантынуантаў /ž/ і /š/, якія пайшлі з /r'/[36].

У наступным фрагменце з тэфсіра **L** знаходзяцца прыклады ўжывання графемы *rā'* = *r* як для цвёрдага /r/, так і ў пазіцыях, у якіх у польскай мове стаіць кантынуант змякчанага /r'/ > /rz/: *ā zaś pōpendzą tich ktōre newernimi bili dō pekla pōlkamī pōlkamī āž k'edī prijdą dō pekla ōtworōn-še wrōta jich rekną dō nich wladare pek'elne ā ci ne-prišed dō was prōrōk z-was-že cō bi čital na was prikezana bōga wašegō* (381b7)[37].

Існуюць розныя прыкметы, якія гавораць пра зацвярдзенне /r'/ > /r/ паводле беларускага ўзору альбо пра пранікненне цвёрдага /r/ з беларускай мовы.

Аканне /e/ > /a/ з'яўляецца ў тэксце тэфсіра пераважна ў пераднаціскным складзе ў пазіцыі пасля цвёрдага зычнага. Так, напр., наступныя спосабы напісання можна разглядаць як адзнакі зацвярдзелага /r/, тым больш што ў іх адназначна пранікае гучанне адпаведных беларускіх лексем *спрачацца* і *прадаваць*: *spračali-še* (34a8) (польск.: sprzeczali się), *zapradali* (14a6) (польск.: zaprzedali), *pradali* (23a4) (польск.: sprzedali), *pradawši* (23a6) (польск.: sprzedawszy)[38].

У імёны ж. р. на *-ra* рэгулярна пранікаюць формы скланення паводле беларускага ўзору: *kū warī* (16b1), *w tej warī* (14b6). Такія формы дав. і месн. скл. адз. л. паказваюць ляхіцкую перагаласоўку, якая сустракаецца толькі перад цвёрдым пярэднеязычным гукам альбо зацвярдзелым /r/, і выразна кантрастуюць з правільнай польскай формай без перагаласоўкі *wierze*. Таму яны могуць расцэньвацца як указанні на зацвярдзенне /r'/ > /r/, аналагічнае таму, якое існуе ў беларускай мове[39].

---

[35] Параўн. Łapicz (1986), p. 81: "Wpływ ten [języków ruskich] nawet współcześnie powoduje w polskich gwarach kresowych mieszanie spółgłoski ž (< r') i jej ubezdźwięcznionego odpowiednika ze spółgłoską r." Лапіч абапіраецца на А. Зданюкевіча (A. Zdaniukiewicz: Gwara Łopatowszczyzny. Fonetyka, fleksja, słownictwo. Wrocław 1972, p. 39).

[36] Гл. Антонович (1968), с. 336–338. Параўн. Łapicz (1986), p. 81–82, 138.

[37] У сучаснай арфаграфіі гэты фрагмент гучыць так: *a zaś popędzą tych którzy niewiernymi byli do piekła półkami półkami aż kiedy przyjdą do piekła otworzą się wróty ich rzekną do nich władarzy piekielni a czy nie przyszedł do was prorok z was że (samych) któryby czytał na was przykazania boga waszego.*

[38] Параўн. >>> 10.9.3. Аканне /e/ > /a/ перад націскам.

[39] Параўн. >>> 10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка; гл. >>> 12.3.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду; 12.3.6. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

Нарэшце, толькі на падставе такіх ускосных указанняў арабскае пісьмо дазваляе зрабіць высновы пра якасць фанемы, пазначанай графемай *rā'* = *r*. Аднак у тым факце, што для напісання фанем */ž, š/* у арабскім пісьме ўжываюцца графемы *že* = *ž* і *šīn* = *š*, маецца важны аргумент, які гаворыць пра пранікненне цвёрдага */r/* замест */ř, ž, š/ < /r'/*. Тое, што ў рукапісах "літоўскіх" татараў, без увагі на гэта, трымаюцца напісання праз *rā'* = *r*, даказвае, што змена */r'/ > /ž, š/* пад уплывам беларускага субстрату яшчэ да канца XIX ст. не была завершаная і паралельна ёй панавала тэндэнцыя да зацвярдзення */r', ř/ > /r/*[40].

У тэксце тэфсіра, які прапануецца, зусім рэдка сустракаюцца спосабы напісання з графемай *že* = *ž*, якія даказваюць змену */r'/ > /ž/*: *pewne w stwoženū nebōs i źemi i ū sprečanū nōci se-dnem znak'i jedinōstwe bōžžegō* (58a8), *ten ktōrij stwožil nōc i dzen* (258a7), *ōn na wšitk'i žeči mōcnij* (99a2), *pan bōg na wšitk'i žečī dūžij mōcnij* (85b8).

Прыклады пісьмовага выражэння змены */r'/ > /ž, š/* з дапамогаю графем *že* = *ž* і *šīn* = *š* прымнажаюцца ў польскамоўных тэкстах "літоўскіх" татараў толькі ў другой палове XIX ст. Так, напр., некаторыя адпаведныя спосабы напісання мы знаходзім у рукапісе тэфсіра **M**[41] канца XIX ст.: *dôbže* M(7b7) M(8a4), *džewâ* M(9a3), *gžechi* M(6a6), *gžechôw* M(6a6), *stwôžene* M(8b4), *stwôžīl* M(7b1) M(8a8), *ūwežili* M(6a3) M(7b7), *ūwežôn* M(6a7), *wežic* M(9a7), *wežili* M(8a6), *wežimi* M(6b1), *wežôn* M(6b5), *žekliśmi* M(8b8), *žeklô* M(6b5). Побач з гэтым знаходзяцца прыклады прагрэсіўнай асіміляцыі */pž/ > /pš/*: *pšed* M(6a4) M(7b1), *pšejścu* M(8a5), *pšičini* M(10a1), *pšicôngne* M(6b8), *pšidôn* M(6b7), *pšikâẓâl* M(8a6), *pšikâẓânne* M(8a5). Аднак паралельна гэтаму мы сустракаем і спосабы напісання праз *rā'* = *r*: *ktôre* M(6b7), *pred* M(9b7), *prikeẓâl* M(9b1), *prispôri* M(6b3), *reknô* M(8a3), *ūwerīli* M(6a4), *ūwerili* M(8a3), *weric* M(6b5), *werô* M(6b6), *wistregâjônci-śe* M(7a6). Такія спосабы напісання, з аднаго боку, могуць ляжаць у аснове фанетычнай інтэрферэнцыі з беларускай мовай, а з іншага боку, яны могуць разглядацца як свядомыя этымалагічныя спосабы напісання.

Для цвёрдай фанемы */r/* у тэксце тэфсіра не зафіксаваныя гіперкарэктныя формы з */ž/* альбо */š/* замест этымалагічнага цвёрдага */r/*[42].

11.5. Асіміляцыя зычных

Характэрным для ўсіх рукапісаў татараў Вялікага Княства Літоўскага з'яўляецца часты спосаб напісання зычных у іх асіміляваных з фанетычным кантэкстам формах. Аднак пісьмовае выражэнне асіміляцыі не падлягае строгім арфаграфічным правілам, так што зычныя перадаюцца то ў сваёй асіміляванай, то ў этымалагічнай форме. Пры гэтым у першую чаргу паказва-

[40] Таксама цалкам не выключаецца магчымасць свядомага этымалагічнага спосабу напісання */ř, ž, š/ < /r'/* праз *rā'* = *r*.

[41] Гл. >>> 17.4. Рукапіс тэфсіра **M**.

[42] Параўн. Kurzowa (1993), p. 104–105.

юцца рэгрэсіўныя асіміляцыі ў глухіх і звонкіх зычных, а таксама асіміляцыі паводле месца артыкуляцыі, асабліва ў палатальных зычных. Тыповымі таксама з'яўляюцца асіміляцыйныя камбінацыі паводле месца артыкуляцыі, палатальнасці і глухасці-звонкасці. Аказіянальна сустракаюцца прыклады выпадзення зычных з прычыны асіміляцый альбо, наадварот, асіміляцыі з прычыны выпадзення зычных пры спрашчэнні кансанантных груп.

11.5.1. Карэляцыя ўдзелу голасу

Карэляцыя *звонкі : глухі* можа дакладна выражацца ў арабскім пісьме, таму што для ўсіх звонкіх і глухіх зычных ужываюцца асобныя графемы. Пісьмовая перадача зычных, асіміляваных паводле ўдзелу голасу, сустракаецца часта, аднак, як правіла, пануе этымалагічны спосаб напісання.

Асабліва часта асіміляцыя *звонкі* > *глухі* сустракаецца ў прыназоўніку *z*: *tak też z-'ōwōcōw figi fūnik'i winōgradī i rōźinkī činice i rōbice s-tegō napōj* (213a2), *prišed monž jeden s-kōnca masta charbilem*[43] *nazwanij prendkō pribegl ī rekl i mūśâ*[44] *zapewne fera'ūnśk'e*[45] *lūdze radzōn-śe w twojej sprawa žebi-ce zabili* (312a3).

Таксама ў сярэдзіне слова рэгулярна сустракаюцца спосабы напісання, якія перадаюць асіміляцыю *звонкі* > *глухі*: */žš/* > */šš/*: *wiwiššilišmi* (34a5), *bliššе* (32a5); */žk/* > */šk/*: *cenšk'imi* (29a4); */žc/* > */šč/*: *ci-wi tō jesteśce cō prichōdzice z-grechem menžčizna dō menščiźni* (322a7); */dp/* > */tp/*: *ōtpūščene* (23b7); */dk/* > */tk/*: *ī te ktōre īman*[46] *prijenli bōndzca śwetkami jedin drūgemū k'edi śe zgōtūje jednemū z-was śmerc* (96b8); */zt/* > */st/*: *skali rōstōpōn-śe i pregōrą na pasek na pil a tō s-tegō klamstwa cō dōwodzą na bōga sinī* (246b5).

Назоўнік *prośba* (просьба) рэгулярна паказвае прыпадабненне паводле звонкасці */s'b/* > */z'b/*: *prōźbi* (16a2) (18b2) (19b2) (24b5). У слове *liczba* (лічба) таксама паслядоўна перадаецца на пісьме прыпадабненне */čb/* > */džb/*: *liğbe* (39a6), *liğbi* (26b7) (32b8). У іншых лексемах асіміляцыйныя спосабы напісання паказваюцца, аднак, толькі спарадычна. Так, напр., у назоўніку *sługa* (слуга) з асіміляцыяй */sł/* > */zł/*: *zlūdzī* (24b5). Але побач з гэтым мы знаходзім этымалагічны спосаб напісання: *jezūs rekl pewne ja slūga bōžžij* (242a2).

---

[43] Ар. *Ḥarbil* = Харбіль (імя ўласнае). Гэтае імя ўжываецца як экзегетычны дадатак да верша **Q**(28:20): "І прыйшоў чалавек з ускраіны горада. Прыбег і сказаў: "О Муса, сапраўды, знатныя [людзі] змовіліся наконт цябе, што заб'юць цябе. Выходзь, сапраўды, я для цябе шчыры дарадчык". Фраза, якая мае ў Каране агульны сэнс (прыйшоў чалавек), у тэксце тэфсіра канкрэтызуецца тым, што прыводзіцца імя Харбіль. У Ат-Табары яно падаецца як мужчынскае імя Саман альбо Шамун: "*wa-qawlu-hū* {**wa-ğâ'a rağulun**} *ḏukira anna-hū mu'minu āli fir'awna wa-kāna smu-hū fī-mā qīla Sam'ān wa-qāla ba'ḍu-hum bal kāna smu-hū Šam'ūn.*" (Што да гэтых слоў {**і прыйшоў чалавек**}, то ўжо згадвалася, што гэта быў вернік з людзей фараона, і яго імя, як было сказана, – Саман. Аднак некаторыя кажуць, што яго імя было Шамун.) (Гл. Ат-Табары да **Q**[28:20].)

[44] Ар. *Mūsâ* = Майсей.

[45] Ар. *fir'awn* = фараон.

[46] Ар. *īmān* = вера.

Асіміляцыя паводле звонкасці выяўляецца таксама на мяжы слоў: */z-č/ > /s-č/*: *bes-času* (31b4); */s'-g/ > /z'-g/*: *ã chōcbiż gō jawnimi slōwi chwalil* (247a8); */ž-p/ > /š-p/*: *pōnewaš pitają* (25a5); */d-t/ > /t-t/*: *pret-tim* (16b2); */ž-p/ > /š-p/*: *ōtō-š pewne prijdze i źjawi-še na was ōd bōga wašegō kerane* (123b1). Побач з гэтым таксама сустракаюцца анамальныя спосабы напісання: *ponewaš wjádōma* (34b7).

Як бачна з прыкладаў, асіміляваныя спосабы напісання ў сферы звонкасці можна назіраць у сібілянтах і альвеалярных зычных: */z-s, z'-s', ž-š, č-dž, d-t/*. У тэфсіры **L** адсутнічаюць прыклады асіміляцыі *звонкі > глухі* ў фанеме */w/ > /f/*, у той час як яна ў асобных выпадках сустракаецца ў рукапісе **M** канца XIX ст.: *dzefčentâ* M(10a3). У рукапісе **M** асабліва звяртае ўвагу страта звонкасці ў канцавым лабіяльным */w/ > /f/*: *kref* M(8b3), *lôtrôf* M(8a5), *mūf* M(10a2).

11.5.2. Прагрэсіўная асіміляцыя адпаведна ўдзелу голасу

Характэрная прагрэсіўная асіміляцыя */kw, tw, sw/ > /kf, tf, sf/* у даследаваным тэксце тэфсіра, як і наогул у польскамоўных тэкстах "літоўскіх" татараў, не знаходзіла выражэння ў арабскім пісьме. Гэта з'яўляецца яшчэ адным доказам блізкасці рукапісаў да польскай мовы паўночных крэсаў, якая не ведала асіміляцыі ў названых гукавых групах[47].

Гукавая група */chw/*, аднак, падлягае прагрэсіўнай асіміляцыі */chw/ > /chf/* і далей спрошчванню */chf/ > /f/*. Змена */chw/ > /f/* рэгулярна выяўляецца ў рукапісе **L** у назоўніку *lichwa > lifa* (ліхвярства) і яго дэрыватах, напр. *lichwiarz* (ліхвяр): *i ci ktōre w jedinegō bōga werice ne-jedzce lifī prispōrajōnc ją dla prispōrenja skarbū wašegō* (52a3), *bōjce-še tež ōgna pek'elnegō ktōrij nagō[to]wanij dla newernikaw ī līfarōw* (52a4). У іншых лексемах з гукавой групай */chw/*, напр., *chwała* (хвала) *chwalić* (хваліць), змена не паказваецца: *spōlenčnik'i i ōbrazi chwalą* (94a4).

У кантынуантах змякчанага */r'/ > /ž/* (*rz*) у польскай мове дзейнічае прагрэсіўная асіміляцыя *звонкі > глухі* ў камбінацыях */pž, tž, kž, chž/ > /pš, tš, kš, chš/*. Умовай такога кшталту асіміляцыі з'яўляецца завяршэнне змены */r'/ > /ř/ > /ž/*, якая запавольвалася ў польскай мове паўночных крэсаў пад уплывам беларускага субстрату да XIX ст. Таму мы не знаходзім у тэфсіры **L** прыкладаў гэтай асіміляцыі[48].

11.5.3. Асіміляцыя па месцы артыкуляцыі

Асіміляцыя паводле месца артыкуляцыі асабліва часта паказваецца ў сферы палатальнай карэляцыі *цвёрды : мяккі* і некалькі радзей у іншых апазіцыях, такіх як *дэнтальны : альвеалярны* альбо *дэнтальны : білабіяльны*.

---

[47] Параўн. Łapicz (1986), p. 130: "teksty odzwierciedlają więc typowo wschodnią (kresową) wymowę grup: kv, sv, tv. Wyjątek stanowi grupa xv, która ulega asymilacji i uproszczeniu".

[48] Параўн. >>> 11.4. */r/, /ř/* і */ž, š/* (< */ř/*). Там прыведзеныя таксама некалькі прыкладаў з рукапісу **M** канца XIX ст.

11.5.3.1. Карэляцыя палатальнасці

У сферы палатальнай карэляцыі выразна праяўляецца асіміляцыя ў фанемах */s - s', z - z', k - k', d - dz', t - c'/*, таму што для гэтых зычных у арабскім пісьме ўжываюцца парныя графемы для адрознівання цвёрдых і мяккіх карэлятаў[49].

Часта прыпадабненне *цвёрды > мяккі* можна сустрэць зноў у прыназоўніку *z*, які палаталізуецца пераважна ў камбінацыі з асабовым займеннікам 3 ас. адз. і мн. л.: *ã pō tim znōwu temū ne-werac bendą bō najwencej ź nich są newernikami* (215a3), *pewne bōgū klanają ci cō w nebōsach i w źemi ź rōbakōw i źwerōw i bidla i z-'enōlōw na nebe i na źemi ã żaden ź nich ne-pōdnōśi-śe w piche wśisci bōjōn-śe pana swegō* (211b2). У апошнім фрагменце ў спосабе напісання прыназоўніка *z* праз *zāy = ź* у *ź rōbakōw* мае месца адна са шматлікіх непаслядоўнасцей пры напісанні цвёрдага */z/* альбо мяккага */z'/*[50]. Часам асіміляцыя *цвёрды > мяккі* дадаткова суправаджаецца прыпадабненнем *звонкі > глухі*: *ne-rūcajce ś-ciśnenem rōnk wašich samich śebe w zgūba wečną* (25b7).

Далей прыпадабненне *цвёрды > мяккі* паказваецца пераважна ў прэфіксальным *z-*: *jeśli zachcece ličic pōżitk'ī bōżże ne-źličice jich* (208b4), *i skōśtūjece kerane za tō cō źbijali lūdzej ōd drōgi bōżej* (216a8).

Фанетычна неабгрунтаванымі з'яўляюцца ў наступных прыкладах спосабы напісання праз *sīn = ś* для */s'/* замест *zāy = ź* для */z'/*: *świastūj* (7b6), *świastūjōnc* (27b6). Тут таксама праяўляецца тыповая непаслядоўнасць пісьмаўжывання, размеркаваная па ўсім тэксце.

11.5.3.2. Ускосны паказчык палатальнасці

У камбінацыі з мяккімі графемамі *<ś, ś, ş, ź, k', dz, c>*, якія рэпрэзентуюць зычныя */s', z', k', dz', c'/*, асіміляваныя з наступнымі палатальнымі зычнымі, суседнія зычныя таксама часта могуць быць палатальнымі, без графемнага выражэння свайго ўласнага змякчэння[51].

Для ілюстрацыі можа служыць наступная асіміляцыя *цвёрды > мяккі* ў дзеяслоўнай форме *zbliżyła się* (зблізілася): *źbližila śa gōdzina sōndnegō dna* (433b6). Напісанне прэфікса *z-* з мяккай графемай *zāy = ź* паказвае на змякчэнне ўсёй кансанантнай групы */z'b'l'/*[52]. Пры гэтым змякчэнне */b'/* і */l'/* паказваецца толькі ўскосна, бо для дыферэнцыйнага спосабу напісання цвёрдых */b, l/* і мяккіх */b', l'/* парныя графемы не ўжываюцца.

---

[49] Гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці.

[50] Гл. >>> 11.8. Змяшэнні */s/* з */s'/* і */z/* з */z'/*.

[51] Графемы, якія не выражаюць палатальнасць, наступныя: *<b, p, ch, ch, g, f, l, m, n, h, w>*; пра асаблівае становішча *<dz, c>* гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці.

[52] Параўн. з прыведзеным прыкладам каментар Лапіча: "Nie ulega wątpliwości, iż w zapisach tego rodzaju odzwierciedla się charakterystyczna cecha fonetyczna polszczyzny północno-kresowej (por. np. Turska, s. 68 oraz Turska, Język, s. 19), tzn. zmiękczanie -z przyimkowo-przedrostkowego oraz śródgłosowego przed następującą spółgłoską miękką" (Łapicz (1986), p. 147).

Такія ўскосныя ўказанні на палатальнасць пры асіміляцыі прыназоўніка *z*, а таксама прэфіксальнага *z-* вельмі частыя; акрамя таго, яны сустракаюцца перш за ўсё пры білабіяльных */w, b, m/* і */n/*.

У пазіцыі перад змякчаным */w'/* на пісьме з дапамогаю мяккай графемы *kāf* = *k'* паказваецца змякчэнне */k/ > /k'/*: *ne-jest skritō ōd pana bōga twegō ōd wagī k'winti*[53] *w źemi ānitež w nebōsach* (165b8), *rōščepi-še nebō na dwoje dla stōnpena ānjōlōw pretō bendze jakō k'wjāt rōžane gdze čerwone gdze žōlta gdze blenk'ītne* (437a3). У слове *kwiat* (кветка) палатальнасць */w'/* паказана двойчы: ускосна праз асіміляцыю */kw'/ > /k'w'/* і дадаткова праз спосаб напісання *wāw + yā' = wj*, што з'яўляецца тыповым для перадачы асінхроннай артыкуляцыі палатальных білабіяльных[54]. Прыкметным у прыведзеных прыкладах з'яўляецца тое, што прагрэсіўная асіміляцыя *звонкі > глухі*, */k'w'/ > /k'f'/*, не паказана ніводнага разу.

Для змякчэння */g/ > /g'/* перад */w'/* адсутнічае графемная магчымасць выражэння ў пісьме: *pōddal wam w pōslūgi nōc i dzen i slōnce i meśōnc i gwjázdī* (208a4); цвёрды */g/* і мяккі */g'/* пішуцца аднолькава праз графему *ġayn* = *g*.

11.5.3.3. Тыповае беларускае змякчэнне */d, t/* перад */w'/*

У якасці тыповай беларускай асіміляцыйнай з'явы належыць разглядаць зафіксаваную з XIV–XV стст. асіміляцыю */d/ > /dz'/* і */t/ > /c'/* у пазіцыі перад мяккім */w'/* (дзеканне і цеканне). Афрыката */dz'/* звычайна з'яўляецца ў формах ж. р. лічэбніка (бел.) *дзве* ў параўнанні з (польск.) *dwie*. Спосаб напісання праз *dze* = *dz* зноў ускосна паказвае палатальнасць */w'/*: *ūwolniliśmi-gō i dzwe cūrk'ī jegō źe'ūra i źejna*[55] *tilkō žōna jegō zōstala tam w zgūbe* (124b4), *ā jeśli dzwe naciji z-werōncich muśulman bendōn-še bic z-sōbą pretō zgadzajce jich bendzce medijatōrmi medzi nich* (423b2). Аднак звычайнай з'яўляецца польская форма *dwie* без змякчэння */d/*: *dwe newasti* (38b4).

Вельмі рэдка ў пазіцыі перад змякчаным */w'/* таксама сустракаецца змякчэнне */t/ > /c'/*: *wlaśne tak'e pōdōbenstwo tich ktōre pred nimi bili nedawnim [!] časōw na gazejścwe*[56] *bedrejśk'ej*[57] *i skōštōwali za grech swoj karane* (449a8). Спосаб напісання з дапамогай мяккіх графем *tā' = ś* і *ce = c* (для */c'/*) выразна паказвае змякчэнне ўсёй кансанантнай групы */stw/ > /s'c'w'/* перад канчаткам меснага склону *-'e*[58].

---

[53] Польск. *kwinta* = старая мера вагі.

[54] Гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці; 10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка; 11.6. Асінхронная артыкуляцыя ў палатальных білабіяльных.

[55] *Заура* і *Зайна* – гэта арабскія жаночыя імёны ўласныя; дочкі Лота.

[56] Гл. >>> 3.1.1. Арабізм "*ġāzī*" (змагар за веру).

[57] Ар. *Badr* = мясцовасць у Хіджазе, дзе ў 624 г. адбылася бітва паміж мусульманамі і "няверніка́мі" (пра Бадр гл. El-2).

[58] Гэты прыклад прыкметны яшчэ ў іншых адносінах: у абстрактным назоўніку *gazeistwo* = *"змагары за веру, вайна за веру"*, утвораным ад (ар.) *ġāzī = змагар за веру*, пад уплывам акання

Такія інтэрферэнцыі, як дзейныя беларускія асіміляцыі паводле палатальнасці */d, t/ > /dz', c'/* перад */w'/*, сустракаюцца толькі ў асобных выпадках; іх не варта разглядаць як рэгулярную з'яву, а толькі як выпадковую маргінальную асаблівасць тэксту тэфсіра.

11.5.3.4. Змякчэнне */s/ > /s'/* у пазіцыі перад */k'/*

Моўнай асаблівасцю тэксту тэфсіра, як і наогул рукапісаў "літоўскіх" татараў, з'яўляецца асіміляцыя */s/ > /s'/* перад змякчаным */k'/*, якая ў арабскім пісьме выразна праяўляецца праз мяккую графему *ṯā' = ś* (радзей *sīn = ś*) замест цвёрдага *ṣād = s*. Часцей за ўсё такі спосаб напісання прысутнічае ў прыметніках на *-ski*. Пры гэтым асіміляцыя */sk'/ > /s'k'/* асабліва праяўляецца ў пазіцыі пасля зычнага: *prowadzil sluga swegō nōcą iź mečetu mek'k'ejśk'egō*[59] *dō mečetū jerūzalimśk'egō tegō mečet'u ktōrij pōświenciliśmi ōkōlici jegō* (219b4), *sprečali-śe w nim grōmadi k'afirśk'e*[60] *medzi sōbą* (243a1), *zawolaliśmi na negō ōd bōkū gōrī śinajśk'ej* (244a4), *ā čemū ne-widzī člōwek że śmī zapewne stworili gō z-menśk'ej krōpli wōdi celesnej* (363a7). У пазіцыі пасля галоснага асіміляцыя, як правіла, адсутнічае: *pan i karmicel nebesk'ij i źemśk'ij* (245a4). Аднак часта сустракаюцца адхіленні ад гэтага правіла: *bōžže jest krōlewstwa nebeśk'e i źemśk'e* (410a8), *chwala panū nebeśk'emū i panū źemśk'emū* (411a3).

Спарадычна маніфестуецца асіміляцыя */sk'/ > /s'k'/* таксама пры з'яўленні гэтай самай групы гукаў ў непрыметнікавых марфемах: *pōtrimali ōprōč pana bōga bōgi balwani ā bendą te balwani dla newernikōw wojśk'em* (246a6).

Мы пастаянна сустракаем для камбінацыі */sk/* таксама мяккія спосабы напісання *<śk, śk>*, якія не засноўваюцца на рэгрэсіўнай асіміляцыі, а могуць тлумачыцца толькі як спосабы напісання па аналогіі: *muśulmańska* (17b4), *z-wojśkami* (33b6), *i ne-jest pri wašej grōmadze ānitež pri grōmadze k'afirśkōj*[61] (78a5), *bōg jest świątlōścą nebeską i źemśką (283a3), ne-chōdzce na źemi šalberskō latrōwśkō* (300b7).

адбылася тыповая беларуская змена роду ніякі > жаночы *gazeistwo > gazeistwa*, што робіцца відавочным праз камбінацыю з прыметнікам у месным склоне жаночага роду *bedrejśk'ej*, утвораным ад арабскага тапоніма *Бадр* (гл. >>> 13. Змена роду). Выраз *na gazejśćwe bedrejśk'ej = у Бадрскім ваенным паходзе* з'яўляецца эгзэгетычным дадаткам да ар. тэксту **Q**(59:15): {**ka-maṯali lladīna min qabli-him qarīban ḏāqū wabāla amri-himwa-la-hum 'aḏābun alīmun**} = (літаральна) "*Падобна тым, хто да іх нядаўна паспрабаў згубнасць сваёй справы, і ім – нясцерпныя пакуты*". Гэтае тлумачэнне ўказвае на бітву пры Бадры 624 г. Параўн. з гэтым каментар у Тафсіры Аль-Джалалайн да **Q**(59:15): "{**kamaṯali lladīna min qablihim qarīban**} *bi-zamanin qarībin wa-hum ahlu Badrin mina l-mušrikīna*" = {**Падобна тым, хто перад імі нядаўна**}у нядаўні час – гэта тыя людзі Бадра, якія былі язычнікамі.

[59] Ар. *Makka* = Мекка.

[60] Ар. *kāfir* = нявернік.

[61] Ар. *kāfir* = нявернік. (Наконт бел. канчатка *-oj* гл. >>> 14.1.15. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду.)

Такія асіміляцыі ў гукавой групе */sk'/ > /s'k'/*, якія лічацца ў дачыненні да літаратурнай мовы субстандартнымі, апісваюцца многімі даследчыкамі польскай мовы крэсаў[62]. Асіміляцыі ў гукавой групе */sk'/ > /s'k'/* праяўляюцца як у рукапісе **L**, так і ў рукапісе **I**. Рукапіс **U**, наадварот, паказвае змякчэнне */sk'/ > /s'k'/* толькі як выключэнне.

11.5.3.5. Асіміляцыя *дэнтальны > альвеалярны* і *дэнтальны > білабіяльны*

Сярод іншых абумоўленых артыкуляцыйным становішчам асіміляцый, якія не належаць да карэляцыі *цвёрды : мяккі*, дамінуюць прыпадабненні паміж *дэнтальнымі* і *альвеалярнымі* зычнымі. Асіміляцыя *дэнтальны > альвеалярны* вельмі часта сустракаецца ў фанеме */z/*. Тут звычайна дамінуе прыназоўнік *z*, а таксама зычны */z/* у прэфіксах *z-, roz-: jeślibi chcał kerac pan bōg lūd wedlūg zlōści ne-zastawilbi na źemi nic iż żżiwolōw*[63] (212a7), *winidze iż żiwotōw jich mōd rōźnich kōlōrōw w tim jest lekerstwa i pōżitek lūdzem* (213a6). Пры гэтым такі від асіміляцыі часта паказваецца разам з прыпадабненнем *звонкі > глухі, /z-č/ > /s-č/ > /š-č/*: *ā k'edi rūcili lask'i ōčerōwali ōči lūdzem i welk'ij strach zadali jim bō kōždegō laska bila wenżem i prišli š-čarōdzejstwam welk'im* (127a7), *š-čegō* (29a1), *rekli ī hūd*[64] *cō i š-čim prišedleś jak'je*[65] *maš cūda* (175a6), *rōščepi-śe nebō na dwoje dla stōnpena ānjōlōw* (437a3).

Асіміляцыя *дэнтальны > білабіяльны* мае месца ў гукавых групах */np, nb/ > /mp, mb/* і часта сустракаецца пры расчэпленай артыкуляцыі насавых */ą/ > /on/* і */ę/ > /en/*: *skompstwa* (36b8), *stōmpi* (34a1), *wistempek* (39a2), *zōmb za zōmb* (89a7)[66].

11.5.4. Асіміляцыі са спрашчэннем кансанантных груп

У выніку асіміляцыйнага працэсу часам адбываецца спрашчэнне кансанантных груп альбо выпадзенне асіміляваных зычных. Наступныя прыклады ахопліваюць тыповыя для тэксту тэфсіра з'явы: */z-ž/ > /ž-ž/ > /ž/*: *ne-lōnčce-śe [z] žōnami* (25a2); */zs'/ > /ss'/ > /s's'/ > /s'/*: *[z] świádkōw* (38b4); */d-t/ > /t-t/ > /t/*: *uwolnice-śe ō[d] tej trūdnōści* (26a3). Кансанантная група */ds/* у прыметніку *ludski* праз асіміляцыю звычайна пераходзіць у афрыкату */c/*, што адлюстроўваецца праз напі-

---

[62] Гл. Kurzowa (1985), p. 87: "W pozycji między dwiema spółgłoskami miękkimi spirant s otrzymuje miękkość w przyrostku -ski: pańśk'i, Bil'ińsk'i, polśk'i, po spółgłosce twardej zdarza się rzadziej, np. lwoŭśk'i i w ogóle cechował wymowę osób niekształconych. [...] / Przykłady takiej wymowy notuje T. Lehr-Spławiński: Wzajemne wpływy polsko-ruskie w dziedzinie językowej, s. 113". Параўн. таксама Stankievič (1952), c. 68 – 70; Stang (1935), p. 37; Łapicz (1986), p. 141.

[63] Гл. >>> 11.13. Падваенне зычных.

[64] Ар. *Hūd* = Гуд (арабскі прарок).

[65] Спосаб напісання праз *yā' = j* у пазіцыі пасля мяккага */k'/* нехарактэрны.

[66] Гл. >>> 10.5.1. Насавыя галосныя ў сярэдзіне слова.

санне *ce* = *c*: */ds/* > */ts/* > */c/*: *lucka* (21b2). У наступным прыкладзе адбываецца спрашчэнне кансанантнай групы */dč/* > */tč/* > */č/*: *dōşwačil* (18a2)[67].

І наадварот, у асобных выпадках асіміляцыйныя працэсы адбываюцца ў выніку спрашчэння кансанантных груп. Звычайна спрашчэнне */stn'/* > */sn'/* выяўляецца разам з асіміляцыяй */sn'/* > */s'n'/* у шэрагу лексем: *pan bōg waš źgūbi neprijacōl wašich i chce ūčinic nameśnikami krōlami was na źemī* (128a5), *ne-trimal sōbe sina āni-jest jemū kōlegō ūčenśnik'em nicht w krōlewstwe jegō* (287b6), *pōśnik pōśnikajōnce menščiźni i pōśnik pōśnikajōnci newjesti* (343a3).

11.6. Асінхронная артыкуляцыя ў палатальных білабіяльных

Ужо для сярэднепольскай мовы была выяўлена расчэпленая біфанемная артыкуляцыя мяккіх білабіяльных */p'*, *b'*, *v'*, *m'/* і */f'/*, якая і сёння з'яўляецца прыкметай гутарковай мовы і дыялектаў[68].

У тэксце тэфсіра гэтая біфанемная артыкуляцыя маніфестуецца праз асаблівы спосаб напісання. Пасля графемы для лабіяльных *pe* = *p*, *bā'* = *b*, *wāw* = *w*, *mīm* = *m* або *fā'* = *f* дадаткова пішацца графема *yā'* = *j* як паказчык расчэпленай палатальнасці <*pj*, *bj*, *wj*, *mj*, *fj*>. Пры гэтым графема *yā'* = *j* знаходзіцца ў спецыяльнай лігатуры з *alif diacriticum* = *á* – <*yá*>[69]. Гэты спосаб напісання асабліва распаўсюдзіўся ў сувязі з *ляхіцкай перагаласоўкай*[70]. Зразумела, ён ўжываецца не зусім паслядоўна. Так, напр., часта здараецца, што перагаласоўка не перадаецца на пісьме побач з адасобленым */j/* альбо расчэпленая артыкуляцыя змякчанага білабіяльнага не паказваецца на пісьме.

Спосаб напісання з лігатурай *yā'* + *alif diacriticum* = *yá* ў тэксце тэфсіра асабліва часта можна назіраць пасля */w'/*: *bō k'edī swjástūją jednemū z-was dzewčiną ūrōdzōną weśōlōśc twari jegō źmeni-śe i ščerni ōn bendze pelen gnewu na žōna i tajic tō bendze ōd lūdzej ze-zlōści swej w tim ō čim śwjástōwanij i bendze miślil cō činic či-chōwac ją pōdmōrōnc glōdem či-też zakōpac w źemją āle wedz zapewne i muchemmedu jak'e tō zle rōzsōndk'ī jich* (212a3)[71], *chwala bōgu panu wšitk'ich śwjetōw* (370a2), *ālbō ne-prišla wam wjádōmośc tich ktōre pred wami pōgineli lūd*

---

[67] Характэрным з'яўляецца адлюстраванне гэтых працэсаў у розных рукапісах у рознай ступені. Этымалагічны спосаб напісання выкарыстоўваецца ў рукапісе **I** *daśwâdčil* I(18a2), тым часам як рукапіс **U** паказвае асіміляваны спосаб напісання: *dôśwâččil* U(18a2).

[68] Гл. Mazur 1993, p. 217–218: "Выявілася, што як у гутарковай мове, так і ў большасці дыялектаў замест палаталізаванага лабіяльнага зычнага артыкулюецца біфанемнае гукаспалучэнне: лабіяльны зычны + j (/pj/, /bj/, /fj/, /vj/, /mj/), за выключэннем пазіцыі перад галосным і".

[69] Параўн. Антонович (1968), с. 152. Параўн. таксама Stankievič (1952), с. 24, які ў спосабах напісання праз *yā'* + *alif diacriticum* = *já* бачыць адлюстраванне дыфтонга.

[70] Гл. >>> 10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка.

[71] Гл. **Q**(16:57).

nūchōwi[72] *i 'adōwī*[73] *i śemūdōwī*[74] (198a4), *ne-zabijajce gō ãzalī że ūpōžitkūje nas ãbō ōtrimami gō za sīna bō ōni ne bili wjádōmi cō tō jim prineśe* (310b8), *ī źemjá nagōtōwana dla bōjaźnikōw ci ktōre ōfjárūją datek z-dōbrij woli* (52a6), *pricisneliśmi ōbiwatelōw tich mjást napaścami i bedami* (125b8), *i bjada mōja k'edī bim zapewne pōšed na śwját pōwtōre* (380b5). Побач з гэтым заўсёды знаходзяцца спосабы напісання, якія не паказваюць ні біфанемнай артыкуляцыі білабіяльнага, ні перагаласоўкі: *rekli aj beda naša na nas zapewne mī zgrešili zblōndzili* (465a2).

11.7. Змяшэнне /z'/ з /ž/ і /s'/ з /š/

У тэксце тэфсіра досыць часта можна назіраць змяшэнне фанем /z'/ з /ž/ і /s'/ з /š/. У той час як фанемы /z'/ і /ž/ выразна супрацьпастаўляюцца праз ужыванне графем *zāy* = *ź* і *że* = *ž*, адрозненне паміж фанемамі /s'/ і /š/ у арабскім пісьме не заўсёды яснае. Змякчаны /s'/ перадаецца альбо праз *sīn* = *ś*, альбо праз *ṯā'* = *ṡ*. Гістарычна мяккі /š/ рэпрэзентуецца звычайна з дапамогай графемы *šīn* = *š*. Існуе небяспека блытаніны графемы *ṯā'* = *ṡ* з *šīn* = *š*, таму што абедзве графемы пішуцца з трыма дыякрытычнымі кропкамі зверху. Пры нядбайным напісанні асноўных формаў графем *ṯā'* = *ṡ* з *šīn* = *š* дакладнае адрозненне іх часта немагчымае.

У наступным прыкладзе графема *zāy* = *ź* для змякчанага /z'/ знаходзіцца на месцы графемы *że* = *ž* для гістарычна мяккага /ž/: *pōtrōšnī sōbe galōnź*[75] *z-fūnikami pōsipōn-śe na cebe dōjzrale fūnik'i* (242a4), *gdi stala rōźnica*[76] *ōd nich slišeli slōwa bōże* (12b4). У гэтым і аналагічных спосабах напісання, магчыма, мае месца толькі пісьмова-тэхнічная блытаніна абедзвюх графем, *zāy* = *z'* і *że* = *ž*, таму што абедзве графемы адрозніваюцца толькі колькасцю дыякрытычных кропак[77].

На падставе выключна арабскага пісьма з наступнага прыкладу дакладна не вынікае, ці мае месца толькі нядбайнае альбо свядомае напісанне: *ãž k'edi casnō jim bila źemje że ne-meli širōk'egō meškana*[78] (158a7), *za kōždim cūdem spišnelī bardzej i zōstali lūdem grešnim* (128b3), *ne-wedzą newernī k'edī mają bic wskrešenni*[79] (208b7).

---

[72] Ар. *Nūḥ* = Ной.

[73] Ар. *'Ād* = Ад – гэта назва старажытнага арабскага племя, якое часта згадваецца ў Каране.

[74] Ар. *Ṯamūd* = Самуд (імя ўласнае).

[75] Польск. *gałąź* = галіна.

[76] Польск. *różnica* = *розніца* стаіць тут як пераклад ар. *farīq* = група, частка, партыя. Польскі пераклад праз *розніца* трэба разумець як рэфлекс шматзначнасці арабскага кораня *frq*, які мае асноўныя значэнні *разлічаць, аддзяляць, разлучаць*.

[77] Персідская графема *że* = *ž* была ўтвораная ад арабскай графемы *zāy* = *ź* праз напісанне трох дыякрытычных кропак над асноўным знакам.

[78] Польск. *mieszkanie* = жыллё.

[79] Тут таксама звяртае ўвагу рэдуплікацыя /n/; гл. >>> 11.13. Падваенне зычных.

Тыповае змяшэнне фанем /z'/ і /ž/ альбо /s'/ і /š/ рэгулярна выступае ў шэрагу лексем, напр. *źródło* (крыніца), *ślub* (шлюб), *jeśli* (калі). У слове *źródło* дзякуючы спосабу напісання праз графему *że* = *ž* выразна паказваецца гістарычна мяккі /ž/ замест /z'/, што ўказвае на рэфлекс */zr'/ > /žr/[80]: *ej jak wele zastawil ōd ōgrōdnich rečej i ōd žrōdl wodnich* (407a2), *ūčinil bōg twōj pōd tōbą žrōdlō wōdī* (242a3), *ceką spōd nich žrōdla wekū'ista* (325a7), *wrūcajce žōnam swojim wanō šlūbne* (60a3), *cūdzōlōžnica newasta nech šlūbu ne-bere tilkō cūdzōlōžnika menžčiźna ālbō newernich pōgan* (279a8), *rekl še'īb*[81] *zapewne ja chce žebim tōbe pōšlūbil is-tich dwuch cūrek mōjich jednō* (312b7).

Пры выкарыстанні графемы *sīn* = *ś* у слове *jeśli* кожны раз выразна праяўляецца змякчаны /s'/: *jeślī prijdze wam šečenśce i dōbrōci pōčarneją* (51a7). Пры ўжыванні графемы *tā'* = *ṡ*, наадварот, захоўваецца небяспека блытаніны з *šin* = *š*. У наступнай вытрымцы з тэксту ў першым *jeśli* мае месца спосаб напісання праз *šīn* = *š*, які паказвае пераход /s'/ > /š/: *mōwą ješlī wam da tak'ij dekret jakō ū nas pretō trimajce-še tegō ā jeślī ne-da tak'egō dekretū pretō wistregajce-še ōd negō* (88b1), *te ktōre īman*[82] *prijenli ne-mejce i ne-trimajce ōjcōw wašich i braci wašich prijacelmi jeśli ōni ūlūbili newerenstwa nad īman* (146b8).

11.8. Змяшэнне /s/ з /s'/ і /z/ з /z'/

Змяшэнне паміж цвёрдым /s/ і мяккім /s'/ альбо змяшэнне цвёрдага /z/ і мяккага /z'/ знаходзяць сваю прычыну перш за ўсё ў непаслядоўным пісьмаўжыванні. Побач з гэтым можна высветліць фаналагічныя падставы для палаталізаваных спосабаў напісання.

У назоўніку *pismo* (пісьмо, ліст, пісанне), які ў польскай мове ўжываецца з цвёрдым /s/, мы рэгулярна знаходзім у тэксце тэфсіра ўсходнеславянскае, беларускае гучанне са змякчаным /s'/: *chōdzce pō źemī ā pripatrūjce-še jak'ij stal kōnec piśmū i prōrōkū klamajōncim* (52b4). Польскія спосабы напісання з графемай *ṣād* = *s* для цвёрдага /s/, наадварот, рэдкія: *pewne jegō pisma ōbetnica dōšla* (244b8).

Змякчэнне /s/ > /s'/ у гукавой групе /s'k'/ у канцы прыметніка *-ski* абмяркоўвалася вышэй[83]. Непаслядоўныя спосабы напісання, якія паказваюць мяккі /s'/ перад цвёрдым /k/, можна лепш за ўсё патлумачыць як спосабы напісання па аналогіі: *bōg jest śwjátlōšcą nebeską i źemśką* (283a3). Такія прыклады вельмі часта сустракаюцца ў тэксце тэфсіра[84].

---

[80] Параўн. Kurzowa (1993), p. 109; Smolińska (1983), p. 45, 49; Mazur (1993), p. 230.

[81] Ар. *Šu'ayb* = Шуайб (імя ўласнае; арабскі прарок).

[82] Ар. *īmān* = вера.

[83] Гл. >>> 11.5.3.4. Змякчэнне /s/ > /s'/ у пазіцыі перад /k'/.

[84] Параўн. з гэтым Антонович (1968), с. 248: "Кроме того, необходимо особо подчеркнуть, что буква <*s*> [*sād* = *s*], с одной стороны, и буквы <*ṡ*> [*tā'* = *ṡ*], <*ś*> [*sīn* = *ś*] и <*ṣ*> [*ṣīn* = *ṣ*], с другой, употребляются очень последовательно для обозначения соответственно твердого и мягкого звуков /s'/. Мы не знаем ни одного случая обозначения твердого /s/ буквами <*ṡ*, *ś* > или <*s*>".

На непаслядоўнае пісьмаўжыванне можна таксама спаслацца ў наступных прыкладах. На пісьме праз графему *zāy* = *ź* выразна праяўляецца змякчаны */z'/*, які ў дадзенай пазіцыі нельга абгрунтаваць: *pan bōg waš źgūbi neprijacōl wašich* (128a5), *wnet padają dō śeğdejū*[85] *s-płačem ź bōjaźną* (244b4).

11.9. Сляды мазураканння?

Мазураканне (вымаўленне */š, ž, č, dž/* як */s, z, z, dz/*) першапачаткова з'яўлялася асаблівасцю малапольскага дыялекту і было неўласцівае літаратурнай мове. Наконт яго паходжання ў польскім мовазнаўстве існуюць розныя меркаванні адносна часу ўзнікнення і моўнага кантэксту[86].

Як рэдкія і невыразныя сляды мазураканння з тэксту тэфсіра можна прывесці наступныя прыклады: *uzičali*[87] *bōgū pōzičk'ī*[88] *dōbre* (442b8), *spełnił te słōwa ōbrazane*[89] (18a2). Графемы *że* = *ž* і *ḍād* = *z* выразна кантрастуюць у арабскім пісьме, з-за чаго гэтыя спосабы напісання не могуць быць патлумачаныя як простая арфаграфічная памылка.

11.10. Спрашчэнні кансанантных груп

Спрашчэнні кансанантных груп, якія прыводзяцца ніжэй, часта сустракаюцца ў тэксце тэфсіра побач з рэгулярнымі, няспрошчанымі формамі. Такія спрашчэнні з'яўляюцца тыповымі для польскай мовы паўночных крэсаў[90]:

ctw (tstw) > **stw**: У назоўніках *bogactwo* (багацце), *kupectwo* (купецтва) і *świadectwo* (сведчанне) сустракаецца спосаб напісання < *bogastwo, kupestwo, świadestwo* > з графемай *ṣād* = *s* замест *ce* = *c*, які адлюстроўвае спрашчэнне групы */tstw/* > */stw/*: *k'edi prišedli jim ščeńśce bōgastwa pōžitk'ī mōwili dla nas ōtō tō wšitkō* (128a7), *mōwili pewne kūpestwa tak że jakō līfa āle chelalem*[91] *učinił pan bōg kūpestwa* (37b5), *bōg wizna i świadestwo daje* (455a4). Побач з гэтым вылучаюцца адзінкавыя выпадкі аналагічнага спосабу напісання назоўніка *proroctwo* (прароцтва): *daje mōndrōści i prōrōstwa kōmū zachce* (37a1).

rdn замест **rn**: у тэксце тэфсіра звяртае ўвагу прыметнік *miłosierny* (міласэрны), які пастаянна ўжываецца ў варыянце *miłoserdny* з цвёрдым */s/* і кансанантнай групай */rdn/*, што ўказвае на беларускі ўплыў: *najlepša chwała bōgū panu i prōwizorōwi ṣwata laskawemū miłōserdnemū krōlōwī* (5b2), *pewne pan bōg ōdpūskliwij miłōserdnij* (26b3). Побач з гэтым: *bō pan bōg jest ōdpūskliwij łechkōserdnij*[92] (29b7).

---

[85] Ар. *sağda* = прастэрнацыя падчас малітвы.

[86] Гл. Stieber (1973), p. 60; Mazur (1993), p. 123 ff.

[87] Польск. *użyczać* = даваць, пазычыць, дзяліцца.

[88] Польск. *pożyczka* = пазыка.

[89] Польск. *obrażanie* = абраза. Тут род. скл. адз. л. *obrażania*.

[90] Параўн. Kurzowa (1993), p. 110; Smolińska (1983), p. 44.

[91] Ар. *chalāl* = дазволены, дазволенае.

[92] Гл. >>> 3.3.1. Прыметнік "*lekkosierny*" (лёгкасардэчны).

rwš > rš: *cō tō zeslal pan bōg waš rekli başni histōrije peršich lūdzej* (209a3).

stn' > s'n': *rekl dō brata harūna*[93] *bōndz nameśnik'em mōjim w lūdzech mōjich ź nimi zgadzaj-śe* (129b2), *i ne-trimal sōbe sina āni-jest jemū kōlegō učeńsnik'em nicht*[94] *u krōlewstwe jegō* (287b6).

str || sr: у лексемах *srogość* (суровасць) і *srogi* (суровы) тыповым з'яўляецца ваганне паміж іх польскім гучаннем з */sr/* і іх усходнеславянскім гучаннем з захаванай групай */str/*: *aj jak'e zle učink'i cō zarōbili sōbe dūšam īch żebi bila strōgōšc i kerane bōžże nad nimi i w menkach ōni na wek'i bendą* (94a1), *strōgōšc swoją ōkezal nad nim i ūčinil ź nich besteji beźjani i świne* (91b1), *za picha wašą pōdani srōgōšci* (11a6), *bō ktō ōdwrōci jim w ten dzen til swoj chiba dla wibawena neprijacela ālbō dla zlōnčena dō pōlkōw chōrōngwej swojich pewne tak'ij wicerpi srōge kerane* (138a8), *ne-dōtikajce-śe gō činōnc zlōšc bō weźme was kerane srōga* (123b7).

zdr > zr: у лексеме *zdrajza* (здраднік) таксама можна часта назіраць спосаб напісання, які вагаецца паміж спрашчэннем і захаваннем групы */zdr/*: *ābī krōl ō tim wedzal że ja jemū ne-jestem zrajcą* (186a5), *bō pewne panbōg ne-derigūje na dōbrą ōšūkaninī*[95] *zdrajcōw*[96] (186a6), *ābō ne-widzice że ōni są ōšūkanci zdrajci* (159a6).

wst > st: *pōstanece i pōjdzece dō pekla barzō ne-dōbrō mejsce* (40b6), *tich ktōre naśladūją cebe wižej pōdnōse ōd tich ktōre ne-werą aż dō dna pōwstanegō* (45a5), *ne-mają ci-cō ne-werą z-martwich pōstac* (332a7).

spotkać > potkać[97], **dd**[98] **> d**: *k'edi pōtkace-śe*[99] *s-timi ktōre newernikami są w bōjū ne-pōdawajce-śe*[100] *jim* (138a6).

zwł > zł: zlašče (7b3) (= *zwłaszcza*)

11.11. Змяшэнне */w/* і */u/* на пачатку слова, інтэрвакальны */w/* (*ŭ*)

Досыць частае ў тэксце тэфсіра змяшэнне */u/* і */w/* на пачатку слова (білабіялізацыя) абумоўленае беларускім субстратам[101].

Шматлікімі з'яўляюцца прыклады пераходу */u/ > /w/* у пазіцыі пасля галоснага перад зычным. Тут у арабскім пісьме графемай *wāw* = *w* замест галоснага, які пішацца на пачатку слова праз *alif*, паказваецца */w/* і *wtōpiliśmi lūd*

---

[93] Ар. *Hārūn* = Арон.

[94] У займеннік *nikt* (ніхто) пранікае часам беларускае гучанне */nicht/*.

[95] Польск. *oszukanina* з'яўляецца аўгментатыўным утварэннем з суфіксам *-ina*. Параўн. Budziszewska (1994), p. 101.

[96] Тут мы маем адзін з зусім рэдкіх прыкладаў ужывання канчатка род. скл. мн. л. *-ów* назоўнікаў м. р. на *-a* (гл. >>> 12.1.9. Родны склон множнага ліку мужчынскага роду).

[97] Пропускі прэфіксаў у дзеясловах, як у дадзеным прыкладзе, з'яўляюцца тыповымі; гл. Kurzowa (1983), p. 153.

[98] Гл. Smolińska (1983), p. 58.

[99] Польск. *spotkać śię* = спаткацца.

[100] Польск. *poddawać śię* = паддавацца.

[101] Гл. Wexler (1977), p. 140 ff.

fera'unōw[102] *i wšitk'ī cō bili newernimi kriwdnikami* (142a5), *i wčinilišmi tam na źemi wodī drōgi dla prechōdū ãzalebi prōstō drōgą šlī i wčinilišmi nebō sklepenem i prikricem ābī streglō prejšce šetanū* (258a6), *prilōžī pečenc pan bōg na serca tich ktōre ne-znają i ne-wmeją bōga naleźc* (332a6).

Наадварот, у */w/* на пачатку слова часта паказваецца рэфлекс */w/ > /ŭ/*. Тут арабскае пісьмо ўжывае замест зычнай графемы *wāw* = *w* галосны */u/*, які пазначаецца праз *alif*: *ōdzecičī prōrōstwa mōje i ōdzecičī ich kaplanstwa izra'ilśk'e i ūčin-gō bōže mōj sōbe ūdzenčnim* (240b8), *i prišengali newernici pânū bōgū sprewedliwą prišengą że-ne-wskreši jich pan bōg z-martwich i ōwšem ūskreši i termin pōlōžī na tō sprawedliwij* (210b4). Вартай увагі таксама з'яўляецца змена ў прыназоўніку *w* (у): *ne-trīmaj ź nimi prijacelstwa ãž ōdlōnčōn-še ōd dōmū i pōjdą s-tōbą ū drōge bōžžą dō medineju*[103] (71a5).

Досыць часта мы знаходзім, як у беларускай мове, інтэрвакальны */w/*, які знішчае хіятус: *prichōdzce dō pisma cō zeslal bōg i da nawuk'ī prōrōck'ij* (96b4), *ãzalī ō nawuce i newinnōści mōjej bendą wedzec* (185b5), *pō tim bendzece pōwrōcenī dō bōga wjádōmegō zawočnich tajemnic i jawnō wadōmich rečī* (155b1). Побач з гэтым у арабскім пісьме хіятус звычайна пазбягаецца альбо праз *alif* = *'* , альбо праз *'ayn* = *'* ; такія спосабы напісання з'яўляюцца характэрнымі для польскіх тэкстаў: *na'ūčilišmi-gō remōsla wam panceri rōbic wam dla zaščicena was ōd pripadkōw neprijacelśk'ich* (261b3), *nech wam balwani waši pōmōgą jeśli ōdwrōcace-še ōd na'ūk'i mōjej* (166b8). Прыкметна тое, што мы знаходзім польскія і беларускія спосабы напісання ў блізкім кантэксце: *pewne pan bōg wjádōm jest wšitk'ich tajemnic za'ōčnich ci ktōre zajzrōści ōbmawają zawōčne* (153b4).

11.12. Поўнагалоссе

Тыповай рысай, якая выразна адрознівае беларускую мову ад польскай, з'яўляецца ўсходнеславянскае поўнагалоссе. Паказальна, што поўнагалоссе ў тэксце тэфсіра сустракаецца толькі вельмі спарадычна і пераважна звязанае з абмежаванай колькасцю тыповых лексем.

У дзеясловах гэта звычайна сустракаецца ў *strzec* (сцерагчы) і *sprzeczać śię* (спрачацца) і іх дэрыватах: *k'edī prišenžece stereżce-ž pilnō prišengi wašej bōgū ūčinōnej* (95a2), *dōbre ūčink'i statečna činili pō tim bōjaźn bōžžą trimali i jemū werili i mōcnō trimali steregli-še i dōbre-še sprawowali* (95b2), *ã ci ktōre wisteregali-še dagōnōw*[104] *ābi-še jim ne-klanali nawrōcili-še dō bōga pâna* (376b5), *ci ktōre są člōnk'i swoje ōd cūdzōlōstwa pōsteregali i pōsteregają* (468b6), *są nektōre z-lūdzī cō sperečajōn-še ōd wšechmōcnōści bōžej ne-wedzōnc na'ūk'ī bez dōwodū i bez kśengi* (265a1).

---

[102] Ар. *fir'awn* = фараон.

[103] Ар. *Madīna* = горад Медына (першапачаткова Ясрыб), у які эміграваў Прарок пасля таго, як мекканцы не прынялі яго як пасланніка Бога.

[104] Гл. >>> 2.1.5. Боства "Дагон".

Сярод назоўнікаў кідаецца ў вочы польск. *głownia* (галавешка), што заўсёды сустракаецца ў сваёй беларускай форме з поўнагалоссем і са спірантызацыяй /g/ > /h/, а таксама мае беларускія склонавыя канчаткі: *prijde dō was s-tamtōnd z-wjedōmōścą ābō z-halawnōju*[105] *ōd ōgna i ăzalibiśce zegrali-śe ōd źimna* (313a4-5).

Побач з гэтым поўнагалоссе нерэгулярна сустракаецца ў некаторых назоўніках, такіх як *droga* (дарога), *chłop* (селянін), *władza* (улада): *žōna nūchōwa*[106] *i žōna lūtōwa*[107] *bilī te ōbedwe pōd waladzą dwuch slūg slūg našich dōbrich* (461a6), *ōn jest bōg prawdziwij i prōwadzī dōrōgą* (348a8), *i reče jim cō-śce zwedli chalōpōw mōjich* (289a1), *ă ktō nema chalōpa pretō nech pōści dwa mesōnci ne-rōzriwajōnc* (445a3), *či-rōwnūjece-śe s-chōlōpami wašimi ci-bōjice-śe ōd nich jakō śe bac treba ōd rōwnich wam pretō čemū bōžžich chalapōw bōgū kōlegami činice* (325a1). Аднак пераважна мы знаходзім рэгулярныя польскія формы: *rekl staršij ī bušrā*[108] *ōtō ten chlōpec i zchōwali gō s-tōwarami* (182b5). У якасці выключэння ў назоўніку *grzech* сустракаецца спосаб напісання <*gerech*>, які можна расцаніць як арфаграфічную памылку, бо ён не падмацоўваецца гукавымі законамі: *pretō rekli jim kajce-śe i prōśce ōdpūščene gerechōw bōga wašegō* (470a2).

11.13. Падваенне зычных

Рэдуплікацыя, або падваенне, змякчаных зычных з'яўляецца асаблівасцю беларускай (і ўкраінскай) мовы[109], якая, хаця і пацвярджаецца з XIV–XV стст., у тэксце тэфсіра выяўляецца толькі спарадычна.

Тыповым для тэфсіра **L** з'яўляецца падваенне гістарычна мяккага /ž/ > /žž/ у формах прыметніка *boży* (божы): *ă ne-jedzce tegō cō ne-wspōminalō śe īme bożże nad nimi* (111a4), *ci ktōre sprečka činą ă jedinōstwe bōžžem pō tim k'edī prijōl muchemmeda za prōrōke sprečka jich pōtōnpōne* (397a4), *sprečajōn-śe ō korāne bōžžem bez žadnegō slūšnegō dōwodū* (378b4), *zsila ānjōlōw z-ǧebra'ilem*[110] *tō jest dūchem bōžžim* (207a8), *starajce-śe i pracūjce ū pōslūgach bōžžich* (87b6). Акрамя прыметніка boży, рэдуплікацыі зычных сустракаюцца ў тэксце тэфсіра **L** несістэматычна.

У тэфсіры **L** нельга знайсці прыкладаў тыповай беларускай рэдуплікацыі змякчанага /n'/ > /n'n'/ у аддзеяслоўных імёнах на *-enie*. Такія падваенні, наадварот, рэгулярна ўжываюца ў рукапісах **U** і **M**, якія паходзяць з XIX ст., і паказваюць характэрны беларускі ўплыў: *zâ kôždīm ôśwecennem bliskâwici* U(7a7), *k'edi cemnô' stâlô' nâd nimi stânelî w zâdū'mânnū'* U(7a7), *dlâ wâs źeme rôspôstâr dlâ*

---

[105] Наконт склонавага канчатка гл. >>> 12.3.5. Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[106] Ар. *Nūḥ* = Ной.

[107] Ар. *Lūṭ* = Лот.

[108] Ар. *bušrā* = радасная вестка.

[109] Гл. Wexler (1977), p. 149.

[110] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

meškânne â nebô' sklepil i ūfūndôwâl U(7b2), *lâmâjô' prikâžânne bôže pô prijencū' jegô' slôwâ* U(8a5), *lâmâjôn pšikâžânne bôžže pô pšejścu jegô slôwâ* M(8a5).

У тэфсіры **L** у аддзеяслоўных імёнах тыповыя спосабы напісання праз *yā' = j* адлюстроўваюць у адпаведнай пазіцыі артыкуляцыю */n'j/* без рэдуплікацыі, якая з'яўляецца тыповай для беларускіх гаворак паўднёвага захаду беларускага моўнага арэала[111]: *dla prislūchana čitanja muchemmedowegō* (472a3), *takōwī naciji są ōni nalepše medzi stworenjem* (493a3), *ãle zaplata bōga twegō spašenja jest lepše* (276a7).

11.14. Пратэтычны */i/* пры збегу двух зычных на пачатку слова

Пратэтычны */i/* пры збегу двух зычных на пачатку слова з'яўляецца асаблівасцю паўднёвых і паўднёва-заходніх беларускіх гаворак[112]. Усходнія мовы (арабская і цюркская) таксама звычайна раз'ядноўваюць два зычныя на пачатку слова праз пратэтычны */i/*. Тут асаблівасці гэтых усходніх моў сустракаюцца з асаблівасцю беларускіх і польскіх памежных гаворак. Магчыма, у спосабах напісання ў тэксце тэфсіра, у якім ужываецца пратэтычны */i/*, таксама мае месца толькі імітацыя ўсходніх пісьмовых навыкаў, што хутчэй вынікае з арабска-цюркскай пісьмовай традыцыі, чым адбываецца пад уплывам названай моўнай з'явы.

У тэксце тэфсіра мы асабліва часта знаходзім рэфлексы гэтай тэндэнцыі да пратэтычнага */i/* ў прыназоўніку *z*, які пішацца разам з наступным словам і, такім чынам, на пісьме ён чыста тэхнічна можа акрэсліваццца папярэднім *alif* і знакам для галоснага *kasra = i*: *ūpadli te fūndatōrōwe is-tim meśğidem*[113] *w ōgen pek'elnij* (157a5), *zapewne wī w menkach zajednō bendzece iz-šetanami* (403a6).

11.15. Эпентэтычны *l*

Звычайна з беларускай мовы ў асобныя формы тэксту тэфсіра пранікае эпентэтычны *l*, які невядомы заходнеславянскім мовам. Яны захоўвалі больш архаічны стан палаталізаваных лабіяльных без эпентэтычнага *l*: *pan bōg nebōsa i źemli* (229b1), *pane bōže ne zastawlaj na źemī iź newernikōw nikōgō* (470b6).

---

[111] Гл. Антонович (1968), с. 153: "Попадаются случаи реализации группы согласный + ьj + гласный, свойственной некоторым юго-западным белорусским говорам, напр.: нась́ейе 6a1, 6б9, нась́ейа 5б9, рôсказанйа 5a10, згрôмадзенйа 5a7" (Антановіч спасылаецца на манускрыпт XVII ст. Ляйпцыг-280; параўн. Антонович (1968), с. 150 і далей.)

[112] Гл. Wexler (1977), p. 139; параўн. Stankievič (1952), с. 53 і далей. Існуюць прыклады ўжывання беларускай мовы з XV ст. У той час, калі на паўднёвым захадзе ўжо адбылася страта рэдукаваных галосных, на паўночным усходзе ўсходнеславянскага моўнага арэала адбывалася ўзмацненне *i'-* на пачатку слова, таму часткова захаваўся пратэтычны *i-*.

[113] Ар. *masğid* = мячэць.

12. СКЛАНЕННЕ НАЗОЎНІКАЎ

Скланенне назоўнікаў у сваіх асноўных рысах паказвае даволі сучасную моўную карціну, якая адпавядае польскай мове XVII–XVIII стст.

У тэфсіры **L** адлюстраваліся наступныя характэрныя рысы: 1) архаічныя канчаткі; 2) графічныя і фанетычныя асаблівасці; 3) несістэмныя марфалагічныя інтэрферэнцыі з беларускай моваў; 4) сістэмныя, узніклыя на падставе беларускага субстрату узоры скланення польскай мовы крэсаў.

Перш за ўсё тут належыць указаць у агульных рысах некалькі прыкметных, характэрных асаблівасцей сістэмы скланення назоўнікаў у тым выглядзе, у якім яна знаходзіцца ў тэксце тэфсіра **L**:

- Як тыповы графічны фактар указваецца ўжыванне аднаго толькі знака *fatḥa* = *e* для перадачы галоснага */a/*, які, са свайго боку, мог паходзіць з ненаціскнога */o/*. Так, напр., канчатак *-a* часта сустракаецца ў родным склоне адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду ў форме *-e*, г.зн. рэдукавана напісаны толькі праз *fatḥa* = *e*.
- Беларускае аканне выступае як важны фанетычны фактар. У вінавальным склоне адзіночнага ліку жаночага роду пад уплывам акання вельмі часта сустракаецца канчатак *-a* (< *-e* < *-ę*), які з'яўляецца тыповым для польскай мовы паўночных крэсаў.
- Рэфлекс закрытай артыкуляцыі галоснага */e/* > */é/* > */i, y/* ў пазіцыі перад */j/* спарадычна сустракаецца ў канчатку роднага склону множнага ліку *ej* > *éj* > *ij*.
- Дэназалізацыя ў канцы слова з'яўляецца прычынай для спосабаў напісання *ę* > *e* толькі праз *fatḥa* = *e* (наогул у вінавальным склоне адзіночнага ліку жаночага роду) альбо *-ą* > *o* без *saġir-ı nūn* = *ñ* (часта можна назіраць у творным склоне адзіночнага ліку жаночага роду).
- Канчатак *-y* ў назоўным і вінавальным склонах множнага ліку пры гістарычна мяккіх асновах – гэта беларуская асаблівасць, якая з'яўляецца ў тэксце тэфсіра амаль сістэматычна. Канчатак *-y* моцна канкурыруе з адпаведным польскім канчаткам *-e*.
- У вінавальным склоне множнага ліку пры гістарычна мяккіх асновах рэгулярна з'яўляецца канчатак *-ej*, які лепей кантрастуе з беларускімі назоўным і вінавальным склонамі множнага ліку на *-y* назоўнікаў з гэтымі асновамі, чым польскі канчатак *-y* роднага склону множнага ліку.
- У творны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду і асабліва ніякага роду вельмі часта пранікае беларускі канчатак *-om*, а пад уплывам акання таксама *-am*.

- Толькі вельмі рэдка мы канстатуем у тэксце тэфсіра **L** канчатак *-y* || *-i* ў назоўным і вінавальным склонах множнага ліку ніякага роду паводле беларускага ўзору.
- Таксама як беларускі ўплыў можна расцэньваць шырокае распаўсюджванне канчатка *-am* у давальным склоне множнага ліку, асабліва ў ніякім родзе. У польскай мове гэты канчатак, які паходзіць з *a*-скланення, можна разглядаць як архаічны ўжо ў XVII ст.
- Далей звяртае ўвагу спарадычнае ўжыванне формы роднага склону ў вінавальным склоне множнага ліку адушаўлёных назоўнікаў жаночага роду. У польскай мове ўжыванне родна-вінавальнага склону абмяжоўвалася адушаўлёнымі назоўнікамі мужчынскага роду.
- У назоўніках жаночага роду на *-ra* ў давальным і месным склонах адзіночнага ліку сістэматычна перамагаў мяккі канчатак *-y* паводле беларускага ўзору.
- Як архаічная форма ў давальным склоне множнага ліку назоўнікаў з мяккімі асновамі яшчэ даволі часта сустракаецца канчатак *-em*.
- У адушаўлёных назоўніках мужчынскага роду ў множным ліку часта ўжываюцца формы вінавальнага склону замест формаў родна-вінавальнага склону.
- Акрамя таго, часта ва ўсіх родах сустракаецца творны склон на *-y* || *-i*.
- Перанос канчатка *-ą* у вінавальным склоне адзіночнага ліку жаночага роду таксама на назоўнікі з цвёрдай асновай з'яўляецца характэрнай рысай польскай мовы ў паўночных крэсах. Пры дэназалізаваным спосабе напісання з'яўляецца канчатак *-o*; у тэксце тэфсіра **L** на базе арабскага пісьма ён таксама можа чытацца ў беларускім спосабе чытання як *-u*.

У наступных раздзелах будуць дэталёва разглядацца розныя скланенні і асобныя склоны.

12.1. Скланенне назоўнікаў мужчынскага роду

У наступнай табліцы прыводзяцца склонавыя канчаткі назоўнікаў мужчынскага роду (табл. 12.1).

Табліца 12.1

Скланенне назоўнікаў мужчынскага роду

Склон	Адзіночны лік	Множны лік
Наз.	**-Ø** (нулявы канчатак) **-a** (гл. *a*-скланенне)	**-i** (*-y* || *-i*) (не мужчынска-асабовы) (цвёрдая) **-i** (*-i* || *-y*) (мужчынска-асабовы) **-owe** (*-owie*) (мужчынска-асабовы) **-e** (*-e*) (мяккая; гістарычна мяккая; */l, j/*) **-a** (<*-e*) (аканне) **-i** (*-i* || *-y*) (мяккая; гістарычна мяккая) (бел.) **-a** (*-a*) (запазычаныя словы) **-e** (<*-a*) (графічны варыянт)

Род.	**-a** (*-a*) (адушаўлёныя назоўнікі) **-e** (<*-a*) (граф. варыянт) (*fatḥa*) **-u** (*-u*) (неадушаўлёныя назоўнікі)	**-ow** (*-ów*) (цвёрдая) **-i** (*-i* || *-y*) (мяккая; гістарычна мяккая) **-aw** (< *-ow*) (аканне) **-ew** (< *-aw*) (графічны варыянт) **-ew** (*-ew*) (мяккая) (рэдка) **-ej** (*-ej*) (бел.) (асабліва гістарычна мяккая) **-aj** (<*-ej*) (аканне) **-ij** (< *-éj*) (*e pochylone*)
Дав.	**-owi** (*-owi*) (рэгулярны канчатак) **-u** (*-u*) (аднаскладовыя назоўнікі *panu, bratu*) (прыназоўнікавыя фразы з *ku*)	**-om** (*-om*) (цвёрдая; мяккая) **-em** (*-em*) (мяккая) (рэшткі) **-am** (*-am*) (з *a*-скланення) (бел.) **-em** (<*-am*) (графічны варыянт)
Він.	**-Ø** (він. = наз.) (неадушаўлёныя назоўнікі) **-a** (він. = род.) (адушаўлёныя назоўнікі) **-e** (він. = род.) (граф. варыянт)	**-i** (*-y* || *-i*) (цвёрдая) **-e** (*-e*) (мяккая; гістарычна мяккая) **-a** (<*-e*) (аканне) **-i** (*-i* || *-y*) (мяккая; гістарычна мяккая) (бел.) **-a** (*-a*) (запазычаныя словы) **-e** (<*-a*) (графічны варыянт) він. = род. (каля 50 % мужчынска-асабовых)
Твор.	**-em** (*-em*) (польск.) (рэгулярны канчатак) **-om** (*-om*) (бел.) (цвёрдая) (часта) **-em** (*-em*) (бел.) (мяккая) **-am** (*-am* < *-om, -em*) (бел.) (аканне)	**-ami** (*-ami*) (рэгулярны канчатак) **-mi** (*-mi*) (мяккая) (часта) **-i** (*-y* || *-i*) (рэшткі) (цвёрдая; мяккая) **-oma** (*-oma*) (парны лік) (рэдка)
Месн.	**-e** (*-'e*) (цвёрдая) **-u** (*-u*) (мяккая, гістарычна мяккая) (*k, g, ch*) **-e** (бел.) (у канцы) (выключэнні) **-i** (*-i* || *-y*) (бел.) (мяккая; гістарычна мяккая) (польск.) (архаізм: *we <u>dni</u> i w nocy*)	**-ach** (*-ach*) (рэгулярны канчатак) **-ech** (<*-ach*) (графічны варыянт) **-'ech** (< **-ě*) (архаізм)
Клічны	**-e** (*-e*) (цвёрды) **-a** (<*-e*) (аканне) (рэдка) (*ojcza!*) **-u** (*-u*) (мяккая; гістарычна мяккая) (*k, g, ch*)	клічны = **назоўны**

12.1.1. Назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

Пасля выпадзення рэдукаванага галоснага, які знаходзіўся ў канцы слова ў слабой пазіцыі, у польскай мове назоўнікі ў назоўным склоне адзіночнага ліку канчаюцца на чыстую аснову без дадатковых флексійных марфем (нулявы канчатак). Наступствам выпадзення рэдукаванага галоснага было ўтварэнне цвёрдых і мяккіх асноў, пры гэтым адбывалася прыпадабненне паміж першапачатковым скланеннем *-jo* і *-i*, з аднаго боку, і скланеннем *-o* і *-u* – з іншага. Зусім знікла ў польскай мове скланенне на *-n*, якое прыпадобнілася да схемы іншых скланенняў праз перайманне формаў вінавальнага склону ў функцыі назоўнага[1].

Прыклады з тэксту тэфсіра: *tī jest dōbrī prōwizōr karmicel* (98a6), *bō jest člōwek skōmpō stworōnij* (229a6), *jeśli ōcec i matka bendō newernimi* (320a4), *či-ne-widzelišce jak'ij bil kōnec tim ktōre pred nimi bili* (327a2), *ne-padne na twarī jich prōch āni cen ūbōstwa āni pōhanbene* (162b6), *ten ōstatnij dōm tō jest raj dla bōjaźnikōw našich* (319a1), *prišed dō nich pōsel naš świentij mōjžeš* (406b5).

Да назоўнікаў мужчынскага роду належаць амаль усе арабізмы: *prišed dō nich muchemmed*[2] *pōsōl mōj* (406b3), *fera'ūn*[3] *rekł ō zapewne pōsōl waš ktōrij pōslanij dō was pewne glūpij meğnūn*[4] (294b8), *bō farz*[5] *bōžij na lūdzach nawedzic dōm bōžij* (49a1). Арабскія назоўнікі жаночага роду на *-a(t)* у польскай і беларускай мовах звычайна пераходзяць у мужчынскі род[6]. Альбо з арабскай мовы пераймаецца *-t status constructus*, альбо з'яўляецца суфігіраваны *-j*: *āle šerī'et'*[7] *muchemmedow ma bic na wšitek świát nezadlūgō* (283a5), *ā k'edi prijdze jim ājet'*[8] *mōwą ne-werimī āž i nam da tak wlaśne cō danō prōrōkōm bōžžim* (111b1), *stregōn-śe nedōwark'i że spūšča ālbō chōdzī na nich śūrej*[9] (151b6). Перайманне *-t* са *status constructus* адбываецца так, як і ў турэцкай мове: (тур.) *şeriat* (ісламскі рэлігійны закон), (тур.) *ayet* (верш Карана), але (тур.) *sure* (сура Карана) > польск. / бел. *siurej*; таксама (ар.) *fatwā* (заканадаўчая пастанова), (тур.) *fetva* > (польск. / бел.) *fetwej*. Гэта гаворыць пра турэцкае пасярэдніцтва ў запазычванні арабізмаў[10]. Ва ўтвораных ад

---

[1] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 266.

[2] Ар. *Muḥammad* = Мухамад.

[3] Ар. *fir'awn* = фараон.

[4] Ар. *maǧnūn* = звар'яцелы, вар'ят.

[5] Ар. *farḍ* = рэлігійны абавязак.

[6] Выключэннем з'яўляецца арабскі назоўнік *qibla* = кірунак у час малітвы, які часам ужываецца ў ніякім родзе. (Параўн. >>> 12.2.4.) Другім выключэннем з'яўляецца арабскі назоўнік *ṣadaqa* = міласціна, які звычайна трактуецца як назоўнік жаночага роду. (Параўн. >>> 12.3.4.)

[7] Ар. *šarī'a* = шарыят, ісламскі закон.

[8] Ар. *āya* = верш Карана, знак, цуд.

[9] Ар. *sūra* = сура Карана.

[10] Параўн. Akiner (1978).

арабізмаў абазначэннях членаў групы сустракаюцца формы з марфемай *-in*: *ktō gōršij zalimin*[11] *ōd tegō cō kladze pōtwar na pana bōga klamliwij* (114a2).

Назоўнікі мужчынскага роду на *-a*, такія як *sługa* (слуга), *sędzia* (суддзя) і інш., а таксама распаўсюджаныя арабскія імёны ўласныя *Mūsā* = Майсей і *'Īsā* = Ісус падпарадкоўваюцца *a*-скланенню назоўнікаў жаночага роду[12].

12.1.2. Родны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

Першапачаткова ў родным склоне адзіночнага ліку ў *o*- і *jo*-скланенні, да якіх належала большасць назоўнікаў мужчынскага роду, ужываўся выключна канчатак *-a*. Ужо ў далітаратурны час у польскай мове ўзмацнялася пранікненне канчатка *-u* з *u*-скланення, а канчатак *-a* ў далейшым усё больш выцясняўся з ужывання. Пазней, у XVI ст., у польскай мове ўсталяваўся новы прынцып, які вызначыў дыстрыбуцыю канчаткаў *-a* і *-u*. Ужыванне таго ці іншага канчатка не абумоўлівалася першапачатковай прыналежнасцю да тыпу скланення, а вызначалася зноў з семантычнага пункту гледжання: адушаўлёныя назоўнікі прымалі ў родным склоне першапачатковы канчатак *-a*, тым часам як канчатак *-u*, які пранік з *u*-скланення, замацаваўся ў неадушаўлёных назоўніках. Яшчэ праз доўгі час можна было канстатаваць моцныя ваганні ва ўжыванні канчаткаў *-a* і *-u*. Адрозненне абазначэнняў жывых істот і рэчаў стварае ў сучаснай польскай мове падставу для дыстрыбуцыі канчаткаў *-a* і *-u*. Зразумела, па сённяшні час захоўваюцца дакладныя семантычныя класы, якія парушаюць гэтае правіла дыстрыбуцыі. Звычайна назоўнікі, якія абазначаюць часткі цела, гульні, інструменты, масу, вагу, месяцы і інш., прымаюць першапачатковы канчатак роднага склону *-a* з *o*- альбо *jo*-скланення[13].

У тэксце тэфсіра ў родным склоне адзіночнага ліку можна прынцыпова канстатаваць кампліментарнае ўжыванне абодвух склонавых канчаткаў *-a* і *-u*, што з'яўляецца характэрным і для сучаснай польскай мовы. Канчатак *-a* з'яўляецца агульным для адушаўлёных назоўнікаў: *prišedlem dō was s-cūdami značnimi ōd bōga pana wašegō* (126b7), *ja wziwam was dō pōważnegō zbawicela grechōw ni-w-čim ne wontpliwegō* (386b3), *wpatrōwal na ptak'i pre tō rekl cō tō mne ne-widza ūdōda* (304a5). Пры гэтым часам сустракаецца *scriptio defectiva* канчатка *-a* толькі праз *fatḥa* = *e*: *'iśâ sīn merjemin*[14] *slawnij prōrōk na tim świece ā na ōnim świece pričinca bliskij ū bōge* (44a7), *ten ktōrij stworil z-wodī člōweke sīna*[15] *i ūčinil gō narōdami* (291b7), *mōwilišce ne-wskreši pan bōg i ne-pōšle pō nim prōrōke*

---

[11] Ар. *ẓālim* = злачынец.

[12] Гл. >>> 12.3.

[13] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 267–269.

[14] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[15] На падставе працэсаў выраўноўвання па аналогіі канчатак *-a* з'яўляецца ў назоўніку *syn* (сын), які першапачаткова належаў да *u*-скланення, але прыняў канчатак *-a* як абазначэнне жывой істоты.

(385b6). Як рэдкае выключэнне можна назіраць родны склон на *-u* ў назоўніку *mąż* (муж): *tō jest lūdzem za dziw że daliśmi dūcha našegō dō menžū jednegō ź nich* (159b6).

Канчатак *-a* паказваецца, як правіла, у арабскіх імёнах уласных: *pewne mī korān zeslaliśmi prez ǧebra'ila*[16] *dō muchemmeda* (203a4), *lūdze za času nūcha*[17] (27b6).

Канчатак *-u* сустракаецца ў неадушаўлёных назоўніках: *stwōril cebe s-paskū ā pōtim iź naśena menśk'egō* (234a5), *jest na spōdkū tegō mūrū chōwanij skarb* (238a6), *medzi mną i medzi tōbą ābi-bil tak dalekō jakō ōd ūschōdū dō zachōdū* (403a5), *rek'i są z-mōdū* (416a8).

У арабізмах, якія не абазначаюць жывых істот, у родным склоне адзіночнага ліку паказваецца пераважна канчатак *-u*: *čitają korān bōžij časōw wečōrnich i ōni padają dō śeǧdejū*[18] (50b3), *ne-zabijajce źwerōw āni ptakōw idōnc dō k'e'bejū*[19] *k'edi na śe wlōžice ichram*[20] (95b5), *ā ktō ōdwrōci twar ōd pišma megō t'ewrīt'u*[21] *inǧīlu*[22] *źebūru*[23] *furkanu*[24] *pretō zapewne jest dla tak'ich pōžice casne na tim świece i wkrešimi gō dna sondnegō ślepim* (254b8), *i ci ktōre īman*[25] *prijenli k'edi zachcece stawac dō nemaźu*[26] *mijce twar wašō* (83b2), *ōdwrōcą was pō prijencū īmanu*[27] *wašegō dō newerenstwa swegō* (49a7). Выключэннем з'яўляецца назоўнік *koran* (ар. *qur'ān*), які часта ўтварае родны склон на *-a*: *čitaj cō ōznajmōnō tōbe prez dūcha s-korāna pana twegō* (233a2).

Адхіленні ад гэтага падзелу канчаткаў *-a* і *-u* выяўляюцца ў шэрагу вядомых назоўнікаў альбо семантычных катэгорый: *dla świentōbliwości nōwegō meśōnca i dla ōdman jegō i dla świentōbliwości dna i świjátlōści jegō i dla wečōra gdī ōpanūje cemnōśc* (490a4), *chcelibi ōnī żebi wišli z-ōgna pek'elnegō i nemaš jim wijśca s-tamtōnd* (88a1), *jenzika ne-znają ōprōč swegō jenzika* (239a4), *wrōcimi gō iz-bōgem ktōremū śe klanal dō plōmena pek'elnegō* (75a1), *ōn jest bez pōčōntkū peršij i bez kōnca ūstawičnij i jawnij i tajemnij* (441a4), *nic tō ne jest tilkō wšitkō zabawa tegō dōčasnegō świjáta* (403a2). У апошнім прыкладзе ў назоўніку *świat* (свет) паралельна з'яўляецца канчатак *-u*: *ne ōddalaj ōčū swojich ōd nich žōndajōnc ōzdōbi świjátū tegō* (233a5).

---

[16] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

[17] Ар. *Nūḥ* = Ной.

[18] Ар. *sağda* = прастэрнацыя пад час малітвы.

[19] Ар. *ka'ba* = Кааба.

[20] Ар. *iḥrām* = стан святасці.

[21] Ар. *tawrā* = Тора.

[22] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

[23] Ар. *zabūr* = Псалмы.

[24] Ар. *furqān* = Каран (літар. вырашальнае).

[25] Ар. *īmān* = вера.

[26] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[27] Ар. *īmān* = вера.

12.1.3. Давальны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

У польскай мове ў давальны склон таксама, як і ў родны склон, назоўнікаў *o-* альбо *jo*-скланення паступова ўзмацнялася пранікненне канчатка з *u*-скланення, у дадзеным выпадку канчатка *-owi*, які выцясняў першапачатковы канчатак давальнага склону *-u*. Гэты працэс пачаўся яшчэ ў далітаратурную эпоху. Верагодна, канчатак *-owi* ў давальным склоне спачатку зрабіўся прадуктыўным у тых назоўніках, якія перанялі ўжо ў родны склон канчатак *-u* з *u*-скланення, каб унікнуць двухсэнсоўнасці канчатка *-u*. Канчаткі давальнага склону *-u* альбо *-owi* яшчэ ў XVI ст. знаходзіліся ў моцнай канкурэнцыі. Нарэшце, з XVII ст. канчатак *-owi* ўсё больш упэўнена пачаў перамагаць. Канчатак *-owi* дамінуе таксама ў сучаснай польскай мове. Канчатак *-u* захаваўся ў адносна невялікай колькасці тыповых назоўнікаў, напр. *pan* (пан), *ojciec* (бацька), *brat* (брат), *chłopiec* (хлопец), *świat* (свет) і інш. Тыповым з'яўляецца ўжыванне першапачатковага канчатка *-u* ў аднаскладовых назоўніках і ў прыназоўнікавых фразах, якія ствараюцца з дапамогай *ku* (да)[28].

У давальным склоне адзіночнага ліку ў тэксце тэфсіра сустракаюцца абодва канчаткі: *-owi* і *-u*. Канчатак *-owi* – часцей: *chwala bōgū panu i prōwizōrōwi ṣwata laskawemū milōserdnemū krōlōwi* (5b2), *tak jim trūdnō bendze jakō prejśc werblōndōwi w dzūrke igelną* (120a8), *mōwili ōba chwala ōddajemi bōgū temū hōspōdarōwi ktōrij pōwelbil nas nad mnōgimi [s-]slūg swich* (303b4), *rekli ne-biliśmi sprečnimi terminōwi twemū* (252a6). Часам абодва канчаткі, *-owi* і *-u*, з'яўляюцца паралельна: *ōtō ž źlecilem abrahamōwī i mōjžešōwī i jezūsōwi wistawajce wjáre mōcne* (396b2), *dali mōjžešu t'ewrīt'*[29] *ā jezūsu inǧīl*[30] (19a7).

Побач з гэтым у шэрагу пераважна аднаскладовых назоўнікаў выяўляецца канчатак *-u*, як гэта звычайна адбываецца таксама ў сучаснай польскай мове: *prikaže lūdū twemū nech trimają dōbre prikezane* (130a2), *rekl mōjžeš bōže mōj ōdpūśc mne i bratū memū* (130b8), *chwala dajemi bōgū panū i prōwizōrōwi świátow* (160b5), *ne-werą ōstatnemū času* (208b8). Асабліва прыцягвае ўвагу ўжыванне канчатка *-u* ў назоўніку *syn* (сын): *daliśmi 'ejśī sinu merjemi*[31] *cūda mnōge* (14a2) (34a6).

Акрамя таго, канчатак *-u* рэгулярна з'яўляецца ў тэксце тэфсіра ў назоўніках *dzień* (дзень), *prorok* (прарок), *miesiąc* (месяц): *werą ščire bōgū i dnū ōstatnemū i prikezūją kū dōbremū* (50b4), *mōwili cō jest prōrōku temū że je pōtrawī i chōdzī pō ūlicach jakō i mi* (288a6), *ne-klanajce-śe slōncu ānitež meśōncu* (393b3).

Тыповай для канчатка *-u* выступае сувязь з прыназоўнікам *ku* (да)[32]: *kū ūschōdu i zachōdū* (23b1), *prewrōcili-śe kū fałšū ōdbijajōnc tim prawda bōžże* (236a4).

---

[28] Наконт развіцця дав. скл. адз. л. м. р. у польскай мове гл. Klemensiewicz (1965), p. 269–271.

[29] Ар. *tawrā* = Тора.

[30] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

[31] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[32] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 270.

Давальны склон на *-u* рэгулярна ўтвараюць арабізмы: *ne-werili korānu muchemmedu* (14b8), *wolają selach*[33] *gwoli nemaźu*[34] *w dzen pōntkōwij zbōrnij pretō śpešce śe dō chwali bōžžej* (454b5), *mow malik'u*[35] *mūftejū*[36] *židōwśk'emū prijdzce bendze wam čital tō cō cheram*[37] *pan učinil* (115a1).

У арабскіх імёнах уласных ва ўжыванні гэтых канчаткаў назіраецца ваганне. Арабскія формы імёнаў прымаюць канчатак *-u*: *ǧebra'ilū*[38] (15a3), *muchemmedu* (9b3) (10a7) (14b8). Наадварот, у паланізаваных формах, як правіла, з'яўляецца канчатак *-owi*: *gebrijelōwī* (15a5), *michajelōwī* (15a5).

12.1.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

Ужо ў стараславянскай мове ў вінавальным склоне адушаўлёных назоўнікаў усталявалася ўжыванне формаў роднага склону замест першапачатковых формаў вінавальнага. Для неадушаўлёных назоўнікаў, наадварот, без выключэння выкарыстоўваліся першапачатковыя формы вінавальнага склону, аднолькавыя з назоўным склонам. Ужо ў далітаратурную эпоху ў польскай мове перамагла катэгорыя адушаўлёнасці. У старэйшых тэкстах на польскай мове можна знайсці яшчэ шматлікія выключэнні. Аднак з XVI ст. як норма ўсталявалася ўжыванне роднага склону замест формаў вінавальнага склону, так што, напр., абазначэнні жывёл увайшлі ў катэгорыю адушаўлёных назоўнікаў. У сучаснай польскай мове яшчэ можна знайсці рэшткі старога вінавальнага склону, але толькі ў застылых зваротах[39].

У вінавальным склоне адзіночнага ліку ў тэксце тэфсіра звычайна можна канстатаваць размежаванне паміж адушаўлёнымі і неадушаўлёнымі назоўнікамі. У неадушаўлёных назоўніках вінавальны склон аднолькавы з назоўным: *w ten dzen wskrešimi jich i tich cō służili jim* (288b8), *wspōmni ten dzen k'edī ščapaci-śe bendze nebosa s-tūčami balimi na kštalt mglī* (289b6), *napūščiliśmi dežǧ*[40] *śarčistij na nich* (307a6), *k'edī wśadają w ōkrent mōdlōn-śe* (326a1), *ōn jest dōbre wjádōm jak'ij mace zamisl w sercach swojich* (375b7), і *te ktōre īman*[41] *prijenli muśulmane te ktōre klanajōn-śe beš*[42] *wacht*[43] *nemaź*[44]

---

[33] Ар. *ṣalāḥ* = дабрабыт, росквіт, шчасце.

[34] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[35] Ар. *Mālik* = Малік (імя ўласнае).

[36] Ар. *muftī* = муфтый; каментатар ісламскага права.

[37] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

[38] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

[39] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 271 f.

[40] Назоўнік *deszcz* = дождж звычайна сустракаецца ў тэксце тэфсіра ў звонкім варыянце *deżdż*.

[41] Ар. *īmān* = вера.

[42] Тур. *beş* = пяць.

[43] Ар. *waqt* = час.

[44] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

i widawają spelnō źek'at[45] *i dzeşencine* (91a1), *ī welci panōwe dajce mī fet'wej*[46] *snū megō* (185a8).

У адушаўлёных назоўніках вінавальны склон аднолькавы з родным склонам: *pōšli dalej āž pōk'i pōtkali chlōpca* (237b2), *spitają ū cebe ō ż̄ī-l-kernejni*[47] *tō jest aleksandra* (238b1), *pōdwišajce pana bōga pana i kermicela wšitk'ich światōw* (388b1), *bō werblōnda na nōgach stajōncegō rezac śunnet*[48] (267b7). У назоўніку *wół* (вол) звычайна выяўляецца этымалагічны канчатак родна-вінавальнага склону *-u* з *u*-скланення: *bōg prikezūje wam żebiśce zarzneli krōwa albō wolū* (11b7).

12.1.5. Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

У польскай мове пры ўсіх асновах як адзіны канчатак творнага склону адзіночнага ліку выкарыстоўваецца канчатак *-em*[49]. У беларускай мове ў аналагічнай функцыі пры цвёрдых асновах ужываецца канчатак *-om*, а пры мяккіх – канчатак *-em*, абодва яны сустракаюцца пад уплывам акання ў варыянце *-am*.

У тэксце тэфсіра ў творным склоне адзіночнага ліку прадстаўлены ўсе тры канчаткі: *-em*, *-om* і *-am*. Часцей за ўсё сустракаецца звычайны польскі канчатак *-em*: *ktō chce nech bendze newernik'em pewne nagōtōwališmi dla tich tak'ich ẓalimōw*[50] *ōgen pek'elnij* (233a1), *pretō ūčiniliśmi tō pilem rōsprōšōnim* (289b4), *i ōwšem wi biliśce lūdem blendnim* (365a1), *wolal s-płačem dō nas ābiśmi lūd nūcha*[51] *zgūbili* (366b3), *zgūbiliśmi jich krik'em glōsu ǧebrā'ilōwegō*[52] (206a4), *bō pan bōg wšitk'i rečī wjádōmij i dōktōrem jest* (423b1), *ne-bili ōbcenżeni pōsūgami pōwolnōścami nemaźem*[53] *źek'at'em*[54] *gezejstwem*[55] (319b4), *'ebd alláh ibnu šelam*[56] *muft'ejem*[57] *bil żidōwśk'im* (197a5).

Побач з гэтым у тэкст тэфсіра стала пранікае беларускі канчатак *-om*: *ne-jestem ni-čim tilkō člōwekōm pōslōm bōżżim* (228b1), *straš jich tim dnōm cō bendą tegō żalōwac k'edi stane rōzsōndek mōci bōżżij* (243a4), *wziwal jich dō warī ne-prijenli pre tō ōgarneli jich pōtōpōm* (320b7).

---

[45] Ар. *zakā* = міласціна.

[46] Ар. *fatwā* = прававое рашэнне.

[47] Ар. *Dū al-Qarnayni* = Аляксандр (літар. двухрогі). Канцавы *-i* ў *ż̄ī-l-kernejni* як частка арабскага канчатка парнага ліку *-ayn-i* не належыць да сферы польскага скланення.

[48] Ар. *sunna* = традыцыя, звычай.

[49] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 272.

[50] Ар. *ẓālim* = злачынец.

[51] Ар. *Nūḥ* = Ной.

[52] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

[53] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[54] Ар. *zakā* = міласціна.

[55] Гл. >>> 2.1.2. Знаўца Пісання *'Абд Алаг ібн Салам*.

[56] Гл. >>> 3.1.1. Арабізм "*ġāzī*" (змагар за веру).

[57] Ар. *muftī* = муфтый; каментатар ісламскага права.

Пад уплывам акання паралельна з канчаткам *-om* месцамі з'яўляецца канчатак *-am*: *ōn jest strōžem i ōpekūnam* (111b8), *tilkō mī dō cebe prijdzim s-prawdziwim korānem wikladam* (290a7), *ōtworil pan bōg sercō jegō klūčam dūcha świentegō* (377a7), *pōslališmi-gō dō fera'ūna*[58] *z-dōwodam jasnim jawnim* (428b2).

Розныя канчаткі, *-em*, *-om*, *-am*, часта выступаюць побач у блізкім кантэксце: *ti-jesteś bōgem našim karmicelem i stworicelam i pritūlōm i wspōmōžicelem* (263b8), *rekl člōweku pōbōžnemū bōndz k'afirinem*[59] *ā k'edi stal k'afirinam rekl šetan pewne ja ōdlōčam-śe ōd cebe* (449b1).

Як крайне маргінальная з'ява ў тэксце тэфсіра сустракаецца канчатак *-im* (*-ym*), які ўзнік у выніку тэндэнцыі да звужэння галоснага перад насавымі[60]: *dō pana bōga majstatim wladajōncegō drōgi bi nalaźl* (223b3), *ktō bendze sprečal-śe s-panim bōgem ōd nich dna sondnegō* (74a6). Але можна прывесці толькі некалькі такіх прыкладаў.

12.1.6. Месны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

Пры першапачатковых *o*-асновах у польскай мове працягвае ўжывацца стары канчатак *-'e* (< *-ě*) са старажытнапольскай мовы. Да XVI ст. гэты канчатак прымалі асновы на */k, g, ch/*, у якіх потым у месным склоне згодна з 2-й палаталізацыяй гутуральных адбылося характэрнае змякчэнне. Пры мяккіх асновах прадуктыўным стаў канчатак *-u* з *u*-скланення. З XVI ст. асновы на */k, g, ch/*, якія зніклі ў парадыгме пасля 2-й палаталізацыі праз прыпадабненне па аналогіі, прынялі канчатак *-u*[61].

У месным склоне адзіночнага ліку ў тэксце тэфсіра з'яўляюцца два канчаткі *-'e* і *-u*, дыстрыбуцыя якіх адпавядае дыстрыбуцыі ў сучаснай польскай мове. Канчатак *-'e* з'яўляецца ў назоўніках, якія канчаюцца на цвёрды зычны. Пры гэтым адбываецца змякчэнне канца асновы, якое паказваецца на пісьме толькі пры фанемных парах *цвёрды – мяккі*, для якіх арабскі алфавіт дае парныя графемы[62]: *rekl kabil*[63] *i beda mōja jâ-m slabšij w rōzūme žebim ūčinil tak jakō ōtō ta wrōna* (87a4), *ja-m wenkšij jest za cebe ū skarbe i pōważnejšij w narōdze* (234a2), *rōskōšūją śe na tim świece* (326a3), *ne-ma pri[j]śc na nich menka ōwšem prijdze w nespōdzewanim čaśe* (211a6), *wizwoliliśmi nūcha*[64] *i tōwaristwa jegō cō ź nim bili w ōkrence* (320b8), *ōn bendze ū prišlim žiwoce jedin calij iz salichōw*[65] (322a5).

---

[58] Ар. *fir'awn* = фараон.

[59] Ар. *kāfir* = няверні́к.

[60] Гл. >>> 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

[61] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 273.

[62] Гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці.

[63] Ар. *Qābil* = Каін.

[64] Ар. *Nūḥ* = Ной.

[65] Ар. *ṣāliḥ* = праведны.

Канчатак *-u* (*-'u*) з'яўляецца пры асновах, якія канчаюцца на мяккі альбо гістарычна мяккі зычны ці на велярны */k, g, ch/*: *spitają ū cebe ī muchemmed ō gōrach i w sondnim dnū cō ź nich bendze* (253b4), *pōcōngną jich dō wrajōncej wodī ā pōtim w ōgnu bendą gōric* (389a4), *i wźeli-śe za te drōge na mōrū cūdōwnō kendi riba śla* (236b8), *prilōžiš rence dō serca ū frasūnkū na tō cō śe widalō* (234b3), *pane bōże naš pewne mī slišeliśmi w dūchū glōs* (58b4)[66]. Назоўнік *dom* (дом) захаваў першапачатковы канчатак *-u* з *u*-скланення: *pan bōg ōžiwī i ūmōrī w dōmū i na drōdze* (54b8). Як рэдкі выпадак беларускага ўплыву належыць разглядаць месны склон на *-e* замест *-u* ў назоўніку *koniec* (канец): *ōni bili w jednem kōnce tej pečarī* (231b3).

Асабліва звяртае ўвагу канчатак меснага склону на *-i* ў назоўніку *dzień* (дзень) у звароце *we dnie i w nocy*[67] (днём і ноччу), які сустракаецца рэгулярна: *wspōminaj bōga swegō mnōge i chwal-gō w nōci i we dni* (44a1), *bōndz s-timi cō wziwają bōga swegō ū kūślūkach*[68] *we dni i w wečōr i w nōci* (233a3). Таксама як выключэнне месны склон на *-i* ўжываецца ў назоўніку *kamień* (камень): *ōbweściliśmi dō mōjźeše prōrōke k'edi žōndali wodī lūdze jegō žebi wderil laską swoją pō kameni* (132a7).

Назоўнікі *dzień* (дзень) і *kamień* (камень) першапачаткова належалі да *n*-асноў[69]. Назоўнікі *n*-асновы ў сваім развіцці перайшлі спачатку да *i*-асноў, а пазней разам з апошнімі – да *jo*-асноў[70]. Месны склон адзіночнага ліку назоўнікаў з *i-* і *jo*-асновамі рэгулярна паказвае канчатак *-i*, які, аднак, у польскай мове ўжо вельмі рана быў выцеснены канчаткам *-u* з *u*-асноў[71]. У беларускай мове пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах з'яўляецца канчатак *-i* || *-y*. Такім чынам, канчатак меснага склону адзіночнага ліку на *-i* ў дадзеных назоўніках (*dzień, kamień*) можна расцэньваць як беларускі ўплыў. У звароце *we dnie i w nocy* (удзень і ўночы) з месным склонам *we dni* мае месца застылая архаічная форма.

Арабізмы часта ўтвараюць месны склон адзіночнага ліку на *-u* па схеме мяккай асновы, у тым ліку тады, калі мае месца цвёрдае заканчэнне асновы: *ne-mejce za chelal*[72] *ōpūščac cerimōnī bōžže cō śe činą w k'e'beju*[73] (82a6), *bōg laskawij milōserdnij na 'eršū*[74] *majstace ōpōnōwal-śe mōcą swoją* (247a7),

---

[66] Параўн. Bräuer (1969), Bd. 2, p. 54. У тэксце тэфсіра пры асновах, якія канчаюцца на велярныя */k, g, ch/*, у месным склоне адзіночнага ліку не сустракаецца ніводнай формы з канчаткам *-'e* (< *-ĕ*) і першай палаталізацыяй.

[67] Параўн. Strutyński (1993), p. 87.

[68] Тур. *kuşluk* = раніца.

[69] Гл. Bräuer (1969), Bd. 3, p. 19.

[70] Параўн. Rott-Żebrowski (1993), p. 98.

[71] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 273; гл. Strutyński (1993), p. 87.

[72] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[73] Ар. *ka'ba* = Кааба.

[74] Ар. *'arš* = трон.

ne-bendzece še zlōnčac ź newasti āni lōtrōwac ani lajac kōgō āni-še bic u chaǧu[75] (26a7), *ōznajmilišmi dō sinōw izra'elšk'ich w k'it'abu*[76] *t'ewrīt'u*[77] *že mace zblōndzic na źemi dwa razi* (220a1), *cō wī tajice ō muchemmedu i cō jawnō činice (12b8), i lūdze pišmeni čegō wī sprečajce-še ō ibrahīmū*[78] (46a2).

Аднак у некаторых частаўжывальных арабізмах рэгулярна сустракаецца месны склон на *-'e*: *tak też ūpōwadam w tim korāne*[79] *lūdzōm s-kōždegō pōdōbenstwa* (235b8), *stawajce ū nemaźe i widawajca źek'at'*[80] *i dzešencina* (16b3), *zabil dawūd*[81] *ǧalūt'a*[82] *ā pōtim pō talūce*[83] *ōddal diwidōwi pan bōg krōlewstwe* (34a2)[84].

12.1.7. Клічны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

У клічным склоне адзіночнага ліку ў польскай мове ўжываюцца два канчаткі *-e* і *-u*. Канчатак *-e* сустракаецца пры цвёрдых асновах, да якіх першапачаткова прыраўноўваліся таксама асновы на */k, g, ch/*, якія ў далейшым зведалі змякчэнне пасля першай палаталізацыі, але неўзабаве ператварыліся ў застылыя архаізмы. Канчатак *-u* з'яўляецца пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах, а таксама пры асновах на */k, g, ch/*[85].

У тэксце тэфсіра функцыю клічнай часціцы выконвае часцей за ўсё турэцкі выклічнік *i* (o!)[86] і некалькі радзей – арабскі выклічнік *yā* (o!)[87]. Гэтая клічная часціца часта з'яўляецца ў формуле: *i muchemmed* альбо *yā muchemmed* = "О, Мухамад!", якая часта ўстаўляецца ў тэкст перакладу як экзегетычны дадатак: *či-ne patriš i muchemmed na tich ktōre reklō še jim zatrimajce ōd wojni rence waše ā ōni wojni žōndają* (69b3), *mow ja muchemmed pōpelgrimūjce i pōchōdzece pō źemi* (321a7). Звяртае на сябе ўвагу тое, што імя ўласнае Мухамад у названай

---

[75] Ар. *ḥaǧǧ* = паломніцтва.

[76] Ар. *kitāb* = кніга.

[77] Ар. *tawrā* = Тора.

[78] Ар. *Ibrāhīm* = Абрагам.

[79] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[80] Ар. *zakā* = міласціна.

[81] Ар. *Dāwūd* = Давід.

[82] Ар. *Ǧālūt* = Галіяф.

[83] Ар. *Tālūt* = Гідэон.

[84] Параўн. Akiner (1978), p. 235; яна канстатуе наяўнасць меснага склону на *-e*, асабліва ў арабізмах з */m, b, n/* у канцы слова.

[85] Наконт развіцця клічнага склону гл. Klemensiewicz (1965), p. 274.

[86] Турэцкі выклічнік *i* (o!) таксама часта функцыянуе пры славянскіх словах як клічная часціца і ў гэтай функцыі яго нельга пераблытаць са злучнікам *i*. Параўн. таксама Антонович (1968), с. 21. Антановіч лічыў ужыванне турэцкай клічнай часціцы паказчыкам турэцкага пасярэдніцтва ў тэксце тэфсіра.

[87] У транслітарацыі арабская клічная часціца *yā* з'яўляецца ў форме <*ja*>, і яе нельга блытаць з асабовым займеннікам *ja* (*я*).

формуле, як правіла, не прымае клічнага канчатка і застаецца без склонавага канчатка. Там, дзе яно скланяецца, з'яўляецца канчатак *-u*, як пры мяккіх асновах: *mōw ī muchemmedu bōże naš krōlū daješ krōlewstwa i skarb kōmū chceš* (42a7), *mow ja muchemmedu bōg wjádōmšij likū jich* (232b2).

У клічным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду ў тэксце тэфсіра сустракаюцца канчаткі *-e* і *-u*, якія кампліментарна падпарадкоўваюцца цвёрдым і мяккім асновам.

Пры цвёрдых асновах з'яўляецца канчатак *-e*: *mōwą pane bōże naš pewne mī werami tōbe* (41a7). Арабізмы з цвёрдым заканчэннем асновы, як правіла, таксама прымаюць канчатак *-e*: *rekli či-ti-prišedleš dō nas s-prawdą ibrahīme* (260a1), *rekl mōjžeš ī fera'ūne pewne ja pōslem prōrōk'em ōd pana bōga megō* (126b5). Выключэннем, як ужо тлумачылася вышэй, з'яўляецца толькі імя ўласнае *Muḥammad*.

Пры асновах на велярныя */k, g/* сустракаюцца архаічныя формы са зменай гука */k, g/ > /č, ž/* паводле першай палаталізацыі: *jeślī prijdze jim jaka prigōda mōwą tō mami prōrōče ōd cebe* (70a1), *i tūlajōnci-še prōrōče pōwstan pōstraš i na'ūčaj lūd swoj* (474a2), *chwala tōbe bōže* (325b6).

Спарадычна канчатак *-e* падлягае аканню */-e/ >/-a/*: *rekl dō ōjca swegō ī ōjča čemū tī slūžiš klanaješ-še temū cō ne-sliší ānī tež wīdzī* (243a7), *ī ōjča ne-slūž i ne-klanaj-še šetanu balwanu* (243b2).

Канчатак *-u* выступае пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах: *rekli izra'elčici ī mōjžešū ūčin nam bōgi jakō ōni mają bōgi ōsōbliwe* (129a4), *rekl i pane karmicelū mōj pewne ja tōbe ṣe pōlecam* (174b5), *reklī ej zacnij kenslerū pewne jest ū negō ōcec starōšci welk'ij* (188b3), *rekl ī zwodzicelū cō tōbe stalō że ṣ-ti ne-bil z ōnimi klanajōncimi* (204a8). Як правіла, клічны склон на *-u* ўтвараюць таксама назоўнікі з асновай на */k, g, ch/*: *rekl dō harūna*[88] *aj jak'ij tō zlij nameśnikū* (130b4). Як звычайнае выключэнне пры назоўніку *syn* (сын), які першапачаткова належаў да *u*-асноў, клічны склон рэгулярна ўтвараецца з канчаткам *-u*[89]: *rekl ōjcec ī sinū mōj ne-pōwadaj widzena swegō* (181b2).

12.1.8. Назоўны склон множнага ліку мужчынскага роду

У сучаснай польскай мове ў назоўным склоне множнага ліку мужчынскага роду сустракаюцца чатыры канчаткі: у множным ліку не мужчынска-асабовых назоўнікаў ужываецца канчатак *-y* || *-i* (пасля */k, g/*) пры цвёрдых асновах і канчатак *-e* пры ўсіх мяккіх асновах. У множным ліку мужчынска-асабовых назоўнікаў з'яўляецца канчатак *-i* || *-y* (пасля асноў з гістарычна мяккім заканчэннем), а таксама канчатак *-owie* з *u*-асноў у шэрагу мужчынска-асабовых назоўнікаў[90].

---

[88] Ар. *Hārūn* = Арон.

[89] Параўн. Strutyński (1993), p. 88.

[90] Наконт развіцця назоўнага склону множнага ліку гл. Klemensiewicz (1965), p. 275–278.

У тэксце тэфсіра ўсе названыя канчаткі знаходзяцца галоўным чынам у іх сучасных дыстрыбуцыях. Сустракаецца некалькі адхіленняў у размеркаванні асобных канчаткаў, якія былі абумоўленыя беларускім субстратам і працягам існавання архаічных формаў.

У множным ліку не мужчынска-асабовых назоўнікаў пры цвёрдых асновах у сучаснай польскай мове з'яўляецца цвёрды канчатак *-y*, які рэалізуецца як *-i* пасля велярных */k, g/*[91]. Арабскае пісьмо тэксту тэфсіра не адрознівае галосных */y/* і */i/*. Якасць канчатка, аднак, пры фанемных парах (*цвёрды* : *мяккі*), для якіх ужываюцца парныя графемы, паказваецца непасрэдна праз напісанне цвёрдай альбо мяккай зычнай графемы[92]: *tak'e dekreti nalepše dōwodī s-pišma* (67b7), *mōwą ōtō te ōbrazi bōlwani pričinci naši ū bōga* (161b3), *sprečk'i činili pōlk'ī nektōre s-pōjsrōdku īch* (404b5), *ummet'i*[93] *prizwani bendą dō kśōng jich* (410b1).

Канчатак *-e*[94] з'яўляецца пры ўсіх асновах, якія канчаюцца на мяккія альбо гістарычна мяккія зычныя, такія як */l, j/*, незалежна ад таго, ідзе размова пра не мужчынска-асабовыя альбо мужчынска-асабовыя назоўнікі множнага ліку: *falšiwim wikladem zamūtek ū warī učinili ābi lūdze wzeli-śe za ten falšiwij wiklad* (40a7), *ū negō są klūče nebešk'e i źemśk'e* (396a8), *zapewne ōni nam strōge neprijacele* (296a6), *takōwe nacije są ōbiwatele rajū ōni w tich wečnimi są* (162b6), *ci ktōre bōjōn-śe pâna bōga swegō dla nich jest raje ceką spōd nich rek'ī* (41a5). Гэты канчатак таксама можа падлягаць аканню і тады запісвацца як *-a*: *pewne ōbiwatela tich mjást i wśī ūwerili* (126a2). Канчатак *-e* назоўнікаў з мяккімі асновамі рэгулярна з'яўляецца ў абазначэннях асобаў на *-anin*: *mōwci wi dō nich bōndzca wi świádkami na tim że mi muśulmane jesteśmi* (46a1).

Пры мяккіх асновах можна назіраць пранікненне канчатка *-i (-i || -y)* паводле ўзору цвёрдай асновы, што можна расцэньваць як інтэрферэнцыю з беларускім субстратам. У якасці дапаможнага фактара для гэтага ў фанетычнай сферы можна назіраць тэндэнцыю да рэдукцыі ненаціскога */e/ > /i, y/*[95]: *bendze mū pōlawica s-tegō cō lūdzi činą* (70b6), *ā jeśli ne-daš jim s-tegō w ten čas ōnī tōbe newdzenčni neprijaceli* (151a4), *rekl lūt*[96] *ōtō te gōści mōje pretō ne-hanbice mne w nich* (206a1), *ā ti ne-bilaś pri nich k'edi rūcali pisari kelem*[97] *īch* (44a4), *ta kśenga korān rōzsōndk'i mōje mōndre wirši* (170a6), *nech pōści dwa meśōnci ne-rōzriwajōnc* (445a3).

---

[91] Гл. Strutyński (1993), p. 89. Канчатак *-y* быў перанесены з вінавальнага склону множнага ліку і з XVIII ст. цалкам выцесніў у множным ліку не мужчынска-асабовых назоўнікаў першапачатковы палатальны канчатак *-i*.

[92] Гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці.

[93] Ар. *umma* = рэлігійная абшчына. Графема *tā'* = *t'* не выражае змякчэння, а адпавядае этымалагічнаму спосабу напісання, які большай часткай захоўваецца ў запазычаных арабізмах.

[94] Пра розныя этымалогіі гэтага канчатка гл. Klemensiewicz (1965), p. 276–278; Bräuer (1969), Bd. 2, p. 87–88.

[95] Гл. >>> 10.8.1. Звужэнне ненаціскавага */e/ > /i, y/*. Параўн. Kurzowa (1993), p. 168.

[96] Ар. *Lūṭ* = Лот (імя ўласнае).

[97] Ар. *qalam* = трысняговае пяро.

Наадварот, пры цвёрдых асновах, здаецца, можна назіраць пранікненне канчатка *-e*: *ābi-chōdzili ōkrente waši w nich watrōwą mōcą našą* (409a2), *tam że są palaci i majstate wisōk'e* (488a6)[98]. Але, магчыма, у абодвух прыкладах, *okręte* і *majestate*, размова ідзе толькі пра *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага */a/* праз *fatḥa* = *e*, якой перадаецца канчатак *-a*. Назоўны склон множнага ліку на *-a* распаўсюдзіўся з XV ст., асабліва ў лацінізмах, і аказіянальна гэты канчатак ужываўся таксама ў польскіх словах[99]. У тэксце тэфсіра ў лацінізмах спарадычна сустракаюцца прыклады ўжывання канчатка *-a*: *pretō te pūste fūndamenta znakōmiti jich meškane jūž ne-žije tam pō nich tilkō trōcha nōc ābō dwe* (316a5), *tak'e lūdze mają bic na prawici i rejestra w prawej renca i ci zaś ktōre są newernikami ājet'ōm*[100] *korānnim ōni są na lewici i rejestra jich w lewej rence* (490a2). Назоўнік *okręt* (карабель) таксама сустракаецца з канчаткам множнага ліку *-a*: *chōdzą ōkrenta pō mōrū jakō gōrī jeśli zachce ūspōkōji wjátr pretō bendze stal cichō na werchū mōra* (398b7).

У абазначэннях асоб мужчынскага полу выступае палатальны канчатак *-i*[101], які змякчае цвёрдае заканчэнне асновы. Пасля гістарычна мяккіх зычных гэты канчатак рэалізуецца як *-y*. У арабскім пісьме няма дыферэнцыяцыі паміж */i/* і */y/*: *ne-čince sprečk'ī jakō še sprečali židzī greci trōjčane* (396b4). Часта немагчыма вырашыць, мае месца канчатак назоўнага склону *-i* || *-y* альбо канчатак вінавальнага склону *-i* || *-y*, пераняты назоўным склонам. У назоўніку *kapłan* (святар) у наступным прыкладзе на падставе арабскага пісьма не зразумела, які канчатак маецца на ўвазе, таму што для фанем */n/* і */n'/* не існуе асобных графем. Цвёрды */n/* і мяккі */n'/* запісваюцца аднолькава праз *nūn* = *n*: *prišli dō negō prendkō kaplani* (367a4). Аналагічна выглядае справа ў наступным прыкладзе, дзе ва ўсіх выпадках ставіцца канчатак *-y*: *prišlī dō lūdzej lūtōwich*[102] *pōslanci bōžže* (205b4). У назоўніку *sługa* (слуга) палаталізацыя робіцца выразнай праз пераход */g/* > */dz/*, і ў якасці канчатка ў наступным прыкладзе трэба ставіць *-y*: *pewne slūdzī mōje ne-mōžeš tī mec nad nimi mōci* (204b7). У той самай лексеме *sługa* (слуга) мы знаходзім таксама канчатак *-e*: *jeślī bi ne-grōmili jich rabinōwe slūdze bōžže i wadomi pišma ōd slōw jich grešnich i ōd jedzena nečistegō cheramnegō*[103] *ne-bilōb gōršej rečī nad tō cō ōni rōbą* (91b5). Далей мы сустракаем форму *bogi* (багі) са скасаванай 2-й палаталізацыяй замест *bogowie*[104]: *jeślibi bili w tich nebōsach i źemi bōgi ōprōč bōga alláhu*[105] (257b2).

---

[98] Параўн. Kurzowa (1993), p. 168.

[99] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 278; гл. таксама Kurzowa (1993), p. 168. Параўн. Kurzowa (1985), p. 107; яна таксама адзначае, што множны лік на *-a* часта можна сустрэць у паўднёвых крэсах у запазычаных словах і спарадычна – у польскіх лексемах.

[100] Ар. *āya* = верш Карана, знак, цуд.

[101] Гл. Strutyński (1993), p. 89.

[102] Ар. *Lūt* = Лот.

[103] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

[104] Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 276.

[105] Ар. *Allāh* = Алаг.

У назоўніках, якія заканчваюцца на /*k*/, пры далучэнні мужчынска-асабовага канчатка *-i* выяўляецца пераход /*k*/ > /*c*/ паводле 2-й палаталізацыі. Польская мова захоўвае гэтыя палаталізаваныя формы дагэтуль. Але ў тэксце тэфсіра часта сустракаюцца формы без гэтай змены аналагічна вінавальнаму склону множнага ліку. Такія формы, з аднаго боку, абапіраюцца на беларускі субстрат, які ў назоўным склоне множнага ліку зноў скасаваў 2-ю палаталізацыю праз выраўноўванне парадыгмы[106]. З іншага боку, у польскай мове ў XVII–XVIII стст. захоўвалася тэндэнцыя да пераймання формаў вінавальнага склону множнага ліку назоўным склонам таксама ў назоўніках, якія абазначаюць асоб мужчынскага полу, па аналогіі з неадушаўлёнымі назоўнікамі. Нарэшце, першапачатковыя палаталізаваныя формы назоўнага склону ў назоўніках, якія абазначаюць асоб мужчынскага полу, працягваюць існаваць, бо формы, перанятыя з вінавальнага склону, часта ўжываюцца ў пэяратыўным значэнні[107]. Існаванне паралельных формаў кшталту *prorocy* || *proroki* з'яўляецца характэрным для тэксту тэфсіра: *prichōdzili dō nich prōrōci z-rōznimi cūdami pretō ōni ne-werili tim wšitk'im pretō wźōl jich pan bōg pōd keranje swoje* (384b2), *prichōdzili dō nich prōrōk'i īch z rōźnimi cūdami* (126b1), *mōw i muchemmed wšak prichōdzili dō nas prōrōk'i prede mnō z-rōznimi cūdami* (57b4), *prišli dō nich prōrōk'i ōd prōdū rōnk jich i ōd tilū jich* (391a8), *zejdą rejestrã i ōbačą grešnici i bendōn-śe bac rejestrōw swojich ōd tegō cō w nich* (235a6), *ōbačą grešnici peklō* (235b6), *i ōwšem biliśce sami wistempne grešnik'i* (351a6), *tilkō bōjaźnici bōžże bendą prijacelmi medzi sōbą* (404b8), *dla tich ktōre bōjaźnik'i bōžże jest jim ū bōga jich raje* (41a5), *w ten dzen kōnsac bendą newernici rence swoje* (289b7), *mōwili newernici čemū ne-zeslal na muchemmeda cūde bōžże* (324b2), *newernik'i są i sklamali piśmō bōžże korān* (94b3), *padli wšitk'ī čarōwnici dō źemi* (127b2), *zapewne ōtō te dwa čarōwnik'i chcą pō was żebi wiprōwadzili was iź źemi waśij* (250a8).

Таксама ў арабізмах выяўляюцца паралельныя формы з 2-й палаталізацыяй і без яе паводле вышэйпрыведзенай схемы: *cō stalō wam ī munafici*[108] *że śe rōzlōnčili ōd werōncich* (71a2), *mową munafik'i pōwolni-śmi tōbe ã k'edi winidą ōd cebe premenają slowe twoje* (70a5).

---

[106] Параўн. Rott-Żebrowski (1992), p. 101 і De Bray (1980), p. 193.

[107] Гл. Bräuer (1969), Bd. II, p. 56: "У XVIII ст. у назоўніках, якія абазначаюць асоб мужчынскага полу, *-у* ўжываўся як канчатак назоўнага склону множнага ліку, што, аднак, не захавалася, бо гэты спосаб утварэння быў ужывальным яшчэ раней выключна ў пэяратыўным сэнсе".

Параўн. з гэтым Klemensiewicz (1965), p. 277, які кажа пра агульнапольскую тэндэнцыю да пераймання канчатка вінавальнага склону множнага ліку таксама назоўнікамі, што абазначаюць асоб мужчынскага полу, якія ўрэшце не захавалі гэтых формаў з-за пэяратыўнага значэння.

Пэяратыўнае значэнне можна выключыць у парах *prorocy – proroki, bojaźnicy – bojaźniki.* Усталяванне формаў вінавальнага склону ў назоўным склоне на ўзор неадушаўлёных назоўнікаў адбываецца пад беларускім уплывам.

[108] Ар. *munāfiq* = крывадушнік. Тут у выразе "*i munaficy*" ўжыты мн. л. клічнага склону, які супадае з мн. л. назоўнага склону.

Формы з 2-й палаталізацыяй */k* > *c*/ спарадычна сустракаюцца ў адушаўлёных назоўніках таксама па-за катэгорыяй абазначэнняў асоб мужчынскага полу. Так, у тэксце тэфсіра яшчэ рэгулярна выяўляецца множны лік *ptacy* (птушкі): *bendą jeśc ptaci ōd glōwī jegō mōzg* (185a4), *pewne bōga chwalą jegō ci cō w nebōsach ā ci cō na źemi i ptaci na pōwetrū* (284a2). Такія формы, якія былі звычайнымі ў старапольскай мове, ужо з XV ст. сталі ўсё часцей скланяцца аналагічна неадушаўлёным назоўнікам з цвёрдай асновай: *ptaki*. Гэтыя формы, якія перайшлі з вінавальнага склону, шырока ўсталёўваліся з XVIII ст. таксама ў адушаўлёных назоўніках, якія не абазначалі асоб мужчынскага полу[109].

Канчатак *-owie* з *u*-асноў у цяперашняй польскай мове выступае ў абазначэннях асоб мужчынскага полу, якія вылучаюцца ў асобную групу. Канчатак *-owie* сустракаецца ў тэксце тэфсіра таксама ў такой сучаснай функцыі, як мужчынска-асабовы множны лік. Няма прыкладаў ужывання гэтага канчатка ў якасці канчатка не мужчынска-асабовага множнага ліку: *tilkō welce ūčeni dōktōrowe w na'ūce ź nich uwerili jak 'ebdulláh sīn śelamōw*[110] *werą temū cō zeslanō tōbe i cō zeslanō pred tōbą* (80a2), *mōwili pewne mī jesteśmi učnōwe i pōmōcnici 'īśī* [111] (94a6), *ūpadli te fūndatōrōwe is-tim meśğidem*[112] *w ōgen pek'elnij* (157a5), *nimaš inšegō bōga tilkō ten ktōrij ūwerili jemū sinōwe izrā'elśk'e* (168b3). Множны лік слова *anioł* (анёл) таксама рэгулярна ўтвараецца з дапамогай *-owie*: *bendą stac na bregach neba pōlkami i prinōsą majstat pana bōga ānjōlōwe na sōbe* (466b7). У наступным прыкладзе ў назоўніку *poseł* (пасланнік) выяўляецца назоўны склон множнага ліку на *-i* || *-y*, які адхіляецца ад цяперашняга звычайнага ўтварэння з дапамогай *-owie*. Тыповым тут з'яўляецца таксама тое, што на базе арабскага пісьма, якое не адрознівае */i/*:*/y/* і */l/*:*/l'/*, немагчыма вырашыць, ідзе размова пра не мужчынска-асабовы множны лік *posły* або пра мужчынска-асабовы множны лік *posli* з палатальным канчаткам *-i*: *pōsli naše ānjōlōwe pōplečne pri nich są* (405b2). Зразумела, у спосабе напісання слова з цвёрдым */s/* праз графему *ṣād* = *s* змяшчаецца ўказанне на тое, што размова ідзе хутчэй пра не мужчынска-асабовы множны лік *posły*.

У арабізмах, якія абазначаюць асоб мужчынскага полу, таксама адносна часта сустракаецца канчатак *-owie*: *āle zalimōwe*[113] *cō bōgū śabri najdūją dziś jest na świece w blendze welk'im jawnim* (243a3). Пры гэтым часта выяўляюцца паралельныя формы. Так, у арабізме *kāfir* > (польск.) *kiafir(in)* = "нявернік", з аднаго боку, з'яўляецца канчатак *-owie*: *dōbre wemi że tōbe casnō i welka żal sercū twemū*

---

[109] Гл. Strutyński (1993), p. 89.

[110] Гл. >>> 2.1.2. Знаўца Пісання *'Абд Алаг ібн Салам*. Гэтае імя згадваецца тут як экзегетычны дадатак да верша **Q**(4:162), якраз як у Тафсіры Аль-Джалалайн: {**lākini r-rāsiḫūna fī l-'ilmi minhum**} *ka-'Abd Allāh ibn Salām [...]*.

[111] Ар. *'Īsā* = Ісус. Тут у <*'īśī*> мае месца род. скл. адз. л. або дав. скл. адз. л. у адпаведнасці з жаночым *a*-скланеннем з мяккай асновай.

[112] Ар. *masǧid* = мячэць.

[113] Ар. *ẓālim* = злачынец.

ōd tegō cō mōwą k'afirōwe (207a4). З іншага боку, у гэтай лексеме зрэдку таксама выяўляецца канчатак *-e* паводле ўзору мяккіх асноў: *bendą rōzūmec k'afire że ōni są na dōbre drōga direktōwani* (403a4). У аснове гэтага мяккага канчатка *-e* ляжыць адзіночны лік *kiafirin*[114]. Нарэшце, зрэдку ў гэтай лексеме яшчэ выяўляецца канчатак *-y*, які запісваецца ў арабскім пісьме праз *kasra* = *i*: *mōwili k'afiri i židzī* (16b4). Наадварот, на базе арабскага пісьма нельга вырашыць, трэба гэта чытаць як не мужчынска-асабовую форму *kiafiry*, якая адпавядае беларускай форме, або як польскую мужчынска-асабовую форму *kiafirzy*[115].

Побач са згаданымі канчаткамі сустракаюцца калектыўныя формы, утвораныя праз суфікс *-'ja*, як напр. *bracia* (браты) і *chłopia* (хлопцы, сяляне): *i wijmim tō cō w sercū īch gnew i zazdrōści i bendą jakō bracja na rōskōšnich trōnach* (205a2), *i chōlōpja*[116] *mōje ne-bendze strachu na was w ten dzen ānitež wī zafrasūjece-śe* (404b8).

12.1.9. Родны склон множнага ліку мужчынскага роду

З выпадзеннем рэдукаваных галосных, якія знаходзіліся ў канцы слова ў слабой пазіцыі, формы роднага склону множнага ліку словаў са стараславянскімі *o-*, *jo-*, *n*-асновамі, да якіх належала пераважная большасць назоўнікаў мужчынскага роду, у многіх выпадках прыраўняліся да формаў назоўнага і вінавальнага склонаў адзіночнага ліку. На гэтым фоне ў назоўніках з асновай на цвёрды зычны адбылося хуткае распаўсюджванне канчатка *-ov* > *-ów* з *u*-асноў. У мяккіх асновах распаўсюджваўся канчатак *-ьjь* > *-i* са стараславянскага *i*-скланення. У сучаснай польскай мове абодва канчаткі, *-ów* альбо *-i* || *-y* (пасля гістарычна мяккіх зычных), дадаткова падпарадкоўваюцца цвёрдым альбо мяккім асновам[117].

У тэксце тэфсіра ў словах з цвёрдымі асновамі часцей за ўсё сустракаецца канчатак роднага склону множнага ліку *-ów*. Паколькі арабскае пісьмо тэфсіра не адрозніває /*o*/ і /*u*/, немагчыма зрабіць высновы наконт артыкуляцыі закрытага /*ó*/[118]. На базе беларускага субстрату, які ў родным склоне множнага ліку выкарыстоўвае канчатак *-ov* (*-oй*), магчымая артыкуляцыя /*-ów*/ > /*-ow*/, і адначасова гэты канчатак таксама падлягае аканню. Таму ўсюды гэты канчатак транслітаруецца як /*-ow*/: *w ten dzen času sondnegō pōčarneją twari grešnikōw newernikōw* (327a8), *ne-mam činic jemū šabrōw spōlenčnich* (100a6), *ūprōwadzimī-jich zapewne medzi pōlkōw slūg našich* (320a5), *prikezališmi pilnim prikezanem lūdzōm dō rōdzicōw bic dōbrim dōbrōtliwim* (320a3), *wšak pōslališmi prōrōkōw dō rōznich*

---

[114] Параўн. Łapicz (1986), p. 163.

[115] Гл. >>> 11.4. Фанемы /*r*/, /*ř*/ і /*ž, š*/ (< /*ř*/).

[116] Гэтая форма ўжываецца тут як клічны склон, які ідэнтычны назоўнаму склону. Параўн. Łapicz (1986), p. 163.

[117] Наконт развіцця р. скл. мн. л. м. р. гл. Klemensiewicz (1965), p. 278–280.

[118] Гл. >>> 9.4. Напісанне галосных; гл. >>> 10.4.3. Закрыты /*ó*/.

ūmmet'ow[119] *pred tōbą āle ōni ne-werili* (102b6), *ā ten cō ōn bendze ūmarlij z-mukerrebōw*[120] *mne blisk'ich pretō jest dla negō rōskōš radōšc i raj hōjnij* (440b5).

Канчатак *-ow* спарадычна падлягае аканню і тады набывае форму *-aw*: *rekla merjema*[121] *tō ja mam ōd pana bōga pewne pan bōg nadarī pōžitkaw kōmū chce* (43b3), *jedlibi ōni z ōwocaw cō nad nimi i z ūrōdzajōw pâšni cō pōd nōgami jich* (92b6), *pōslališmi dō lūdzej prōrōkaw* (70a3).

Часам канчатак *-ow* || *-aw* запісваецца толькі праз *fatḥa* = *e* і тады ў трансліт-арацыі набывае форму *-ew*: *bendze brōnil i ōdwodzil īch ōd zlich zakezanich ūčinkew* (131b6), *prechōdzce-še na źemi ōbačice jak-še stalō kōnec prōrōkew klamajōncich* (210b2), *jūž nemaš t'emū ōd direktōrew nikōgō* (377b3). Пры гэтым размова можа ісці пра чыста графічную асаблівасць, тым больш што ў прыкладах */k/* запісваецца цвёрдай графемай *qāf* = *k*. Зразумела, у наступным прыкладзе, *zwodziciel* (спакуснік), можа быць дапушчальным рэфлекс канчатка *-ew*, які раней сустракаўся ў назоўніках мужчынскага роду з мяккай асновай[122]: *wejẓrī i muchemmedu jak'ij bil kōnec s-tich zwodzicelew prikezane lamōncich* (126b5).

Нулявы канчатак рэгулярна з'яўляецца ў лексемах *przyjaciel / nieprzyjaciel* (прыяцель / непрыяцель) і абазначэннях асоб на *-anin*[123]: *ābō jich ōgarne strachem neprijacōl jich* (211a7), *nemaš jim nikōgō s-prijacōl ābī jich mōgl ratōwac i kara bōžže ōdjōnc* (396a3), *ne-trimajce i ne-mejce muśulmane newernikōw za prijacela ōprōč muśulman* (42b3), *ōdwrōc twar swoja ōd pōgan neznajōncich* (136a8). Але ў гэтых абазначэннях асоб спарадычна можна назіраць пранікненне канчатка *-ów* > *-ow*: *wziwaj slūg bōžich dō bōga twegō āle zapewne ne-bondz i muchemmed ōd trōjčanōw bōga rōwnūjōncich* (319a8), *nemaš wam ōprōč alláhâ*[124] *bōga [ratującego] ōd neprijacelow* (180a7)[125].

Мяккія асновы часта маюць замест рэгулярнага польскага канчатака *-i* || *-y* (пасля гістарычна мяккіх зычных) канчатак *-ej*. У польскай мове паўночных крэсаў родны склон на *-ej* уяўляе сабой асаблівасць, якая пранікла ў дыялект дзякуючы беларускаму субстрату[126]. У некаторых назоўніках мужчынскага роду множнага ліку вельмі рэгулярна ўжываецца канчатак *-ej*, напр. у лічэбніку *tysiąc* (тысяча).

---

[119] Ар. *umma* = супольнасць вернікаў.

[120] Ар. *muqarrab* = прадстаўнік, любімец (літар. прыбліжаны).

[121] Ар. *Maryam* = Марыя.

[122] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 279: "Rzeczowniki miękkotematowe miały niekiedy końcówkę *-ew*, n.p. *krolew*".

[123] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 279.

[124] Ар. *Allāh* = Алаг.

[125] Параўн. Kurzowa (1993), p. 169.

[126] Параўн. Kurzowa (1993), p. 169: "Końcówka ta, jak widać, nierzadka (15 poświadczeń) stanowi niewątpliwie osobliwość na tle historii języka ogólnopolskiego i dialektu północnokresowego. Nie była bowiem nigdy notowana ówcześnie ani później [...] Wytłumaczenia dla niej trzeba szukać na tle wschodniosłowiańskim. Występuje ona w gwarach północnoukraińskich oraz białoruskich, cechuje

У назоўным склоне множнага ліку *tysiąc* замест польскага канчатка *-e* звычайна ўжываецца беларускі канчатак *-y* (гл. наз. скл. мн. л.), які пранік перш за ўсё ў гістарычна мяккія асновы: *chijōw*[127] *dwa tiśōnci stō dwadześca trī jest* (2b1). З-за гэтага ў родным склоне множнага ліку, які ў польскай мове ў гістарычна мяккіх асновах рэгулярна пазначаецца канчаткам *-y*, як правіла, з'яўляецца канчатак *-ej*, праз які забяспечваецца фармальная дыферэнцыяцыя назоўнага і роднага склонаў множнага ліку: *dalōw*[128] *penc tišencej šessōt čtirdześca dwa jest* (2b2). Канчатак *-ej* з-за акання можа змяняцца на *-aj*: *śejōw*[129] *dześenc tišencaj dzweśca*[130] *śedmidzešōnt šeśc jest* (2a17).

Аналагічна выглядае справа з назоўнікамі *ludzie* (людзі), *dzień* (дзень), *miesiąc* (месяц), у якіх таксама часта можна назіраць родны склон множнага ліку на *-ej*: *ōtō tō pewnij jest priklad dla lūdzej ūčōnich* (328a6), *ne-meli nadzeji newernici z-lūdzej grōbōw znōwo ōžic* (452b1). Побач з гэтым у лексеме *ludzie* значна радзей з'яўляецца рэгулярны польскі родны склон множнага ліку на *-i*, таму што канчатак *-i* канфліктуе з беларускім назоўным і вінавальным склонамі множнага ліку на *-i*, які часта сустракаецца замест нарматыўнага польскага канчатка *-e*: *prišed dō nich muchemmed s-prawdą s-korānem āle mnōge są s-tich lūdzī kōrānu bili newernimi* (276a5).

Канчатак *-ij* можна назіраць у якасці рэфлексу закрытага */é/ > /i/* ў пазіцыі перад */j/*[131]: *ne-stworil pan bōg tō wšitkō tilkō dla prawdī i dla slūšnōści ōznajmūjōnc cirkla jich chōdzena cūdōwnegō dla lūdzij wjádōmich* (160a7).

У назоўніку *dzień* (дзень) у родным склоне множнага ліку таксама выразна дамінуе канчатак *-ej*: *nech pōści tri dni*[132] *pred bajramem*[133] *ū k'abejū*[134] *ā śedmi dnej k'edi pōwrōcice dō dōmōw* (26a4). Побач з гэтым можна назіраць пранікненне канчатка *-ow*: *āle meśğid*[135] *ktōrij fundōwanij na bōjaźni bōžą [!] ōd dawnich dnōw*[136]

---

dopełniacz l.mn. rzeczowników trzech rodzajów: ukr. *ludej*, *kostej*, *nočej*, *ditej*, błr. *nažej*, *lasej*, *učitalej*, *babej*, *vačej*, *vušej*. [...] Była to więc końcówka, która okresowo tylko (koniec XVI – koniec XVII w.) zaznaczyła się w języku polskim na obszarze W. Księstwa Litewskiego, być może charakteryzowała język bardzo potoczny, występowała u osób dwujęzycznych, u których dwa systemy językowe wzajemnie się przenikały". Параўн. таксама Łapicz (1986), p. 165.

[127] Ар. *ḥā'* = ḥ (5-я літара арабскага алфавіта).

[128] Ар. *dāl* = d (8-я літара арабскага алфавіта).

[129] Ар. *ṯā'* = ṯ (4-я літара арабскага алфавіта).

[130] Тут паказваецца лічэбнік (польск.) *dwieście* = 200 са змякчэннем */dw'/ > /dz'w'/*, што з'яўляецца тыповым для беларускай мовы (гл. >>> 11.5.3.3.), як і аканне ў канцы слова.

[131] Гл. >>> 10.4.2. Закрыты галосны */é/*.

[132] Форма *dni* адпавядае бел. наз. скл. мн. л.

[133] Тур. *bayram* = свята.

[134] Ар. *ka'ba* = Кааба.

[135] Ар. *masğid* = мячэць.

[136] Параўн. Bräuer (1969), Bd. 3, p. 20. У сваім скланенні *n*-асновы прыпадабняюцца да *jo*-асноў і пры гэтым таксама пераймаюць канчатак *-ow*, які паходзіць з *u*-асноў. Форму *dniów* у параўнанні з больш новай формай *dni*, якая ўтворана згодна з *i*-асновай, трэба разглядаць як архаічную.

lepšij (157a3). У назоўніку *miesiąc* (месяц) родны склон множнага ліку на *-ej* сустракаецца больш рэдка, але гэта даволі паказальна для гістарычна мяккіх асноў: *dō terminu trech meśencej* (30b4).

Канчатак *-ow* зрэдку сустракаецца таксама ў гістарычна мяккіх асновах: *klūčōw jegō ne-mōglī nōšic ǧemi'et*[137] *lūdzej barzō śilnich* (318a1).

12.1.10. Давальны склон множнага ліку мужчынскага роду

У давальным склоне множнага ліку ў польскай мове ўжо вельмі рана з былых *o*-асноў на ўсе цвёрдыя асновы распаўсюдзіўся канчатак *-om*. У мяккіх *jo-* і *i*-асновах да XVII ст. захоўваўся канчатак *-em*, які, аднак, у параўнанні з прадуктыўным канчаткам *-om* усё больш страчваў пазіцыі. Таксама канчатак *-am*, які пранік з жаночага *a*-скланення, і які з XV ст. і асабліва ў XVI ст. можна было назіраць у назоўніках мужчынскага роду, выцясняўся ў польскай мове на працягу XVII ст. прадуктыўным канчаткам *-om*[138].

У давальным склоне множнага ліку мужчынскага роду ў тэксце тэфсіра сустракаюцца тры канчаткі: *-om*, *-em* і *-am*. Пры гэтым часцей за ўсё сустракаецца канчатак *-om* – як пры цвёрдых, так і пры мяккіх асновах: *nech zakriwają plachtami glōwi i perści swoje i nech ne-pōkezūją ōzdōb swojich tilkō menžōm swojim ālbō ōjcōm swojim ālbō śwekrōm swojim albō sinōm swojim ālbō sinōm menžnim drūgich žōn ālbō bracjōm swojim albō sinem bracji swojich ālbō sinem śōstr jich ālbō žōnam*[139] *drūgich menžōw swojich ālbō newolnikōm swojim ālbō newolnicam albō najemnikōm celeśnij žōndzi ne-majōncim starim* (282a5-8). Прыцягвае ўвагу тое, што ў прыведзеным фрагменце тэксту назоўнік *syn* (сын) для ўтварэння давальнага склону множнага ліку двойчы мае канчатак *-om* і двойчы – канчатак *-am*. Канчатак *-em* у тэксце тэфсіра неаднаразова з'яўляецца пры цвёрдай аснове: *čemū śe wī klanace balwanem ne-klanajce-śe tilkō panu bōgū* (391a8). Аднак у гэтым немагчыма бачыць перанос канчатка *-em* з мяккай асновы ў цвёрдую. Верагодна, мае месца толькі *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага /o/ альбо /a/ толькі праз *fatḥa* = *e*[140].

Побач з гэтым у тэксце тэфсіра пры цвёрдых асновах толькі зрэдку сустракаецца канчатак *-am* з жаночага *a*-скланення[141]: *ej jak'e-ž zle mejsca kriwdnikam i newernikōm* (53b7). Размова ідзе, бясспрэчна, пра канчатак *-am* пры *scriptio*

---

[137] Ар. *ǧamī'a* = натоўп, група.

[138] Пра развіццё давальнага склону множнага ліку гл. Klemensiewicz (1965), p. 280–281.

[139] Наконт давальнага склону множнага ліку жаночага роду, дзе ў тэксце тэфсіра яшчэ дамінуе канчатак *-am*, гл. >>> 12.3.10.

[140] Параўн. Łapicz (1986), p. 166. Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 280–281; ён не апісвае ніякага пераносу мяккага канчатка *-em* на цвёрдыя асновы.

[141] Належыць таксама памятаць пра ўплыў беларускага субстрату, дзе шырока распаўсюдзіўся канчатак *-am* і дзейнічае аканне /o/ > /a/. Хаця ў паўднёва-заходняй Беларусі таксама маюцца дыялекты, якія паказваюць такія змешванні двух канчаткаў: *-om* і *-am*; гл. Łapicz (1986), p. 171.

defectiva галоснага */a/* толькі праз *fatḥa* = *e* ў камбінацыі з цвёрдай зычнай графемай *qāf* = *k*: *ne-mōwonō tōbe inačej i muchemmedu tilkō tō cō śe reklō prōrōkem pred tōbōm* (394a4).

Пры мяккіх асновах побач з канчаткам *-om* сустракаецца канчатак *-em*, які ў польскай літаратурнай мове сустракаецца пры гэтых асновах да XVII ст. Асабліва часта ў тэксце тэфсіра можна назіраць давальны склон множнага ліку на *-em* у назоўніку *ludzie* (людзі): *zapewne te mastō zōstawiliśmi jąˢ*[142] *pūste na priklad lūdzem rōzūm majōncim* (323a1), *w tim wšitk'im priklad jest lūdzem slīšōncim* (328a8), *zapewne mī nadali jim šćirōśc kū dōbrim ōbičajem* (373a2). Але побач з гэтым часта з'яўляецца сучасная форма на *-om*, якая шырока распаўсюдзілася ў XVII ст.: *nemaš zgūbi tilkō lūdzōm lōtrōwśk'im* (415a2), *pretō takōwīm lūdzōm premeni pan bōg grech jich na spaśena* (293a3), *ne-jest ten korān blendnij tilkō na'ūka i napōminač lūdzōm* (466a2), *ja-m jest dōbrij rad gōścōm pōdrūžnim* (186b6).

Можна прывесці толькі адзіны прыклад давальнага склону множнага ліку на *-im*. Гэты канчатак можна было б патлумачыць тэндэнцыяй да звужэння галоснага перад насавымі[143]: *takōwim lūdzīm zaplata īch ōdpūščene grechōw ōd bōga* (52b2). Але, верагодна, размова ідзе толькі пра арфаграфічную памылку, бо іншыя прыклады адсутнічаюць.

12.1.11. Вінавальны склон множнага ліку мужчынскага роду

У вінавальным склоне множнага ліку ў неадушаўлёных назоўніках з цвёрдымі асновамі дагэтуль працягвае існаванне канчатак *-y* || *-i* (пасля */k, g/*) з былых *o-* і *u*-асноў. У неадушаўлёных назоўніках з мяккімі асновамі паўсюль стаў прадуктыўным канчатак *-e* з былых *jo-* альбо *n*-асноў. У назоўніках, якія абазначаюць мужчын, ужо ў XVI ст. можна было назіраць выкарыстанне формаў роднага склону ў функцыі адушаўлёнага вінавальнага склону. Але катэгорыя адушаўлёнасці набыла сістэмны характар толькі з XVII ст. У далейшым формы вінавальнага склону адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду выкарыстоўваліся як стылістычны сродак і пераважна ў пэяратыўным значэнні[144].

У неадушаўлёных назоўніках з цвёрдай асновай у тэксце тэфсіра звычайна сустракаецца рэгулярны канчатак *-i* (*-y* || *-i* пасля */k, g/*): *widzice ōkrenti rōzdzelajōnc wodī w mōrū* (208a8), *wikōwali s-kamene w skalach sōbe dōmī* (206b2), *i wčiniliśmi jich prōwrōconimi werchi dōmōw na dōl ā fūndementi na werch* (206a5), *ōdwrōcimō ōd nich zlōści i grechi īch* (320a1), *tak ōznajmūje pan bōg wam rōzsōndk'i swoje* (95a2). Канчатак *-i* (*-y* || *-i*) выступае таксама

[142] Пастаноўка займенніка жаночага роду *jąˢ* з'яўляецца інтэрферэнцыяй з арабскім тэкстам; гл. >>> 2.3.3. Пранаміналізацыя і адносны даданы сказ.

[143] Гл. >>> 10.4.2. Закрыты галосны */é/*; 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

[144] Наконт развіцця вінавальнага склону множнага ліку гл. Klemensiewicz (1965), p. 281–282.

ў запазычаных арыенталізмах: *wistawuj nemaźī*[145] *na strōnach dwuch dzennich ewle*[146] *ik'indi*[147] *i na perśich gōdzinach ächšam*[148] *ōd nōci i jet'ci*[149] (180a8).

Пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах у тэксце тэфсіра, як правіла, з'яўляецца польскі канчатак *-e*: *ōdwrōcil ōd nich grech i zwičaje dōbre* (415a6), *spūściliśmi dežğ na nich kamene śarčane i ōgen ōd pekla* (206a5), *zsilal ź neba dežğ i wiprōwadzil tim ōwoce jedne za drūgich rōźne i smak'em ī kōlōrem* (356a6). Канчатак *-e* можа таксама падлягаць аканню: *spūściliśmi dežğ na nich kamena śarčista* (124b4). Назоўнік *dzień* звычайна ўтварае вінавальны склон на *-i*: *nech pōści tri dnī* (95a1)[150].

Паралельна звычайнаму польскаму канчатку *-e* пры мяккіх і перш за ўсё пры гістарычна мяккіх асновах можна назіраць пранікненне беларускага канчатка *-y* || *-i* паводле ўзору цвёрдай асновы: *grizą na was palci swoje ōd zlōści* (51a6), *rekną ālbō ne-biliśmi z-wami čemū nam zdōbiči ne-dzelīce* (77b8), *prišla mōc bōžže na fūndūši īch i strōnsla fūndamente i ōbwalili-śe* (209a5), *i ūčinilbi tōbe palaci majstate* (288b3), *i na' ūčiliśmi-gō remōsla wam panceri rōbic wam dla zaščicena was ōd pripadkōw* (261b3).

Гэта, здаецца, магло прывесці (параўн. назоўны склон множнага ліку) да пераносу канчатка *-e* на цвёрдыя асновы ў назоўніках *fundament* (фундамент) і *majestat* (трон) з вышэйпрыведзеных прыкладаў: *prišla mōc bōžže na fūndūši īch i strōnsla fūndamente i ōbwalili-śe* (209a5), *i ūčinilbi tōbe palaci majstate* (288b3). Наадварот, больш верагодным з'яўляецца тое, што мае месца *scriptio defectiva* ненаціскнога канчатка *-a*[151] толькі праз *fatḥa* = *e*. Тыповы для запазычаных слоў канчатак вінавальнага склону множнага ліку *-a* выразна дэманструе, напрыклад, назоўнік *cyrkiel* (круг); тут меліся на ўвазе кругавыя арбіты планет: *ne-stworil pan bōg tō wšitkō tilkō dla prawdī i dla slūšności ōznajmūjōnc cirkla jich chōdzena cūdōwegō* (160a6).

У адушаўлёных назоўніках для абазначэння жывёл паўсюль з'яўляюцца формы рэгулярнага вінавальнага склону множнага ліку на *-i* (*-y* || *-i*) пры цвёрдых і *-e* – пры мяккіх асновах: *čwornōge bidlō stworilem [...] i tež kōne i mūli i ōslī dla wśedena na nich i dla ōzdōbi* (207b7). У тэксце тэфсіра пры абазначэнні жывёл няма формаў роднага склону ў функцыі вінавальнага склону.

---

[145] Перс. *namāz* = рытуальная малітва. На базе арабскага пісьма ў (перс.) *namāz* > (польск.) *nemaź* = малітва не можа быць выражана якасць канчатка *-y* альбо *-i*, бо з персідскай арфаграфіі захоўваецца неэмфатычная і мяккая ў польскай мове графема *zāy* = *z*, якая не абавязкова выражае змякчэнне.

[146] Тур. *öğle* = поўдзень, паўдзённая малітва.

[147] Тур. *ikindi* = час пасля поўдня.

[148] Тур. *akşam* = вечар. Тут маецца на ўвазе вячэрняя малітва.

[149] Тур. *yatsı* = час каля 1–2 гадзін пасля заходу сонца. Тут маецца на ўвазе пятая абавязковая малітва, якая выконваецца ў гэты час.

[150] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 281: "Tylko rzeczownik dzień przyjmuje końcówkę -i: dni od tematów na -i".

[151] Параўн. >>> 12.1.8. Назоўны склон множнага ліку мужчынскага роду.

Утварэнне катэгорыі адушаўлёных назоўнікаў мужчынскага роду ў польскай літаратурнай мове прыпадае на XVII ст.[152] У тэксце тэфсіра пры абазначэнні асоб мы сустракаем змяшэнне першапачатковых формаў вінавальнага склону на *-y* || *-i* і формаў родна-вінавальнага склону.

Прыклады першапачатковага вінавальнага склону множнага ліку ў абазначэннях асоб мужчынскага полу: *ī cī ktōre īman*[153] *prijenli ne mejce za prijaceli*[154] *i ne ūtriwajce tajemnici tim cō ne ź warī wašej* (51a2), *učinilibišmi z-was ānjōlī* (404a8), *pretō wrūcil-še dō lūdzej swojich fera'ūn*[155] *i zebral wšitk'e čarōwnik'i pōtim prišedl na plac naznačōnij* (250a5), *pan bōg ne ōdpūšci i ne-zmilūje-še nad timi cō spōlenčnik'i jemū pripisūją* (75a2), *wčiniliśmi w našenū jegō prōrōk'i i daliśmi jim kśenga t'ewrīt'*[156] *inǧīl*[157] *źebūr*[158] (322a4), *ẓabijali sīni waši i żiwili i srōmōcili żōnī waši i cūrk'i waši* (129a8), *mōw werōncim muśulmankōm nech tūlają ōčī swoje i zakriwają i ne-patrą na cūdze menżī*[159] (282a3).

Паралельна выяўляецца родна-вінавальны склон: *pan bōg waš źgūbi neprijacōl wašich* (128a4), *ūmōrili ālbō zatōpili ānjōlōw w newerenstwa dūš jich* (209b1), *pewne ōni bendą zwodzic mek'k'ejšk'ich*[160] *newernikōw ōd drōgi dōbrej* (403a4), *zapewne ūčiniliśmi pōslōw našich prōrōkōw laską ōd pana bōga twegō* (406a6), *rekl fera'ūn*[161] *zaraz każe zabijac sinōw jich ā żiwe sōstawic i srōmōcic żōn*[162] *ich* (128a1), *pōtim ūwolnimi pōslancōw našich tich ktōre ūwerili ōtō tak pōwinenem i należnōšc mōja na nich ūwolnic i ratōwac werōncich muśulman* (169b3). У назоўніку *obywatel* (жыхар) побач з канчаткам *-ow* з'яўляецца канчатак *-ew* як графічна-фанетычны альбо як марфаналагічны варыянт: *pricisneliśmi ōbiwatelōw tich mjást napaścami i bedami* (125b8), *wignali ź mjástâ ãgibtū ōbiwatelew tegō mastâ* (127b4).

У назоўніку *ludzie* (людзі) канстатуецца ваганне паміж канчаткамі *-i* і *-e*, што было тыповым для польскай літаратурнай мовы да XVII ст.[163]: *zapewne mī spūścimi dežǧ na lūdzī tegō meškana śarke ōgen i kamene* (322b8), *newernikami są*

---

[152] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 281. Параўн. Łapicz (1986), p. 166.

[153] Ар. *īmān* = вера.

[154] У дадзеным прыкладзе *prijaceli* трэба звярнуць увагу, што адсутнічае польская перагаласоўка, таму гэтую форму можна прачытаць па-беларуску *прыяцелі* (польск. *przyjaciele*) і вызначыць мяккі канчатак *-i*. Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 282: "Rzadko trafiają się formy *przyjacioły*, *nieprzyjacioły* z końcówką -y na wzor rzeczowników twardotematowych".

[155] Ар. *fir'awn* = фараон.

[156] Ар. *tawrā* = Тора.

[157] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

[158] Ар. *zabūr* = Псалмы.

[159] Польск. *mąż* = муж; мн. л. *mężу* || *męże*. Тут зноў паказваецца пранікненне канчатка *-y* || *-i* назоўнікаў з цвёрдымі асновамі ў назоўнікі з мяккімі і гістарычна мяккімі асновамі. Параўн. 12.1.8. Назоўны склон множнага ліку мужчынскага роду.

[160] Ар. *Makka* = Мекка.

[161] Ар. *fir'awn* = фараон.

[162] Наконт вінавальна-роднага склону множнага ліку жаночага роду гл. 12.3.11.

[163] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 282: "Forma *ludzi* (właściwa tematom na *-i*) i *ludzie* (na podobieństwo tematów na *-jo*) waha się w tym okresie od czasów najdawniejszych".

i zwedzą lūdzī ōd drōgi bōžej (80b4), *ā wi žebišce bili śwjádkami na lūdze pōśledne že prōrōci prikaz bōžij dōnōšili* (271b8), *ōtō ten k'itab*[164] *kśenga zeslaliśmi ją tōbe žebiś wiprōwadzil lūdze ōd cemnegō blondū dō śwjátlōści* (197a6). Паралельна таксама выяўляецца родна-вінавальны склон з тыповым канчаткам *-ej*, які можна разглядаць як беларускі ўплыў: *mī zapewne wigūbimī lūdzej ōtō tegō masta* (322b3).

У цэлым мы знаходзім у тэксце тэфсіра ў абазначэннях асоб мужчынскага полу формы першапачатковага вінавальнага склону некалькі часцей, чым родна-вінавальнага склону[165].

12.1.12. Творны склон множнага ліку мужчынскага роду

У польскай мове ў творным склоне множнага ліку да XVI ст. быў прадуктыўным канчатак *-y* || *-i* (пасля *k, g*) назоўнікаў з былымі *o-* і *jo*-асновамі. У назоўніках *i-, u-* і *n*-асноў ужываўся канчатак *-mi*; ён распаўсюдзіўся таксама на былыя *jo*-асновы. Спарадычна ў друкаваных выданнях XVI ст. можна яшчэ знайсці канчатак *-oma*, пераняты з парнага ліку, які, аднак, не стаў прадуктыўным. Канчатак *-ami*, які пранік з *a*-скланення назоўнікаў жаночага роду, да XVI ст. можна было сустрэць у назоўніках мужчынскага роду толькі зрэдку. Але ён распаўсюджваўся ў XVI ст. усё мацней і, нарэшце, цалкам выцесніў усе іншыя канчаткі (*-mi, -oma, -y* || *-i*)[166].

У творным склоне множнага ліку ў тэксце тэфсіра сустракаюцца ўсе чатыры канчаткі: *-ami, -mi, -y* || *-i* і *-oma*.

У цвёрдых асновах часцей за ўсё выяўляецца канчатак *-ami*, які пранік з *a*-скланення назоўнікаў жаночага роду: *prijdzą ze-wšitk'imi čarōwnikami wjádōmimī* (127a3), *jeśli ce dōtkne ālláh*[167] *bōg zawadą chōrōbą bedami pripadkami nicht tō ōdjōnc ne-mōże tilkō ōn* (169b8), *ōnī są medzi was słūchajōncimi špegami* (150a4), *ūčinil was nameśnikami krōlami pō lūdzech 'adōwich*[168] (123b8), *zeslal wam kśenge korān ājet'ami*[169] *rōzdzelami* (110b2), *pane ūčin-mī ūstawičnim nemaźkarem*[170] *i ōd pōtōmstwa naśena megō namaźkarami* (201b5), *ānjōlōwe bendą chwalic ōnegō t'eśbichami*[171] *ūstawičnimi i w nōci i we dni* (393b4). Як асобны варыянт сустракаецца, магчыма, пад уплывам насавога */m/*, канчатак *-omi* (< *-ámi*): *ci ktōre k'afirōmi*[172] *są newernimi ź lūdzej piśma nemajōncich i trōjca wiznawajōncich maja bic w ōgnū pek'elnem* (493a1).

---

[164] Ар. *kitāb* = кніга.

[165] У паўднёва-заходнім беларускім дыялекце сустракаецца він. скл. мн. л. = наз. скл. мн. л. у абазначэннях мужчын. Параўн. Łapicz (1986), p. 167: "Pewne analogie rozwojowe można upatrywać w brus. gwarach płd.-zach., w których formy B. są równe M. także u rzeczowników żywotnych".

[166] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 282–283.

[167] Ар. *Allāh* = Алаг.

[168] Ар. *'Ād* = назва арабскага племя.

[169] Ар. *āya* = верш Карана, знак, цуд.

[170] Перс. *namāzkār* = той, хто моліцца.

[171] Ар. *tasbīḥ* = усхваленне.

[172] Ар. *kāfir* = нявернік.

Пры мяккіх асновах часта сустракаецца канчатак *-mi*. Гэты канчатак звычайна ўжываецца, у прыватнасці, у назоўніку *ludzie* (людзі): *i daj nam źwirchnōśc nad lūdzmī newernimi* (53b3), *prendkō idz z-lūdzmī twojimī w jednej čeńści ōd nōci i weź za sōbą naśladōwnikōw swōjich* (205b6), *bilī pōganmī i ješčō ne-bili naprewadzenī na drōga prawdziwa* (96b6). Канчатак *-mi* звычайна прымае арабізм *kāfir* (няверны, наверанік), польск. *kiafirin*: *wedzeli ci ktōre k'afirmi zōstali że ōni pewne są jest klamci* (210b6), *pewne tak pitali izra'elśk'e lūdze pred wami ā pōtim zōstali dla tegō k'afirmi* (96b2).

У назоўніку (*nie*)*przyjaciel* канчатак творнага склону вагаецца паміж *-mi*, *-i* і *-ami*. Часцей за ўсё ўжываецца канчатак *-mi* паводле ўзору мяккіх асноў: *ā k'edi-śe zejdą z-wami bendą wam neprijacelmi* (450b4). Побач з гэтым ужо з'яўляецца сучасны канчатак *-ami*: *ā teraz wī staliśce žōndajōncimi śmerci naprōd niž śe pōdkali ź neprijacelami* (53a2). Толькі зрэдку сустракаецца канчатак *-y* || *-i*: *ōni wam neprijaceli jawnimi i welk'imi* (22b5)[173].

Толькі спарадычна ў тэксце тэфсіра сустракаецца ў творным склоне множнага ліку канчатак *-oma*, перанесены з парнага ліку: *dla nich jest tam jenčene stenkana zfrigatane źenbōma* (179b6)[174].

Першапачатковы канчатак *-y* || *-i* назоўнікаў з *o-* і *jo*-асновамі ў сучаснай польскай мове захаваўся толькі ў некаторых устойлівых зваротах. У тэксце тэфсіра гэты канчатак з'яўляецца хаця і рэдка, але яшчэ даволі рэгулярна паказвае рэшткавую прадуктыўнасць, якая выходзіць за межы ўстойлівых зваротаў, якія мы знаходзім і сёння: *wšak pōslališmi mōjžeša z-rōźnimi pōznak'i* (384b3), *alláh*[175] *bōg nemaš medzi bōgi tilkō ōn pan mastatū welk'egō* (304b6), і *mī jemū werōncimī muśulmani*[176] (324a5). Але паралельна гэтаму з'яўляецца сучасны канчатак *-mi*: *mōw tim ktōrīm danō kśenge židōm grekōm i nepiśmenim 'erabōm*[177] *či bendzece muśulmanmi* (41b6). Толькі як выключэнне мы знаходзім канчатак *-i* ў назоўніку *ludzie*: *tak ma mowic bōndzece wī slūgami bōžžimi slūžōnc mū ščirō cō śce stali ūčōnimi piśma kśengi i staliśce lūdzī ūčōnimi* (47b1).

12.1.13. Месны склон множнага ліку мужчынскага роду

Канчатак *-ach,* які паходзіць з *a*-скланення жаночага роду, распаўсюдзіўся ў польскай літаратурнай мове з другой паловы XVI ст. на мужчынскія асновы і з канца XVII ст. стаў адзіным канчаткам меснага склону множнага ліку[178].

---

[173] Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 283: "Może to jedyny ślad końcywki *-i* tematów na *-jo*". (Ні ў адной з формаў не сустракаецца польскай перагаласоўкі, таму, у прыватнасці, у апошнім прыкладзе можна вызначыць палатальны канчатак *-i*.)

[174] У дыялектах часткова распаўсюдзіўся канчатак *-oma* (*-yma*) замест *-ami*. Гл. Klemensiewicz (1965), p. 283.

[175] Ар. *Allāh* = Алаг.

[176] Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 283: "Starą końcówkę **-y* mają też rzeczowniki na *-anin*, np. *miedzy pogany* (w. XIV), *z mieszczany*, *Walentiniany*, *dworzany* (w. XVI)".

[177] Ар. *'arab* = арабы.

[178] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 286. Параўн. Strutyński (1993), p. 95.

У тэксце тэфсіра канчатак *-ach* з'яўляецца дамінантным канчаткам меснага склону множнага ліку: *ja jest mnejšij ōd cebe w skarbach i w narōdze w dzatkach* (234a8), *mejsca są čiste w rajach ādenśk'ich*[179] (453b3), *bili pred muchemmedam ū blendach welk'ich* (454a3), *pana bōga chwalil pō wečōrach i pō rankach* (371a2).

Побач з гэтым у тэксце тэфсіра з'яўляюцца сляды першапачатковага канчатка *-'ech* (< *-ĕch*)[180] з *o*-скланення, які захоўваўся ў літаратурнай мове да XVI ст. (у асобных выпадках – да XVII ст.), аднак у другой палове XVI ст. быў неўзабаве заменены сучасным канчаткам *-ach*. На крэсах альбо ўскраінах польскага моўнага арэала канчатак *-'ech* мог праіснаваць даўжэй, чым у літаратурнай мове. Спасылаючыся на паўноўчныя крэсы, Курцова разглядае канчатак *-'ech* ужо як архаічную форму ў XVII і XVIII стст.[181]

Канчатак *-'ech* змякчае цвёрды зычны ў канцы асновы, і пры велярных */k, g, ch/* адбываецца гукавая змена паводле 2-й палаталізацыі. У тэксце тэфсіра змякчэнне цвёрдага заканчэння асновы перад канчаткам *-'ech* паказваецца, бясспрэчна, вельмі рэдка: *we trech čašech*[182] (285b8). Але побач з гэтым у беспасярэдным наступным кантэксце звычайна сустракаецца сучасны канчатак *-ach*, які не змякчае канцавы зычны: *pō tich trech časach* (286a3). Адносна часта можна знайсці канчатак *-'ech* у назоўніках з мяккай асновай: *na wek'ī bendą w tich rajech* (251a8), *ne-slišeliśmi ōtō tak ō jednim bōgū w wekach prešlich i w lūdzech pōślednich t'eraznejših nic tō ne-jest tilkō klamstwa* (370a8), *ūšadši prislōnōm-še na pōścelech kōldrī jich [z] žōltegō ātlasu* (437b3). У арыенталізмах часта паказваецца канчатак *-'ech* таксама пры мяккіх асновах: *ōni bili u nemaźech*[183] *swojich z-bōjaźną bōžą i z-gōtōwim sercōm* (272a3), *ci ktōre są na namaźech swojich należnich časōw pōstregają takōwī nacije w rajach za učink'i swoje dōbre ū welk'ej pōwadze bendą* (469a1).

На базе арабскага пісьма часта нельга адназначна вырашыць, ідзе размова пра палатальны канчатак *-'ech* альбо толькі пра *scriptio defectiva* канчатка *-ach*. Гэта датычыць канцавых зычных асноў, якія запісваюцца такімі графемамі, што не перадаюць палатальнасці[184]: *bendze pri k'afirech*[185] *wiktōrija* (77b8). З аднаго боку, тут у арабізме *kāfir* (нявернік) > польск. *kiafirin* сапраўды можа ісці размова пра палатальны канчатак *-'ech*; з іншага боку, можа таксама мець месца *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага */a/* толькі праз *fatḥa* = *e*. Такія прыклады, як наступны, ясна паказваюць, што пры канчатку *-'ech*, які

---

[179] Ар. *'adn* = Эдэн, рай.

[180] Пра іншую этымалогію гэтага канчатка гл. Klemensiewicz (1965), p. 284.

[181] Гл. Kurzowa (1993), p. 171: "Ponieważ w tekstach AWK końcówka *-ech* ma 10 zapisów z XVII w. i 5 z XVIII, trzeba ją uznać w dialekcie kresowym tego czasu za archaiczną".

[182] Мяккая графема *t̤ā'* = *ś* для палатальнага */s'/* кантрастуе з цвёрдай графемай *ṣād* = *s* для цвёрдага /s/. Спосаб напісання <*čašeh*> адназначна перадае змякчэнне */s/* > */s'/*.

[183] Перс. *namāz* > (польск.) *nemaź* = малітва.

[184] Гл. >>> 9.3.3. Выражэнне палатальнасці.

[185] Ар. *kāfir* = нявернік.

знаходзіцца ў транслітарацыі, часта размова ідзе толькі пра *scriptio defectiva* канчатка *-ach*: *w ziwotech jich tilkō ōgen pek'elnij* (23a5). Гук /t/ у канцы асновы тут не змякчаецца ў /c'/, так што за транслітараваным напісаннем <*-ech*> можа хавацца канчатак *-ach*[186].

У тэксце тэфсіра нельга знайсці ніводнага прыкладу для канчатка *-och*, які пераважна з'яўляецца ў малапольскіх моўных помніках да канца XVI ст.[187]

12.1.14. Клічны склон множнага ліку мужчынскага роду

Формы клічнага склону множнага ліку мужчынскага роду ідэнтычныя формам назоўнага склону множнага ліку, і яны не патрабуюць ніякага асобнага каментару[188].

Часта пры зваротах з'яўляецца клічная часціца *i* (o!)[189]: *ī welci panōwe dajce mī fet'wej*[190] *snū megō* (185a8), *dla was jest twarda kerane i grekōwe ōd tegō cō bōga klamliwe persōnice* (257a6), *reče pan bōg ōdberce-še i rōźlōnčce-še dziś ī grešnici ōd wernich i reče pan bōg dō grešnich ābō-m ne napōminal dō was i sīni člōweče žebišce ne-slūžili šetanōwi* (362a7), *mōdlce-še i trōjčane tim ktōrim mōdliliści-še jim ōprōč bōga* (350a5), *ī lūdze bōjce-še bōga wašegō ktōrij stworil was z-dūcha jednegō tō jest' ādamâ* (59b4).

12.2. Скланенне назоўнікаў ніякага роду

12.2.1. Назоўны (клічны) склон адзіночнага ліку ніякага роду

Польская мова дагэтуль захавала ў ніякім родзе стараславянскія канчаткі назоўнага склону адзіночнага ліку *-o, -e, -ę*[191].

У тэксце тэфсіра таксама знаходзяцца ўсе тры названыя канчаткі: *-o, -e* і *-ę*. Канчатак *-ę* падлягае ў канцы слова дэназалізацыі і ў арабскім пісьме ніколі асабліва не пазначаецца як насавы. Таму ў транслітарацыі замест канчатка *-ę* заўсёды пішацца *-e*, які перадаецца напісаннем *fatḥa* = *e*.

Усе канчаткі, *-o, -e* і *-e* (< *-ę*), могуць падлягаць аканню, што асабліва моцна праяўляецца ў ніякім родзе ў назоўным і вінавальным склонах. Таму да названага пераліку канчаткаў, *-o, -e* і *-e* (< *-ę*), яшчэ трэба дадаць канчатак *-a*, які ўзнік другасна праз аканне.

---

[186] Параўн. Łapicz (1986), p. 168: "[...] *o časex* [...] *na varotex*". Прыведзеныя Лапічам прыклады хутчэй даказваюць *scriptio defectiva* канчатка *-ach*, чым ужыванне палатальнага канчатка *-'ech*.

[187] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 285. Гл. Strutyński (1993), p. 95. Параўн. Łapicz (1986), p. 168: "W Kitabie nie stwierdzono końcówki -och, jaka istnieje w brus. zabytkach językowych oraz we współczesnych gwarach".

[188] Гл. >>> 12.1.8. Назоўны склон множнага ліку мужчынскага роду.

[189] Наконт клічнай часціцы *i* гл. >>> 12.1.7. Клічны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду.

[190] Ар. *fatwā* = прававое рашэнне.

[191] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 300. Гл. Strutyński (1993), p. 95.

Табліца 12.2

Скланенне назоўнікаў ніякага роду

Склон	Адзіночны лік	Множны лік
Наз.	**-e** (*-e*) **-e** (<*-ę*) (дэназалізаваны) **-o** (*-o*) **-a** (< *-e, -ę, -o*) (аканне) **-e** (< *-a*) (графічны варыянт)	**-a** (*-a*) **-e** (< *-a*) (графічны варыянт) **-i** (*-y* || *-i*) (бел.) **-i** (*-y*) (парн.) (рэшткі: *oczy, uszy*)
Род.	**-a** (*-a*) **-e** (< *-a*) (графічны варыянт)	**-Ø** (нулявы канчатак) (звычайны канчатак) **-ej** (*-ej*) **-u** (парн.) (рэшткі) (*oczu*) **-ow** (*-ów, -oŭ*) (рэдка)
Дав.	**-u** (*-u*) (адзіны канчатак)	**-am** (*-am*) (*a*-скланенне) (!) **-em** (< *-am*) (графічны варыянт)
Він.	**-e** (*-e*) **-e** (< *-ę*) (дэназалізаваны) **-o** (*-o*) **-a** (<*-e, -ę, -o*) (аканне) **-e** (< *-a*) (графічны варыянт)	**-a** (*-a*) **-e** (< *-a*) (графічны варыянт) **-i** (*-y* || *-i*) (бел.) **-i** (*-y*) (рэшткі: *oczy, uszy*) він. = род. (адушаўлёныя ніякага роду) (рэдка)
Твор.	**-em** (*-em*) (дамінантны) **-om** (*-om*) (бел.) (часта) **-am** (< *-em, -om*) (аканне) (часта) **-im** (< *-ém*) (*e-pochylone*) (рэдка)	**-ami** (*-ami*) **-i** (*-y* || *-i*) (рэдка) **-mi** (*-mi*) (мяккая, гістарычна-мяккая) **-ima** (*-yma*) (парн.) (рэшткі: *oczyma*)
Месн.	**-'e** (< **-ě*) **-'a** (< *'e*) (аканне) **-u** (*-u*) (мяккая, гістарычна мяккая; *k, g, ch*)	**-ach** (*-ach*) (*a*-скланенне) **-'ech** (<**-ěch*) (вельмі рэдка)
Клічны	-	-

Прыклады канчатка *-o*: *prišed dō nich rōznimi cūdami rekli tō jest čarōdzejstwo welk'e i jawne* (453a3), *ne-jest tō tilkō słōwo lūck'e* (474b1), *ne-ōdpadne z-drewa i jedin list tilkō za wjádōmōšcą jegō ānitež źarnō w cemnōšci źemi* (104b3), *nic ne-jest' pōžīce tegō dōčasnegō świáta tilkō igriskō i ōšūkanina*[192] *ālе wečnij świát lepšij jest* (101b7).

Пад уплывам акання з'яўляецца канчатак *-a*, які звычайна запісваецца *scriptio plena* праз *alif* + *fatḥa* = *a*: *pewne na cebe preklenstwa āž dō dna sōndnegō* (204b2),

[192] Польск. *oszukanina* з'яўляецца аўгментатыўным утварэннем з суфіксам *-ina*. Параўн. Budziszewska (1994), p. 101.

w ten čas k'edi prišed dō nich korān świentij rekli ōtō ten korān jest čarōdzejstwa ā mī zaś pewne temū korānu newernikami jest (402b3), *prišlō dō nas pišma naše* (255a2), *rekl i lūdze mōje či-ne-mōje jest krōlewstwa āgipt'* (404a1). Аднак рэгулярна з'яўляецца рэдукаваны спосаб напісання (*scriptio defectiva*), ненаціскнога канчатка *-a* (< *-o*) толькі праз *fatḥa* = *e*, так што замест этымалагічнага канчатка *-o* ў транслітарацыі можа з'яўляцца *-e*: *ne-jest ten korān tilkō klamliwe słowe* (288a2).

Прыклады этымалагічнага канчатка *-e*, які ў арабскім пісьме звычайна запісваецца праз *fatḥa* = *e*: *mōw ja*[193] *muchemmed či-tō jest' lepše pōžice či-tež raj wečnij* (288b7), *źwicenžōne jest kōnstantin pōle*[194] *grecija* (326b1), *w ten dzen lepše jest meškane* (289b5), *dla nich jest na tim świece pōnižene i pōtenpene* (88b4).

Канчатак *-e*, як правіла, таксама падлягае аканню: *bjâda wam spašena bōžže lepše jest dla tich cō ūwerili* (318b2), *pewne te peklō barzō zle pōmeškana i mejsce zle* (292b6), *cheramem*[195] *ūčinil pan bōg na negō raj i mejsca*[196] *jegō jest' nar*[197] *peklō* (93a4).

Канчатак *-ę* заўсёды запісваецца дэназалізавана толькі праз *fatḥa* = *e*: *pewne mī swestūjem cebe sīnem īmę jemū jechjá*[198] (141a1). Насавы *-e*, дэназалізаваны ў канцы слова, звычайна падлягае аканню */-e/* > */-a/*[199]: *w īma bōga laskawegō miłōserdnegō* (6a1).

Гук *-e*, які знаходзіцца ў канцы слова, часта пераходзіць у *-o*, што з'яўляецца дыялектнай асаблівасцю беларускай мовы[200]. Таму часта сустракаюцца такія формы, як *słońco* (сонца), *miejsco* (месца), *serco* (сэрца): *ī ōjče pewne ja widzalem widzene jedinašce gwazd i słōncō i meśōnc* (181b1), *ī prōrōče wojūj newernikōw šablō i ne-dōwerkōw grōm jenzik'em i bōndz dūžim strōgim nad nimi i mejsce jich ūstawične peklō ej jak'e zle mejscō* (461a5), *lipej-bi-śe ūspōkōjilō sercō mōje* (35b5).

12.2.2. Родны склон адзіночнага ліку ніякага роду

У польскай мове яшчэ да пачатку пісьмовай традыцыі ў родным склоне адзіночнага ліку ніякага роду як адзіны флексійны афікс усталяваўся канчатак *-a*[201].

---

[193] Ар. *yā* = клічная часціца.

[194] Польск. *Konstantyn pole* = "Канстантын поле"; народнае этымалагічнае тлумачэнне *Канстантынопаля*.

[195] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

[196] У назоўніку *miejsce* (месца) у тэксце тэфсіра часта знаходзіцца варыянт *mejsco*, таму таксама можа мець месца аканнне */o/* > */a/*; гл. ніжэй.

[197] Ар. *nār* = агонь.

[198] Ар. *Yaḥyā* = Ян.

[199] Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 301: "Typ *siemię* uległ w różnych okolicach różnym modyfikacjom: albo powstała odmiana (*ten*) *ramień ramiania*, albo *ramie ramia*, *imie imia*, *siemie siemia*".

[200] Гл. >>> 10.11. Змена */e/* > */o/* ў канцы слова.

[201] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 302: Strutyński (1993), p. 96.

У тэксце тэфсіра канчатак *-a*, які пішацца *scriptio plena* праз *alif* + *fatḥa* = *a*, таксама выглядае цалкам дамінантным: *wedlūg primira ābrahamōwegō* (116a7), *ā k'edī ōbačą z-mejsca dalek'egō* (288b4), *idzce dō pekla* (365b7), *wšitkō bilō źe srebra i źe zlōta* (403a1), *ktō zsila ź neba dežğ* (325b5), *bōg ktōrij ūčinil dla was źeme grūntem dla meškanja i pōčinil dla was na tej źemi drōgi* (401a5).

Канчатак *-a* часта запісваецца *scriptio defectiva* праз *fatḥa* = *e* і тады перадаецца ў транслітарацыі як *-e*: *rekliśmi jim ne-wipadajce s-prikezane granic* (79a8), *ū sprečanū nōci se-dnem znak'i jedinōstwe bōžžegō* (58b1), *swestūjem cebe sinem īme jemū jechjá*[202] *ne činiliśmi tek'egō pred tim imene*[203] (241a1).

12.2.3. Давальны склон адзіночнага ліку ніякага роду

У давальным склоне адзіночнага ліку ў польскай мове яшчэ да пачатку пісьмовай традыцыі ўсталяваўся канчатак *-u* назоўнікаў з *o-* альбо *jo*-асновамі[204].

У тэксце тэфсіра сустракаецца выключна канчатак *-u*, які запісваецца альбо *scriptio plena* праз *wāw* + *ḍamma* = *ū*, альбо *scriptio defectiva* праз *ḍamma* = *u*: *ne-weril piśmū bōga swegō i menkōm pōslednim twardim* (255a3), *ne-pristōji slōncu ābī chōdzilō pō stōmpnach meśončnich* (361a4), *ne-werili ōni prikezanū bōžžemū* (79b1).

Звяртае ўвагу форма назоўніка *cielę* (цяля) з *nt*-асноў са скарочанай формай пашыранай асновы: *mōwili ne-zabawīmi-śe mi w pekle tilkō dnī cō celcū klanali-śe* (42a4).

12.2.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку ніякага роду

Вінавальны склон адзіночнага ліку ў тэксце тэфсіра паказвае той самы інвентар канчаткаў, што і ў назоўным склоне, а менавіта *-o, -e*, *-e* (< *-ę*) і на базе акання таксама *-a* (< *-o, -e*)[205].

Прыклады канчаткаў *-o* і *-a* (< *-o*): *ja tilkō wam dōnōše bōžže slōwo (41b7), nagōtōwaliśmi jim mejscō*[206] *peklō* (228b8), *wrūcajce žōnam swojim wanō šlūbne* (60a3), *trimają piśmō bōžže korān i pōstrašene jegō na šiderstwa na žarti* (236a4), *daliśmi dawidōwi ōd nas welką świentōbliwośc i prōrōstwa i krōlewstwa* (348b7), *cī ktōre uwerili i ōtrimają z-was šehīdstwa*[207] (52b8).

---

[202] Ар. *Yaḥyā* = Ян.

[203] За напісаннем *imene* належыць разумець (польск.) *imienia*, дзе канчатак *-a*, будучы ненаціскным, запісваецца ў арабскім пісьме рэдукавана, альбо *scriptio defectiva*, праз *fatḥa* = *e*. Можна з упэўненасцю выключыць тое, што пад *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага /*a*/ разумеецца праславянскі канчатак роднага склону **-e* назоўнікаў з асновай на *-en-* (гл. Bräuer (1969), Bd. 3, p. 24).

[204] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 303. Strutyński (1993), p. 97.

[205] Параўн. >>> 12.2.1. Назоўны (клічны) склон адзіночнага ліку ніякага роду.

[206] Параўн. >>> 10.11. Змена /*e*/ > /*o*/ ў канцы слова.

[207] Ар. *šahīd* = пакутнік.

Прыклады канчаткаў *-e* і *-a* (< *-e*): *ōbačice slōnce gdi bendze wschōdzic* (231b2), *chtō ūwerī bōgū bendze dirigōwal serce jegō kū cerpliwośći* (457a7), *ā pōtim pan bōg k'edi zachce bendze tworic stworene pōśledne* (321a8), *takōwim lūdzōm premeni pan bōg grech jich na spaśena* (293a3).

Прыклады канчаткаў *-e* (< *-ę*) і *-a* (< *-ę*): *nōśi newjásta dzece i ne-rōdzi ta newjásta tilkō za wjádōmōścą bōžžą* (394b4), *pō' ōbwalalibi-śe ōltarī pūstelnikōw cerkwī greck'ij śkōli židōwśk'e i mečet'i rōźne cō wspōminają w nich ime bōžże* (268a7), *i tō cheram*[208] *cō zarźnōne na ima ōbrazōw i balwanōw* (82b5).

У вінавальным склоне таксама дзейнічае беларуская змена канцавога *-e* > *-o*. Мы знаходзім, як і ў назоўным склоне, некалькі характэрных лексем, якія паказваюць гэтую змену[209]: *ā pōtim ūčiniliśmi slōncō drōgō pōkazūjōnce prikladem* (291a6), *naśladōwali prōrōke w časach barzō trūdnich glōdnich pō tim cō prišla wontapliwośc na sercō jich* (158a5), *nadchneliśmi dūchem našim w sercō twojej matk'ī* (248b4). Тыповым для беларускай мовы і "*пальчызны крэсовай*" з'яўляецца назоўнік *perło* (перл) у форме ніякага роду: *winōśice ź negō ozdōbi ōchōndōstwa kamene perlō nōśice tō na sōbe* (208a8).

Зусім рэдка ў тэксце тэфсіра сустракаюцца арабізмы на *-e*, якія можна тлумачыць як назоўнікі ніякага роду: *bōže ūčin ōtō te mek'k'e*[210] *mestem pōkōju* (18a6), *či-ne-widzą tō że zapewne mī ūčiniliśmi k'e'ebe*[211] *chramem našim spōkōjnim* (326a3). З дадзенага сінтаксічнага кантэксту не вынікае з усёй яснасцю, ці сапраўды прыведзеныя прыклады функцыянуюць як назоўнікі ніякага роду. У наступным арабізме *qibla* = кірунак малітвы (у арабскай мове жаночага роду) з кантэксту робіцца зразумелым, што ён функцыянуе як назоўнік ніякага роду: *ne-činilem kible tōbe ktōre bilō īm* (20a3).

12.2.5. Творны склон адзіночнага ліку ніякага роду

У польскай мове ў назоўніках ніякага роду ў творным склоне адзіночнага ліку яшчэ да пачатку пісьмовай традыцыі пры ўсіх асновах усталяваўся канчатак *-em*[212].

У тэксце тэфсіра побач з польскім канчаткам *-em* мы знаходзім яшчэ як марфалагічную інтэрферэнцыю беларускі канчатак *-om*, а пад уплывам аканя *-am*.

---

[208] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

[209] Гл. >>> 10.11. Змена /e/ > /o/ ў канцы слова.

[210] Ар. *Makka* = Мекка. *Makka*, чый канчатак *-a(tun)* пры перайманні польскай мовай паказваецца як *-e*, у арабскай мове жаночага роду. Але звычайна арабскія назоўнікі жаночага роду на *-a(tun)* у польскай мове залічваюць да назоўнікаў мужчынскага роду, таму што яны прымаюць канчаткі *-et'* альбо *-ej*. Гл. 12.1.1. Назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду. Але гэты канчатак можна таксама тлумачыць як жаночы канчатак *-ę* > *-e*.

[211] Ар. *ka'ba* = Кааба. Звычайна арабскі назоўнік жаночага роду *ka'ba(tun)* пераймаецца польскай мовай як назоўнік мужчынскага роду з канчаткам *-ej* – *kie'bej*.

[212] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 303 f.; Strutyński (1993), p. 97 f.

У тэксце тэфсіра пры цвёрдых і мяккіх асновах выразна дамінуе польскі канчатак *-em*: *prišedl wam pōsōl prōrōk s-prawdziwim pišmem ōd bōga wašegō* (80b7), *ōn zapewne mne naprōwadzi direktōrśk'im slōwem {lā ilāha illā llāh}*[213] *i wčinil te slōwa slōwam wečnim i wekū'istim* (402b1), *preprawadziliśmi sinōw izrajelśk'ich mōrem* (168b1), *ōn jest ktōrij učinil slōnca świátlōścą palajōncą ā meśōnc ōświecenem mnejšim* (160a5). У назоўніках з *n*-асновай спарадычна паказваюцца формы без пашырэння асновы, як, напр., у назоўніку *imię* (імя): *pōtim jich kriknī imem mōjim* (35b6). Прыцягвае ўвагу спосаб напісання канчатка *-em* з папярэдняй графемай *yā'* = *j* у наступным прыкладзе *oblicze* (аблічча) з гістарычна мяккім */č/* у канцы асновы: *padaj ōbličjem dō źemī* (44a3).

Паралельна сустракаецца, значна радзей, чым канчатак *-em*, канчатак *-om*, які пранік з беларускай мовы: *ne-pōsilami prōrōkōw tilkō świástūjōnc rajem ā strašōnc peklōm* (236a3), *bōże mōj prōwadz me prōwadzenōm prawdziwim dō medinejū*[214] *i wiprōwadz mne prōwadzenjōm*[215] *prawdziwim dō k'e'ebeju*[216] (227a6), *wolal bōga swegō wolanjōm milčōncim* (240b5), *mī drūgij raz ne-pōwstanemi stworenjōm nōwim* (224a6), *ōni bili ū nemaźech*[217] *swojich z-bōjaźną bōžą i z-gōtōwim sercōm* (272a3).

Пад уплывам акання сустракаецца таксама канчатак *-am*: *ne-lūbi pan bōg jawnegō grechū žebišce ōbmawali kōgō zlim slōwam* (78b4), *prišli ōni ź welk'im neprijacelstwam* (385b8), *wibralem cebe nad lūdzī prōrōčenstwam rōzmōwnim referendarstwom* (129b8), *wiprōwadzil was z-źemi wašij ōtō tak'im čarōdzejstwam* (295a6).

У дачыненні да дыстрыбуцыі трох канчаткаў, *-em*, *-om* і *-am*, нельга вызначыць устойлівага правіла. Часцей за ўсё сустракаецца польскі канчатак *-em*. Беларускі канчатак *-om* сустракаецца радзей і, здаецца, пераважна сустракаецца пры мяккіх асновах і ў аддзеяслоўных імёнах, утвораных з дапамогай **-ьj-*[218]. Побач з гэтым беларускі канчатак *-am* асабліва часта з'яўляецца ў назоўніках ніякага роду на *-stwo*.

Як рэфлекс моцнай тэндэнцыі да звужэння галосных перад насавымі[219] можна зразумець канчатак *-im* || *-ym* (*-ém*). Ён сустракаецца ў тэксце тэфсіра вельмі рэдка: *ābō jich trimac w prijaźni ālbō ōdprawce z-dōbrim jej* (30b5), *jakō pōdōbenstwa pastira z-bidlim* (22b8).

---

[213] "Няма бога, акрамя Алага" (ісламская веравызнаўчая формула).

[214] Ар. *Madīna* = Медына.

[215] Спосабы напісання праз *yā'* = *j* з'яўляюцца характэрнымі для аддзеяслоўных імёнаў (у тым ліку ў твор. скл. адз. л.).

[216] Ар. *ka'ba* = Кааба.

[217] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[218] Наадварот, ва ўсім тэксце тэфсіра няма прыкладу канчатка *-im*, які ўжываўся ў назоўніках ніякага роду, утвораных з дапамогай дэрывацыйнага суфікса **-ьj*. Гл. Klemensiewicz (1965), p. 303: "Z bardzo nielicznymi wyjątkami jest końcówka *-im* w powszechnym użyciu do końca XV w. W ciągu wieku XVI pod wyrównawczym wpływem N innych rzeczowników nijakich zaczyna się *-em* mieszać z ich końcówką zrazu rzadko, około połowy stulecia coraz częściej, ku jego schyłkowi uchodzi już za archaizm".

[219] Гл. >>> 10.7.3. Змена *iM* > *eM*; параўн. >>> 10.4.2. Закрыты галосны */é/*.

12.2.6. Месны склон адзіночнага ліку ніякага роду

У месным склоне адзіночнага ліку ніякага роду сустракаюцца два канчаткі: *-'e* (< **-ě*) і *-u* (з назоўнікаў з *u*-асновай). Абодва канчаткі камплементарна ўжываюцца ў сучаснай польскай мове: канчатак *-'e* з'яўляецца пры цвёрдых асновах, а канчатак *-u* – пры мяккіх, гістарычна мяккіх і асновах на велярныя */k, g, ch/*[220].

У сваёй сучаснай дыстрыбуцыі абодва гэтыя канчаткі, *-'e* (< **-ě*) і *-u*, ужываюцца таксама ў тэксце тэфсіра. Канчатак *-'e* (< **-ě*) выступае пры цвёрдых асновах і змякчае цвёрдае заканчэнне асновы: *sprečajōn-śe ō piśme bōžim korānu bez žadnegō dōwodū* (385b8), *ne tajnō jemū žadna reč w źemi initež w nebe* (40a4), *pewne ja bōjen-śe że dōtkne cebe menka ōd bōga bō te bendzeš šetanū w pekle prijacelem* (243b3), *pewne mī widzemi cebe w welk'em glūpstwe* (123a2). Вартым увагі ў наступным прыкладзе з'яўляецца слова *piekło* (пекла) з асіміляваным спосабам напісання */k/* праз мяккую графему *kāf = k'*, якой непасрэдна пазначаецца змякчэнне */ł/ > /l'/* перад канчаткам *-'e*: *pewne mają bic w pek'le na wek'i* (449b3).

Часам у канчатку *-'e* таксама сустракаецца аканне: *ā tō dla tegō žebi ne-prišli zle prigōdī pregnene praci frasūnk'i trūdnōści i glōdī na drōdze bōžžej na gaźejstwa*[221] (158b4).

Канчатак *-u* звычайна ўжываецца ў тэксце тэфсіра пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах: *ōtō tak'ī właśne plati bendzem placic w rōwnawanū bōga* (255a2), *zōstaną w zadziwenū rōzūmōw bezrōzūmne blendne* (258b8), *nemaš nic w sercū jich tilkō picha gardōšc* (387b5), *rōzūmeją ōni że mi zapewne ne-slišemi tajemnic jich jak w tilū*[222] *radzilī-śe jedin z-drūgim ō zabicjū* (405b1), *ne-majōn-śe bic z-was ōraz w pōlū tilkō w mūrach w ścanach i w fortecach* (449a6), *ktō ne-bendze slūchał pō tak'em prikezanū bō tō jest dla negō menka serca pâlōnca* (95b4), *ne-zacmeli-śe ōči muchemmedowe bō ōči dūchōwne bilī i ne-mōgli w widzenjū blōndzic* (432a1), *chelalem*[223] *jest' wam ćwernōge bidlenta na źemi i w mōrū* (82a2).

У тэксце тэфсіра няма слядоў старапольскага канчатка *-i* назоўнікаў з *jo*-асновай, якія сустракаліся ў агульнапольскай мове яшчэ да XVI ст., напр. *na morzy*[224].

---

[220] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 304 f.; Strutyński (1993), p. 98 f.

[221] Гл. >>> 3.1.1. Арабізм "*ġāzī*" (змагар за веру).

[222] Тут варта звярнуць увагу на месны склон адз. л. м. р. на *-u: w tylu* замест *w tyle*.

[223] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[224] Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 304; Strutyński (1993), p. 99: "W zabytkach XIV i XV w. trafiają się też odziedziczone formy rzeczowników dawnych tematów na -jo- z końcówką -i, np.: na morzy, w narodzeni, w pisani, w umęczeni. Rzeczowniki te od XVI w. mają również końcówkę -u, np.: na morzu, w narodzeniu itd".

12.2.7. Назоўны (клічны) склон множнага ліку ніякага роду

У польскай мове дагэтуль захаваўся канчатак *-a*, атрыманы ў спадчыну з праславянскай мовы[225].

Канчатак *-a* з'яўляецца звычайным канчаткам назоўнага склону множнага ліку таксама ў тэксце тэфсіра. Гэты канчатак, як правіла, запісваецца *scriptio plena* праз *alif* + *fatḥa* = *a*: *jūž ci ne ūwerą chōcbi prišli wšitk'ī pišma bōžže i cūda* (169a3), *bōžže są imōna nalepša wziwajce gō i mōdlce-še prez-nich* (134b5), *ne-są ōni tilkō jakō bidlenta* (291a4).

У назоўніках *ucho* (вуха) і *oko* (вока) былыя формы парнага ліку[226] перанялі функцыю множнага ліку. Гэтыя формы паказваюць у назоўным склоне парнага ліку гукавую змену велярных */k, ch/ > /č, š/* паводле 1-й палаталізацыі: *bendą śwjádčic ūši jich i ōči jich i skūri jich tō cō bili činōncimi* (392a2).

Побач з гэтым спарадычна з'яўляецца канчатак *-y* || *-i*, які пранік з беларускай мовы[227]: *ztwardzili-še serci waši* (12b1), *zebralō še dō śulujmâna*[228] *wojśk'i jegō z-ferejōw*[229] *i ź lūdzī i s-ptastwa* (303b7), *reče ūchōdzce u wrōte pek'elne na wek'i tam zōstanece aj jak'e źle mejsci gardim newernim* (382a2).

12.2.8. Родны склон множнага ліку ніякага роду

У польскай мове ў назоўніках ніякага роду з даўніх часоў з'яўляецца родны склон множнага ліку без канчатка, які ўзнік пасля выпадзення канцавых рэдукаваных галосных[230].

У тэксце тэфсіра ў родным склоне множнага ліку ніякага роду пануе нулявы канчатак: *ōdstąpilī [od] was w dzen pōtkane wojsk našich i k'afiršk'ich*[231] (54b4), *ješlibi bilō mōre čarnilōm dla pisane slōw bōžich* (240a7), *rek'i są z-win barzō smačnich* (416a8), *zabawil-še medzi nimi tišōnc lat tilkō ōprōč pencūdzešōnt rōkōw* (320b6), *nimaš žadnich źwerōnt na źemi āni ptakōw latajōncich na dwuch skridlach tilkō mają īmama*[232] *pōwodira* (102a8), *i s-tich bidlōnt i źwerōnt ima jich zebrac w jedne mejsce k'edi bendze chcal* (398b3), *čemū ōni ne-klanajōn-še bōgū ktōrij cō wprōwadza ź ničegō dežğ i śneg ź nebōs* (304b4).

Родны склон множнага ліку на *-ej*[233] з'яўляецца ў назоўніках з мяккімі і гістарычна мяккімі асновамі, напр. у назоўніку *dziecko* (дзіця): *ne-jest ōtō ten*

---

[225] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 305; Strutyński (1993), p. 99.

[226] Гл. Bräuer (1969), Bd. 3, p. 54.

[227] У беларускай мове назоўнікі ніякага роду наогул прынялі канчатак *-y* || *-i* ў назоўным, вінавальным, клічным склонах множнага ліку паводле ўзору жаночага і мужчынскага роду. Параўн. Bräuer (1969), Bd. 2, p. 67.

[228] Ар. *Sulaymān* = Саламон.

[229] Перс. *perī* = добры дух, анёл, фея, звышнатуральная крылатая істота.

[230] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 305–306; Strutyński (1993), p. 99–100.

[231] Ар. *kāfir* = нявернік.

[232] Ар. *imām* = той, хто моліцца наперадзе; кіраўнік.

[233] Параўн. >>> 12.1.9. Родны склон мужчынскага роду.

dōčasnij śwját tilkō ōšukanina igriska malich dzecej (325b8). Такім самым чынам ужываецца канчатак *-ej* у словах *ucho* (вуха) і *oko* (вока), калі адсутнічае парнае значэнне: *ne-kriliśce-śe ōd śwjádčōncich na was ūšōj*[234] *wašich ānitež ōčej wašich ānitež skūr wašich* (392a5). Паралельна ў назоўніках *ucho* і *oko* пры парным значэнні з'яўляецца родны склон парнага ліку: *ne ōddalaj ōčū swōjich ōd nich* (233a4). Пры метафарычным ужыванні, наадварот, з'яўляецца родны склон множнага ліку без канчатка *ok* (тут у значэнні "крыніца"): *pretō wiplinelō ōtworilō śe ź negō dwanaśce ōk žrōdel* (132a7)[235].

Толькі як рэдкае выключэнне ў тэксце тэфсіра ў родным склоне множнага ліку ніякага роду выкарыстоўваецца канчатак *-ów*, спарадычнае ўжыванне якога ў польскай мове адзначаецца з XVI па XVIII ст.[236]: *ktō śe bal dzecow* (24a4), *ōtō w tim korāne ze-wšitk'ich pōdōbenstwow* (332a4), *ōdzejōn-śe w nim ōd manelōw ōd zlōta ōd perlow* (266b1). Аднак у іншым месцы сустракаецца назоўнік *perło* (жамчужына)[237] у родным склоне множнага ліку з нулявым канчаткам: *ōd manelej ze-zlōta i ōd perl* (357a1).

Вартым увагі, асабліва на фоне беларускага субстрату, з'яўляецца рэдкае ўжыванне канчатка *-ów* у ніякім родзе. У беларускай мове канчатак *-ov* (*-оў* і *-аў*) стаў прадуктыўным ва ўсіх родах, у тым ліку ў ніякім. Нулявы канчатак з'яўляецца звычайным толькі ў абмежаванай колькасці назоўнікаў ніякага роду, у якіх сёння існуюць паралельныя формы з нулявым канчаткам побач з рэгулярным канчаткам *-ov* (*-оў* і *-аў*)[238].

12.2.9. Давальны склон множнага ліку ніякага роду

Канчатак *-om* назоўнікаў з *o*-асновай з'яўляецца канчаткам давальнага склону множнага ліку, атрыманым у спадчыну з праславянскай мовы. Ён даволі рана выцесніў канчатак *-em* з мяккіх асноў і распаўсюдзіўся таксама на ўсе іншыя асновы. З XV ст. у ніякім родзе стаў прадуктыўным таксама канчатак *-am* назоўнікаў з жаночай *a*-асновай. Яны шырока распаўсюдзіліся ў канцы XV і на пачатку XVI ст. Аднак ужо ў канцы XVI ст. ён быў цалкам выцеснены першапачатковым канчаткам *-om* назоўнікаў з *o*-асновай[239].

---

[234] Канчатак *-oj* тут трэба разглядаць як гіперкарэкцыю ў сувязі з аканнем альбо як арфаграфічную памылку. Таксама вельмі верагодна, што наступны прыклад канчатка *-aj* у аддзеяслоўным назоўніку *karanie* з-за яго адзінкавасці трэба расцэньваць як арфаграфічную памылку: *ne-bendą mōci mec ōbrazi balwani žebi tō ratōwac samich śebe ōd karanaj našich* (259a4).

[235] Назоўнік *oko* тут з'яўляецца як пераклад арабскага *'ayn* = вока, крыніца.

[236] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 306: "Od XVI do XVIII w. trafia się sporadycznie zapożyczona z deklinacji męskiej końcówka -ów". Параўн. Strutyński (1993), p. 100.

[237] У тэксце тэфсіра гэты назоўнік з'яўляецца ў ніякім родзе (*perło*), а не ў жаночым, што тыпова для "*пальчыкзны крэсовай*" і беларускай мовы.

[238] Параўн. Mayo (1976), p. 22; Rott-Żebrowski (1992), p. 97.

[239] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 306; Strutyński (1993), p. 100 f.

У тэксце тэфсіра мы пастаянна знаходзім канчатак *-am* з жаночых *a*-асноў: *prikaže jim prikezane abī rōzrezali ūši bidlentam* (75a6), *ktō mōcen dac slūch ūšam i widzenja ōčam* (163a6), *pōdōbnō serce īch sercam tich* (17b1).

У наступным прыкладзе чыста графічны варыянт < *-em* > са *scriptio defectiva* галоснага /*a*/ толькі праз *fatḥa* = *e* трэба таксама тлумачыць як канчатак *-am*: *takōwi lūdze te ktōre ne werili cūdem i kōranū bōžžemū* (240a2).

Распаўсюджванне канчатка *-am* у ніякім родзе ў тэксце тэфсіра можна зразумець як уздзеянне беларускага субстрату, дзе канчатак *-am* з жаночага *a*-скланення перамог ва ўсіх родах. Наадварот, у польскай літаратурнай мове ўжо на мяжы XVII і XVIII стст. канчатак *-am* у давальным склоне множнага ліку з'яўляўся архаічным.

12.2.10. Вінавальны склон множнага ліку ніякага роду

Формы вінавальнага склону множнага ліку ў ніякім родзе аднолькавыя з формамі назоўнага склону множнага ліку.

У тэксце тэфсіра пераважна сустракаецца рэгулярны польскі канчатак *-a*, атрыманы ў спадчыну з праславянскай мовы: *pōnūrili-še w słōwą inše nekoranne ōd šebe zmišlōne* (77b5), *pōtim zeslal pan bōg šešc tišencej ānjōlōw na pōmōc prōrōku i werōncim muślemanōm i zeslal wojska newidōme* (147a8), *ten jest bōgem ktōrij pōdnōsl i pōstanōwil nebōsa bez žadnegō filarū* (191b8).

Нярэдка канчатак *-a* запісваецца *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*: *mōw zdrōwe słōwe dō bōga prōšōnc* (406a2)[240].

У сувязі з аканнем, якое ў тэксце тэфсіра праяўляецца вельмі моцна, часта немагчыма вырашыць, ці сапраўды пад канчаткам *-a* разумеецца канчатак множнага ліку альбо ў яго аснове ляжаць канчаткі *-o*, *-e* або *-ę* адзіночнга ліку: *ā k'edī ōbačiš īch i muchemmedu zadziwiš-še patrōnc na cala jich* (455a7). У дадзеным прыкладзе на базе арабскага тэксту належыць дапусціць множны лік, таму што слова *ciała* з'яўляецца польскім адпаведнікам арабскага множнага ліку *aǧsām* (адзіночны лік *ǧism* = цела).

У назоўніку *oko* (вока) зноў з'яўляюцца формы парнага ліку: *ōčerōwali ōči lūdzem i welk'ij strach zadali jim* (127a7)[241]. Таксама мы знаходзім як выключэнне парны лік слова *lato* (год, лета): *nech karmą dzatk'ī jich dwe lece* (31a4).

Побач з польскім канчаткам *-a* ў вінавальным склоне, як і ў назоўным, спарадычна з'яўляецца беларускі канчатак *-y* || *-i*, які ў беларускай мове ўзнікае ў ніякім родзе па аналогіі з мужчынскім і жаночым родамі: *ūkaram te masti*

---

[240] За напісаннем *słōwe* можа хавацца множны лік *słowa*, а таксама адзіночны лік *słowo*, бо канцавы /*-o*/ пад уплывам акання можа перайсці ў /*-a*/, які тады нярэдка запісваецца *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*. У такіх выпадках часта нельга адназначна вырашыць, ужыты множны лік ці адзіночны, тым больш калі формы прыметніка ніякага роду ў вінавальным склоне множнага і адзіночнага ліку гучаць аднолькава.

[241] Параўн. >>> 12.2.7. Назоўны (клічны) склон множнага ліку ніякага роду.

i wśī keranjōm twardim (225a3), *i ne-'ūčinil pan bōg w jednim člōweku dwa serci* (338b7). Аднак у цэлым беларускі канчатак *-y* || *-i* сустракаецца вельмі рэдка.

Катэгорыя адушаўлёнасці праяўляецца праз ужыванне формаў родна-вінавальнага склону: *mōw ti pridzece prizōwmī dzeci našich i dzecej wašich i newast našich i newast wašich i dūši naši i dūši waši* (45b4). Тут зноў з'яўляецца характэрным ваганне ва ўжыванні канчаткаў родна-вінавальнага склону *-i* (*-y*) і *-ej* у блізкім кантэксце.

12.2.11. Творны склон множнага ліку ніякага роду

Канчатак *-ami* з жаночага *a*-скланення з сярэдзіны XVI ст. стаў прадуктыўным таксама ў ніякім родзе і з пачатку XVII ст. выцясняў два першапачатковыя канчаткі творнага склону множнага ліку ніякага роду, *-y* і *-mi*, так што яны далей толькі ў асобных выпадках сустракаліся як архаічныя формы[242].

Канчатак *-ami* дамінуе таксама ў тэксце тэфсіра: *pewne ja prišedlem dō was s-cūdami ōd bōga wašegō* (44b3), *prōrōk wziwal zlimi slōwami na ōdwrōt ābišce pōšilkōwali preklōl was zlimi slōwami* (54a4).

Побач з гэтым спарадычна яшчэ сустракаецца першапачатковы канчатак творнага склону множнага ліку *-y* назоўнікаў з *o*-асновамі: *zecisneliśmi lūd fera'ūnōw*[243] *latī zlimi ne'ūrōdzajnimi i ūmnejšelī z-'ōwocōw* (128a6), *činil medzi dwoma mōrī granico* (307b4), *mōwiliśce tō ūsti wašimi* (280b1).

Пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах часам таксама знаходзіцца канчатак *-mi*: *chce pan bōg žebi ūkaral jich tim skarbem i dzecmi w tim dōžiwotnim świece* (150b8).

У назвах парных частак цела часта з'яўляецца канчатак *-ima* (*-yma*) з парнага ліку, як, напр., у назоўніку *oko* (вока): *pânni rajśk'e bjále z-jasnimi ōčima wlašne tak ōni jakō najlepše strūsōwe* (365b1).

12.2.12. Месны склон множнага ліку ніякага роду

Да сярэдзіны XVI ст. у польскай мове ў месным склоне множнага ліку ніякага роду дамінаваў першапачатковы канчатак *-'ech* (< * *-ěch*, **-'ch*) назоўнікаў з *o*-асновай альбо з кансанантнымі асновамі. Побач з гэтым з XIV па XVI ст., і перш за ўсё ў малапольскіх моўных помніках, ужываўся канчатак *-och*. На працягу XVI ст. у ніякім родзе ўсё больш прадуктыўным станавіўся канчатак *-ach* з жаночага *a*-скланення, і з XVII ст. ён цалкам выцесніў іншыя канчаткі[244].

У тэксце тэфсіра ў месным склоне ніякага роду пануе канчатак *-ach*: *jeśli zatajice miśli waši te cō w sercach wašich ālbō ōbjawice we tō wšitkō pan bōg i we tō cō w nebōsach i tō cō w źemi* (42b6), *ōbačiš tich ktōre w sercach jich mają chōrōbe*

---

[242] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 307; Strutyński (1993), p. 101.

[243] Ар. *fir'awn* = фараон.

[244] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 307; Strutyński (1993), p. 101 f.

(417a2), *wčiniliśmi w pōtōmstwach jich nektōrich prōrōkami* (444a2), *sprečace w īmōnach bōgōw swīch nazwališce īch sōdad*[245] *semūrheba*[246] (123b2).

Толькі як выключэнне з'яўляецца канчатак *-'ech* (< * *-ěch*, *-'ch*), які змякчае цвёрдую канцоўку асновы: *pri' ōzdōbil šetan lūdzem [...] kōchane [...] w stadach jeżdnich i w bidlencech i w welk'ich pašnach* (41a3).

Прыклады малапольскага канчатка *-och* у тэксце тэфсіра адсутнічаюць.

12.3. Скланенне назоўнікаў жаночага роду

12.3.1. Назоўны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У назоўніках жаночага роду дагэтуль захаваўся стараславянскі канчатак *-a* назоўнікаў з *a*-асновай. Гэты канчатак выступае ў старапольскай мове ў мяккіх асновах у двух колькасных варыянтах: кароткі *-a* альбо доўгі *-ā*. З XVI па XVIII ст. як рэфлекс старапольскага доўгага галоснага /*ā*/ выступае закрыты /*á*/, у тым ліку ў канчатку *-á*[247].

У тэксце тэфсіра ў назоўніках жаночага роду сустракаецца выключна канчатак *-a*. Ад канчатка *-á* з закрытай артыкуляцыяй, наадварот, не засталося ніякага следу: *dla nich jest menka ūstawična* (88a1), *w sercach jich jest dwulična newerna chōrōba* (159a5), *cūdzōlōžnica newasta nech šlūbu ne-bere tilkō cūdzōlōžnika menžčiźna ālbō newernich pōgan* (279a8).

Канчатак *-a* часта запісваецца *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e* і з'яўляецца ў транслітарацыі як *-e*: *ci ktōre ne werą korānu i ājet'ōm*[248] *bōžim dla nich jest menke twarda* (40a2), *zeslališmi t'ewrīt'*[249] *w nim jest prawdziwa drōge dō bōga i jest świątlōšcą blendnim* (89a2), *ci ktō īman*[250] *ne-prijenli na ūši jich glūchōte* (394a7), *drōge jest prawdziwa* (417a8).

Як назоўнікі жаночага роду скланяюцца назоўнікі мужчынскага роду на *-a*: *bō ōn jest pōważnij krōl wladca mōndrij sendza nad sendzami* (197b4), *pewne pan bōg świentij mōndrij sendza* (152b8), *bō pewne pan bōg wam priwodca kū dōbremū milōserdnij* (441b6). Тут таксама сустракаецца *scriptio defectiva* з *fatḥa* = *e*: *pan bōg jest świentij sendze mōndrij* (88a3).

12.3.2. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У цвёрдых асновах у польскай мове дагэтуль захаваўся атрыманы ў спадчыну з праславянскай мовы канчатак *-y* || *-i*. Да канца XVII ст. пры мяккіх асновах атрыманы ў спадчыну канчатак *-e* сустракаецца паралельна канчатку *-ej* (*-éj*),

---

[245] *Sodād* = старажытнае ўсходняе боства.

[246] *Samūrhabā* = старажытнае ўсходняе боства.

[247] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 287; Strutyński (1993), p. 103.

[248] Ар. *āya* = верш Карана, знак, цуд.

[249] Ар. *tawrā* = Тора.

[250] Ар. *īmān* = вера.

Табліца 12.3

Скланенне назоўнікаў жаночага роду

Склон	Адзіночны лік	Множны лік
Наз.	**-a** (*-a*) **-e** (<*-a*) (графічны варыянт)	**-i** (*-i* || *-y*) (цвёрдая) **-e** (*-e*) (мяккая; гістарычна мяккая) **-i** (*-y*) (гістарычна мяккая) (бел.) **-'e** (< **-ě*) (рэшткі парн. л. *ręce*)
Род.	**-i** (*-y* || *-i*) (цвёрдая) **-i** (*-i* || *-y*) (мяккая; гістарычна мяккая) **-e** (архаічная; адзінкавыя выпадкі)	**-Ø** (нулявы) **-ow** (*-ów, -ov*) (адзінкавыя выпадкі) **-ej** (*-ej*) (мяккая; гістарычна мяккая) (адзінкавыя выпадкі) **-i** (*-i*) (мяккая) (запазычанні) (рэдка)
Дав.	**-'e** (< **-ě*) (цвёрдая) **-i** (*-i* || *-y*) (мяккая; гістарычна мяккая) **-i** (*-y*) (назоўнікі на *-ra*) (бел.) (сістэматычна)	**-am** (*-am*) (мяккая; гістарычна мяккая) (дамінуе) **-em** (*-em*) (графічна-фанетычныя варыянты) **-om** (*-om*) (ужо вельмі прадуктыўны)
Він.	**-e** (<*-ę*) **-a** (< *-e,* <*-ę*) (тыпова для крэсаў) **-ą** (*-ą*) (мяккая) (*-ą*) (таксама цвёрдая; тыпова для крэсаў) **-o** (<*-ą*) (дэназалізаваны) **-u** (*-u*) (адзінкавыя выпадкі) (бел.)	**-i** (*-y* || *-i*) (цвёрдая) **-e** (*-e*) (мяккая) **-'e** (< **-ě*) (Рэшткі парн. л.: *ręce*) **-i** (*-y*) (гістарычна мяккая) (бел.) він. = род. (адушаўлёныя наз. ж. р.) (бел.)
Твор.	**-ą** (*-ą*) (цвёрдая; мяккая) **-o** (*-ą*) (дэназалізаваны) **-om** (*-ą*) (вялікапольск. артыкуляцыя) **-oju** || **-eju** (арх.; адзінкавыя выпадкі) (бел.)	**-ami** (*-ami*) (цвёрдая; мяккая) (рэгулярна) **-oma** (*-oma*) (парн. л.; рэшткі: *rękoma*) **-i** (*-y* || *-i*) (архаізм) (рэдка)
Месн.	**-'e** (< **-ě*) (цвёрдая) **-'a** (*-'e*) (аканне) (адзінкавыя выпадкі) **-i** (*-i* || *-y*) (мяккая; гістарычна мяккая) **-i** (*-y*) (наз. на *-ra* !) (бел.) (сістэматычна)	**-ach** (*-ach*) (цвёрдая; мяккая) **-ech** (*-ech*) (граф.-фанет. варыянты) **-'ech** (< **-ěch*) (рэдка) **-u** (парн. л.; рэшткі: *w ręku*)
Клічны	**-a** (*-a*) (клічны = наз.)	клічны = наз.

перанятаму са скланення поўных прыметнікаў. Толькі з канца XVII ст. пры мяккіх асновах таксама ўсталёўваецца канчатак *-i* || *-y*, запазычаны з назоўнікаў з *i*-асноў[251].

У тэксце тэфсіра пры цвёрдых асновах усюды з'яўляецца канчатак *-y* || *-i*. Пры мяккіх асновах сустракаецца, амаль перамагаючы, сучасны канчатак *-i* || *-y*. Можна знайсці толькі зусім рэдкія прыклады канчатка *-e*. Ад канчатка *-ej* (альбо варыянта з *é pochylone -éj*) не засталося ніякага следу. Гэта перш за ўсё павінна было быць абумоўлена беларускім субстратам. У беларускай мове пры мяккіх асновах раней, чым у польскай мове, перамог канчатак *-i* || *-y* паводле ўзору цвёрдых і кансанантных асноў[252]: *s-kōnt ma bic jemū sīn bō ne-bilō ū negō towarišk'ī gōspōdīnī* (109a6), *dirigūje kōgō chce dō drōgi prawdziwij* (162b5), *k'edī zachōdzilō približalō še dō nich ź lewej strōni pečarī* (231b3), *i wešli ź nim dō tūrmī dwa mlōdzenci* (184a8), *rekl ten ktōrij gō kūpil ketgīr*[253] *z āgiptū dō žōnī swojej šanūj i mejsce dōbre daj āzali že bendzem pōžitek mec ź negō* (182b7), *rekl ibrahīm*[254] *ne-traca nadzeji ōd lask'ī bōžžij* (205b1), *stworiliśmi člōweke ōd sūchej glinī źemī z-čarnej negō ūfōrmōwalem* (204a3), *pōklōnce-še dō źemi pretō pōklōnili-še ānjōlōwe wšistk'ī* (204a6), *ten bōg tak'ij ktōrij ūtworil was z-dūši jednej ādamōwij bō učinil s-tej-ž dūši žōne jegō chawá*[255] (135b2), *ne-jest ten korān pricōngač mōcą tilkō napōminač ōd tworci śwjátū* (191a2), *pewne pōdōbenstwa 'ejśī*[256] *u mōci bōžžej jakō pōdōbenstwa ādamu stworil gō s-paskū ź źemī ā pōtim rekl na tō stan člōwek'em i stal-še bez ōjca* (45b2), *ānjōlōwe jim bendą mōwic dziś nemaš wam śemenči*[257] (289b3).

Арабізм *ṣadaqa* (міласціна), назоўнік жаночага роду, як правіла, у тэксце тэфсіра з'яўляецца як *sedeke / sedaka* і функцыянуе як жаночы род, што стварае выключэнне пры запазычванні арабскіх назоўнікаў жаночага роду, якія звычайна пераходзяць у мужчынскі род. У род. скл. адз. л. рэгулярна з'яўляецца канчатак *-i* са змякчаным спосабам напісання канцавога зычнага */k'/* праз графему *kāf* = *k'*: *ci ktōre w zajzrōšci ōbmawają zawočne šč̄ōdrōbliwich datnikōw muśulman w dawanū hōjnej sedak'ī i dześencini i ci ktōre ne-najdūją na ōfara tilkō wibrawši pōdle rečī i naśmewajōn-še ź nich ōd šidzi* (153b5).

---

[251] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 288; Strutyński (1993), p. 104.

[252] Гл. Янкоўскі (1989), с. 163–164: "Назоўнікі мяккай разнавіднасці мелі канчатак *-ѣ*. Гэты галосны ў пераважнай большасці выпадкаў супаў у беларускай мове з *э(е)*, але не ў форме, якую разглядаем; пад уплывам назоўнікаў цвёрдай разнавіднасці (*галавы, травы, славы, мамы*) і назоўнікаў з асноў на заднеязычныя (*рукы – рукі*) назоўнікі з асноваю на мяккі зычны атрымалі нефанетычным шляхам канчатак *-і*, а пасля зацвярдзення зычных (шыпячых, *ц* і *р*) – *-ы*: *пѣснь → песні, роль ѣ → ралі, межѣ → мяжы, бурѣ → буры, молодицѣ → маладзіцы*.

[253] Ар. *Qaṭgīr* = Катгір (імя ўласнае).

[254] Ар. *Ibrāhīm* = Абрагам.

[255] Ар. *Ḥawā'* = Ева.

[256] Ар. *'Īsa* = Ісус.

[257] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

Тыповым у запазычаных словах (лацінізмах і інш.) на *-yja* выступае канчатак *-e*: *ne-jest ten korãn tilkō čarōdzejstwo zebranō z-histōrije perších spisanij* (474b1), *nemaš wiktōrije tilkō ōd pana bōga świentegō ūważnegō mōndregō krōla* (51b7). У якасці доказу ўжывання канчатка *-e* ў родным склоне адзіночнага ліку можна яшчэ прывесці наступны прыклад: *ōd tegō stworicela źeme i nebōs wisōk'ich* (247a6). Наадварот, наступную адзінкавую форму з канчаткам *-e* пры цвёрдай аснове, верагодна, належыць расцэньваць як арфаграфічную памылку: *ōtō te wirší kśenge welk'ej lewch al-mechfūẓ*[258] (181a6). Наогул канчатак *-e* ў родным склоне адзіночнага ліку жаночага роду сустракаецца ў тэксце тэфсіра толькі спарадычна.

12.3.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У польскай мове ў назоўніках давальнага склону адзіночнага ліку жаночага роду працягваюць ужывацца праславянскія канчаткі. Канчатак *-'e* (< * *-ě*) з'яўляецца ў цвёрдых асновах і змякчае канцавы цвёрды зычны. У мяккіх і гістарычна мяккіх асновах з'яўляецца канчатак *-i* || *-y*. Паралельна гэтаму ў мяккіх асновах да канца XVII ст. ужываўся канчатак *-ej* (*-éj*), які паходзіць са скланення поўных прыметнікаў[259].

У тэксце тэфсіра ўвогуле выяўляецца звычайная ў польскай мове дыстрыбуцыя канчаткаў *-'e* і *-i* || *-y*. Канчатак *-'e* з'яўляецца пры цвёрдых асновах і змякчае канцавы зычны. Гэтае змякчэнне выразна паказваецца ў арабскім напісанні зычных, для якіх выкарыстоўваюцца парныя графемы: *ī cī ktōre īman*[260] *prijenli jeśli bendzece pōslūšnī grōmadze tej ktōrej daliśmi kśenge ōdwrōcą was pō prijencū īmanū waśegō dō newerenstwa* (49a6), *zlōdzejū neweśce pō' ōcinajce rence īm kerane za tō cō zarōbili grech kradzeżą* (88a2), *żebi-śe ōświecilī ōčī jich kū świetōj strōne* (345a4). У канцы асновы на велярныя */k, g, ch/* у давальным склоне адзіночнага ліку на *-'e* (< *-ě) паказваецца змякчэнне паводле 2-й палаталізацыі: *ā ōcec nic ne-dawši narūcac dzece matce ne-pōwinen* (31a6), *jakō ż mają klamliwim balwanōm werōncimi bic ā lasce i pōżitkōm bōżżim ōni newernimi bic* (213b6), *ā tō gwoli piśe swojej żebi bili na świece welk'im na źemi* (358a3). У апошнім прыкладзе *pycha* > *pysie* (пыха) мы знаходзім палаталізацыю */ch/* > */s'/* паводле беларускага ўзору, у польскай мове гэта прывяло б да змены */ch/* > */š/*[261].

---

[258] Ар. *al-lawḥ al-maḥfūẓ* = "Патаемная скрыжаль" на небе, на якой напісаны спрадвечны Каран. Параўн. >>> 7.2. "*Літоўская метрыка*".

[259] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 289; Strutyński (1993), p. 105.

[260] Ар. *īmān* = вера.

[261] Параўн. Wexler (1977), p. 68. Параўн. Bräuer (1969), Bd. 1, p. 189 f. Трэба, праўда, адзначыць, што абедзве графемы, *šīn* = *ś* і *ṯā'* = *ś*, пры няясным напісанні не заўсёды можна дакладна адрозніваць. У тэксце тэфсіра абедзве гэтыя графемы часта запісваюцца бегла. Параўн. >>> 11.7. Змяшэнне */z'/* з */ž/* і */s'/* з */š/*; гл. таксама >>> 12.3.6. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

Асаблівая з'ява, якая ўзыходзіць да беларускага субстрату, выяўляецца ва ўтварэнні давальнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду на *-ra*. Яны прымаюць, паводле ўзору беларускай мовы, мяккі канчатак *-i* || *-y*, як мяккія і гістарычна мяккія асновы[262]. Разам з гэтым у тэксце тэфсіра ў назоўніках жаночага роду на *-ra* звычайна з'яўляюцца формы, утвораныя паводле беларускага ўзору, такія як *wiary*, у процілегласць польскаму *wierze* (давальны склон польскага *wiara* = *вера*)[263]: *nawrōc-że twarą twoją kū wjárī prawdziwij* (330b2), *werą ōbrazōm balwanōm i meśōncu i gwazdam wenerī*[264] *i dagōnū*[265] *balwanu co-w nim šetan* (67a2).

Пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах выкарыстоўваецца пераважна канчатак *-i* || *-y*: *ne-prišlišmi zle činic tej źemī i ne-bilišmi i ne-jesteśmi zlōdzejami* (188a4).

Пры мяккіх асновах у тэксце тэфсіра нельга знайсці прыкладаў ужывання канчатка *-ej*, запазычанага са скланення прыметнікаў.

12.3.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду

Пры цвёрдых асновах у польскай мове захаваўся першапачатковы канчатак *-ę*. Пры мяккіх асновах да канца XVII ст. паралельна сустракаюцца два канчаткі: *-ę* і *-ą*. Канчатак *-ą* адзначаецца ў тых самых назоўніках, назоўны склон якіх у старапольскай мове канчаўся на доўгі *-ā* і далей, з XVI ст., – на закрыты *-á*[266]. З XVIII ст. канчатак *-ę* усталяваўся таксама пры мяккіх асновах. Наадварот, канчатак *-ą*, асабліва ў запазычаных славах на *-yja* || *-ija*, упарта трымаўся яшчэ на працягу XVIII–XIX стст.[267].

У тэксце тэфсіра канчатак *-ę* з'яўляецца выключна ў сваёй дэназалізаванай форме *-e*, якая запісваецца праз *fatḥa* = *e*: *zsila ź neba wode dežğōwą* (328b1), *ten bōg ktōrij w nabōženstwe laske pōlōžil na was* (344a3), *āni naprōwadzi īch na prawdziwą drōga tilkō na drōge pek'elnō* (80b6), *ōn tō jest ktōrij rōspōstarl źeme i ūčinil w nej gōrī i rek'ī* (192a3).

Арабізм *ṣadaqa* (міласціна) таксама паказвае дэназалізаваны канчатак *-ę* > *-e*, які не змякчае канцавы */k/*: *pewne pōdšed na sedeke dla ūbōgich i žebrakōw* (151a6). На базе арабскага пісьма гэтую форму з тым самым поспехам можна было б прачытаць як *sedeka*, гэта значыць, з пераходам канчатка *-ę* > *-e* > *-a* (гл. ніжэй). У арабізме *manna* (манна) няясна, функцыянуе ён як назоўнік жа-

---

[262] Гл. Bräuer (1969), Bd. 2, p. 116: "У беларускай мове назоўнікі на *-ra* далучаюцца да назоўнікаў, *-ra* якіх ўзыходзіць да *-rja*. Яны запазычылі канчатак давальнага і меснага склонаў адзіночнага ліку *-'i*, які захаваўся ў *ja*-скланенні і пасля зацвярдзення *-r'-* > *-r-* стаў *-y*, напр. род. скл. адз. л. да *гара – гары*, дав., месн. скл. адз. л. – *гары*".

[263] Параўн. >>> 11.4. Фанемы /r/, /ř/ і /ž, š/ (< /ř/).

[264] Польск. *wenera* = планета Венера.

[265] Гл. >>> 2.1.5. Боства "Дагон".

[266] Гл. >>> 10.1. Польская сістэма галосных; 10.5. Насавыя галосныя.

[267] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 289–290; Strutyński (1993), p. 106.

ночага роду ці як ніякага. У наступным прыкладзе на базе арабскага пісьма можна прыняць запісаны праз *fatḥa* = *e* дэназалізаваны канчатак *-ę* > *-e*: *i zeslališmi na was manne i watrem zapendzōne ptašk'i jedzce z-čistich darōw cō ōbdariliśmi was* (251b5).

Дэназалізаваны канчатак *-e* часта падлягае аканню *-e* > *-a*. Узніклы такім чынам канчатак *-a* фармальна супадае з назоўным склонам і з'яўляецца характэрным для польскай мовы паўночных крэсаў[268]: *zapewne slišeliśmi kśenga zeslana pō mōjžešū* (414a8), *pōslal pan bōg wrōna i wikōpala jama w źemi dla ōkazanjâ jemū jak ma zakric calō trūp brata jegō* (87a3), *pōnūrali-śe w wōda dla perla i kōral* (372b3), *chwala bōgū ktōrij zeslal na slūga swegō kśenga korān* (230a7), *wziwac bendzeš na drōga prawdziwą dō īmanū*[269] (236a7).

Канчатак *-ą* звычайна ўжываецца пры мяккіх асновах у запазычаных словах (лацінізмах) на *-yja* || *-ija*[270]: *čitaj jim bele'emową*[271] *histōriją* (134a8), *wkara jich pan bōg renką wašą i zwicenźi īch i da wektōriją wam nad nimi* (145b8), *prirekliśmi dekleraciją našą dō ādama ješčō ābī ne-jadl s-tegō drewa pretō zapōmnal i jadl* (254a6), *prijdze wam ōde mne direkcija prez piśma lūb prez-prōrōk'i ā ktō śe ūda za direkciją mōją pretō ten ne-zblōndzi* (254b7). Канчатак *-ą* часам падлягае дэназалізацыі і тады пераходзіць у *-o*: *ōtrimališce ōd bōga deklaracijō na welnōśc* (13a4), *i meśicha*[272] *'ejśō sina merijeminegō*[273] *mūśinegō*[274] *učinili bōgem* (148a2).

Асабліва прыкметная рыса тэксту тэфсіра заключаецца ў пераносе канчатка *-ą*, тыповага для мяккіх асноў, таксама на цвёрдыя асновы. Канчатак *-ą* нярэдка можна назіраць у вінавальным склоне пры цвёрдых асновах, што з'яўляецца тыповым для польскай мовы ў паўночных крэсах. Канчатак *-ą* пры цвёрдых асновах некаторымі даследчыкамі тлумачыўся як памылка. Але вінавальны склон на *-ą* назоўніка з цвёрдай асновай ужываецца вельмі часта як у матэрыяле, даследаваным Курцовай, так і ў тэксце тэфсіра[275]: *naprōwadzi jich na drōgą prawdziwą* (77b1), *i widzą tō na'ūką* (191a3), *ōtō dziś spelnilem wam wjára waša i spelnilem nad wami laską mōją* (82b7).

---

[268] Гл. Łapicz (1986), p. 170; Kurzowa (1993), p. 175. Канчатак *-a* він. скл. адз. л. тлумачыцца звычайна як *перанос* канчатка наз. скл. адз. л. на він. скл. адз. л. Паколькі *e* насавы ў канцы слова ў іншых марфалагічных катэгорыях таксама вельмі часта падлягае аканню (гл. >>> 10.5.2. Насавы *e* ў канцы слова; 10.9.4. Аканне */e/* > */a/* пасля націску), я аддаю перавагу аканню пры тлумачэнні канчатка *-a* ў він. скл. адз. л. назоўнікаў жаночага роду.

[269] Ар. *īmān* = вера.

[270] Параўн. Kurzowa (1993), p. 174.

[271] Ар. *Bal'am Ibn Ba'ūr(ā)* = Більям б. Беор (гэбр.) (імя ўласнае); гл. **Q**(7:175, 176); гл. артыкул Г. Вайды (G. Vajda) у EI-2.

[272] Ар. *masīḥ* = Месія.

[273] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[274] Ар. *Mūsā* = Майсей.

[275] Kurzowa (1993), p. 175.

Тут часта адбываецца таксама дэназалізацыя канчатка *-ą* > *o*. Гэты канчатак запісваецца без *ṣaġır-ı-nūn* = *ñ* толькі як галосны */o/*. Такі спосаб напісання з'яўляецца тыповым і частым: *i ześle pan bōg laskō swoją świentą* (149a7), *za cenō malą* (58a4), *dami skōštōwac tim ktōre newernimi bili menkō barzō twardą* (392b5), *pewne mī zeslališmi dō cebe muchemmed kōrān kśengō prawdziwą* (73b8), *i wiprōwadzī jich z-cemnegō blendū na świátlō drōgō* (85a6), *weźmece zaplatō za tō cō biliśce zarōbajōncimi (154a3), bō pan bōg zsila ź neba wodō* (212b6), *činil medzi dwuma mōrī granico (307b4), sedeko*[276] *dajōnce newjesti* (343a2).

Дэназалізаваны канчатак *-ą* > *o* можа ў прынцыпе чытацца як беларускі канчатак вінавальнага склону *-u*, таму што ў даследаваным манускрыпце **L** у арабскім пісьме графічна не адрозніваюцца галосныя */o/* і */u/*. Асабліва прымальным было б яго чытанне як канчатка беларускага вінавальнага склону ў адназначна беларускіх лексемах альбо ў кантэксце з моцнай беларускай афарбоўкай: *k'edi wizwoliliśmi gō i ṣemjū jehō wšitk'ich* (368b3).

12.3.5. Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду

Стараславянскі канчатак творнага склону жаночага роду **-ojǫ, *-ejǫ* назоўнікаў з *a-* або *ja*-асновамі ў польскай мове скараціўся да аднаго доўгага задняга насавога, які ў XV–XVI стст. перайшоў у задні насавы галосны *-ą*. У творным склоне жаночага роду ў польскай мове перамагае канчатак *-ą*[277].

У тэксце тэфсіра таксама вельмі рэгулярна ўжываецца польскі канчатак творнага склону *-ą*: *wšisci chwalą gō chwalą* (223b5), *wrōcili-śe tą drōgą śladem tej rībī* (237a1), *k'edi zachcece radzic cō tajemne s-prōrōk'em pre tō idzce wprōdi dō negō pred radą* (446a6), *i prōrōče grōm newernikōw šablą i dwoličnikōw jenzik'em* (153a3), *žebi krōl ō tim wedzal że ja jemū ne-jestem zrajcą* (186a5).

Канчатак *-ą* можа падлягаць дэназалізацыі, і тады на пісьме перадаецца толькі галосны *-o*: *ne-ūdawaj-śe za światōm ā za žōndzō swoją* (397a1).

Акрамя таго, у канчатак *-ą* часта пранікае расчэпленая артыкуляцыя з тыповай вялікапольскай зменай */-ą/ > /-om/*[278]: *zapewne ja bōjōn-śe žebim ne-zgrešil bōgū mōjemū ābim ne-bil karanij menkōm dnjá welk'egō* (376b1)[279].

Побач з польскім канчаткам *-ą* || *-o* || *-om* з'яўляецца як рэдкае выключэнне беларускі канчатак творнага склону *-oju* (*-eju*)[280]: *k'edi prišli pōsli naši*

---

[276] Ар. *ṣadaqa* = міласціна.

[277] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 291; Strutyński (1993), p. 107.

[278] Гл. >>> 10.5.3. Насавы *o* ў канцы слова.

[279] Тым самым канчатак фармальна супадае з беларускім канчаткам *-om* твор. скл. адз. л. м. альбо н. р. (гл. вышэй). Тут таксама зноў маніфестуецца комплексналасць мовы тэксту тэфсіра, у якой розныя канчаткі пераходзяць адзін у другі дзякуючы разнастайным фаналагічным працэсам і, такім чынам, здаецца, змешваюцца марфалагічныя катэгорыі.

[280] Канчатак *-oju* з'яўляецца архаічным. З XV ст. ён паступова выцясняецца новым канчаткам *-oj*; гл. Янкоўскі (1989), с. 164. Параўн. Łapicz (1986), p. 170. Перш за ўсё архаічныя формы на *-oju* захаваў паўднёва-заходні беларускі дыялект; гл. Янкоўскі (1989), с. 124: "Вялікая частка паўднёвага захаду Беларусі захоўвае форму канчатка з *-у*: *вад-ойу, зямл'-ойу, гул'н'-ойу, нов-айу, добр-айу*".

dō ōbrahama z-śemenčōju[281] *reklī mī zapewne wigūbimī lūdzej ōtō tegō masta są kriwdnikami dūš swojich rekl ibrahīm jest tam brat mōj lūt*[282] (322b2), *i nawrōtce-śe dō bōga swegō s-kajetōju*[283] *i pōddajce-śe pōd pōslūšenstwa jegō* (380a8), *pōd wladzejū jegō* (474b3), *z-'ejśoju sinem merjeminim*[284] (444a4).

12.3.6. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У месным склоне ў польскай мове сустракаюцца два канчаткі: *-'e* і *-i* || *-y*. Канчатак *-'e* (<*-*ě*) з'яўляецца ў цвёрдых асновах, змякчаючы цвёрды канец асновы. Асновы з велярнымі зычнымі */k, g, ch/* у канцы пры далучэнні канчатка *-'e* (<*-*ě*) паказвалі змену гука паводле 2-й палаталізацыі. Канчатак *-i* || *-y* сустракаецца пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах. У XVI–XVIII стст. пры мяккіх асновах спарадычна з'яўляецца канчатак *-ej*, які перайшоў са скланення поўных прыметнікаў[285].

У цэлым у тэксце тэфсіра мы знаходзім канчаткі *-'e* і *-i* || *-y* ў сучаснай дыстрыбуцыі. Канчатак *-'e*, запісаны толькі праз *fatḥa* = *e*, з'яўляецца пры цвёрдых асновах, змякчаючы канцавы зычны асновы. Гэта ясна выражаецца толькі ў выпадку парных фанем, для якіх у арабскім пісьме ўжываюцца парныя графемы: *zgineli na zōŕe ranō ne-pōmōglō jim ōd tegō tō cō bili činōncimi* (206b2), *ne-kara was pan bōg za-priśengi waše cō zażiwace w mōwe ãle tilkō bendze karal za te cō mōcnō ōbōwonżece-śe bōgū prisengą ã zlame* (94b7), *gdi śmi nacōwali pri skale pretō tam zapewne zapōmnalem rība ne-zapōmnalbim ãle prez šetana tegō tōbe ne-wspōmnalem że tam riba* (236b6), *sprečališce-śe s-prōrōk'em w bitwe i ne-slūchališce-gō* (54a1), *bendze dla nich ta menka dna sondnegō i na wek'i bendą tam ū hanbe welk'ij* (293a2). Ясна паказваецца змякчэнне пры зубных */t, d/ > /c', dz'/*: *k'ediśmi naznačili na negō śmerc ne-'ōznajmiliśmi jim śmerci jegō ābī ū rōbōce ne-ūstawali* (349a7), *jest i bil majstat jegō na wodze* (170b6), *takowī nacije w rajach za učink'i swoje dōbre ū welk'ej pōwadze bendą* (469a2). Акрамя таго, велярныя */k, g, ch/* паказваюць змену гука паводле 2-й палаталізацыі[286]: *bendze mōwil dō lūdzej w kōlisce* (44a7), *ãzali ō nawuce i w newinnōści mōjej bendą wedzec* (185b5), *tilkō tō wšitkō napisalō še w matrice bōżej lewch-el-mechfūẓ*[287] (354b7), *ci ktōre bili cerpliwimi na pōslūdze bōżżej* (393a8), *tak wlaśne w kśendze bōżżej lewch el-mechfūẓ*

---

[281] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

[282] Ар. *Lūṭ* = Лот.

[283] Наконт *kajeta* || *kajata* = "дараванне, раскаянне" гл. >>> 3.4 Фразеалагічныя дзеясловы.

[284] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[285] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 291–292; Strutyński (1993), p. 107–108.

[286] 2-я палаталізацыя велярных у месным склоне на **-ě* з'яўляецца асаблівасцю, якая ўказвае на польскую і беларускую мовы, у процілегласць рускай мове, дзе адбыліся выраўноўванні па аналогіі і скасаванні змен унутры парадыгмаў. Гл. Wexler (1977), p. 68. Параўн. Bräuer (1969), Bd. 1, p. 189 f.

[287] Ар. *al-lawḥ al-maḥfūẓ* = "патаемная скрыжаль" на небе, на якой напісаны спрадвечны Каран. Параўн. >>> 7.2. "*Літоўская метрыка*".

značne napisana jest (339b1). У назоўніку *księga* > *księdzie* рэдка з'яўляецца таксама беларуская форма *kniha* > *knizie*: *w kniźe bōžžej w korāne* (339a7), *ū kniźe jawnej* (308b6). У наступным прыкладзе на аснове арабскага пісьма немагчыма дакладна вырашыць, разумеецца змена гука паводле 2-й палаталізацыі */ch/* > */š/* згодна з польскай мовай альбо згодна з беларускай мовай */ch/* > */s'/*: *ci ktōre newernimi są w piše pōważnej swojej* (370a3)[288]. Пры беглым спосабе напісання дзве графемы, *šīn* = *š* і *ṯā'* = *ṡ*, часта немагчыма адрозніць. Аднак часта змена */ch/* > */s'/* згодна з беларускай мовай сустракаецца ў польскай мове паўночных крэсаў як інтэрферэнцыя з усходнеславянскім субстратам[289].

Як рэдкая з'ява сустракаюцца спосабы напісання канчатка *-'e* меснага склону назоўнікаў з цвёрдымі асновамі праз *alif* + *fatḥa* = *a*, якія належыць тлумачыць як аканне: *w tej strōna šwentōbliwošc twari bōžij* (17a5), *wibral gō i ūčinil lepšim nad was w šila i w na'ūce* (33a7).

Мяккія або гістарычна мяккія асновы звычайна паказваюць канчатак *-i* || *-y*: *pōpelgrimūjce pō źemi pretō ōbačice jak'ij bil kōnec grešnikōw newernich* (308a8), *ābō ne-chōdziliše pō źemi i ne-widzeliše jak'ij bil kōnec tim ktōre bili ješčō pred nimi bili* (384a7), *wspōminaj bōga twegō w sercū i w dūši twojej s-płačem i z-bōjaźną bōžžą* (136b6), *ā w tim zawolal na negō ānōl ǧebrā'il*[290] *ā ōn stal mōdlōnci-še w kaplici* (43b5), *ā lūdze na lewici bendōnce pek'elne są cō weš ti ī muchemmed aschab šimal*[291] *cō za menka bendze* (439a6), *ūčinilišmi lancūchi ōkōwi rōspalōne ōgnem na šiji tich ktōre newernimi* (351b1).

Як інтэрферэнцыя з беларускай мовай можа тлумачыцца ўтварэнне меснага склону адзіночнага ліку ў назоўніках жаночага роду на *-ra* паводле ўзору мяккіх асноў. Месны склон назоўнікаў жаночага роду на *-ra* заўсёды ўтвараецца з канчаткам *-y*[292]: *zabawili-še w pečarī*[293] *jich trista hōd* (232b7), *kōžde dzece rōdzi-še z-matk'ī w wjárī muśulmanśk'ej* (329a5), *prōrōk jehō milōšt' mōdlil-še na chira*[294] *gōrī k'e'bejśk'ej*[295] *i ōbačil ǧebra'ila*[296] *stempōncegō ź neba* (474a1), *pretō ōdkūpiliśmi gō welk'im baranem na ōfarī* (367b5).

Як апіску або сінтаксічную памылку можна разглядаць канчатак *-y* ў наступным адзінкавым прыкладзе: *i ne-chcą išc na wojne i spračajōn-še s-tōbą ō prawdī pō ōznajmenū jim že majō źwirchnōšc i wiktōriją ā wlaśne jakō nechentne wlōkōn-še*

---

[288] Параўн. >>> 12.3.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[289] Гл. Kurzowa (1993), p. 208.

[290] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

[291] Ар. *aṣḥāb aš-šimāl* = людзі левага боку; гэта значыць, людзі, якія ў Дзень Суда будуць сабраныя па левым баку; асуджаныя.

[292] Параўн. >>> 12.3.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[293] Польск. *pieczara* = пячора. Параўн. Grażyna-Ritter (1992), p. 74–75.

[294] Ар. *Ḥirā'* / *Ḥarā'* = Хіра – гэта назва гары на паўночны ўсход ад Мекі. У пячоры гэтай гары Мухамад, паводле ісламскай традыцыі, атрымаў першае адкрыццё (гл. EI-2).

[295] Ар. *ka'ba* = Кааба.

[296] Ар. *Ǧibrā'īl* = Габрыэль.

na śmerc i ōni ūcekac wiglōndają (137b1). Гэтая форма, вельмі верагодна, можа разумецца як памылкова напісаны родны склон адзіночнага ліку.

Ва ўсім тэксце тэфсіра нельга знайсці прыкладаў ужывання канчатка *-ej* са скланення поўных прыметнікаў, які ў XVI–XVII стст. распаўсюдзіўся ў польскай мове пры мяккіх асновах.

12.3.7. Клічны склон адзіночнага ліку

У польскай мове пры цвёрдых асновах дагэтуль захаваўся канчатак клічнага склону *-o*. Пры мяккіх асновах ужываецца канчатак *-e*, які з XVI ст. выцясняўся канчаткам *-o*, таксама прадуктыўным пры мяккіх асновах. Да XVI ст. пры мяккіх асновах спарадычна сустракаецца канчатак *-i*, які пранік з назоўнікаў з *i*-асновай. Канчатак *-u* з XVI ст. па аналогіі з канчаткам *-u* назоўнікаў клічнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду з мяккай асновай ў памяншальна-ласкальнай форме ўсталяваўся ў жаночых імёнах уласных[297]. Побач з гэтым ужо з XIV ст. у функцыі клічнага склону ўжываліся таксама формы назоўнага склону[298].

У тэксце тэфсіра ў назоўніках жаночага роду ў функцыі клічнага склону выступаюць выключна формы назоўнага склону, што супадае з сітуацыяй у беларускім субстраце. У беларускай мове пад уздзеяннем поўнага акання клічны склон супаў з назоўным. Атрыманы ў спадчыну клічны склон на *-o* захаваўся толькі ў тых гаворках, у якіх існуе няпоўнае аканне, якое не распаўсюджвалася на канец слова[299]: *rekl ānijōl*[300] *ī merjema*[301] *pewne pan bōg swjástūje cebe ōtō tim slōwem cō jest z bōge* (44a6), *ne-slūž nikōmū tilkō jemū i rōdzicōm žebišce dōbrōc činili wedla pōtrebi jich k'edī dōjzreją pri tōbe kū starōści jedin ź nich ābō chōc i ōbōje ne-mōw na nich ōh ōjče ōh matka i ne-mōw na nich tak'e slōwe čim-bi-śe ōni zafrasōwalī* (221b8), *mōw ī muchemmed ī bōže mōj tworca nebōs i źemi* (379b2).

12.3.8. Назоўны (клічны) склон множнага ліку жаночага роду

Пры цвёрдых асновах у польскай мове з'яўляецца атрыманы ў спадчыну канчатак *-y*, які рэалізуецца пасля велярных */k, g/* як *-i*. Пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах з'яўляецца канчатак *-e*[302].

---

[297] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 292; Strutyński (1993), p. 108.

[298] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 292.

[299] Гл. Янкоўскі (1989), с. 164: "Як ужо заўважана было, клічную форму захавалі назоўнікі 1-га скланення толькі ў гаворках з няпоўным аканнем і оканнем: *Гáнно!, мáмачко!, цётко!, бáбо!, Нáдзё!*" Параўн. Rott-Żebrowski (1992), p. 103.

[300] Наконт клічнай часціцы *i* гл. >>> 12.1.7. Клічны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду.

[301] Ар. *Maryam* = Марыя.

[302] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 293; Strutyński (1993), p. 108 f.

У тэксце тэфсіра пры цвёрдых асновах усталяваўся атрыманы ў спадчыну канчатак *-y* || *-i*: *ne-zabrōnil jim pan bōg žebi prijente bili ōd nich ōfari jich* (150b6), *ne-mōgą bic te žōni matkami jich* (444b7), *cūrk'i ne-są lepše ōd sinōw* (369a5).

Рэшткі парнага ліку выяўляюцца ў канчатку *-'e* (<**-ě*) пры цвёрдых асновах, напр. у назоўніку *rękа* (рука): *rekli židzī rence bōžže źwenzane jest skōmpūj ã zwenzane jest renca jich i preklenta za tō cō mōwili* (91b7). У апошнім прыкладзе выяўляецца, акрамя таго, змена канчатка *-e* > *-a* пад уплывам акання.

Мяккія і гістарычна мяккія асновы прымаюць канчатак *-e*: *dō bōga wrōcōn-śe wšitk'e dūše* (27b2), *takōwe nacije są ōbiwatelmi pek'elnimi ōni w tim bendą wečnimi* (163a1). Аднак на падставе беларускага субстрату часта можна назіраць пранікненне ў назоўнікі з гістарычна мяккімі асновамі канчатка *-y* паводле ўзору цвёрдых асноў[303]: *tak'je granici prikezane bōžžegō ã ktō bendze pōwolnij i pōslūšnij prikezanū bōžžemū i prōrōku jegō wnidze ten dō raju* (61b7), *wšitk'i dūši skōštūją śmerci gōrk'ej* (325a5), *w tich rajach są krinici žrōdla cekōnce žiwej wodī* (488a5).

На гэтым фоне канчаткі змешваюцца, і ў ідэнтычных словах сустракаецца то польскі канчатак *-e*, то беларускі канчатак *-y*: *ōtō te nacije wšitk'e ź wojśka šetańsk'egō nic ne-bili ōni wšitk'e tilkō klamci* (370b6), *ãle pan bōg świádk'em jest że ōni są dwolične klamce* (449a3).

12.3.9. Родны склон множнага ліку жаночага роду

У польскай мове ў назоўніках жаночага роду з *a-* і *ja*-асновамі ў родным склоне множнага ліку захаваўся атрыманы ў спадчыну нулявы канчатак. Побач з гэтым у назоўніках жаночага роду, якія заканчваюцца на зычны (гл. далей), і ў шэрагу назоўнікаў жаночага роду на *-nia, -elnia, -ownia* і г.д. рэгулярна сустракаецца канчатак *-i* назоўнікаў з *i*-асноў. У XVII і XVIII стст. для ўтварэння роднага склону множнага ліку жаночага роду часта выкарыстоўваўся таксама канчатак *-ów* са скланення назоўнікаў мужчынскага роду[304].

У тэксце тэфсіра пры цвёрдых асновах як рэгулярная флексійная марфема роднага склону множнага ліку выяўляецца нулявы канчатак: *ne-trimajce milōšnic frijerek* (83a8), *ne-bilō w ten čas lūdzej rōźnich war* (161b5), *pewne ja widzalem widzene jedinaśce gwazd i slōncō i meśōnc wīdze ōni mne klanają dō nōg* (181b1), *rekl krōl pewne ja widze sen śedmi krōw tlūstich jedzą ōni śedem zaś chūdich* (185a7), *w tim pekle śedem wrōt i kōžde wrōta dla nich rōzlōnčōne i pōdzelōne jest* (204b8), *i na'učiliśmi-gō ōd nas na'ūk našich (237a2), ne ōbačiš tam gōr ãni pagōrkōw ãnitež dōlin* (253b5), *na kōždim chōrim glōdnim werblōndze prijdą ze-wšitk'ich welkich drōg i glenbōk'ich strōn* (266b8), *w dōmach wujōw wašich ālbō w dōmach*

---

[303] Параўн. >>> 12.1.8. Назоўны склон множнага ліку мужчынскага роду.

[304] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 293 f.; Strutyński (1993), p. 109 f.

cōtak wašich pō matce (286b6), *chelalem*[305] *wam też cnōtliwe z-muśelmanek is-tich cnōtliwich newjást ktōrim dane kśenge t'ewrīt'*[306] *inǧīl*[307] *źebūr*[308] *pred wami* (83a7).

Перанос канчатка *-ów* са скланення назоўнікаў мужчынскага роду, што часта адбывалася ў польскай мове XVII і XVIII стст.[309], у тэксце тэфсіра сустракаецца зрэдку і, здаецца, пераважна ў запазычаных словах, напр. у слове *figa* (інжыр): *ōbōje jedli s-tegō drewa pretō ōkazal-śe jim wstid jich i pōčeli zšiwac i lepic na śebe z-liścej rajsk'ich figōw* (254b5). Паралельна аднак таксама паказваецца рэгулярная форма з нулявым канчаткам: *pōčinilem w nej sadī ōgrōdī s-fig* (360b6). У назоўніку *manila*[310] паралельна ўжываюцца ажно тры канчаткі; першы – *-ów: ōdzejōn-śe w nim ōd manelōw ōd zlōta ōd perlow ōdzeże jich w tich rajach z-jedwabōw* (266b1), другі – рэгулярны нулявы канчатак: *ne-pōkezūjōnc pōtajemnich nōžnich strōjow manel zlōtich* (286b1), і дадаткова, толькі ў адзіночных выпадках, канчатак *-ej*, распаўсюджаны пры мяккіх асновах, што дазваляе зрабіць выснову пра мяккае вымаўленне канцавога */l'/*: *dla nich jest raj 'edni*[311] *wnidą tam i pri' ōzdōbōn-śe tam ōd manelej ze-zlōta i ōd perl* (357a1).

У запазычаных словах з назоўным склонам адзіночнага склону на *-yja, -ija* ў тэксце тэфсіра рэгулярна з'яўляецца канчатак *-i*[312] альбо нулявы канчатак: *pri chrame ceremōni bōžich wspōminajce i chwalce jegō* (26b2), *wiprōwadzami mī ze-wšitk'ich ummet'ōw*[313] *i nacij świádkami prōrōkow* (317b6).

Канчатак *-ej* сустракаецца пры мяккіх асновах, напр. рэгулярна ў назоўніку *drzwi* (дзверы): *i gōnila gō dō driwij i ūrwala kōšūla jegō albō sūkne ōd zadū i pōtkali pana swegō wedla driwej* (183a7), *ne naśladūj prōžnich žōndzej jich* (114b8). Акрамя таго, у першым прыкладзе (*driwij*) пад уплывам закрытага */é/* ўжыты графічна-фанетычны варыянт канчатка *-éj* > *-ij*.

12.3.10. Давальны склон множнага ліку жаночага роду

Да канца XVI ст. у польскай мове ў давальным склоне множнага ліку назоўнікаў жаночага роду панаваў атрыманы ў спадчыну канчатак *-am*. Канчатак *-om* назоўнікаў з мужчынскай *o*-асновай у XVI ст. распаўсюджваўся ўсё мацней на назоўнікі жаночага роду праз назоўнікі мужчынскага роду на *-a*. Фанетычнай падставай і дапаможным фактарам з'яўляецца тэндэнцыя да закрытай артыкуляцыі */a/* > */á/* ў пазіцыі перад */m/*. З другой паловы XVI ст. канчатак *-om*

---

[305] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[306] Ар. *tawrā* = Тора.

[307] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

[308] Ар. *zabūr* = Псалмы.

[309] Разам з гэтым у якасці важнага фактара, зразумела, мог дзейнічаць беларускі субстрат, дзе канчатак *-ov* з мужчынскага скланення таксама пераносіўся на ніякі і жаночы род.

[310] Італ. *manela* = бранзалет.

[311] Ар. *'adn* = Эдэн, рай.

[312] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 294.

[313] Ар. *umma* = супольнасць вернікаў.

робіцца ўсё больш прадуктыўным і ў XVII ст. цалкам выцясняе першапачатковы канчатак[314]. У беларускай мове канчатак *-am* з жаночага скланення ўсталяваўся ў давальным склоне множнага ліку ўсіх родоў як адзіны прадуктыўны канчатак. Аднак канчатак *-om* у назоўніках жаночага роду з націскам у канцы слова быў засведчаны ў паўднёва-заходнім дыялекце беларускай мовы[315].

У тэксце тэфсіра ў давальным склоне назоўнікаў жаночага роду сустракаюцца тры канчаткі: *-am, -om* і графічна-фанетычны варыянт *-em*.

У цэлым можна ўбачыць лёгкую перавагу канчатка *-am: zawrōcili glōwī swoje kū zabawam śweck'im* (256a2), *bili sami sōbe dūšam swōjim kriwdnikami* (327a5), *tilkō alláh*[316] *samij bōg pretō prōś-gō ābī ōdpūścil grechi waše i werōncim menžōm i werōncim newjástam* (416b8), *ā tō ma bic kajetnikōm nemaźkarōm*[317] *slūgam bōžžim chwala ōddajōncim* (157b3).

Паралельна гэтаму канчатак *-om* выглядае ўжо вельмі прадуктыўным: *ktō ne-bendze weril pânū bōgū i ānōlōm jegō i kśengōm jegō i prōrōkam jegō i dnū ōstatnemū tedī ten zblōndzil w blōnd barzō dalek'ij* (77a7), *zlōści činą muśulmanōm i muśulmankōm ā pōtim ne-kajeli-śe tegō grechu* (468b3), *zapōmnōnij bendzeš w pekle ōtō tak'ī wlaśne plati bendzem placic w rōwnawanū bōga i cō ne-wiril piśmū bōga swegō i menkōm pōślednim twardim i wečnim* (255a3).

Канчатак *-em* можна разглядаць як графічна-фанетычны варыянт, бо ненаціскныя галосныя */a, o/* ў арабскім пісьме часта запісваюцца *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*[318]: *ktō werī panū bōgū i dnū ōstatnemu i ānjōlem slūgem bōžim i kśengem zeslanim* (23b2). У вышэйпрыведзеным фрагменце звяртае ўвагу канчатак *-em* у слове *anioł* (анёл), канцавы */l/* якіх пад беларускім уплывам можа артыкулявацца надзвычай мякка. Канчатак *-em* прыцягвае ўвагу таксама ў слове *sędzia* (суддзя): *jesteś sendze wladca sendzem wladcōm* (174b3)[319].

12.3.11. Вінавальны склон множнага ліку жаночага роду

Канчаткі вінавальнага склону множнага ліку супадаюць з канчаткамі назоўнага склону множнага ліку. Цвёрдыя асновы прымаюць канчатак *-y* || *-i* , а мяккія і гістарычна мяккія асновы – канчатак *-e*[320].

У тэксце тэфсіра польскія канчаткі знаходзяцца пераважна ў сваёй рэгулярнай дыстрыбуцыі. Пры цвёрдых асновах перамагае канчатак *-y* || *-i*: *spōjźral jednim pōjźrenem na gwjázdī i planeti* (367a1), *widzeš tich ktōre mają w sercach swojich chōrōbi dwuličnōści* (90b1), *pewne ti widziš źeme wischlą bez dežgū pretō*

---

[314] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 294–295; Strutyński (1993), p. 110.

[315] Гл. Янкоўскі (1989), с. 165. Параўн. Łapicz (1986), p. 171.

[316] Перс. *Allāh* = той, хто моліцца.

[317] Ар. *namāzkār* = Алаг.

[318] Параўн. Łapicz (1986), p. 166. Параўн. >>> 12.1.10. Давальны склон множнага ліку мужчынскага роду.

[319] Параўн. >>> 12.1.10 Давальны склон множнага ліку мужчынскага роду.

[320] Параўн. >>> 12. 3. 8. Назоўны (клічны) склон множнага ліку жаночага роду.

k'edi zeslališmi na nō dežğ pōrōšila i widala z-śebe naśene i trawi (393b6), *iź nich są tak'e jest prōšą ū cebe k'edi rōzdaješ ōfari sedōk'ī*[321] *jeśli jim daš s-tegō wdzenčni bili barzō s-cebe ã jeśli ne-daš jim s-tegō w ten čas ōnī tōbe newdzenčni neprijaceli* (151a3).

У прыватнасці, захаваліся формы парнага ліку назоўніку *ręka* (рука) з канчаткам *-'e* (<**-ě*), які змякчае цвёрды канец асновы: *wicōngną na wasrence swōje i jenzik'i swoje ze-zlim slōwem* (450b4).

Пры мяккіх асновах звычайна з'яўляецца канчатак *-e*. Аднак часта на грунце беларускага субстрату можна назіраць пранікненне канчатка *-y* паводле ўзору цвёрдых асноў, асабліва пры гістарычна мяккіх асновах: *ōni znōwa pōlamali dekleracije swoje* (128b6), *ci ktōre ne-werili i skriwdzili w tim dūši swoje ne-bendze pan bōg ōdpūskliwij jim* (80b5), *pretō śemenčūj*[322] *tich ja*[323] *muchemmed cō pōddali šiji swoje pōd slūžbi jegō* (267b4).

Абазначэнні асоб мужчынскага полу на *-a* паказваюць ваганні паміж формамі вінавальна-роднага склону, якія функцыянуюць як выражэнні катэгорыі адушаўлёнасці, і рэгулярным вінавальным склонам[324] на *-y* || *-i*: *bō pan bōg dōbre widzi slūg swojich* (41a6), *pan bōg dōbrō widzī slūgi swoje* (41b7).

У тэксце тэфсіра звяртае ўвагу тое, што вінавальна-родны склон часта распаўсюджваецца на адушаўлёныя назоўнікі жаночага роду: *rekl fera'ūn*[325] *zaraz każe zabijac sinōw jich ã żiwe sōstawic i srōmōcic żōn īch* (128a1), *mōw ti prijdzece prizōwmī dzeci našich i dzecej wašich i newast našich i newast wašich* (45b4).

Такія формы можна зразумець на грунце беларускага субстрату, дзе катэгорыя адушаўлёнасці не абмяжоўваецца толькі назоўнікамі са значэннем асобы мужчынскага полу.

12.3.12. Творны склон множнага ліку жаночага роду

У творным склоне множнага ліку ў польскай мове ўсталяваўся атрыманы ў спадчыну канчатак *-ami* назоўнікаў з *a-* і *ja*-асновамі. Побач з гэтым спарадычна запазычваецца канчатак *-y* || *-i* (пасля */k, g/*) з мужчынскага ў жаночае скланенне. У XVIII–XIX стст. такія формы на *-y* || *-i* ўжываліся пераважна ў стылізаванай, архаізаванай функцыі[326].

У творным склоне множнага ліку жаночага роду ў тэксце тэфсіра дамінуе канчатак *-ami*: *radzi bili żebi zōstali wespōl ź newestami* (154b3), *pri' ōzdōbiliśmi nebō ōd tegō świátâ gwjázdami* (391a6), *tō jest ābišce ūwerili bōgū jedinemū*

---

[321] Ар. *ṣadaqa* = міласціна.

[322] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

[323] Ар. *yā* = клічная часціца.

[324] Катэгорыя назоўнікаў са значэннем асобы мужчынскага полу ўтварылася ў польскай мове ў XVII ст.; гл. Klemensiewicz (1965), p. 281. Параўн. Łapicz (1986), p. 167.

[325] Ар. *fir'awn* = фараон.

[326] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 295 f.; Strutyński (1993), p. 111.

i pōslōwi jegō prawdziwemū i żebiśce bili na drōgach bōżich z-dūšami i skarbami wašimi i żōndzami wašimi (453b1), *ūčiniliśmi na nebe dōmī ōkna i pri' ōzdōbiliśmi planetami gwjázdami patrōncimi* (203b2).

Наадварот, ад канчатка *-y* || *-i*, перанесенага з мужчынскага скланення, у тэксце тэфсіра захаваліся толькі сляды: *menśčizni mają mec źwirchnōśce*[327] *nad newjástī* (64b7).

У назоўніку *ręka* часам сустракаецца старажытны канчатак парнага ліку *-oma* ў функцыі множнага ліку: *ā chōcbi zeslali mī na ce ī muchemmed napisanō kśenge na paperach i pōjmalibi-tō ronkōma swojimi pō staremū bi rekli ci ktōre newernikami są nic tō ne jest* (99b4).

12.3.13. Месны склон множнага ліку жаночага роду

Польская мова ў месным склоне множнага ліку жаночага роду захоўвае атрыманы ў спадчыну канчатак *-ach* назоўнікаў з *a*-асноваў, які можна ахарактарызаваць як надзвычай прадуктыўны таксама ў назоўніках мужчынскага і ніякага роду. Побач з гэтым пераважна ў XV–XVI стст. спарадычна ўжываўся канчатак *-'ech* назоўнікаў з *i-* і *er*-асновамі. Паралельна канчаткам *-ach* і *-ech* ужываўся, галоўным чынам у малапольскім моўным арэале, канчатак *-och*, які перайшоў са скланення назоўнікаў мужчынскага роду[328].

У тэксце тэфсіра сустракаюцца два канчаткі: *-ach* і *-ech*. Канчатак *-ach* дамінуе як у цвёрдых, так і ў мяккіх асновах: *pracūjce ū pōslūgach bōżżich* (87b6), *ten ktōrij prōwadzi was pō cemnōtach źemśk'ich i mōrśk'ich* (307b7), *jest tō wšitkō w kśengach lewch-el-mechfūẓ*[329] (225a4), *zapewne wī w menkach zajednō bendzece iz-šetanami* (403a6), *wšak bili są w histōrijach jich prikladī na ūpōmentane lūdzem rōzūm majōncim* (191b4).

Канчатак *-ech*, наадварот, сустракаецца толькі спарадычна. Узнікае пытанне: можа, размова ідзе хутчэй пра графічна-фанетычны варыянт, а менавіта пра *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага */a/* толькі праз *fatḥa* = *e*, чым пра канчатак *-'ech* (<*-ĕch*)[330]: *zeslal ten korān ktōrij wjádōm tajemnic w nebōsach i w źemjech*[331] (288a4), *w tich čtirech lit'erech zawira śe calij korān* (116b7).

У назоўніку *ręka* (рука) звычайна сустракаецца старажытны канчатак парнага ліку *-u*: *w renkū twojich wšitk'e dōbra* (42a8), *ta kśenga cō mace w renkū swojich* (414b1).

---

[327] Наконт він. скл. на *-ę* у кансанантным скланенні гл. >>> 12.4.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[328] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 296; Strutyński (1993), p. 111–112.

[329] Ар. *al-lawḥ al-maḥfūẓ* = "патаемная скрыжаль" на небе, на якой напісаны спрадвечны Каран. Параўн. >>> 7.2. "*Літоўская метрыка*".

[330] Наконт этымалогіі гэтага канчатка гл. Klemensiewicz (1965), p. 284.

[331] Тут звяртае ўвагу спосаб напісання праз *yā'* = *j*, які паказвае на асінхронную артыкуляцыю білабіяльнага */m'/*; гл. >>> 11.6. Асінхронная артыкуляцыя ў палатальных білабіяльных.

12.4. Кансанантнае скланенне назоўнікаў жаночага роду

12.4.1. Назоўны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У польскай мове ў назоўным склоне адзіночнага ліку кансанантнага скланення назоўнікаў жаночага роду працягвае існаваць нулявы канчатак, які ўзнік пасля падзення рэдукаваных галосных[332].

Табліца 12.4

Кансанантнае скланенне назоўнікаў жаночага роду

Склон	Адзіночны лік	Множны лік
Наз.	**-Ø** (нулявы)	**-i** (*-i* || *-y*)
Род.	**-i** (*-i* || *-y*)	**-i** (*-i* || *-y*) **-ej** (*-ej*) **-ij** (< *-éj*) (*é pochylone*)
Дав.	**-i** (*-i* || *-y*)	**-om** (*-om*)
Він.	**-Ø** (нулявы) (він. = наз.) **-e** (<*-ę*)	**-i** (*-i* || *-y*)
Твор.	**-ą** (*-ą*) **-o** (<*-ą*) (дэназалізаваны) **-om** (<*-ą*) (вялікапольскі)	**-ami** (*-ami*) **-mi** (*-mi*) **-oma** (*-oma*) (парн. л.) (рэшткі)
Месн.	**-i** (*-i* || *-y*)	**-ach** (*-ach*) **-ech** (<*-ach*) (графічныя варыянты)

Наступныя прыклады з тэксту тэфсіра не патрабуюць ніякіх далейшых каментараў: *ā k'edi tōbe prijdze pōmōc ōd pana bōga twegō pretō rekną zapewne biliśmi s-tōbą wespōl tam* (320a7), *tilkō wenkša čenšc lūdzej cō tegō ne-wedzą abō ne-wedzeli* (350b7), *pretō ne-zawodzi was rōskōš tegō dōčasnegō świeta* (354a2), *ōdpūścil mū ta wina dawidōwi zapewne jemū jest wedla nas welka bliźkōšc i dōbre mejsca* (371b4), *ālbō ne-prišla wam wjádōmōšc tich ktōre pred wami pōgineli* (198a4), *w sercach jich gōrōncōšc ōplōšenstwa newedōmōšc ǧahilstwo*[333] (421b6). Як слова жаночага роду з'яўляецца ў тэксце тэфсіра таксама назоўнік *żal* (жаль), што робіцца відавочным з формы прыметніка жаночага роду: *i welka żal sercū twemū ōd tegō cō mōwą k'afirōwe*[334] (207b4).

12.4.2. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У родным склоне адзіночнага ліку ўжываецца канчатак *-i* назоўнікаў з *i*-асновай, які рэалізуецца як *-y* пасля гістарычна мяккіх асноў. З XVII ст. ён выцясняе

---

[332] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 297. У кансанантнае скланенне разам з некаторымі назоўнікамі, якія страцілі свой галосны канчатак, перайшлі галоўным чынам назоўнікі з *ū*- і *r*-асновамі.

[333] Ар. *ǧāhil* = неадукаваны, недасведчаны, даісламскі.

[334] Ар. *kāfir* = нявернік.

ўсе іншыя канчаткі. У сярэднепольскі перыяд спарадычна сустракаецца таксама канчатак *-ej*, які перайшоў са скланення поўных прыметнікаў. У назоўніках з асновамі на *-r* і *-ū* да XVIII ст. яшчэ часам знаходзіцца першапачатковы канчатак *-e*[335].

У тэксце тэфсіра сустракаецца выключна канчатак *-i* (*-i* || *-y*) назоўнікаў з *i*-асновай. І наадварот, нельга знайсці прыкладаў канчатка *-e* і канчатка *-ej*, які перайшоў са скланення прыметнікаў: *termin śmerci ma zapewne prijśc* (319b7), *ā zapewne newernikōm pōmōci nemaš* (416a1), *ne-'učiniliśmi dla nich ōprōč slōnečnej ceplōści ōdzeži pōkriwajōncej* (239a1), *bō mi ne-gūbili žadnegō masta i wśi tilkō bil jim zalōžōnij pišmem termin* (202b8).

12.4.3. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У давальным склоне адзіночнага ліку ў польскай мове ўжываецца канчатак *-i* || *-y* (пасля гістарычна мяккай канцоўкі асновы) з *i*-асноў[336].

У тэксце тэфсіра мы таксама знаходзім выключна канчатак *-i* (*-i* || *-y*): *ne-stworiliśmi nebōsa i źemi i cōkōlwek jest medzi nimi tilkō kū slūšnōści* (206b4), *k'edī prišed dō nich pōstrašicel muchemmed prōrōk ne-prispōrilō jim kū wernōści tilkō wenkše ōddalene* (358a4), *āle cō mace radzic i mōwic mōwce kū dōbremū i kū bōjaźni bōžžej* (446a1).

12.4.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду

Формы вінавальнага склону не маюць канчатка, як і формы назоўнага склону.

Прыклады з тэксту тэфсіра: *učiniliśmi tō reč nedōbrą* (237a8), *nawrōc twar twoją dō warī muśulmańsk'ij* (329a4), *zachcemi ābiśmi mōgli zgūbic ktōre meškana weś ābō mastō* (221a5), *ōn jest bōg ten ktōrij stwožil nōc i dzen i slōnca i meśōnc* (258a8).

Асабліва прыкметнымі ў тэксце тэфсіра з'яўляюцца спосабы напісання, якія, здаецца, паказваюць перанос канчатка *-ę* у кансанантнае скланенне. Магчыма, размова ідзе толькі пра арфаграфічную памылку ў тым, што дапаможны знак *fatḥa* = *e* пераблытаны са знакам *sukūn*, які пазначае адсутнасць галоснага[337]. Спосаб напісання праз *fatḥa* = *e* ўпарта паўтараецца на працягу ўсяго тэксту. Ён знаходзіцца амаль выключна ў спалучэнні з назоўнікам *jedyność* (еднасць): *klamają jedinōšce bōžžą i ōd warī prawdziwij ōdwrōcajōn-še* (249b2), *ūprōwadze jich dō raju 'edenšk'egō*[338] *dō tegō 'edenšk'egō cō deklerowaleš jim i tim zaš cō werili w jedinōšce twoje* (383a5), *ci ktōre ūwerili w jedinōšce bōga* (415a5), *pōslaliśmi cebe śwjádk'em i śwjástūjōncim lask'i i pōstrašajōncim karanem ābi ūwerili w jedinōšce bōžžą* (419a5), *i*[339] *te ktōre werice w jedinōšce bōga muśulmane*

---

[335] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 297; Strutyński (1993), p. 104.

[336] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 297; Strutyński (1993), p. 105.

[337] Гл. >>> 9.4.3. Дапаможныя арфаграфічныя знакі *sukūn* і *hamza*.

[338] Ар. *'adn* = Эдэн, рай.

[339] Тут размова ідзе пра клічную часціцу *i* (*o*); гл. >>> 12.1.7.

(446a3), *menščizni mają mec zwirchnōšce nad newjásti i stawac ū kriwda īch s-tegō że jich pōwišil pan bōg* (64b7).

Перапісчык рукапісу **L** на аркушы 419b і 420a памылкова паўтарае вершы ад **Q**(48:11) да **Q**(48:14). Разгледзім двойчы прыведзены пераклад **Q**(48:14)[340]: *ā ci cō ne-'ūwerili w jedinōšce bōga i pōsla jegō muchemmeda pretō wedz zapewne nagōtōwališmi dla newernich śe'īr*[341] *peklō* (419b6), *ā ci cō ne-'uwerili w jedinōšce bōga i pōsla jegō muchemmeda pretō wedz zapewne nagōtōwališmi dla ne-wernich śe'īr peklō plōministō*[342] (420a6). Заслугоўвае ўвагі тое, што абодва пераклады паказваюць вінавальны склон адзіночнага ліку на *-ę* назоўніка *jedyność* (еднасць) праз *fatḥa* = *e*, што не варта расцэньваць толькі як апіску.

12.4.5. Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У тэксце тэфсіра, як і ў польскай літаратурнай мове, у творным склоне адзіночнага ліку працягвае ўжывацца атрыманы ў спадчыну канчатак *-ą* (< **-ьjǫ*) назоўнікаў з *i*-асновай[343]: *jeśli pic zachcą napōją jich takōwą wodą rōspūščōną k'ipačą medzą* (233a8), *stworil kōžde reč wšechmōcną mōcą swoją* (287b7), *ōnī są pewne k'afire*[344] *newernici panu bōgū i pōslōwi jegō i pōmarli śmercą k'afirską* (154a7), *čistij ōn jest i wisōk'ij ōd tegō cō mōwą ōnī wisōkōšcą welką* (223b4), *i ūzdrōwī radōšcą serca lūdzej werōncich* (145b8).

Побач з гэтым сустракаюцца дэназалізаваныя спосабы напісання без *sagır-ı-nūn* = *ñ*, дзе паказваецца толькі канчатак *-o*: *prijdze dō mne ze-slawnō wadōmōšcō jawnō i jasnō* (304a7).

Формы творнага склону адзіночнага ліку на *-om* можна тлумачыць як рэфлекс вялікапольскай артыкуляцыі */-ą/ > /-om/*[345]: *zaplaci tim ktōre učink'i činili dōbrōcōm i rajem* (432b6).

Неверагодна, каб тут у назоўніку жаночага роду *dobroć* (дабрыня) адбывалася змена роду > *dobroć* (муж. р.) і таму гэты назоўнік прыняў беларускі канчатак мужчынскага роду *-om*. Такое ўражанне атрымліваецца, аднак, ад назоўніка *twarz* (твар) (жаночага роду ў польскай, але мужчынскага – у беларускай), які, здаецца, прымае ў творным склоне адзіночнага ліку канчатак *-em* з мужчынскага скланення: *ā wchōdzōnc w brōma padnice twarem dō źemi* (132b3), *i padli wšitk'ī čarōwnici dō źemi twarem rekli ūweriliśmi panū bōgū śwjátōw*

---

[340] **Q**(48:14): {**wa-man lam yu'min bi-llāhi wa-rasūli-hī fa-innā a'tadnā li-l-kāfirīna sa'īran**} = "А хто не паверыў у Алага і пасланніка Яго, то, сапраўды, Мы падрыхтавалі для нявернікаў агонь".

[341] Ар. *sa'īr* = полымя, агонь, пекла.

[342] Польск. *płomienisty* = вогненны. Гэта адлюстраванне значэння арабскага слова *sa'īr* (полымя, агонь, пекла). (Наконт склонавага канчатка *-o* замест *-e* гл. 14.1.2.; 14.1.6.)

[343] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 297.

[344] Ар. *kāfir* = нявернік.

[345] Гл. >>> 10.5.3. Насавы *o* ў канцы слова.

wšitk'ich (127b2). Аднак гэты канчатак можна было б патлумачыць вялікапольской артыкуляцыяй насавога *o* (*/-ą/ > /-om/*) разам са *scriptio defectiva* ненаціскнога галоснага */o/* толькі праз *fatḥa* = *e*.

12.4.6. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У месным склоне адзіночнага ліку кансанантнага скланення працягвае ўжывацца атрыманы ў спадчыну канчатак *-i* назоўнікаў з *i*-асновай, які рэалізуецца пасля гістарычна мяккіх зычных як *-y*. У XVI ст. спарадычна сустракаўся таксама канчатак *-ej*, які перайшоў са скланення поўных прыметнікаў[346].

Канчатак *-i* (*-i* || *-y*) у тэксце тэфсіра з'яўляецца адзіным канчаткам меснага склону адзіночнага ліку ў кансанантным скланенні. Нельга знайсці ніякіх слядоў канчатка *-ej*, які перайшоў са скланення прыметнікаў: *ne-witriwaš ze-mną w cerpliwości* (237b4), *tō też s-prikladōw sen waš w nōci dō ūspōkōjenja i witchnena* (328a7), *berce t'ejemmum*[347] *pask'em čistim ābō pōtrice pō twarī wašej i pō renkach wašich tim pask'em* (83b5), *pitaj ū nich ō tij wṣī ktōre bila pri bregū mōrśk'em* (132b6), *tī weš tō cō jest w mišli mōjej ale ja ne-wem tō cō w zamislach twojich* (98b2), *mōw ī muchemmed pewne pripadek pōgrōm i wiktōreje wšitkō w mōci bōžej* (54a8).

12.4.7. Назоўны склон множнага ліку жаночага роду

У назоўным склоне множнага ліку кансанантнага скланення працягвае ўжываца запазычаны з вінавальнага склону множнага ліку канчатак *-i*, які пасля гістарычна мяккіх зычных рэалізуецца як *-y*. З XVI ст. пад уплывам тэндэнцый выраўноўвання па аналогіі паміж рознымі тыпамі скланення канчатак *-e* назоўнікаў з гістарычна мяккімі асновамі пранікае таксама ў кансанантнае скланенне. Аднак толькі з другой паловы XVIII ст. канчатак *-e* робіцца прадуктыўным пры асновах на гістарычна мяккі зычны. Пры гэтым яшчэ доўгі час існавалі паралельныя формы на *-y* || *-e*, якія часткова захаваліся дагэтуль[348].

У тэксце тэфсіра звычайна паказваецца канчатак *-i* (*-i* || *-y*): *pewne chitrōšci i ōšūkanini*[349] *są welk'e* (183b4), *dla tich ktōre ūčinili dōbrōc dōbre rōskōši rajśk'e i nagrōdī sowite* (162b5).

12.4.8. Родны склон множнага ліку жаночага роду

У кансанантным скланенні ў родным склоне множнага ліку з ранніх часоў ужываецца канчатак *-i* || *-y* (пасля гістарычна мяккіх зычных) назоўнікаў з *i*-асновай[350].

---

[346] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 298.

[347] Ар. *tayammum* = рытуальнае амавенне.

[348] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 298; Strutyński (1993), p. 108.

[349] Польск. *oszukanina* з'яўляецца аўгментатыўным утварэннем з суфіксам *-ina*. Параўн. Budziszewska (1994), p. 101.

[350] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 298 f.

У тэксце тэфсіра мы звычайна знаходзім таксама канчатак *-i* (*-i* || *-y*): *ōtō te wjádōmōšc ź weści tajemnich ōbweščami prez ānijōla tōbe ī muchemmed* (44b3), *bendą jim tōwariškami rajśk'e panni mlōde perści welk'ich nemajōnc* (373a7).

Побач з гэтым звычайна ўжываецца прадуктыўны канчатак *-ej*, які на пісьме сустракаецца і ў варыянце *-ij* (< *-éj*): *narūciliśmi te watri na nich śedem nōcej i ōśmi dnej gūbic jich bez prestankū ōbačilbiś ten lūd ī muchemmed ōd tich watrōw pōschli ī pōgineli wlaśne jakōbi pōschli pni dōktilōwe i pōčernali* (466a8), *lūdze fereji*[351] *tajemnich rečej ne-wedzą* (349a8), *pōwrōcą was dō bōga wadōmegō tajemnic za'ōčnich i jawnō wadōmich rečij* (156b6), *aj jak'e pōgūbiliśmi lūdzej s-panstwa rōźnich wşej i mast jūž pō nūch*[352] *prōrōku* (221a6), *ktō ōdwrōci jim w ten dzen til swoj chiba dla wibawena neprijacela ālbō dla zlōnčena dō pōlkōw i chōrōngwej swojich bō pewne tak'ij wicerpi srōge kerane ōd pana bōga* (138a8), *ūpōwedami i wilīčami na ce muchemmedu z-wjádōmōšcej prōrōkow cō jūž mineli* (253a6), *i jesteś-ti muchemmed bendzeš na'ūčōnij kōrān ōd našich mōndrōšcej i na'ūk* (302b8).

У тэксце тэфсіра нельга знайсці прыкладаў нулявога канчатка, які з XV па XVIII стст. спарадычна пераносіўся з назоўнікаў з *a-* і *ja*-асновамі ў кансанантнае скланенне. Таксама нельга пацвердзіць ужыванне канчатка *-ów*, які ў XVIII і XIX стст. сустракаўся ў кансанантным скланенні назоўнікаў жаночага роду па аналогіі са скланеннем назоўнікаў мужчынскага роду[353].

12.4.9. Давальны склон множнага ліку жаночага роду

У польскай мове ў давальным склоне кансанантнага скланення з ранніх часоў быў запазычаны канчатак *-am* з *a*-скланення. Аднак у XVII ст. гэты канчатак *-am* цалкам выйшаў з ужывання, бо ўжо з XVI ст. усё больш выцясняўся канчаткам *-om* са скланення назоўнікаў мужчынскага і ніякага роду[354].

У тэксце тэфсіра давальны склон кансанантнага скланення з'яўляецца вельмі рэдкім. У якасці прыкладу мы знаходзім канчатак *-om* у наступным фрагменце тэксту: *nawrōcą ōčī swoje kū twarōm lūdzij pek'elnich* (121a4), *bōndzece i wī cnōtliwimi ōd cūdzōlōstwa ne-bōndzece cūdzōlōžnikami i ne-trimajce milōśnic frijerek ā ktō ne-weril tak'im rečōm prijōlši īman*[355] *tedī takōwij traci učink'i jegō i ōn bendze na strašnim sōndze welk'im sōbe škōdnik'em* (83a8). Прыкладаў канчатка *-am* прывесці немагчыма.

---

[351] Перс. *perī* = добры дух, анёл, фея, звышнатуральная крылатая істота (адпавядае ар. *pinn* = джын).

[352] Ар. *Nūḥ* = Ной.

[353] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 299.

[354] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 299.

[355] Ар. *īmān* = вера.

12.4.10. Вінавальны склон множнага ліку жаночага роду

Канчаткі вінавальнага склону множнага ліку ідэнтычныя канчаткам назоўнага склону множнага ліку (гл. вышэй).

Канчатак *-i* (*-y*) дамінуе ў тэксце тэфсіра: *ōn bendze pec korân wī śpewajce peśni wirši* (392b4), *tajice zlōści w sercach waśich* (54b3), *jeśli zatajice miśli waši te cō w sercach waśich ālbō ōbjawice we tō wśitkō pan bōg* (42b5), *ūtwōriliśmi z-tegō mensa kōści i pōwlekliśmi kōści mensem* (272b4).

Пры асновах на гістарычна мяккі зычны не сустракаюцца формы з канчаткам *-e*: *ōgarnel pan naš wśitk'ī rečī na' ūką* (125b1), *pewne pan bōg jest na wśitk'i reči wīdzōncij świádek* (64b7).

12.4.11. Творны склон множнага ліку жаночага роду

У творным склоне множнага ліку з ранейшых часоў у кансанантным скланенні звычайна ўжываецца канчатак *-ami*, які перайшоў з назоўнікаў з *a*-асновай. Побач з гэтым толькі спарадычна сустракаецца канчатак *-mi*[356].

Звычайны канчатак творнага склону множнага ліку ў тэксце тэфсіра – канчатак *-ami*: *karmili inše matk'ī perścami dzatk'ī waši* (31a8), *pōmremi i bendzem pask'em i kōścami* (365b7), *ūdali-śe za pōžōndliwoścami świátōwimi* (416a6).

Побач з гэтым мы знаходзім толькі сляды канчатка *-mi* і рэшткі канчатка *-oma*, запазычанага з парнага склону: *k'edī mī bendzem kōścmi gnilimi mī drūgij raz ne-pōwstanemi* (224a5), *ōčiśčajce i chwalce bōga ktōrij ma w renkū swojich wladze krōlewstwa ze-wśitk'imi rečōma* (363b6).

12.4.12. Месны склон множнага ліку жаночага роду

Ужо з вельмі ранняга часу ў кансанантным скланенні стаў прадуктыўным канчатак *-ach* назоўнікаў з *a*-асновай. Канчатак *-ech* назоўнікаў з *i*-асновай ужо ў старапольскі перыяд сустракаўся вельмі рэдка. З XVI ст. ён быў цалкам выцеснены канчаткам *-ach*[357].

У тэксце тэфсіра знаходзяцца абодва канчаткі: *-ach* і *-ech*. Канчатак *-ach* пры гэтым дамінуе. Канчатак *-ech*, пры ўжыванні якога размова можа ісці толькі пра графічна-фанетычны варыянт[358] *-ach*, наадварот, з'яўляецца толькі спарадычна: *ōni w rajśk'ich hōjnōścach rōskōšōwac-śe bendą* (327b3), *pan bōg jest dūžij w rečech jegō tilkō wenkša čenśc lūdzej ne-wedzą tegō* (183a1), *ā zapewne pōwešam was na galenźech fūnikōwich* (251a1).

У тэксце тэфсіра нельга знайсці прыкладаў канчатка *-och*, які ў польскай мове з XIV па XVI ст. спарадычна пераносіўся са скланення назоўнікаў мужчынскага роду на кансанантнае скланенне назоўнікаў жаночага роду.

---

[356] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 299 f.

[357] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 300.

[358] Параўн. >>> 12.1.13. Месны склон множнага ліку мужчынскага роду; 12.3.13. Месны склон множнага ліку жаночага роду.

13. ЗМЕНА РОДУ

Тыповай лінгвістычнай асаблівасцю беларускай мовы з'яўляецца пераход ніякага роду на *-o*, *-e* альбо *-ę* у жаночае скланенне на *-a*, што звязана з пераходам гэтых канчаткаў *-o*, *-e*, *-ę* > *-a* пад уплывам акання[1].

У тэксце тэфсіра часта адбываюцца ўскладненні сінтаксічнай структуры, пры якіх у назоўніках, прыметніках альбо таксама дзеясловах ужываюцца канчаткі розных родавых катэгорый: *naša świedectwa prawdziwše jest ōd świádectwa tich dwuch* (97a6). На базе акання адрозненні паміж жаночым і ніякім родам сціраюцца: *nasza świadectwa* выглядае як назоўнік жаночага роду і толькі ў наступнай прыназоўнікавай фразе *od świadectwa* без сумневу робіцца відавочным, што гэта ніякі род. Прыметнік *prawdziwsze* з канчаткам *-e* нельга адназначна лічыць прыметнікам ніякага роду, бо ў дадзеным рукапісе галосны /*a*/ часта падлягае рэдукцыі /*a*/ > /*e*/[2] і на пісьме таксама часта пішацца *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*.

У наступным прыкладзе аканне адбіваецца ў дзеяслоўнай форме *przychodziło*, якая пераходзіць у жаночую форму *przychodziła*. Толькі з кантэксту, з наступным дзейнікам *karanie boże*, робіцца відавочным, што форма *przychodziła* ніякага роду (з аканнем): *k'edi ōbačice že prichōdzila wam kerane bōžže* (102b4).

У наступным прыкладзе *twardym męką* (жорсткай мукай) у прыметніку ўжыты канчатак *-ym* творнага склону адзіночнага ліку мужчынскага або ніякага роду. Назоўнік *męka* (мука), наадварот, паказвае правільны канчатак творнага склону адзіночнага ліку жаночага роду *-ą*: *preciwni bili panu bōgū i pōslōwi jegō ā chtō preciwni biwa bōgū pretō pan bōg ōkara īch twardim menką* (448a1). Прычынай таму можа быць вымаўленне канчатка *-ą* як *-om*, якое часта канстатуецца ў дадзеным рукапісе[3]. Пры гэтым канчатак *-ą* > *-om* супадае з беларускім канчаткам творнага склону адзіночнага ліку мужчынскага або ніякага роду *-om*[4]. Такім чынам, у дадзеным выпадку ў творным склоне адзіночнага ліку мае месца дэвіяцыя назоўніка *męka* ад жаночага роду ўбок ніякага і мужчынскага: *twardym mękom*. Такая інтэрпрэтацыя абапіраецца на наступны кантэкст, дзе змена *-ą* > *-om* адлюстроўваецца на пісьме: *menkōm pōślednim twardim i wečnim* (255a3).

---

[1] Параўн. Kurzowa (1993), p. 256–257. Параўн. >>> 10.9.2. Аканне /*o*/ > /*a*/ пасля націску; 10.9.4. Аканне /*e*/ > /*a*/ пасля націску.

[2] Гл. >>> 10.9.5. *Scriptio defectiva* /*a*/ праз *fatḥa* = *e*.

[3] Гл. >>> 10.5.3. Насавы *o* ў канцы слова.

[4] Гл. >>> Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду; 12.2.5. Творны склон адзіночнага ліку ніякага роду.

У назоўніку жаночага роду *twarz* (твар) таксама сустракаецца сінтаксічная блытаніна, якая быццам паказвае на змену жаночага роду на мужчынскі: *pōtim ōdwrōcil twar swoje ōd negō* (406b3). У прыведзеным прыкладзе прыналежны займеннік выразна паказвае на жаночы род. Аднак у іншым кантэксце *twarz* (твар) часта сустракаецца з канчаткам *-em* творнага склону адзіночнага ліку мужчынскага або ніякага роду: *ā wchōdzōnc w brōma padnice twarem dō źemi* (132b3), *i padli wšitk'ī čarōwnici dō źemi twarem rekli ūweriliśmi panū bōgū śwjátōw wšitk'ich* (127b2), *twarem nizkō klanajon-śe* (136b8). Гэты канчатак у арабскім пісьме кожны раз запісваецца праз *fatḥa* + *mīm* = *-em*. Часам за напісаннем *fatḥa* + *mīm* = *-em*, дзе можна было б дапусціць *scriptio defectiva* /o/ толькі праз *fatḥa* = *e*, хаваецца вялікапольскае вымаўленне насавога *o* ў канцы слова *-ą* > *-om*[5].

Здаецца, што па падставе фаналагічных і графічных фактараў, дзейных у дадзеным рукапісе, наогул сціраецца розніца паміж канцавымі галоснымі і канчаткамі і што з-за гэтага таксама ўтойваецца і зацямняецца розніца паміж граматычнымі катэгорыямі альбо адбываюцца пераходы ва ўжыванні асобных канчаткаў.

На гэтым фоне ў наступным фрагменце *pretō śwjástūj slūg mōjich tich ktōre slišą slowe mōjō koranne* (376b7) іменную фразу *słowo moje koranne* можна прачытаць без сумневу як вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду: *słowę moją korannę (koranną)*. Перанос канчатка вінавальнага склону адзіночнага ліку жаночага роду *-ę* з іменнага ў прыметнікавае скланенне вельмі распаўсюджаны ў дадзеным рукапісе[6].

Звычайна ў тэксце тэфсіра можна знайсці адназначныя прыклады, якія даказваюць змену ў скланенні ніякага роду на жаночы: *āle ten cō ūweril [w] jedinōstwa bōžžą i dōbre ūčink'i činil pretō dla negō jest zaplata dōbra* (238b7), *takōwe naciji są wojską bōžžą wedz zapewne wojškō bōže ōni są ūwolnenī ze-wšitk'egō zlegō* (447a8), *i jest direkciją i laska śwentą i śwjástōwanją dla werōncich muśulman* (215b5), *falšōwali i premenali slōwo mōją z-grūntū ne-tak jak īm pōdane* (84b6). У апошнім прыкладзе ў фразе *słowo moją* можна было б вызначыць пераход канчатка *-ą* з прыметнікавага скланення ў назоўнікавае, які добра пацвярджаецца ў рукапісе. Гэты канчатак часта ўжываецца ў рукапісе ў назоўніках з цвёрдым канцом асновы[7]: *słową moją*. На базе арабскага пісьма таксама быў бы магчымы спосаб прачытання, бліжэйшы да беларускай мовы: *słowu moją*.

[5] Гл. >>> 10.5.3. Насавы *o* ў канцы слова; Параўн. >>> Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[6] Гл. >>> 14.1.13. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

[7] Гл. >>> 12.3.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

14. ПРЫМЕТНІКІ І ІХ СКЛАНЕННЕ

14.1. Скланенне прыметнікаў

У польскай мове, як ва ўсіх славянскіх мовах, у прыметніках першапачаткова маглі адрозніваць назоўнікавае і займеннікавае, альбо складанае, скланенне. Назоўнікавае скланенне, у якім прыметнікі пераймаюць склонавыя канчаткі назоўнікаў, захоўвалася яшчэ да XVI ст.[1], але потым у ходзе далейшага развіцця было цалкам заменена складаным скланеннем.

У складаным (займеннікавым) скланенні прыметнікаў да назоўнікавых склонавых канчаткаў дадаваліся яшчэ адпаведныя формы анафарычнага займенніка *jь, ja, je*. У польскай мове канчаткі, якія ўзніклі такім чынам, змяняліся і скарачаліся праз скасаванне, сцяжэнне і прыпадабненне груп зычных і галосных разнастайнымі спосабамі[2]. У гэтым працэсе адбывалася падаўжэнне галоснага, які застаўся пры выпадзенні суседняга гука. З XVI ст. тыя доўгія галосныя, якія ўзніклі дзякуючы гэтаму падаўжэнню, падлягалі звужэнню ў закрытыя галосныя.

У тэксце тэфсіра **L** скланенне прыметнікаў дасягнула таго самага ўзроўню развіцця, як і ў сучаснай польскай мове. Рэшткі назоўнікавага скланення знаходзяцца толькі ў пэўных катэгорыях слоў (напр., у прыналежных прыметніках, утворанных з *-ów*, а таксама ў прыналежных займеннікаў) і ў пэўных сінтаксічных функцыях (напр., у выказніку); у складаным (займеннікавым) скланенні прыметнікаў сукупнасць канчаткаў адпавядае ў сваёй аснове сукупнасці канчаткаў у сучаснай польскай мове. Між тым у сістэме склонавых канчаткаў знаходзяцца спецыфічныя адхіленні, якія, з аднаго боку, гістарычна могуць быць патлумачаныя на падставе тэндэнцый развіцця, дзейных наогул у польскай мове, а з іншага боку, абумоўліваюцца перыферыйным моўным становішчам. Нарэшце, не апошнюю ролю ў абліччы сістэмы склонаў, як мы яе знаходзім у тэксце тэфсіра, адыгрывае беларускі субстрат.

Як фактары, якія спецыфічным чынам зафіксавалі склад формаў прыметнікавага скланення, маглі быць пералічаныя наступныя:

1) Рэфлексы ў артыкуляцыі закрытага галоснага */é/ > /i/, /á/ > /o/*[3].

2) Тэндэнцыя да звужэння ў артыкуляцыі галосных перад */m/*[4].

3) Дэназалізацыя насавых галосных у канцы слова */-ę, -ą/ > /-e,- o/*[5].

---

[1] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 321 ff.; Strutyński (1993), p. 125.

[2] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 327 ff.

[3] Параўн. >>> 10.4. Закрытыя галосныя.

[4] Параўн. >>> 10.7. Уплыў плаўных і насавых на галосныя.

[5] Параўн. >>> 10.5.2. Насавы *е* ў канцы слова; 10.5.3. Насавы *о* ў канцы слова.

4) Рэфлексы моцнага акання ў канцавым галосным /-*e*/ > /-*a*/[6].

5) Рэдукаваны спосаб напісання (*scriptio defectiva*) галоснага /*a*/ толькі праз *fatḥa* = *e*[7].

6) Далейшае існаванне архаічных канчаткаў.

7) Марфалагічныя інтэрферэнцыі з беларускім субстратам.

Наступная табліца ахоплівае сукупнасць канчаткаў прыметнікавага скланення, якія сустракаюцца ў тэксце тэфсіра.

Табліца 14.1

Скланенне прыметнікаў

Склон	Мужчынскі род	Ніякі род	Жаночы род	Множны лік
Наз.	**-ij** (*-yj* || *-ij*) (бел.)	**-e** (*-e*) **-a** (<*-e*) **-o** (*-o*)	**-a** (*-a*) **-e** (<*-a*) **-o** (< *-á*)	**-i** (*-i* || *-y*) **-e** (*-e*) **-a** (< *-e*) **-ije** (*-yje* || *ije*)
Род.	**-ego** (*-ego*) **-ogo** (*-oho*) (бел.)		**-ej** (*-ej*) **-ij** (*-éj*) **-i** (<*-é* < *ē*) **-oj** (*-oj*) (бел.)	**-ich** (*-ych* || *-ich*) **-ich** (*-ich* || *-ych*) **-ech** (*-ech*) (?)
Дав.	**-emu** (*-emu*) **-omu** (*-omu*) (бел.)		**-ej** (*-ej*) **-ij** (<*éj*) **-oj** (*-oj*) (бел.)	**-im** (*-ym* || *-im*) **-im** (*-im* || *-ym*) **-em** (*-em, -ém*)
Він.	**-ij** (*-yj* || *-ij*) **-ego** (він. = род.)	**-e** (*-e*) **-a** (<*-e*) **-o** (*-o*)	**-ą** (*-ą*) **-o** (<*-ą*) **-e** (<*-ę*) **-a** (<*-e* <*-ę*)	**-e** (*-e*) **-a** (<*-e*) **-ije** (*-yje* || *-ije*) він. = род.
Твор.	**-im** (*-ym* || *-im*) (цвёрдая) **-im** (*-im* || *-ym*) (мяккая)		**-ą** (*-ą*) **-o** (<*-ą*)	**-imi** (*-ymi* || *-imi*) **-imi** (*-imi* || *-ymi*) **-emi** (*-emi* || *-émi*)
Месн.	**-im** (*-ym* || *-im*) (цвёрдая) **-im** (*-im* || *-ym*) (мяккая) **-em** (*-em*) **-om** (*-om*) (бел.)		**-ej** (*-ej*) **-ij** (<*-éj*) **-oj** (*-oj*) (бел.)	**-ich** (*-ych* || *-ich*) **ich** (*-ich* || *-ych*)
Клічны	клічны = наз.	клічны = наз.	клічны = наз.	клічны = наз.

14.1.1. Назоўны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

У тэксце тэфсіра ў назоўным і вінавальным склонах адзіночнага ліку мужчынскага роду прыметнікаў звяртае ўвагу паслядоўнае ўжыванне канчатка *-ij* (*-yj* || *-ij*). Гэты канчатак, які ў тэксце тэфсіра не проста спарадычна сус-

[6] Параўн. >>> 10.9.4. Аканне /*e*/ > /*a*/ пасля націску.

[7] Параўн. >>> 10.9.5. *Scriptio defectiva* /*a*/ праз *fatḥa* = *e*.

тракаецца, але сістэмна замацаваны ў парадыгме прыметнікавага скланення, з'яўляецца інтэрферэнцыяй з беларускай мовай[8]. Прыклады канчатка *-ij* (*-yj*): *wedz zapewne że ja jest bōg ūważnij świentij mōndrij* (303a4), *pewne ti-jest pōważnij krōl i mōndrij cesar* (383a6), *w ten dzen pewne pan bōg prendk'ij liğbar* (384a2), *ōn jest prijaźnij ōn ōžīwa martwich i ōn na wšitk'i rečī wšechmōgōncij* (396a4), *ōstatnij čas prijdze dō nich ź nenacka* (404b6), *rekl pretō wistōmp ōd nas ź neba bō ś-ti-jesteś ūbitij ūkemenōwanij i preklentij* (204b2).

Нельга прывесці прыкладаў польскага канчатка *-i* (*-y* || *-i*) з тэксту тэфсіра **L**. У рукапісе **I** таксама значна дамінуе канчатак *-ij* (*-yj* || *-ij*), у той час як у рукапісе **U** дамінуе польскі канчатак *-i* (*-y* || *-i*). Напрыклад, можна параўнаць тэкст тэфсіра ў вершы **Q** (2:32): *rekli čistij chwalebnij bōže naš ne-mami na'uk'i tak'ij tilkō cō ti nas na'učil zapewne tī jesteś wedōmij mōndrij wladce* (8b5), *reklî čistij chwalebnij naš bōže ne-mâmi na'ūk'ī tâk'ej tilkō cō ti nâs na'ūčil zapewne tī jesteś wedōmij mōndrij wlâdce* I(8b5), *rekli čistij chwâlebnî nâš-bôže ne-mâmi nâ'ūk'i tâk'ej t'ilkô' cô ti nâs nâ'ūčil ẓâpewne tî jesteś wâdômî môndrî wlâdcâ* U(8b5).

Нулявы канчатак паказваюць прыналежныя займеннікі і адыменныя прыналежныя прыметнікі: *wedz zapewne że bōg mōj jest bōgatij i świentij* (305b8), *prišed dō nich pōsel naš świentij mōjžeš* (406b6), *klamali tak ješčō wprōdi mek'k'ejšk'ich*[9] *lūdzej lūd nūchōw*[10] *i też 'adōw*[11] *i też fera'unōw*[12] (370b4).

Нулявы канчатак з назоўнікавага скланення прыметнікаў звычайна сустракаецца ў прэдыкатыўнай функцыі[13]: *čemū ž ne-ma bic mōcen žebi ōžiwil martwich* (414b6), *mōwą ktō bendze židem i grek'em ten bendze zbawon* (75b4), *ābō ja ne-mōwilem wam że pewne ja wjádōm ōd pana bōga tō cō wī ne-wece* (190a5), *wedzce zapewne że pan bōg ne-pōžōndliwij ūslūg wašich bōgatij ōn ōt tegō ānitež rad biwa s-pōslūg newernich ā jeśli bendą chwala ōddawac s-tegō jest wdzenčen* (375b4), *ōcec nic ne-dawši narūcac dzece matce ne-pōwinen* (31a6), *či-mōže bic stworca rōwen s-tim cō ne ūme tworic* (208b3).

---

[8] Пра канчатак *-ij* (*-yj*) гл. Янкоўскі (1989), с. 192 і наст. Параўн. Łapicz (1986), p. 184 f.; гл. таксама ДАБМ, карты 110–111. У паўднёва-заходнім беларускім дыялекце (за выключэннем Брэста) выпаў канцавы *-j* у формах наз. і він. скл. адз. л. м. р.; гэтая форма канчатка без канцавога *-j* сёння з'яўляецца нормай у беларускай літаратурнай мове.

[9] Ар. *Makka* = Мекка.

[10] Ар. *Nūḥ* = Ной.

[11] Ар. *'Ād* = назва племя.

[12] Ар. *fir'awn* = фараон.

[13] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 326: "Niektóre przymiotniki wykazują od najstarszej epoki szczególną skłonność do formy niezłożonej w orzeczniku; przeważnie mają one i dzisiaj takie właśnie formy jako wyłączne (*rad*, *wart*) lub możliwe (*pełen*, *wesół*, *zdrów*, *winien*, *gotów*, *łaskaw*)". Параўн. Kurzowa (1993), p. 181; Łapicz (1986), p. 183. У іншых выпадках ужываюцца прыметнікі складанага скланення.

14.1.2. Назоўны склон адзіночнага ліку ніякага роду

Нарматыўным канчаткам назоўнага склону адзіночнага ліку ніякага роду ў тэксце тэфсіра з'яўляецца канчатак *-e*, як гэта адбываецца ў сучаснай польскай мове: *prišlij žiwot jest wečne meškane* (386a6), *bō pewne jest dla nich wečne šćenśce wedla bōga jich* (159b6), *prišed dō nich z-rōznimi cūdami rekli tō jest čarōdzejstwo welk'e i jawne* (453a3), *či-dla nich jest krōlewstwa nebesk'e i źemśk'e i cōkōlwek medzi nimi* (370b3), *ōtō te peklō ktōre bilō wam deklerōwane ūchōdzce-ž dō negō dziś* (362b2), *zapewne jemū jest wedla was welka bliźkōśc i dōbre mejsca* (371b4), *serce mōje chōre jest* (367a2). Канчатак *-e* можа таксама падлягаць аканню і тады прымаць форму *-a*, якая запісваецца праз *alif* + *fatḥa* = *a*: *bō mejscō jich peklō i jest tō nagōrša meškana* (153a3).

Як асаблівасць у тэксце тэфсіра ў назоўным склоне адзіночнага ліку ніякага роду спарадычна з'яўляецца канчатак *-o*, які трэба тлумачыць як рэшткі назоўнікавага скланення прыметнікаў: *rekl ānōl wdir ō źeme nōgą twoją dwa razi i wpadli dwa žrōdla ōtō jednō ceplō zmij-śe i źimne napi-śe* (372b6), *pōjdzece dō pekla barzō ne-dōbrō mejsce* (40b7), *na balem mūle zlōtō śōdlō* (318a8). Канчатак *-o* звычайна ўжываецца ў дзеепрыметніках у функцыі прыметнікаў[14]: *mejsca īch peklō aj jak'e tō zle legōwiskō zgōtōwanō* (59a5), *pewne prijdze i źjawi-śe na was ōd bōga wašegō kerane deklerōwanō i strōgōśc jegō* (123b1), *nimaš z-nas nikōgō tilkō jemū mejsca jūž z-dawna namenōwanō* (369b2).

14.1.3. Родны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду

У тэксце тэфсіра ў мужчынскім і ніякім родзе нарматыўным канчаткам роднага склону адзіночнага ліку з'яўляецца канчатак *-ego*, які таксама існуе ў сучаснай польскай мове. Належыць звярнуць увагу, што канцавы *-o* канчатка *-ego* звычайна запісваецца *scriptio plena* і ніколі не падлягае аканню.

Прыклады мужчынскага роду: *nemaš wiktōrije tilkō ōd pana bōga śwentegō ūważnegō mōndregō krōla* (51b7), *ja wziwam was dō pōważnegō zbawicela grechōw ni-w-čim ne wontpliwegō* (386b3), *nic tō ne-jest tilkō wšitkō zabawa tegō dōčasnegō śwjáta* (403a2), *zawolają dō wladci pek'elnegō ī malik'*[15] *nech kōnec bendze na nas* (405a7), *w ten dzen prijdze ź nebōs z-dimem barzō welk'im jedna pōznaka ōstatnegō času* (406b1), *pretō chwalce pana bōga i t'eśpich*[16] *jemū činic času āchšamnegō*[17] *i času ōświtanjū sabachōwegō*[18] (327b5).

---

[14] Параўн. Kurzowa (1993), p. 181 f. Канчатак *-o* з назоўнікавага скланення некалькі часцей ужываецца ў пасіўным дзеепрыметніку мінулага часу. Гэтая форма добра вядомая ў старапольскай мове. Яшчэ да XVII ст. яна ў значнай ступені адышла на задні план. У крэсах яна засталася, аднак, даўжэй, да XVIII–XIX стст. і нават да XX ст. Працягу існавання гэтай формы спрыяў беларускі субстрат. Параўн. >>> 14.1.6. Вінавальны склон адзіночнага ліку ніякага роду; 16.9.3. Пасіўны дзеепрыметнік мінулага часу.

[15] Ар. *malik* = цар.

[16] Ар. *tasbīḥ* = усхваленне.

[17] Ар. *akṣam* = вечар.

[18] Ар. *ṣabāḥ* = раніца.

Прыклады ніякага роду: *dla świentōbliwości lechk'egō serce mōjegō korān zeslanij ōd laskawegō milōserdnegō bōga* (390a8), *ne-bendze žadnegō ratūnku ōd karana bōžžegō* (391b6), *tam rek'i są z-wod nigdī ne-pachnōncich i rek'i są z-mleka ne'ūk'islegō* (416a7), *pewne ibrahim*[19] *bil žalōściwij ment'k'egō serca* (157b8), *rekl 'ifrīt'*[20] *staršij is-ferejōw*[21] *ja prinese gō dō cebe ten majstat wprōdi niž tī wstaneš z-mejsca swegō sōndnegō pred ewlejem*[22] *bō zapewne ja na tō dūžij jest i spōsōbnij* (305b4).

Як інтэрферэнцыю або кантамінацыю з беларускім канчаткам *-oho* можна тлумачыць канчатак *-ogo*, які сустракаецца, аднак, толькі ў асобных выпадках: *i ja jej īme daje merjem*[23] *i ōnō w wapeke pōlecam tōbe i naśene jej ōd šetana preklentōgō ubitegō* (43a8), *āle dōsic tōgō że pan bōg liğbi slūchac bendze* (60b2).

14.1.4. Давальны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду

Рэгулярны польскі канчатак *-emu* ў тэксце тэфсіра з'яўляецца дамінантным канчаткам давальнага склону адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду.

Прыклады мужчынскага роду: *werą ščire bōgū i dnū ōstatnemū i prikezūją kū dōbremū* (50b4), *tō jest ābišce ūwerili bōgū jedinemū i pōslōwi jegō prawdziwemū* (453a8), *w tim pōznak'i są kōždemū cerpliwemū i bōga chwalōncemu* (398b8).

Прыклады ніякага роду: *k'edī pōmremi i bendzem pask'em tak'e reči nawrōt kū świežemū calū barzō dalek'ij* (425a1), *ōdbijaj zle slōwe kū zlemū ā dōbre kū dōbremū* (393a6).

Побач з гэтым можна назіраць пранікненне беларускага канчатка *-omu*; аднак толькі ў вельмі рэдкіх выпадках. У наступным прыкладзе вартае ўвагі тое, што перапісчык паправіў беларускую форму, уставіўшы польскую форму: *rekli werami panu bōgū jedinnōtū jedinnemū ne-werami tim cō meliśmi jich za kōlegi bōžže* (390a5), *pewne pan bōg ne-sprečnij terminōwi swomū* (195b7).

14.1.5. Вінавальны склон адзіночнага ліку мужчынскага роду

Канчатак *-ij* (*-yj* || *-ij*) прыметнікаў, дапасаваных да неадушаўлёных назоўнікаў, аднолькавы з канчаткам назоўнага склону адзіночнага ліку: *pōslaliśmi na nich wjátr gōrōncij jak ōgen palōncij* (391b3), *či-mōžiš tegō naprōwadzic ktōrij w blendze jawnim jeśli tōbe śmertelnij napōj dami* (403a7), *pōsilaliśmi na nich grad kamenistij jakō na sōdōme i gōmōre* (323b1).

---

[19] Ар. *Ibrāhīm* = Абрагам.

[20] Ар. *'Ifrīt* = (літар. мяцежны) імя джына альбо д'ябла. Тут мае месца пераклад **Q**(27:39), дзе джын *Іфрыт* абяцае Саламону прынесці трон царыцы Саўскай (гл. EI-2, слоўнікавы артыкул 'IFRIT).

[21] Перс. *perī* = добры дух, анёл, фея, звышнатуральная крылатая істота (адпавядае ар. *ğinn* = дух).

[22] Тур. *öğle* = паўдзённы час, паўдзённая малітва. Як гэта прыйшло да польска-беларускага *evle*, застаецца незразумелым. Параўн. Akiner (1978), p. 234.

[23] Ар. *Maryam* = Марыя.

У прыметніках, якія дапасуюцца да адушаўлёных назоўнікаў, з'яўляецца канчатак роднага склону *-ego*: *rekli čemū ne-zeslanij ten korān na menža jak'egō staršegō* (402b4), *wspōmni slūge našegō dawida pana renčnegō*[24] *bō w renkū mal wšitkō mōc* (371a1), *ōpūščiliśce nalepšegō bōga stworicela* (368a7).

14.1.6. Вінавальны склон адзіночнага ліку ніякага роду

У прыметніках ніякага роду вінавальны склон адзіночнага ліку аднолькавы з назоўным склонам адзіночнага ліку. Рэгулярна з'яўляецца канчатак *-e*, які запісваецца толькі праз *fatḥa* = *e*. Гэты канчатак можа падлягаць аканню і тады ў арабскім пісьме запісваецца праз *alif* + *fatḥa* = *a*: *pōrwalbi-gō wjátr i zanōsbī gō na mejsce dalek'e* (267a8), *pōšed dō jerūzalima rekl bōže mōj daj mne pōtōmstwa dōbra statečna* (367a7), *jeśli zachce ōdrūcilbi was ā priwodbi stworena nōwe bō ne-jest tō na pana bōga zatrūdnō* (355b2).

У рэдкіх выпадках як у назоўным склоне, так і ў вінавальным паказваецца канчатак *-o*[25]: *pretō śwjástūj slūg mōjich tich ktōre slišą slowe mōjō koranne*[26] (376b7), *ūčiniliśmi dla nich raj firdewśi*[27] *mejscō wekū'istō* (240a5).

14.1.7. Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага родаў

Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага родаў у польскай мове атрымаў у спадчыну з ранняга перыяду цвёрды канчатак *-ym* (*-im* пасля */k, g/*) і мяккі канчатак *-im* (*-ym* пасля гістарычна мяккіх зычных)[28]. З XVI ст. тэндэнцыя да звужэння галосных у пазіцыі перад насавымі і плаўнымі садзейнічала ўзнікненню канчатка *-em* у творным склоне і, адпаведна, змяшэнню канчаткаў творнага і меснага склонаў. Гэты працэс прыпадае перш за ўсё на сярэднепольскі перыяд[29].

Ва ўсім тэксце тэфсіра канчаткам творнага склону адзіночнага ліку як у мужчынскім, так і ў ніякім родзе выступае выключна канчатак *-im* (цвёрдая: *-ym* || *-im*; мяккая: *-im* || *-ym*).

---

[24] Пераклад з прыметнікам *ręczny* нясе на сабе моцны адбітак арабскай мовы, дзе пад арабскім *dū l-aydi* = (літар.) "які з рукамі" маецца на ўвазе ўладар. У перакладзе следам адразу ідзе тлумачэнне ў выглядзе экзегетычнага дадатку: таму што ён меў усю ўладу ў руцэ.

[25] Параўн. Kurzowa (1993), p. 181 f.; параўн. >>> 14.1.2. Назоўны склон адзіночнага ліку ніякага роду.

[26] Тут, магчыма, таксама мае месца тыповая для беларускай мовы змена роду з ніякага на жаночы, бо ўсю іменную фразу можна прачытаць на падставе арабскага пісьма таксама як він. скл. адз. л. ж. р.: *słowę moją korannę* (*koranną*); параўн. >>> 13. Змена роду.

[27] Ар. *firdaws* = рай.

[28] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 331.

[29] Гл. Klemensiewicz (1965b), t. 1, p. 108; Mazur (1993), p. 86; параўн. >>> 10.4. Закрытыя галосныя; 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

Прыклады мужчынскага роду: *jeślibiśmi ūčinili korãn jenzik'em 'eğemśk'im*[30] *tō jest persk'im rekli trōjčane 'erabśk'e*[31] *čemū śe tō ne ōznajmilō ãjet'i*[32] *korãnne zgōdne ābiśmi mōgli rōzūmec* (394a5), *nadchneliśmi ducha našegō dō cebe ābiś čital korãn 'erabśk'im*[33] *jenzik'em* (395b8), *ã k'edī ōn pōd neprijacela prijdze ne-mōže bic značnim ricerem* (401b7), *zapewne ōni stali lūdem latrōwśk'im zbitečnim* (404a4), *i ūdal-śe za nimi fera'ūn*[34] *i wojskō jegō neprijacelśk'im rōzbōjničim spōsōbem* (168b1).

Прыклады ніякага роду: *ūčiniliśmi pōtōmstwa jegō jakō śam*[35] *cham*[36] *jafet'a*[37] *dlūgōletnim* (366b4), *ābraham bil k'edi pristōmpil dō pana bōga sercam zdrōwim i prawdziwim* (366b7), *zakōchal-śe w nej ã k'edi prikril ōną pōlem swojim ōcenžala bremenem lechk'im tō perše dzeci bili habil*[38] *kabil*[39] (135b3).

Адсутнічаюць доказы існавання канчатка *-em*, які быў адносна частым у агульнапольскай мове сярэднепольскага перыяду. Падставы для поўнай адсутнасці канчатка творнага склону адзіночнага ліку *-em* у тэксце тэфсіра **L** могуць знаходзіцца ў беларускім субстраце. У беларускай мове ў адпаведным склоне мы знаходзім канчатак *-ym* (цвёрдая: *-ym* || *-im*; мяккая: *-im* ||*-ym*), атрыманы ў спадчыну з агульнаславянскай мовы, які пазней, як і ў польскай мове, распаўсюдзіўся таксама на месны склон[40].

14.1.8. Месны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду

Першапачатковым канчаткам меснага склону адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду ў польскай мове з'яўляецца *-em*. Аднак з XV ст. канчатак *-ym* (цвёрдая: *-ym* || *-im*; мяккая: *-im* || *-ym*) пачынае пранікаць з творнага склону таксама ў месны. У далейшым у абодвух склонах, творным і месным, адбываецца змяшэнне канчаткаў *-im* || *-ym* і *-em*. Фаналагічнай падставай для гэтага была моцная ў сярэднепольскі перыяд тэндэнцыя да звужэння галосных у пазіцыі перад насавымі і плаўнымі[41]. Нарэшце, у другой палове XVII ст.

---

[30] Ар. *'aǧam* = персы, варвары.

[31] Ар. *'arab* = арабы.

[32] Ар. *āya* = знак, верш Карана.

[33] Ар. *'arab* = арабы.

[34] Ар. *fir'awn* = фараон.

[35] Ар. *Sām* = Сім.

[36] Ар. *Ḥām* = Хам.

[37] Ар. *Yāfiṯ* = Яфет.

[38] Ар. *Hābil* = Авель.

[39] Ар. *Qābil* = Каін.

[40] Гл. Янкоўскі (1989), с. 194.

[41] Гл. >>> 10.4. Закрытыя галосныя; 10.7. Уплыў плаўных і насавых на галосныя; 14.1.7. Творны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду.

у месным склоне таксама ўсталёўваецца канчатак *-ym* (цвёрды: *-ym* || *-im*; мяккі: *-im* || *-ym*) як адзіны прадуктыўны канчатак[42].

У тэксце тэфсіра пераважае канчатак *-im*. Але побач з гэтым яшчэ спарадычна сустракаецца першапачатковая форма на *-em*: *i ne-dadzą tōbe wjedōmości ō prišlim žiwoce jakō mōj bōg* (355a8), *ne-mają ōni žadnej mōci na tim świece ānitež na prišlim świece wekū' istem* (386b4), *jesteśmi prijacelmi wam na tim dōčasnim świece i tež ū prišlim wečnem świece* (393a3), *na' ūči jich pišma korān slōwa bōžže i mōndrōści sōndōw chōcaśce bili pred tim w blendze welk'em i jawnim* (55b5), *zapewne jest wam w tim ibrahīmōwem prikladze priklad dōbrij* (451a4), *ne-mają na' ūk'i i ne-wedzą ō prawdziwem bōgū* (409b4), *pan bōg ōžiwi [was] w macerinśk'em žiwoce ā pōtim wmōri was* (410a6).

Прыклады ніякага роду: *prišedlem dō cebe z-śeba*[43] *krōlewstwa ktōre w jeminśk'im*[44] *panstwe* (304a8), *ktō blendnejšij ōd tegō cō ōn w dalek'im neprijacelstwa* (395a5), *jakō cemnōśc w mōrū glōnbōk'em* (283b7).

Толькі як крайне маргінальная з'ява можа разглядацца пранікненне беларускага канчатка *-om*[45]: *ōgrōd na rōwnōm mejscū* (36a8). Наступны прыклад трэба разглядаць як аканне ў беларускім канчатку меснага склону *-om* альбо ў польскім канчатку *-em*: *na prišlam świece* (278b8).

14.1.9. Клічны склон адзіночнага ліку мужчынскага і ніякага роду

У прыметніках мужчынскага і ніякага роду адзіночнага ліку ў польскай мове формы клічнага склону аднолькавыя з формамі назоўнага склону, таксама як і ў тэксце тэфсіра.

Прыклады мужчынскага роду: *rekną ānjōlōwe čistij chwalebnij bōže ti-jesteś prijaźnim panem našim* (352a4), *prišed wespōl z ōjcem dō widōncegō mejsca i rekl i sinačkū mōj* (367a8).

Можна знайсці толькі рэдкія прыклады клічнага склону ніякага роду: *aj jak'e zle mejsce i pōžice naše* (373b4), *pre tō idzce dō brōm pek'elnich na wečnōśc tam ej zle mejsce dla gardich newernikōw* (209b3).

14.1.10. Назоўны склон адзіночнага ліку жаночага роду

Канчатак *-a* назоўнага склону адзіночнага ліку ў польскай мове ўзнік з кантракцыі канчатка **-aja* займеннікавага скланення[46]. Гэты канчатак у старапольскай мове быў доўгім *-ā* і рэалізоўваўся з XVI ст. як закрыты */á/*[47].

---

[42] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 331 f. У беларускай мове ў прыметніках мужчынскага і ніякага роду таксама адбылося прыпадабненне канчаткаў творнага і меснага склонаў адзіночнага ліку. Першапачатковыя канчаткі меснага склону *-om* || *-em* былі выцесненыя канчаткам творнага склону *-ym* || *-im*. Гл. Янкоўскі (1989), с. 194. Параўн. таксама Łapicz (1989), p. 188.

[43] Ар. *Sabā* = Саба.

[44] Ар. *Yaman* = Йемен.

[45] Параўн. Kurzowa (1993), p. 183.

[46] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 332. Параўн. Łapicz (1986), p. 185.

[47] Гл. >>> 10.4.1. Закрыты /á/.

У тэксце тэфсіра звычайным канчаткам назоўнага склону адзіночнага ліку жаночага роду з'яўляецца канчатак *-a*, які ў арабскім пісьме, як правіла, запісваецца *scriptio plena* праз камбінацыю *alif* + *fatḥa* = *a*: *ōtō tō ājet'i*[48] *korānne kśenga jawna i jasna* (302b3), *ne-dōtkne-śe jich zla menke ānitež ōni zafrasūjōn-śe* (381a1), *i ne-pōmože wam žadna ōbmōwa žadna pričina dna sondnegō* (403a5), *ūdajce-śe za mną ōtō ta drōga pawdziwa i nech was ne-zwodzī z-drōgi šetan* (404b2), *jest jim za cūd i priklad cemna nōc ździrami ź nej dzen k'edī ōna biwa cemna* (361a1), *pri panū bōgu jest' zaplata świecka i wečnegō świáta* (77a1), *pewne ta gōdzina ōstatečna kōnečne ma prišc* (206b4), *rekla matke mūśina dō śōstrī jegō* (146b3).

Спарадычна канчатак *-a* паказваецца ў арабскім пісьме *scriptio defectiva* толькі праз *fatḥa* = *e*, што ўказвае на рэдукцыю ненаціскнога галоснага */a/ > /e/*[49]: *bō źema bōžže šerōke jest* (376a6).

Канчатак *-o* можна тлумачыць як рэфлекс артыкуляцыі */á/ > /o/*: *na nich jest zapalčiwośc bōžže i dla nich menke barzō twardō* (397a5), *zblōndzi i twar jegō čarnō bendze* (401b6). Канчатак *-o* (< *-á*) у арабскім пісьме тэфсіра, як правіла, запісваецца *scriptio plena* праз камбінацыю *wāw* + *ḍamma* = *o*. Аднак такія формы надзвычай рэдкія[50].

14.1.11. Родны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У родным склоне адзіночнага ліку жаночага роду першапачатковы канчатак *-ē* ўзнік з кантракцыі складанага канчатка займеннікавага скланення. Доўгі канчатак *-ē* з XVI ст. пераходзіць у закрыты */é/* праз артыкуляцыю */é/ > /y, i/*. На працягу XVI ст. у родным склоне па аналогіі з давальным склонам усталёўваўся канчатак *-ej*. Пры гэтым у пазіцыі перад */j/* артыкуляцыя закрытага */é/ > /y, i/* паказвалася асабліва часта, што прывяло да ўзнікнення канчатка *-yj* || *-ij*[51].

У тэксце тэфсіра часцей за ўсё сустракаецца канчатак *-ej*: *ōn jest 'īśâ*[52] *prikladem na'ūkō ōstatnej gōdzini* (404b1), *rekl ne-mōge žebim bil klanajōncim člōweku stworileś-gō ōd glinī sūchej čarnej i innich kōlōrōw* (204b1), *i zwod jich ōd drōgi prawdziwej pretō ōnī dōbrej drōgi ne-šūkają* (304b3).

Побач з гэтым у пазіцыі перад */j/* даволі часта паказваецца рэфлекс закрытага */é/ > /y, i/*: *prewrōcališmi jich mōcą našą s-prawej strōni na lewą ā z-lewij na prawą* (231b6), *wedzce że-śmī stworiliśmi was z-źemi ā pōtem z-malženśk'ij wodī celesnij ā pōtem z-kriwī* (264a8), *ōfjárūją datek z-dōbrij woli* (52a6), *dirigūje kōgō chce dō drōgī prawdziwij* (162b5), *pan bōg bōgatij bez wašij slūžbi i ūchwalōnij bez wašij chwali* (76b6), *pri'ōzdōbil šetan lūdzem milōśc žōndzi celesnij* (41a2), *rekl źek'erja*[53] *pane bōže skōnd bendze mne sīn bō ja jūž dōjzralij starōści* (43b7).

---

[48] Ар. *āya* = знак, верш Карана.

[49] Гл. >>> 10.9.5. *Scriptio defectiva* /a/ праз *fatḥa* = *e*.

[50] Гл. >>> 10.4.1. Закрыты /á/.

[51] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 332 f.

[52] Ар. *'Īsā* = Ісус.

[53] Ар. *Zakariyā* = Захарыя.

У гэтай сувязі вартым увагі з'яўляецца спосаб напісання, пры якім канчатак *-éj* запісваецца адначасова з дапаможным знакам *fatḥa* = *e* і *kasra* = *i*: *ne-čince zlōšci na źemī pō prijencū warī statečneij* (122a4).

Немагчыма знайсці прыкладаў першапачатковага канчатка *-e* (< *-ē*). Аднак сустракаецца канчатак *-y* || *-i* як рэфлекс артыкуляцыі */ē/* > */é/* > */y*, *i/*: *chce šetan žebi was ōdwrōcil ōd chwali bōžži i ōd nemaźu*[54] (95a6), *ā jūž mī ne-bendzem mec žadni menk'ī jakō lūdze pek'elne* (366a2), *dališmi jich skōštōwac menk'i barzō pōhanbōni* (391b5), *pretō nadchneliśmi dūchem našim dō matk'ī mōjžešōwi że pōkarmi perścami mūšū* (310b3).

Толькі ў выглядзе вельмі рэдкіх слядоў выяўляецца беларускі канчатак *-oj*, які пад уплывам акання можа з'яўляцца таксама як *-aj*[55]: *pej klanaj-śe nemaź*[56] *ōd pōlūdna āž dō cemnōj nōci* (227a3), *w tim jest priklad jednōści našōj* (294a2), *i ne-bendze jim ōd rōwnačōw jich ōd ōbrazōw i balwanōw jim žadnōj pričini* (327b1), *wiprōwadzi mne ze-zlōj drōgi* (312a6), *stworil parista malženstwa samca i samica s-celesnōj žōndzī* (433a6).

14.1.12. Давальны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У польскай мове канчатак *-ej* давальнага склону адзіночнага ліку ўзнік са скарачэння складанага займеннікавага канчатка **-ěji* і з прычыны выраўноўвання па аналогіі[57].

У тэксце тэфсіра ў давальным склоне адзіночнага ліку сустракаліся канчаткі *-ej*, *-yj* || *-ij* (<*-éj*) і беларускі канчатак *-oj*. Рэгулярным канчаткам з'яўляецца *-ej*: *jeśli bendzece dōpōmagac warī bōžej ā pan bōg dōpōmaže wam* (415b5), *ne-jest slūšnō werōncim menžōm ānitež werōncej neweśce* (343a5).

У канчатку *-yj* || *-ij* паказваецца закрытая артыкуляцыя */é/* > */y*, *i/* ў пазіцыі перад */j/*: *pretō nawrōc-śe twarą twoją kū wjárī prawdziwij* (330b2).

Толькі вельмі рэдка сустракаюцца формы з беларускім канчаткам *-oj*: *ōbōje bliśše są kū bōjaźni bōžōj* (32a5).

14.1.13. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У польскай мове канчатак вінавальнага склону адзіночнага ліку *-ą* узнік з кантракцыі канчатка **-ojǫ*[58]. Побач з гэтым у тэкстах з XVI па XVIII ст., перш за ўсё ў аўтараў з беларускіх і ўкраінскіх памежных раёнаў, канчатак *-ę* пераносіцца са скланення назоўнікаў[59].

---

[54] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[55] Параўн. Łapicz (1986), p. 186. Параўн. Янкоўскі (1989), с. 193.

[56] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[57] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 328, 332 f.

[58] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 333.

[59] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 333: "W starszej literaturze nie brak jednak przykładów, że przymiotnik przyjmuje końcówkę rzeczownika, np. *dobrę nadzieję* (w. XVI); *całę noc*, *nowę służbę* (w. XVII); *tę zdobycz ogromnę*, *stronę słabę* (w. XVIII). Przeważnie są to autorzy z pogranicza ukraiń-

У тэксце тэфсіра часцей за ўсё сустракаецца рэгулярны канчатак *-ą*, хаця часта і ў сваёй дэназалізаванай форме *-o*, што з'яўляецца тыповым для польскай мовы крэсаў: *naprōwadzi jich na drōga prōstą i wkaże jim natūrī jich* (415b4), *chcą tegō ābi zagaśili wjáre śwjátlą bōžžą gembami jich* (453a5), *i też učiniliśmi laskō našą značną na mōjžeša* (368a1), *na cō ti zabijaš dūše newinnō dūše čistą* (237b2), *ūsliśą dla tegō strōgōšc grmōtną perūnōwo s-pekla* (288b4), *ūčinil jim menke barzō pōnižōnō* (391b7), *i wiprōwadzī jich z-cemnegō blendū na śwjátlō drōgō* (85a6), *trimali ware muśulmanskō na žarti* (121b2).

Канчатак *-ę*, перанесены з іменнага скланення, у тэксце тэфсіра заўсёды запісваецца ў дэназалізаванай форме *-e* праз *fatḥa* = *e*. Ён сустракаецца ў тэксце тэфсіра досыць часта[60]: *i wprōwadzī jich pan bōg w laske swoją śwente* (156a2), *wčiniliśmi medzi nimi a renkōma jich zaslōni ābi prikladu ne-widzeli i pō zadze jich zaslōne cemne* (359a3), *i bendą rōzumec k'afire*[61] *że ōni są na dōbre drōga direktōwani* (403a4). Звычайна ўжыванне першапачатковага іменнага канчатка (**-ǫ* >) *-ę* > *-e* з'яўляецца тыповым у прыналежных займенніках, у якіх толькі ў другой палове XIX ст. праз прыпадабненне па аналогіі ўсталяваўся як норма канчатак *-ą* (< **-ǫjǫ*) з прыметнікавага скланення[62]: *ūprōwadzī kōgō chce w laska swoje* (396a2), *pōtim ōdwrōcil twar swoje ōd negō* (406b3), *rekl mūśá*[63] *bōže mōj pewne ja skriwdzilam grechami dūše mōje* (311b4), *ōtō dziś spelnilem wam wjára waša* (82b7). У апошнім прыкладзе альбо дадаткова дзейнічае аканне, альбо канчатак можна інтэрпрэтаваць як перанос канчатка наз. скл. адз. л. на він. скл. адз. л. (гл. ніжэй). У тэксце тэфсіра канчатак *-ę* у прыналежных займенніках з'яўляецца правілам, і мы не знаходзім ніякіх слядоў сучаснага канчатка *-ą* па аналогіі.

Як асаблівая рыса "*пальшчызны крэсовай*" указваецца далей перанос канчатка *-a* з назоўнага склону адзіночнага ліку ў вінавальны склон[64]: *pewne pan*

---

skiego i białoruskiego. I dziś są tego rodzaju formy w użyciu w gwarach, przede wszystkim na wschodnim pograniczu, ale i na Mazowszu, sporadycznie w Wielkopolsce, zdarzają się nawet u inteligencji warszawskiej i krakowskiej. Gdy w danej gwarze końcowe *-ę* przeszło w *-ą* i dalej w *-a*, wówczas usłyszymy przykłady w rodzaju *widza ta nowa książka*, zamiast *widzę tę nową książkę*".

[60] Параўн. Kurzowa (1993), p. 183. Параўн. Łapicz (1986), p. 187: "Również cechą polszczyzny kresowej jest końcówka *-e* (< *-ę*), zapisywana, jak wszystkie nosówki wygłosowe, bez oznaczania nosowości".

[61] Ар. *kāfir* = нявернік.

[62] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 315. Параўн. Kurzowa (1993), p. 189. Курцова ў даследаваным ёю матэрыяле з паўночных крэсаў вызначае ў прыналежных займенніках пранікненне ўжо з сярэдзіны XVII ст. канчатка *-ą*, удзельная вага якога да канца XVIII ст. ужо складала 42,8 %.

[63] Ар. *Mūsā* = Майсей.

[64] Параўн. Łapicz (1986), p. 187: "Końcówka *-a* tłumaczy się tu chyba przeniesieniem do biernika form mianownikowych, co jest cechą polszczyzny kresowej, dokumentowaną nawet w polszczyznie „warstw wyższych" oraz w polszczyźnie poniewieskiej (Turska, s. 84)". Параўн. таксама Klemensiewicz (1965), p. 333. Канчатак *-a* можа таксама тлумачыцца як дэназалізаваны канчатак *-ę* > *-e*, які падлягае аканню. Гэтаму тлумачэнню можна аддаць перавагу, калі, напр., улічыць уплыў акання таксама на дэназалізаваны канчатак *-ę* > *-e* дзеясловах, што часта сустракаецца ў тэксце тэфсіра. Параўн. >>> 12.3.4. Вінавальны склон адзіночнага ліку жаночага роду.

bōg nagōtōwal dla newernikōw menka pōtenpōna (73b5), *i naprōwadzī jich na drōge prōsta wjári muśelmańsk'ij* (85a6), *jūž ne-pōjdzece ni-na jedna wojne* (154a5), *tak was premeni s-tej natūri w inša natūre* (486a3).

14.1.14. Творны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У польскай мове канчатак *-ą* творнага склону адзіночнага ліку жаночага роду ўзнік праз кантракцыю канчатка **-ǫją* са складанага (займеннікавага) скланення[65].

У тэксце тэфсіра сустракаецца толькі рэгулярны польскі канчатак *-ą*, які, аднак, спарадычна падлягае дэназалізацыі і тады паказваецца як *-o*: *chwal ūstawične chwalą naližitą bōga swegō po-wečōrach pō zarankach* (387b3), *ābō ne-jest mōcnij ten ktōrij stworil nebōsa i źemje mōcą swoją* (363b4), *pewne ōn korān jest kśengą barzō pōważnō świętą* (394a2), *pretō śemenčūj*[66] *jich zbawenjōm i platō świentōbliwo* (359a6).

У творным склоне адзіночнага ліку жаночага роду не назіраецца пранікненне беларускіх канчаткаў (*-oj* || *-aj*).

14.1.15. Месны склон адзіночнага ліку жаночага роду

У месным склоне адзіночнага ліку жаночага роду ў польскай мове сустракаецца канчатак *-ej*, які паходзіць з кантракцыі складанага канчатка *-ěji*, *-iji* і працэсаў прыпадабнення па аналогіі[67].

Самым частым канчаткам меснага склону адзіночнага ліку ў тэксце тэфсіра з'яўляецца рэгулярны польскі канчатак *-ej*: *ãzali bendzece zbawonimi w lasce bōžej* (52a5), *ci ktōre bili cerpliwimi na pōslūdze bōžžej* (393a8), *na zdrōwej wjárī muśulmańsk'ej* (127b7), *wijachal karūn*[68] *dō lūdzej swojich w ōzdōbe strōjnej na balem mūle* (318a8).

З іншага боку, пры канчатку *-ej* часам паказваецца рэфлекс закрытай артыкуляцыі */é/ > /y, i/* ў пазіцыі перад */j/*, так што канчатак набывае форму *-ij* (*-yj* || *-ij*): *spitają ū cebe i muchemmed lūdze ō gōdzine ōstatnij mow zapewne wjedōmōšc ta wedla pana bōga* (346b7).

Спарадычна можна назіраць пранікненне беларускага канчатка *-oj*: *ne-jest pri wašej grōmadze ānitež pri grōmadze k'afirśkōj*[69] *kōgō źbije pan bōg z-drōgi prawdziwij* (78a5), *ã pōmarli na pōdrōžnōj pōśceli* (270a1), *ci ktōre starajōn-śe w našōj drōdze tedi pōprōwadzim ōnich drōgą našą* (326a7), *i wi či-bendzece sprečac-śe z-muchemmedam cō widzal w zūpelnōj parsōne gebrijela* (431b8).

---

[65] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 333.

[66] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

[67] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 332 f.

[68] Ар. *Qārūn* = Каран.

[69] Ар. *kāfir* = нявернік.

14.1.16. Клічны склон адзіночнага ліку жаночага роду

Канчатак клічнага склону адзіночнага ліку аднолькавы з канчаткам назоўнага склону: *reče dō šetana i beda mōja* (403a4), *rekną i bedna glōwka naša zapewne mī stali kriwdnikami* (257a1).

14.1.17. Назоўны склон множнага ліку

У сучаснай польскай мове ў назоўным склоне множнага ліку прыметнікаў сустракаюцца канчаткі *-i* || *-y* (пасля гістарычна мяккіх зычных) і *-e*. Канчатак *-i* || *-y* ў літаратурнай мове функцыянальна дыферэнцыраваўся да пачатку XVIII ст. і ў сваёй дыстрыбуцыі абмежаваўся катэгорыяй *асабовага множнага ліку* ў *абазначэннях асоб* мужчынскага полу. Наадварот, канчатак *-e* пераняў функцыю *не мужчынска-асабовага множнага ліку* ва ўсіх трох родах[70].

У тэксце тэфсіра ў назоўным склоне множнага ліку сустракаюцца абодва канчаткі: *-i* (*-i* || *-y*) і *-e*. Канчатак *-e* можа падлягаць аканню[71] і тады перадаваць на пісьме камбінацыяй *alif* + *fatḥa* = *-a*. Толькі вельмі рэдка можна назіраць пранікненне нясцягнутага беларускага канчатка *-ije* (*-ije* || *-yje*)[72].

Камплімэнтарная дыстрыбуцыя канчатка *-i* (*-i* || *-y*) для мужчынска-асабовых формаў і канчатка *-e* для не мужчынска-асабовых формаў у тым выглядзе, у якім яна існуе ў польскай літаратурнай мове з пачатку XVIII ст., у тэксце тэфсіра паказваецца невыразна і часта парушаецца.

Курцова ў сваім даследаванні польскамоўнага матэрыялу XVI–XVIII стст. з тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага адрозніваe чатыры тыпы абазначэнняў асобаў мужчынскага полу (мужчынска-асабовых формаў): 1) *назоўнік у мужчынска-асабовай форме + прыметнік у мужчынска-асабовай форме*; 2) *назоўнік у не мужчынска-асабовай форме + прыметнік у мужчынска-асабовай форме*; 3) *назоўнік у мужчынска-асабовай форме + прыметнік у не мужчынска-асабовай форме*; 4) *назоўнік у не мужчынска-асабовай форме + прыметнік у не мужчынска-асабовай форме*[73].

У якасці найбольш частай камбінацыі Курцова вызначае трэці тып (*назоўнік у асабовай форме + прыметнік у не мужчынска-асабовай форме*), а як другую па частаце камбінацыю – першы тып (*назоўнік у мужчынска-асабовай форме + прыметнік у мужчынска-асабовай форме*). Два іншыя тыпы камбінацый сустракаюцца, паводле Курцовай, вельмі рэдка[74]. Курцова прыходзіць да вы-

---

[70] Пра паходжанне, развіццё і функцыянальную дыферэнцыяцыю абодвух канчаткаў, *-i* || *-y* і *-e*, гл. Klemensiewicz (1965), p. 333–334.

[71] Гл. >>> 10.9.4. Аканне /e/ > /a/ пасля націску.

[72] Наконт беларускіх канчаткаў назоўнага склону множнага ліку гл. Янкоўскі (1989), с. 194 і далей. Параўн. Łapicz (1986), p. 189.

[73] Гл. Kurzowa (1993), p. 184 f.

[74] Гл. Kurzowa (1993), p. 185: "Dla badanych tekstów najbardzej typowy jest, jak widać typ 3. łączący męskoosobowy rzeczownik z niemęskoosobowym określeniem".

сновы, што катэгорыя мужчынска-асабовага множнага ліку ў прыметніках усталявалася пазней, чым у назоўніках, і што польская мова паўночных крэсаў у гэтых адносінах адставала ад стану развіцця польскай літаратурнай мовы XVII–XVIII стст.[75]

Гэтыя атрыманыя Курцовай вынікі цалкам пацвярджаюцца моўным матэрыялам тэксту тэфсіра. Далей будзе прапанавана некалькі тыповых прыкладаў з тэксту тэфсіра да прыведзеных вышэй тыпаў камбінацый:

1. **Назоўнік у мужчынска-асабовай форме + прыметнік у мужчынска-асабовай форме**: *prōśili ū cebe pōzwolene panōwe bōgaci nektōre ź nich i rekli* (154b2), *ne rōzūmeją tegō tilkō ūčeni ūčicelōwe* (323b7), *ā drūdzi bracja īch ješčō dalej zawodzą jich w blōnd* (136b2), *rekli lūdze jōzefōwi cō za kerane temū jeśli bendzece klamliwimi* (188a4), *pewne lūdze rajsci w dzen ten w zabawach w swojich w hōjnōści ōwocōw rajśk'ich* (362a4), *zawalają lūdze pek'elnī dō lūdzij rajsk'ich* (121a8), *bōgi te cō meli i służili ōjcōwe naši*[76] (123a8), *pretō bendą wedzec lūdze mek'k'ejsci*[77] *cō ōni są w blendze jawnim* (463b7).

2. **Назоўнік у не мужчынска-асабовай форме + прыметнік у мужчынска-асабовай форме**: прыкладаў гэтай камбінацыі нельга знайсці ў тэксце тэфсіра.

3. **Назоўнік у мужчынска-асабовай форме + прыметнік у не мужчынска-асабовай форме**: *pewne ōnī są ōbiwatelī pek'elne* (157b7), *prišed głōs i mōjžešū ne-bōj-śe pewne ci ne-bōjōn-śe pri mne bendōnce prōrōci pōsli mōje* (303a6), *zapewne menžōwe muśulmańsk'e i muśulmank'i i werōnce menžčiznī i werōnce newjesti i pōwolni menščiźni i pōwolni newjesti* (342b8). Характэрным для тэксту тэфсіра з'яўляецца існаванне ў блізкім кантэксце мужчынска-асабовых і не мужчынска-асабовых формаў: *newernici rekli ne-jesteśce wī tilkō lūdze ādamśk'e pōdōbni nam* (359b3), *lūdze lūtōwi*[78] *i lūdze pečarśk'e medijańsk'e ōtō te nacije wšitk'e ź wojśka šetańsk'egō nic ne-bili ōni wšitk'e tilkō klamci* (370b5). Для тэксту тэфсіра таксама характэрнае ўжыванне не мужчынска-асабовай формы прыметніка ў атрыбутыўнай функцыі з адначасовым выкарыстаннем мужчынска-асабовай формы ў прэдыкатыўнай функцыі[79]: *tilkō słūdze bōžže ščire bili wolni* (366b2).

---

[75] Гл. Kurzowa (1993), p. 185: "Zestawienie tego materiału z opisami języka pisarzy XVII w. z Polski centralnej (Chrościński s. 91, Twardowski s. 392), u których podobne niezgodności rodzajowe są o wiele rzadsze, przekonuje, że kategoria męskoosobowości nie osiągnęła w dialekcie północnokresowym XVII i XVIII w. stanu ogólnopolskiego, wykazywała dużą chwiejność, w czym na pewno odegrał rolę żywy kontakt z białoruszczyzną, której ta kategoria morfologiczna jest obca".

[76] У апошнім прыкладзе з'яўляецца тыповая форма *naszy* без змены /š/ > /s'/. Такія формы мужчынска-асабовага множнага ліку працягвалі існаваць у літаратурнай мове ажно да XVIII ст. і тады былі заменены сучаснымі формамі, такімі як *nasi*, якія грунтуюцца на аналогіі. Параўн. Kurzowa (1993), p. 182 f.

[77] Ар. *Makka* = Мекка.

[78] Ар. *Lūṭ* = Лот.

[79] Параўн. тып 5 ніжэй.

4. **Назоўнік у не мужчынска-асабовай форме + прыметнік у не мужчынска-асабовай форме**: *i ōwšem bilišce sami wistempne grešnik'i* (351a6), *zapewne bōjaznik'ī bōžže [ze] slūg jegō tō jest ūčenī lūdze* (356b1). У тэксце тэфсіра можна знайсці толькі некалькі прыкладаў гэтага тыпу камбінацыі.

На падставе матэрыялу тэфсіра цікава яшчэ паглядзець на шэсць іншых функцыянальных спосабаў ужывання мужчынска-асабовых і не мужчынска-асабовых формаў.

5. **Прэдыкатыўнае ўжыванне мужчынска-асабовых формаў**: пры прэдыкатыўным ужыванні прыметнікаў можна назіраць значнае павелічэнне выпадкаў ужывання мужчынска-асабовых формаў: *prišedlem dō was s-tak'imi cūdami ōd bōga wašegō pretō bōjce-še bōga i bōndzce pōwolnī i pōslūšnī* (44b8), *jeślī cerpliwi bendzece w bōjaźni bōžej* (51b5), *ālbō skarac jich k'edi bendą ōnī gōdnī za kriwdi pōčinōne* (52a1), *mowili pewne pân bōg jest' ūbōgij ā mī bōgaci* (57a8), *ūwolniliśmi werōnce muśulmane i bendą ze-wšitk'egō wolni na sond panšk'ij* (272a3), *ne-mace bic pōdōbnī tim cō chōdzą w cemnōści blendū* (111a6), *ăzali-bišce bili pōžalōwani w lasce jegō* (122b7), *ne-bendze tam strachū na was ănitež wī bendzece zafrasōwani* (121a8), *zapewne prišedlem dō was z-dōwodami mōndrōści bōžžej ażebim ōznajmil wam nektōre reči ktōre sprečace-še w tim mowice tō kašer*[80] *tō trepna*[81] *tō chelal*[82] *pretō bōjce-še bōga i bōndzce pōslūšnī* (404b4), *daje pan bōg pōdōbenstwa s-tegō cō bili na spōkōjnim mejscū ōd neprijacela i kōntenci bili s-tegō meškana lūdze prichōdzil jim riźk.*[83] *jich hōjnij dōstatnij ze-wšitk'ich strōn* (218a2), *ōnī mają bōgi ōsōbliwe rekl mōjžeš pewne jesteśce wī lūdzī bezzakōnnī ne-znace cō bōg cō bâlwan ōtō te bâlwani zginą ōd tegō cō w nich jest* (129a5), *radzi bili žebi zōstali wespōl ź newestami* (154b3).

6. **Прэдыкатыўнае ўжыванне не мужчынска-асабовых формаў**: не мужчынска-асабовыя формы ў прэдыкатыўным выкарыстанні можна сустрэць у тэксце тэфсіра значна радзей, чым мужчынска-асабовыя формы: *rekli ci ktōre pišne garde pewne mī temū cō ūwerilišce ā mī ne-werimi* (124a4), *sami są ūčinōne ūrōbōne martwe ne-są žiwe i ne-wedzą newernī k'edī mają bic wskrešenī* (208b6), *najdzeš ktōre mōwili pewne mī jesteśmi ūčnōwe i pōmōcnici 'īśī*[84] *tedi te blišše muśulmaninem* (94a5), *nawrōcajce-še s-kajet'ō dō bōga ōraz ze-wšitk'ich grechōw ī werōnce muśulmane ăzali bendzece ūwolnōne* (282b3), *ci ktōre w picha pōdneśōna bili* (351a5). У апошнім прыкладзе праяўляецца аканне.

7. **Адушаўлёны назоўнік жаночага роду + прыметнік у не мужчынска-асабовай форме:** выкарыстанне не мужчынска-асабовых формаў з'яўляеццца нормай у адушаўлёных назоўніках жаночага роду: *pânni rajšk'e bjále z-jasnimi*

---

[80] Польск. *koszer* = кашэрны.

[81] Бел. *трэфны*; рус. *трефной*; згодна з юдэйскім законам аб ежы – некашэрны; з ідыш *trejfe*, са старажытнаяўрэйскага *terefâ*; тут выкарыстана як сінонім да ар. *ḥarām* = "забаронены".

[82] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[83] Ар. *rizq* = сродкі існавання.

[84] Ар. *'Īsā* = Ісус.

ōčima wlaśne tak ōni jakō najlepše strūsōwe (365b1), *ā werōnca menžōwe*[85] *i werōnca newasti majōn bic prijaźni prijacela jedin drūgemū* (152b5). У апошнім прыкладзе зноў з'яўляецца аканне.

8. **Адушаўлёны назоўнік жаночага роду + прыметнік у мужчынска-асабовай форме:** *zapewne menžōwe muśulmańsk'e i muśulmank'i i werōnce menžčiznī i werōnce newjesti i pōwolni menščiźni i pōwolni newjesti* (342b8), *pōśnik pōśnikajōnce menščiźni i pōśnik pōśnikajōnci newjesti* (343a3). Зразумела, камбінацыі гэтага тыпу, *powolni niewiasty*, сустракаюцца надзвычай рэдка.

9. **Не мужчынска-асабовы множны лік + прыметнік у не мужчынска-асабовай форме**: звычайнай з'яўляецца камбінацыя назоўнікаў, якія абазначаюць рэчы, з прыметнікамі ў не мужчынска-асабовым множным ліку на *-e*: *bōndz cerpliwim ja*[86] *muchemmed pewne termini bōžže są ja muchemmed prawdziwe* (387b2), *i też dla nich ōgniste bečī*[87] *są żelaźne* (266a6), *pewne te spreč'k'ī bendą zaprawde spreč'k'ī neprijazne lūdzej pek'elnich* (373b7), *i lūdze mōje za pewne ōtō ten dōžiwotnij śwját krōtk'e jegō rōskōši* (386a6), *rekl pan bōg ja cō mōwe prawde mōwe i prawdziwe slōwa mōje że zapewne napelne peklō ṣ-cebe i s-tich cō śe ūdadzą za tōbą* (374b4), *ne-prijdze jim s-korānu ōd bōga jich nōwe slōwe ānjelsk'e ǧebra' ilōwa* (256a3), *dla tak'ich lūdzej są dla nich mejsca pōwīšōna i pōważne* (251a7).

10. **Не мужчынска-асабовы множны лік + прыметнік у мужчынска-асабовай форме**: толькі зрэдку пранікаюць у камбінацыю з не мужчынска-асабовым множным лікам прыметнікі з канчаткам *-i* || *-y*: *mow ī muchemmedu gwoli bōgū są dōwodī dōskōnali* (112a3). Часцей з'яўляюцца рэгулярныя формы: *takōwe nacije dla nich jest menka* (399b2).

У прыналежных займенніках *nasz* і *wasz* у назоўным склоне множнага ліку, як правіла, паказваецца канчатак *-y* замест не мужчынска-асабовай формы на *-e*: *ne-pōmōgli wam źbirane skarbi waši* (121a6).

11. **Адносны займеннік** *który* ў тэксце тэфсіра з'яўляецца ў назоўным склоне множнага ліку без выключэнняў у не мужчынска-асабовай форме *które*, у тым ліку тады, калі ён карэлюецца з мужчынска-асабовым множным лікам: *rekną ci ktōre ū bōga pōnižōne na tich ktōre w picha pōdnešōne bilī* (351a4), *wnet prijdze tim ktōre činą welk'ij grech pōhanbene ōd pana bōga i menka twarda* (111b3). Часта таксама ўжываецца адносны займеннік *co* замест *które*: *i ci cō ktōre činili ūčink'i neščirō tilkō pō chwala lūcką dla nich jest menka twarda* (354b4).

Высновы, якія можна зрабіць з матэрыялу тэфсіра.

Мужчынска-асабовая форма ў прэдыкатыўнай функцыі больш пашыраная, чым у атрыбутыўнай функцыі. Вартым увагі з'яўляецца выпадковае ўжыванне мужчынска-асабовых формаў прыметнікаў у камбінацыі з адушаўлёнымі назоўнікамі жаночага роду і асобныя выпадкі з назоўнікамі ў не мужчынска-

[85] Параўн. тып 3 вышэй.

[86] Ар. *yā* = клічная часціца.

[87] Польск. *bicz* = біч; да ар. *maqāmi'* = бічы, дубінкі.

асабовым множным ліку. Але ў цэлым гэтыя камбінацыі застаюцца рэдкімі выключэннямі. Наогул вынікі, атрыманыя Курцовай (1993), можна пацвердзіць на падставе тэксту тэфсіра **L**.

Сляды беларускіх канчаткаў у назоўным склоне множнага ліку: нясцягнуты беларускі канчатак *-yje* || *-ije*[88] паказваецца вельмі нерэгулярна: *zapewne pan bōg jest jegō prijacelem i pōmōcnik'em i ǧebra'il i dōbrije wernik'ī abū bek'īr*[89] *'umer*[90] *'elej*[91] *i ānjōlōwe pō tak'im wašim ōdwrōce pōmōcnikami jemū bendą* (460b1), *ã te ktōre īman*[92] *prijeli i ūčink'i dōbrije činili ne-wlōžiliśmi trūdnōści na dūši jich* (120b2).

14.1.18. Родны склон множнага ліку

У польскай мове ў родным склоне множнага ліку ва ўсіх трох родах пры цвёрдых асновах ужываецца канчатак *-ych* || *-ich* (пасля */k, g/*), а пры мяккіх асновах – канчатак *-ich* || *-ych* (пасля гістарычна мяккіх зычных). У дыялектах дадаткова сустракаецца канчатак *-ech*[93].

Адзіным канчаткам роднага склону множнага ліку ў тэксце тэфсіра з'яўляецца канчатак *-ich* (*-ych* || *-ich*) без графічнай дыферэнцыяцыі паміж */y/* і */i/*, г.зн. аднолькавы пасля цвёрдых і мяккіх асноў: *swastōwaliśmi-gō sinem izakam*[94] *że ma bic prōrōk'em i ma bic z-dōbrich lūdzej* (367b7), *zapečentōwal pân bōg na wšitk'e serca pišnich gardich mōcarōw* (386a1), *mōdlce-że jak wele chcece ãle neprijenta prōźba newernich k'afirow*[95] (387a6), *wistregali-że ōd welk'ich grechōw ōd cūdzōlostwa i nečistich grechōw* (399a4), *ōni ōd tak značnich ãjet'ōw*[96] *twar swoje pō'ōdwrōcali* (258a7), *pewne pan bōg ne-lūbi pišnich gardich lōtrōwśk'ich lūdzej* (318a5), *rekl fera'ūn i haman*[98] *zbūdūj dla mne palac ãzali dōśōngne drōg nebesk'ich* (386a2), *dami ūkōštōwac jim ōd mōnk ūstawičnich barzō twardich* (395a2), *pōtim wrōcce jich na glōwo i wlejce z-mōnk pek'elnich* (407b7), *pōtim prijdą pō tich też śedem lat glōdnich twardich ne'ūrōžajnich* (185b7).

Зусім маргінальным з'яўляецца ў тэксце тэфсіра дыялектны канчатак *-ech*: *bō ōnī są świedkami sami na śebe i na dūši swoje w newernōści takōwech lūdzej pōtenpōne ūčink'i īch i w pekle ōni na wek'i bendą* (146a6). З прычыны адзінкавасці прыкладу тут перш за ўсё трэба бачыць арфаграфічную памылку.

---

[88] Гл. Янкоўскі (1989), с. 194 і далей.

[89] Ар. *Abū Bakr* = Абу Бакр (1-ы халіф).

[90] Ар. *'Umar* = Умар (2-і халіф).

[91] Ар. *'Alī* = Алі (4-ы халіф).

[92] Ар. *īmān* = вера.

[93] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 335.

[94] Ар. *Iẓḥāq* = Ісаак.

[95] Ар. *kāfir* = нявернік.

[96] Ар. *āya* = знак, верш Карана.

[97] Ар. *fir'awn* = фараон.

[98] Ар. *Hāmān* = Гаман (імя ўласнае); міністр фараона (гл. артыкул HĀMĀN у EI-2).

14.1.19. Давальны склон множнага ліку

У польскай мове ўсе тры роды ў давальным склоне множнага ліку маюць пры цвёрдых асновах канчатак *-ym* || *-im* (пасля */k, g/*), а пры мяккіх асновах – канчатак *-im* || *-ym* (пасля гістарычна мяккіх зычных). Побач з гэтым у пазіцыі перад */m/* у стара- і сярэднепольскай мовах часта адбывалася змяшэнне паміж */y, i/* і звужаным */é/*, а таксама */e/*; такім чынам у моўных помніках стара- і сярэднепольскага перыяду ў давальным склоне часта сустракаецца канчатак *-ém* || *-em*[99].

Тэкст тэфсіра паказвае ў давальным склоне множнага ліку дамінантны канчатак *-im* (цвёрдая: *-ym* || *-im*; мяккая: *-im* || *-ym*) без графічнай дыферэнцыяцыі паміж */y/* і */i/*. З-за гэтага немагчыма адрозніць цвёрдыя і мяккія асновы: *zapewne tak właśne placimi dōbrōtliwim* (366b6), *w ten dzen ne-pōmōże nic newernim k'afirōm*[100] (387a8), *ne-mają bic nedōwerkami ājet'ōm*[101] *korānnim tilkō kriwdnici dūš swojich* (324b2), *mow ja*[102] *muchemmed pewne škōdnici te są ktōre zaškōdzili dūšam swojim i zaškōdzili i lūdzem swojim* (376b3), *ōdpūścil grechi waše i werōncim menžōm i werōncim newjástam* (416b8).

Канчатак *-em*, які пранік у давальны склон множнага ліку на фоне змяшэння */y, i/* і */é, e/* перад */m/*, у тэксце тэфсіра сустракаецца надзвычай рэдка ў параўнанні з рэгулярным канчаткам *-im* (цвёрдая: *-ym* || *-im*; мяккая: *-im* || *-ym*): *pretō ktōrim cūdam bōžžem ne-dōwerac bendzece* (389b8), *ci ktōrem daliśmi jim kśenge t'ewrīt'*[103] (17b5). Беларускі субстрат мог стаць вырашальным для слабай прадстаўленасці ў тэксце тэфсіра канчатка *-em*. У беларускай мове ў давальным склоне множнага ліку сустракаецца выключна канчатак *-ym* || *-im* (мяккая: *-im* || *-ym*).

14.1.20. Вінавальны склон множнага ліку

Да XVI ст. у польскай мове ў вінавальным склоне множнага ліку ў не мужчынска-асабовых абазначэннях на базе працэсаў выраўноўвання па аналогіі ва ўсіх трох родах усталяваўся канчатак *-e* (< *-é* < *-ē*). Побач з гэтым з XVI ст. фармавалася катэгорыя мужчынска-асабовай формы, якая знайшла сваё граматычнае выражэнне ў выкарыстанні канчаткаў роднага склону *-ych* || *-ich* у функцыі вінавальнага склону[104].

У тэксце тэфсіра ў не мужчынска-асабовых прыметніках множнага ліку дамінуе канчатак *-e*: *pōtim premenil ōbičaje swoje na dōbre pō zlich ūčinkach*

---

[99] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 335. Параўн. >>> 10.4.2. Закрыты галосны */é/*; 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

[100] Ар. *kāfir* = нявернік.

[101] Ар. *āya* = знак, верш Карана.

[102] Ар. *yā* = клічная часціца.

[103] Ар. *tawrā* = Тора.

[104] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 335 f.

(303a6), *ā ōd wšitk'ich mōr jece mensō ribe sweże* (355a1), *nektōre ź nich zgwaltōwali dūši swoje* (356b6), *učinil tam na źemi wisōk'e gōrī ābi nadal bilō widac ź werchū jich* (391a1).

Побач з гэтым у канчатку *-e* робіцца прыкметным уплыў акання: *ci cō īman*[105] *prijenli i ūčink'i činili dōbre statečna dla nich jest zbawena* (354a5), *mōwili słōwa newerna i zastali newernikami pō prijencū warī muśulmańsk'ej* (153a4)[106]. У прыналежных займенніках *nasz* і *wasz* тыповым з'яўляецца ўжыванне канчатка *-y*: *mōw ja*[107] *muchemmed prineśce dōwodī waši* (257b4).

Толькі ў асобных выпадках можна назіраць пранікненне нясцягнутага беларускага канчатка *-yje* || *-ije*: *te ktōre īman prijeli i ūčink'i dōbrije činili ne-wlōżiliśmi trūdnōści na dūši jich* (120b2).

Катэгорыя адушаўлёных прыметнікаў мужчынскага роду ў тэксце тэфсіра яшчэ не выражаецца праз паслядоўнае ўжыванне родна-вінавальнага склону. Наадварот, можна канстатаваць паралельнае ўжыванне вінавальнага і родна-вінавальнага склону; вінавальныя і родна-вінавальныя формы прыблізна ўраўнаважваюцца. Частае ўжыванне формаў вінавальнага склону ў адушаўлёных прыметніках мужчынскага роду ў тэфсіры **L**, які ўзнік у 1725 г., уяўляе сабой ужо архаічную рысу[108].

Прыклады ўжывання вінавальнага склону на *-e* ў камбінацыі з адушаўлёнымі назоўнікамі мужчынскага роду можна назіраць яшчэ часта: *mōw werōncim muśulmankōm nech tūlają ōčī swoje i zakriwają i ne-patrą na cūdze menżī* (282a3), *słūżice klamliwe bōgi ōprōč bōga* (366b8), *pōdwišiliśmi inše prōrōk'i nad inše* (224b6). Побач з гэтым прыблізна з аднолькавай частатой сустракаецца родна-вінавальны склон: *pōtim ūwolnimi pōslancōw našich tich ktōre ūwerili ōtō tak pōwinenem i należnōśc mōja na nich ūwolnic i ratōwac werōncich muśulman* (169b3), *bendą zwodzic mek'k'ejśk'ich*[109] *newernikōw ōd drōgi dōbrej* (403a3), *ā ktō uwolnī ālbō pōratūje kogō ōd śmerci jakōbi też ōżiwił lūdzī wšitk'ich* (87a7).

Катэгорыя адушаўлёнасці час ад часу паказваецца ў ніякім і жаночым родзе: *mōw ti pridzece prizōwmī dzeci našich i dzecej wašich i newast našich i newast wašich i dūši naši i dūši waši* (45b4).

---

[105] Ар. *īmān* = вера.

[106] Вельмі неверагодна, што ў апошнім прыкладзе *słōwa newerna* ўжыты першапачатковы канчатак ніякага роду *-a*, які ў польскай мове XIV і XV стст. яшчэ немагчыма знайсці (гл. Klemensiewicz (1965), p. 336). Беларускі кантэкст указвае хутчэй на тое, што размова ідзе пра ўплыў акання.

[107] Ар. *yā* = клічная часціца.

[108] Параўн. >>> 12.1.11. Вінавальны склон множнага ліку мужчынскага роду.

[109] Ар. *Makka* = Мекка.

14.1.21. Творны склон множнага ліку

У польскай літаратурнай мове на творны склон множнага ліку пры цвёрдых асновах указвае канчатак *-ymi* || *-imi* (пасля */k, g/*), а пры мяккіх асновах – канчатак *-imi* || *-ymi* (пасля гістарычна мяккіх зычных). Побач з гэтым ужо з XIV–XV стст. з'яўляецца канчатак *-emi* як рэфлекс змяшэння галосных */y, i/* і */é, e/* перад */m/*[110]. Канчатак *-emi* ў сярэднепольскай мове адзначаўся як вельмі прадуктыўны. Ён істотна выцясняў першапачатковыя канчаткі *-ymi* || *-imi* і ўстойліва трымаўся да XIX–XX стст.[111]

У тэксце тэфсіра адназначна дамінуе канчатак *-ymi* || *-imi*. Паколькі ў арабскім пісьме графічна не адрозніваюцца */y/* і */i/*, у транслітарацыі канчатак паказваецца пры цвёрдых і мяккіх асновах аднолькава ў форме *-imi*, запісанай праз камбінацыю *kasra* + *mīm* + *kasra* = *-imi*, як правіла, без поўнага напісання галосных: *ūdali-śe za pōžōndliwośćami śwjátōwimi cō sami chceli* (416a6), *słōnce i meśōnc kōžde ź nich chōdzą terminami swojimi naznačōnimi* (355a4), *korān zeslanij ōd mōndregō bōga wśitk'imi jenzikami ūchwalōnegō cesara* (394a3), *pewne pan bōg jest z-muśulmanmi werōncimi* (138b5), *zeslal mū barana ze-zlōtimi rōgami* (367b4), *prišed dō was z-rōźnimi cūdami ōd bōga wašegō* (385a3), *k'edi prišed 'ejśâ*[112] *z-cūdami našimi rekl dō lūdzej pewne prišedlem dō was z-dōwodami mōndrōści bōžžej* (404b3), *strelają jich ōgnistimi gwjezdami ze-wśitk'ich strōn* (364a3), *ne-są ōni dōskōnalimi* (390b5), *ōni są ōbiwatelmi pek'elnimi* (386b5), *bōjen-śe że źje-gō wilk bō wī jesteśce ōd negō ōplōšnimi* (182a5), *bendzece zbawonimi w lasce bōžej* (52a5).

Канчатак *-emi* ў тэксце тэфсіра паказваецца толькі ў рэдкіх выключэннях. Гэта тым больш вартае ўвагі, бо ў польскай літаратурнай мове XVII і XVIII стст. дамінаваў канчатак *-emi*. Амаль выключнае ўжыванне канчатка *-ymi* || *-imi* ў тэксце тэфсіра можна тлумачыць на базе беларускага субстрату. Беларуская мова не ведае канчатка *-emi* ў творным склоне множнага ліку[113]: *cerpliwemi są w nedōstatkū w bedech i chōrōbach* (23b4), *bendą medzi cedrami ōwoc dajōncimi i pōd drewami pōmarōnčōwemi* (439a3), *mōże wi s-timi pōdarūnkami wašemi mōžece bic ūweselenī* (305a8)[114].

---

[110] Параўн. >>> 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

[111] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 336.

[112] Ар. *'Īsā* = Ісус.

[113] Параўн. Łapicz (1986), p. 190: "N.lmn. Obok motywowanej końcówki -imi (bez graficznego wariantu -ymi) zaskakuje w tekście wysoka frekwencja końcówki -emi; pojawia się ona niezależnie od rodzaju gramatycznego. Na wschodniosłowiańskim obszarze językowym końcówka ta jest nieznana, trzeba więc w tekście interpretować ją jako polonizm. Końcówka ta zresztą w polszczyźnie XVIII-wiecznej jest niezwykle ekspansywna". (Лапіч даследуе кітаб XVIII ст., у якім дамінуюць тэксты на беларускай мове.)

[114] Іншыя прыклады гл. >>> 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

14.1.22. Месны склон множнага ліку

У множным ліку меснага склону ў польскай мове з даўніх часоў выступаюць канчаткі (сцягнутыя з **-yjich''* || **-ijich''*) *-ych* || *-ich* (пасля */k, g/*) і мяккі варыянт *-ich* || *-ych* (пасля гістарычна мяккіх зычных)[115].

У тэксце тэфсіра мы знаходзім у месным склоне множнага ліку ўсіх родаў выключна рэгулярны канчатак *-ich* (цвёрдая: *-ych* || *-ich*; мяккая: *-ich* || *-ych*), без графічнай дыферэнцыяцыі паміж */i/* і */y/*. Канчатак, як правіла, запісваецца праз камбінацыю *kasra* + *ḥā'* = *-ich* без поўнага напісання галоснага: *twori was w żiwotach macerińsk'ich nemaš jemū pōdōbnegō w żadnij rečī* (396a7), *ōni są świętōbliwimi w rajach hōjnich na mejstatach jedin preciwkō drūgegō* (365b1), *dzedzicami ūčinil sīnōw izra'elśk'ich ū panstwach nebiwalich* (387b2), *i pewne ōn jest wjedōm cō jak'e jest pōmisli w sercach člōwečich* (357b2), *zapewne grešnici newernici w menkach pek'elnich na wek'i ne'ūlžī-śe ōd nich i ōni w tim bez nadzeji zōstaną* (405a5).

Нельга прывесці прыкладаў дыялектнага канчатка *-ech* з тэксту тэфсіра. Выключнае ўжыванне рэгулярнага канчатка *-ich* (*-ych*) у тэксце тэфсіра несумненна падтрымліваецца беларускім субстратам.

14.1.23. Клічны склон множнага ліку

Канчаткі клічнага склону множнага ліку адпавядаюць канчаткам назоўнага склону множнага ліку[116].

У тэксце тэфсіра сустракаюцца знаёмыя з назоўнага склону камбінацыі мужчынска-асабовага і не мужчынска-асабовага множнага ліку. Тыповым зноў з'яўляецца выкарыстанне клічнай часціцы *i* (o!) пры зваротах на пачатку сказа: *rekl 'īśâ sīn merjemin*[117] *i sīni izra'ilōwe jakūbōwe pewne ja pōsōl bōžij dō was pōtwerdzajōncij prawda tich cō prede mną bili s-t'ewrīt'u*[118] *i ješčō was winšūje i śemenčūje*[119] *pōslōm cō prijdze pō mne īma jegō āchmed*[120] *ma bic* (453a1), *ī ādamśk'e sīni wī jesteśce pōžōndliwe dō bōga* (355a8), *rekl ten ktōrij īman*[121] *prijōl tō jest charbil*[122] *i lūdze mōje ūdajce-śe za mną* (386a5), *ī lūdze mōje cō mne stalō*

---

[115] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 335.

[116] Гл. >>> 14.1.17. Назоўны склон множнага ліку.

[117] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

[118] Ар. *tawrā* = Тора.

[119] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

[120] Ар. *Aḥmad* = Ахмед (літар. пахвальны).

[121] Ар. *īmān* = вера.

[122] Ар. *Ḥārbil* = Харбіль (імя ўласнае). Прыведзены прыклад з'яўляецца фрагментам тэксту з **Q**(40:39); паводле Табары гэтага чалавека завуць *Джыбрыл*: *wa-qad ḏukira anna sma hāḏā r-raǧuli l-mu'mini min āli fir'awna Ǧibrīl*. (Як ўжо было згадана, імя верніка з сям'і фараона было Джыбрыл.) У Тафсіры аль-Джаляляйні гэты вернік ідэнтыфікуецца са стрыечным братам фараона: "{**wa-qāla raǧulun mu'minun min āli fir'awna**} *qīla huwa bnu 'ammi-hī* ..." ({**гэта казаў вернік з сям'і фараона**}) гэта значыць, што апошні быў яго стрыечным братам ...).

wziwam was dō ūwolnena ōd pekla ã wī mne wziwace dō pekla (386b1), *rekla jedna mūraška*[123] *ī pōlk'ī mūrašk'inī ūchōdzce w meškane swoje żebi was ne-pōteptal śuluman*[124] (304a1), *mōw ī muchemmedu i slūdzī bōżżī te ktōre īman*[125] *prijenli bōjce-że bōga swegō* (376a5), *ī welci panōwe dajce mī fet'wej*[126] *snū megō jeśli wi jesteśce snōw wikladače* (185a8).

14.2. Утварэнне ступеняў параўнання прыметнікаў

Для ўтварэння вышэйшай ступені параўнання прыметніка служаць суфіксы *-szy* і *-iejszy* (*-ejszy* пасля гістарычна мяккіх зычных), якія ў найвышэйшай ступені дапаўняюцца яшчэ прыстаўкамі *na-* альбо *naj-*. Прыстаўкі *na-* і *naj-* яшчэ ў сярэднепольскі перыяд ужываліся паралельна; толькі ў навапольскі перыяд прыстаўка найвышэйшай ступені *naj-* стала нормай літаратурнай мовы[127].

Прыклады вышэйшай ступені: у *czysty* (чысты) > *czyściejszy* ў наступным прыкладзе ў арабскім пісьме даволі выразна паказваецца змякчэнне і змена зычнага ў аснове, таму што для мяккіх фанем */s'/* і */c'/* выкарыстоўваюцца ўласныя графемы *ṯā'* = *ś* і *ce* = *c*: *tak'ij ōbičaj čiścejšij dla serca wašegō i dla nūtra*[128] *jich* (345b5). Аднак у *błędny* (памылковы) > *błędniejszy* у наступным фрагменце тэксту на пісьме не перададзена змякчэнне */n/* > */n'/* перад суфіксам *-iejszy*, таму што для абедзвюх фанем, */n/* і */n'/*, выкарыстоўваецца толькі адна графема *nūn* = *n*: *takōwe lūdze wlaśne jakō bidlō čwernōgo albō ješčō ōnī blendnejše za bidlō* (134b4). Іншыя прыклады ўтварэння з суфіксам *-szy*: *wnidō lūd fera'ūnōw*[129] *w twardše menka* (387a1), *tedī ta dōbrōc ma bic i na tim świece i na meškanū wečnim ješče lepša* (209b5), *dla nich jest majstati a na werchū tegō wišše majestati ūfundōwane* (377a2), *naša świedectwa prawdziwše jest ōd świádectwa tich dwuch* (97a6), *ābō ne-jest bōg wjádōmšij*[130] *tō cō w sercach lūdzej świeck'ich* (320b1).

Прыклады найвышэйшай ступені: у тэксце тэфсіра мы знаходзім у найвышэйшай ступені абедзве прыстаўкі: *na-* і *naj-*. Аднак можна канстатаваць перавагу ва ўжыванні прыстаўкі *na-*. Прыстаўка *naj-* перамагла ў літаратурнай мове ў канцы сярэднепольскага перыяду пад моцным уплывам мазавецкага дыялекту. Вартым увагі з'яўляецца дамінаванне прыстаўкі *na-* ў тэфсіры **L**, які паходзіць з 1725 г., таму што стан яго моўнага развіцця адстае ад

---

[123] Бел. *мурашка*; польск. *mrówka*.

[124] Ар. *Sulaymān* = Саламон.

[125] Ар. *īmān* = вера.

[126] Ар. *fatwa* = прававое рашэнне.

[127] Параўн. Kurzowa (1993), p. 186. Параўн. Mazur (1993), p. 250.

[128] Бел. *нутро, нутра*. Гэтае слова з'яўляецца тут як пераклад арабскага *qalb* (мн. л. *qulūb*) = сэрца. Відавочна, трэба было пазбегнуць паўтору слова *serce*, з-за чаго перакладчык / перапісчык схіліўся да беларускага слова.

[129] Ар. *fir'awn* = фараон.

[130] Наконт *wiadomszy* параўн. Suter (1993).

тагачаснай агульнапольскай мовы. Прыклады: *ōn jest z-dōmōw nalatweišij i naslabšij dōm pajōnkōwij* (323b4), *pewne nagōršij člōwek ū pana bōga glūchij prawdi ne-slūchajōncij {lā ilāha illā llāh}*[131] *ne-mōwoncij* (138b8), *jak'e slōwe jest najlepše slōwe* (393a5), *pōčawši ōd raju firdewśi*[132] *najwišš̄egō āž dō raju 'edna*[133] *ceką zespōdū jich rek'ī* (251a7), *śiğğīn*[134] *jest najhlibše ōd śedmi pekal tūrma zapečentōwanō pečencą bōžą pek'elna mūka* (484b4). Характэрным для тэксту тэфсіра з'яўляецца апошні прыклад *najhlibše* (найглыбейшы), бо гэтая беларуская форма найвышэйшай ступені рэгулярна паўтараецца. Але разгледжаны ў цэлым беларускі ўплыў у формах ступеняў параўнання нязначны.

14.3. Скарачэнні ў прыналежных займенніках

У тэксце тэфсіра мы знаходзім характэрныя для польскай мовы скарачэнні ў склонавых формах прыналежных займеннікаў *mój*, *twój*, *swój*. У пачатку склонавых канчаткаў узнікаюць групы галосных, якія размяжоўваюцца праз /j/. Яны лёгка падлягаюць скарачэнню кшталту *twójemu* > *twemu*.

Такія скарачэнні рэгулярна, калі не пераважна, сустракаюцца ў тэксце тэфсіра[135].

Прыклады скарочаных формаў займенніка *swój*: *slūgami są newolnikami śwentimi ne-wislawą gō slōwami swimi* (257b8), *tak też jest nemalō z-drōbaźgu ptakōw źwerow rōbakōw nenōšōncich žiwnōści swi pan bōg karmi i žiwī jich i też samich was* (325b1), *ōn jest prawdziwij dōwodzōncij prawda na te piśmō cō maš medzi renkōma swīmi* (356b5), *pewne ten muchemmed w rečach swich barzō dziwnij* (370a6), *ci ktōre bōjōn-śe pâna bōga swegō dla nich jest raje ceką spōd nich rek'ī žiwonce* (59a5).

Прыклады скарочаных формаў займеннікаў *mój* і *twój*: *ā tō dla tegō że-śce bōjali pōstrachu megō zamerōnich terminōw* (199a2), *či-žōndaš ōd nich zaplati za ūwerene āle zaplata bōga twegō spaśenja jest lepše* (276a7), *rekli ne-biliśmi sprečnimi terminōwi twemū* (252a6), *rekl ōcec ī sinū mōj ne-pōwadaj widzena swegō na twe bracje* (181b2).

Побач з гэтым мы рэгулярна знаходзім таксама нескарочаныя формы: *wlōž renke twoje w zanadre twoje i wijōl jakō śneg bjâlą trendōwatą ā ne-bōlōncą* (248a5).

---

[131] Ар. *lā ilāha illā llāh* = няма бога, акрамя Алага.

[132] Ар. *firdaws* = рай.

[133] Ар. *'adn* = Эдэн.

[134] Ар. *siğğīn* = пякельная турма.

[135] Параўн. Smolińska (1983), p. 83.

15. ПРЫСЛОЎІ

У польскай мове прыслоўі ўтвараюцца ад прыметнікаў з дапамогай фармантаў *-(i)e* і *-(i)o*. Побач з гэтым сустракаюцца вядомыя выключэнні накшталт *po polsku* альбо імёны з застылымі склонавымі формамі[1].

Беларускі ўплыў выяўляецца ў прыслоўях у слабой тэндэнцыі да дадатковага выкарыстання беларускага фарманта *-o* (пад уплывам акання *-a*), таму што беларуская мова не ведае фарманта *-(i)e* пры ўтварэнні прыслоўяў. Тыповымі з'яўляюцца запазычанні з беларускай мовы, такія як *dobra,* якое пранікае ў тэкст тэфсіра побач з распаўсюджаным польскім *dobrze*.

Пераважная большасць прыслоўяў, якія можна знайсці ў тэксце тэфсіра, з'яўляюцца рэгулярнымі ўтварэннямі, звычайнымі для польскай мовы: *prijdą lūdze dō cebe pešō bōsō* (266b8), *rekl bōg rūc-ją ōd śebe ī mūśâ*[2] *gdi rūcil ją ōd śebe āle wnet ōbačil ź nej smok[a] prendkō begajōncegō* (248a4), *gdzekōlwek bendzece prijdze dō was waša śmerc chōcbiśce bili u wečach w zamkach twardō mūrōwanich* (69b8), *žili pō rōzbōjśkū tedi žebi jich zabijali ābō wešali ābō ūcinali renca īch i nōgi īch na preciwek* (87b2), *mōwil pō 'ibrejśkū i pō 'erabśkū* (186a8), *prišla jim gōdzina dna sōndnegō znenacka rekną ī beda naša* (101b5), *k'edi prišenžece sterežce-ž pilnō priśengi wašej bōgū ūčinōnej* (95a2), *učiniliśmi latwo korān pec na jenzik twoj ī muchemmed a tō žebiś świástōwal tim bōjaźnikōm bōžim* (247a2), *bō pan bōg jest twardō karajōncij* (40b6), *ōn jest dōbre wjádōm jak'ij mace zamisl w sercach swojich* (375b7), *ne-mają bic rōwni židzī greci cō jim piśmō danō z-lūdem sprewedliwim cō čitają korān bōžij časōw wečōrnich i ōni padają dō śeğdejū*[3] *i werą šćire bōgū i dnū ōstatnemū i prikezūją kū dōbremū ā ōdwōdzą ōd zlich grechōw* (50b3), *pan bōg dal za tō cō mōwili raje ceką ōd spōdkū rek'ī žiwōnce wečne bendą w nich* (94b3), *ā ktō tegō času zabilbi z-was ktō bi ūmislne*[4] *tedi ma ōšacōwac tak wele ceni cō zabil [...] nech tō ōšacūje dwoje lūdzej sprawedliwich* (95b5), *ā k'edi śe dōtkne lūdzej zarazi chōrōbi glōdi pripadk'i bendōn-śe mōdlic bōgū swemu mōdlic žalōśne i nawrōcōn-śe dō negō* (329b2).

---

[1] Для дыстрыбуцыі фармантаў *-(i)e* і *-(i)o* можна прыняць даволі строгія правілы. Напрыклад, фармант *-(i)o* з'яўляецца пры мяккіх і гістарычна мяккіх асновах, а таксама пры асновах, якія заканчваюцца на */k, g, ch, p, b, s, d/* альбо ўтвараюцца з пэўнымі марфемамі, такімі, як *-owy*. Фармант *-(i)e*, у сваю чаргу, прадуктыўны пры большасці прыметнікаў на *-ny*, зноў жа з вядомымі выключэннямі, такімі, як *trudny* > *trudno* і г.д.

[2] Ар. *Mūsā* = Майсей.

[3] Ар. *sağda* = прастэрнацыя падчас рытуальнай малітвы.

[4] Польск. *umyślnie* = "наўмысна"; змякчаны */s'/* тут непаслядоўна быў запісаны праз цвёрдую графему *ṣād* = *s*.

Толькі час ад часу здараюцца такія ўтварэнні, як *znowa* замест *znowu* (зноў) альбо *znagła* (раптам) замест *nagle*: *bili weseli s-tegō cō danō jim znowe wźenliśmi znagla i sami wedzeli że śe ōšūkali* (103a2). На базе беларускага субстрату можна канстатаваць слабую тэндэнцыю да ўтварэння прыслоўя з фармантам *-o* (*-a*) замест *-(i)e*: *wziwajce gō i mōdlce-śe bōgū wašemū s-płačem jawnō i w sercū tajemnō* (122a3), *tegō časū słūšnō tō ābserwowac* (25b5), *podōbnō wi jim mōwice* (12b6), *we ktō jim miśli źle a ktō dōbra* (29a4), *bōndzece wī słūgami bōžžimi słūžōnc mū šćirō* (47b1), *spōkōjna chwalce bōga jakō na'učil was* (32a8).

У прыслоўях мы знаходзім таксама характэрнае суіснаванне розных формаў, графічна-фанетычных варыянтаў, для дыстрыбуцыі якіх немагчыма вызначыць правілы: *bō pan bōg dōbrō widzī słūgi swoje* (41b7), *āle terez wī bendzeca zwicenžcami jeśli bendzece dōbra weric* (52b6), *bō pan bōg dōbre widzi słūg swojich* (41a6), *słūchaj dōbre tō cō z-nadchnena megō tōbe pōwe-śe pewne ja-m jest bōg nimaš inšegō bōga tilkō ja* (247b6), *peklō barzō źle pōmeškana i mejsca zle* (292b5), *pan bōg bârzdō lūbi dōbrōci činōncich* (95b2).

Некалькі формаў ступеняў параўнання: *rekl jūzuf*[5] *pewne bōže mōj wenźene milej mne ōd tegō cō wziwają mne dō tegō* (184a5), *ū boga są tajemnici nebešk'e i źemšk'e i ne-prikezal wedzec skōnčena świątū tilkō stane-śe tō tak prendkō w mgnenū ōka ālbō i za tō prendzej ōn tō we* (214a7), *pewne bōg lepej zna chitrōšci* (45a3).

[5] Ар. *Yūsuf* = Іосіф.

16. МАРФАЛОГІЯ ДЗЕЯСЛОВА

Неабходна прынцыпова канстатаваць, што марфалогія дзеясловаў, як мы яе знаходзім у тэксце тэфсіра, у цэлым адпавядае польскаму спражэнню дзеясловаў. На гэтую польскую базу час ад часу пранікаюць беларускія асаблівасці, якія, аднак, толькі ў выглядзе выключэнняў набываюць сістэмны статус.

Далей можна будзе супаставіць некалькі фактараў, якія наклалі своеасаблівы адбітак на марфалогію дзеяслова.

1. Асобныя лексемы больш ці менш рэгулярна выступаюць у асаблівых формах, якія з'яўляюцца вынікам уплыву беларускай мовы. Так, напр., можна канстатаваць павышанае пранікненне беларускіх дыялектных формаў у дзеяслове *wierzyć* (верыць). Дзеяслоў *verati* зафіксаваны ў беларускай мове XVI ст.: *i lūdze greci čemū ne-werace i zapirace piśmū bōžžemū t'ewrīt*[1] *inǧīl že wī świedčice-śe že ōd bōga* (46a8), *pane bōže naš werami tōbe cō zeslaleś inǧīl* (45a2), *mow ī muchemmed weram ja bōgū jedinemū* (47b8). Спарадычна таксама з'яўляюцца формы з перагаласоўкай: *rekli warami panu bōgū ōbačiwši menke* (353a5) *mī mami weric w tō cō zeslanō nam w t'ewrīt'u āle ne-waramī w tō cō pō nej* (14b1), *zapewne ja ūwarem*[2] *bōgū wašemū* (360a5). Як і для іншых асаблівасцей, тут таксама немагчыма канстатаваць адзіную моўную карціну. Польскія альбо беларускія формы з'яўляюцца ў выпадковым размеркаванні, якое нельга ахапіць правіламі: *ne-werimi mōwilišce jawne bili wam grechi cō činili pretō gōdni-šce temū karanū* (410b7), *k'edī bendze čital na nich korān rekną werami temū pewne ōn prawdziwij jest korān* (315b4), *weremī bōgū ā ti bōndz świádk'em na tim że mi pewne jesteśmi muśulmanami* (45a2), *werice kśengōm wšitk'im ā k'edi śe zejdą z-wami mōwą werami* (51a5).

Далей, дзеяслоў "пець, рэцытаваць" (польск. *śpiewać*) заўсёды з'яўляецца ў сваёй беларускай форме *peć*. Пры гэтым характэрна, што гэта пераважна ўзнікае ў структуры фразеалагічнага дзеяслова, утворанага з арабізмам: *ā tī ne-pej ǧinaźe*[3] *ni-nad jednim ź nich* (154a6), *anjōlōwe jegō selewât*[4] *pejūc i prōźbe činą na prōrōke* (346a4), *i też ktōre nemaź*[5] *pejuc i te cō z-risku*[6] *swegō ōfarūją* (267b5),

---

[1] Ар. *tawrā* = Тора; ар. *inǧīl* = Евангелле.

[2] Тут са *scriptio defectiva* галоснага */a/* толькі праз *fatḥa* = *e*.

[3] Ар. *ǧanāza* = пахаванне, пахавальны рытуал.

[4] Ар. *ṣalā* (мн.л. *ṣalawāt*) = малітва, бласлаўленне.

[5] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[6] Ар. *rizq* = сродкі існавання.

i wziwal dō nemaźu[7] *korān pejūči i blisk'im stal jeden drūgegō scisnuwši*[8]*-śe jeden na drūgim dla prislūchana čitanja muchemmedowegō* (472a3)[9].

Рэгулярна мы сустракаем асобныя дзеяслоўныя формы, якія адлюстроўваюць уплыў беларускага субстрату: *ja tilkō wam dōnōše bōžže slōwo bō pan bōg dōbrō widzī slūgi swoje* (41b7), *pane bōże ne zastawlaj na źemī iź newernikōw nikōgō* (470b6), *prirečene učiną mōcne pōd priśengą pō tim zlamają* (15a7).

У вялікай колькасці іншых дзеяслоўных формаў немагчыма правесці мяжу паміж беларускімі і польскімі формамі, бо яны ідэнтычныя ў абедзвюх мовах.

2. У сферы ўтварэння дзеясловаў з прыстаўкамі можна канстатаваць анамаліі, пропускі, скарачэнні і змяшэнні, тыповыя для польскай мовы крэсаў: *āle świádk'i mejce k'edi cō kūpūjece predajece*[10] (39a1), *k'edi pōtkace-śe s-timi ktōre newernikami są w bōjū ne-pōdawajce-śe jim* (138a6), *čemū wī īdzece i prestempūjece*[11] *dō mōnžčiznī činōnc grech sōdōmśk'ij* (300a4), *āzalibiśce zegrali-śe ōd źimna* (313a5).

3. Пры ўтварэнні асноў у некаторых дзеясловах выяўляюцца асаблівасці; напр., у дзеясловах на *-iwać / -ywać*, дзе не заўсёды адбываецца змена асновы. Знаходзяцца такія формы, як *oszukiwają* замест *oszukują* (ашукваць)[12]: *ōšūk'iwają pana bōge i tich ktōre ūwerili āle ne-'ōšūkają tilkō sami śebe* (6b1). Далей, у асобных дзеясловах, напр., *oznajmiać* (абвяшчаць), *korzystać* (карыстацца), мы сутыкаемся з пашырэннем асновы праз суфікс *-owa-* (цяперашні час *-uj-*), што з'яўляецца тыповым для крэсаў. Так, сустракаюцца такія формы, як *oznajmuje*[13] замест *oznajmia* альбо *korzystował* замест *korzystał*: *ōtō tak ōznajmūje bōg wam u korāne āzalibiśce dōmiślali ž ten świat dōčasnij ā tamten wečistij* (29a1), *āle ten cō zblōndził i kōristōwał sōbe pōžica tegō świáta lepej niž prišlegō tedī zapewne dla nich jest peklō* (481b6).

4. У некаторых канчатках як фаналагічны фактар рэгулярна дзейнічае аканне, напр. у канчатках 1-й ас. адз. л. на */-ę/ > /-a/*.

5. Як фаналагічны фактар дзейнічае таксама тэндэнцыя да звужэння галоснага перад насавым */m/*, напр. */-łem/ > /-łym /* у форме 1-й ас. пр. ч.

6. Можна канстатаваць толькі асобныя рэфлексы рэдукцыі ненаціскных галосных. Часам мы знаходзім пераход канцавога */-e/* ў */-i, -y/*, напр. */-cie/ > /-ci/* ў форме 2-й ас. мн. л.

---

[7] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[8] Дзеепрыметнік *scisnuwši-śe* можна прачытаць па-польску таксама як *scisnowši* з дэназалізацыяй */ą/ > /o/* перад */w/*. Параўн. Kurzowa (1993), p. 82, 85.

[9] Гл. >>> 3.4. Фразеалагічныя дзеясловы; параўн. >>> 16.2.6. 3-я асоба множнага ліку цяперашняга часу. Наконт фразеалагічных дзеясловаў, утвораных з арабізмамі, у пісьменстве татараў Вялікага Княства Літоўскага гл. Несцяровіч (1983), с. 137–147; Suter (1993).

[10] Параўн. Kurzowa (1993), p. 194.

[11] Параўн. Kurzowa (1993), p. 196.

[12] Параўн. Kurzowa (1993), p. 195.

[13] Параўн. Kurzowa (1993), p. 156; Łapicz (1986), p. 196.

7. Некаторыя архаічныя канчаткі захоўваліся ў польскай мове крэсаў даўжэй, чым у агульнапольскай мове. Ва ўмоўным ладзе мы сустракаем у 1-й ас. мн. л. канчатак *-bychmy*, а ў інфінітыве – формы на *-ci* (у тэксце тэфсіра звычайна перад суфіксальным зваротным займеннікам *się*).

8. Як тыпова беларускія марфалагічныя інтэрферэнцыі выступаюць у прошлым часе ў 1-й і 2-й асобе ў адзіночным і множным ліку формы без канчаткаў.

9. Побач з гэтым у асобных выпадках паказваюцца выпадкова праніклыя беларускія канчаткі. Асабліва характэрнымі з'яўляюцца ў цяперашнім часе канчаткі *-ić* і *-uć* 3-й ас. адзіночнага ліку і 3 ас. множнага ліку. У прошлым часе ў 3-й ас. адз. л. м. р. звычайна ўжываецца канчатак *-ŭ* (запісанае праз графему *wāw* = *w*) як рэфлекс пераходу */ł/* > */ŭ/* у беларускай мове. Таксама даволі часта назіраюцца формы 1-й ас. мн. л. з суфіксам *-mo*[14], якія можна расцэньваць як беларускі ўплыў.

10. Важны фактар, які вызначае выгляд канчаткаў, што мы знаходзім у тэксце тэфсіра, палягае ў выкарыстанні арабскага пісьма і яго транслітарацыі. На пісьме, напр., галосныя */i/* і */y/* не адрозніваюцца, так што ў транслітараваным тэксце немагчыма адрозніць канчатак *-ić* ад *-yć* і *-im* ад *-ym*. Таму ў прошлым часе і ва ўмоўным ладзе немагчыма адрозніць не мужчынска-асабовыя формы на *-ły* ад мужчынска-асабовых на *-li*. Акрамя таго, маюць значэнне шматлікія выпадкі *scriptio defectiva* галоснага */a/* толькі праз *fatḥa* = *e*.

16.1. Інфінітыў

Фармант інфінітыва */-c'/*, які паходзіць са змякчанага */-t'/*, у арабскім пісьме тэксту тэфсіра звычайна запісваецца праз графему *ce* = *c*[15].

У дзеясловах на *-ać* гэтая марфема даволі паслядоўна запісваецца праз камбінацыю *alif* + *fatḥa* + *ce* = *-ac*. *Scriptio defectiva* галоснага */a/* толькі праз *fatḥa* = *e* ў гэтай пазіцыі практычна не сустракаецца: *ne-ma śe-gō tikac tilkō čistōśc majōncij* (440b1), *ōtrimali pōzwolene fūndōwac meśǧid*[16] *na śkōda muśulman i dla jawnij newernōści i dla rōzlōnčena zgōdī medzi werōncimi* (156b8), *i wspōmni w ten dzen kōnsac bendą newernici rence swoje* (289b7), *śemenčōwac*[17] *jim bendze w ten dzen ānjōlōwe rajem* (442a4).

У дзеясловах на *-ić* / *-yć* у арабскім пісьме немагчымая дыферэнцыяцыя паміж */i/* і */y/*. Гэтая марфема звычайна запісваецца з дапамогай камбінацыі *kasra* + *ce* = *-ic* і большай часткай без *scriptio plena* галоснага. Якасць галоснага паказваецца ўскосна толькі праз цвёрдую альбо мяккую зычную графему перад

[14] У абвесным ладзе толькі ў некаторых няправільных дзеясловах (*damo, jamo* і г.д.) (V клас), а ў загадным ладзе ў некаторых дзеяслоўных групах.

[15] Параўн. Łapicz (1986), p. 205 f.; Kurzowa (1993), p. 193 ff.

[16] Ар. *masǧid* = мячэць.

[17] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

марфемай: *ne-mają mōci ūmōric ānitež ōžiwic āni ź nimi wskrešic* (288a1), *i prijdą tam dō nich chlōpci slūžic jim* (430b1).

Дзеясловы на *-eć* заўсёды запісваюцца праз камбінацыю *fatḥa* + *ce* = *-ec*. Трэба звярнуць увагу на тое, што гэтая марфема ніколі не падлягае аканню таксама і ў беларускай мове: *ā žadin wedzec ne-mōže tich wikladōw tilkō pan bōg* (40a7), *dōšic jim pek'elnej menk'i wšedši tam gōrec bendą* (445b7), *i prijdze jim śmerc ze-wšitk'ich strōn āle ūmrec ūmrec ne mōgą* (199a5), *pan bōg daje slišec kōmū chce ā tī ne-mōžeš nic slišec tich cō w grōbe* (355b8), *pewne slūdzi mōje ne-mōžeš tī mec nad nimi mōci tilkō nad nim[i] cō ūdajōn-śe za tōbą* (204b7).

У дзеясловах на *-ąć* насавы галосны запісваецца расчэплена са *scriptio plena* галоснага */o/* праз *wāw* + *ḍamma* = *ō* і кансанантную графему *nūn* = *n*, што мае месца звычайна ў сярэдзіне слова: *ne-sliší ānitež wīdzī i nemōcnij ōdjōnc ōd cebe zlich prigōd* (243a8). Побач з гэтым спарадычна сустракаецца дэназалізаваны спосаб напісання праз *wāw* + *ḍamma* = *ō*, які ў прынцыпе можна чытаць бліжэй да беларускай мовы, як */-u/*: *ne-mōgą pōlknōc* (199a4); альбо на беларускі манер: *pōlknūc*.

Інфінітыў з асновай на зычны даволі рэгулярна запісваецца праз камбінацыю *ṭā'* + *ce* = *śc*: *prijdze dō cebe muśulmanka i prida tōbe renka na tim že ne-ma rōwnac na pana bōga dō žadnej reči i ne-ma krašc i ne-ma cūdzōlōžic i ne-ma dawic dzeci swoje ā ne-prichōdzic ź dzecencōm klamliwim* (452a4), *i dali-śe źweśc i w wjárī jich w tim zōstali klamcami* (42a5).

Прыцягвае ўвагу тое, што ў сферы ўтварэння інфінітыва ў тэксце тэфсіра сустракаюцца формы на *-ci*. Пры гэтым размова ідзе пра асаблівасць паўднёва-заходняга беларускага дыялекту[18], якая спарадычна праяўляецца. Фармант *-ci* з'яўляецца выключна ў пазіцыі перад суфіксальным зваротным займеннікам *się*: *ā k'edi čitaci-śe bendze nad nim naše naznačōni ājet'i*[19] (410a5), *pitaci-śe ne-bendą* (317a2), *ōčiščaci-śe bendze* (355b5), *ne-būdzece bōjaci-śe* (422a3), *nech ne-pōkazūją ūchondōstwa strōje tilkō cō krici-śe ne-mōže ź nich jakō twar tilkō naleže ōdkriwac* (282a4). Як абсалютнае выключэнне мы знаходзім спосаб напісання праз цвёрдую графему *ṭā'* = *t*, без змены */t'/* > */c'/*: *či-ne strašili was spōtkati-śe ōtō s-tim dnōm teraznejšim* (382a1).

16.2. Цяперашні час

16.2.1. 1-я асоба адзіночнага ліку цяперашняга часу

У 1-й ас. адз. л. у цяперашнім або ў цяперашне-будучым часе ў тэксце тэфсіра сустракаюцца выключна польскія канчаткі *-am*, *-ę* і *-em* адпаведных спражэнняў. Пранікнення беларускага канчатка *-u* не назіраецца[20].

---

[18] Параўн. Łapicz (1986), p. 205: "Formy te tłumaczą się jako płd.-zach. gwaryzmy brus., znane szczególnie w rejonie Grodna, Wołkowyska, Brześcia (DABM, mapa 173)."

[19] Ар. *āya* = знак, каранічны верш.

[20] Параўн. Łapicz (1986), p. 195 f.

Канчатак *-am*, як правіла, запісваецца праз камбінацыю *alif* + *fatḥa* + *mīm* = *am*: *na negō ōpeke skladam i dō negō nawrōcam-śe* (396a6), *ja ne-dōmišlawam-śe że mam powstac* (394b8), *mōw tī nawracam-śe ščire twarą swoją kū bōgū* (41b5), *mōwi pan bōg ne-pōsilam ja ānijōl tilkō s-pōtrebą* (203a3), *bōże mōj pritūlam-śe dō cebe ōd znūščena mnōgich šetanōw* (277b6), *zapewne ja zrekam-śe ōd tegō cō wi jim slūžice* (402a8).

Канчатак *-ę* у арабскім пісьме заўсёды запісваецца дэназалізавана толькі праз *fatḥa* = *e*: *mow ī muchemmed pewne ja ide i naśladūje tō cō ōbweščōnō mne ōd bōga megō* (136b3), *ōtō dōnōše*[21] *wam pōselstwa i prikezane bōga megō i napōminam was ī wam ōd bōga tō cō ne-wece wī* (122b5), *i pōzamikala wšitk'e drwī i rekla ōtō śe ōddaje tōbe rekl jūzuf*[22] *ūcekam-śe i pōlecam-śe bōgū panū mōjemū* (183a4), *i ješčō was winšūje i śemenčūje*[23] *pōslōm cō prijdze pō mne ima jegō āchmed*[24] *ma bic* (453a2).

У суфіксальных зваротных займенніках ужываецца расчэплены спосаб напісання канчатка *-ę* > *-en*, як гэта звычайна адбываецца ў сярэдзіне слова: *pewne ja bōjen-śe* (385a8). Пры гэтым часам выяўляецца ваганне ў якасці насавога: *pewne ja bōjōn-śe* (385b3).

Дэназалізаваны канчатак *-ę* > *-e* ў канцы слова часта падлягае аканню і тады запісваецца ў тэксце тэфсіра як галосны */a/* праз *alif* + *fatḥa* = *a*: *pewne ja ūmōre cebe i pōdnōse cebe dō śebe i ōčišča cebe ōd tich ktōre tōbe źle činą* (45a4), *rekl cō tō mne ne-widza ūdōda ābō stal ōd zginōnich zapewne ūčine mū kerana twarda ālbō zarzne gō* (304a5).

Канчатак *-em*, як правіла, запісваецца праз *fatḥa* + *mīm* = *em*: *ne ōznajmūje płačū i frasūnkū tilkō dō bōga bō ja wem ōd pana bōga tō cō wi ne-wece* (189b7).

У якасці копулы пры 1-й ас. адз. л. ужываецца форма *jestem*, дзе канчатак *-em* часта выступае энклітычна ў характэрнай польскай манеры: *i pewne jestem wam napōminacem cichim zicliwim* (123a5), *ja-m jest z-muśulman werōncich* (168b3), *mōw pewni-m*[25] *ja wam jest pōstrašicel i jawnij ūpōminac*(206b8). Спарадычна ў функцыі копулы сустракаецца толькі *jest* без якога-небудзь абазначэння асобы: *ānitež mōwe wam że jest' ānijōl* (103b2).

16.2.2. 2-я асоба адзіночнага ліку цяперашняга часу

Канчаткі 2-й ас. адз. л. *-asz, -ysz / -isz* і *-esz* цяперашняга альбо цяперашне-будучага часу ў тэксце тэфсіра звычайна запісваюцца праз графему *šīn* = *š*: *alif*

---

[21] Тыповымі з'яўляюцца такія змяшэнні як: *donieść* > *doniosę* (прынесці); *donosić* > *donoszę* (данасіць).

[22] Ар. *Yūsuf* = Іосіф.

[23] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

[24] Ар. *Aḥmad* = Ахмад (высокапахвальны) (форма найвышэйшай ступені параўнання прыметніка ад кораня *ḥmd* – хваліць).

[25] Гл. >>> 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

+ fatḥa + šīn = -aš, kasra + šīn = -iš і *fatḥa + šīn = -eš*[26]: *daješ krōlewstwa i skarb kōmū chceš ōdbiraš krōlewstwa i skarb ōd kōgō chceš pōświenciš i ōčiściš tegō kogō chceš pōhanbiš i pōniżiš kogō chceš* (42a7), *bendzece na nich wśadac i witchneš sōbe na gribece jegō* (401b1).

Як выключэнне канчатак можа асіміляваць з суфіксальным зваротным займеннікам *się*, і тады ён запісваецца праз графему *tā' = ś*: *rekl śulujman*[27] *či-prawde mōwileś ālbō jesteś ōd klamliwich i pōjdześ s-pisanem mōjim ōtō tim i ōddaś dō nich ā pōtim wrōciś-śe s-tamtōnd āle pripatrūj-śe i prislūchaj-śe ś-čim zaś wrōciś-śe* (304b6-8).

Часам праяўляецца тэндэнцыя да рэдукцыі ненаціскнога */e/ > /i, y/*: *ci*[28]*-mōžiš īch ūwolnic* (377a1), *či-mōžiš tegō naprōwadzic ktōrij w blendze jawnim* (403a7). Тыповым у гэтай сувязі з'яўляюцца ваганні ў гучанні, як гэта можна ўбачыць у наступным прыкладзе: *ūprōwadziš nōc w dzen i wiprewadzeš dzen w nōc i wiwodziš żiwegō z-martwich i wiwodziš martwegō ōd żiwegō i nadaraš pōżitk'em kōgō chceš* (42b1).

У якасці копулы мы знаходзім форму *jesteś*, у якой канчатак *-eś*, як звычайна ў польскай мове, можа функцыянаваць у якасці энклітыкі. Пры гэтым часам можна знайсці падвойнае напісанне канчатка ў энклітычнай пазіцыі і адначасова суфіксальна пры асноўнай форме *jest*: *jeśli-ś tī jest prōrōk prawdziwij* (123b1), *i mōdl-śe dō pana bōga pewne-ś-tī jesteś naprōwadzōnij na drōge prawdziwą* (270b6), *bō pan bōg wjádōm że-ś-ti-jesteś pōsōl jegō* (455a4). Побач з гэтым у якасці копулы таксама сустракаецца адзін толькі энклітычны канчатак *-(e)ś*: *rekl jemū mōjżeś pewne-ś-tī blendnik jak'ij jawnij* (311b7).

16.2.3. 3-я асоба адзіночнага ліку цяперашняга часу

У польскай мове, як у большасці іншых славянскіх моў, яшчэ ў далітаратурны час наогул знік атрыманы ў спадчыну з праславянскай мовы канчатак 3-й ас. адз. л. *-t'*[29]. У беларускай мове ў спражэнні на *-ić* | *-yć* захаваўся канчатак у форме *-c'* (<*-t'*). Канчаткі 3-й ас. адз. л. адпавядаюць у польскай мове галосным асновы розных спражэнняў.

Канчатак *-a* спражэння *-am, -asz* у тэксце тэфсіра звычайна запісваецца праз *alif + fatḥa = a*. Пры гэтым, як правіла, не бывае *scriptio defectiva* праз адну толькі *fatḥa = e*. У канчатку *-y / -i* спражэння *-ę, -isz* немагчыма графічна адрозніць */y/* і */i/*. Гэты канчатак у большасці выпадкаў запісваецца *scriptio defectiva* толькі праз *kasra = i*, хаця *scriptio plena* з *jā' + kasra = ī* часта сустракаецца

[26] Параўн. Łapicz (1986), p. 196.

[27] Ар. *Sulaymān* = Саламон.

[28] Пры ўжыванні польскай пытальнай часціцы *czy* часам пранікае беларускае гучанне.

[29] Гл. Strutyński (1993), p. 141; гл. Klemensiewicz (1965), p. 359.

ў канцы слова. У спражэнні *-ę, -esz* альбо *-em, -esz* канчатак 3-й ас. адз. л. заўсёды запісваецца толькі праз *fatḥa* = *e*; каканне ніколі не мае месца ў гэтай пазіцыі: *ōstrega was bōg dūšī wašej bō panbōg jest' milōšciwij slūgam swojim* (42b8), *bō ōn mūṣī-še wstidac ōd was* (345b3), *pan bōg dōbre widzi slūg swojich* (41b6), *ãle bōg twori cō chce k'edi zachce mōc i wola jegō pretō pewne rekne na tō stan-še tak i stane-še wedlūg woli jegō* (44b1), *ne-zrōwnūje-še ōbiwatel pek'elnij z-'ōbiwatelem rajšk'im* (449b6), *w ten dzen ne-weźme-še ōd was ōkūp* (442b2), *ne-tkne-še*[30] *īch tam prigōda ãni-chōrōba* (205a3). У наступным прыкладзе праяўляецца тэндэнцыя да рэдукцыі ненаціскнога */e/ > /i, y/* альбо звужаная артыкуляцыя */e/ > /é, i/* перад займеннікам, які пачынаецца з */j/*: *pewne ci ktōre newernimi są ne-pōmōži jim ōd tegō skarb jich* (50b6).

У спражэнне *-ę, -isz* у тэксце тэфсіра часам пранікае беларускі канчатак 3-й ас. адз. л. *-c*[31]. Гэты канчатак запісваецца графемай *ce* = *-c*, пры гэтым графема *ce* = *c* не выражае мяккасці */c'/*: *pan bōg sōndzic medzi was dna sondnegō* (78a1), *bō dōšic zblōndzic pan bōg tegō kogō chce i derigūje na dōbrō kogō chce* (197b3), *nawedzi-gō pan bōg jegō i ūčinic gō i nadaje-mū pōžitkōw* (489a1).

У копуле *jest* у тэксце тэфсіра звяртае ўвагу часты спосаб напісання праз графему *tā'* = *t'*: *ktō čini tak ne-jest' ten z-bōga w žadnej reči bō ne-jest' bōžij tilkō ten cō streže ware z-was ōstrōžnōšcą welką* (42b4). Наадварот, спосаб напісання праз *ṭā'* = *t* зусім рэдкі: *śwjádk'em jest sam bōg że ōn wlasnij bōg* (41b1). Часта копула прапускаецца паводле беларускага ўзору: *pewne medzi war wara ū pana bōga na' ilepša muśulmańska* (41b2).

16.2.4. 1-я асоба множнага ліку цяперашняга часу

Канчатак *-m* у польскай мове з'яўляецца атрыманым у спадчыну з праславянскай мовы канчаткам 1-й ас. мн. л. Ён, аднак, быў паступова выцеснены канчаткам *-my*, які, верагодна, узнік пад уплывам асабовага займенніка *my*[32]. Але першапачатковы канчатак *-m* дагэтуль захаваўся ў польскіх дыялектах.

У беларускай мове захаваўся першапачатковы канчатак *-m*. У некаторых гаворках беларускай мовы мы знаходзім дадаткова кантынуант канчатка ў форме *-mo*[33].

У тэксце тэфсіра мы звычайна знаходзім у некаторых спражэннях у функцыі канчатка 1-й ас. мн. л. сучасны канчатак *-my*. У спражэнні *-am, -asz* гэты канчатак, як правіла, запісваецца праз *alif* + *fatḥa* + *mīm* + *kasra* = *-ami*. Аналагічна ў спражэнні *-ę, -isz* ужываецца спосаб напісання *kasra* + *mīm* + *kasra* = *-imi*. У спражэнні *-ę, -esz* альбо *-em, -esz* сустракаецца спосаб напісання *fatḥa* + *mīm* + *kasra* = *-emi*. Канцавы *-y* канчатка *-my* запісваецца *scriptio plena* толькі зрэдку.

---

[30] Пра *tknie* гл. Kurzowa (1993), p. 195.

[31] Параўн. Łapicz (1986), p. 196.

[32] Гл. Strutyński (1993), p. 141; гл. Klemensiewicz (1965), p. 359.

[33] Параўн. Kurzowa (1993), p. 197; Łapicz (1986), p. 197; Rott-Żebrowski (1992), p. 150.

Некалькі прыкладаў: *ōtō te wjádōmōšc ź weści tajemnich ōbweščami prez ānijōla* (44a3), *naprōwadzami tim kogō chcemi z-chalōpōw našich* (400b4), *i ōžiwami tim mjesta zamarle sūchōtō* (401a7), *zapewne ōznajmimi tim ktōre newernimi bili tō cō činili* (395a7), *pewne-mī ūwolnimī jich wšitk'ich* (205b3), *rekliśce ne-wemi mī cō jest ōstatna gōdzina* (410b6), *pewne mī są rōzmōwami i žartūjemi z-sōbą* (151b8), *mōwili prišengami bōgū že zabijemi*[34] *salicha i pōtōmstwa jegō ā pōtim rečemi welīju*[35] *salichōwemū ne-biliśmi pri tim āni-patrali na tō na zgūbe jegō i pōtōmstwa jegō i jesteśmi zapewne ōd prawdziwich* (306b4), *źwestūjemi tōbe prawdziwą reč* (205a8), *w ten dzen prizōwemi ūšitk'ich lūdzej s-pōwodirami jich* (226b1).

У спражэнні *-ę, -isz* спарадычна з'яўляецца канчатак *-emy* замест *-imy / -ymy*. Тлумачэнне да гэтага можна было б шукаць у часта звужанай артыкуляцыі */e/ > /é, i/* перад */m/* і ў абумоўленым гэтым змяшэнні галосных */e, é, i/* ў гэтай пазіцыі[36]. У тэксце тэфсіра гэты канчатак часта нечакана ўзнікае ў дзеяслове *uczynić* (зрабіць): *pōtim bendzem prōšic bōga i ūčinemi preklenstwa bōže nad klamliwimi* (45b5), *bōže naš ūkaž nam te dwa pōlk'i ktōre zwedli nas z-ferejōw*[37] *i z-lūdzej ūčinemi jich i pōdbijemi pōd stōnpi nōg našich i ūčinemi ōd pōnižōnich* (392b8). З іншага боку, у спражэнні *-ę, -isz* у 1-й ас. мн. л. спарадычна сустракаецца канчатак *-im / -ym*, што зноў можна зразумець на фаналагічнай падставе звужэння галосных у пазіцыі перад насавымі[38]: *tilkō mī dō cebe prijdzim s-prawdziwim korānem wikladam* (290a7), *ōtō dziś zapečentūjim na ūsta jich* (362b3), *naśladūjim pōsla twegō 'īśâ*[39] (45a3), *reklī ī mūśâ*[40] *pewne w tij źemi są lūdze ōlbrimi welk'e dūže i mī pewne ne-wnidzim tam āž ōni unidą ź negō* (86a5), *i rekli nic tō ne-jest' tilkō pōžice dōčasnegō świjátū i jūž mī ne-pōwstanim* (101b2).

У тэксце тэфсіра ў спражэнні *-ę, -isz* кароткі канчатак *-m* сустракаецца ўжо значна радзей у параўнанні з сучасным канчаткам *-my*[41]: *pōtem ūwolnim tich ktōre bōjōn-še pâna bōga ā ūpūšcim trōjčanōw grešnich grešnich w pekla* (245b3).

Першапачатковы канчатак 1-й ас. мн. л. *-m* захаваўся пераважна ў спражэнні *-ę, -esz*, у якім ён нярэдка ўжываецца ў тэксце тэфсіра. Ён рэгулярна сустракаецца, напр., у дапаможным дзеяслове *być* (быць): *ā k'edi inačej ūčinimī nech bendzem grešnikami pōtenpōnimi* (97a4), *za pewne mī źemścimi-še ālbō tōbe ūkažem te menk'ī ktōre naterminōwališmi jim pretō zapewne nad nimi menk'i zadawac jesteśmi mōcnimi* (403a8), *ā ta źemjá ktōrá zla zamarla ne-rōšci ś-šebe tilkō nepōtrebne źele tak šafūjem cūdami našimi dla lūdzī chwala ōdajōncich* (122b1).

---

[34] Ар. *Ṣāliḥ* = Саліх (сумленны), імя ўласнае.

[35] Ар. *walī* = патрон, апякун у ар. племянным грамадстве, святы.

[36] Гл. Kurzowa (1993), p. 196; параўн. таксама Łapicz (1986), p. 198.

[37] Перс. *peri* = фея, дух.

[38] Гл. >>> 10.7.3. Змена *iM* > *eM*.

[39] Ар. *'Īsā* = Ісус.

[40] Ар. *Mūsā* = Майсей.

[41] Параўн. Kurzowa (1993), p. 196.

Спарадычна, але не бессістэмна з'яўляецца ў тэксце тэфсіра ў 1-й ас. мн. л. спражэнняў *-ę, -isz* і *-ę, -esz* канчатак *-mo*. Тут мае месца ўплыў беларускіх дыялектаў: *k'edi rekliśce ślišemō prikezane twoje* (84a1), *ōznajmūjemō tōbe wjádōmōści jich prawdziwe* (231a3), *ōdwrōcimō ōd nich zlōści i grechī īch (320a1), i slūšnō że skōštūjemō menk'i* (365a2), *pan bōg zbere nas na sōndnij dzen ōraz wšitk'ich i dō negō nawrōcimō śe* (397a3), *wejẓrice na nas ōśwecimō śe ōd świátlōści wašej* (442a6), *premenimō žōni lepše ōd was majōnc zdrōwą wjára majōnc īman*[42] (460b2), *pewne ōtō tak činemō newernikōm grešnikōm* (365a4). У апошнім прыкладзе адлюстроўваецца адкрытая артыкуляцыя галоснага */i/ > /é, e/* перад насавым */m/*.

Мы рэгулярна знаходзім ў 1-й ас. мн. л. копулу ў форме *jesteśmy*, звычайную для польскай мовы: *āni-patrali na tō na zgūbe jegō i pōtōmstwa jegō i jesteśmi zapewne ōd prawdziwich* (306b5). Але побач з гэтым мы таксама знаходзім канструкцыі, пабудаваныя з асновы *jest* альбо *są* і асабовага займенніка *my*: *reklī pewne-mī jest pōslanī dō lūdzej grešnich ōbwinōwac jich* (205b2), *rekli ci pōsli pan naš wjedōm że mī zapewne dō was pōslanimi są* (359b4). Апрача таго, мы часам знаходзім у копуле таксама канчатак *-mo* з беларускай афарбоўкай: *rekli ne-bōj-śe mī dwa prawnici jesteśmō* (371a5), *rekl ūčnōwe mī jesteśmō tōbe pōmōcnikami* (453b6).

16.2.5. 2-я асоба множнага ліку цяперашняга часу

Кантынуантам праславянскага канчатка 2-й ас. мн. л. *-te* ў польскай мове з'яўляецца канчатак *-cie*, які, між іншым, супадае з аналагічным канчаткам у беларускай мове.

У тэксце тэфсіра мы звычайна знаходзім канчатак *-cie*, запісаны праз камбінацыю *ce + fatḥa = -ce*: *jeśli zatajice miśli waši te cō w sercach wašich ālbō ōbjawice we tō wšitkō pan bōg* (42b5), *i dam wam wedzec tō cō wī jece i cō w zepas chōwace i tajice w dōmach wašich* (44b5), *dziwujece-śe że prišlō wam ūpōminane ōd bōga wašegō prez jenzik člōweka* (122b6), *bō ja was ne-mōge ratōwac i wī tež ne-mōžice*[43] *ratōwac* (199b8). Вельмі рэдка сустракаецца спосаб напісання праз *ce + alif + fatḥa = -ca*, які можна расцэньваць як рэфлекс акання: *pō tim dō negō pōwrōcica pō tim ōznajmi wam tō cō biliśce wī činōncimi* (104b6).

Копула рэгулярна з'яўляецца ў звычайнай для польскай мовы форме *jesteście*: *rekli pewne wī jesteśce lūd netūtejījšij* (205b4), *ne-jesteśce wī tilkō pōtōmpōne klamci* (332a5). Тут таксама зноў сустракаюцца канструкцыі, пабудаваныя з асабовага займенніка *wy* і асновы *jest*: *pewne w tim welk'e cūda wam jeśli wī jest' temū werōncimi* (44b6).

---

[42] Ар. *īmān* = вера.

[43] Звяртае ўвагу форма *môžice* замест *možece*. Тут або мае месца арфаграфічная памылка, або можна казаць пра рэфлекс рэдукцыі ненаціскнога галоснага; у такім выпадку можна прыняць іншы, г.зн. не польскі (на перадапошнім складзе) націск. Параўн. >>> 16.2.3. 3-я асоба адзіночнага ліку цяперашняга часу.

16.2.6. 3-я асоба множнага ліку цяперашняга часу

У тэксце тэфсіра звычайным канчаткам 3-й ас. мн. л. цяперашняга часу ва ўсіх спражэннях з'яўляецца канчатак *-ą*, які ў арабскім пісьме запісваецца праз камбінацыю *scriptio plena* галоснага */o/* з графемай *ṣagır-ı-nūn* = *-ą*: *ci ktōre ne-werą koranu i ājet'ōm*[44] *bōžžim dla nich jest menke twarda* (40a2), *zabijają tich ktōre prikezūją dō prawdī* (41b8), *słūchają tich lūdzej cō ū cebe ne-biwają i premenają fałšūją słōwa* (88a8), *takōwe chōc mają serce ne-rōzūmejąc tim chōc mają ōčī ne-widzą nimi ā chōc mają ūši ne-słišą nimi* (134b3), *pōdžegają gō lūdze ād drewa kamena nad tim są ānjōlōwe barzdō śilne twarde i ne milōserdne* (460b5), *chwalą chwalą należitō bōga ci-cō w nebōsach i na źemi* (441a2), *i wprōwadzī jich w raje ceką*[45] *spōd negō rek'i na wek'i tam w rōskōšach bendą* (447a7).

Перад суфіксальным зваротным займеннікам *się* гэты канчатак запісваецца ў расчэпленай форме: *bijōn-śe na drōdze balwanōw ābrazōw* (69b2).

Спарадычна можа пранікаць артыкуляцыя *-ą* > *-om*, якая сустракаецца ў вялікапольскім дыялекце[46]. Тады ў арабскім пісьме замест графем *nūn* = *n* альбо *ṣagır-ı-nūn* = *ñ* стаіць *mīm* = *m*: *są preklenci gdzekōlwek najdōm-śe lapaj jich i zabijaj jich zabicjem twardim* (346b5), *ūšadši prislōnōm-śe na pōścelech kōldrī jich žōltegō ātlasu* (437b3).

Радзей сустракаецца як дэназалізаваны варыянт канчатак *-o* (< *-ą*), які запісваецца без графемы *ṣagır-ı-nūn* = *ñ*: *wnet ūpadnō perūni i bliskawici* (7a6).

У тэксце тэфсіра мы знаходзім толькі вельмі рэдкія сляды беларускага канчатка *-uc'*. Гэты канчатак звязаны, напрыклад, з беларускім дзеясловам *пець* (польск. *śpiewać*), які ў кожным разе з'яўляецца складанай часткай фразеалагічнага дзеяслова, утворанага з арыентальнымі назоўнікамі: *anjōlōwe jegō selewât'*[47] *pejūc i prōźbe činą na prōrōke* (346a4), *i też ktōre nemaź*[48] *pejuc i te cō z-risku*[49] *swegō ōfarūją* (267b5), *bōjōn-śe bōga nemaź pejūc pō nōcach ūklōni činą i stojōnc-śe mōdlō i wistregajōn-śe ōd kerana wečnegō i spōdzewajōn-śe lask'ī bōga swegō* (376a2). Ва ўсіх прыведзеных прыкладах вартае ўвагі тое, што, за выключэннем названых фразеалагічных зваротаў, усе іншыя дзеяслоўныя формы маюць польскія канчаткі.

У тэксце тэфсіра як копула 3-й ас. мн. л. звычайна з'яўляецца форма *są* (< праслав. **sąt'*), пры гэтым насавы часам можа выступаць расчэпленым як

---

[44] Ар. *āya* = знак, каранічны верш.

[45] Трэба звярнуць увагу, што гэтая форма не паказвае пашырэння асновы *-n-*. Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 365; параўн. Kurzowa (1993), p. 195.

[46] Гл. >>> 10.5.3. Насавы *o* ў канцы слова.

[47] Ар. *ṣalā* мн. л. *ṣalawāt* = малітва, блаславанне.

[48] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[49] Ар. *rizq* = сродкі існавання.

-ą > *-on* альбо дэназалізавана як *-ą* > *-o*: *wšitk'e ričī są zrachōwane i wipisane w lewchi l-mechfūẓ*[50] (480a7), *kogō naprōwadzī pan bōg ten bendze naprōwadzōnij ā kōmū każe zblōndzic tedi takōwī lūdze sōn ōnī škōdnikami samich śebe* (134b1), *takōwe nacije sō ōnī lōtrōwe blendnī* (279b2).

Спарадычна для мн. л. выкарыстоўваецца таксама форма адзіночнага ліку *jest*: *šedl dō fera'ūna*[51] *i dō lūdū jegō pewne ōni jest lūdem blendnim lōtrōwśk'im* (303a8).

16.3. Прошлы час

Формы прошлага часу складаюцца з дзеепрыметніка незалежнага стану прошлага часу на *-ł* і формаў дапаможнага дзеяслова *być* (быць), скарочаных да канчатка. Канчаткі прошлага часу 1-й і 2-й ас. адз. л. і 1-й і 2-й ас. мн. л. могуць стаяць асобна ад дзеепрыметніка, таму што яны ўзніклі з самастойных дзеяслоўных формаў, і займаць энклітычную пазіцыю. У 3-й ас. адз. л. і 3-й ас. мн. л. выкарыстанне дапаможных дзеясловаў даволі рана, а менавіта ў XIV ст. выйшла з ужытку. У 1-й і 2-й ас. адз. л., а таксама ў 1-й і 2-й ас. мн. л. ужо ў XV ст. былі пераважна формы скарочаныя да канчаткаў, а поўныя формы дапаможнага дзеяслова цалкам зніклі[52].

У беларускай мове складаныя формы прошлага часу вельмі рана выйшлі з ужытку. Ужо ў XI ст. знік дапаможны дзеяслоў у 3-й ас. адз. і мн. л. У 1-й і 2-й ас. адз. і мн. л. яго выкарыстанне можна назіраць яшчэ да XIV–XV стст., а часам нават яшчэ ў XVI ст.[53]

16.3.1. 1-я асоба адзіночнага ліку прошлага часу

У тэксце тэфсіра ў 1-й ас. адз. л., як правіла, паказваецца тыповы польскі канчатак *-(e, a)m*: *i też ğanōw*[54] *stworilem ješčō pred tim z-'ōgna pek'elnegō* (204a4), *ūpersōnilem ūfōrmōwalem gō i nadchnelem*[55] *w negō z-dūcha našegō ālbō z-dūcha megō* (204a6), *ne-malem ja nad wami žadnej mōci tilkō jeśli wziwalem was* (199b6), *bō wšak bawilem-śe medzi was wek mōj pred tim pōk'i ne-bilam prōrōk'em* (161a8). Апошнюю форму *byłam* замест *byłem* можна патлумачыць уплывам акання ў выпадку, калі адсутнічае сінтаксічная інкангруэнцыя[56]. Зразумела, такія ад-

---

[50] Ар. *al-lawḥ al-maḥfūẓ* = "Патаемная скрыжаль" на небе, на якой напісаны спрадвечны Каран.

[51] Ар. *fir'awn* = фараон.

[52] Наконт развіцця прошлага часу ў польскай мове гл. Klemensiewicz (1965), p. 369 ff. Параўн. Strutyński (1993), p. 158.

[53] Гл. Rott-Żebrowski (1992), p. 160. Параўн. Łapicz (1986), p. 199. Параўн. таксама Stang (1935), p. 112.

[54] Ар. *Ǧān* = Ібліс, чорт.

[55] Наконт дэназалізаванай артыкуляцыі */ę, ą/* перад */l, ł/* у прошлым часе гл. >>> 10.5.1. Насавыя галосныя ў сярэдзіне слова.

[56] Параўн. Kurzowa (1993), p. 198.

хіленні сустракаюцца даволі часта: *ōdwrōcil-śe ōd nich i rekl i lūdze mōje wšak dōnōšilam wam pōselstwa bōga megō i napōminačem bilim wam* (124a7). У форме дзеяслова *byłem* > *byłym* адбываецца звужэнне /e/ > /i, y/ перад насавым /m/, так, як у наступным прыкладзе: *wšak dōnōsilim wam pōselstwa pana megō* (125b6). Такія канчаткі хаця не вельмі частыя, але яны ўпарта трымаюцца на працягу ўсяго тэксту.

Энклітычныя канчаткі таксама рэгулярна сустракаюцца ў тэксце тэфсіра: *zabawil-śe nedlūgij čas pretō prilecawši rekl ja-m-śe dōwedzel*[57] *cō ti tegō ne-wedzaleś* (304a7-8), *žalūje tegō że-m ne-trimal wespōl s-prōrōk'em drōgi prawdziwej* (289b8), *mow muchemmed ābō-m ja dō was ne-prišed z-direkciją slūšną ōd tegō cō śce naleźli na tim ōjcōw wašich* (402a5). У слове *przyszedł* з апошняга прыкладу ў арабскім пісьме не запісваецца канцавы /ł/, бо ён у вымаўленні застаецца амаль нямым. Такое падзенне можна назіраць часта.

Спарадычна сустракаюцца формы без канчаткаў, таму толькі з бліжэйшага кантэксту робіцца зразумелым, пра якую асобу ідзе размова: *ōdlōnčil-śe ōd was k'edi-m-śe bal ōd was* (294b3). Такія чаргаванні формаў без канчаткаў прошлага часу і формаў з энклітычнымі альбо далучанымі да дзеепрыметніка канчаткамі не рэдкасць у тэксце тэфсіра.

Праўда, можна часта назіраць пабудаваныя тыповым беларускім спосабам формы прошлага часу з пастаноўкай асабовага займенніка і без канчатка: *pewne ja učinila zarōk panū bōgū pōścic i milčac* (242a6). У наступным прыкладзе зноў з кантэксту простай мовы робіцца зразумелым, што маецца на ўвазе 1-я ас. адз. л.: *â k'edi pōrōdzila rekla bōże mōj pewne ūrōdzila dzewčine ā pan bōg wjadōmšij tō cō ūrōdzic mjála* (43a6). Выкарыстанне такіх формаў прошлага часу без канчаткаў знаходзіцца, бясспрэчна, пад беларускім уплывам.

16.3.2. 2-я асоба адзіночнага ліку прошлага часу

У 2-й ас., таксама як у 1-й ас. адз. л., у тэксце тэфсіра, як правіла, сустракаецца польскі канчатак *-(e)ś* ці *-(a)ś*, далучаны да дзеепрыметніка альбо ў энклітычнай пазіцыі: *rekl pân bōg i zwodzicelū cō ce ōdwodla žebiš-śe mal ūklōnic temū cō-m-gō stwōril wšechmōcnō renkō našą pōdnōsleš-śe w picha čemū ti jest'eš ōd wisōk'ich ānimūšōw rekl šetan ja-m jest lepšij ōd negō stworileš-mi ōd ōgna ā stworileš gō z-glinī rekl pan bōg pretō idz preč ōd nas bō stalaš zapewne ūbitij preklenstwam i pewne na cebe preklenstwa āž dō dna sōndnegō* (374a6-8), *i ne-bileš ti muchemmed čitajōncim pred korānem s-tich kśong perwšich i ne-pisaleš jich prawicą swoją* (324a8), *ne-bōj-śe ūwolnileš-śe ōd lūdzej kriwde činōncich* (312b5), *ābō-ś ne-wedzal ī muchemmed pewne panbōg jest' krōlewstwa nebešk'e* (88a4), *rekli ābō ś-ti dō nas pō tō prišedl žebiśmi-śe klanali i slūžili bōgū jednemū* (123a7).

[57] Трэба звярнуць увагу на адсутнасць перагаласоўкі; гл. >>> 10.6.1. Ляхіцкая перагаласоўка.

Часам сустракаюцца фанетычныя варыянты гэтага канчатка, якія знаходзяцца пад уплывам рэдукцыі ненаціскнога /e/ > /i/[58]: *prišlišmi dō tek'egō časū ktōrij naznačiliś nam* (112a2), *a wźeliś za žondze celesną pjanstwa i cūdzōlōstwa* (24b5).

У наступных прыкладах дзейнічае аканне: *w ten čas reklaś dō muśulman či-nedōsic wam że pōśilkūje was pan bōg waš trema tiśōncami ōd ānjōlow* (51b4), *ā k'edi ulepilaś z-glini jaką persōne ptaka ne-dōpira mōcō mōją i nadchneleś w negō i stanōl ptak'em za rōzkazanem i mōcą mōją* (97b5). Можна таксама параўнаць з вышэйпрыведзеным прыкладам: *[...] bō stalaś zapewne ūbitij preklenstwam [...]* (374a7). З кантэксту робіцца зразумелым, што размова ідзе пра "спакусніка" (*zwodziciel*), чорта, істоту мужчынскага роду[59].

Пад беларускім уплывам зноў выяўляюцца формы без канчаткаў, якія адносна часта сустракаюцца ў тэксце тэфсіра. З кантэксту робіцца зразумелым, якая асоба маецца на ўвазе: *čemū-ž ne-prišed dō nas z-'anōlami jeśli tī jest ōd prawdziwich* (203a3), *rekli či-tī-tō ūčinil ibrahīme tak'e obelgi bōgōm našim ī ibrahīme*[60] (260a7), *ne-bil tī wjádōm i muchemmed cō jest kśenga ānitež cō jest īman*[61] *tilkō ž ūčiniliśmi gō tōbe świetlōścą* (400b3).

16.3.3. 3-я асоба адзіночнага ліку прошлага часу

У польскай і беларускай мовах у 3-й ас. адз. л. прошлага часу ўжываецца толькі дзеепрыметнік з канчаткамі мужчынскага роду (нулявы канчатак), жаночага роду (*-a*) і ніякага роду (*-o*).

Прыклады мужчынскага роду: *pōtim približil-śe dō muchemmeda i barzō bliskō prišed* (431b6), *rōspōstarl risk*[62] *hojnij pōžitk'ī kōmu chce* (396a8), *āle ten cō zblōndzil i kōristōwal sōbe pōžica tegō świáta lepej niž prišlegō tedī zapewne dla tich jest peklō i tak'e mejsco īm ā ktō zaś mal bōjaźn bōžą i pretendōwal sōbe mejsca ū bōga swegō i pōstregal dūši swojej ōd zabaw świeck'ich pretō zapewne dla tich jest raj* (481b6).

Прыклады жаночага роду: *i prišla mōc bōžże na fūndūši īch i strōnsla fūndamente i ōbwalili-śe* (209a5), *pewne ti widziš źeme wischlą bez deżčū pretō k'edī zeslališmi na nō deżğ pōrōśila i widala z-śebe naśene i trawi* (393b6), *bōże naš prewicenžila i premōgla nad nami zlōśc i grechi naše i biliśmi lūdem blendnim* (278a6), *i pōslal pan bōg wrōna i wikōpâla jâmâ w źemi dla ūkazanjâ jemū jak ma zakric calō trūp brata jegō* (87a3).

Прыклады ніякага роду: *ścisnōlō śe serce jegō frasūnk'em i strachem i rekl ne-bōj-śe āni-śe frasūj zapewne mī cebe ūwolnimī* (322b6), *wišed muchemmed pretō*

---

[58] Гл. >>> 10.8.1. Звужэнне ненаціскнога /e/ > /i, y/.

[59] Параўн. Kurzowa (1993), p. 198 f.; яна канстатуе ў даследаваным ёю матэрыяле такія самыя адхіленні ў кангруэнцыі.

[60] Ар. *Ibrāhīm* = Абрагам.

[61] Ар. *īmān* = вера.

[62] Ар. *rizq* = сродкі існавання.

ščernalō serca jich (442b6), *i zebralō śe dō śulujmâna*[63] *wojśk'i jegō z-ferejōw*[64] *i ź lūdzī i s-ptastwa* (303b7), *i ōświecilō śe serce matk'ī mūśī*[65] *radōścą k'edi slišâla że sinem gō činą sōbe* (311a1).

Часта выяўляецца артыкуляцыя вуснай мовы, якая выразна адлюстроўваецца ў арабскай карціне пісьма; напр., дэназалізацыя */ą, ę/* перад */ł, l, l'/* альбо падзенне суфікса *-ł*[66]: *pretō nadchnōl dō slūgi bōžžegō tim duchem cō bōg nadchnōl na negō* (431b7), *pretō k'edī prišedl tam glōs zašed ōd strōni śinaj pečōri* (313a6), *rekla jedna s-tich dzewek i ōjča mōj najmi jegō na plata ābi pas nam drōbi* (312b6), *k'edi wjadōmō stalō jemū że jest ōn neprijacelem bōžžim zrek-śe ōd negō* (157b8), *pewne fera'ūn*[67] *pōdnōś-śe w picha na źemi* (310a6). У апошнім прыкладзе падзенне канцавога */-ł/* прыводзіць да асіміляцыі */s/ > /s'/* перад зваротным займеннікам *się*.

Акрамя таго, пастаянна сустракаюцца формы без перагаласоўкі, як у наступным прыкладзе: *wedzel pan bōg ktō z-was bōji-śe jegō* (95b3).

Спарадычна ў тэксце тэфсіра канцавы */-ł/* дзеепрыметніка запісваецца графемай *wāw = w* замест *lām = l*. Такія спосабы напісання, якія паказваюць пераход */-ł/ > /-ŭ/*, з'яўляюцца тыповымі для беларускіх тэкстаў[68]: *pretō ūśmichnōw-śe ōd slōwa tej mūrašk'i* (304a2), *zwodzicel pōdnōś-śe w picha ā ne ūklōniw śe i zōstal ōd newernich k'afirōw*[69] (374a6). Зноў жа тыповым з'яўляецца тое, што ў блізкім кантэксце формы прошлага часу запісваюцца то польскім спосабам напісання *lām = l*, то беларускім – праз *wāw = w*: *mī pewne naleźliśmi tō cō ōbecīwal nam bōg naš wšitkō prawdziwe też wī či-naleźliśce cō deklerōwaw bōg waš* (120b7).

16.3.4. 1-я асоба множнага ліку прошлага часу

У 1-й ас. мн. л. у тэксце тэфсіра ў відавочнай большасці выпадкаў сустракаецца рэгулярны польскі канчатак *-śmy*, які таксама паводзіць сябе як энклітыка. Гэты канчатак, як правіла, запісваецца праз камбінацыю *tā' + mīm + kasra = -śmi*. Часам сустракаецца поўнае напісанне (*scriptio plena*) галоснага ў канцы слова; спосабы напісаня *-śmy* праз графему *sīn = ś* рэдкія: *ā zatō pōtōpiliśmi tich ktōre klamali prikezana naše* (122b8), *učiniliśmi na nebe dōmī ōkna i pri' ōzdōbiliśmi planetami gwjázdami patrōncimi* (203b2), *prišliśmī dō cebe s-prawdą bōžą i jesteśmī prawdziwimī* (205b5), *mōwili tōbe ōznajmiliśmi tō ne ōd nas i ne-mami žadnegō śwjádka na tō* (394b5), *čitaj ī muchemmed cō śmi nadchneli dō cebe s-korānu* (323b8), *wlaśne jakō-śmi nadichali tamtich prōrōkow nadchneliśmi dūcha*

---

[63] Ар. *Sulaymān* = Саламон.

[64] Перс. *perī* = фея, дух.

[65] Ар. *Mūsā* = Майсей.

[66] Параўн. Łapicz (1986), p. 203.

[67] Ар. *fir'awn* = фараон.

[68] Параўн. >>> 11.3. Фанемы /ł/, /l/ і /l'/.

[69] Ар. *kāfir* = нявернік.

našegō dō cebe (395b8). Нярэдка гэты канчатак выкарыстоўваецца двойчы: як энклітыка і адначасова пры дзеепрыметніку: *pewne śmī wšitk'i reči stworiliśmi jich* (435b4), *wedzce że-śmī stworiliśmi was z-źemi* (264a8).

У блізкім кантэксце дзеясловы могуць сустракацца то з канчаткам, то без канчатка: *ōtō ten dōm wečistij pōślednij i ūčiniliśmi gō i naznačili dla tich ktōre ne-žōndają sōbe wisōk'ich ānimūšōw i welk'ich pich* (318b8), *prekleliśmi jich i ōddalīli ōd lask'ī našej* (84b5).

Таксама часта сустракаюцца ўтварэнні без канчатка паводле беларускага ўзору; пры гэтым у кантэксце на асобу, якая маецца на ўвазе, часцей за ўсё ўказвае альбо сэнс сказа, альбо асабовы займеннік: *zapewne naleźliśmi ōjcōw na jednim lūdū i zapewne mī na jich śladū jich zaprawili-śe īdzemī za nimi* (402a5), *pewne mī was slūchali za wami šlī či-mōžece wī nas pōratōwac ōd nas ōddalic kerane bōžže* (199b3), *chcece žebišce ōdwrōcili nas ōd tegō cō meli za bōgi i slūžili jim* (198b2).

Часам сустракаюцца ўтварэнні з канчаткам *-śmo*, якія знаходзяцца пад беларускім уплывам[70]: *i dališmō jemū inǧīl*[71] *w nim prawdziwa drōga i świátlōšc* (89b2), *ne-zōstawiliśmō ničegō wšitkō wpisali w kśengi lewch el-mechfūẓ*[72] (102b1), *rekną chwala panū bōgū ktōrij naprōwadzil nas na drōga āž dō tegō mejsca pewne biliśmō naprōwadzeni* (120b4).

Як абсалютную рэдкасць у тэксце тэфсіра можна назіраць утварэнні з *-ch-(-chmy)*. У наступным выключным прыкладзе прыводзіцца спачатку беларуская форма дзеяслова *zwiedli my* (без канчатка і з асабовым займеннікам) і далей дапаўняецца (альбо паляпшаецца?) польскай, архаічнай ужо ў XVII ст. і, між іншым, звязанай з малапольскім дыялектам – *zwiedlichmy*[73]: *i bōže naš ōtō te lūdze ci ktōre zwedli mī-jich zwedlichmī jich jakōž źwedli nas* (316b6). Гэты прыклад застаецца невытлумачальным з прычыны сваёй адзінкавасці.

У арабскім пісьме немагчыма адрозніць мужчынска-асабовыя і не мужчынска-асабовыя формы[74]. У арабскім пісьме абодва галосныя, /i/ і /y/, не адрозніваюцца, і фанемы /l/, /l'/ і /ł/ запісваюцца адной і той жа графемай *lām* = *l*. Хаця ў карціне пісьма маюцца ўскосныя намёкі на мужчынска-асабовыя формы. Так, напрыклад, сустракаюцца выпадкі, калі зычныя перад змякчаным /l'/ дзеепрыметніка запісваюцца таксама змякчана, у сваёй асіміляванай форме: *mī pewne*

---

[70] Параўн. Łapicz (1986), p. 202.

[71] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

[72] Ар. *al-lawḥ al-maḥfūẓ* = "Патаемная скрыжаль" на небе, на якой запісаны спрадвечны Каран.

[73] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 372. Параўн. Kurzowa (1993), p. 197. Параўн. Łapicz (1986), p. 202.

[74] Катэгорыя мужчынска-асабовай формы ўтварылася на мяжы XVI і XVII стст. выключна ў польскай мове; гл. Strutyński (1993), p. 151. У беларускай сістэме дзеяслова такой катэгорыі няма.

naleźliśmi tō cō ōbecīwal nam bōg naš wšitkō prawdziwe też wī či-naleźliśce cō deklerōwaw bōg waš (120b7). У корані не адбываецца перагаласоўкі з прычыны змякчэння */z/ > /z'/*.

16.3.5. 2-я асоба множнага ліку прошлага часу

У 2-й ас. мн. л. у тэксце тэфсіра рэгулярна сустракаецца польскі канчатак *-ście*, які паводзіць сябе таксама як энклітыка. Гэты канчатак звычайна запісваецца праз камбінацыю *ṯā' + ce + faṯḥa = śce*. Графема *sīn = ś* <-*śce*> выкарыстоўваецца ў гэтым канчатку толькі зрэдку: *tedī wī žōndališce bic-śe s-timi kūpcami cō pewne ne-mają ōrenža dō bōju ā mają skarbi žebi-tō wam snadnō prišlō* (137b2), *i ne-wi śce zabijali āle tilkō pan bōg zabijal īch ne-wi tō strelace k'edī strelace āle tilkō pan bōg strelajōncij* (138b1), *pretō rečemi tim trōjčanōm prineśce dōwodī swoje cō śce pōwedali ō kōlegach mōjich pretō bendzece zapewne wedzec że bōg jeden prawdziwij bōg* (317b7), *k'edi-śce ūcekali na gore ā žadin-śe ne ōbejẓral nazad jedin na drūgegō ani na prōrōka* (54a3), *zapewne wī tō najdzece cō śce na dōčasnim świece ūčinili* (460b7).

Наступныя прыклады могуць разглядацца як фанетычныя варыянты ў сувязі з рэдукцыяй ненаціскных галосных: *wspōmnice k'edi was bilō barzō newela nedūže rōzgrōmōne na źemi bōjališci-śe žibi was ne-rōzchwitali lūdze neprijacele waše* (139a5), *i židzi greci piśmō majōnce wšak prišed wam pōsōl prōrōk naš ōznajmil wam jak dawnō ōdarwališci-śe ōd prōrōkōw że mōwice ne-prišed nam świástūjōncij prōrōk* (85b6). Такія канчаткі перыядычна сустракаюцца ў тэфсіры **L**.

Таксама ў адпаведным кантэксце сустракаюцца формы без канчаткаў. У наступным прыкладзе ўказанне на асобу змяшчае далейшы тэкст: *či-ne-bili ājet'i*[75] *naši čitani na was pretō pōdneśli-śe w picha i staliśce lūdem newernimi* (410b5). У дзеяслоўнай форме *podnieśli się* спосаб напісання зноў ускосна паказвае праз мяккую графему *ṯā' = ś* на змякчэнне */l/ > /l'/*, г.зн. дазваляе зрабіць выснову пра наяўнасць мужчынска-асабовай формы.

16.3.6. 3-я асоба множнага ліку прошлага часу

У 3-й ас. мн. л. як у польскай, так і ў беларускай мове як формы прошлага часу ўжываюцца чыстыя дзеепрыметнікі: *pretō ōgarnōl jich glōs ānjelsk'ij zgineli na zōre ranō* (206b2), *i źahidstwo*[76] *pūstelnictwo cō ōni sami na śe prijenli i wimišlili ne-pisanō tō na nich tilkō sami wimišlili* (444a5), *dōtikali was zlim ōtrapenem menkami i zabijali i rzneli i dawili sīni waši i žiwe zōstawali cūrk'i waše* (197b8), *pewne ci ktōre īman*[77] *prijenli i ci ktōre židami stali i ci ktōre slōncū meśōncū*

---

[75] Ар. *āya* = знак, цуд, каранічны верш.

[76] Ар. *zāhid* = аскет, манах.

[77] Ар. *īmān* = вера.

i planetōm klanali-że i grekōwe cō ōgnū klanali i ci ktōre bōgū kōllegi priznawali pewne pan bōg pōrōzlōnča medzi nich dnjá sondnegō pewne pan bōg na kōždą reč jest świádk'em (265b6-8), *ã k'edī prijdze glōs trōmbi iśrafīlōwij*[78] *welk'ej w ten dzen prijdze na pamenc lūdzōm cō činili na tim świece* (481b4).

У арабскім пісьме мужчынска-асабовая форма ў 3-й ас. мн. л. таксама паказваецца толькі ўскосна: *naleźli ōjcōw swojich ū welk'em blendze pretō ōni [w] ōbrendach klamliwich predkōw swojich chodzili* (366a8). На пісьме дзякуючы ўжыванню графемы *zāy* = *ź* перадаецца асіміляцыя */zl'/ > /z'l'/*, і да таго ж адсутнічае перагаласоўка.

16.4. Сляды плюсквамперфекту

У плюсквамперфекце дзеепрыметнік на *-ł* камбінуецца з формай прошлага часу дапаможнага дзеяслова *być*[79]. У тэксце тэфсіра плюсквамперфект сустракаецца рэдка: *i ješčō mōwili jakō mī mamī ōdrūcic bōgi naši gwoli pō'eti glūpegō āle i ōwšem prišed bil muchemmed s-prawdō s-korānōm* (365a6), *ã k'edī-że dōtkne člōweke chōrōba z-dawna ōbecana bendze-że mōdlil panu bōgū nawrōciwši-że dō negō ã pōtim k'edī-że da-jemū laska naša ōd nas i zapōmni cō że bil mōdlil dō negō pred ōzdrōwenem* (375b8), *gdiž źwedli i ūblōndzil me ōd korānu pō tim k'edī prišedl bil mne* (290a2), *i bilī pōčinili wikōwali s-kamene w skalach sōbe dōmī dla pōkōjū* (206b1), *bō pōšli bili wšitk'ī za prikezanem fera'unōwim*[80] *i meli-gō za bōga ne-jest prikezana fera'unōwe direkciją dō dōbregō* (179a4).

Плюсквамперфект сустракаецца перш за ўсё ў 3-й ас. адз. і мн. л., што даказваюць вышэйпрыведзеныя прыклады. У іншых асобах формы плюсквамперфекту можна знайсці толькі спарадычна.

У двух наступных прыкладах 1-й і 2-й ас. мн. л. звяртае ўвагу рухомасць канчаткаў. Адзін раз канчатак далучаецца да галоўнага дзеяслова, а другі – да дапаможнага: *karūn*[81] *bil z-lūdzej mōjžešōwich i pōblondzil na tō ã dališmī bili nemū ōd skarbōw welk'ich* (317b8), *wšak prišed wam pōsōl i prōrōk wijawil wam mnōge rečej tō cō wi biliśce zatajili u t'ewrīt'u*[82] *i w inǧilu*[83] (85a3).

16.5. Умоўны лад

Умоўны лад у польскай мове ўтвараецца аналагічна прошламу часу. Да дзеепрыметніка незалежнага стану прошлага часу на *-ł* далучаюцца канчаткі *-bym,*

---

[78] Ар. *Isrāfīl* = імя архангела, які ў дзень уваскрасення будзе будзіць мёртвых трубой.

[79] Параўн. Łapicz (1986), p. 203 f.; Kurzowa (1993), p. 199; Klemensiewicz (1965), p. 373; Strutyński (1993), p. 159; Kuraszkiewicz (1981), p. 130.

[80] Ар. *fir'awn* = фараон.

[81] Ар. *Qārūn* = Каран (імя ўласнае).

[82] Ар. *tawrā* = Тора.

[83] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

-byś, -by, -byśmy, -byście, -by. Гэтыя асабовыя канчаткі спражэння, як вядома, паходзяць са стараславянскіх формаў аорыста і ўмоўнага ладу дзеяслова *byti* (быць)[84]. На працягу свайго развіцця ў польскай мове яны скараціліся і ператварыліся ў канчаткі дзеепрыметнікаў. Узнікненнем гэтых канчаткаў з самастойных дзеяслоўных формаў можна тлумачыць іх энклітычны характар. Гэтыя формы канчаткаў замацаваліся ў сваім сённяшнім выглядзе ў XVI і XVII стст.[85]

У беларускай мове гэтае развіццё працякала крыху інакш. Форма 3-й ас. адз. л. *-by* з парадыгмы формаў аорыста дзеяслова *byti* (быць) у XIV–XV стст. паступова зводзілася да часціцы і ў выніку пачала служыць для выражэння ўмоўнага ладу ва ўсіх асобах. Гэтая часціца ў значнай ступені страціла сваю рухомасць, так што яна ў адрозненне ад польскай мовы не магла свабодна далучацца да іншых слоў у сказе. Аналагічнае развіццё адбылося таксама ў рускай і ўкраінскай мовах[86].

16.5.1. У **1-й ас. адз. л.** у тэксце тэфсіра сустракаецца рэгулярны польскі канчатак *-bym*, які пастаянна запісваецца ў арабскім пісьме праз *bā' + kasra + mīm = -bim*. У наступных прыкладах выразна выяўляецца энклітычны характар гэтага канчатка: *mōw ī muchemmed jeślibim ja naśladōwal wašich prōžnich bōgōw tedi bim zblōndził dalekō a ne-bilbim ja prawdziwij drōgī muśulmaninem* (104a6), *jestem dō was pōsōl ōd pâna bōga wšitk'ich świątōw ābim dōnōsł wam pōselstwa i prikezane pana megō* (123a4), *rekl še'īb*[87] *zapewne ja chce žebim tōbe pōślūbił is-tich dwuch cūrek mōjich jednō* (312b7), *i rekl kabil*[88] *i beda mōja jâ-m slabšij w rōzūme žebim učinił tak jakō ōtō ta wrōna ābim zakril trūp brata mōjegō* (87a4). Часам знаходзяцца ўтварэнні паводле беларускага ўзору "*jeśliby ja miał / kiedy-b ja umarła*", як у наступных прыкладах: *jeślibī ja mjáł śile bilbim-še z-wami ālbō bim wšedl dō tūrmī twardej* (177b2), *rekla merjema*[89] *aj beda mōja k'edi-b ja umerla wprōdī niš-tō bilabim zapōmnōna zapōmnenōm* (242a2).

16.5.2. У **2-й ас. адз. л.** умоўнага ладу ў тэксце тэфсіра паказваецца звычайны польскі канчатак *-byś*, што таксама паводзіць сябе як энклітыка. У арабскім пісьме гэты канчатак звычайна запісваецца камбінацыяй *bā' + kasra + tā' = -biš*: *jeślī tī wicōngneš na me renka twoją žebiš-me zabił a jâ ne-wicōngna renk'ī na cebe žebī zabic cebe* (86b7), *pewne ja chce žebiš-tī zwonzał mōj grech i swoj grech* (86b8), *ne-zeslališmi tōbe korān naprōžnō tilkō žebiš ōznajmił jim te warą w ktōrej*

---

[84] Польскія канчаткі ўмоўнага ладу паходзяць ад першапачатковых формаў умоўнага ладу дзеяслова *byti* (быць) праз прыпадабненне да формаў аорыста таго самага дзеяслова *byti*. Гл. Klemensiewicz (1965), p. 379.

[85] Гл. Strutyński (1993), p. 159; гл. Klemensiewicz (1965), p. 378 ff.

[86] Гл. Rott-Żebrowski (1992), p. 162 ff.

[87] Ар. *Šu'ayb* = Шу'айб (імя арабскага прарока).

[88] Ар. *Qābil* = Авель.

[89] Ар. *Maryam* = Марыя.

sprečają z-wami w nej (212b5), *jakbiś tō ne-widzal i ne-słišal* (16b2), *stalō cebe žebiś pōšedl prinōsl cūde spōd źemi ālbō drabina dō neba i prinōslbiś jim cūda ne ūwerą* (102a4).

16.5.3. У **3-й ас. адз. л.** спосабы ўтварэння ўмоўнага ладу ў польскай і беларускай мовах аднолькавыя. У тэксце тэфсіра канчатак (часціца) *-by* запісваецца камбінацыяй *bā' + kasra = -bi*. Поўнае напісанне гэтага канчатка праз *bā' + yā' + kasra = -bī* сустракаецца толькі спарадычна: *jeślibi chcal pân bōg ūčinilbi jich lūdem jednej wjárī jednej muśulmańsk'ej tilkō ž ūprōwadzī kogō chce w laska swoje* (396a2), *na tim mejscū priwodbi pō was kōgō zachce* (122b2), *pretō ōdwrōciliśmi-gō dō matk'ī jegō ābī ōświecili-śe ōčī jej ážebi-śe ne-frasōwala i žebi dōbre wedzala że pewne dekleraceja bōżże jest prawdziwa* (311a5), *čemū ōni ne-pōmišlą na korān świentij jeślibi tō bilō ōd kogō inšegō ā ne ōd pana bōga nalazlabi-śe w nim sprečka mnōga spreček* (70a8).

16.5.4. У **1-й ас. мн. л.** утварэнне ўмоўнага ладу ў тэксце тэфсіра выражана багацей за ўсё, як гэта мела месца ў прошлым часе. Нарматыўным канчаткам умоўнага ладу з'яўляецца рэгулярны польскі канчатак *-byśmy*, які паводзіць сябе таксама як энклітыка. Гэты канчатак у арабскім пісьме, як правіла, запісваецца праз камбінацыю *bā' + kasra + t̲ā' + mīm + kasra = -biśmi*, у якой рэдка сустракаецца *scriptio plena* галосных: *jeślibi chcal pan bōg ne-słūžilibiśmi ōprōč negō inšim* (210a5), *rekną staršina biśmī bili zadirigōwani direkciją bōžą i was biśmi naprōwadzili* (199b4), *rekl še'īb*[90] *jeślibiśmi bili dwoličnimi tedi pōtwar biśmi kladli na bōga klamliwij jeślibiśmi nawrōcili w wara wašą pō tim gdi wizwolil nas pan bōg ōd tej warī ne-jest' słūšnō žebiśmi pōwrōcili dō wari wašej tilkōž-bi-tak chcal pan bōg pan naš* (125a7). Толькі зрэдку пад беларускім уплывам адбываецца скарачэнне канчатка да *-b*, як у наступным прыкладзе: *jeślibiśmi chceli dōtknalibiśmi īch grechami īch i pricisnelib pečencō na nūtrī jich žebi ōni ne-słišeli* (126a7).

У тэксце тэфсіра знаходзяцца выпадковыя прыклады канчатка *-bychmy*, які ўзыходзіць да аорыста[91]: *mōw ī muchemmed jeślibi bilō mōre čarnilōm dla pisane słōw bōžich ūbendze mōre ūprōdī niž mają ūbic słōwa bōga megō chōc bichmī priwedli w pōdōbenstwa drūge mōre kalamarem* (240a8), *ā jeśli bichmi chceli ūčinilibiśmi z-was ānjōlī* (404a8), *jeśli bichmi chceli newernikōw i nedōwerkōw ūkezalibichmi tōbe* (417b5).

Як іншы канчатак 1-й ас. мн. л. умоўнага ладу ў тэксце тэфсіра спарадычна выступае канчатак *-byśmo*, які знаходзіцца пад беларускім уплывам[92]: *k'edī bi činili mōglibiśmō jim dac z-lask'ī našōj spaśene welk'e i naprōwadzilibiśmō īch na drōge prawdziwą* (68b5), *wedzelibiśmi że ti nam gdi cō mōwil tō prawda i bīlibiśmō na tak'e darī świádčōncimi* (98a4), *ā k'edi čitają nad nimi korān mōwili wšak słišeliśmi*

---

[90] Ар. *Šu'ayb* = Шу'айб (імя арабскага прарока).

[91] Параўн. Kurzowa (1993), p. 199 f.

[92] Параўн. аналагічныя ўтварэнні з *-mo* ў цяперашнім, прошлым часе і ў загадным ладзе.

k'edibiśmi chceli mōwilibiśmō wleśne tak nic ne-jest' tilkō historije perwšich lūdzej (139b5), *i pewne mī widzeme cebe medzi nami pōdlegō barzō nedūżegō jeślibiśmi ne ūpatrōwali na prijacela twoje cō z-nami ūkemenōwalibiśmō cebe* (178b4).

16.5.5. 2-я ас. мн. л. рэгулярна паказвае ва ўмоўным ладзе канчатак *-byście*, які ў арабскім пісьме звычайна запісваецца праз камбінацыю *bā' + kasra + ṯā' + ce + fatḥa = -biśce*. Гэты канчатак паводзіць сябе як энкліты-ка, што з'яўляецца звычайным для польскай мовы: *i rekla grōmada s-tich ktōre newernimi stali ź lūdzej še'ibōwich*[93] *jeślibiśce pōśli za še'ibam pewne biśce bili w ten čas škōdnikami sōbe* (125b3), *i dal wam wladac ōkrentem żebiśce chōdzili na mōrū mōcą jegō* (200b8), *či-tak chcece jeśli muchemmed ūmre ālbō zabiją żebiśce ōdwrōcili-śe nazad dō newernōści wašij* (53a4).

16.5.6. 3-я ас. мн. л. паказвае ў польскай і беларускай мовах аналагічныя ўтварэнні з *-by*. Гэты канчатак (часціца), як правіла, запісваецца праз *bā' + kasra = -bi* без *scriptio plena* галоснага: *k'edi zeslanī tōbe śūrej*[94] *berā' et'*[95] *żebī uwerili panū bōgū i żebi gazejstwa*[96] *činili wespōl s-prōrōk'em jegō prōśili ū cebe pōzwolene panōwe bōgaci nektōre ź nich i rekli pōrūc nas nech-mi bendzem iz śedzōncimi radzi bili żebi zōstali ź newestami* (154b2), *ōtō tak'e pōdōbenstwo pōdbijami lūdzōm ãzalebi ōnī dōmišlali-śe i were prijmōwali* (450a1), *jeślibi pewne ōbiwatela tich mjást i wśī ūwerili i bōga bi-śe bali ūtworiliśmi nad nimi spōr hōjnij ōd neba i ź źemī ūrōdzaj tilkōż ōni klamliwimi pretō skeraliśmi īch za tō* (126a2).

Як у прошлым часе, так і ва ўмоўным ладзе мужчынска-асабовыя формы маглі адрознівацца ў арабскім пісьме ад не мужчынска-асабовых толькі вельмі абмежавана (гл. вышэй).

16.6. Будучы час

Утварэнне будучага часу ў польскай мове магчымае трыма спосабамі. З аднаго боку, формы цяперашняга часу дзеясловаў закончанага трывання пераймаюць функцыю будучага часу. З другога боку, будучы час выражаецца праз камбінацыю будучага часу дапаможнага дзеяслова *być* (быць) і інфінітыва дзеяслова незакончанага трывання. У якасці трэцяй магчымасці ў польскай мове развілася камбінацыя будучага часу дапаможнага дзеяслова *być* з бесканчатка-вым прошлым часам дзеяслова незакончанага трывання, якая ўзыходзіць да будучага (*futurum exactum*) часу стараславянскай мовы[97].

---

[93] Ар. *Šu'ayb* = Шу'айб (імя арабскага прарока).

[94] Ар. *sūra* = сура Карана.

[95] Ар. *barā'a* = адмова, вызваленне; ар. *barā'a* – першае слова суры 9.

[96] Ар. *ġāzī* = змагар за веру (гл. >>> 3.1.1.).

[97] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 374.

У беларускай мове трэці спосаб утварэння будучага часу з дзеепрыметнікавымі формамі, які ўзыходзіць непасрэдна да будучага (*futurum exactum*) часу, знік. Аднак трэба дадаткова разгледзець утварэнне будучага часу з дапаможным дзеясловам *mieć* (мець), які сустракаецца ў паўднёва-заходнім беларускім дыялекце[98].

У тэксце тэфсіра сустракаюцца ўсе тры вышэйзгаданыя спосабы ўтварэння будучага часу, якія характэрны для польскай мовы. Характэрны польскі спосаб ўтварэння будучага часу з дзеепрыметнікавымі формамі ў тэксце тэфсіра прадстаўлены, аднак, толькі ў адзіночным ліку. Пры гэтым мы знаходзім у тэксце тэфсіра такія словаўжыванне і дыстрыбуцыю дзеепрыметнікавых формаў, якія, напр., зафіксаваны ў пісьменніка Мікалая Рэя (1505–1569)[99].

Тут можна адмовіцца ад дэталёвага абмеркавання асобных формаў, бо элементы, якія ўдзельнічаюць ва ўтварэнні будучага часу, ужо абмяркоўваліся ў цяперашнім і прошлым часе. Звычайным з'яўляецца пранікненне ў дапаможны дзеяслоў *być* (быць) беларускага вымаўлення і формаў, напр. *budu* замест *będę*.

16.6.1. Прыклады **1-й ас. адз. л.**: *jeśli bendzece mī chwala ōddawac prispōre wam i pōżitkōw i samich ā jeśli bendzece newernimi pewne jest wam menka i kerana twarda* (198a2), *zwodzic bende ōraz wšitk'ich tilkō twojich ź nich šćirich tich ne zwodza* (204b6), *pōglōndajce i čekajce pewne i ja z-wami bende čekał i wiglōndal kerane* (123b3), *rekl pan bōg wī ne-bōjce-śe zapewne ja z-wami wespōl bende ūstawične bende słišał i widzal* (249a6). У асобных выпадках пранікаюць беларускія ўтварэнні: *i spitają ū cebe ō żī l-kernejni*[100] *tō jest āleksandra mōw ī muchemmed būdū pec wam ō nem wjádōmōści jegō* (238b1).

16.6.2. Прыклады **2-й ас. адз. л.**: *idzmī dō fera'ūna*[101] *bō ōn barzō zblōndzil i mōw jemū či-chceš bic čistej ōd grechōw mōw {lā ilāha illā allāh}*[102] *i naprōwadze cebe na drōga ktōrą pōjdzeš dō bōga twegō i bendzeš bal karana jegō* (481a5), *i rōwnō tō nad nimi chōc-tī i muchemmed bendzeš strašic ich ālbō ne-strašic jich jūž ne-'ūwerą zapewne bendzeš strašil tich ktōre pōddadzōn-śe pōd prikezana korānne* (395a4-5), *ā jeśli bendzeš jemū kōlegi priznawal tedi zaniweč pōjdą učink'i twoje dōbre* (381a5), *jest dla cebe na ōnim świece dōbrōci tōbe dane lepšá niż ten wšitek świat i da tōbe na ōnim świece bōg twoj ō cōkōlwek bendzeš žōndal* (491a3)

---

[98] Параўн. Łapicz (1986), p. 204; Rott-Żebrowski (1992), p. 150 f.

[99] Kuraszkiewicz (1981), p. 134: "Сістэма ў Рэя камбінаваная: у адзіночным ліку ў яго звычайна дзеепрыметнікавыя формы, у множным ліку – інфінітыўныя формы, і толькі апошнія маглі мець адваротны парадак слоў, напр. *będę miał, będziesz miała, będzie miało,* але *będziemy mieć* ці *mieć będziemy*. Відавочна, ужыванне дзеепрыметнікавых формаў у адзіночным ліку мела на мэце пазначыць род дзейніка. У Рэя сустракаюцца рэдкія прыклады дзеепрыметнікавых формаў у множным ліку ад дзеясловаў *móc, chcieć, mieć, woleć,* якія мелі пры сабе інфінітыўныя дапаўненні, напр. *objaśnić będą mogli, dobrze czynić będziemy chcieli, będziecie mieli mówić, będą woleli obracać*".

[100] Ар. *Dū al-Qarnayn* = Аляксандр (літар. з двума рагамі).

[101] Ар. *fir'awn* = фараон.

[102] Ар. *lā ilāha illā Allāh* = Няма Бога акрамя Алага.

16.6.3. Прыклады **3-й ас. адз. л.**: *ōn jest bōg ktōrij stworil was ūprōd s-paskū ā pōtim z-žōndzi celesnij ā pōtim ze-krwi śśadlej pōtem wiprōwadze was dzecencem ā pōtem priwedze was dō dōskōnalej śilī* (388b5), *pewne ten ktōrij ōżiwił źeme s-trawami ten że ōżiwī i martwich* (393b6), *wspōmni ten dzen k'edī ščepaci-śe bendze nebōsa s-tūčami balimi na kštalt mglī* (289b5), *bendze pec tōbe ōd prōrōctwa mōjżešōwegō i ōd spraw fera'ūnōwich*[103] (310a5), *meśich*[104] *maśijaš tō jest 'ejśá sīn merjemin*[105] *slawnij prōrōk na tim świece ā na ōnim świece pričinca blisk'ij ū bōge i bendze mōwił dō lūdzej w kōliśce i w starōści* (44a7), *ā ktō ne-bendze weril prikezanū bōżżemū na tich pewne bōg prendk'ij ōdbirac liğbi* (41b5), *ten bendze nagōršij medzi lūdzej ktōrij bendze gōral w ōgnū pek'elnim* (487b6), *w ten dzen bendze-śe trōnsla źeme trenśenem welk'im* (481a1).

16.6.4. Прыклады **1-й ас. мн. л.**: *mōwili ne-zabawimi-śe mī w pekle* (42a4), *i ūčinemō jich na jegō panstwe dzedzīcami i pōčinim jich krōlami śilnimi* (310b1), *i mī pewne ne-wnidzim tam āż ōni unidą ź negō ā jeślī ź negō winidą ōnī ź negō tedi ten čas wnidzeme* (86a5), *ā jeśli wī bendzece-śe bic zabijac dōpōmōżem wam āle pan bōg świádek jest że ōni są dwolične klamce* (449a2), *pōślī gō z-namī jūtrō bendzem paświc bidlō i bendzem grac i mī pewne jemū bendzem strōżami* (182a4). У 1-й ас. мн. л. мы, як правіла, не знаходзім дзеепрыметнікавых формаў.

16.6.5. Прыклады **2-й ас. мн. л.**: *jeśli zachcece ličic pōżitk'ī bōżże ne-źličice jich* (208b4), *zarez ōbačice i bendzece wedzec cō ja z-wami ūčine* (127b5), *jeşli bendzece słūchac īch i dajce-śe namōwic pewne wī bendzece newernikami* (111a5), *k'edī bendzece tajemnō weric ālbō radzic pretō ne-radzce-śe zdradliwe i klamliwe* (445b8), *ūgōliwśi glōwa waša i ōstrigši wlōsi waši ne-būdzece bōjaci-śe bō we pan bōg tō cō ne-wece wī* (422a3). Як відавочна з наступных прыкладаў, пры ўтварэнні будучага часу з інфінітывам змяняецца парадак слоў: *bendzece-śe mōdlic balwanem swojim żebi was brōnili jeśli wī jest prawdziwimi āle jūż tam kōnečne jemū mōdlici-śe bendzece ōn ōbrōni tegō cō mōdli-śe jemū* (102b5). У 2-й ас. мн. л. мы таксама не знаходзім утварэння будучага часу з дзеепрыметнікавымі формамі.

16.6.6. Прыклады **3-й ас. мн. л.**: *i ūstrašōn-śe tim korānem i dōwedzōn-śe że pewne jest bōg jedinnij i wspamentają śe pani rōzūmū* (202b4), *prijdą dō raju ī ōtworōn-śe wrōta jich i rekną dō nich wladara rajsci pōzdrōwene i pōkōj na was* (382a4), *ōni ne-bendą żōndac śmerci nigdī ā tō za tō cō zarōbili rence jich* (454b2), *i takōwe lūdze ōnimi pōdpalac bendą ōgen pek'elnij* (40b4), *ā jeśli bendą sprečac-śe s-tōbą ō wjáre mōw tī nawracam-śe ščire twarą swoją kū bōgū* (41b4). У якасці адзінкавай дзеепрыметнікавай формы мы знаходзім у тэксце тэфсіра *ne-bendą mōgli ūčinic*

---

[103] Ар. *fir'awn* = фараон.

[104] Ар. *masīḥ* = месія.

[105] Ар. *'Īsā Ibn Maryam* = Ісус, сын Марыі.

testamentōw (361b7). Пры гэтым характэрна тое, што дзеепрыметнікавая форма выступае пры мадальным дзеяслове, у дадзеным выпадку *móc* (магчы)[106].

16.6.7. Адсутнасць будучага часу з дапаможным дзеясловам *mieć* (мець)

Апісанае Лапічам (Łapicz (1986)) на падставе рукапісу кітаба ўтварэнне будучага часу з дапаможным дзеясловам *mieć* + інфінітыў і асабліва звязаныя з гэтым сінтэтычныя канчаткі, якія паходзяць ад формаў дзеяслова *mieć* (мець) і характэрныя для паўднёва-заходняга беларускага дыялекту[107], немагчыма знайсці ў тэксце тэфсіра.

Канструкцыі кшталту *mieć* + інфінітыў, якія сустракаюцца ў тэксце тэфсіра, без сумневу маюць значэнне будучага часу, аднак відавочна, што іх можна разумець зыходзячы з сэнсу сказа як мадальныя канструкцыі; напр.: *k'edi źberemi īch na ten dzen nimaš wentepliwości w nim ma pōžitkōwac kōžda dūša tō cō zarōbila* (42a6), *bō ma zaplacic pan bōg jich kōždej dūši cō zarōbila* (202b2), *pewne ta gōdzina ōstatečna kōnečne ma prišc pōnōṣ te cenžarī pōnōšenem dōbrim* (206b4), *ne-zōstane žadnō meškana na źemi tilkō wšitkō zgubic mami pre[d]-dnem sondnim* (225a2), *ăle šerī'et'*[108] *muchemmedow ma bic na wšitek świát nezadlūgō* (283a6). У дадзеных прыкладах падкрэсліваюцца неабходнасць і непазбежнасць наступных падзей, а не будучы час. У наступным фрагменце таксама ясна, што маецца на ўвазе маральны імператыў і наўрад ці будучы час: *pōwinenem na tim że ne-mam mōwic na bōga tilkō rečī prawdziwe* (126b6), *zapewne mī zeslališmi na ce kśenga korān čitaci-śe ma nad nimi w tim wšitk'im laska mōja jest chwala i na' ūke dla lūdzej werōncich* (324b5), *rekną ci ktōre newernimi są na tich ktōre ūwerili či nakarmic mami tegō cō ne-chcal bōg nakarmic jegō* (361b4).

16.7. Загадны лад

У цэлым у тэксце тэфсіра мы знаходзім пры ўтварэнні загаднага ладу даволі сучасную моўную карціну.

16.7.1. Калі аснова цяперашняга часу канчаецца на *-a*, то загадны лад **2-й ас. адз. л.** спражэння *-am, -asz*, а таксама некаторых нетэматычных дзеясловаў,

---

[106] Параўн. Kuraszkiewicz (1981), p. 134.

[107] Гл. Łapicz (1986), p. 204-205: "O ile futurum ze słowem posiłkowym 'być' (plus bezokolicznik) jest znane wszystkim gwarom brus., o tyle konstrukcje ze słowem posiłkowym 'mieć' są właściwe dość ograniczonemu obszarowi gwar płd.-zach., głównie zresztą w zachodniej części tego obszaru (DABM, mapa 166). Na tym samym obszarze gwarowym są też znane formy syntetyczne czasu przyszłego, zachowujące resztki dawnych form osobowych słowa imati, dołączane do czasowników w formie końcówek. Konstrukcje takie zachowują również teksty Kitabu: ...a xto ni činic, to k'afirinom / ne būdze i mūk'i żadnej ne mecime ...30/3-4; ... všakže v kur'ane čitacimeš jake jest rozkazanne / pana boha, a ježili sam ne būdzeš ūmec to od navčonix čūcimeš ...47/6-7". Параўн. таксама De Bray (1980), p. 233.

[108] Ар. *šarī'a* = шарыят, ісламскі закон.

напр. *dać* (даць) і вытворных ад яго, утвараецца праз суфікс *-j*. У арабскім пісьме гэты канчатак запісваецца праз камбінацыю *jā' + sukūn = -j*: *čitaj na nich dzeje wjádōmōšc sinōw ādamōwich* (86b4), *bōndz pōslūšna i pōwolna bōgu twemū i padaj ōbličjem dō źemi i klanaj-śe ś-timi cō śe klanają* (44a3), *i tī pridaj renka jim i muchemmed i prōš ōdpūščene grechōw mōdlōnc-śe bōgū* (452a7).

Два спражэнні, *-ę, -isz* і *-ę, -esz*, у польскай мове пры ўтварэнні загаднага ладу ўжо ў далітаратурны перыяд прыпадобніліся. Спачатку для 2-й ас. адз. л. ужываўся канчатак *-i*. Такія ўтварэнні, аднак, амаль цалкам зніклі да канца XVI ст., і на іх месцы ўсталяваліся формы без канчаткаў. Толькі пры збегу дзвюх зычных у корані альбо ў канцы асновы захаваўся канчатак *-i*, і на працягу далейшага развіцця ўжо з XVII ст. ён дапаўняецца суфіксам *-j*[109].

У тэксце тэфсіра мы пастаянна знаходзім у дзеясловах абодвух спражэнняў, *-ę, -isz* і *-ę, -esz*, бесканчаткавыя формы: *rekl mūśâ pane bōże rōzšir serce mōje warą zdrōwą i latwo čin kōždą reč* (248a8), *rekl pan bōg ūlap gō i ne-bōj-śe* (248a4), *ci cō prišli pōśle muhağirōw*[110] *i insarōw*[111] *mōwą pane naš bōże zbaw nas i z-bracją našą* (448b6), *k'edi ōbačiš tich ktōre bluźną pišmō naše ōdwrōc-śe idz preč preč ōd nich* (105a8), *zbaw ōd nas grechi naši i strež nas ōd menk'ī ōgnistej* (41a7), *pretō prendkō idz z-lūdzmī twojimī w jednej čeńści ōd nōci i weź za sōbą naśladōwnikōw swojich* (205b6), *stworil gō s-paskū ź źemī ā pōtim rekl na tō stan člōwek'em i stal-śe bez ōjca* (45b2), *ī prōrōče wojūj newernikōw šablō i nedōwerkōw grōm jenzik'em i bōndz dūžim i strōgim nad nimi* (461a4), *i zabijają tich ktōre prikezūją dō prawdī z-lūdzij śemenčūj*[112] *jich menką gōrką* (42a1), *ā tī ne-pej ğinaźe*[113] *ni-nad jednim ź nich* (154a6). З прычыны адзінкавасці прыклада застаецца пытаннем, ці мае месца ў наступным прыкладзе рэлікт першапачатковага канчатка *-i*: *ūkaži nam pōrōndk'i ōfara jak činic* (18b3).

Толькі ў каранях альбо ў асновах са збегам дзвюх зычных у канцы захаваўся першапачатковы канчатак *-i*; аднак у тэксце тэфсіра ён з'яўляецца толькі як выключэнне з суфіксальным *-j*: *rekl ānōl wdir ō źeme nōgą twoją dwa razi i wpadli dwa žrōdla ōtō jednō ceplō zmij-śe i źimne napi-śe* (372b6). У наступных прыкладах звяртае ўвагу *scripio plena* гэтага канчатка: *pōtrōšnī sōbe galōnź z-fūnikami pōsipōn-śe na cebe dōjzrale fūnik'i pretō jedz i pī* (242a4), *wspōmnī ī muchemmed k'edi rekl mūsâ dō lūdzej swojich i lūdze wspōminajce laske i darī bōžže* (86a1), *āle tilkō wejzrī na gōre či-mōže ōna stac na mejscū swojim jeśli-śe ūstōji mōžeš i tī widzec mne* (129b5).

16.7.2. У **1-й ас. мн. л.** рэгулярна з'яўляецца польскі канчатак *-my*, які ў арабскім пісьме, як правіла, запісваецца праз *mīm + kasra = -mi*. *Scriptio plena* галос-

---

[109] Наконт развіцця загаднага ладу ў польскай мове гл. Klemensiewicz (1965), p. 375 ff.

[110] Ар. *muhāğir* = перасяленец, які разам з Прарокам эмігравaў з Мекки ў Медыну.

[111] Ар. *anṣār* = памочнікі (жыхары Медыны, якія далучыліся да Прарока).

[112] Гл. >>> 3.2.1. Дзеяслоў "**siemęczować*" і назоўнік "**siemęcza*".

[113] Ар. *ğanāza* = пахаванне, пахавальны рытуал.

нага /y/ з'яўляецца рэдкім: *ne-slūžmī-ž inšemū tilkō bōgū āni trimajmi za bōgi jedin drūgegō ōbrazi balwani ōprōč bōga* (45b8), *idzmi ōd negō ā bōndzmi cerpliwimi cō na bōgi naši mōwi zapewne ten muchemmed zimšlōna reč pōwada* (370a7).

Канчатак *-mo* (з аканнем *-ma*) характэрны для паўднёва-заходняга беларускага дыялекту[114]. Ён сустракаецца ў тэксце тэфсіра паралельна з больш частотным польскім канчаткам *-my*: *ne-bila inakša ōdpōwedz lūdu ābrahamōwegō dō negō tilkō rekli zabijmo gō ālbō spalmō gō pretō wiratōwal gō pan bōg ōd ōgna* (321b5). Канчатак *-mo* ў арабскім пісьме, як правіла, запісваецца праз *mīm* + *wāw* + *ḍamma* = *-mō*, са *scriptio plena* галоснага /o/. У тэксце тэфсіра, зразумела, таксама сустракаюцца варыянты, якія ўказваюць на рэдукаваны спосаб напісання толькі праз *fatḥa* = *e*: *rekli idzme na nich dō brōmi* (86a7).

16.7.3. У **2-й ас. мн. л.** у тэксце тэфсіра часцей за ўсё паказваецца рэгулярны канчатак *-cie* (< **-te*), які далучаецца да формы 2-й ас. адз. л.: *bijce i rūbajce pō werchū karkōw jich i pōwcinajce jich wšitk'ī palci ōtō tak čince jim ā tō za tō że są neprijacelmi panū bōgū* (138a3), *i te ktōre ūwerili selewat'*[115] *pejce na negō i pōzdrōwajce gō pōzdrōwenem* (346a4), *ne-približajce-še dō cūdzōlōstwa i tō pewne jest nečistim grechem* (222b4), *wziwajce-gō i mōdlce-še bōgū wašemū s-płačem jawnō i w sercū tajemnō* (122a3), *ā ne-čince spōlenčnik'i jemū* (45b8), *chwalce cerpliwich chwalce sprewedliwich i bōgōbōjnich i skarbi ōfarūjōncich i ōdpūščene grechōw prōšōncich* (41a8), *rekliśmi jim bōndzce bezjanami bestijami* (133a4), *ā tō cō dal prōrōk weźce tō sōbe ā cō wam zakazūje strežce-še ōd tegō* (448a7), *k'edi reče jim źberce-še i prijdzce nech mōdli-še za was pōsōl bōžij k'iwają na tō glōwami swojimi* (455b2), *i prichōdzce tam kendī tōbe rōzkazanō* (205b7), *k'edi zachcece stawac dō nemaźu*[116] *mijce twar wašō i rence waše dō lōkcej* (83b2), *i ci ktōre īmam*[117] *prijenli k'edi zachcece radzic cō tajemne s-prōrōk'em pretō idzce wprōdi dō negō pred radą tajemno āfarūjce mū sedeku*[118] *tō wam lepej jest pōcešic gō niž gō na še ūprōšic* (446a7), *reče-še dō nich bōg lapajce i pōwonžce nōgi dō šiji ā pōtim wrūcce w pek'lō w ōgen ā pōtim ōkūjce gō w lancūch lōkcej śedmidzešōnt lōkcami ālbō 'eršynami i pōcōngnice gō* (467a6), *berce t'ejemmum*[119] *pask'em čistim ābō pōtrice pō twarī wašej ī pō renkach wašich tim pâsk'em* (83b5), *pōšlice pō mastach źbirajōnc čarōwnik'ī priwodą* (127a3), *wejzrice na nas ōšwecimō še ōd świátlōści wašej* (442a6). Як перажытак канчатка *-i* трэба расцэньваць наступную форму: *ā ne idzice za timi cō chelal*[120] *cheram*[121] *ā cheram chelalem činą* (22b4).

---

[114] Гл. Łapicz (1986), p. 207.

[115] Ар. *ṣalā* мн. л. *ṣalawāt* = малітва-бласлаўленне.

[116] Перс. *namāz* = малітва.

[117] Ар. *īmān* = вера.

[118] Ар. *ṣadaqa* = міласціна.

[119] Ар. *tayammum* = рытуальнае абмыванне.

[120] Ар. *ḥalāl* = дазволены, дазволенае.

[121] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

Пад уплывам акання канчатак *-cie* можа выступаць у тэксце тэфсіра ў форме *-cia*. Тады ў арабскім пісьме ён запісваецца праз камбінацыю *ce + alif + fatḥa = -ca*: *ī ci ktōre īman*[122] *prijenli streščza sami šebe i dūš wašich i dūš lūdzej wašich ōd ōgna pek'elnegō* (460b4), *ā k'edi bendzece nečiste ōbmijca wšitkō câla* (83b4), *bendzece ūčicelami kōždij z-was grōmadi lūdū wziwajca dō dōbregō i prikazūjce dō paznana bōga i prōrōke i karajca* (49b5).

Спарадычна можна знайсці таксама рэфлексы рэдукцыі ненаціскнога галоснага */e/ > /i, y/*[123]. Такія прыклады як наступны, хаця і рэдкія ў тэксце тэфсіра, але зусім не адзінкавыя: *jeśli pōjdą nazad dō blondōw mōwci wi dō nich bōndca wi świádkami na tim że mi muśulmane jesteśmi* (46a1), *k'edi pōjdzece na gazejstwa*[124] *bōże i ōznajmi prez ślam*[125] *muśulmanstwo ne-mōwci wī pō ōddanū dō was ślam że ti-ne-jest' [z] muśulman żebišce chceli zabic* (72a5).

Іншай прыкметнай асаблівасцю тэксту тэфсіра з'яўляецца выкарыстанне ў 2-й ас. мн. л. канчатка загаднага ладу *-ecie*. Гэты канчатак *-ecie*, які ў арабскім пісьме звычайна запісваецца праз *fatḥa + ce + fatḥa = -ece*, выступае ў тэксце тэфсіра толькі ў дзеясловах спражэння *-ę, -esz*. Такі канчатак з'яўляецца інтэрферэнцыяй з паўднёва-заходнім беларускім дыялектам[126]. Ён сустракаецца ў тэксце тэфсіра ў дзеясловах названага спражэння не заўсёды, а пранікае ў адзінкавых выпадках: *mow i lūdze pišmō majō[nce] prijdzece wi dō jednegō slōwa ábišmi rōwni [bili] jak ū nas bilī pišmō prōrōk'i tak ū was piśmō prōrōk'i* (45b7), *mōw ja muchemmed pōpelgrimūjce i pōchōdzece pō źemi* (321a7), *priwedzece gō napred ōči lūck'e* (260a6), *bōndzece pōwolnī i pōslūšnī panū bōgū i pōslōwi jegō* (52a4), *i bōndzece powelnimi i pōslūšnimi bōgū i pōslūšnimi prorōku i strežce prikezane* (95a7).

16.7.4. У **3-й ас. адз. і мн. л.** сустракаюцца з XVI ст. парафрастычныя ўтварэнні загаднага ладу з дапамогай застылых формаў дзеяслова *niechać* (дазваляць) *niechaj > niech*, скамбінаваных з цяперашнім часам[127]. Выкарыстанне гэтых формаў, якія мы знаходзім у тэксце тэфсіра, ніякім чынам не адрозніваецца ад словаўжывання ў сучаснай польскай мове: *ā ktō ī tō ne-zmōże pretō nech nakarmī šeśdzešōnt ūbōgich* (445a3), *i nech-spōminają tam īme świentegō ābi chwalili jegō tam i ranō i wečōr* (283a8), *ī prōrōče mōw dō žōn swojich i dō cūrek swojich i newjestōm werōncim nech narūcą na śebe na twar zapūni rantūchōwe* (346b1), *nech piją jedzą*

---

[122] Ар. *īmān* = вера.

[123] Параўн. >>>> 10.8.1. Звужэнне ненаціскнога */e/ > /i, y/*.

[124] Гл. >>> 3.1.1. Арабізм "*ġāzī*" (змагар за веру).

[125] Ар. *salām* = мір, прывітанне. Тут маецца на ўвазе ісламскае прывітанне *as-salāmu 'alaykum* = мір (хай будзе) на вас, дзякуючы якому можна пазнаць мусульманіна ў тым, хто вітае.

[126] Гл. Łapicz (1986), p. 207: "Sufiks -ece jest elementem morfologicznym o szczególnej wyrazistości terytorialnej, znany jest bowiem w brus. gwarach płd.-zach., szczególnie w czworokącie wyznaczonym przez Grodno-Pińsk-Mozyr-Mińsk (DABM, mapy 170, 172)".

[127] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 377.

i rōskōšūją i nech-śe zwodzą dlūgimi miślami pō tim bendą wedzec dō čegō prijdą (202b7), *pretō pōrūc īch i muchemmed nechaj-śe pōnūrą ū zawodze śwjáta tegō i nech jakō chcą gedają āž prijdze dzen na nich ktōrij jūž jest naznačōnij* (469a6).

16.8. Зваротныя дзеясловы

Мы звычайна знаходзім у тэксце тэфсіра польскі зваротны займеннік *się*, які ў арабскім пісьме, як правіла, запісваецца праз камбінацыю *tā' + fatḥa = -śe* (радзей праз *sīn + fatḥa = -śe*) з дэназалізаваным канцавым *e*-насавым */-ę/ > /-e/*. Гэты займеннік звычайна запісваецца разам з дзеепрыметнікавай формай. Але ён таксама захаваўся ў форме энклітыкі і прымыкае да іншых слоў у сказе: *ā pōtim wigōtūjem jich pred ōkōlicą pek'elnō upadlich na kōlenach pōtim kažemi īm sprečaci-śe [s] židōm i k'afirōm we wšitk'ich nacijach* (245b1), *mow ja muchemmed dajce-ž mne wedzec ō tich cō śe wī jim mōdlice-śe i wziwace ōprōč pana bōga* (378b5), *cōkōlwek w nebōsach śe dzeje cō w źemi cōkōlwek jest w tajemnej radze dōbrej medzi trema tilkō ōn čwartij jest medzi nich także medzi pencū tilkō ōn šōstij medzi nich chōc i mnej tegō ālbō i wencej tilkō ōn ź nim wespōl gdzekōlwek bendą* (445b1-3), *lepej bi bilō žebiśmi śe pōwrōcili z-nōwu w źemją k'edibi bili kōścmi źgnilimi* (481a3).

Часам у зваротны займеннік пранікае беларускае гучанне. Тады ў арабскім пісьме ён запісваецца праз камбінацыю *tā' + alif + fatḥa = -śa*. Прычым гэты зваротны займеннік заўсёды далучаецца да дзеяслова як суфікс: *ne-približajce-śa dō grechū nečistegō cūdzōlōstwa* (115a3), *źbližila-śa gōdzīna sōndnegō dna i reščapil-śe meśōnc ōd palca muchemmedowegō ā k'edī tak'ij cūd ōbačili newernici mek'k'ejśk'e*[128] *i ōdwrōcili twar swoją rekli čarōdzejstwo neščenśliwo i meli tō za klamstwo* (433b6), *mī też ōtworiliśmi ōkna nebeśk'e z-wodami barzō cekōncimi i pōreščapaliśmi źemją źrōdlami wodnimi pretō zlōnčila-śa woda nebesna iź-źemną na jedin čas* (434a5).

Як абсалютнае выключэнне мы знаходзім характэрныя беларускія ўтварэнні з рэдуплікацыяй і зацвярдзеннем беларускага канчатка 3-й ас. мн. л. цяперашняга часу *-c' > -cca*, як у наступным прыкладзе: *najhlibše peklō dla tich nemaźgarōw*[129] *ktōre są ź nedōwerkōw munafikōw*[130] *że ōni u nemaźech*[131] *swojich ōplōšni i ne' ōchōtni ktōre ōni na pōchwala nemaź klanejucca i sami ne-dają i drūgim ne-kažą źek'at'*[132] *i dześencina widawac* (495b3). Такія беларускія дзеяслоўныя формы звычайна сустракаюцца ў структуры фразеалагічных дзеясловаў, утвораных з арыенталізмамі[133].

---

[128] Ар. *Makka* = Мекка.

[129] Перс. *namāzkār* = той, хто моліцца.

[130] Ар. *munāfiq* = крывадушнік.

[131] Ар. *namāz* = рытуальная малітва.

[132] Ар. *zakā* = абавязковая міласціна.

[133] Гл. вышэй >>> 16. Марфалогія дзеяслова (пункт 1).

16.9. Дзеепрыметнікі

16.9.1. Дзеепрыметнік цяперашняга часу незалежнага стану

Мы заўсёды знаходзім у дзеепрыметніку цяперашняга часу незалежнага стану рэгулярныя польскія формы, якія ўтвораны з дапамогай марфемы *-ąc* і адпаведных склонавых канчаткаў[134]. Сярод іх не знаходзіцца архаічных формаў і ўтварэнняў, якія ўзніклі пад беларускім уплывам[135].

Дзеепрыметнікі, выяўленыя ў тэксце тэфсіра, з'яўляюцца шмат у чым вельмі літаральнымі перакладамі аналагічных дзеепрыметнікаў з арабскага тэксту. Гэта адбываецца таму, што ў арабскай мове дзеепрыметнік незалежнага стану выконвае важныя сінтаксічныя функцыі: ад *nomen agentis* да прыслоўнага абазначэння стану. Таму мы знаходзім у тэксце тэфсіра вялікую колькасць дзеепрыметнікаў, якія пераважна адлюстроўваюць ужыванне дзеепрыметніка ў арабскай мове: *wejẓrīce na ōwoce īch k'edi dadzą ōwoce i na dōjzralōści īch pewne w tim wšitk'e są pōznak'i jedinōstwa megō dla lūdzej werōncich*[136] (109a3), *pretō ne-bōndz pōwolnij cebe klamajōncim*[137] *bō žōndają žebiś-še naklōnil dō newernich* (464a6), *i prīšlō ź neba na te ōgrōdī ōgen na ōwoci ō[d] bōga jich ā ōni bilī śpōncimi*[138] (464b3), *w ten dzen bendą nebōsa jakō rōspūščōna medz i bendą gōrī jakō pōrō ālbō pūch latajōncij*[139] (468a5), *i zapewne wjádōmi-śmī ktō z-was korān klamajōncij*[140] *i zapewne te klamane jest welką škōdą nad newernikami* (467b7), *k'edi zachcą žebi wišli s-tamtōnd ōd tich frasūnkow i mōnk i z-nōwu jich*

---

[134] Наконт развіцця дзеепрыметніка цяперашняга часу незалежнага стану гл. Klemensiewicz (1965), p. 380 ff.

[135] Гл. Łapicz (1986), p. 209 f.

[136] Дзеепрыметнік з'яўляецца тут адлюстраваннем бяззлучнікавага адноснага сказа, які складаецца толькі з адной дзеяслоўнай формы *yu'minūna* = "яны веруюць"; **Q**(6:100) {**... inna fī ḏālikum la-āyātin li-qawmin yu'minūna**} = "сапраўды, у гэтым знакі людзям, якія веруюць".

[137] Дзеепрыметнік у тэксце тэфсіра з'яўляецца літаральным перакладам дзеепрыметніка незалежнага стану *mukaḏḏib* = "той, хто хлусіць" у арабскім тэксце: **Q**(68:9) {**fa-lā tuṭi'i l-mukaḏḏibīna**} = "Не слухайся тых, хто хлусіць".

[138] **Q**(68:20): {**fa-ṭāfa 'alay-hā ṭā'ifun min rabbi-ka wa-hum nā'imūna**} = "І абышоў яго (сад) абходчык ад твайго Госпада, калі яны спалі". Фраза *a oni byli śpiącymi* з'яўляецца тут літаральным адлюстраваннем у польскай мове арабскага *ḥāl*-сказа (акалічнаснага сказа) *wa-hum nā'imūna* = (літар.) "а яны тыя, хто спяць".

[139] Дадзены дзеепрыметнік у польскім тэксце не з'яўляецца адлюстраваннем з арабскай мовы. Больш таго, арабскі назоўнік *'ihm* = *шэрсць* з **Q**(70:10) апісваецца як "шэрсць, якая лётае" = *puch latający*.

[140] Гэты дзеепрыметнік у тэксце тэфсіра адпавядае арабскаму дзеепрыметніку незалежнага стану *mukaḏḏib* = "той, хто хлусіць, ілгун" з **Q**(69:50) {**wa-innā la-na'lamu anna min-kum mukaḏḏibīna**} "Сапраўды, Мы ведаем, што сярод вас ёсць ілгуны".

nawrōcą tam że dō ōgna ōtō skōštūjce menk'i palōnce[141] (266a7), *ne-pōslališmi inačej prōrōkōw tilkō mają świástōwac werōncich*[142] *ā strašōnc newernikōw* (103a7), *tak też narūcami i nasilami nektōrich kriwdnikōw na drūgich za tō cō bili rōbōncimi*[143] *grechī* (112a4).

16.9.2. Дзеепрыметнік цяперашняга часу залежнага стану

Утвораны з дапамогай суфікса *-m-* дзеепрыметнік цяперашняга часу залежнага стану ў польскай мове ўжо ў далітаратурны перыяд знік з інвентара дзеяслоўных формаў. Ён захаваўся ў рэшткавым выглядзе ў функцыі прыметніка пераважна з актыўным значэннем[144]; напр. *wiadomy* (вядомы), які ў тэксце тэфсіра сустракаецца вельмі часта і ў актыўным значэнні[145]. Гэты дзеепрыметнік стаіць часцей за ўсё на месцы фінітнай формы арабскага дзеяслова *'alima* (ведаць): *i ōn jest' ktōrij učinil wam gwjázdī žebišce pō nich drōgi znajdōwali w cemnōšci na źemi i w nōci i na mōrū pewne ōznajmūjemi piśmō o jedinstwa našim dla lūdzej ūčōnich wjádōmich*[146] (108b6), *wojōwac skarbem wašim i sami sōbą na*

---

[141] Гэты дзеепрыметнік адпавядае тут ар. назоўніку *ḥarīq* = *пажар, агонь*; у **Q**(22:23) {[...] **wa-ḏūqū 'aḏāba l-ḥarīqi**} = "[...] і паспрабуйце пакуту агню".

[142] **Q**(6:49) {**wa-mā nursilu l-mursalīna illā mubašširīna wa-munḏirīna [...]**} = "Мы пасылаем пасланнікаў толькі дабравеснікамі і тымі, хто папярэджвае [...]". Частка *mają swiastować wierzących* з'яўляецца перакладам арабскага дзеепрыметніка незалежнага стану *mubašširīna* = "тыя, што абвяшчаюць добрую вестку, дабравеснікі", які як акалічнасны вінавальны склон мае адвербіяльнае значэнне і звязаны з фінітным дзеясловам *nursilu* = "Мы пасылаем". Паралельна гэтаму ў арабскім тэксце мае месца другі акалічнасны вінавальны склон, які таксама адносіцца да фінітнага дзеяслова *nursilu* = "Мы пасылаем", – у слове *munḏirīna* = "тыя, што папярэджваюць". У тэксце тэфсіра апошняе перадаецца дзеепрыслоўем *straszqc*, што знаходзіцца бліжэй да арабскага арыгінала, чым парафрастычны пераклад першага дзеепрыметніка *mubašširīna* = "тыя, што абвяшчаюць добрую вестку, дабравеснікі" – *mają swiastować wierzących*.

[143] Вельмі характэрным з'яўляецца адлюстраванне ў тэксце тэфсіра праз канструкцыю *być* + дзеепрыметнік цяперашняга часу арабскіх састаўных дзеяслоўных формаў кшталту *kāna* + *імперфект*, якія паказваюць дзеянне, што працягваецца ў прошлым. Дадзены прыклад з'яўляецца перакладам **Q**(6:130) {**wa-kaḏālika nuwallī ba'ḍa ẓ-ẓālimīna ba'ḍan bimā kānū yaksibūna**} = "Так Мы набліжаем адных злачынцаў да другіх за тое, што яны набылі". Арабская састаўная дзеяслоўная форма была скапіявана ў польскай мове *byli robiącymi grzechi*. Параўн. 2.3.4. Састаўныя часавыя формы *kāna* + імперфект.

[144] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 385. Параўн. Kuraszkiewicz (1981), p. 137. Параўн. Kurzowa (1993), p. 200.

[145] Параўн. Łapicz (1986), p. 209. Параўн. Suter (1993).

[146] Польск. *wiadomy* (вядомы) стаіць тут на месцы фінітнай дзеяслоўнай формы з арабскага тэксту: **Q**(6:98) {[...] **qad faṣṣalnā l-āyāti li-qawmin ya'lamūna**} = "[...] Мы размеркавалі знакі для людзей, якія ведаюць". Арабская фінітная дзеяслоўная форма *ya'lamūna* = "яны ведаюць" утварае бяззлучнікавы адносны сказ да *qawm* = "людзі": *li-qawmin ya'lamūna* = "для людзей, якія разумеюць", што ў польскім тэксце перадаецца як *dla ludzi uczonych wiadomych*.

drōdze bōžej taka praca lepša wam jeśli jesteśce tegō wjádōmī[147] (149b2), *zapewne bōg twoj ōn tegō wjádōmšij tegō cō zblōndzil ōd drōgi jegō i ōn jest wjádōmšij*[148] *ktō idze prawdziwą drōgą* (464a5). Дзеепрыметнік *wiadomy* (у кароткай форме) часта з'яўляецца ў функцыі выказніка ў назоўнікавым скланенні: *mow ja muchemmed zeslal ten korān ktōrij wjádōm tajemnic w nebōsach i w źemjech* (288a4), *pan bōg ne-jest wjádōm mnōgich rečej ōd tich cō wī činice* (392a6).

16.9.3. Дзеепрыметнік прошлага часу залежнага стану

Дзеепрыметнік прошлага часу залежнага стану ў польскай мове ўтвараецца з дапамогай суфіксаў *-t-*, *-n-* і *-en-*[149]. У тэксце тэфсіра мы знаходзім у пераважнай большасці рэгулярныя ўтварэнні. Спарадычна ва ўтварэннях з суфіксам *-en-* сустракаюцца адхіленні пры перагаласоўцы. У прэдыкатыўнай пазіцыі дзеепрыметнікі прошлага часу залежнага стану таксама заўсёды паказваюць у тэксце тэфсіра прыметнікавае скланенне[150]: *rekl pretō wistōmp ōd nas ź neba bō-ś-ti-jesteś ūbitij ūkemenōwanij i preklentij* (204b2).

Прыклады ўтварэнняў з суфіксам *-t-*: *pewne renca jegō rōspōstarte na šČōdrōbliwośc daje ją pōžiwene i skarbi jakō chce* (91b8), *prawdziwe k'edī ōfarōwal[i] ofarī prijenta ōd jednegō habila*[151] *ā neprijenta ōd drūgegō kabila*[152] (86b5), *pewne pjanij napōj i kōstk'ī grac i karte lōsi i wrōžbi preklentij cheram*[153] *jest* (95a4), *śedzą prislōniwši-śe na kreslach parenčōwich źelōnim plawatem ōbitich i na kōbercach rōźnimi farbami tkanich nadōbnich barzō* (438a5).

---

[147] Польск. *wiadomi* стаіць тут на месцы арабскай фінітнай дзеяслоўнай формы *ta'lamūna* = *вы ведаеце* ў рыфмаванай фразе з верша **Q**(9:41) {**[..] wa-ğāhadū wa-bi-amwāli-kum wa-bi-anfusi-kum fī sabīli llāhi ḏālikum ḫayrun la-kum in kuntum ta'lamūna**} = "[...] і змагайцеся сваімі маёмасцямі і сваімі душамі на шляху Алага! Гэта лепшае для вас, калі вы ведаеце".

[148] Форму вышэйшай / найвышэйшай ступені польск. *wiadomszy* можна зразумець з арабскага арыгінала, дзе ў дадзеным месцы стаіць прыметнік *'alīm* = "той, хто ведае" ў найвышэйшай ступені *a'lamu* = "той, хто ведае найлепшым чынам": **Q**(68:8) {**inna rabba-ka huwa a'lamu bi-man ḍalla 'an sabīli-hī wa-huwa a'lamu bi-l-muhtadīna**} = "Сапраўды, Гасподзь твой найлепшым чынам ведае таго, хто адхіліўся ад Яго шляху, і Ён найлепшым чынам ведае тых, хто ідзе проста."

[149] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 386. Параўн. Kuraszkiewicz (1981), p. 138 ff. Параўн. Łapicz (1986), p. 211.

[150] Параўн. Klemensiewicz (1965), p. 386: "Jedynie w M l.p. spotyka się do XVII w. częściej formy odmiany niezłożonej, które w nowej polszczyźnie trwają już jako archaizmy, np. w modlitewnym kontekście: *umęczon*, *ukrzyżowan*, *pogrzebion*". Параўн. Kuraszkiewicz (1981), p. 140: "Наадварот, у старапольскай мове да XVIII ст. гэтыя формы іменнай флексіі выступаюць у функцыі прэдыката. Напр., у Рэя гэта датычыць пераважна дзеепрыметнікаў мужчынскага і ніякага роду ў форме на *-t*, *-n* і *-to*, *-no*, радзей у множным ліку і ў жаночым родзе".

[151] Ар. *Hābīl* = Авель.

[152] Ар. *Qābil* = Каін.

[153] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

Прыклады ўтварэнняў з суфіксам *-n-*: *i jedzą ōni zakazani rečī cheramne*[154] *ej jak'e zle rečī cō stali činōncimi* (91b4), *wšak prišla tōbe wjádōmōšc ō mōjžešu gdi zawolal na negō pan bōg w dōline gōrīstej gōrī šinajšk'ej nazwane tūje*[155] (481a5).

Прыклады ўтварэнняў з суфіксам *-en-*: *pewne pan bōg ne-preči i ne-narūša terminow zamerōnich* (40b3), *ā k'edī prišenžece sterežcež pilnō priśengi wašej bōgū ūčinōnej* (95a2), *tō ūčinek z-ūmiẓlū umisla (!) šetanšk'egō pretō strōnce-še gō jeślī bic chcece ūwolnōnimi* (95a4), *ī merjema*[156] *pewne bōg blōgōslawil cebe i ōčiścil cebe ōd pōmōwena i blōgōslawona s-ti nad newjásti* (44a2), *nemalō ź nich jest [s] starcōw pūstelnikōw bōjaźnikōw bōžich ūčōnich i ōnī nigdī ne-pōdnašajōn-še w picha* (94a6), *korān zeslanij ōd mōndregō bōga wšitk'imi jenzikami ūchwalōnegō cesara* (394a3), *takōwe lūdze są ōnī w blendze welk'em zablōndzōnimi* (197b2), *pretō wi žōndace ōd bōga riźku*[157] *i ōnemū slūžce i klanajce-še i chwalce gō bō dō negō zapewne pōwrōcōni bendzece* (321a4).

Таксама ў тэксце тэфсіра рэгулярна выкарыстоўваецца дзеепрыметнік прошлага часу залежнага стану, які канчаецца на *-o*. Канчатак *-o* з'яўляецца застылай формай наз. скл. адз. л. н. р. з назоўнікавага скланення. Гэтая форма атрымала ў польскай мове асаблівую сінтаксічную функцыю – апісваць безасабовыя дзеянні, не называючы канкрэтнага суб'екта[158]. У арабскім пісьме гэты канчатак, як правіла, запісваецца *scriptio plena* праз *wāw* + *ḍamma* = *-ō*: *mōw ī muchemmed i lūdze piśmō majōnce ne-mace wī za cō še mścic ōd nas tilkō za tō że werimi panu bōgū i temu cō zeslal nam i cō zeslanō pred nami* (91a7), *ālbō ne-patriš na tich ktōrem danō ūrōnd i kśenge t'ewrīt'*[159] (42a2), *i mōw tim ktōrīm danō kśenge židōm grekōm i nepiśmenim 'erabōm*[160] *čī bendzece muśulmanmi* (41b5), *ā k'edi ūslišą cō zeslanō ājet'i*[161] *dō prōrōke ōbačiš ōči jich zapilną lzami s-tegō cō wedzą że tō prawdziwe* (94a7), *ne-mōwonō tōbe inačej i muchemmed tilkō tō cō še reklō prōrōkem pred tōbōm* (394a4), *pewne ci ktōre newernī są jeślibi bilō ū nich tō cō na źemi skerbi wšitk'i ješčō k'ed-bi take wele tegō ābi-še ōkūpili tim ōd kerane dna sōndnegō ne prijentō*[162] *bendze ōd nich i dla nich jest menka gōrka* (87b7).

Наступны прыклад можна зразумець як графічна-фанетычны варыянт лексемы *oznajmiono* (паведамлена): *jūž ōznajmene jak wele tedī mace dac jej* (32a1).

---

[154] Ар. *ḥarām* = забаронены, забароненае.

[155] Ар. *Ṭuwā* = Тува; горны масіў на Сінаі; гл. **Q**(79:17).

[156] Ар. *Maryam* = Марыя.

[157] Ар. *rizq* = сродкі існавання.

[158] Гл. Kuraszkiewicz (1981), p. 140.

[159] Ар. *tawrā* = Тора.

[160] Ар. *'arab* = арабы.

[161] Ар. *āya* = знак, цуд, каранічны верш.

[162] Канчатак *-o* наз. скл. адз. л. н. р. з'яўляецца тыповым для пасіўнага дзеепрыметніка ў прэдыкатыўнай пазіцыі; параўн. >>> 14.1.2. Назоўны склон адзіночнага ліку ніякага роду.

Гэты дзеепрыметнік тут не паказвае перагаласоўкі, і канчатак запісаны рэдукавана (*scriptio defectiva*) толькі праз *fatḥa* = *e*.

16.10. Дзеепрыслоўі

16.10.1. Дзеепрыслоўе незакончанага трывання

Формы, якія сустракаюцца ў тэксце тэфсіра, з'яўляюцца выключна польскімі ўтварэннямі з суфіксам *-ąc*, які ў арабскім пісьме запісваецца праз камбінацыю *wāw* + *ḍamma* + *nūn* + *ce* = *-ōnc*. Паказальна, што мы не знаходзім беларускіх утварэнняў з суфіксам *-učy*[163].

Дзеепрыслоўі, выяўленыя ў тэксце тэфсіра, большай часткай з'яўляюцца адлюстраваннямі арабскага арыгінальнага тэксту, якія кожны раз больш ці менш умела інтэграваныя ў польскую мову. У наступным прыкладзе перадаюцца два арабскія адвербіяльныя акалічнасныя сказы (ар. *ḥāl-сказы*)[164], якія ў польскай мове прыводзяць да сінтаксічнай блытаніны: *ne-zabrōnil jim pan bōg żebi prijente bili ōd nich ōfari jich tilkō dla tegō że ōnī są newernikami panu bōgū i pōslōwi jegō ā ne-prichōdzą dō nemaźu*[165] *tilkō ōni ne-chcōnc*[166] *i ne-ōfarūją z-dōbrej woli tilkō ōni ne-chcōnc s-primūsū* (150b7). Далейшыя прыклады, у якіх дзеепрыслоўі абумоўлены арабскім арыгінальным тэкстам: *i prišlī dō ōjca jich w wečōr plačōnc*[167] *rekli ī ōjča naš pewne mī begališmi w zawodī i zōstawiliśmī jūzūfa*[168] *wedla rečej bōrešnī*[169] *našej pretō zjadl-gō wilk* (182a8), *i zeslališmi tōbe ī muchemmed korān prawdziwij pōtwerdzajōnc*[170] *tō cō w renku īch z-kśong rownich*

---

[163] Параўн. Łapicz (1986), p. 210.

[164] Гл. >>> 2.3.6. Адвербіяльныя абазначэнні акалічнасцей (ар. *ḥāl*).

[165] Перс. *namāz* = рытуальная малітва.

[166] Перакладчык спрабуе літаральна перадаць арабскія акалічнасныя сказы. Гл. **Q**(9:54) {**wa-mā mana'a-hum an tuqbala min-hum nafaqātu-hum illā anna-hum kafarū bi-llāhi wa-bi-rasūli-hī wa-lā ya'tūna ṣ-ṣalāta illā wa-hum kusālā wa-lā yunfiqūna illā wa-hum kārihūna**} = "І нічога не перашкодзіла ім, каб ад іх былі прынятыя іх расходы, акрамя таго, што яны не верылі ў Алага і ў пасланніка Яго, што яны прыходзяць на малітву толькі ляніва і расходы даюць толькі без жадання."

[167] Гэтае дзеепрыслоўе з'яўляецца прамым адлюстраваннем ар. акалічнаснага сказа (*ḥāl*-сказа): **Q**(12:17) {**wa-ǧā'ū abā-hum 'išā'an yabkūna**} = "І прыйшлі яны да бацькі свайго вечарам плачучы."

[168] Ар. *Yūsuf* = Іосіф.

[169] Форма *borešni* не з'яўляецца цалкам адназначнай, але, безумоўна, мае дачыненне да беларускага *барахло* = нешта маленькае, малакаштоўнае, а таксама правіянт (якраз столькі, каб не памерці з голаду).

[170] У ар. тэксце мае месца дзеепрыметнік незалежнага стану ў вінавальным склоне, які функцыянуе як адвербіяльнае абазначэнне акалічнасці. Перакладчык перадаў гэтае месца цалкам правільна і блізка да літаральнага перакладу. **Q**(5:49) {**wa-anzalnā ilay-ka l-kitāba bi-l-ḥaqqi muṣaddiqan li-mā bayna yaday-hi mina l-kitābi [...]**} = "І Мы паслалі табе Пісанне з ісцінай, якая пацвярджае тое, што было да яго з Пісання […]."

t'ewrīt'[171] *inǧīl*[172] *źebūr*[173] *i mej ōka patr na nich i sōndz medzi nich tim cō zeslal pan bōg* (89b6), *i činą panū bōgū ṣabrami ānjōlōw i ferejōw*[174] *ā wedzōnc*[175] *że tō pan bōg stworil* (109a4).

Побач з гэтым мы пастаянна знаходзім дзеепрыслоўі, якія не маюць адпаведнікаў у арабскім арыгінале. Напр., мы часта знаходзім у тэксце тэфсіра дзеепрыметнік *mówiąc* для ўвядзення простай мовы: *za klamca meli slūga našegō i rekli że šalōnij cō mū bilō barzō zacenškō pretō mōdlil-še bōgū swemū mōwonc pewne ja welkō beda cerpe* (434a4).

Іншыя прыклады, у якіх дзеепрыслоўі ўяўляюць сабой у тэксце тэфсіра дапаўненні: *ne-dziwūj-še i ne-zajzri patrōnc na skarbi jich ānitež na dzeci jich pewne chce pan bōg žebi ūkaral jich tim skarbem i dzecmi* (150b8), *prichōdzą dō cebe i muchemmed pōzdrōwajōnc ślamem*[176] *tak'im cō ne-pōzdrōwal ce tim bōg* (445b6).

16.10.2. Дзеепрыслоўе закончанага трывання

Формы дзеепрыслоўя закончанага трывання ўтвараюцца з дапамогай суфікса *-wszy* альбо *-łszy*[177]. Марфемы *-wszy, -łszy* звычайна запісваюцца ў арабскім пісьме праз камбінацыю *wāw* + *šīn* + *kasra* = *-wši* альбо *lām* +*šīn* + *kasra* = *-lši*, пераважна без *scriptio plena* галоснай (асабліва пры дзеясловах на *-ąć*). У тэксце тэфсіра сустракаюцца ўтварэнні дзеепрыслоўяў з марфемай *-łszy* замест *-wszy*. Формы дзеепрыслоўя закончанага трывання прадстаўлены ў тэксце тэфсіра адносна часта.

У супрацьлегласць дзеепрыметніку цяперашняга часу незалежнага стану і дзеепрыслоўю незакончанага трывання формы дзеепрыслоўя закончанага трывання ў большасці выпадкаў немагчыма паставіць у прамую сувязь з арабскім арыгінальным тэкстам. У марфалагічным фондзе арабскага дзеяслова няма формы, якая была б аналагічнай польскаму дзеепрыслоўю закончанага трывання.

Дзеепрыслоўе закончанага трывання з'яўляецца ў тэксце тэфсіра больш далёкім ад арабскага арыгінала, чым дзеепрыметнік цяперашняга часу незалежнага стану альбо дзеепрыслоўе незакончанага трывання. Яно заўсёды змяшчае інтэрпрэтацыі адносна паслядоўнасці часу, якой часта няма ў літаральным сэнсе арабскага слова. Акрамя таго, яно ўносіць дадатковую экзегетычную інфармацыю адносна арабскага арыгінала і часта сінтаксічна і семантычна зліваецца з такімі дадатковымі каментарамі і тлумачэннямі.

---

[171] Ар. *tawrā* = Тора.

[172] Ар. *inǧīl* = Евангелле.

[173] Ар. *zabūr* = псалмы.

[174] Перс. *perī* = фея, дух.

[175] **Q**(6:101); гл. >>> 2.3.6. Адвербіяльныя абазначэнні акалічнасцей (ар. *ḥāl*).

[176] Ар. *salām* = мір, прывітанне; ісламскае прывітанне "ас-саляму алайкум".

[177] Гл. Klemensiewicz (1965), p. 384-385. Параўн. Łapicz (1986), p. 211. Параўн. Kurzowa (1993), p. 201.

Далей прыводзяцца некалькі характэрных прыкладаў: *pōslališmī jich s-cūdami slōw prōrōck'ich i zeslališmi tōbe ōtō ten korān ābiś ōznajmil lūdzem cō zeslanō dō nich āzalibi ōni rōzmišliwśi-śe*[178] *ūwerili* (211a4), *ūdal-śe za nimi fari'ūn*[179] *z-wojśkami swojimi pretō ōgarnela gō woda ā zalali-śe wolami morśk'imi i zelali jich pretō i sam zginōl fari'ūn i lūd jegō ne-prijōlśi*[180] *drōgi prawdziwij* (251b3), *mow ī muchemmed pewne zabrōnōne mī żebim ja mjál slūżic i klanac-śe tim bōgōm ktōrim wī mōdlice-śe zanechawśi*[181] *pana bōga* (104a5), *tak-tež učiniliśmi kōżdemū prōrōku neprijacelmi šetanōw lūdzij i ferejōw*[182] *nadicha zlim dūchem jedin drūgim pri'ōzdōbiwśi*[183] *klamstwa falśī zlōta i slōwa čim-bī mōgli ōšūkac*

---

[178] **Q**(16:45) {**bi-l-bayyināti wa-z-zuburi wa-anzalnā ilay-ka ḏ-ḏikra li-tubayyina li-n-nāsi ma nuzzila ilayhim wa-laʿalla-hum yatafakkarūna**} = "З яснымі знакамі і пісаннямі; і Мы паслалі да цябе напамін, каб ты тлумачыў людзям, што ім было паслана, і, магчыма, яны задумаюцца." У ар. тэксце дзеяслоўная форма 3 ас. мн. л. цяперашняга часу *yatafakkarūna* (яны задумаюцца) уводзіцца часціцай *laʿalla*, якая мае адгартатыўнае значэнне. У польскім тэксце літаральны сэнс арабскага арыгінала (магчыма, яны задумаюцца) экзегетычна дапаўняецца, і яму надаецца значэнне папярэдняга дзеяння: *azali by oni rozmyśliwszy się uwierzyli* (яны, падумаўшы, уверылі). Сэнс і мэта "задумвання" выражаецца яшчэ эксплiцытна як жаданне праз аптатыўны, адгартатыўны кан'юнктыў.

[179] Ар. *firʿawn* = фараон.

[180] **Q**(20:79) {**fa-atbaʿa-hum firʿawnu bi-ǧunūdi-hī fa-ġašiya-hum mina l-yammi mā ġašiya-hum**} = "І пагнаўся за імі Фараон з войскамі сваімі, і пакрыла іх з мора тое, што іх пакрыла." **Q**(20:80) {**wa-aḍalla firʿawnu qawma-hū wa-mā hadā**} = "І збіў з дарогі Фараон народ свой, і не павёў прама." Ар. дзеяслоў *hadā* (весці прама) стаіць у ар. арыгінальным тэксце ў перфекце; у польскім тэфсіры ён перакладаецца як дзеепрыслоўе закончанага трывання *nie przyjąwszy drogi prawdziwej* (не прыняўшы дарогі праўдзівай; = таму што ён не прыняў / яны не прынялі праўдзівай дарогі), чым імплікуецца кансэкутыўнае значэнне, якое дакладна адпавядае літаральнаму сэнсу арабскага сказа.

[181] **Q**(6:57) {**qul innī nuhītu an aʿbuda llaḏīna tadʿūna min dūni llāhi** [...]} = "Скажы, сапраўды мне забаронена пакланяцца тым, каму вы пакланяецеся, акрамя Алага [...]." Арабская прыназоўнікавая фраза *min dūni llāhi* (акрамя Алага, замест Алага) у польскім перакладзе перадаецца не літаральна, а ў выглядзе парафразы *zaniechawszy pana boga* (пакінуўшы Пана Бога), якая змяшчае з дзеепрыслоўем закончанага трывання таксама часавую інтэрпрэтацыю, што не мае адпаведніка ў арабскім тэксце.

[182] Перс. *perī* = фея, дух.

[183] **Q**(6:113) {**wa-kaḏālika ǧaʿalnā li-kulli nabīyin ʿadūwan šayāṭina n-nāsi wa-l-ǧinni yūḥī baʿḍu-hum ilā baʿḍin zuḫrufa l-qawli ġurūran wa-law šāʾa rabbu-ka mā faʿalū-hu fa-ḏar-hum wa-mā yaftarūna**} = "Так кожнаму прароку Мы зрабілі ворагамі шайтанаў з людзей і джынаў. Адны з іх паведамляюць іншым прыгажосць слова высакамерна. І калі б пажадаў Гасподзь твой, яны б не рабілі гэтага, а ты пакінь іх і тое, што яны выдумляюць". Арабскія назоўнікі *zuḫruf l-qawl* (прыгажосць слова) і *ġurūr* (высакамернасць) у тэксце тэфсіра эгзегетычна пашыраныя і парафразаваныя: *nadycha złym duchem jeden drugim przyozdobiwszy kłamstwa fałszy złoto i słowo czym by mogli oszukać i zwieć* (літар.: Натхняў адзін аднаго злым духам, прыаздобіўшы хлусню, фальш, золата і слова, якімі яны маглі б ашукаць і падмануць).

i źweśc (110a7), *pretō dō negō jedne s-tich dzewek zakriwši*[184] *twar ōd wstidū rekla zapewne ōcec mōj wziwa cebe ābī dal zaplata tōbe* (312b3), *ja ōdpūščajōncij jest grechōw dla tich cō kajete ūčiniwši*[185] *īman*[186] *prijenli i ūčink'i dōbre činili i pōtim pilnōwali drōgi bōżej* (251b8).

---

[184] **Q**(28:26) {**fa-ǧā'at-hu iḥdā-humā tamšī 'alā istiḥyā'in qālat inna abī yad'ū-ka [...]**} = "І прыйшла да яго адна з іх, ідучы сарамліва. Яна сказала: "Вось бацька мой кліча цябе […]." Арабская прыназоўнікавая фраза *'alā istiḥyā'in* (сарамліва) функцыянуе ў арабскім тэксце як акалічнасць да дзеяслова *ǧā'a* (прыйсці). Перакладчык гэтае месца парафразаваў у духу экзегетычнага каментару і адначасова ўвёў дзеянне, якое папярэднічае дзеяслову *qāla* (казаць) і якое ён выразіў дзеепрыслоўем: *zakrywszy twarz od wstydu rzekła […]* (Закрыўшы твар ад сораму, сказала […]).

[185] **Q**(20:83) {**wa-innī la-ġaffārun li-man tāba wa-āmana wa-'amila ṣāliḥan ṯumma htadā**} = "Сапраўды, Я дарую таму, хто пакаяўся і ўвераваў і рабіў добрыя справы, потым пайшоў правільным шляхам." Тут у польскім тэксце перакладчык інтэрпрэтаваў у часавай паслядоўнасці тры арабскія дзеясловы ў перфекце, *tāba* (пакаяцца), *āmana* (увераваць) і *'amila ṣāliḥan* (рабіць добрыя справы), і першы дзеяслоў, арабскае *tāba* (пакаяцца), падаў як папярэдні да іншых дзеянняў: *kajatę uczyniwszy iman przyjęli […]* (Пакаянне зрабіўшы, веру прынялі) […].) Наконт перакладу арабскага *tāba* (пакаяцца) польск./бел. фразеалагічным дзеясловам *kajatę czynić* (літар. пакаянне рабіць) гл. Suter (1993).

[186] Ар. *īman* = вера.

17. РУКАПІСЫ

У дадзенай працы разглядаецца пяць рукапісаў:

1. Тэфсір L, Беларуская бібліятэка імя Францішка Скарыны ў Лондане, 1725.
2. Тэфсір I, Інстытут усходазнаўства ў Санкт-Пецярбургу, канец XVIII ст.
3. Тэфсір U, Санкт-Пецярбургскі універсітэт, 1825 г.
4. Тэфсір M, прыватная маёмасць Ібрагіма Канапацкага (Мінск), канец XIX ст.
5. Кітаб K, Брытанскі музей у Лондане, пачатак XIX ст.

У аснову дадзенага даследавання пакладзены рукапіс Тэфсіра **L**. Рукапісы тэфсіраў **I**, **U** і **M** прыводзяцца для параўнання. З манускрыпта кітаба **K** Брытанскага музея ў Лондане прыводзіцца некалькі каранічных цытат у якасці тэкстаў для параўнання.

Пры перадачы рукапісу **L** размяшчэнне тэксту другой суры (ар. *al-baqara* = Карова) адпавядае паслядоўнасці падрадковага тэксту ў манускрыпце. Пры гэтым транслітараваны як арабскі арыгінальны тэкст, так і польскі тэкст тэфсіра.

Пры перадачы тэкстаў рукапісаў **I**, **U** і **M** арабскі арыгінальны тэкст апускаецца. Тэкст тэфсіра заўсёды падзяляецца аналагічна рукапісу **L**, г.зн. ён дзеліцца на часткі адпаведна паслядоўнасці старонак рукапісу **L**, каб аблегчыць параўнанне асобных версій. Пры гэтым у тэксце рукапісаў **I**, **U** і **M** звесткі пра старонкі і радкі рукапісу **L** падаюцца ў квадратных дужках [ ]. Калі ў папярэдніх раздзелах прыводзіліся для параўнання фрагменты з манускрыптаў **I**, **U** альбо **M**, то кожны раз з прывядзеннем звестак пра старонкі рукапісу **L**. Першасны парадак старонак манускрыптаў **I**, **U** і **M** можна вызначыць па звестках пра старонку і радок, якія заўсёды прыводзяцца ў круглых дужках ( ).

Тлумачэнні да знакаў транслітараванага тэксту

У фрагменце з манускрыпта **L** (гл. >>> 17.1.1.) у круглых дужках заўсёды прыводзяцца нумары радкоў (тэкст Карана: 1a–8a; тэкст тэфсіра: 1b–8b). У квадратных дужках [0, 1 … 263] нумаруюцца каранічныя вершы ў арабскім тэксце, каб аблегчыць арыентацыю ў тэксце Карана. У манускрыпце такой нумарацыі няма.

Акрамя таго, таксама ў квадратных дужках [*xy*] устаўляюцца для паўнаты тэксту некаторыя словы, якія былі прапушчаныя перапісчыкам.
Няправільна напісаныя арабскія словы і фразы ў транслітарацыі прыводзяцца ў іх арыгінальным напісанні. Іх выпраўленні ідуць следам у круглых дужках ( ) і дадаткова пазначаюцца камбінацыяй знакаў !=.

Ва ўсіх транслітарацыях арабскія і цюркскія часткі тэксту ўводных раздзелаў для яснасці прыводзяцца ў фігурных дужках { }. Арабскі тэкст заўсёды запіс-

ваецца {**паўтоўстым шрыфтам**}, цюркскі тэкст – {звычайным шрыфтам}, а славянскі тэкст – *курсівам*. У манускрыпце такіх маркіровак не існуе.

У цюркскіх фрагментах графема *šīn* = *š* перадаецца праз <ş>, як у сучаснай турэцкай мове. Таксама графема *čīm* = *č* транслітаруецца праз сучасны знак <ç>. Поўнае напісанне галосных */ü, ö, ı, e/* паказваецца падкрэсліваннем адпаведных літар: < *ü, ö, ı, e* >.

17.1. Рукапіс тэфсіра L

Рукапіс **L** – гэта манускрыпт тэфсіра з Беларускай бібліятэкі імя Францішка Скарыны ў Лондане. Манускрыпт значыцца пад інвентарным шыфрам 33264 як Тэфсір 1725 г. Рукапіс дагэтуль навукова дасканала не даследаваўся[1].

Рукапіс **L** на апошняй старонцы манускрыпта (496b) у якасці дадатку да тэксту Карана змяшчае дату перапіскі:

> Арабскім пісьмом на арабскай і цюркскай мовах:
> *ben bo[ḥdan] ibn ša'ban āsanōwič 'azīz wa-šarīf kurān kalāmu llāhi l-'aẓīm 'alā kutubi-him tamām etdī fī šahri rā[bī'i] l-āḫar fī yawmi iḥdā wa-'išrūna fī [sanat alf] mi'at ṯālāṯūna sab'a penčešembe gün*
>
> Літар. пераклад: Ібн Богдан ібн Ша'абан Асановіч высакародны святы Каран, слова Алага Усемагутнага, паводле іх кніг закончыў. У месяцы рабіахар у дзень дваццаць першы ў год тысяча сто трыццаць сёмы, у чацвер.

Арабскім пісьмом на польскай мове:

> *ōd narodzenja 'īśī*[2] *prōrōka tišōnc śedem set dwadzestij pōntij dōpisał we čwartek īmam [...]č[.]ck'ij*

---

[1] Лонданскі рукапіс прадстаўлены Г.М. Мэрэдыт-Оуэнс і А. Надсанам у іх артыкуле "The Byelorussians Tartars and Their Writings" у Journal of Byelorussian Studies (1970, V. 2., № 2, p. 141–176) і коратка апісаны. Гл. таксама Suter (1993). Колькі цюркскіх фрагментаў з уступных раздзелаў рукапісу **L** было даследавана ў артыкуле Scharlipp (1992b). Іншых навуковых даследаванняў рукапісу **L** не існуе.

На след лонданскага рукапісу **L** мы натыкаемся яшчэ ў Дзямідчыка (Демидчик (1987), с. 242): "В том же 1927 г. Л. Цветков в статье 'Несколько слов о минских татарах' привел сведения о рукописи Корана, переписанного в 1725 г. с подстрочным переводом на белорусский язык и многочисленными заметками на маргиналиях, а также рукопись 1812 г. целиком на белорусском языке". Дзямідчык спасылаецца на Цвяткова (1927); там на старонцы 11 коратка згадваецца Каран-тэфсір 1725 г.: "У сям'і Смайкевічаў ёсьць коран 1725 году. [...] Менскі паасобнік корану 1725 г. мае пры арабскім тэксьце падрадковы пераклад на беларускую мову з значнаю колькасьцю полёнізмаў".

Паводле А. Надсана тэфсір **L** у 1968 г. быў перададзены на захаванне Беларускай бібліятэцы імя Францішка Скарыны ў Лондане сям'ёй Смайкевічаў – нашчадкаў апошняга імама Мінска, якія эмігравалі пасля Другой сусветнай вайны ў Злучаныя Штаты.

[2] *'Īsā* = Ісус.

Літар. пераклад: Ад нараджэння Ісы прарока [у год] тысяча семсот дваццаць пяты. Напісаў у чацвер; імам […]ч[.]цкі.

Лацінскім пісьмом на польскай мове:

napisany ten Alkoran z tłumaczeniem w roku 1725m.

Літар. пераклад: Напісаны гэты Каран з тлумачэннем у годзе 1725-м.

Такім чынам, перапісчыкам быў імам па імені Ібн Богдан ібн Ша'абан Асановіч[3]. На жаль, утвораны ад тапоніма прыметнік, які далучаецца да рэлігійнага тытулу, немагчыма зразумець[4].

Праца над манускрыптам была завершана *21 рабі' II 1137 г. гіджры*, што адпавядае *7 студзеня 1725 г.* н.э. Назва дня тыдня *чацвер* (*peček̆embe gün, čwartek*) з'яўляецца каштоўнай тым, што дзякуючы ёй можна дакладна суаднесці дадзеную хрысціянскую дату з юліянскім праваслаўным летазлічэннем. *7 студзеня 1725 г.* паводле грыгарыянскага календара была нядзеля. *7 студзеня 1725 г.* паводле юліянскага календара адпавядае грыгарыянскай даце 18 студзеня 1725 г. і прыпадае на чацвер.

Рукапіс **L** ахоплівае 497 аркушаў фарматам 31 × 19 см. На першых чатырох аркушах змешчаныя тры кароткія трактаты, якія служаць уводзінамі да каранічнага тэксту і да рэцытацыі Карана.

На арк. 2a знаходзіцца трактат пра арабскую малітоўную формулу "*bi-smi llāhi r-raḥmāni r-raḥīm*" (У імя Алага Міласэрнага і Міласцівага).

Следам на арк. 2a:8–2b:16 ідзе трактат пра падзел каранічнага тэксту на адрэзкі, якія служаць літургічным мэтам (*sufur, aḥzāb*), а таксама на суры і вершы. Пасля гэтага ідзе статыстыка пра частотнасць розных арабскіх літар у тэксце Карана[5].

На арк. 4a і 4b знаходзіцца дэталёвае апісанне, як можна падрыхтаваць чытанне Карана ў гонар памерлага. Пункт за пунктам пералічваецца, якія прадпрымаць рытуальныя дзеянні, якія прымаць паставы цела падчас рытуальнай малітвы, якія арабскія, цюркскія малітоўныя формулы вымаўляць і якія суры Карана рэцытаваць. Арабскія і цюркскія малітоўныя выказванні, выслоўі займаюць большую частку тэксту. На беларускай мове ў кароткіх каментарах апісваецца толькі знешні ход цырымоній.

Непасрэдна перад каранічным тэкстам на арк. 5a цытуюцца вершы з 77-га па 80-ы суры 56, якія можна знайсці ў тэксце тэфсіра з (440a8) па (440b2).

---

[3] Гл. Meredith-Owens / Nadson (1970), p. 158: "It is known that a noble Tartar family with the name of Asanovič lived in the district of Minsk". Наконт сям'і Асановічаў гл. таксама Dumin (1999), p. 32–33, p. 153 (Сямейны герб).

[4] Гэта можна было б прачытаць як варыянт *rečycki* (ад месца стварэння *Рэчыца*).

[5] Такая цалкам ідэнтычная статыстыка знаходзіцца ў кітабе **K**; гл. >>> 17.5.1.12; параўн. Flügel (1856).

Уласна каранічны тэкст пачынаецца на арк. 5b першай сурай. Размяшчэнне тэксту адпавядае размеркаванню арабскага тэксту, вядомаму з "літоўскага" тэфсіра, – па восем радкоў на старонцы, якія заўсёды суправаджаюцца падрадковым перакладам. Тэкст Карана займае ўсю прастору ад арк. 5b да арк. 496b. Непасрэдна за апошняй сурай знаходзіцца калафон са звесткамі пра перапісчыка і месца стварэння манускрыпта (гл. вышэй).

На арк. 497a знаходзіцца заключная малітва на арабскай мове, якая павінна вымаўляцца пасля чытання Карана. Дадаткова ў тэкст устаўляецца таксама некалькі цюркскіх малітоўных формул.

Почырк старанны і добра чытаецца. Графема *ṣaġir-i-nūn= -ą* звычайна служыць для абазначэння *o*-насавога ў канцы слова. Галосныя */u/* і */o/* графічна не адрозніваюцца. Для напісання галоснага */a/* пастаянна ўжываецца камбінацыя *alif + fatḥa = a*. Наадварот, камбінацыя *alif + alif diacriticum = â* сустракаецца вельмі рэдка. У якасці *mater lectionis* для галосных на пачатку слова заўсёды выступае *alif = '*, графему *'ayn = '* у гэтай функцыі наўрад ці можна сустрэць. Звычны */z/* прынцыпова запісваецца праз графему *ḍād = z*, а графема *ẓā' = z* у гэтай функцыі сустракаецца рэдка. Рэгулярна ўжываецца камбінацыя графем *yā' + alif diacriticum = já*, што тыпова для польскіх тэкстаў.

17.1.1. Тэкст рукапісу L

(арк. 2a) (1) {**bi-smi llāhi r-raḥmāni r-raḥīmi**}[6] (2) *dzewet'naśce chūrfōw*[7] *ā chtō bī tije dzewet'naśce pew štō* (3) *[...]t* (4) *chtō īma majō welīkeja tō jest* {**bi-smi llāhi r-raḥmāni r-raḥīmi**} (5) *chtō bī stō tridześca tri razi na kōždij dzen pew īmōna maje bōžije* (6) *tedī pan bōg miłościwij da jemū na tim świece ščenśca ī pōžitkū w prispō-* (7) *-rū i wšitkō dam jemū wedlūg žōndane jegō āmīn*[8] ***bab***[9] (8) *tō jest ō korānnaj rachūbe i welīkōści ōznajomō jak wele* (9) *čegō jest naprōd sufur*[10] *tridześca ū korāne chiźbōw*[11] *stō dwa-* (10) *-dześca śūrejōw*[12] *stō čtirnaśca ū korāne ājet'ōw*[13] *šeśc* (11) *tiśencaj šessōt šeśdześōnt ū korāne tak jest ne inačej* (12) *tō jest ō rachūbe ō korānnich ō wšitk'ich chūrfach*[14] *zelī*[15] (13) *izrōchōwana na liğbe na jednō mejśca*

---

[6] Ар. *bi-smi llāhi r-raḥmāni r-raḥīmi* = У імя Алага Міласцівага і Міласэрнага. У арабскім пісьме прыведзеная малітоўная формула запісваецца роўна праз 19 літар.

[7] Ар. *ḥarf* = літара.

[8] Ар. *āmīn* = амінь.

[9] Ар. *bāb* = вароты, раздзел.

[10] Ар. *sifr* = кніга.

[11] Ар. *ḥizb* = частка, партыя.

[12] Ар. *sūra* = сура.

[13] Ар. *āya* = знак, каранічны верш.

[14] Ар. *ḥarf* = літара.

[15] Тут размова ідзе пра апіску перапісчыка. Гэта належыць чытаць як род. скл. мн. л. *słōw* (слоў); арабскае напісанне *zelī* і *słōw* вельмі падобнае.

naprōd ālifow[16] *ōšim tišencaj* (14) *stō šedmidzešōnt jest bejōw*[17] *čtirī tišōnci čtirista dwadzešca* (15) *jest t'ejōw*[18] *dzešenc tišencaj stō dzewencdzesōnt jest* (16) *šejōw*[19] *dzešenc tišencaj dzwešca šedmidzešōnt šešc jest* (17) *ǧimōw*[20] *trī tišōnci dzwešca šedmidzešōnt trī jest*

(арк. 2b) (1) *chejōw*[21] *tišōnc dzewenc-set jest ḫijōw*[22] *dwa tišōnci stō dwa-* (2) *-dzešca trī jest dalōw*[23] *penc tišencej šessōt čtirdzešca dwa (3) jest žalōw*[24] *tišōnc šessōt dewendzešōnt jest rejōw*[25] *dzešenc tišencej* (4) *dzewenc-set dzewenc źejōw*[26] *tišōnc dzwešce dzewendzesōnt jest šin-* (5) *-nōw*[27] *tišōnc ōšmi-set šedmidzešōnt šedmi jest šinōw*[28] *tišōnc dzwe-* (6) *-šca pendzešōnt trī jest satōw*[29] *trī tišōnci jest zatōw*[30] (7) *tišōnc šedem-set jest tijew*[31] *tišōnc dzwešce šedmidzešōnt čtirī jest* (8) *ẓ[e]jōw*[32] *ōšim-set čtirdzešca dwa jest '[e]jinōw*[33] *dzewenc tišencej dwa-* (9) *-dzešca dwa jest gejinōw*[34] *dwa tišōnci dwadzešca ōšim jest fejōw*[35] *šešc* (10) *tišencej čtirī-sta dzewenc-dzešōnt jest kafōw*[36] *šešc tišencej* (11) *ōšmi-set dwadzešca trī jest k'efōw*[37] *tišōnc penc-set jest lemōw*[38] (12) *trī-dzešca tišencej čtirista tridzešca dwa jest* (13) *nunōw*[39] *dwadzešca šešc tišencej šešdzešōnt jest wowaw*[40] *dwadzešca* (14) *tišencej tridzešca dwa jest hejōw*[41] *dwadzešca tišencej šedmidzešont jest* (15) *lamalīfōw*[42]

---

[16] Ар. *alif* = ', аліф, 1-я літара ар. алфавіта.
[17] Ар. *bā'* = b, 2-я літара ар. алфавіта.
